Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”

У.А. ЛОБАЧ

# ЭТНАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 “Гісторыя”,
1-02 01 02 “Гісторыя. Замежная мова”

Наваполацк 2006

УДК 39 (075.8)
ББК 63.5 (4Беи) я73
Л 68

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору БДУ
(загадчык – канд. філал. навук Т. Марозава);
В.І. Шайкоў, канд. гіст. навук, дацэнт

Л 68 **Лобач У.А. Этнаграфія Беларусі**: Вучэбна-метадычны комплекс для студ. спец. 1-21 03 01 “Гісторыя”, 1-02 01 02 “Гісторыя. Замежная мова”. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 328 с.
ISBN 985-418-396-3

Прадстаўлены аўтарскія лекцыі па ўсіх раздзелах і тэмах вучэбнай праграмы, метадычныя і інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы, якія стымулююць творчае засваенне каштоўнасцей беларускай этнічнай культуры, кантрольныя тэсты і заданні, слоўнік паняццяў і спіс літаратуры па кожным раздзеле вывучаемага курса.

Прызначаны для студэнтаў гуманітарных і педагагічных спецыяльнасцей дзённай і завочнай форм навучання.

УДК 39 (075.8)
ББК 63.5 (4Беи) я73

ISBN 985-418-396-3

© Лобач У.А., 2006
© УА “ПДУ”, 2006

# УВОДЗІНЫ

У сучасным грамадстве фарміраванне ўсебакова развітай, творчай асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй немагчыма без далучэння да этнакультурнай спадчыны народа: мовы, абрадаў, звычаяў, сацыянарматыўных традыцый, каштоўнасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры. Ва ўмовах імклівай глабалізацыі і універсалізацыі чалавечага быцця этнічная самабытнасць кожнага народа, у тым ліку і беларусаў, не толькі набывае статус прынцыпова ўнікальнага і непаўторнага сегмента сусветнай культуры, але і з'яўляецца важнейшым механізмам нацыянальнай самаідэнтыфікацыі чалавека, усведамлення ім месца і ролі свайго народа ў планетарных маштабах. Творчае спасціжэнне разнастайных аспектаў беларускай традыцыйнай культуры, якая прайшла ў сваім развіцці шматвяковы, складаны шлях, з'яўляецца не простай мемарыяльнай данінай "патрыярхальнай мінуўшчыне", што незваротна сыйшла ў нябыт, але заклікана рэанімаваць каналы міжпакаленнай перадачы этнакультурнай інфармацыі, якія былі парушаны гвалтоўнай калектывізацыяй, сталінскімі рэпрэсіямі, Другой Сусветнай вайной, а таксама імклівай урбанізацыяй і русіфікацыяй 1950 – 1970-х гадоў. Далучэнне да матэрыяльных і духоўных набыткаў папярэдніх пакаленняў, разуменне і ўспрыняцце светапоглядных каштоўнасцяў продкаў ляжаць у аснове выхавання сапраўднага патрыятызму і пачуцця адказнасці за цяперашняе і будучае сваёй Бацькаўшчыны, фарміруюць павагу не толькі да ўласнай культуры, але і да этнічных традыцый іншых народаў.

Разам з тым, негледзячы на важкую сацыякультурную значнасць дысцыпліны "Этнаграфія Беларусі" і працяглы вопыт яе выкладання ў ВНУ Беларусі, навукова-метадалагічнае забеспячэнне гэтага прадмету айчыннай гуманітарыстыкі да нядаўняга часу мела шэраг прынцыповых недахопаў. Па-першае, традыцыйная беларуская культура разглядалася пераважна ў рэтраспектыўным ключы, як спадчына толькі вясковай супольнасці мінулых стагоддзяў, што не мае непасрэднай сувязі з сучаснай нацыянальнай культурай Беларусі. Адсюль, у студэнтаў фармавалася пачуццё культурнай адчужанасці і дыстанцыі адносна каштоўнасцяў беларускага традыцыйнага грамадства.

Па-другое, у выкладанні этнаграфіі Беларусі доўгі час прывілеяваў матэрыялістычны падыход у інтэрпрэтацыі этнічнай культуры, калі матэ-

рыяльныя аспекты штучна адасабляліся ад духоўных каштоўнасцяў і разглядаліся як прыярытэтныя, хаця ў традыцыйнай супольнасці яны складаюць непарыўнае цэлае.

Па-трэцяе, дасягненні айчыннай акадэмічнай этнаграфіі (этналогіі), асабліва ў апошнія дзесяцігоддзі, толькі ў малой ступені ўлічваліся ў межах дысцыпліны “Этнаграфія Беларусі”, што выявілася на практыцы ў катастрафічным разрыве паміж вялікай колькасцю высокапрафесійных навуковых даследаванняў і амаль поўнай адсутнасцю вучэбнай літаратуры: за ўвесь час выйшаў толькі адзін (!) падручнік па беларускай этнаграфіі, які, пры ўсіх сваіх вартасцях, не адпавядае сучаснаму стану навукі і педагагічнай метадалогіі.

Такім чынам, прапанаваны вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) па характары, змесце і форме заклікаы выправіць існуючыя недахопы з улікам апошніх даследаванняў, як уласна ў навуцы так і ў методыцы выкладання. Яго мэта – павышэнне якасці і эфектыўнасці пазнавальна-выхаваўчай дзейнасці на аснове інавацыйных педагагічных тэхналогій. Навізна выдання заключаецца ў тым, што ў ім прадстаўлены аўтарскія тэксты лекцый па ўсіх тэмах і раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама неабходныя студэнту інфармацыйна-аналітычныя, метадычныя і даведачныя матэрыялы, якія стымулююць глыбокае азнаямленне з асноўнымі каштоўнасцямі беларускай этнічнай культуры.

Усебаковае і ўсвядомленае засваенне студэнтамі дысцыпліны “Этнаграфія беларусі” немагчыма без актыўнага працэсу самаадукацыі пад кіраўніцтвам выкладчыка, паўнавартай падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў, творчай распрацоўкі індывідуальных тэм і даследаванняў, прамежкавай атэстацыі і заліку. З мэтай аптымізацыі падрыхтоўкі, у вучэбны працэс уключаны *этнаграфічны практыкум*, які ўключае:

а) свядомы выбар адзіна правільнага варыянту адказу на актуальныя пытанні этнаграфічнай тэорыі і практыкі;

б) самастойнае вырашэнне лагічных задач і праблем;

в) выкананне даследаванняў па этнаграфіі Беларусі ў выглядзе рэфератаў і спавешчанняў;

г) планамернае і кантраляванае выкладчыкам засваенне этнаграфічных катэгорый і вызначэнняў.

Дзейсны метад самакантроля якасці засвоеных студэнтамі ведаў – выкананне *індывідуальных заданняў* да папярэдняга заліку.

Вучэбна-метадычны комплекс утрымлівае 27 варыянтаў такіх заданняў, якія ахопліваюць усе тэмы і раздзелы вучэбнай праграмы. *Тэсты*, выкарыстаныя ў індывідуальных заданнях маюць наступную формулу:

Т (тэст) = З (заданне) + Э (эталон).

Працэдура вызначэння ўзроўню засваення матэрыялу заключаецца ў параўнанні адказу студэнта з *эталонам* – узорам зместу і якасці засвоеных ведаў, які адпавядае адукацыйнаму стандарту па вучэбнай дысцыпліне "Этнаграфія Беларусі".

Дзеля больш прадуктыўнай і ўсебаковай індывідуальнай падрыхтоўкі ў вучэбна-метадычным комплексы змешчаны інфармацыйныя дадаткі да канкрэтных тэм вучэбнай праграмы, выкарыстанне якіх у межах самастойнай працы з'яўляецца не толькі пажаданым, але і абавязковым. Для трывалага і глыбокага засваення этнаграфічных катэгорый (паняццяў) і вызначэнняў у структуры вучэбна-метадычнага комплекса змешчаны *слоўнік* усіх асноўных этнаграфічных тэрмінаў.

# МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**1.1. Мэта выкладання дысцыпліны**

Паглыбленае азнаямленне студэнтаў з этнічнай гісторыяй і этнакультурнай спецыфікай Беларусі.

**1.2. Задачы вывучэння дысцыпліны**

1. Вызначыць месца і ролю этнаграфіі Беларусі ў сістэме айчыннай гуманітарыстыкі.
2. Азнаёміць з гісторыяй этнаграфічнага вывучэння Беларусі.
3. Даць характарыстыку асноўных этапаў этнічнай гісторыі Беларусі.
4. Азнаёміць з асноўнымі метадамі палявых этнаграфічных даследаванняў.
5. Скласці ўяўленне пра традыцыйныя гаспадарчыя занятк беларусаў і асноўныя аспекты матэрыяльнай культуры.
6. Даць веды па асаблівасцях грамадскага і сямейнага быту беларусаў у гістарычнай рэтраспекцыі.
7. Азнаёміць з асноўнымі рытуаламі сямейнага і каляндарнага цыклаў.
8. Даць характарыстыку беларускага фальклору, сістэме народных ведаў, уяўленняў і традыцыйных вераванняў.
9. Азнаеміць з гісторыка-этнаграфічным падзелам традыцыйнай культуры Беларусі.
10. Скласці ўяўленне пра паходжанне і этнакультурную самабытнасць нацыянальных меншасцяў Беларусі.

# ВІДЫ ЗАНЯТКАЎ І ФОРМЫ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

| Віды заняткаў, формы кантролю ведаў | Дзённая форма | Завочная форма |
|---|---|---|
| Курс | 1 | 1 |
| Семестр | 2 | 2 |
| Лекцыі, г | 18 | 4 |
| Залікі, г | 2 | 2 |
| Семінарскія, г | 18 | 4 |
| Курсавая работа (семестр / гадзіна) | 2 / 15 | 2 / 15 |
| Самастойная работа студэнта пад кіраўніцтвам выкладчыка | 6 | – |

## Лекцыйны курс

| Назва раздзелаў і тэм лекцый і іх змест | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | Д | З |
| **1. Уводзіны ў этнаграфію Беларусі.**<br>Вызначэнне этнаграфіі, яе месца ў сістэме гуманітарных ведаў. Аб'ект і прадмет этнаграфіі. Этнас і кампаненты этнічнай сістэмы. Этнас і экалогія. Этнаграфічнае рузуменне культуры. Этнічная свядомасць і стэрэатыпы. Этнонімы. Гістарычныя формы этнічных супольнасцяў. Праблемы нацыянальных меншасцяў і міжэтнічных адносін. Крыніцы і метады этнаграфічных даследаванняў. Этнаграфічная класіфікацыя. | 2 | |
| **2. Гісторыя этнаграфічнага вывучэння Беларусі.**<br>Антычныя і візантыйскія аўтары пра старажытнае насельніцтва Беларусі. Этнаграфічныя звесткі ў пісьмовых крыніцах Сярэднявечча (летапісы, хронікі, судовыя справы і інш.), працы і творы Яна Ласіцкага, Міхалона Ліцвіна, М. Гусоўскага як гісторыка-этнаграфічныя крыніцы. Замежныя падарожнікі XV – XVIII стст. пра Беларусь.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Экспедыцыі І. Ляпехіна, У. Севяргіна. Працы А. Меера, З. Даленгі-Хадакоўскага, М. Чарноцкай. Фальклорныя зборнікі Я. Чачота. Этнаграфічныя звесткі ў працах У. Сыракомлі, П. Шпілеўскага, Р. Падбярэскага, Я. Баршчэўскага. Стварэнне Рускага геаграфічнага таварыства і яго роля ў этнаграфічным вывучэнні Беларусі.<br>Этнаграфічныя працы М. Анімеле, А. Кіркора, А. Рыпінскага і братоў Тышкевічаў.<br>Этнаграфія Беларусі другой паловы XIX ст: І. Насовіч, П. Бяссонаў, М. Дзмітрыеў, Ю. Крачкоўскі.<br>Рэгіянальны прынцып у этнаграфічных даследаваннях П. Шэйна, У. Дабравольскага, М. Нікіфароўскага, Е. Раманава.<br>Этнаграфія Беларусі ў пачатку XX ст. Новыя накірункі этнаграфічных даследаванняў у працах І. Сербава, А. Сержпутоўскага, М. Доўнар-Запольскага, Я. Карскага.<br>Станаўленне беларускай савецкай этнаграфіі. Працы І. Сербава, А. Сержпутоўскага, А. Шлюбскага, М. Мялешкі, М. Нікольскага. Сувязь этнаграфіі з краязнаўчым рухам 1920-х гг. Этнаграфічнае вывучэнне Зах. Беларусі.<br>Этнаграфія Беларусі ў 1950 – 1980-х гг. Стварэнне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Асноўныя накірункі этнаграфічных даследаванняў. Музей народнай архітэктуры і побыту і музей старажытнабеларускай культуры. Этнаграфія Беларусі на сучасным этапе. | 4 | |
| **3. Этнічная гісторыя Беларусі.**<br>Асноўныя этапы этнічнай гісторыі Беларусі.<br>Даславянскае насельніцтва Беларусі і славянская каланізацыя. Этнічныя супольнасці крывічоў, радзімічаў і дрыгавічаў. Беларусь у складзе ВКЛ: этнакультурны аспект. | 2 | |

| | | |
|---|---|---|
| Структура этнічнай самасвядомасці беларусаў у XIV – XVI стст.<br>Этнічны крызіс сярэдзіны XVII ст. Ператварэнне беларусаў у этнас з няпоўнай сацыяльнай структурай.<br>Умовы фарміравання беларускай нацыі ў XIX – пачатку XX ст. Нацыянальна-вызваленчы рух і змены ў самасвядомасці беларусаў. Нацыянальны ўздым 1910 – 1920-х гг. Беларускі этнас у 1930 – 1980-х гг. Сучаснае становішча і перспектывы развіцця беларускай нацыі. Беларуская дыяспара. | | |
| **4. Традыцыйная матэрыяльная культура і сацыяльная арганізацыя беларусаў.**<br>Традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў. Земляробства, жывелагадоўля, іх рэгіянальная спецыфіка. Традыцыйныя промыслы: рыбалоўства і паляванне, пчалярства і збіральніцтва. Транспартныя сродкі. Традыцыйныя рамёствы: кавальства, ганчарства, дрэваапрацоўка, ткацтва, кушнерства.<br>Паселішча. Тыпы паселішчаў: горад, мястэчка, сяло, вёска, засценак, аколіца, хутар. Сялянская сядзіба. Жылле і гаспадарчыя пабудовы. Рэгіянальныя асаблівасці планіроўкі. Інтэр’ер традыцыйнага жылля і семантыка яго асноўных элементаў.<br>Традыцыйная беларуская кулінарыя: лакальныя і сацыяльныя асаблівасці. Традыцыйнае адзенне: рэгіянальная і сацыяльная спецыфіка. Гісторыка-этнаграфічнае раёнаванне Беларусі.<br>Грамадскі быт. Формы сацыяльнай арганізацыі. Вясковая грамада, яе функцыі і эвалюцыя. Талака. Сябрына. Бонда. Вячоркі. Ігрышчы. Маладзежная субкультура.<br>Сямейны быт. Гістарычныя формы сям’і. Вялікая сям’я. Яе структура, сістэма кіравання, маемасныя адносіны. Малыя сем’і. Сем’і са здольнікамі. Традыцыйная сістэма выхавання. | 4 | 2 |
| **5. Традыцыйная духоўная культура беларусаў.**<br>Рытуалы сямейнага цыклу: радзіны, вяселле, пахаванне. Лакальныя асаблівасці сямейнай абарадавасці.<br>Традыцыйныя каляндарныя рытуалы: Каляды, Гуканне вясны, Саракі, Юр’я, Вялікдзень, Семуха, Купалле, Зажынкі і Дажынкі, Дзяды. Асаблівасці каляндарнай абарадавасці Палесся і Беларускага Падзвіння.<br>Народныя веды: астраномія і касмалогія, медыцына.<br>Фальклор. Каляндарна-абрадавая паэзія. Пазаабрадавы і эпічны фальклор. Малыя жанры фальклору.<br>Народнае музычна-харэаграфічнае мастацтва. Гульні і забавы. Батлейка. Традыцыйнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: яго сімволіка. Традыцыйныя рэлігійныя ўяўленні беларусаў. Дахрысціянскія вераванні, народная дэманалогія. Магічныя практыкі: чарадзейства, знахарства, варажба. Сінтэз паганскіх і хрысціянскіх элементаў у традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. | 4 | 2 |
| **6. Нацыянальныя меншасці і міжэтнічныя адносіны на Беларусі.**<br>Рускія. Гісторыя фарміравання. Рускія-стараверы. Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры.<br>Габрэі. Гісторыя з’яўлення на Беларусі. Асаблівасці гаспадарчых заняткаў і матэрыяльнай культуры. Грамадскі быт. | 2 | |

| | | |
|---|---|---|
| Палякі. Спецыфіка фарміравання групы. Польская мова і культура ў этнічнай гісторыі Беларусі.<br>Татары. Асаблівасці фарміравання групы. Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры.<br>Іншыя нацыянальныя меншасці: украінцы, літоўцы, латышы, немцы ды інш.<br>Традыцыйныя беларускія этнастэрэатыпы. Гістарычныя формы міжэтнічных адносін на Беларусі. Нацыянальна-культурныя аўтаноміі этнічных меншасцяў у БССР у 1920 – 1930-х гг. Сучаснае становішча нацыянальных меншасцяў і міжэтнічных адносінаў. | | |
| **Усяго:** | 18 | 4 |

## Практычныя заняткі

| Назва тэм практычных заняткаў і іх змест | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | Д | З |
| **1. Уводзіны ў этнаграфію Беларусі.**<br>1. Вызначэнне этнаграфіі, яе месца ў сістэме гуманітарных ведаў.<br>2. Этнас і кампаненты этнічнай сістэмы.<br>3. Крыніцы і метады этнаграфічных даследаванняў. | 2 | |
| **2. Гісторыя этнаграфічнага вывучэння Беларусі.**<br>1. Этнаграфічныя звесткі пра Беларусь у эпоху Сярэднявечча.<br>2. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.<br>3. Беларуская савецкая этнаграфія: асноўныя прынцыпы і накірункі даследаванняў.<br>4. Беларуская этнаграфія (этналогія) на сучасным этапе. | 4 | |
| **3. Этнічная гісторыя Беларусі.**<br>1. Раннія этапы этнічнай гісторыі Беларусі (ад старажытнасці да XII ст.)<br>2. Фарміраванне і станаўленне беларускага этнасу.<br>3.Фарміраванне і станаўленне беларускай нацыі: праблемы і гістарычныя перспектывы. | 2 | |
| **4. Традыцыйная матэрыяльная культура і сацыяльная арганізацыя беларусаў.**<br>1. Традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў: гістарычная эвалюцыя і лакальныя асаблівасці.<br>2. Традыцыйныя тыпы паселішчаў і беларускае народнае дойлідства.<br>3. Традыцыйны комплекс адзення і народная кулінарыя беларусаў.<br>4. Грамадскі быт і традыцыйныя формы сацыяльнай арганізацыі ў беларусаў.<br>5. Гістарычныя формы сям'і ў беларусаў.<br>6. Традыцыі народнага выхавання беларусаў. | 4 | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| **5. Традыцыйная духоўная культура беларусаў.**<br>1. Рытуалы сямейнага цыклу: радзіны, вяселле, пахаванне.<br>2. Традыцыйныя каляндарныя рытуалы беларусаў.<br>3. Віды і жанры беларускага фальклору.<br>4. Народныя веды: астраномія і касмалогія, метэаралогія і метралогія, народная медыцына.<br>5. Традыцыйныя рэлігійныя ўяўленні і народная дэманалогія.<br>6. Магічныя практыкі (чарадзейства, знахарства, варажба) у беларускім традыцыйным грамадстве. | 4 | 2 |
| **6. Нацыянальныя меншасці і міжэтнічныя адносіны на Беларусі.**<br>1. Славянскія этнічныя меншасці на Беларусі: гісторыя фарміравання і культурная спецыфіка.<br>2. Габрэі, татары, літоўцы, латышы і інш. этнічныя меншасці Беларусі.<br>3. Сучаснае становішча нацыянальных меншасцяў і міжэтнічныя адносіны на Беларусі. | 2 | |
| **УСЯГО:** | 18 | 4 |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

### Асноўная літаратура


1. Беларуская міфалогія: Энц. слоўнік. – Мн., 2004.
2. Беларускі народны каляндар. – Мн., 1993.
3. Беларусы. Т. 1. Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мн., 1995.
4. Беларусы. Т. 2. Народнае дойлідства. – Мн., 1996.
5. Беларусы. Т. 3. Гісторыя этналагічнага вывучэння. – Мн., 1999.
6. Беларусы. Т. 4. Вытокі і этнічнае развіццё. – Мн., 2001.
7. Беларусы. Т. 5. Сям'я. – Мн., 2001.
8. Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі. – Мн., 2002.
9. Беларусы. Т. 7. Вусная паэтычная творчасць. – Мн., 2004.
10. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. – Мн., 1993.
11. Итс Р. Введение в этнографию. – Л., 1991.
12. Пилипенко М.Ф. Этнография Белоруссии. – Мн., 1981.
13. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – Мн., 2001.
14. Цітоў В.С. Народная спадчына. – Мн., 1995.
15. Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына. – Мн., 1996.
16. Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі. – Мн., 2001.
17. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн., 1989.

## Дадатковая літаратура

18. Агеева Р.А. Страны и народы: происхождение названий. – М., 1990.

19. Арлова Г.П. Беларуская народная педагогіка. – Мн., 1993.

20. Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. – Мн., 1964.

21. Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст. – Мн., 1970.

22. Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. – Мн., 1972.

23. Беларускае народнае адзенне. – Мн., 1975.

24. Беларускае народнае жыллё. – Мн., 1973.

25. Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму. – Мн., 1989.

26. Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. – Мн., 1989.

27. Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. – Мн., 1995.

28. Бядуля З. Жыды на Беларусі. – Мн., 1992.

29. Валодзіна Т.В. Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў. – Мн., 1997.

30. Валодзіна Т.В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. – Мн., 1999.

31. Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии. – Мн., 1993.

32. Вяселле: Абрад. – Мн., 2004.

33. Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. – Мн., 1995.

34. Гринблат М.Я. Белорусы: Очерки происхождения и этнической истории. – Мн., 1968.

35. Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. – Мн., 1980.

36. Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. – Мн., 1998.

36а. Зайкоўскі Э.М. Жыватворныя крыніцы Беларусі. – Мн., 2001.

37. Замовы. – Мн., 1992.

37а. Земляробчы каляндар. – Мн., 2003.

38. Зямля стаіць пасярод свету: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. – Мн., 1996.

39. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. – Мн., 1999.

40. Карнейчык Я.І. Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс. – Мн., 1969.

41. Карскі Я. Беларусы. – Мн., 2001.

42. Каханоўскі Г. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. – Мн., 1984.

43. Кіпель В. Беларусы ў ЗША. – Мн., 1993.
44. Кухаронак Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў канца XIX – пачатку XX стст. – Мн., 1993.
45. Кухаронак Т.І. Маскі ў каляндарнай абрадавасці беларусаў. – Мн., 2001.
46. Лакотка А.І. Бераг вандраванняў, ці адкуль у Беларусі мячэці. – Мн., 1994.
47. Лакотко А.И. Белорусское народное зодчество середины XIX – XX вв. – Мн., 1991.
48. Лакотка А.І. Пад стрэхамі прашчураў. – Мн., 1995.
49. Ляўкоў Э.М. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. – Мн., 1992.
50. Мальдзіс А. І ажываюць спадчыны старонкі. – Мн., 1994.
51. Молчанова Л.А. Материальная культура белорусов. – Мн., 1968.
52. Молчанова Л.А. Очерки материальной культуры белорусов XV – XVIII вв. – Мн., 1981.
53. Нацыянальныя меншасці Беларусі. Зб. навуковых прац. Кн. 1 – 2. – Брэст-Віцебск, 1996.
54. Ненадавец А.М. Сілаю слова: Чорная і белая магія. – Мн., 2002.
55. Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция. – Мн., 1991.
56. Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палессе. – Мн., 2004.
57. Радзік Р. Беларусы: погляд з Польшчы. – Мн., 2002.
58. Садохин А.П., Грушевицкая Т.Г. Этнология. – М., 2000.
59. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. – Мн., 1997.
60. Седов В.В. Восточные славяне в VI – XIII вв. – М., 1982.
61. Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – Мн., 1998.
62. Скир А. Еврейская духовная культура в Беларуси. – Мн., 1995.
63. Сысоў У.М. Беларуская пахавальная абраднасць. – Мн., 1995.
64. Сям'я і сямейны быт беларусаў. – Мн., 1990.
65. Терешкович П. Русские в Беларуси // Неман. – № 6. – 1992. – С. 164 – 176.
66. Терехин С.Ф. Охота в Белоруссии. – Мн., 1986.
67. Урбан П. Да пытання этнічнай прыналежнасці ліцвінаў. – Мн., 1994.
68. Федароўскі М. Люд беларускі: Вяселле. – Мн., 1991.
69. Шпилевский П. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. – Мн., 1992.
70. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. – Мн., 1985.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № тыдня | № тэмы | Назва пытанняў, якія вывучаюцца на лекцыях | Занятки (нумары) | | Наглядныя і метадычныя сродкі навучання | Самастойная работа студэнта | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | практ. | лаб. | | змест | гадз. | |
| 1 | 1 | 1. Вызначэнне этнаграфіі.<br>2. Праблемы нацыянальных меншасцяў і міжэтнічных адносін.<br>3. Крыніцы і метады этнаграфічных даследаванняў. | | | 11, 12, 17, 33, 58 | | | |
| 2 | | | 1 | | 11, 12, 17, 33, 58 | | | |
| 3 | 2 | 1. Этнаграфічныя звесткі пра Беларусь у крыніцах XI – XVIII стст.<br>2. Этнаграфія Беларусі ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. | | | 5, 12, 17, 20, 21, 25, 26, 42, 70 | | | |
| 4 | | | 2 | | 5, 12, 17, 20, 21, 25, 26, 42, 70 | | | |
| 5 | 2 | 3. Беларуская савецкая этнаграфія.<br>4. Беларуская этнаграфія (этналогія) на сучасным этапе. | | | 5, 12, 17, 21, 70 | | | |
| 6 | | | 3 | | 5, 12, 17, 21, 70 | | | |
| 7 | 3 | 1. Перыядызацыя этнічнай гісторыі Беларусі.<br>2. Праблема этнагенезу беларусаў. | | | 6, 12, 13, 17, 18, 34, 40, 41, 43, 55, 57, 60, 67, 70 | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 3. Асаблівасці фармавання беларускай народнасці.<br>4. Беларуская нацыя: праблемы фарміравання і станаўлення. | | | | | | |
| 8 | | | 4 | | 6, 12, 13, 17, 18, 34, 40, 41, 43, 55, 57, 60, 67, 70 | 1. Этнічныя крызісы ў гісторыі Беларусі.<br>2. Нацыянальны ўздым і нацыянальнае Адраджэнне ў пачатку XX ст.<br>3. Сучаснае становішча і перспектывы развіцця беларускай нацыі. | 2 | Апытанне |
| 9 | 4 | 1. Традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў.<br>2. Традыцыйныя тыпы паселішчаў і беларускае народнае дойлідства.<br>3. Беларускае традыцыйнае адзенне. | | | 1, 4, 7, 10, 12, 14, 17, 23, 24, 38, 48, 51, 52, 56, 59, 64, 66 | | | |
| 10 | | | 5 | | 1, 4, 7, 10, 12, 14, 17, 23, 24, 38, 48, 51, 52, 56, 59, 64, 66 | Гістарычна-этнаграфічныя рэгіены Беларусі | 2 | Кантрольная работа |
| 11 | 4 | 1. Грамадскі быт і традыцыйныя формы сацыяльнай арганізацыі ў беларусаў.<br>2. Сям’я і сямейны быт беларусаў.<br>3. Традыцыі народнага выхавання ў беларусаў. | | | 7, 8, 10, 12, 15, 17, 19, 29, 36, 56, 61, 64 | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | | | 6 | | 7, 8, 10, 12, 15, 17, 19, 29, 36, 56, 61, 64 | | | |
| 13 | 5 | 1. Рытуалы сямейнага цыклу: радзіны, вяселле, пахаванне.<br>2. Традыцыйная каляндарная абрадавасць беларусаў. | | | 1,2,8,9,10,12,14,і 17,31,32,37а,41,44,61,63,68 | | | |
| 14 | | | 7 | | 1, 2, 8, 9, 10, 12, 14, 17, 31, 32, 37а, 41, 44, 61, 63, 68 | Віды і жанры беларускага фальклору | 1 | Практыкум |
| 15 | 5 | 1. Сістэма народных ведаў у беларусаў<br>2. Традыцыйныя рэлігійныя ўяўленні і культы ў беларусаў. | | | 1, 27, 30, 36а, 37, 39, 49 | | | |
| 16 | | | 8 | | 1, 27, 30, 36а, 37, 39, 49 | Асаблівасці традыцыйных уяўленняў і вераванняў беларусаў Падзвіння | 1 | Апытанне |
| 17 | | 1. Этнічныя меншасці на Беларусі: гісторыя фарміравання і культурная спецыфіка.<br>2. Сучаснае становішча нацыянальных меншасцяў на Беларусі. | | | 1, 12, 16, 18, 28, 46, 53, 62, 65, 69 | | | |
| 18 | | | 9 | | 1, 12, 16, 18, 28, 46, 53, 62, 65, 69 | | | |

# ТЭМА 1. ЭТНАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ ЯК НАВУКА, ЯЕ ПРАДМЕТ, МЕТАДЫ І ЎЗАЕМАСУВЯЗЬ З СУМЕЖНЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ

**1. Вызначэнне этнаграфіі.**
**2. Аб´ект і прадмет этнаграфіі Беларусі.**
**3. Этнас. Кампаненты этнічнай сістэмы.**
**4. Гістарычныя формы этнічных супольнасцяў.**
**5. Крыніцы і метады этнаграфічных даследаванняў. Класіфікацыя ў этнаграфіі.**
**6. Класіфікацыя ў этнаграфіі.**

## 1.1. Вызначэнне этнаграфіі

Нягледзячы на тое, што этнаграфія з´яўляецца даволі “маладой” навукай, за 150 гадоў яе існавання ўзнікла шмат розначытанняў і блытаніны ў вызначэнні яе зместу і характару. Справа ў тым, што ў сярэдзіне XIX ст., адначасова з этнаграфіяй, ў якасці асобнай дысцыпліны афармляецца таксама і этналогія, якая мела ідэнтычны з этнаграфіяй аб´ект даследвання (народ), і гэта вельмі часта прыводзіла да атаясамлення абодвух накірункаў у навуцы. Разам з тым, неабходна ведаць, што спачатку пад “этнаграфіяй” (ад грэч. “*ethnos*” племя + “*qrapho*” пішу) разумелася апісанне культуры асобных народаў, заснаванае, галоўным чынам, на непасрэдных кантактах з носьбітамі гэтай культуры, у той час, як “этналогія” (ад грэч. “*ethnos*” народ + “*logos*” вучэнне) мела на мэце больш якаснае ў тэарэтычным плане сістэмна-параўнальнае вывучэнне мадэляў і працэсаў у сучасных і зніклых культурах. Прасцей кажучы, калі ў функцыі этнаграфіі ўваходзілі апісанне разнастайных культур і назапашванне этнаграфічных матэрыялаў, то задачай этналогіі было іх тэарэтычнае асэнсаванне.

Справа ўскладнілася і тым, што тэрмін “этнаграфія” трывала замацаваўся за расійскім (савецкім) народазнаўствам і ў XX ст. па ідэалагічных меркаваннях, прынцыпова супрацьпастаўляўся “заходнееўрапейскай буржуазнай этналогіі”. У той жа час у краінах Заходняй Еўропы і ЗША этналогія і этнаграфія сталі разглядацца як неад´емныя часткі больш шырокай дысцыпліны – сацыякультурнай антрапалогіі.

Аднак, памылкова было б меркаваць, што савецкая этнаграфія XX ст., зыходзячы з назвы, заставалася выключна апісальнай, эмпірычнай навукай, а заходняя этналогія займалася толькі распрацоўкай тэарэтычных канцэпцый і мадэляў. На самой справе адбываўся даволі інтэнсіўны метадалагічны дыялог і ўзаемадзеянне паміж рознымі навуковымі школамі.

Разам з тым, тэрмін “этнаграфія” канчаткова “прайграе” права азначаць усю навуку, і ўжо з 1973 г. у назвах міжнародных кангрэсаў выкарыстоўваецца назва “этналагічны”. Такім чынам, тэрмін “этнаграфія” ў айчыннай навуцы – гэта, хутчэй, даніна традыцыі, але не адлюстраванне ўнутранага зместу і метадалагічных прынцыпаў. Маючы гэта на ўвазе, мы можам вызначыць *этнаграфію, як гістарычную навуку, якая даследуе паходжанне і этнічную гісторыю народа, вывучае фарміраванне спецыфічных асаблівасцяў яго культуры, побыту, сацыяльнай арганізацыі і псіхалогіі (ментальнасці).* Пры гэтым, правамоцнай будзе яшчэ адна паралель паміж этнаграфіяй Беларусі і заходнееўрапейскай (асабліва, нямецкамоўнай) этналогіяй, якая выразна падзяляецца на Volkerkunde – накірунак, які займаецца вывучэннем замежных, пераважна былых каланіяльных народаў і на Volkskunde, пад якім разумееццца вывучэнне ўласнага народа. Менавіта апошняму тэрміну і адпавядае этнаграфія Беларусі, у прадметнае поле якой не ўваходзіць вывучэнне замежных этнасаў.

## 1.2. Аб´ект і прадмет этнаграфіі Беларусі

*Аб´ектам* даследавання этнаграфіі Беларусі ў самым шырокім значэнні з´яўляецца ўласна беларускі этнас і яго састаўныя часткі: этнічныя групы (частка этнасу, якая пражывае па-за межамі этнічнай тэрыторыі: беларусы Сібіры, Канады, Аўстраліі і г.д.), этнаграфічныя групы (лакальнатэрытарыяльныя групы, што адрозніваюцца асаблівасцямі традыцыйнай культуры, асабліва ва ўмовах феадальнага грамадства: пінчукі, тураўляне, палачане і інш.). Пры гэтым этнас, як аб´ект даследавання выступае не як статычная адзінка, але як дынамічная сістэма і разглядаецца на ўсіх этапах гістарычнага развіцця і ў гістарычнай перспектыве.

*Прадметам* этнаграфіі выступае культура народа і пераважна тая яе частка, якая ўвасабляе этнічную самабытнасць і спецыфіку. Іншымі словамі, размова ідзе пра так званую “традыцыйную” (народную) культуру, якая характарызуецца найбольшым кансерватызмам і гістарычнай устойлівасцю (народная кулінарыя, дойлідства, абрадавасць, фальклор і інш.). Акцэнтаваная ўвага этнографаў менавіта да “традыцыйнай” культуры зяўляецца невыпадковай і з тае прычыны, што ва ўмовах індустрыяльнага / постіндустрыяльнага (гарадскога) грамадства адбываецца імклівая глабалізацыя, стандартызацыя і ўніфікацыя соцыякультурнага быцця з адначасовым сціраннем этнічных адметнасцяў у сферы культуры. Так, да прыкла-

ду, бессэнсоўна шукаць этнічную спецыфіку ў сучасных камп'ютэрных сістэмах і інфармацыйных тэхналогіях, як і немагчыма знайсці чалавека, што асвятляў бы сваю кватэру з дапамогай лучыны, а не электрычнасці.

Такім чынам, *наданне асноўнай увагі вывучэнню спецыфічных асаблівасцяў культуры і побыту народа і складае сутнасць этнаграфічнага разумення культуры.* Гэта зусім не азначае, што этнаграфія ігнаруе рысы культуры, агульныя з іншымі народамі. Бо, менавіта разгляд спецыфічна-асаблівага, што вылучае этнас сярод іншых, у спалучэнні з вывучэннем агульнага, што аб´ядноўвае гэты народ з іншымі, дазваляе стварыць найбольш поўны і навукова аб´ектыўны вобраз этнічнай культуры. “Культура”, як спецыфічная катэгорыя, уласцівая толькі для жыццядзейнасці чалавечай супольнасці, мае мноства вызначэнняў у разнастайных гуманітарных дысцыплінах. *Этнаграфія пад культурай этнаса разумее сукупнасць з´яў і аб´ектаў матэрыяльнага і духоўнага жыцця, а таксама сацыяльныя нормы, выпрацаваныя ў межах пэўнага этнасу, якія з’яўляюцца для яго спецыфічнымі і адрозніваюць ад іншых этнасаў.* Прыведзенае вызначэнне з´яўляецца вельмі ёмістым і шырокім, каб дакладна вызначыць прадмет этнаграфіі. Таму “разгарнём” асноўнае прадметнае поле этнаграфіі больш маштабна. Так, да актуальных праблем сучаснай беларускай этнаграфіі можна аднесці наступныя:

– *гісторыя этнаграфічнага вывучэння Беларусі* (даследуе гісторыю назапашвання этнаграфічных крыніц і ведаў пра Беларусь, асноўныя тэндэнцыі і накірункі ў этнаграфічным вывучэнні Беларусі, як у мінулым, так і на сучасным этапе);

– *этнічная гісторыя Беларусі* (дазваляе даць этнічную характарыстыку насельніцтва Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі, прасачыць моўныя змены, працэсы культурнага ўзаемадзеяння, фармаванне этнічнай свядомасці; даследуе праблемы этнагенезу беларусаў, фармавання беларускай народнасці і нацыі);

– *гісторыя традыцыйных форм гаспадаркі і матэрыяльнай культуры* (даследуе ўзнікненне і спецыфіку развіцця вытворчых форм гаспадаркі, месца і ролю промыслаў і рамёстваў на розных этапах этнічнай гісторыі Беларусі; генезіс і асаблівасці народнага дойлідства і г.д.);

– *традыцыйная духоўная культура* (сістэмнае вывучэнне ўсёй жанравай разнастайнасці беларускага фальклору, комплекса народных ведаў, народнай медыцыны, асаблівасцяў архаічнага светапогляду, міфалагічных уяўленняў і вераванняў);

– *этнічная антрапалогія* (даследуе антрапафізічнае развіццё беларусаў);

– *этнічная псіхалогія* (разглядае пытанні фармавання этнічных стэрэатыпаў, этнічнай самасвядомасці і ідэнтыфікацыі);

– *сучасныя этнічныя працэсы* (адна з найбольш актуальных і недастаткова распрацаваных тэм у беларускай этнаграфіі, якая павінна ахарактарызаваць этна-сацыяльныя працэсы ў сучасным беларускім горадзе і вёсцы);

– *гісторыя этнічных меншасцяў Беларусі* (даследуе гісторыю іх з′яўлення на Беларусі, культурныя асаблівасці, характар міжэтнічнага ўзаемадзеяння з беларусамі);

– *этнапедагогіка* (вывучае асаблівасці выхаваўчага і адукацыйнага працэсу ў беларусаў).

Пазначаныя праблемы, безумоўна, не вычэрпваюць ўсё прадметнае поле беларускай этнаграфіі. Тым больш, што развіццё навукі, яе метадалогіі, актыўнае міждысцыплінарнае ўзаемадзеянне практычна кожны год адкрываюць новыя накірункі для этнаграфічных даследаванняў.

## 1.3. Этнас. Кампаненты этнічнай сістэмы

*Этнас – устойлівая супольнасць людзей, якая гістарычна склалася на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, культуры, побыту, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання.*

Паколькі этнас з′яўляецца асноўным аб′ектам даследавання этнаграфіі і яе галоўнай катэгорыяй, неабходна ведаць асноўныя кампаненты этнічнай сістэмы, без якіх этнас, альбо не можа існаваць увогуле, альбо аказваецца нежыццяздольным.

Базавай умовай існавання любога этнасу з′яўляецца тэрыторыя яго пражывання. *Этнічная тэрыторыя – гэта тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа, з якой цесна звязаны яго этнагенез і этнічная гісторыя.* Этнічная тэрыторыя характарызуецца значнай устойлівасцю на працягу многіх стагоддзяў, але пры гэтым практычна ніколі не супадае з тэрыторыяй палітычнай (дзяржаўнай). Так, напрыклад, беларуская этнічная тэрыторыя, межы якой былі вызначаны навукоўцамі (Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі) паводле моўных, культурных асаблівасцяў і самасвядомасці мясцовага насельніцтва яшчэ ў пачатку XX ст., далёка не цалкам увайшла ў

склад БССР. У сувязі з неспрыяльнымі палітычнымі абставінамі па-за межамі беларускай дзяржавы апынуліся беларусы Паўднёвай Пскоўшчыны, Заходняй Смаленшчыны, Беласточчыны, Віленшчыны, Латгаліі, якія, з цягам часу, былі амаль цалкам асіміляваны (Пскоўшчына, Смаленшчына), альбо набылі статус этнічнай меншасці ў краіне свайго пражывання (Польшча, Літва).

Асаблівасці прыроднага асяродка, які складае этнічную тэрыторыю, аб΄ектыўным чынам уплываюць як на матэрыяльную (спецыфічныя формы гаспадаркі, промыслы, паселішчы і г.д.), так і на духоўную (адлюстраванне знакавых элементаў прыроды ў мове, фальклоры, вераваннях) культуру. На вышэйшай стадыі развіцця этнаса шэраг вобразаў "роднай прыроды" набываюць статус нацыянальных сімвалаў, з'яўляюцца, свайго рода, "візітнай карткай" народа і краіны (як, напрыклад, для беларусаў – бусел, зубр, белавежская пушча).

З другога боку, і этнас у выніку гаспадарчай дзейнасці пераўтварае навакольнае прыроднае асяроддзе у так званы "культурны ландшафт" (паселішчы, палеткі, дарогі і інш.). Але, калі на ўзроўні традыцыйнай (аграрнай) супольнасці, ва ўмовах панавання міфапаэтычнага светапогляду, які разглядаў прыроду як ажыватвораную і адухоўленую, гаспадарчая дзейнасць людзей яшчэ не парушала экалагічнай стабільнасці і раўнавагі, то на сучасным этапе праблема *экалогіі этнасу* паўстала вельмі востра. Экалагічны крызіс выкліканы не толькі імклівымі тэмпамі росту прамысловасці і шырокім выкарыстаннем штучных матэрыялаў, але, перш за ўсё, спажывецкім стаўленнем людзей да прыроды, калі апошняя ўжо не ўспрымаецца як раўнапраўны партнёр чалавека ў ягоным быцці, а выступае ў якасці мёртвай крыніцы сыравіны для гаспадарчай дзейнасці. Падобная экалагічная палітыка з'яўляецца крызіснай для самога этнасу, паколькі забруджванне (хімічнае, радыяктыўнае і г.д.) навакольнай прыроды вядзе не толькі да канчатковага знікнення шматлікіх відаў флоры і фауны, але непасрэдным чынам (рост злаякасных захворанняў, мутацыі, скарачэнне працягласці жыцця) падрывае генафонд народа. Такім чынам, на сённяшні дзень надзвычай актуальным і важным з'яўляецца не толькі распрацоўка дасканалых прыродаахоўных тэхналогій, але і вывучэнне традыцыйнага народнага вопыту прыродакарыстання, з далейшым яго выкарыстаннем на ўсіх узроўнях адукацыі і выхавання.

Найбольш важным кампанентам этнічнай сістэмы, які факусуе практычна ўсе адметныя рысы этнасу, з'яўляецца *культура* (пра яе этнавызна-

чальныя функцыі глядзі вышэй), якую прынята падзяляць на матэрыяльную і духоўную. *Матэрыяльная культура – аб'екты, створаныя чалавекам, якія матэрыяльна існуюць у прасторы ў пэўны часавы прамежак* (прылады працы, жытло і гаспадарчыя пабудовы, зброя, адзенне, упрыгожанні, а таксама культурныя расліны і ахатненыя жывёлы).

*Духоўная культура – прадукт дзейнасці калектыўнай (індывідуальнай) свядомасці і розуму.* У межах духоўнай культуры адрозніваюць тры раздзелы: рэлігія (вераванні); мастацтва; веды. Кожны з раздзелаў адыгрываў большую ролю на пэўным этапе гістарычнага развіцця. Так, для чалавека Сярэдневечча рэлігія мела непамерна большае значэнне, чым для нашага сучасніка, для якога прыярытэтным з'яўляецца атрыманне высокапрафесійных ведаў.

Аднак, трэба ўлічваць, што прыведзеная класіфікацыя культуры – вынік знешняй, навуковай класіфікацыі, у той час, як у народным успрыняцці культура мела сінкрэтычны (злітны) характар. Напрыклад, будаўніцтва хаты ў XIX ст. абавязкова суправаджалася разнастайнымі варожбамі і магічнымі дзеяннямі, а выкананне абрадавых песень павінна было забяспечыць добры ўраджай.

У фармаванні любой этнічнай культуры надзвычай важную ролю адыгрывае *мова этнасу*, якая, перш за ўсё, спрыяе пачуццю групавой ідэнтычнасці. Агульная мова падтрымлівае высокі ўзровень кансалідацыі этнічнай супольнасці, у першую чаргу, дзякуючы ўзаемаразуменню. Мова ўвасабляе агульныя веды людзей пра свае традыцыі, у ёй апасродкавана матэрыялізуецца гістарычная памяць народа. І нарэшце, мова – гэта складаная знакавая сістэма, з дапамогай якой адбываецца дыяхронная (міжпакаленная) і сінхронная (у межах аднаго пакалення) перадача інфармацыі, якая захоўвае калектыўны вопыт этнасу.

У выпадку частковай ці поўнай моўнай асіміляцыі народа (беларусы, валійцы, ірландцы), этнічная культура губляе не толькі свой непаўторны каларыт, але страчвае значныя магчымасці для творчай самарэалізацыі.

Важнейшым кампанентам этнічнай сістэмы з´яўляецца *этнічная самасвядомасць – усведамленне людзьмі сваёй прыналежнасці да пэўнага этнасу.* У шэрагу выпадкаў, калі моўная ідэнтычнасць народа парушана (напрыклад, валійцы, шатландцы), менавіта этнічная самасвядомасць пачынае адыгрываць яскравую этнавызначальную ролю. На розных гістарычных стадыях развіцця беларусаў этнічная самасвядомасць выяўлялася неаднолькава. Да прыкладу, у эпоху феадалізму прадстаўнікі розных саслоў-

яў усведамлялі сваю прыналежнасць па-рознаму. Этнічная свядомасць пануючых класаў часта замянялася саслоўнай самасвядомасцю (“шляхецкі народ”), у простага люду – лакальна-тэрытарыяльнай (палешукі), зямляцкай (палачане, тураўцы), так званай, этнацэнтрычнай (тутэйшыя), канфесіянальнай (людзі “рускай”(праваслаўнай) ці “польскай” (каталіцкай) веры). Агульнабеларуская этнічная самасвядомасць становіцца толькі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. і практычна супадае з часам складвання беларускай нацыі, пра што сведчыць пашырэнне на ўсю тэрыторыю краіны этноніма беларусы.

Негледзячы на тое, што этнонім – вонкавая праява этнічнай самасвядомасці, вылучаюць іх 2 асноўных тыпы. Пад *эндаэтнонімам* разумеецца саманазва народа; яна характарызуецца найбольшай гістарычнай устойлівасцю і трываласцю. *Экзаэтнонім* – назва, дадзеная народу іншымі, як правіла суседнімі этнасамі, якая можа абсалютна не супадаць з саманазвай канкрэтнага этнасу. Да прыкладу, этнас, што мае эндаэтнонім “дойч”, па-беларуску называецца “немцы”, па-італьянску – “тэдэско”, па-сербску – “швабы”.

Апрача пазначаных дзвюх асноўных катэгорый у этнаграфіі выкарыстоўваецца і такі тэрмін як *палітонім* (ад грэч. “*politeia*” дзяржава + “*ђnyma*” імя) – назва народаў паводле іх дзяржаўна-палітычнай прыналежнасці (“ліцвін” – выхадзец з Вялікага княства Літоўскага; “маскаль” – прадстаўнік Маскоўскага княства і г.д.). На сучасным этапе вельмі часта палітонім супадае з этнонімам (жыхар Беларусі – беларус).

*Канфесіёнім* – назва групы насельніцтва па яе рэлігійнай прыналежнасці; у наш час бытуе, як правіла, сярод веруючага вясковага насельніцтва.

Паколькі этнасы не жывуць адасоблена адзін ад аднаго, для іх характэрна ўзаемадзеянне (культурнае, эканамічнае і інш.), у выніку якога складваюцца *этнічныя стэрэатыпы – суб’ектыўныя, максімальна абагульненыя, эмацыйна афарбаваныя, але пры гэтым устойлівыя вобразы пэўных этнасаў ці іх частак*. Так, ужо аксіёмай сталі агульныя ўяўленні пра немцаў, як добрых і мужных воінаў, спраўных работнікаў і пунктуальных людзей. Латышы, што жылі ў XIX ст. на тэрыторыі беларускага Падзвіння, характарызаваліся як увішныя гаспадары, але злосныя чараўнікі. Як правіла, этнічным стэрэатыпам спадарожнічаюць і *псеўдаэтнонімы* (этнічныя мянушкі), якія атрымлівае этнас ад суседніх народаў за нейкі спецыфічны элемент сваёй культуры. Так, у кулінарным ключы разглядаюцца французы (“лягушатнікі”), беларусы (“бульбашы”) і італьянцы (“макароннікі”).

## 1.4. Гістарычныя формы этнічных супольнасцяў

Маючы справу з этнасамі, этнаграфія паказвае карціну гістарычнай эвалюцыі ад аднаго тыпу супольнасці да другога, даючы на пэўным этапе гістарычнага развіцця асобную назву. Агульнапрынятымі з'яўляюцца: племя, народнасць, нацыя.

*Племя* – першая этнічная супольнасць у гісторыі чалавецтва, узнікшая ў першабытную эпоху (эпоху развітага родавага грамадства). Спачатку складалася з некалькіх экзагамных родаў і груп, і валодала найбольшай устойлівасцю, максімальным адзінствам мовы і культуры.

*Народнасць* першая этнічная супольнасць класавага грамадства, якая ўзнікла на аснове змешвання і зліцця розных плямёнаў, аб'яднаных не толькі па кроўна-сваяцкіх прыкметах, але і па тэрытарыяльна-суседскіх. Была ўласціва рабаўладальніцкаму і феадальнаму ладу. У працэсе складвання народнасці вялікую ролю адыгрывалі адзіная дзяржаўнасць, этнагенетычная роднасць насельніцтва, што спрыяла фарміраванню агульнай этнічнай тэрыторыі, мовы, самасвядомасці, пэўнага культурнага і эканамічнага адзінства.

На Беларусі працэс фарміравання народнасці пачаўся ў канцы І тыс. н.э. з пераходам славяна-балцкага насельніцтва ад першабытнаабшчыннага ладу да феадальных адносін. Быў звязаны з этнакансалідацыйнымі працэсамі ў Полацкім княстве, насельніцтва якога характарызавалася агульнай этнічнай самасвядомасцю (этнонім палачане), моўным адзінствам, падабенствам культуры.

Трэба адзначыць, што тэрмін "народнасць" з'явіўся ў савецкай гістарычнай навуцы ў 1940-х гг. і не мае аналагаў у замежных аўтараў, якія выкарыстоўваюць тэрмін "народ" ("*gens*"), у яго сярэдневечным разуменні.

*Нацыя* – на сённяшні дзень вышэйшая форма этнічнай супольнасці людзей, гістарычна склаўшаяся ў індустрыяльную эпоху на базе зліцця ранніх форм родных ці не родных этнічных супольнасцяў (плямён, народнасцяў). Кожная нацыя абавязкова мае ўласны механізм трансляцыі этнакультурнай інфармацыі. Ён уключае народную асвету, мастацкую культуру і сродкі масавай інфармацыі, якія выкарыстоўваюць уніфікаваны сродак зносін – навукова апрацаваную, кадыфікаваную літаратурную мову. Уздзеянне нацыянальнага камунікатыўнага механізму прыводзіць да распаўсюджвання агульнаэтнічнай нацыянальнай самасвядомасці, якая арыентуе сваіх носьбітаў пераважна на культурныя каштоўнасці сваёй нацыі.

Аднак, гарантам паўнавартаснага функцыянавання нацыянальнага камунікатыўнага механізму і нацыі ўвогуле можа быць толькі нацыянальная дзяржава.

Пры гэтым, любая нацыянальная дзяржава не можа быць монаэтнічнай. У той ці іншай ступені ў ёй прысутнічаюць этнічныя меншасці (напрыклад, у Беларусі: рускія, палякі, татары, літоўцы і інш.), што ў сваю чаргу спараджае праблему *міжэтнічных адносін*. Праблема заключаецца менавіта ў характары ўзаемаадносін *тытульнай нацыі* (этнас, які мае сваё дзяржаўнае ўтварэнне, што носіць яго імя) і *этнічных меншасцяў* (пэўная этнічная супольнасць, што пражывае на тэрыторыі іншанацыянальнай дзяржавы і якая захоўвае сваю этнічную самабытнасць і спецыфічныя традыцыйныя рысы культуры, усведамляе свае адрозненні і прылічвае сябе да самастойнай этнічнай групы).

Негледзячы на тое, што Беларусь характарызуецца адсутнасцю міжэтнічных канфліктаў (існуе так званы міжэтнічны кансэнсус), а тэорыя міжэтнічнай камунікацыі і канфліктаў намі разглядаецца ў рамках курса "Этналогія", варта яшчэ раз прыгадаць тыя правілы, выкананне якіх дапаможа пазбегнуць напружанасці і непаразумення паміж прадстаўнікамі розных этнасаў:

1. Ведаць сімволіку і культуру свайго ўласнага этнасу.
2. Ведаць камунікатыўную сімволіку чужога народа.
3. Разумець, што ўсе этнічныя культуры роўныя паміж сабой.
4. Паспрабаваць убачыць свет чужымі вачыма пры захаванні каштоўнасцяў сваёй этнічнай супольнасці.

## 1.5. Крыніцы і метады этнаграфічных даследаванняў. Класіфікацыя ў этнаграфіі

Як і для любой гістарычнай дысцыпліны *пісьмовыя крыніцы* з'яўляюцца аднымі з важнейшых і для этнаграфіі. Увесь іх корпус цяжка пералічыць: летапісы, хронікі, гродскія кнігі, нататкі замежных падарожнікаў, шляхецкія дыярыюшы (дзённікі) і гэтак далей – усе яны даюць этнографу магчымасць зазірнуць у часы Сярэдневечча, калі этнаграфічныя даследванні яшчэ папросту не праводзіліся, а інфармацыя пра гаспадарку, побыт, матэрыяльную і духоўную культуру (асабліва сялянства) трапляла на ста-

ронкі тэкстаў хутчэй выпадкова, чым заканамерна. У гэтай сувязі этнограф павінен мець на ўвазе:

а) свядомасць сярэдневечнага чалавека не адпавядае сучаснай і перад тым, каб спрабаваць тлумачыць матывацыі яго ўчынкаў і дзеянняў неабходна разабрацца ў адметнасцях тагачаснага светапогляду;

б) меркаванне сярэдневечнага аўтара магло быць суб’ектыўна-скажоным па палітычных, сацыяльных, этнічных і іншых прычынах.

Адсюль праца з пісьмовымі крыніцамі патрабуе ад этнографа не толькі вытрымкі (часам матэрыял, які зацікавіў даследчыка, можа быць дысперсна раскіданы на тысячах старонак самых разнастайных дакументаў), але і навуковай аб’ектыўнасці і крытычнасці.

Значнай крыніцай могуць стаць і этнаграфічныя *музейныя калекцыі*. Гэта тлумачыцца тым, што музейныя зборы могуць даць значна больш інфармацыі этнографу пра пэўныя элементы матэрыяльнай культуры беларускай вёскі канца XIX – пачатку XX стст., якія ў сучаснасці ўжо не бытуюць.

Аднак самай важнай крыніцай для этнаграфіі з’яўляюцца *матэрыялы палявых даследаванняў,* якія фіксуюцца ў выніку экспедыцыі. Вылучаюць некалькі форм палявых этнаграфічных даследаванняў.

Найбольш эфектыўнай лічыцца *стацыянарная экспедыцыя*, калі даследчык працяглы тэрмін пражывае ў вывучаемым асяродку. Пры гэтым тэрмін стацыянарнай працы павінен быць не меншым за адзін этнаграфічны год, які па сваёй працягласці павінен на 2 – 3 месяцы перавышаць каляндарны. 2 – 3 месяцы прызначаны для знаёмства і адаптацыі да новых умоў, пасля чаго этнограф назірае жыццё супольнасці ва ўсе перыяды гадавога цыклу.

*Сезонная экспедыцыя* менш эфектыўная за папярэднюю, паколькі абмежавана па часе і не дае магчымасці дэтальна і ўсебакова азнаёміцца з культурай і бытам мясцовага насельніцтва.

Тэхніка палявой даследчыцкай працы таксама можа быць разнастайнай.

Адным з відаў палявога даследавання можа быць *метад непасрэднага назірання*, калі этнограф асабіста назірае за заняткамі, побытам ці святамі людзей. Недахопам гэтага метада з’яўляецца тое, што даследчык можа суб’ектыўна тлумачыць тыя ці іншыя з’явы народнай культуры, паколькі сам не з’яўляецца яе носьбітам. Да таго ж, этнограф павінен праяўляць максімум тактоўнасці да мясцовых традыцый, бо, напрыклад, яго прысутнасць на вяселлі ці пахаванні без запрашэння, можа быць успрынята негатыўна ці нават варожа.

Найбольш важным і інфарматыўным метадам палявога даследавання з’яўляецца *апытванне мясцовага насельніцтва*. Аднак, ад этнографа выка-

рыстанне гэтага метада патрабуе даволі значнага практычнага і тэарэтычнага вопыту. Якое, каму і як задаць пытанне – гэтыя тры правільна падабраныя кампаненты даюць значны эффект у размове з рэспандэнтам. Вельмі раіцца пры апытванні выкарыстоўваць аудыё-фота-відэафіксацыю, што дазваляе захоўваць усю паўнату і дакладнасць атрыманай інфармацыі, а таксама перадаваць асаблівасці культурнага кантэксту (рэспандэнт, сядзіба, вёска), дзе яна была запісаная.

Яшчэ адзін метад – *збор этнаграфічных калекцый* (тыповыя для даследуемай тэрыторыі ўзоры матэрыяльнай культуры: ручнікі, посуд, прылады працы і г.д.). Буйныя матэрыяльныя комплексы (сядзіба, млын, могільнік) фіксуюцца з дапамогай фота-відэатэхнікі альбо замалёўваюцца. (Дадатак 1).

Безумоўна, велізарнае значэнне для развіцця этнаграфіі маюць дадзеныя іншых навук.

*Фізічная антрапалогія* дае каштоўныя звесткі пра змяненне фізічнага аблічча людзей у выніку культурна-гістарычнага працэсу, антрапалагічны склад этнасаў і іх асобных частак.

*Параўнальнае мовазнаўства* праводзіць параўнаўчы аналіз лексікі розных моваў, тым самым высвятляючы ступень іх роднасці.

*Археалогія* істотна дапамагае вывучаць дапісьмовы перыяд гісторыі этнаса; гаспадарчыя заняткі, эвалюцыю жытла і прылад працы, акрэслівае арэалы рассялення этнічных адзінак, вызначае іх культурную адметнасць.

*Фальклярыстыка*, даследуючы вусна-паэтычную творчасць народа, дае каштоўны матэрыял пра глыбіню так званай фальклорнай памяці, асаблівасці традыцыйнага светапогляду, які неапасродкавана адлюстраваўся ва ўсіх жанрах фальклора.

*Псіхалогія*, калі прадметам яе даследавання становіцца этнас, фарміруе міжпрадметную вобласць ведаў – *этнапсіхалогію*, якая даследуе этнічныя асаблівасці псіхікі людзей, нацыянальнага характару, этнічнай самасвядомасці і этнічнай самаідэнтыфікацыі.

Сацыялогія, філасофія, культурантрапалогія, геаграфія, педагогіка – гэта далёка не поўны пералік дысцыплін, якія не толькі даюць каштоўную інфармацыю этнографу, але ўсё часцей і часцей выступаюць як раўнапраўныя партнёры з этнаграфіяй у рамках перспектыўных міждысцыплінарных даследаванняў.

## 1.6. Класіфікацыя ў этнаграфіі

Колькасць больш-менш вывучаных, а дакладней, вядомых этнаграфіі этнічных супольнасцяў вагаецца ў межах 2,2 – 2,4 тыс. Паколькі кожны этнас з'яўляецца аб'ектам навуковага даследавання, этнаграфія павінна была выпрацаваць пэўную сістэму навуковай класіфікацыі этнасаў.

Для розных мэт, для рознай ступені паўнаты карціны этнічнага складу свету сучасная этнаграфія выкарыстоўвае чатыры тыпы класіфікацый: геаграфічную, антрапалагічную, гаспадарча-культурную і лінгвістычную.

*Геаграфічная* класіфікацыя грунтуецца на тым аб'ектыўным факце, што этнасы расселены ў пэўных частках айкумены і зоны іх рассялення знаходзяцца ў межах рэгіёнаў, вядомых па геаграфічных дадзеных.

Галоўным тэрмінам геаграфічнай класіфікацыі з'яўляецца *гісторыка-этнаграфічная вобласць* – тэрыторыя, у насельніцтва якой на глебе сацыяльна-эканамічнай агульнасці, працяглых сувязяў і ўзаемаўплываў узніклі падобныя культурна-бытавыя (этнаграфічныя) асаблівасці. Вылучаюць малыя, сярэднія і вялікія гісторыка-этнаграфічныя вобласці (ГЭВ). Малая ГЭВ, як правіла, ахоплівае адносна невялікую тэрыторыю, насельніцтва якой характарызуецца максімальным падабенствам этнаграфічнага плану (напрыклад, Прыбалтыка). Сярэдняя ГЭВ займае большую прастору, але і падабенства ў культуры народаў, што яе населяюць не такое вялікае (напрыклад, Сярэдняя Азія). Ну і нарэшце, вялікія ГЭВ, якія, як правіла, супадаюць з часцінамі Свету (Афрыка, Азія і г.д.), вылучаюцца толькі намінальным ці мінімальным падабенствам у культуры народаў. Трэба адзначыць, што геаграфічная класіфікацыя не ў стане паўнаварта апісаць этнас, таму павінна дапаўняцца іншымі класіфікацыямі.

На рэальна існуючых адрозненнях заснавана і *антрапалагічная класіфікацыя*, якая мае справу як з вялікімі, малымі расамі, так і з антрапалагічнымі тыпамі. Інфармацыйны ўзровень антрапалагічнай класіфікацыі, калі яна адыходзіць ад агульнага падзелу народаў на вялікія расы і звяртае ўвагу на фізічныя асаблівасці антрапалагічных тыпаў, вышэй, чым у геаграфічнай класіфікацыі.

*Лінгвістычная класіфікацыя*, якая ў розных аспектах вывучае моўную разнастайнасць народаў свету, падзяляецца на класіфікацыю *марфалагічную* і *генеалагічную*. Першая карыстаецца параўнальна-супастаўляльным метадам і даследуе мовы ў незалежнасці ад іх роднасці, сістэматызуючы ў групы марфалагічна (структурна) падобныя мовы. Генеалагічная класіфікацыя сістэматызуе мовы паводле ступені іх роднасці, што вельмі важна, паколькі роднасць моў указвае і на роднасць носьбітаў гэтых моў.

Уласна этнаграфічнай з'яўляецца *гаспадарча-культурная класіфікацыя*, якая звяртае ўвагу менавіта на культурна-бытавыя міжэтнічныя адрозненні, якія сфармаваліся ў выніку гаспадарчай дзейнасці людзей у канкрэтных геакліматычных умовах. Асноўным тэрмінам гэтай класіфікацыі з'яўляецца *"Гаспадарча-культурны тып" (ГКТ)* – пэўны комплекс асаблівасцяў гаспадаркі і культуры, якія склаліся ў розных народаў, што знаходзяцца на адным узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця і ў падобных прыродных умовах.

Вылучаюць тры асноўных ГКТ:

– паляўнічых, збіральнікаў і рыбаловаў;

– ручных земляробаў і жывёлаводаў;

– ворных земляробаў.

Асноўныя ГКТ маюць мноства падтыпаў у залежнасці ад канкрэтнай прыроднай зоны (напрыклад, паляўнічыя лясной зоны і паляўнічыя і рыбаловы палярнай зоны).

## Асноўная літаратура

1. Итс Р.Ф. Введение в этнографию. – Л., 1991.

2. Пилипенко М.Ф. Этнография Белоруссии. – Мн., 1981.

3. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989.

## Літаратура для паглыбленага вывучэння тэмы

4. Агеева Р.А. Страны и народы: происхождение названий. – М., 1990.

5. Бромлей Ю. Этнос и этнография. – М., 1973.

6. Бромлей Ю. Очерки теории этноса. – М., 1983.

7. Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. – Мн., 1995.

8. Садохин А.П., Грушевицкая Т.Г. Этнология. – М., 2000.

9. Этнография восточных славян: Очерки традиционной культуры. – М., 1987.

# ТЭМА 2. ГІСТОРЫЯ ЭТНАГРАФІЧНАГА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСІ

**1. Этнаграфічныя звесткі пра Беларусь ў IX – XVIII стст.**

**2. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.**

**3. Развіццё беларускай этнаграфіі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.**

**4. Беларуская савецкая этнаграфія.**

**4.1. Беларуская этнаграфія ў 1920 – 30-я гг.**

**4.1. Беларуская савецкая этнаграфія 1950 – 1980-х гадоў.**

**4.2. Беларуская этналогія на сучасным этапе.**

## 2.1. Этнаграфічныя звесткі пра Беларусь ў IX – XVIII стст.

Першыя напаўлегендарныя звесткі пра старажытнае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі прыводзіць яшчэ “бацька гісторыі” Герадот (V ст. да н.э.), які пісаў пра балоцістую краіну Неўрыду (атаясамліваецца з тэрыторыяй беларускага Палесся), дзе жыве загадкавы народ неўраў, што мае за звычай некалькі раз на год перакідвацца ў ваўкоў. Гэтыя ж звесткі падцвярджалі Пліні, Дыянісі, Эфар і шэраг іншых антычных аўтараў. Быць можа ў гэтых паведамленнях і ёсць доля ісціны, бо яшчэ ў XIX ст. на беларускай этнічнай тэрыторыі ўяўленні пра ваўкалакаў былі вельмі шырока распаўсюджаны. Але па сапраўднаму першыя этнаграфічныя звесткі пра старажытнае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі з’яўляюцца толькі ў канцы І тыс. н.э., разам з пачаткам усходнеславянскага летапісання. Так, аўтар “Аповесці мінулых часоў” даволі падрабязна характарызуе этнічныя супольнасці (крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў), што рассяліліся на тэрыторыі Беларусі, пазначае арэалы іх пражывання, адзначае іх этнакультурную адметнасць: “Усе гэтыя плямёны мелі свае звычаі, і законы сваіх бацькоў і паданні, і кожныя – свой нораў”. Разам з тым, неабходна мець на ўвазе, што кіеўскі летапісец свядома прыніжаў узровень культурнага развіцця ўсходнеславянскіх плямён (“жылі звярыным звычаям”), пакідаючы ў шэрагу “культурных” народаў толькі палян, якія якраз і насялялі кіеўшчыну.

Пэўную этнаграфічную інфармацыю ўтрымліваюць павучэнні епіскапа Кірылы Тураўскага. Так, ён са скрухай адзначае, што насельніцтва Тураўшчыны XII ст. аддае перавагу не малітвам, але “гусельнікам”, “сапельнікам” (выканаўцы на духавых інструментах) і “плясанью”. Асабліва абурала епіскапа шырокае распаўсюджанне “вълхваниа”, “чародеяния” і вера людзей у розныя знакі і прыкметы.

Аднак раннесярэдневечныя літаратурныя помнікі ўтрымлівалі толькі крупіцы этнаграфічнага матэрыялу.

Сітуацыя прынцыпова мяняецца ў часы Рэнесанса, калі чалавек з яго ідэаламі і праблемамі становіцца цэнтральнай каштоўнасцю эпохі.

Славуты твор Міколы Гусоўскага "Песня пра зубра" (1523 г.) ўжо літаральна насычаны каштоўнымі гістарычна-этнаграфічнымі звесткамі. Тут мы знаходзім не толькі падрабязнейшае апісанне правілаў, прыёмаў і этыкі палявання на старабеларускіх землях, але і першую згадку пра дзейнасць інквізіцыі, прынцыпы выкрыцця народам ведзьмакоў і механізм пакарання іх. Сустракаем у паэме і этнастэрэатыпы тых часоў, і здзіўленне самога аўтара ўсеабдымным бытаваннем знахарства: "Часта з трывогаю думаеш: чым растлумачыць сілу, што ў нас надаецца замовам і травам, песні і магіі слова? Адказу не знойдзеш…" (Гусоўскі М. Песня пра зубра // Стражытная беларуская літаратура. – Мн., 1990. – С. 130).

Ужо не мастацкім, але сур'ёзным краязнаўча-этнаграфічным характарам вылучаецца праца Міхалона Ліцвіна "Пра норавы татараў, літвінаў і маскавіцян" (1550 г.), дзе аўтар бадай упершыню выкарыстоўвае этнаграфічна-параўнаўчы метад, апісваючы побыт, звычаі, этнічныя характары, вайсковыя здольнасці памянёных народаў, дзе пад "ліцвінамі" разумелася жыхарства ВКЛ, пераважна беларусы. М. Ліцвін далёкі ад ідэалізацыі свайго народа (у першую чаргу ён характарызуе ліцвінскую шляхту), гаворачы пра такія яго хібы як п'янства, хабарніцтва, лянота, марнатраўства, непатрыятызм. Што датычыцца простага люду, аўтар папракае яго ў выпраўленні разнастайных паганскіх культаў і ўшанаванні святых гор, азёр, лясоў, багоўленні змяі, варажбе і чарадзействе.

Але першым прадстаўніком шляхецкага саслоўя, хто звярнуўся непасрэдна да народнай творчасці, безумоўна, з'яўляецца Саламон Рысінскі, які ў 1618 г. выдае кнігу "Польскія прымаўкі…". Аднак, на самой справе ў зборніку было змешчана больш за 1800 прымавак і прыказак уласна сабраных аўтарам на Наваградчыне. Нездарма, што значную колькасць гэтых прыказак запісалі на Беларусі ўжо ў XIX ст. І. Насовіч і М. Федароўскі.

Немалое значэнне для спазнання беларускай этнічнай культуры часоў Сярэдневечча маюць нататкі і творы замежных падарожнікаў, што наведвалі ці праязджалі праз Беларусь. У розныя часы тут пабывалі польскі вучоны, аўтар "Трактата аб дзвух Сарматыях" Мацей Мяхоўскі (1517), пасол германскага імператара Сігізмунд Герберштейн (1517 і 1526), італьянскі купец Рафаэле Барберыні (1565), англійскі пасол Джайлз Флэтчар (1591), амстэрдамскі бургамістр Мікалай Вітсэн (1664) і іншыя заход-

нееўрапейцы, якія пакінулі ў сваіх нататках і навуковых працах шмат каштоўных звестак пра жыццё, побыт, народную культуру Беларусі.

Але асаблівае значэнне для нас маюць працы тых іншаземцаў, якім давялося вельмі доўга пражыць на тэрыторыі тагачаснай Беларусі (як сказалі б мы сёння – “ва ўмовах стацыянарнай экспедыцыі”), што дало ім магчымасць дэтальна і падрабязна разгледзець і апісаць заняткі, звычаі, абрады мясцовага насельніцтва. Асаблівай увагі заслугоўваюць працы аднаго з найбольш значных пісьменнікаў-краязнаўцаў другой паловы XVI – першай паловы XVII стст. паляка Яна Ласіцкага, які пражыў на Беларусі каля 20 гадоў. Для беларускай этнаграфіі найбольшае значэнне мае кніга Я. Ласіцкага “Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя, пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў, татар…” (1582 г.). Вельмі падрабязна аўтар апісвае шлюбныя звычаі і абрады беларусаў, прыводзіць практычна адзінае апісанне абрада выкрадання нявесты; гэтак жа дэтальна гаворыцца і пра пахавальную абрадавасць.

Акрамя таго, Я. Ласіцкі падае многа надзвычай цікавага з павер’яў, народных спосабаў лячэння розных хвароб, апісвае элементы звычаёвага права, ежу, адзенне, жыллё, музычныя інструменты, расказвае пра гандаль, паляванне на куніц і баброў і шмат іншага.

Падобна Я. Ласіцкаму, амаль 20 гадоў прабыў на Беларусі і італьянец Аляксандр Гваньіні, які служыў у войску ВКЛ ротмістрам, актыўна ўдзельнічаў у Лівонскай вайне, з’яўляўся вайсковым камендантам Віцебска. У сваёй працы “Хроніка Еўрапейскай Сарматыі” (1578 г.) ён апісвае народную культуру пераважна Беларускага Падзвіння, гаворыць пра фальклорныя традыцыі і звычаі ў краі; падае каляндар сельскагаспадарчых работ, апісвае ўменне сялян весці гаспадарку.

Этнаграфічныя звесткі пра быт, звычаі, гаспадарку, нормы маралі, матэрыяльную і духоўную культуру тагачасных жыхароў Беларусі ўтрымліваюцца і ў вялікай колькасці гродскіх судовых кніг, юрыдычных актах, граматах, прывялеях, Статутах ВКЛ (апошнія, напрыклад, рэгламентуюць прававое становішча этнічных меншасцяў у краіне). Прынцыпова змяняецца і характар летапісання. Аўтары Баркулабаўскага летапісу (пачатак XVII ст.) і Магілёўскай хронікі (XVII – XVIII стст.) звяртаюць увагу не толькі на палітычную гісторыю і падзеі дзяржаўнай значнасці, як гэта было ў раннім Сярэднявеччы, але не ў малой ступені на так званае “штодзённае жыццё”: прыродныя бедствы, неўраджаі, кошты на хлеб, гандаль, рамёствы, узаемаадносіны гараджан, стаўленне да іншаэтнічных прадстаўнікоў і г.д., што дае аб’ектыўнае ўяўленне пра рэальнага чалавека XVII ст. з яго каштоўнасцямі, радасцямі, фобіямі, стэрэатыпамі, верай і прымхамі.

Асобныя месца займаюць шляхецкія дыярыюшы (дзённікі) XVI – XVIII стст., якія адлюстроўваюць асаблівасці шляхецкай (магнацкай) субкультуры з яе ідэаламі, нормамі паводзінаў, як у надзвычайных (сейм, вайна), так і бытавых сітуацыях.

Падсумоўваючы, варта паўтарыцца, што на працягу IX – першай паловы XVIII стст. мэтанакіраванага даследавання народнай культуры (працы Я. Ласіцкага і С. Рысінскага былі выключэннем з правіла) не праводзілася, бо культура сялянства ўвесь гэты перыяд лічылася нявартай увагі, "дзікунскай". Гэтак жа не вывучалася ні культура гараджан, ні шляхты. Адсутнасць навукі (этнаграфіі) як такой – тут не першапрычына, бо грамадства на кожным гістарычным этапе аўтаматычна вызначае свае прыярытэты. Таму большасць этнаграфічных звестак згаданага перыяду, як мы бачым, "рассыпана" ў тысячах разнастайных твораў і дакументаў, аналіз якіх яшчэ застаецца важнай задачай для даследчыкаў.

## 2.2. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.

Поўная абыякавасць да народнай культуры, якая панавала ў грамадстве яшчэ ў сярэдзіне XVIII ст., ужо ў канцы XVIII – першай палове XIX стст. раптоўна змянілася надзвычайнай цікавасцю да яе з боку адукаваных саслоўяў. Гэтая метамарфоза была не выпадковай і не выключнай для Беларусі. Згаданы працэс разгортваўся па ўсёй Еўропе пад уплывам Рамантызму – ідэйна-мастацкага накірунку, які ў канцы XVIII ст. прыйшоў на змену ідэалогіі Асветніцтва. Адной з вызначальных рыс Рамантызму з'явілася ідэалізацыя айчыннай гісторыі і патрыярхальнага народнага жыцця. Сялянская культура ўжо разглядаецца не як "дзікунская", але, як экзатычная, надзвычай старажытная, дзе можна адшукаць вытокі нацыянальнай гісторыі. Асабліва актуальным гэта было на землях былой Рэчы Паспалітай, бо страта дзяржаўнасці ўспрымалася перадавымі коламі грамадства як вялікая нацыянальная трагедыя і выклікала небывалы рост патрыятызму, у тым ліку і сярод інтэлегенцыі "усходніх крэсаў" (Беларусі), якая прылічвала сябе да палякаў. Гэты патрыятызм у сваю чаргу прывёў да неабходнасці вывучэння народа – носьбіта нацыянальнага характару, у прыватнасці вывучэння народнай культуры, у якой знаходзіў выяўленне гэты нацыянальны характар.

У XVIII ст. першым, хто стаў вывучаць і запісваць народныя абрады беларусаў, стаў вядомы гісторык Адам Нарушэвіч, разглядаючы іх як дапаможную, але патрэбную крыніцу для гістарычных даследаванняў. Пры гэтым даследчык не бачыў вялікай розніцы паміж польскай культурай і культурай насельніцтва Беларусі і выкарыстоўваў запісы беларускіх абрадаў у сваёй фундаментальнай працы “Гісторыя польскага народа”. Паслядоўнікамі А. Нарушэвіча выступілі і іншыя польскія навукоўцы: вучоны і літаратар Юльян Нямцэвіч, археолаг, гіторык і этнограф Ян Патоцкі, гісторык і грамадскі дзеяч Тадэвуш Чацкі. Аднак уласна беларускую этнічную культуру, пазначаныя даследчыкі не вывучалі, выкарыстоўваючы беларускі фальклорны матэрыял як укосны і дадатковы ў сваіх навуковых і публіцыстычных працах.

Важным крокам у станаўленні польскай і беларускай этнаграфіі стала першая навуковая праграма па збору фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, распрацаваная ў 1802 г. вядомым палітычным і культурным дзеячам Гуга Калантаям. Праграма была даволі шырокай і закранала асноўныя пытанні матэрыяльнай (гаспадарка, народнае дойлідства, кулінарыя, рамёствы) і духоўнай (мова і дыялектныя асаблівасці, календарная, сямейная абрадавасць, фальклор, чарадзейства і інш.) культуры народа.

Аўтарам практычна першага артыкула, прысвечанага ўласна беларускай народнай культуры, стала *Марыя Чарноўская*. У 1817 г. у друку з’яўляецца яе даследаванне “Рэшткі славянскай міфалогіі, захаваныя ў звычаях вясковага люду на Белай Русі”, дзе аўтарка характаразуе Купальскую абрадавасць Чэрыкаўшчыны, а таксама дахрысціянскія вераванні сялян. Так, напрыклад, вяскоўцы шчыра верылі ў існаванне “справядлівага ляснога бажка Дабрахочага”, які карае “непачцівых” людзей і якому прыносяцца ахвяры (Czarnowska M. Zabytki mitologii slowianskiej w zwyczajach wiejskiego ludu na Bialei Rusi dochcwywane // Dziennik Wilenski. – 1817. – T. 6. – S. 407).

Адным з пачынальнікаў беларускай, польскай, рускай, украінскай этнаграфіі, археалогіі, фалькларыстыкі стаў *Зарыян Даленга-Хадакоўскі*, навуковыя прыярытэты і абшары даследчыцкай дзейнасці якога былі надзвычай шырокімі. Ён падарожнічаў па Беларусі, Польшчы, Галіцыі, Паўночнай Расіі, дзе запісваў фальклор, даследаваў археалагічныя помнікі. Даследчык тэарэтычна абгрунтаваў неабходнасць і прынцыпы збору фальклору, упершыню ў славістыцы паказаў ролю тапанімікі для гістарычных даследаванняў. У сваёй асноўнай працы “Пра славяншчыну да

хрысціянства” (1818 г.) навукова даказаў каштоўнасць язычніцкіх элементаў у народнай культуры, слушна адзначыў, што ў рэгіёнах з праваслаўным насельніцтвам захавалася значна больш архаічных (дахрысціянскіх) традыцый, чым у рэгіёнах каталіцкіх, што тлумачыў большай нецярпімасцю каталіцкай царквы да народнай культуры. На жаль, большасць яго прац не апублікавана: збор беларускіх песень (каля 500), замоў, загадак, матэрыялаў па этнаграфіі, тапаніміцы, археалогіі. Але навуковая і збіральніцкая дзейнасць З. Даленгі-Хадакоўскага стала на той час узорам і праграмай для навукова-літаратурных аб’яднанняў Беларусі, Польшчы, Украіны і Расіі.

Вывучэннем Паўночнай Беларусі быў апантаны вядомы пісьменнік, этнограф і фалькларыст *Ян Баршчэўскі*. Здзейсніўшы дзесяткі вандровак па родным краі, ён запісаў вялікую колькасць народных легенд, паданняў, апавяданняў, якія ляглі ў аснову яго таленавітага зборніка “Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” (1844 – 1846 гг.).

Паплечнік і сябра Я. Баршчэўскага *Рамуальд Падбярэзскі* сваю працу “Лісты пра Беларусь” (1844 г.) прысвяціў таксама Беларускаму Падзвінню. У артыкуле даецца характарыстыка этнічнага складу Віцебскай губерніі, упершыню звяртаецца ўвага на этнастэрэатыпы беларусаў адносна латышоў (лічылі чараўнікамі) і рускіх старавераў, таксама аналізуюцца гаспадарчыя і прамысловыя заняткі ў рэгіёне, апісваецца музычнае і інструментальнае мастацтва, народнае дойлідства.

Даследаваннем і збіраннем беларускага фальклору ў гэты час паслядоўна займаўся *Ян Чачот*. Ён выдаў шэсць зборнікаў беларускіх песень, чатыры з якіх па польску, два – па беларуску. Вялікае значэнне Я. Чачот надаваў вывучэнню ўласна беларускай мовы (называў яе “крывіцкай”), якую лічыў самастойнай славянскай мовай і спрабаваў скласці яе тлумачальны слоўнік. Збіраў і малыя жанры фальклору: прыказкі, прымаўкі, выслоўі, якія змясціў у адным са зборнікаў.

Каштоўны ўклад у развіццё этнаграфічнага вывучэння Беларусі зрабіў і *Уладзіслаў Сыракомля*. І хоць яго праца “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах” (1853 г.) мела, збольшага, краязнаўчы характар, яна змяшчае і багаты этнаграфічны матэрыял. Так, даследуючы гістарычнае мінулае Нясвіжа, Стоўбцаў, Койданава, Міра, ён характарызуе сацыяльнае становішча, гаспадарку, жыллё, звычаі, асаблівасці грамадскага і сямейнага побыту, каляндарнай і сямейнай абрадавасці сялян Мінскай губерні. Асаблівае месца займае апісанне побыту, звычаяў і гаспадарчых заняткаў этнічных меншасцяў рэгіёна: татараў, габрэяў, цыганаў.

Даволі ёмісты і грунтоўны этнаграфічна-фальклорны зборнік “Беларусь” (1840 г.) выдае ў Парыжы *Аляксандр Рыпінскі*. Апісваючы разнастайнасць беларускага песеннага фальклору, даследчык бадай першы звярнуў увагу на такі жанр як пахавальныя галашэнні. Вылучаецца кніга і самым вялікім на той час зборам прымавак і прыказак. Але нягледзячы на інфарматыўную каштоўнасць даследавання, неабходна ўлічваць пазіцыю самога аўтара адносна беларускай культуры, якую ён лічыў часткай польскай і актыўна выступаў за канчатковую паланізацыю Беларусі.

Калі ж казаць пра этнаграфічнае вывучэнне Беларусі расійскімі даследчыкамі, то ў канцы XVIII – першай палове XIX стст. яно практычна адсутнічала, калі не лічыць навуковых экспедыцый І. Ляпёхіна (1773) і акадэміка У. Севяргіна (1803), якія сабралі шмат каштоўных матэрыялаў пра традыцыйныя формы гаспадаркі і матэрыяльнай культуры беларусаў. Але стаўленне самога акадэміка да беларусаў было падкрэслена грэблівым. Так, пра беларусаў Полаччыны ён піша: “Простой народ большею частью юродлив и груб, исповедует униатскую веру и весьма склонен к невежеству” (Севергин В. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российского государства. – СПб., 1804. – С. 95).

Калі Я. Баршчэўскі, Р. Падбярэскі, У. Сыракомля з’яўляліся ідэйнымі прыхільнікамі рамантызму, што адбівалася ў іх працах залішняй эмацыйнасцю, мастацкай вобразнасцю, то браты *Яўстафі і Канстанцін Тышкевічы* ўжо выступаюць у якасці практычна першых прафесіяналаў у галіне этнаграфіі, археалогіі і краязнаўства, працы якіх грунтуюцца выключна на фактах і суправаджаюцца не літаратурна-публіцыстычнымі, але навуковымі каментарыямі. Адсюль, абсалютна невыпадкова, што менавіта фундаментальнае даследаванне Я. Тышкевіча “Апісанне Барысаўскага павета” (1847 г.) можна лічыць адзінай этнаграфічнай манаграфіяй у класічным разуменні гэтага слова, што ўбачыла свет у першай палове XIX ст. Праца, вельмі грунтоўная па напаўненні, змяшчае практычна поўнае апісанне каляндарных святаў, вяселля, культа ўшанавання продкаў, прыведзены змястоўны збор мясцовых гістарычных паданняў, вялікі корпус чарадзейскіх і знахарскіх прымхаў і забабонаў.

Абсалютна наватарскім у этнаграфіі таго часу стаў зварот аўтара да народных уяўленняў пра раслінны свет. Дзякуючы высокай працаздольнасці і прафесіяналізму “на прыкладзе толькі аднаго беларускага павета вопытны даследчык стварыў панараму духоўнага жыцця народа” (Каханоўскі Г.А., Малаш Л.А., Цвірка К.А. Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму. – Мн., 1989. – С. 218).

Прынцыповай вехай у станаўленні беларускай этнаграфіі з'явілася Рускае геаграфічнае таварыства (РГТ), створанае ў Пецярбурзе ў 1845 г. Менавіта з гэтага часу пачынаецца арганізаванае, планамернае і інтэнсіўнае вывучэнне беларускай вуснапаэтычнай творчасці і народных традыцый. Уласна народазнаўчы накірунак даследаванняў у РГТ курыраваў этнаграфічны аддзел, які напачатку ўзначальваў акадэмік К.М. Бэр. На старонках перыядычных выданняў гэтага таварыства з'явіліся шматлікія сур'ёзныя працы па этнаграфіі Беларусі.

Фальклорна-этнаграфічную работу таварыства распачало з рассылкі ў 1848 г. ва ўсе губерні Расіі праграмы па збору этнаграфічных дадзеных. І хоць інструкцыя была недасканалай, рэакцыя з месцаў пераўзышла ўсе чаканні кіраўнікоў РТГ. Толькі з Беларусі рукапісы ішлі бесперапыннай плынню. Сярод іх былі працы настаўніка Навагрудскага дваранскага вучылішча М. Дзмітрыева "Песні сялян Навагрудскага павета", святара Ф. Уласовіча "Этнаграфічныя звесткі пра сяло Цвяты Заслаўскага павета", Афанасьева "Апісанне Полацкага намесніцтва", святара С. Пашкевіча "Этнаграфічныя звесткі пра Холмскі прыход Кобрынскага павета" і мноства інш.

З гэтых найбагацейшых фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, толькі невялікая частка ўбачыла свет на старонках дарэвалюцыйных выданняў. Астатняе дагэтуль ляжыць у архіве РГТ у Санкт-Пецярбурзе і чакае беларускіх даследчыкаў.

## 2.3. Развіццё беларускай этнаграфіі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.

Пасля падаўлення паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага грамадска-палітычная сітуацыя на Беларусі заставалася напружанай. Афіцыйныя ўлады на чале з генерал-губернатарам М. Мураўёвым праводзілі жорсткі курс на русіфікацыю краю. Зразумела, што ў такіх умовах *Паўночна-заходняе аддзяленне РГТ*, адчыненае ў Вільні ў 1867 г., менш за ўсе пераследавала навуковыя мэты. Паказальнай з'яўляецца асоба кіраўніка аддзялення – папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі І.П. Карнілава, бліжэйшага паплечніка Мураўёва, які бачыў сваю задачу ў тым, каб "схіліць сэрца беларуса да вялікарускіх братоў" (Цішчанка І.К. Да народных вытокаў. – Мн., 1986. – С. 92). Адпаведным з'яўляўся і склад Паўночна-заходняга аддзелу. З 58 чалавек палову складалі расійскія вайскоўцы, другую палову –

расійскае ж чынавенства. Мясцовыя даследчыкі ў аддзел ўключаны, натуральна, не былі. Але падобная арганізацыя не магла быць жыццяздольнай і, выдаўшы адну надзвычай няўдалую анкету, сабраўшы мізерную колькасць этнаграфічнага матэрыялу, Паўночна-заходні аддзел РГТ у 1876 г. спыніў сваю дзейнасць.

Аднак, нягледзячы на палітычную рэакцыю, актыўнае этнаграфічнае вывучэнне Беларусі мясцовымі даследчыкамі не спыняецца. Працягвае сваю навуковую і выдавецкую дзейнасць этнограф і археолаг *Адам Кіркор*, які яшчэ ў 1858 г. надрукаў сваё грунтоўнае даследаванне "Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню", якое вылучалася праўдзівасцю ў апісанні побыту сялянства. У працы даследчык характаразуе этнічны склад губерні, вылучыўшы два асноўных масіва – беларусаў і літоўцаў; апісваюцца асаблівасці сямейнага і бытавога ўкладу, антрапамарфічныя характарыстыкі жыхароў Віленшчыны, іх мова. Відавочнай хібай працы з'яўляецца тое, што сярод песень, змешчаных А. Кіркорам у ёй, 157 тэкстаў ён папрост узяў з кнігі Я. Тышкевіча "Апісанне Барысаўскага павета".

У публікацыях "Літоўскае Палессе" і "Беларускае Палессе" ("Живописная Россия" – Т. 3, 1882 г.) даследчык даў этнічную і сацыяльна-бытавую характарыстыку тыпаў беларусаў, апісаў абрады і звычаі. Аднак, менавіта ў гэтых працах ён цалкам наследуе міфалагічную дактрыну П. Шпілеўскага, прыдумляючы новыя міфалагічныя персанажы і сцвярджаючы, што паганства ў беларусаў яшчэ ў XIX ст. засталося амаль у некранутым выглядзе. Аднак, пры ўсіх недахопах, аўтар ва ўсіх сваіх працах паслядоўна праводзіў думку пра самабытнасць беларусаў і адметнасць іх мовы.

У 1860 – 70 гг. з'яўляецца цэлая плеяда таленавітых этнографаў з ліку ўраджэнцаў Беларусі, сярод якіх найбольш вядомымі былі І. Насовіч, Ю. Крачкоўскі, М. Дзмітрыеў.

Адным з буйнейшых даследчыкаў Беларусі быў *Іван Насовіч*, якога, перадусім, цікавіла адметнасць і унікальнасць беларускай мовы, што была яшчэ практычна нязнанай для акадэмічнай расійскай навукі. Другім накірункам яго навуковага пошуку былі малыя жанры беларускага фальклору: прыказкі і прымаўкі. І ўжо ў 1852 г. выйшаў першы зборнік сабраных І. Насовічам прыказак (каля 1000 адзінак). Паралельна даследчык рупліва працуе над слоўнікам старажытнабеларускай лексікі, за які ў 1865 г. яму прысуджаюць Увараўскую прэмію. Неўзабаве за новы зборнік беларускіх прыказак ён атрымлівае залаты медаль ад РГТ, з якім трывала супрацоўнічае.

Аднак галоўнай справай усяго жыцця І. Насовіча, стаў “Слоўнік беларускай мовы” (1870), які змяшчаў больш за 30000 слоў з тлумачэннямі і аналагаў якому датуль не было. У 1873 г. навуковец выдае зборнік “Беларускія песні”, які змяшчаў каля 450 тэкстаў і вялікую аўтарскую прадмову. Аднак значным яго недахопам, як і ўсіх прац І. Насовіча і большасці тагачасных этнографаў, трэба лічыць тое, што значная частка матэрыялаў не мела пашпартызацыі. Другой хібай даследчыка было тое, што, выступаючы супраць прадстаўнікоў міфалагічнага накірунку, ён займаў радыкальна супрацьлеглую пазіцыю, спрабуючы давесці, што ў беларускай народнай культуры абсалютна не засталося ніякіх архаічных элементаў, а ўсё прасякнута хрысціянскім духам. Але, пры ўсіх пазначаных недахопах, працы І. Насовіча не страцілі свайго значэння і сёння.

Плённай была праца і аматара этнаграфіі *Міхаіла Дзмітрыева*, які ў 1869 г. у Вільні выдаў “Збор песень, казак, абрадаў і звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю”. Нягледзячы на тое, што зборнік змяшчаў шэраг матэрыялаў, якія друкаваліся раней, яго адметнасць заключалася ў наяўнасці шматлікіх новыў апісанняў абрадаў (вясельных, пахавальных, калядных, купальскіх, Дзядоў і інш.), розных народных забаў, гульняў і танцаў. У адрозненне ад шматлікіх тагачасных этнаграфічных прац, якія былі прасякнуты палітычнай тэндэнцыйнасцю, працы М. Дзмітрыева прысвечаны аб’ектыўнаму апісанню чыста этнаграфічных з’яў. За высокі навуковы ўзровень даследаванняў М. Дзмітрыеў быў узнагароджаны срэбным медалём РГТ.

Сярод прац 1860 – 70-х гг. багатымі этнаграфічнымі звесткамі вылучаюцца працы *Юліяна Крачкоўскага*: “Нарысы быту заходнебеларускага селяніна” (1869); “Быт заходнебеларускага селяніна” (1874). У “Нарысах…” даследчык асвятляе тэму, абсалютна невядомую тагачаснай беларускай этнаграфіі, – этнаграфію дзяцінства. Аўтар уважліва прасочвае месца і ролю дзяцей у беларускай сям’і, пачынаючы ад іх нараджэння і да паўналецця. Другая праца вылучаецца падрабязнейшым апісаннем усяго цыкла традыцыйнай каляндарнай абраднасці беларусаў. Прыводзяцца шматлікія прыкметы, павер’і, звязаныя як з вытворчай дзейнасцю, так і са штодзённым жыццём селяніна.

Аб’ектыўным стаўленнем да беларускай этнічнай культуры вызначаўся і рускі фалькларыст-славіст *Пётр Бяссонаў*, якога цікавіла разнастайнасць славянскіх культур (выдаў зборнікі балгарскіх, сербскіх песень). У прадмове да зборніка “Беларускія песні” (1871) ён адзначыў вялікі ўнёсак беларусаў у супольную скарбніцу славянскай культуры. Аднак у шэра-

гу выпадкаў ён перабольшваў значэнне міфалагічнай архаікі, лічачы, напрыклад, што грунтам земляробчага каляндара былі міфы.

Адметную ролю ў развіцці беларускай этнаграфіі адыграў *Павел Шэйн*. Гэта быў адзіны этнограф, уключаны ў склад Паўночна-Заходняга аддзела РГТ, што дало яму магчымасць распрацаваць падрабязную праграму па збіранню фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу і разаслаць яе ў сотнях экземпляраў па ўсёй Беларусі. Негледзячы на тое, што праграма была арыентавана толькі на абрадавасць і фальклор, яе метадалагічны ўровень (патрабаванне абавязковай пашпартызацыі матэрыялу, фіксацыі дыялектных асаблівасцяў мовы і г.д.) быў даволі высокі. Ва ўмовах фармавання беларускай нацыі, нараджэння нацыянальнай інтэлегенцыі, праграма Шэйна была прыхільна сустрэта на месцах і неўзабаве даследчык пачаў атрымліваць шматлікія фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Дзякуючы праграме П. Шэйн, які па прычыне слабога здароўя практычна не займаўся палявымі этнаграфічнымі даследаваннямі (адзіная яго экспедыцыя па Беларусі адбылася ў 1877 г.), атрымаў цэлую сетку карэспандэнтаў па ўсёй Беларусі, з якімі пастаянна падтрымліваў кантакт. У гэтым сэнсе П. Шэйн выступае, хутчэй, як кабінетны навуковец, таленавіты сістэматызатар, класіфікатар і выдавец, бо пераважная частка матэрыялаў, змешчаных ва ўсіх ягоных зборніках, уласна яму не належала. Ужо ў 1874 г. П. Шэйн выдае буйнейшы на той час фальклорны зборнік “Беларускія песні”, які змешчаў больш за тысячу тэкстаў і вылучаўся высокім навуковым узроўнем (дакладная пашпартызацыя матэрыялу, каментарыі, слоўнік і г.д.). Падаецца неверагодным, але больш за 400 (!) песень і абрадаў П. Шэйн запісаў ад сваёй служанкі, простай беларускай сялянкі Марыі Кашкевіч.

Этнаграфічная дзейнасць П. Шэйна была вельмі плённай. Звесткі, дасланыя карэспандэнтамі ён апрацаваў і выдаў у шматтомным зборніку “Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю” (Т. 1, ч. 1. СПб., 1887; Т. 1. ч. 2. СПб., 1890; Т. 2. СПб., 1891; Т. 3. СПб., 1902). Праца П. Шэйна не згубіла навуковай значнасці і дагэтуль. У ёй апісана вялікая колькасць абрадаў, прыведзены тэксты народных песень практычна ўсіх жанраў, значная колькасць казак, легенд і паданняў, змястоўны матэрыял па народнай дэманалогіі, чарадзействе, знахарстве, прыкметах і павер’ях; звесткі па матэрыяльнай культуры беларускіх сялян (дойлідства, адзенне, кулінарыя і інш.). Праца П. Шэйна стала першай панарамнай публікацыяй, якая асвятляла шмат якія аспекты беларускай этнічнай культуры.

Як карэспандэнт П. Шэйна, пачаў свой шлях у этнаграфіі *Мікалай Нікіфароўскі.* Ураджэнец Віцебшчыны, усе свае навуковыя працы ён прысвяціў народнай культуры Беларускага Падзвіння. Надзвычай высокі навуковы ўзровень яго прац вылучаўся ўжо ў зборніках П. Шэйна. І, напэўна, невыпадкова, што, калі М. Нікіфароўскі вырашыў займацца навукай самастойна, то П. Шэйн не толькі не вярнуў яго матэрыялаў, але ўвогуле спыніў з ім перапіску. Тым не менш, у 1892 – 1899 гг. у часопісе "Этнаграфічны агляд" выходзіць серыя артыкулаў М. Нікіфароўскага пад агульнай назвай "Нарысы Віцебскай Беларусі". Шэраг артыкулаў з'яўляўся абсалютна наватарскім у тагачаснай беларускай этнаграфіі. Так, у артыкуле "Старцы" (1892) даследчык усебакова аналізуе субкультуру гэтай сацыяльнай групы, пазначае яе ўнутраную структуру і функцыі ў межах вясковай грамады. Аўтар пераканаўча даводзіць, што старцы-жабракі ў народных уяўленнях з'яўляліся медыятарамі (пасрэднікамі) паміж светам жывых і памерлых, валодалі знахарскімі і вяшчунскімі здольнасцямі і таму разглядаліся вяскоўцамі як постаці сакралізаваныя, максімальна набліжаныя да Бога.

Наватарскім з'яўляўся артыкул "Дудар і музыка" (1892), дзе характарызуецца багацце музычнай культуры сялян Віцебшчыны і асобна паказана роля дудара як у штодзённым, так і абрадавым жыцці вёскі.

Выключную цікавасць мае артыкул "Гульні і гульцы" (1897), дзе М. Нікіфароўскі аналізуе звыш 60 гульняў дзяцей, моладзі і дарослых Падзвіння. Пры гэтым аўтар прыводзіць шэраг прыкмет і павер'яў, звязаных з рознымі гульнямі. Астатнія артыкулы "Нарысаў…" былі прысвечаны, пераважна сацыяльна-эканамічнаму становішчу вёскі і вылучаюцца дэмакратызмам і аб'ектыўным асвятленнем "непрыемных" для ўрада фактаў.

Аднак найвялікшую этнаграфічную каштоўнасць на сённяшні дзень маюць працы М. Нікіфароўскага "Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку" (1895) і "Простанародныя прыкметы і павер'і, забабонныя абрады і звычаі, легендарныя паданні аб асобах і мясцінах" (1897).

Першая кніга з'яўляецца буйнейшым дарэвалюцыйным даследаваннем па матэрыяльнай культуры беларусаў XIX ст. "Нарысы…" складаюцца з чатырох частак. Першая частка прысвечана вывучэнню ежы (характарызуецца 112 (!) страў, спосаб іх прыгатавання, вылучаюцца рытуальныя і штодзённыя стравы), другая – вывучэнню адзення (апісваецца тэхналогія вырабу, пачынаючы ад апрацоўкі лёну і воўны; асаблівасці мужчынскага і

жаночага, штодзённага і святочнага адзення), трэцяя – жылля і гаспадарчых пабудоў (характар паселішча Падзвіння, іх планіроўка, тэхналогія будаўніцтва, інтэр'ер і інш.), чацьвёртая – вытворчай дзейнасці беларускага селяніна (земляробчыя, паляўнічыя, рыбалавецкія, цеслярскія і інш. прылады працы; асаблівасці вытворчай, прамысловай і рамесніцкай дзейнасці). Адметнасцю манаграфіі з'яўляецца вялікая колькасць ілюстрацый, прыведзеных у кожным з раздзелаў. Калі "Нарысы…" дэтальна паказваюць матэрыяльны свет беларусаў Падзвіння, то "Простанародныя прыкметы…" адчыняюць перад намі духоўны свет селяніна, асаблівасці яго светапогляду, вывучэнне якога з'яўляецца вельмі складанай задачай. У кнізе аўтар змяшчае 2307 розных народных прыкмет, павер'яў, абрадаў, звычаяў, сродкаў народнай медыцыны. Увесь гэты вялізны матэрыял збіраўся М. Нікіфароўскім каля 40 гадоў.

Міфалагічным уяўленням вяскоўцаў прысвечана даследаванне "Нячысцікі. Звод прастанародных у Віцебскай Беларусі сказанняў пра нячыстую сілу" (1907), дзе М. Нікіфароўскі робіць класіфікацыю ўсіх дэманалагічных персанажаў (чорт, дамавік, лазнік і г.д.), вера ў якія бытавала на Віцебшчыне.

З фальклорных прац М. Нікіфароўскага варта вылучыць зборнік "Беларускія песні-частушкі" (1910), які змяшчае больш за 2300 тэкстаў (гэты жанр фальклору да М. Нікіфароўскага быў амаль цалкам ігнараваны беларускімі фалькларыстамі), а таксама зборнік "Прастанародныя загадкі"(1898), які па колькасці сабраных матэрыялаў пераўзыходзіць падобныя зборнікі І. Насовіча, Е. Раманава, П. Шэйна і інш.

З'яўляючыся адным з лепшых прадстаўнікоў тагачаснай беларускай нацыянальнай інтэлегенцыі, М. Нікіфароўскі сваімі даследаваннямі надзейна абараняў беларускі народ ад польскіх нацыяналістаў і рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў, якія адмаўлялі яго права на самастойнае нацыянальнае развіццё.

Да плеяды дэмакратычнай нацыянальнай інтэлегенцыі належаў і буйнейшы этнограф Беларусі канца XIX ст. *Еўдакім Раманаў*. Некалькі дзесяцігоддзяў прысвяціў ён збору і публікацыі этнаграфічных матэрыялаў, якія склалі дзевяцітомны "Беларускі зборнік" (1886 – 1912). Па аб'ёму этнаграфічнага матэрыялу, яго праўдзівасці, навуковай значнасці, шырокаму ахопу быту беларускага народа гэтае выданне не мела сабе роўных у дарэвалюцыйнай беларускай этнаграфіі. У адрозненне ад П. Шэйна, Е. Раманаў вельмі ўдала спалучаў кабінетную і палявую даследчыцкую

працу. Толькі ў перыяд з 1886 па 1891 г. ён здзейсніў пяць буйнамаштабных экспедыцый. Усяго за сваё творчае і навуковае жыццё Е. Раманаў выдаў больш за 200 (!) прац па этнаграфіі, фальклору, гісторыі, археалогіі і мове беларусаў, больш за 10000 фальклорных твораў. Яго зборы беларускіх казак і замоў былі і застаюцца самымі прадстаўнічымі ў гэтай галіне. Знаёмства з фальклорна-этнаграфічнымі працамі Е. Раманава (акрамя "Беларускага зборніка" адметнае месца займаюць і "Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні" вып. 1 – 2, 1911 – 1912) паказвае, што амаль ні адна галіна этнічнай культуры не была абмінута беларускім этнографам. Быт народа, яго творчасць, матэрыяльная і духоўная культура ва ўсіх яе праяўленнях, каляндарная і сямейная абрадавасць, прыкметы і вераванні, тлумачэнні сноў, народная медыцына, дзіцячая субкультура – усё гэта падрабязна адлюстравана ў ягоных працах. Акрамя таго, шырокую вядомасць набылі яго даследаванні па археалогіі, гісторыі, гістарычнай тапаграфіі Беларусі.

Апрача ўсяго, Е. Раманаў з'яўляўся таленавітым і актыўным арганізатарам этнаграфічнай працы на Беларусі. Пасля таго, як у 1910 г. аднаўляе сваю дзейнасць Паўночна-Заходні аддзел РГТ, Е. Раманаў узначальвае ў ім секцыю археалогіі і этнаграфіі, гуртуючы вакол сябе нацыянальна настроеныя даследчыцкія сілы. Менавіта пад кіраўніцтвам Е. Раманава секцыя займаецца актыўнай экспедыцыйнай і выдавецкай дзейнасцю.

Неабходна адзначыць і высокую грамадзянскую пазіцыю даследчыка ў няпросты для станаўлення беларускай нацыі час. Ён усяляк адстойваў права народа на развіццё нацыянальнай культуры, мовы, навукі і літаратуры. Невыпадкова, што, практычна на свае сродкі Е. Раманаў у 1900 г. Выдае зборнік "Тарас на Парнасе і іншыя беларускія вершы". І гэта ў той час, калі падобныя выданні на беларускай мове былі катэгарычна забаронены царскім урадам.

На вялікі жаль, не ўся навуковая спадчына вялікага этнографа дайшла да нас. Незадоўга да смерці Е. Раманаў падрыхтаваў да друку X – XIV выпускі "Беларускага зборніка", аднак іх рукапісы былі знішчаны пад час нямецка-фашысцкай акупацыі.

У той жа час, што і Е. Раманаў, этнаграфічнае даследаванне беларусаў Смаленшчыны праводзіў *Ўладзімір Дабравольскі*, які лічыў, што неабходна вывучаць канкрэтныя рэгіёны, каб вызначыць спецыфічнае і агульнае ў кожным этнаграфічным рэгіёне. Асноўны акцэнт у сваіх даследаваннях У. Дабравольскі рабіў на вуснапаэтычную творчасць, што, аднак, не перашкодзіла яму сабраць каштоўную калекцыю народнага адзення Сма-

ленскай і Арлоўскай губерняў, за што ён быў узнагароджаны малым залатым медалём РГТ. Галоўным плёнам вывучэння рэгіёна стаў “Смаленскі этнаграфічны зборнік” (Ч. I – IV, 1891 – 1903). Першы том умяшчаў казкі, паданні, легенды, былі, апавяданні сялян пра свае жыццё, а таксама каштоўныя матэрыялы па знахарству; другі быў прысвечаны сямейнай абрадавасці і фальклору, побыту беларусаў Смаленшчыны; трэці ўключаў прыказкі і прымаўкі; чацвёрты з’яўляўся цалкам фальклорным (песенным) і налічваў каля 1500 песень, пераважна абрадавых.

Вялікую навуковую каштоўнасць маюць і асобныя артыкулы, якія Ў. Дабравольскі змяшчаў у часопісах “Жывая даўніна” (“Народныя казанні пра самагубцаў”, 1894; “Нячыстая сіла ў народных вераваннях”, 1908 і інш.) і “Этнаграфічны агляд” (“Жамяра і чарвякі ў народным жыцці”, 1901; “Прымхі адносна ваўкоў”, 1901 і інш.).

На сённяшні дзень усе матэрыялы Ў. Дабравольскага маюць надзвычайную каштоўнасць, паколькі дазваляюць нам узнавіць усё багацце традыцыйнай культуры беларусаў Смаленшчыны, якія не ўвайшлі ў склад беларускай дзяржавы і на працягу XX ст. былі амаль цалкам асіміляваныя рускім этнасам.

Сярод польскіх этнографаў і фалькларыстаў 80 – 90-х гадоў XIX ст. найбольш плённай была дзейнасць *Міхала Федароўскага*, які пражыў на Беларусі 27 гадоў і амаль увесь гэты перыяд праводзіў палявыя этнаграфічныя даследаванні заходніх рэгіёнаў краіны. За гэты час ён зрабіў звыш 200 тысяч (!) запісаў пра мову, фальклор і быт беларусаў, сярод якіх асноўнае месца займаюць вуснапаэтычныя творы.

Публікацыю сабраных матэрыялаў М. Федароўскі пачаў з 1897 г. Даследчык меркаваў выдаць 14 тамоў, сабраных ім матэрыялаў, але пры ягоным жыцці выйшла толькі тры пад назвай “Беларускі народ на Русі Літоўскай” (1897 – 1903), у якіх апублікавана каля 3 тысяч фальклорных твораў, тэкстаў з матэрыяламі па вераваннях і прыкметах, сродках народнай медыцыны, знахарству, чарадзейству, у тым ліку больш за 400 казак, 570 легенд, паданняў і іншых эпічных твораў. Чацьвёрты том (1935), які выйшаў пасля смерці М. Федароўскага, змяшчае больш за 13 тысяч прыказак, прымавак, выслоўяў, жартаў і г.д., а пяты (1958) і шосты (1960) тамы цалкам прысвечаны песеннаму фальклору беларусаў і змяшчаюць больш за 4 тысячы тэкстаў з 1500 запісамі мелодый. Значная частка ўласна этнаграфічных матэрыялаў яшчэ не ўбачыла свет і ў рукапісным выглядзе захоўваецца ў архівах Варшавы і Вроцлава, чакаючы, прынамсі, беларускіх даследчыкаў.

Калі для папярэдніх этнографаў была найбольш характэрна руплівая праца па збору і фіксацыі этнаграфічна-фальклорнага матэрыялу, то ў канцы XIX – пачатку XX стст. з'яўляецца цэлая плеяда даследчыкаў, якія імкнуліся ўжо да тэарэтычнага асэнсавання палявой фактуры. Сярод найбольш вядомых можна назваць М. Доўнар-Запольскага, А. Багдановіча, І. Сербава, Я. Карскага.

Так, на высокім тэарэтычным узроўні аналізаваў асаблівасці беларускага вясельнага абрада *Мітрафан Доўнар-Запольскі*, які ў сваім даследаванні "Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках" (1893), выкарыстаў гістарычна-параўнальны метад, прыводзячы паралелі паміж беларускім традыцыйным вяселлем і шлюбнымі абрадамі шмат якіх славянскіх і іншых індаеўрапейскіх народаў. Даследчык прадпрыняў даволі ўдалую спробу даследаваць паходжанне шэрагу элементаў вясельнага абрада: "пасада" жаніха і нявесты, рытуалаў "умыкання" і "куплі". На думку М. Доўнар-Запольскага, усе яны бяруць свае вытокі ў першабытна-родавым ладзе.

Новая тэма ў этнаграфічным даследаванні была разгорнута даследчыкам у артыкуле "Звычаёвае сямейнае права сялян Мінскай губерні" (1897), дзе ўпершыню даследаваны асноўныя формы сялянскай сям'і ў беларусаў, паказаны і прааналізаваны тыя змены, якія адбыліся ў сямейным побыце беларускіх сялян, пад уплывам сацыяльна-эканамічных змен у грамадстве.

Спробу выкарыстаць метады эвалюцыйнай школы ў дачыненні да этнічнай культуры беларусаў прадпрыняў *Адам Багдановіч* (бацька славутага беларускага паэта), этнаграфічная дзейнасць якога, у якасці карэспандэнта П. Шэйна, пачалася яшчэ ў 1880-х гадах. Асноўная праца даследчыка "Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў" прысвечана аналізу архаічных (паганскіх) элементаў у духоўнай культуры беларусаў. Як і большасць эвалюцыяністаў, А. Багдановіч спрабуе прасачыць генезіс рэлігійных вераванняў на прыкладзе беларускага матэрыялу. На яго думку, пачатковай формай рэлігійных уяўленняў з'яўляўся фетышызм, але пры гэтым да яго памылкова адносілася вербальная магія (замовы, праклёны). Чарговымі прыступкамі развіцця рэлігіі А. Багдановіч лічыў анімізм, культ сонца, політэізм. Пры ўсёй спрэчнасці прапанаванай схемы, праца этнографа змяшчае каштоўныя матэрыялы па дахрысціянскіх уяўленнях, культах (агню, каменя, вады), магічных практыках (чарадзейства, знахарства, варажба).

Пэўную навуковую каштоўнасць маюць і артыкулы А. Багдановіча "Педагагічныя погляды беларускага народа" (1886); "Пра паншчыну" (1894). Але ва ўсіх сваіх працах даследчык выступае з народніцкіх пазіцый: лічыць архаічныя элементы народнай культуры не прыкметай яе самабытнасці, а хутчэй "дзікунствам", якое павінна быць выкаранена з дапамогай інтэлігенцыі і асветы; крытычна ставіцца да пранікнення элементаў гарадской культуры ў вёску, не разумеючы аб'ектыўных сацыяльна-эканамічных прычын, якія спарадзілі гэтую тэндэнцыю.

Адначасна з А. Багдановічам пачаў свае этнаграфічныя даследаванні і *Аляксандр Сержпутоўскі*, але іх вынікі праявіліся ўжо на пачатку XX ст., калі навуковец актыўна супрацоўнічаў з Этнаграфічным аддзелам Рускага музея ў Санкт-Пецярбурзе. У 1906 г. А. Сержпутоўскі прадпрымае працяглую экспедыцыю ў маладаступную частку прыпяцкага Палесся, у выніку якой была сабрана абшырная (каля 1000 экспанатаў) калекцыя з прадметаў адзення, земляробчых, паляўнічых, рыбалавецкіх, пчалярскіх прылад, посуду і інш. У 1907 г. даследчык здзяйсняе экспедыцыю на беларуска-украінскае Палессе, пад час якой набыў звыш 800 этнаграфічных прадметаў, зрабіў больш за 200 фотаздымкаў, а таксама сабраў багаты матэрыял па звычаёвым праве і побыце беларускіх і ўкраінскіх сялян. Палявая даследчыцкая дзейнасць А. Сержпутоўскага была надзвычай актыўнай. На працягу 1907 – 1917 гг. ён правёў 13 экспедыцый, за час якіх, акрамя Беларусі, наведаў Украіну, Літву, Польшчу, Цэнтральную і Паўночную Расію, Каўказ.

У сваіх публікацыях А. Сержпутоўскі асвятляе тэмы альбо слабадаследаваныя, альбо зусім не закранутыя этнографамі: "Нарысы Беларусі: Сябрына. Бонда" (1907); "Пра завіткі (заломы) на Беларусі" (1907); "Земляробчыя прылады беларускага Палесся" (1910); "Бортніцтва ў Беларусі" (1914). Высокую навуковую і літаратурна-мастацкую вартасць мае зборнік "Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў" (1911), большасць якіх шматразова перавыдавалася.

Культура Палесся была прадметам навуковай цікавасці і *Ісака Сербава*, які актыўна супрацоўнічаў з Паўночна-Заходнім аддзелам РГТ і па яго заданні ў 1911 – 1912 гг. здзейсніў некалькі экспедыцый на беларускае Палессе, за час якіх сабраў багаты фальклорна-этнаграфічны матэрыял, у тым ліку каля 600 фатаздымкаў. Пры гэтым, асноўную ўвагу даследчык звяртаў на асаблівасці матэрыяльнай культуры: жыллё і гаспадарчыя пабудовы, прылады працы, адзенне і інш. Вынікі экспедыцый у рэфератыўным выглядзе былі змешчаны ў артыкулах "Па Дрыгавіцкай вобласці летам 1911 г." і "Па Дрыгавіцкай вобласці летам 1912 г." Назвы артыкулаў ад-

люстроўваюць памылковае перакананне аўтара ў тым, што беларусы-палешукі пачатку XX ст. з'яўляюцца прамымі нашчадкамі дрыгавічоў.

Найбольш каштоўны этнаграфічны матэрыял быў змешчаны І. Сербавым у асобнай манаграфіі "Беларусы-сакуны" (1915), у якой падрабязна ахарактарызаваны асаблівасці мовы ("саканне"), песенны і эпічны фальклор, матэрыяльная культура і побыт беларусаў невялікага раёна паміж Слуцкам і Асіповічамі.

Вяршыняй аналітычнай думкі ў беларускай дарэвалюцыйнай этнаграфіі сталі працы *Яўхіма Карскага*, выдатнага філолага-славіста, заснавальніка беларускага мовазнаўства, этнографа і фалькларыста. Яго навуковая дзейнасць вылучаецца шматграннасцю і плённасцю. Я. Карскі напісаў больш за 700 (!) прац па славістыцы, беларусістыцы, этнаграфіі і фальклору. Яго даследчыцкі талент быў прызнаны і навуковай супольнасцю. У 1901 г. ён быў абраны членам-карэспандэнтам Пецярбургскай Акадэміі навук, а ў 1916 г. становіцца акадэмікам. Ужо пасля рэвалюцыі ён становіцца правадзейным членам Інстытута беларускай культуры (1922) і Чэшскай Акадэміі навук (1929).

Галоўнай у навуковай спадчыне Я. Карскага з'яўляецца трохтомная праца "Беларусы" (1903 – 1916), названая энцыклапедыяй беларусазнаўства, – вышэйшае дасягненне еўрапейскай славістыкі канца XIX – пачатку XX стст. На аснове глыбокага, комплекснага, параўнальна-гістарычнага аналізу вялікага фактычнага матэрыялу ён навукова абгрунтаваў, што беларускі этнас існуе як нацыянальная адзінка з самабытнай культурай і асобнай мовай. У сваёй працы Я. Карскі на высокім навуковым узроўні разглядае пытанне этнагенезу беларусаў, прыходзячы да высновы, што яны з'яўляюцца аўтахтонным насельніцтвам краіны, а як асобны этнас беларусы сфармаваліся ў XIII – XV стст.

На падставе моўных прыкмет Я. Карскі вызначае межы этнічнай беларускай прасторы. Аднак ігнараванне пры гэтым іншых фактараў (матэрыяльнай і духоўнай культуры, этнічнай самасвядомасці) прывяло да шэрагу недакладнасцяў. Так, значную частку тэрыторыі Паўднёва-Заходняй Беларусі даследчык адносіў да Украіны.

Вялікае значэнне мае і крытычны агляд навуковых прац канца XVIII – пачатку XX ст. па беларускай этнаграфіі, фальклоры, мове і літаратуры. Былі асветлены Я. Карскім і важнейшыя этапы фармавання гісторыі беларускай мовы і старабеларускай літаратуры. Падрабязна характаразуецца фанетычны і граматычны лад страбеларускай і сучаснай беларускай мовы ў яе народна-дыялектных і літаратурныі формах.

Вялікую ўвагу надаў Я. Карскі аналізу ўсіх жанраў беларускага фальклору і архаічных уяўленняў беларусаў, якія, на думку даследчыка, нязменна эвалюцыянавалі, а не заставаліся статычнымі, як гэта сцвярджалі прадстаўнікі міфалагічнай школы. Найбольш старажытным жанрам беларускага фальклору Я. Карскі слушна лічыў замовы, разглядаючы іх генезіс, функцыянальнасць, змест, сувязь з паганствам і хрысціянствам, мастацкую вобразнасць.

Такім чынам, навуковая спадчына Я. Карскага стала трывалым падмуркам для новага этапа развіцця беларусазнаўства, у тым ліку і беларускай этнаграфіі.

Падсумоўваючы гісторыю развіцця дарэвалюцыйнай беларускай этнаграфіі, неабходна адзначыць наступнае:

– беларуская этнаграфія развівалася ў цеснай сувязі з этнаграфіяй Расіі і, часткова, Польшчы, прайшоўшы на працягу XIX ст. эвалюцыйны шлях ад краязнаўча-аматарскіх твораў рамантычнага накірунку да высокапрафесійных этнаграфічных даследаванняў канца XIX – пачатку XX стст.;

– пераважная ўвага дарэвалюцыйных даследчыкаў была звернута на больш “рэльефныя”, яскравыя праявы народнай культуры (фальклор, вераванні, абрадавасць) у той час, як даследаванні матэрыяльнай культуры былі адзінкавымі;

– асноўная маса даследаванняў насіла эмпірычны характар і, фактычна, мела выгляд зборнікаў этнаграфічных матэрыялаў і фальклорных першакрыніц, аналітычнае ж асэнсаванне зафіксаваных звестак практычна адсутнічала;

– у адрозненне ад заходняй этналогіі, этнаграфія Усходняй Еўропы, у тым ліку Беларусі, не вылучаецца распрацоўкай тэарэтычных мадэлей і канцэпцый, адсюль – адсутнасць уласных навуковых школ;

– беларускія этнографы XIX – пачатку XX стст. сабралі, сістэматызавалі і класіфікавалі велізарную, нават па еўрапейскіх мерках, колькасць фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, якія адыгрываюць выключную ролю першакрыніц і ў сучасных этналагічных даследаваннях;

– беларуская этнаграфія XIX – пачатку XX стст. (у асобе яе найбольш прагрэсіўных прадстаўнікоў) стала важкім фактарам станаўлення беларускай нацыі, паколькі ва ўмовах Расійскай імперыі і моўнай русіфікатарскай палітыкі ўрада здолела навукова і прадметна даказаць самастойнасць беларускага этнасу, адметнасць яго мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры; істотным чынам спрыяла абуджэнню этнічнай і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

## 2.4. Беларуская савецкая этнаграфія

### 2.4.1. Беларуская этнаграфія ў 1920 – 30-я гг.

У першыя паслярэвалюцыйныя гады, у сувязі з ваеннымі дзеяннямі на тэрыторыі Беларусі, пытаннямі беларускай этнаграфіі займаліся навуковыя ўстановы Масквы і Петраграда. У 1918 г. у Петраградзе было створана Беларускае вольна-эканамічнае таварыства, у працы якога ўдзельнічаў А. Сержпутоўскі. Ён горача падтрымаў ідэю стварэння БССР і клапаціўся аб правільным вызначэнні яе межаў, лічыў, што навуковым крытэрыем пры вызначэнні этнічнай тэрыторыі беларусаў павінна быць не рэлігія, а мова і сукупнасць культурна-бытавых рыс насельніцтва. У тым жа 1918 г. у Маскве быў створаны Беларускі народны універсітэт, дзе лекцыі па этнаграфіі Беларусі чыталі Д. Анучын, У. Дабравольскі, У. Пічэта і інш. На аснове прачытаных лекцый у 1918 – 1920 гг. быў выдадзены курс “Беларусазнаўства”. З дзевяці артыкулаў гэтай працы, што асвятляюць розныя бакі этнічнай гісторыі, гаспадаркі і побыту беларусаў, чатыры часткова або цалкам прысвечаны пытанням этнаграфіі, асабліва артыкулы М. Янчука і У. Пічэты. У іх на падставе разгляду паходжання, этнічнай гісторыі, асаблівасцяў матэрыяльнай і духоўнай культуры даказвалася права беларусаў на нацыянальна-дзяржаўнае развіццё.

Пасля вызвалення Беларусі, у 1921 г. у Мінску была створана Навукова-тэрміналагічная камісія, якая стала першым навуковым цэнтрам Беларусі і ўжо ў 1922 г. была ператворана ў Інстытут беларускай культуры. У 1925 г. пры Інбелкульце была створана самастойная этнаграфічная секцыя, у якой працавалі вядомыя этнографы: І. Сербаў, А. Сержпутоўскі, П. Дземідовіч. У 1927 г. секцыя была ператворана ў кафедру этнаграфіі, якую ўзначаліў правадзейны член Інбелкульта, вядомы дзеяч беларускага Адраджэння, гісторык, этнограф, мовазнаўца *Вацлаў Ластоўскі*, што, паверыўшы ў перспектывы беларускага нацыянальнага будаўніцтва ў межах БССР, вярнуўся на Беларусь з літоўскай эміграцыі. Але яшчэ ў Літве даследчыцкая дзейнасць В. Ластоўскага вылучалася надзвычайнай актыўнасцю. У 1923 – 27 гг. у Коўне ён выдае навукова-літаратурны часопіс “Крывіч”, дзе прапагандуе “крывіцкую” канцэпцыю паходжання беларусаў, паводле якой этна- і дзяржаватворчай адзінкай з’яўляліся крывічы, здолеўшыя стварыць першую незалежную дзяржаву (Полацкае княства) на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, у сваю канцэпцыю В. Ластоўскі ўкладаў выразна ідэалагічны сэнс. Ён лічыў, што этнонім “беларусы”, які з’явіўся вельмі позна (XVII ст.),

не адпавядае гістарычна-культурным асаблівасцям этнаса, а толькі спрыяе яго асіміляцыі з боку рускіх (па аналогіі белыя рускія), у той час, як найменне "крывічы" спрыяла б умацаванню гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці народа.

Трэба адзначыць, што гэтая ідэя карыстаецца папулярнасцю і ў пэўных колах сучаснай беларускай інтэлегенцыі (глядзі, напрыклад, часопісы "Крыўя" №№ 1 – 3, 1994 – 1996, "Druvis" № 1, 2004).

Апрача "крывіцкай" канцэпцыі, часопіс змяшчаў каштоўныя матэрыялы па этнаграфіі Беларусі, артыкулы, прысвечаныя асобным старонкам этнічнай гісторыі Беларусі, гісторыі народнай асветы, праблемам мовазнаўства.

У 1924 г. В. Ластоўскі выдаў "Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік", каштоўнасць якога заключалася ў тым, што акрамя асноўнага лексічнага масіву ён уключаў слоўнік асабовых імён, слоўнік тэрмінаў арніталагічных і батанічных, што ў беларускім мовазнаўстве было зроблена ўпершыню. Таксама В. Ластоўскі з'яўляецца аўтарам фундаментальнага даследавання "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі" (1926), дзе прааналізавана звыш 1000 тэкстаў X – XIX стст., якія адлюстроўваюць фармаванне і станаўленне беларускай мовы і літаратуры.

Па пераездзе ў БССР В. Ластоўскі фактычна ўзначальвае айчынную этнаграфію, арганізоўвае шматлікія этнаграфічныя экспедыцыі ў розныя куткі Беларусі. Пад час адной з іх ён знайшоў Крыж Еўфрасінні Полацкай. Паралельна даследчык працуе над фундаментальнай манаграфіяй "Матэрыяльная культура Беларусі XVI – пачатку XX стст.".

Моцным імпульсам для ўздыму айчыннай этнаграфіі ў 1920-х гадах стала дзяржаўная палітыка беларусізацыі і масавы краязнаўчы рух, які разгарнуўся па ўсёй краіне. У 1924 г. было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК), якое каардынавала дзейнасць мясцовых краязнаўчых арганізацый, а з 1925 г. пачынае выходзіць перыядычны друкаваны орган ЦБК – часопіс "Наш край", які не толькі змяшчаў каштоўныя ў навуковым плане карэспандэнцыі з рэгіёнаў, але друкаваў інструкцыі, анкеты, апытальнікі і іншыя метадалагічныя матэрыялы, распрацаваныя вядучымі спецыялістамі (этнографамі, фалькларыстамі, археолагамі і інш.), што дазваляла ўзняць краязнаўчыя даследаванні на высокі навуковы ўзровень. Плён фальклорна-этнаграфічнага пошуку краязнаўцаў Беларусі быў больш чым унушальны. Яны сабралі 150 тысяч картак-слоў мовы, больш за 30 тысяч узораў фальклору, каля 200 розных калекцый.

Усяго перад вайной у Акадэміі навук БССР (утворана на базе Інбелкульта ў 1929 г.) захоўвалася каля 70 тысяч адзінак этнаграфічных апісанняў і фальклорных тэкстаў, да 10 тысяч фотаздымкаў і 2 тысяч этнаграфічных экспанатаў.

Побач са збіральніцкай вялася і актыўная даследчыцкая праца. У 1928 г. І. Сербаў апублікаваў манаграфію “Вічынскія паляне”, у якой грунтоўна ахарактарызаваў традыцыйныя гаспадарчыя заняткі (земляробства, жывёлагадоўля, рыбалоўства, пчалярства, садаводства і інш.) і матэрыяльную культуру (паселішчы, сядзібы, жыллё, гаспадарчыя пабудовы, адзенне, прылады працы) жыхароў аднаго з невялікіх этнаграфічных раёнаў на левабярэжжы Прыпяці. Цэнтрам рэгіёна было сяло Вічын (адсюль і назва кнігі).

Асаблівасцям народнага дойлідства Палесся была прысвечана праца рускай даследчыцы *Наталлі Лебедзевай* “Жыллё і гаспадарчыя пабудовы БССР” (1929), дзе не толькі апісваецца палеская сядзіба, але і ўказваюцца супольныя рысы ў традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў, украінцаў і рускіх.

У галіне вывучэння народных вераванняў самай буйной працай 1920 – 30-х гадоў з’яўляецца фундаментальны зборнік А. Сержпутоўскага “Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў” (1930), дзе прыведзена вялізная колькасць уяўленняў, вераванняў, прыкмет, якія суправаджалі жыхароў Случчыны (менавіта там быў сабраны матэрыял) ад нараджэння да самое смерці, былі неад’емнай часткай гаспадарчых заняткаў, каляндарных абрадаў і побыту. Зборнік А. Сержпутоўскага тыпалагічна паўтарае ранейшае выданне М. Нікіфароўскага (1897) і дазваляе параўнаць асаблівасці светапогляду жыхароў Паўднёвай і Паўночнай Беларусі.

Грунтоўнае даследаванне, прысвечанае традыцыйнай духоўнай культуры Віцебшчыны, выдае малады, але таленавіты этнограф і фалькларыст *Алесь Шлюбскі*. У 1927 – 28 гг. у двух частках выходзяць “Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны”. Першая частка “Матэрыялаў…” змяшчае замовы Падзвінскага рэгіёна (сярод якіх шмат надзвычай архаічных узораў), а таксама песні з апісаннем каляндарных рытуалаў гадавога цыклу. Практычна ўсе тэксты суправаджаюцца грунтоўнымі аўтарскімі каментарыямі аб ступені распаўсюджанасці той ці іншай этнаграфічнай (фальклорнай) з’явы, яе архаічнасці, наяўнасці ў іншых рэгіёнах Беларусі. Надзвычай каштоўным з’яўляецца матэрыял, прысвечаны феномену знахарства ў Паўночнай Беларусі.

Другая частка “Матэрыялаў…” падрабязна апісвае сямейны быт сялянства Віцебшчыны: радзінныя, вясельныя, пахавальныя рытуалы з адпаведнымі фальклорнымі блокамі.

Вывучэнню дахрысціянскіх вераванняў і рытуалаў, якія захаваліся ў этнічнай беларускай культуры канца XIX – пачатку XX стст., былі прысвечаны манаграфіі *Мікалая Нікольскага* "Міфалогія і абраднасць валачобных песень" (1931) і "Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства" (1933). У першай працы аўтар дэтальна характарызуе архаічныя земляробчыя культы веснавога і летняга цыклаў, аналізуе персанажы як уласна валачобнага рытуала, так і вялікодных песень.

У даследаванні "Жывёлы…" М. Нікольскі абагульніў і сістэматызаваў архаічныя вераванні беларусаў, звязаныя з жывёламі, выказаў меркаванне, што яны бяруць свае вытокі ў першабытнай эпосе, калі асноўным гаспадарчым заняткам было паляўніцтва.

Творчая атмасфера, якая панавала ў беларускай навуцы ў 1920-х гадах, спрыяла распрацоўцы новых тэм у этнаграфіі. Так, у 1928 г. выходзяць грунтоўныя аналітычныя артыкулы *Уладзіміра Баршчэўскага* "З гісторыі фалёктанізму", дзе аўтар даследуе рэшткі фалічнага культа на Беларусі, прыводзіць шматлікія гістарычна-культурныя паралелі, тлумачыць сутнасць гэтай рытуальнай з'явы, і *Міхаіла Мялешкі* "Камень у вераваннях і паданнях беларуса", у якім упершыню былі абагульнены этнаграфічныя звесткі пра ўшанаванне каменя на Беларусі, прыведзены адпаведныя легенды і паданні, ахарактарызаваны рытуальныя дзеянні, звязаныя з культам каменя.

Даследаванне беларускага фальклору і этнічнай культуры даволі актыўна праводзілася і ў Заходняй Беларусі, якая па ўмовах "Рыжскага міру" 1920 г. апынулася ў складзе Польшчы. Нягледзячы на дыскрымінацыйную палітыку польскіх уладаў у дачыненні да беларусаў, даследаванні такіх польскіх этнографаў як К. Машынскі і Ч. Пяткевіч вылучаюцца навуковай аб'ектыўнасцю і высокім прафесіяналізмам.

Адным з буйнейшых даследчыкаў беларускай традыцыйнай культуры ў 1920 – 30-х гадах, безумоўна, з'ўляецца *Казімір Машынскі*, прафесар Ягелонскага і Віленскага універсітэтаў, акадэмік Польскай Акадэміі навук. Даследаваннем беларускага Палесся навуковец пачаў займацца яшчэ да рэвалюцыі. К. Машынскі прадпрымае шматлікія экспедыцыі ў Цэнтральнае Палессе, па выніках якіх былі напісаны змястоўныя артыкулы "Нататкі пра славянскую тапаграфічную і фізіяграфічную тэрміналогію…" (1921), "Пра народную культуру паўднёва-сярэдняга Палесся" (1925). Аднак цалкам экспедыцыйныя матэрыялы былі абагульнены ў манаграфіі "Усходняе Палессе. Этнаграфічныя матэрыялы…" (1928), дзе адлюстраваны прырода краю, побыт, гаспадарчыя заняткі жыхароў, іх духоўная і грамадская куль-

тура (абрады, вераванні, фальклор). У трохтомным капітальным даследаванні “Народная культура славян” (1929 – 39) ён спрабаваў абагульніць звесткі па культуры ўсяго славянскага свету, разглядаў беларускую культуру і фальклор упоравень з усёй агульнаславянскай культурай. У 1930-х гадах К. Машынскі актыўна вывучаў музычнае і інструментальнае мастацтва Палесся; рабіў запісы беларускіх народных мелодый і фальклору на фанограф.

Бліжэйшым калегам К. Машынскага ў справе вывучэння народнай культуры Палесся быў *Чэслаў Пяткевіч*, ураджэнец Хойніцкага павета. Вынікам яго даследаванняў стаў шэраг грунтоўных этнаграфічных артыкулаў: “Душа і смерць у вераваннях беларусаў” (1930), “Вялікдзень на Беларусі” (1932), “Земляробчыя боствы ў вераваннях беларусаў” (1933) і інш.

Першай фундаментальнай манаграфіяй Ч. Пяткевіча стала праца “Рэчыцкае Палессе: Этнаграфічныя матэрыялы. Ч. 1. Матэрыяльная культура” (1928). У 1938 г. быў апублікаваны працяг даследавання: “Духоўная культура Рэчыцкага Палесся: Этнаграфічныя матэрыялы”. Для прац Ч. Пяткевіча характэрна ўсебаковае асвятленне народнага побыту і культуры беларусаў Палесся, дасканалая перадача моўных асаблівасцяў рэгіёну.

Сярод беларускіх даследчыкаў, якія цікавіліся народнай культурай, можна назваць *Рыгора Шырму*, які збіраў і вывучаў песенны фальклор Заходняй Беларусі (усяго сабрана звыш 2 тысяч песень розных жанраў), і мастака *Язэпа Драздовіча*, які зрабіў шэраг графічных замалёвак узораў народнага дойлідства, прылад працы і прадметаў сялянскага побыту, адзення, а таксама занатаваў каштоўную этнаграфічную інфармацыю, адносна народнай культуры Глыбоччыны і Міёршчыны, у сваім “Дзённіку”, які быў апублікаваны толькі ў 1992 годзе.

У 1930-х гадах на Беларусь абрынуліся палітычныя рэпрэсіі, інспіраваныя сталінскім рэжымам, які быў сур’ёзна занепакоены імклівым нацыянальным будаўніцтвам Беларусі, фармаваннем цэлай плеяды творчай беларускай інтэлегенцыі, што не толькі фарміравала беларускую нацыянальную ідэю, але і абуджала нацыянальнае самаўсведамленне ўсяго грамадства. Пачынаецца барацьба з “нацыянал-дэмакратамі”, якія, нібыта, мелі на мэце адасабленне Беларусі ад СССР і ператварэнне яе ў буржуазную рэспубліку. У выніку рэпрэсій былі арыштаваны і растраляны вядомыя краязнаўцы і этнографы М. Каспяровіч, В. Ластоўскі, М. Мялешка і іншыя беларускія даследчыкі. У лагеры на лесараспрацоўках захварэў і памёр А. Шлюбскі. Ганебны ўдзел у “выкрыцці нацдэмаў” у этнаграфіі прынялі

М. Нікольскі і С. Вальфсон (вядомы сваёй псеўдаэтнаграфічнай працай “Аб ленінскім этапе ваяўнічага атэізму”, 1932).

Цалкам была знішчана краязнаўчая дзейнасць на Беларусі, згорнута і этнаграфічная адукацыя ў ВНУ, на многія дзесяцігоддзі забаронены шэраг перспектыўных тэм у этнаграфіі.

Разгром беларускай этнаграфіі давяршыла Другая Сусветная вайна. Падчас фашысцкай акупацыі былі разрабаваны багацейшыя этнаграфічныя калекцыі, знішчаны архівы этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, рукапісы ўжо падрыхтаваных да друку даследаванняў.

Такім чынам, у сярэдзіне 1940-х гадоў беларуская этнаграфія, як самастойная акадэмічная навука, практычна спыніла сваё існаванне.

### 2.4.2. Беларуская савецкая этнаграфія 1950 – 1980-х гадоў

Калі ў даваеннай і, тым больш, у дарэвалюцыйнай беларускай этнаграфіі прыярытэтнае месца займалі даследаванні традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, то ў пасляваенныя гады малалікі сектар этнаграфіі, які быў створаны ў 1945 г. пры АН БССР, асноўную ўвагу надае матэрыяльнай культуры. Відавочным становіцца і ідэялагічны акцэнт этнаграфічных даследаванняў. Так, у 1950-х гадах у асноўным вывучаюцца: быт калгаснай вёскі, рабочага класа Беларусі, сялянскі быт у партызанскіх зонах.

Бадай адзіным адступленнем ад заяўленай тэматыкі з’яўляецца праца М. Нікольскага “Паходжанне і гісторыя беларускай вясельнай абраднасці” (1956), работу над якой даследчык распачаў яшчэ да вайны. Апрача прыгаданай працы, больш аніводнай (!) навуковай манаграфіі па беларускай этнаграфіі ці фальклярыстыцы ў 1950-х гадах не выйшла. Такога беларуская этнаграфія не ведала за ўсю гісторыю свайго існавання.

Арганізацыйна сітуацыя прынцыпова мяняецца ў 1957 г., калі ў АН БССР быў створаны асобны *Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору* (ІМЭФ), з асобным сектарам этнаграфіі. Стварэнне ІМЭФ спрыяла актывізацыі этнаграфічных і фальклорных даследаванняў, а таксама падрыхтоўцы прафесіянальных кадраў па розных профілях этнаграфічнай навукі. Супрацоўнікі сектара этнаграфіі распрацавалі калектыўную маннаграфію “Беларусы”, дзе на шырокім гістарычным фоне было прааналізавана развіццё важнейшых аспектаў быту і культуры беларусаў, пачынаючы ад крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы да пачатку 1960-х гадоў. У скарочаным варыянце манаграфія была змешчана ў шматтомным выданні Інстытута этнаграфіі АН СССР “Народы свету” (1964).

Аднак, па-ранейшаму, вядучай у навуковых даследаваннях была тэма сацыялістычнай перабудовы побыту і культуры, што знайшло яскравае адлюстраванне ў калектыўных працах: "Будаўніцтва камунізму і сацыяльныя змены ў сялянства Беларусі" (1966), "Быту і культуры сяла – паўсядзённую ўвагу" (1969).

У 1960-х гадах у кантэксце актыўнай барацьбы з рэлігіяй і "рэлігійнымі перажыткамі", якая разгарнулася ў СССР (варта прыгадаць, што найбольшая колькасць беларускіх храмаў была знішчана менавіта ў гэты час), этнографам ставілася задача пошуку "стыхійнага атэізму і матэрыялізму" ў беларускай народнай культуры і выкрыцця "рэакцыйнай сутнасці рэлігіі", шкаданоснасці рэлігійных вераванняў і магічных практык (знахарства). Працы, якія рэалізавалі гэтую задачу, вылучаюцца ідэалагічнай тэндэнцыйнасцю, заснаванай на аднабокім разуменні марксісцкай трактоўкі рэлігіі, штучным падборам этнаграфічнага і фальклорнага матэрыялу, які не ўлічваў шматаспектнасці і поліварыятнасці народнай беларускай культуры і асаблівасцяў традыцыйнага светапогляду беларусаў. Сярод найбольш знакавых публікацый у дадзеным накірунку можна назваць наступныя: "Пытанні рэлігіі і атэізму" (1960), "Антырэлігійныя казкі, частушкі, прыказкі" (1961), "Беларускі народ супраць папоў і рэлігіі" (1969).

Асобнае месца займаюць артыкулы і манаграфіі *Леаніда Мінько*: "Перажыткі знахарства і іх шкоднасць" (1964), "Метады і формы барацьбы з перажыткамі знахарства" (1964), "Святая вада" (1965), "Знахарства" (1971). Аўтар добра валодаў этнаграфічнымі і фальклорнымі матэрыяламі па магічных прыёмах у народнай медыцыне, прыводзіў багата факталагічных звестак у сваіх працах, але трактаваў іх выключна з крытычнага, матэрыялістычнага боку. Так, у манаграфіі "Знахарства" Л. Мінько характарызуе лекавую магію як "паразітычны нарост на целе народнай медыцыны" (Минько Л.Н. Знахарство. – Мн., 1971. – С. 16), хаця, насамрэч, феномен знахарства значна больш глыбокі, шматфункцыянальны і адыгрывае ў межах традыцыйнай супольнасці (у сучаснай вёсцы таксама) выключную ролю, з'яўляючыся неад'емнай часткай народнай медыцыны. З другога боку, несумненную навуковую каштоўнасць маюць даследаванні Л. Мінько, прысвечаныя сістэме народных ведаў (астраномія і касмалогія, метэаралогія, матэматычныя, батанічныя і заалагічныя веды, рацыянальныя прыёмы народнай медыцыны): "Сродкі народнай медыцыны ў беларусаў" (1964), "Народная метэаралогія" (1967), "Народныя веды" (1993).

Адным з галоўных прыярытэтаў пасляваеннай беларускай этнаграфіі становіцца вывучэнне традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў.

Першай буйной працай у азначаны перыяд стаў “Усходнеславянскі этнаграфічны зборнік. Нарысы народнай матэрыяльнай культуры рускіх, украінцаў і беларусаў у XIX – пачатку XX стст.”, які быў падрыхтаваны спецыялістамі Інстытута этнаграфіі АН СССР (Я. Бломквіст, Н. Лебедзева, Г. Маслава) і характарызаваў народнае дойлідства, ткацтва і адзенне ўсходніх славян. Вывучэннем матэрыяльнай культуры ў 1960-я гады займалася *Лідзія Малчанава*. У манаграфіі “Матэрыяльная культура беларусаў” (1968) былі даволі падрабязна разгледжаны важнейшыя аспекты вытворчай дзейнасці беларусаў у дарэвалюцыйны час, традыцыйныя прылады працы, сялянскія паселішчы, сядзібы і жыллё, адзенне, ежа і інш.; робяцца спробы выявіць рэгіянальную спецыфіку і ўзаемасувязі з культурай суседніх раёнаў.

У 1981 г. даследчыца выдае даследаванне “Нарысы матэрыяльнай культуры беларусаў XVI – XVIII стст.”, дзе прасочваецца гістарычная эвалюцыя асноўных форм матэрыяльнай культуры.

Навукоўцы ІМЭФ сумесна з этнографамі Украіны і Малдовы падрыхтавалі рэгіянальны “Гістарычна-этнаграфічны атлас Украіны, Беларусі і Малдовы”, на базе якога былі выдадзены калектыўныя манаграфіі: “Беларускае народнае жыллё” (1973), “Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў” (1974) і “Беларускае народнае адзенне” (1975).

Далейшую распрацоўку гістарычна-этнаграфічнага раянавання матэрыяльнай культуры беларусаў праводзіў *Віктар Цітоў*: “Гістарычна-этнаграфічнае раянаванне матэрыяльнай культуры беларусаў XIX – пачатку XX стст.” (1983). Гэтая манаграфія і калектыўная праца “Помнікі этнаграфіі” (1981) былі падрыхтаваны ў сувязі са стварэннем *Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту*. Арганізацыя “музея пад адкрытым небам” пачалася ў 1976 г. на беразе р. Пціч, непадалёк ад Мінску. Згодна праекта і распрацаваных сектарам этнаграфіі ІМЭФ навуковых рэкамендацый у аснову музея пакладзены тэрытарыяльна-этнічны, функцыянальна-падпарадкавальны, гістарычны і сацыяльны прынцыпы. Экспазіцыйная зона складаецца з сектараў, прысвечаных матэрыяльнай і мастацкай культуры асноўных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (Падзвінне, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Заходняе і Усходняе Палессе) і сектара “мястэчка”. Кожны сектар утварае адпаведны рэгіёну тып паселішча, у які ўваходзяць помнікі драўлянага дойлідства XVII – пачатку XX стст. У экспазіцыі размешчаны грамадскія, жылыя, гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы, у інтэр’ерах – прадметы хатняга ўжытку, прылады промыслаў і рамёстваў, адзенне, творы народнага мастацтва і інш.

У 1970 – 80-х гадах вядзецца актыўная праца па вывучэнні традыцыйных промыслаў і рамёстваў, у выніку якой з’яўляецца шэраг грунтоўных даследаванняў: В. Цітоў “Народныя дрэваапрацоўчыя промыслы Беларусі 1917 – 1941 гг.” (1976), *Іван Браім* “Рыбалоўства ў Беларусі” (1976), *Ганна Курыловіч* “Беларускае народнае ткацтва” (1981), *Сяргей Мілючэнкаў* “Беларускае народнае ганчарства” (1984). Усе пазначаныя працы леглі ў аснову фундаментальнай калектыўнай манаграфіі “Промыслы і рамёствы Беларусі” (1984). Пазней выходзяць асобныя даследаванні *Станіслава Цярохіна* “Паляўніцтва ў Беларусі” (1986) і “У святле канкрэтнага факта” (1988). Апошняя праца ўпершыню апісвае гісторыю і рэгіянальна-сацыяльную спецыфіку ап’яняльных напіткаў на Беларусі.

Народнае мастацтва Беларусі ў гэты час не столькі навукова вывучалася, колькі рэпрэзэнтавалася пасродкам багата ілюстраваных альбомаў: “Беларускае народнае мастацтва” (1951), “Беларускі народны арнамент” (1955), “Беларуская народная архітэктурная разьба” (1958), “Слуцкія паясы” (1960), “Беларускае народнае адзенне” (1981).

Адпаведна духу эпохі, значная ўвага ўдзялялася даследаванню сацыялістычных пераўтварэнняў у беларускай этнічнай культуры: А. Мялешка “Савецкая сямейная абраднасць Беларусі” (1976), яго ж “Сучасныя традыцыі, святы і абрады” (1976), “Сучасныя грамдзянскія абрады і традыцыі” (1985). Як правіла, усе гэтыя працы носяць выразна прапагандысцкі характар, што значна зніжае іх навуковую вартасць.

На працягу 1970 – 80-х гадоў этнографы ІМЭФ планамерна і на новым навуковым узроўні праводзілі вывучэнне сям’і з выкарыстаннем сацыялагічных метадаў даследавання. Анкетнымі даследаваннямі было ахоплена звыш 10 тысяч гарадскіх і сельскіх сем’яў па наступных параметрах: структура і жыццядзейнасць сям’і, колькасны і роднасна-сваяцкі яе склад, сацыяльна-прафесійны і адукацыйны ўзровень, арыентацыя на монаэтнічныя і змешаныя шлюбы.

Асобна даследавалась сямейная абрадавасць беларусаў. Упершыню была зроблена спроба прасачыць гісторыю беларускай сям’і, пачынаючы з XIV ст. і да нашых дзён, ахарактарызаваць дынаміку змен, якія адбываліся на працягу трох эпох – феадалізму, капіталізму і савецкага часу. Вынікі шырокамаштабнага даследавання знайшлі сваё адлюстраванне ў калектыўных манаграфіях: “Змяненні ў быце і культуры сельскага насельніцтва Беларусі” (1976), “Змяненні ў быце і культуры гарадскога насельніцтва Беларусі” (1976). Падагульняючай працай стала манаграфія “Сям’я і сямейны быт беларусаў” (1990).

Сучасныя этнічныя працэсы, якія адбываюцца ў беларускім горадзе даследаваны ў даволі фундаментальнай манаграфіі "Этнічныя працэсы і лад жыцця" (1980), дзе ў якасці крыніц выкарыстаны матэрыялы этнасацыялагічных даследаванняў і перапісаў насельніцтва Беларусі.

Складаныя працэсы імклівай урбанізацыі Беларусі 1950 – 70-х гадоў, іх перадумовы, прычыны і вынікі, уплыў на сацыяльную структуру беларускага этнаса грунтоўна прааналізаваны ў працы *Галіны Каспяровіч* "Міграцыя насельніцтва ў гарады і этнічныя працэсы" (1985).

Значная ўвага ў паваенны час надавалася пытанням этнагенезу і этнічнай гісторыі Беларусі. У 1940 – 50-х гадах выходзяць працы шэрагу гісторыкаў (У. Пічэта, Ф. Канстанцінаў, А. П'янкоў і інш.), якія лічылі асноўным этнатворчым фактарам сацыяльна-эканамічныя ўмовы ў той час, як уласна этнакультурныя фактары былі прааналізаваны недастаткова.

Найбольш значнай працай 1960-х гадоў, у якой разглядаюцца пытанні этнагенезу беларусаў, з'яўляецца манаграфія *Майсея Грынблата* "Беларусы. Нарысы паходжання і этнічнай гісторыі" (1968). У сваім даследаванні М. Грынблат у агульных рысах аб'яднаў асноўныя дасягненні гісторыкаў, філолагаў, антраполагаў, археолагаў і іншых спецыялістаў па пытаннях узнятай праблемы. Даследчык распрацаваў перыядызацыю этнічнай гісторыі Беларусі, якая мае наступны выгляд: VI – VIII стст. – перыяд славянскай каланізацыі тэрыторыі Беларусі; IX – XIII стст. – перыяд старажытнарускай народнасці, якая з'яўлялася адзіным коранем рускай, украінскай і беларускай народнасцяў; XIV – XVI стст. – перыяд фармавання беларускай народнасці; XVII ст. – канец XVIII ст. – перыяд далейшага развіцця беларускай народнасці; канец XVIII ст. – 1861 г. – перыяд складвання перадумоў для ўтварэння беларускай нацыі. Аўтар сцісла характаразуе кожны з пазначаных перыядаў. Галоўная думка даследчыка заключаецца ў тым, што, негледзячы на ролю старажытнарускай народнасці ў этнічнай гісторыі беларусаў, аснову для фармавання беларускай народнасці склалі плямёны крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў.

Сур'ёзны навукова-метадалагічны ўдар па тэорыі старажытнарускай народнасці, якая панавала ў савецкай гісторыяграфіі і разглядала ўсходніх славян часоў Кіеўскай Русі (X – XIII стст.), як адзіную этнічную супольнасць (народнасць), нанесла "балцкая" канцэпцыя паходжання беларусаў, распрацаваная расійскім археолагам *Валянцінам Сядовым* і рэпрэзэнтаваная на старонках часопіса "Савецкая этнаграфія" (1967, 1969).

На думку В. Сядова, этналінгвістычныя і іншыя асаблівасці беларускай народнасці склаліся не на аснове этнічнай спецыфікі заходніх частак

Кіеўскай Русі, а ў выніку асіміляцыі прыйшлымі славянамі ўсходнебалцкага насельніцтва, якое пражывала на тагачаснай тэрыторыі Беларусі, і фарміравання балцкага субстрату (ад лац. “*substratum*”, аснова, на якой размешчана што-небудзь), у этнічным разуменні, – элементы культуры і мовы папярэдняга насельніцтва, якія захаваліся ў прыйшлага этнаса і сфармавалі спецыфічныя рысы яго культуры і мовы). Як лічыў даследчык, балцкі ўплыў праявіўся ў фанетычных і лексічных асаблівасцях беларускай мовы (значная колькасць балтызмаў: “дойлід”, “еўня”, “куль”, “свіран” і інш.), вераваннях (культ каменя і змяі) і пабытовай культуры. У канцэпцыі асноўны акцэнт рабіўся менавіта на этна-культурныя працэсы, якія разглядаюцца як першапрычыны фармавання беларускай этнічнай спецыфікі. У той жа час, у адрозненне ад ранейшых даследчыкаў (У. Пічэта, А. П’янкоў і інш.), В. Сядоў лічыў, што стварэнне і фармаванне беларускага этнаса не мае прамой залежнасці ад палітычнай гісторыі і эканамічнага развіцця.

Канцэпцыя В. Сядова выклікала актыўную навуковую дыскусію і жорсткую крытыку з боку апанентаў (М. Грынблат, П. Траццякоў, В. Жучкевіч і інш.). Паколькі канцэпцыя падрывала ўстойлівую ідэалагему пра спрадвечнае адзінства рускіх, украінцаў і беларусаў, то яна ўсяляк ігнаравалася афіцыйнай беларускай навукай. Невыпадкова, што ў 1973 г. у Мінску была забаронена навуковая канферэнцыя, прысвечаная пытанням этнагенезу, паколькі там меўся выступіць В. Сядоў і прыхільнікі яго канцэпцыі.

Новым крокам у вывучэнні праблемы этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў з’явілася даследаванне калектыву этнографаў *Васіля Бандарчыка*, *Ігара Чаквіна*, *Паўла Церашковіча* і інш., увасобленае ў манаграфіі “Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя” (1985). У працы прааналізаваны практычна ўсе працы рускіх, беларускіх, украінскіх, польскіх, чэшскіх і іншых вучоных, у якіх разглядаюцца ці закранаюцца пытанні этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў, што дало магчымасць выказаць даволі аб’ектыўны і ўзважаны погляд на гэтую праблему.

Вельмі падрабязна ў паваенны час была даследавана гісторыя ўласна беларускай этнаграфіі. У манаграфіях В. Бандарчыка “Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст.” (1964), “Гісторыя беларускай этнаграфіі пачатку XX ст.” (1970), “Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі” (1972) і інш., былі ахарактарызаваны асноўныя тэндэнцыі, накірункі і навуковыя плыні ў беларускай этнаграфіі, дзейнасць арганізацый і навукоўцаў, якія вывучалі этнічную культуру беларусаў.

Укараненню этнаграфіі ў вышэйшай адукацыі надзвычай паспрыяў грунтоўны вучэбны дапаможнік Міхаіла Піліпенкі “Этнаграфія Беларусі” (1981), які ахапіў практычна ўсе аспекты этнаграфічнай навукі, у тым ліку, гісторыю этнаграфічнага вывучэння Беларусі, этнічную гісторыю, гаспадарку і матэрыяльную культуру, грамадскі і сямейны быт і духоўную культуру беларусаў.

Нельга не адзначыць і надзвычай актыўнай і плённай навуковай дзейнасці ў разглядаемы перыяд беларускіх фалькларыстаў, вынікам якой стала унікальная шматтомная серыя “Беларуская народная творчасць”. Для падрыхтоўкі выдання былі выкарыстаны матэрыялы з друкаваных крыніц, архіваў Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы; значную частку склалі экспедыцыйныя запісы апошніх дзесяцігоддзяў. Кожны том прысвечаны пэўнаму жанру фальклора, суправаджаецца тэарэтычным уступным артыкулам, у якім даецца вызначэнне жанру, асвятляецца гісторыя збірання і вывучэння матэрыялу, характарызуюцца крыніцы, аналізуюцца ідэйна-тэматычныя і мастацкія асаблівасці твораў, абгрунтоўваюцца прынцыпы класіфікацыі і сістэматызацыі. Творы суправаджаюцца каментарыямі з указаннем крыніц, варыянтаў у беларускім і адпаведнікаў у замежным фальклоры. Пачынаючы з 1970 г. выдадзена каля 40 тамоў серыі, што робіць гэты збор беларускага фальклору адным з самых прадстаўнічых не толькі ў еўрапейскай, але і сусветнай фалькларыстыцы. Актыўную працу ў складанні і выданні серыі прынялі А. Фядосік (кіраўнік праекта), М. Грынблат, В. Ялатаў, Г. Барташэвіч, А. Гурскі, К. Кабашнікаў, А. Ліс, Л.Малаш, Л. Салавей, І. Цішчанка, якім за значны ўклад у развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1986 г. была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР.

Своеасаблівым падсумаваннем здабыткаў беларускай этнаграфіі і фалькларыстыкі, грунтоўнай квінтэсэнцыяй навуковага і метадалагічнага вопыту, стала першая ў айчыннай гістарыяграфіі энцыклапедыя “Этнаграфія Беларусі” (1989), якая змяшчае сотні артыкулаў, прысвечаных, фактычна ўсім пытанням, што закраналіся беларускімі этнографамі і фалькларыстамі на працягу апошніх 200 гадоў.

### 2.4.3. Беларуская этналогія на сучасным этапе

У сувязі з крызісам марксісцкай ідэялогіі і набыццём Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці, айчынная этнаграфія набыла новы імпульс для свайго развіцця.

Актыўна пачынаюць выкарыстоўвацца міждысцыплінарныя, структурна-семантычныя метады даследавання, багаты метадалагічны вопыт

заходніх краін ужо не разглядаецца як "буржуазны"; практычна няма тэм, закрытых для навуковага пошуку. Надзвычай інтэнсіўнымі (у тым ліку, дзякуючы сучасным СМІ) сталі навуковыя кантакты з замежнымі калегамі.

Надзвычай шырокая грамадская цікавасць да здабыткаў і спецыфікі беларускай народнай культуры, прыцягнула да этнічных праблем (нераспрацаваных ці маларaспрацаваных) даследчыкаў, якія этнографамі і фалькларыстамі ў прафесійным значэнні не з'яўляліся. Так, грунтоўнае даследаванне "культа каменя" на тэрыторыі Беларусі было праведзена *Эрнстам Ляўковым* ("Маўклівыя сведкі мінуўшчыны", 1992). Ушанаванне "святых крыніц" на Беларусі актыўна і шырокамаштабна даследавалі археолагі Эдвард Зайкоўскі і Людміла Дучыц ("Жыватворныя крыніцы Беларусі", 2001). Сяргей Санько, філосаф і культуролаг, бадай упершыню ў айчыннай гісторыяграфіі разгледзеў такія катэгорыі, як "Мадэль свету"; "Карціна свету" і іх значэнне ў традыцыйным беларускім светапоглядзе ("Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралёгіі", 1998).

Безумоўна, станоўчы ўплыў на развіццё этнаграфічных даследаванняў аказвае і фальклорна-этнаграфічнае краязнаўства, якое пасля рэпрэсій 1930-х гг. фактычна перажывае другое нараджэнне. Асобна хацелася вылучыць найбольш масавае і дзейснае "Студэнцкае этнаграфічнае таварыства", якое ўзначальвае таленавіты арганізатар, этнограф і фалькларыст Аляксей Глушко. Толькі за апошнія гады ўдзельнікі "...Таварыства" правялі некалькі дзесяткаў палявых экспедыцый у родных кутках Беларусі, сабралі велізарную колькасць фальклорна-этнаграфічных тэкстаў, зрабілі сотні аудыё-, фота-, відэафіксацый, стварылі ўласны архіў.

Апошняе дзесяціголдзе стала надзвычай плённым і для навуковых супрацоўнікаў ІМЭФ. Актыўна і творча распрацоўваюцца, як традыцыйныя, так і маладаследаваныя тэмы.

Структуру і функцыі беларускага пахавальнага абрада, яго рэгіянальную спецыфіку падрабязна даследаваў *Уладзімір Сысоў* ("Беларуская пахавальная абраднасць...", 1995), радзінную абраднасць беларусаў, з выкарыстаннем вялікай колькасці архіўных, друкаваных і палявых матэрыялаў грунтоўна прааналізвала *Тацяна Кухаронак* ("Радзінныя звычаі і абрады беларусаў, 1993). Надзвычайную ўвагу даследчыкаў, прыцягнула да сябе тэма народнага календара, амаль забароненая ў савецкі час. За кароткі часавы перыяд з'яўляецца цэлы шэраг навуковых прац, прысвечаных дадзенай праблематыцы: "Беларускі народны каляндар" (пад рэд. Ю. Лозкі), 1993; *Васіль Ліцьвінка* "Святы і абрады беларусаў", 1997; У. Сысоў "З кры-

ніц спрадвечных”, 1995; *Іван Крук* “Следам за сонцам…: Беларускі народны каляндар”, 1998 і шэраг іншых.

Працы фальклярыста *Аляксея Ненадаўца* “Каму пакланяліся продкі” (1996); “Сілаю слова. Чорная і белая магія” (2002) прысвечаны даследаванню архаічных народных уяўленняў, феномену знахарства і чарадзейства. Аднак, пры значнасці тэмы, яны носяць хутчэй апісальны, чым навукова-аналітычны характар.

Калі працы прыгаданых даследчыкаў носяць пераважна апісальны характар, то манаграфіі *Таццяны Валодзінай* “Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў” (1997); “Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў” (1999), у тэарэтычным плане на парадак вышэй. Даследчыца не толькі цудоўна ведае прадмет вывучэння, але і ўмела выкарыстоўвае метады і прынцыпы семіялогіі, што дазваляе глядзець на народную культуру не адчужана, а, нібы вачамі ўласна носьбіта традыцыйнай культуры і разумець, што азначае кожны сімвал, кожнае дзеянне.

Не саслабела ўвага даследчыкаў у гэты час і да традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў, адметнасцяў народнага мастацтва.

Так, *Сяргей Сергачоў* (“Беларускае народнае дойлідства”, 1992) і *Аляксей Лакотка* (“Беларускае народнае дойлідства”, 1991; “Пад стрэхамі прашчураў”, 1995) падрабязна і дэтальна, з вялікай колькасцю фотаздымкаў і схем, ахарактарызавалі тэхналогію, сацыяльную і рэгіянальную спецыфіку беларускага дойлідства. Нажаль, аўтары чамусці не звярнулі ўвагу на вялікую колькасць магічных прыёмаў, якія абавязкова суправаджалі будаўнічы рытуал у беларускай вёсцы XIX – пачатку XX стст.

Змястоўныя даследчыцкія працы *Вольгі Фадзеевай* (“Беларускі ручнік”, 1994) і *Вольгі Лабачэўскай* (“Повязі часоў – беларускі ручнік”, 2002) прысвечаны маладаследаванаму элементу культуры і мастацтва – беларускаму традыцыйнаму ручніку, спосабам яго вырабу і аздаблення, сімволіцы арнаменту, рытуальным функцыям.

Народнаму мастацтву прысвяціў сваю аднайменную працу і *Яўген Сахута*. Грунтуючыся на матэрыялах пераважна XIX – XX стст., даследчык, тым не менш, стварае даволі падрабязную, аналітычную панараму беларускага народнага мастацтва, акцэнтуючы сваю ўвагу на асноўныя яго віды: мастацкая апрацоўка дрэва; ганчарства; мастацкая апрацоўка металу; вырабы з саломы, лазы, бяросты, паперы; роспіс; ткацтва і вышыўка.

Вялікую навуковую і грамадскую (у кантэксце масавага фальклорнага руху) цікавасць уяўляе сабой праца *Іны Назінай* “Беларускія народныя

музычныя інструменты” (1997), у якой прасочваецца гісторыя інструментальнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі, пачынаючы ад Сярэдневечча. У кнізе даецца апісанне канструкцыі, форм вырабу практычна ўсіх інструментаў, што бытавалі яшчэ ў XIX – пачатку XX стст., раскрываецца спецыфіка іх бытавання, рытуальныя і бытавыя функцыі. З пазначанай працай пэўным чынам перагукваецца і калектыўная манаграфія (З. Мажэйка, Т. Варфаламеева, І. Назіна і інш.) “Беларуская этнамузыкалогія: Нарысы гісторыі (XIX – XX стст.)” (1997), дзе разкрываецца станаўленне і развіццё беларускай этнамузыкалогіі (музычнай фалькларастыкі) ў XIX – XX стст. у непарыўнай сувязі з самой народнай музычнай традыцыяй; у сістэме беларусістыкі ў цэлым.

Грунтоўную, аналітычную манаграфію, прысвечаную праблемам этнагенеза і этнічнай гісторыі беларусаў, выдаў у 1991 г. *Міхаіл Піліпенка* (“Узнікненне Беларусі: новая канцэпцыя”). Праца вылучаецца не толькі абшырнай і змястоўнай характарыстыкай гісторыяграфіі праблемы, але і ўласна аўтарскім, даволі абгрунтаваным поглядам на пытанне фармавання беларускага этнаса (народнасці). На яго думку, непасрэднымі продкамі беларускага народа з’яўляліся не этнічныя адзінкі ранняга сярэднявечча (крывічы, радзімічы, дрыгавічы), як гэта лічыў М. Грынблат, а дзве вялікія групы ўсходнеславянскай супольнасці. Цэнтрам адной з іх з’яўлялася Папрыпяцце, другой – Падзвінне. Такім чынам, ужо ў межах ВКЛ, у XIV – XV стст., у выніку змешвання папрыпяцкай і падзвінска-падняпроўскай груп, іх моўных, культурных, бытавых асаблівасцяў і ўтвараецца беларускі этнас (народнасць).

Паступальная і плённая навукова-даследчыцкая праца на сучасным этапе вядзецца і беларускімі фалькларыстамі. Высокімі навукова-тэарэтычнымі і аналітычнымі вартасцямі вылучаюцца працы *Арсена Ліса*: “Валачобныя песні” (1989), “Жніўныя песні” (1993), “Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў” (1998) і інш. Не спынілася і выданне шматтомнай фальклорнай серыі “Беларуская народная творчасць”: “Замовы” (1992), “Жаніцьба Цярэшкі” (1993), “Песні Беласточчыны” (1997) і шэраг інш.

На вялікую і шырокую грамадскую цікавасць да пытанняў этнічнай культуры беларусаў і разгортванне актыўных краязнаўча-этнаграфічных даследаванняў не ў малой ступені паўплывалі перавыданні дарэвалюцыйных прац (Я. Баршчэўскага, А. Кіркора, М. Нікіфароўскага, Я. Карскага і інш.).

Аднак, апагеем здабыткаў беларускай этнаграфіі на сучасным этапе, своеасаблівым адлюстраваннем яе акадэмічнасці, грунтоўных метадалагіч-

ных напрацовак і багацейшага вопыту даследаванняў стала васьмітомная серыя “Беларусы” (выйшла ў друк сем тамоў). Кожны том быў сфармаваны па тэматычным прынцыпе: Т. 1 (1995) “Промыслы і рамёствы беларусаў”; Т. 2 (1997) “Дойлідства”; Т. 3 (2001) “Гісторыя этналагічнага вывучэння”; Т. 4 (2001) “Вытокі і этнічнае развіццё”; Т. 5 (2001) “Сям’я”; Т. 6 (2004) “Грамадскія традыцыі”, Т. 7 (2004) “Вусная паэтычная творчасць”. Досвед шматлікіх даследчыкаў, што вывучалі народную культуру Беларусі вось ужо амаль 200 гадоў, і які ўвасоблены ў гэтым выданні, мае неацэннае значэнне для далейшага развіцця айчыннай навукі.

Такім чынам, у апошнія дзесяцігоддзі беларуская этнаграфія трывала становіцца на грунт агульнаеўрапейскай этналогіі, гэта значыць на шлях творчага навуковага мыслення і асэнсавання таго, што збіралася, занатоўвалася цэлымі пакаленнямі беларускіх этнографаў.

## Асноўная літаратура

Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. – Мн., 1964.

Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст. – Мн., 1970.

Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. – Мн., 1972.

Беларусы: У 8 т. Т. 3. Гісторыя этналагічнага вывучэння. – Мн., 1999.

Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989.

## Літаратура для паглыбленага вывучэння тэмы

Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму. – Мн., 1989.

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. – Мн., 1989.

Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. – Мн., 1980.

Каханоўскі Г. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. – Мн., 1984.

Мальдзіс А. І ажываюць спадчыны старонкі. – Мн., 1994.

Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. – Мн., 1985.

# ТЭМА 3. ЭТНІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

**1. Рассяленне індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі.**

**2. Славянская каланізацыя тэрыторыі Беларусі.**

**3. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай: этна-культурны аспект.**

**4. Беларускі этнас у канцы XVIII – пачатку XXст.: пачаткі фарміравання беларускай нацыі.**

**5. Беларуская нацыя ў XX – пачатку XXI ст.: праблемы і перспектывы развіцця.**

Першапачатковае насельніцтва на сучаснай этнічнай тэрыторыі беларусаў з'явілася ў канцы сярэдняга старажытнакаменнага веку, прыкладна 40 тысяч год да н. э. Спачатку былі заселены толькі некаторыя мясцовасці ў басейнах рэк Прыпяць, Ясельда і Сож. Завяршэнне ледавіковага перыяду дазволіла ў 9 – 5 тысячагоддзі да н. э. старажытнаму насельніцтву засяліць усю тэрыторыю Беларусі. Усё яно належала да 1-га гаспадарча-культурнага тыпу, уяўляючы сабой паляўнічых, збіральнікаў і рыбаловаў.

Этнічны склад насельніцтва тых часоў застаецца для нас невядомым. Існуе меркаванне, што ў неаліце частка насельніцтва на тэрыторыі Падзвіння, магчыма, размаўляла на мовах уральскай сям'і, яе фіна-угорскай галіны.

## 3.1. Рассяленне індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі

У эпоху неаліту (3 – 2 тысячагоддзі да н.э.) на тэрыторыі Беларусі адбываюцца вельмі значныя этнічныя перамены. На змену папярэдняга насельніцтва прыходзяць шматлікія плямёны так званай "Шнуравой керамікі", якія занялі вялізную тэрыторыю ад Волгі да Ніжняга Рэйна, ад Паўднёвай Скандынавіі да вярхоўяў Эльбы і Днястра, у тым ліку Сярэдняе Падняпроўе. Насельніцтва культур "Шнуравой керамікі" ўжо займаліся прымітыўным земляробствам і жывёлагадоўляй, а назву атрымалі з-за характэрнага арнаменту ў выглядзе адбітка шнура на керамічным посудзе. Прыблізна ў гэты ж час, на глебе культур "Шнуравой керамікі" сфармавалася і балцкая галіна індаеўрапейцаў, арэал пашырэння якой ахопліваў басейны Віслы, Нёмана, Зах. Дзвіны і Верхняга Падняпроўя. На тэрыторыі Беларусі балтам належалі Днепра-Дзвінская культура, культура Штрыхаванай керамікі і, магчыма, Мілаградская культура.

Вядучую ролю ў эканоміцы балтаў адыгрывала паляванне і рыбалоўства. З удасканаленнем прылад вытворчасці, што было выклікана вынаходніцтвам і шырокім распаўсюджаннем (VII – V ст. да н.э.) на тэрыторыі Беларусі вырабаў з жалеза, вядучай галіной гаспадаркі становіцца земляробства.

Рост прадукцыйных сіл садзейнічаў паяўленню і паглыбленню супярэчнасцей паміж родамі і плямёнамі, што і выклікала неабходнасць пасяляцца на ўмацаваных паселішчах-гарадзішчах, якія былі найбольш распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі ў раннім жалезным веку (7 ст. да н.э. – 4 ст. н.э.). З развіццём земляробства пачалі з'яўляцца неўмацаваныя пасяленні – *селішчы*, дзе жыло некалькі вялікіх, а потым і малых сем'яў. Як правіла, селішчы размяшчаліся непадалёк ад гарадзішчаў, дзе насельніцтва магло схавацца ў выпадку ваеннай пагрозы.

## 3.2. Славянская каланізацыя тэрыторыі Беларусі

Як асобная галіна індаеўрапейцаў славяне вылучыліся прыкладна да сярэдзіны 1 тыс. да н.э. Эпоха вялікага перасялення народаў (III – VII ст. н.э.) выклікала масавыя міграцыі народаў, у тым ліку і славян. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі адбывалася ў некалькі этапаў. Першая моцная групоўка славян з'явілася на праваберэжжы Прыпяці яшчэ ў VI – VII стст., Цэнтральную Беларусь славяне пачалі засвойваць у VIII ст., а Падзвінне – толькі ў IX ст.

Рухаючыся з Поўдня на Поўнач па Дняпры славяне адрэзалі частку ўсходніх балтаў ад іх асноўнага масіва. Частка балтаў была выцеснена на Паўночны Захад, частка знішчана, пра што сведчаць сляды пажараў на некаторых балцкіх гарадзішчах VII – VIII стст., але значная колькасць балтаў засталася жыць на ранейшай тэрыторыі.

Балты былі асіміляваны (*асіміляцыя* – этнічны працэс, які ўяўляе сабой узаемадзеянне двух этнасаў, у выніку адзін з іх паглынаецца другім і страчвае этнічную ідэнтычнасць) прыйшлымі славянамі, якія пераўзыходзілі мясцовае насельніцтва, як колькасна, так і па больш высокім узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Аднак працэс асіміляцыі не быў імгненным і ў розных рэгіёнах Беларусі расцягнуўся з IX па XII – XIII стст. Вядомы знаўца балта-славянскіх старажытнасцяў археолаг В. Сядоў лічыць, што менавіта карэннае балцкае насельніцтва стала кансалідуючай асновай, якая дала пачатак фармаванню

новай, асобнай этнічнай супольнасці. У гэтй сувязі, паказальна, што паўночна-усходнія межы рассялення балтаў у раннім Сярэдневеччы, выяўленыя археолагамі, практычна супадаюць з паўночна-усходняй мяжой беларускай этнічнай прасторы, якую ўстанавіў Я. Карскі ўжо на пачатку ХХ ст.

“Аповесць мінулых часоў” даволі падрабязна апісвае славянскія этнічныя супольнасці, якія ў асноўным засялілі тагачасную тэрыторыю Беларусі: крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў. Аўтар летапісу даволі дакладна вызначае і арэалы іх рассялення: “…друзии съдоша межю Припетью и Двиною и нарекошеся дреговичи”; “кривичи сьдять на верх Волги, и на верх Двины и на верх Днђпра…”, “и пришедъша съдоста Радим на Съжу, и прозвашася радимичи…».

Характэрна, што летапісец, як асобную этнічную супольнасць, у шэрагу пералічаных ім, прыгадвае і палачанаў: “инии седоша на Двинъ и нарекошеся полочане, ръчьки ради, яже втечеть в Двину, имянем Полота, от сея прозвашася Полочане» (Старажытная беларуская літаратура…, С. 19 – 20). Аднак, малаверагодна, што ў дадзеным выпадку, размова вядзецца пра асобную этнічную адзінку. Хутчэй за ўсё, такім чынам аўтар падкрэсліваў асобную палітычна-сацыяльную і культурна-сакральную ролю палачанаў, якія з’яўляліся этнічным ядром Падзвінскіх крывічоў і адыгралі ключавую ролю ў стварэнні першай дзяржавы ў тагачаснай Беларусі – Полацкага княства.

Дагэтуль няма адзінай думкі адносна паходжання і этымалогіі этнонімаў “крывічы”, “дрыгавічы”, “радзімічы”. Так, вядомы лінгвіст Макс Фасмэр тлумачыў паходжанне крывіцкага наймення імём родапачынальніка ўсяго племені “Крыва”. Рускі даследчык В. Тапароў звязваў гэты этнонім з імем Крэва-Крэвайціса – вярхоўнага жраца балтаў. Іншая версія тлумачыць назву “крывічы” ад слова “крэўныя” (гэта значыць блізкія па крыві), але ў межах самай вялікай этнічнай супольнасці ўсходніх славян, ды яшчэ ў часы ранняга сярэдневечча, усведамленне “крэўнасці” – з’ява даволі спрэчная.

Найбольш распаўсюджанай і агульнапрынятай версіяй паходжання назвы “дрыгавічы” з’яўляецца геаграфічная, якая выводзіць этнонім ад слова “дрыгва”. Што і, сапраўды, з’яўляецца адметным элементам палескай прыроды. Гэтаму тлумачэнню не пярэчыць і “балцкая” версія, якая ў аснове этноніма бачыць літоўскае “*drëgnas*”, мокры, сыры, вільготны. Па іншых тлумачэннях назва звязваецца са старaславянскім дрэзна “дрэва, галлё” ці асабовым імём племяннога правадыра Драгавіта /Другавіта.

Бадай, менш за ўсё спрэчак выклікае этнонім Радзімічы, бо яшчэ летапісец Нестар вывеў яго ад імя правадыра Радзіма (скарочанае форма ад славянскага імя Радзімір), які, нібыта, прывёў сваё племя з Польшчы на Пасожжа.

Аб паступовым рассяленні ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі ў IX ст. сведчаць пашыраныя тут тыпова славянскія старжытнасці – паўсферычныя пахавальныя курганы (у эпоху жалеза курганы на тэрыторыі Беларусі адсутнічалі). Аднак, сам пахавальны абрад, негледзячы на нязменнасць пахавальнага насыпу, даволі хутка эвалюцыянаваў. У VIII – IX стст. пераважаў абрад крэмацыі (трупаспалення), калі рэшткі крэмацыі змяшчалі ў спецыяльную керамічную урну, альбо змяшчалі на "ачышчаным" агнём грунце.

У X – XI стст. з'явіўся і паступова распаўсюдзіўся абрад інгумацыі (трупапакладання), а ў пачатку XI ст. рытуал трупаспалення знікае зусім, што звязана з яго рэзкай крытыкай з боку хрысціянскай царквы. З XII ст. звычай пахавання ў курганах пачынае знікаць і ў XIV ст. перамог кананічны хрысціянскі абрад пахавання.

Аднак, менавіта раскопкі курганаў далі магчымасць археолагам выявіць этнакультурныя асаблівасці крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў і, тым самым, значна ўдакладніць арэалы іх рассялення. Гэтыя адрозненні найбольш выяўныя ў жаночых упрыгожаннях: у крывічоў – бранзалетападобныя драцяныя скроневыя кольцы дыяметрам 5 – 10 см, вырабленыя з бронзы, радзей, са срэбра; у радзімічаў – 7-прамянёвыя і 7-лапчастыя скроневыя кольцы, біэліпсоідныя, язычковыя, пятлістыя і гронкавыя падвескі; у дрыгавічоў – вялікія або срэбраныя пацеркі, аздобленыя напаянымі на іх паверхню дробнымі па памерах срэбранымі шарыкамі – зерню. Другой этнічнай адзнакай з'яўляюцца скроневыя кольцы-завушніцы, на якіх замацаваны па тры металічныя пацеркі.

Паспяховае сацыяльна-эканамічнае развіццё, выгодны гандаль, асабліва на "Шляху з вараг у грэкі", спрыялі ўзнікненню гарадоў на старажытнабеларускіх землях. Паводле летапісных звестак іх налічвалася не менш за 35. Гарады ўвасаблялі ў IX – XIII стст. цэнтры княскай улады ці яе фарпосты, з'ўляліся цэнтрамі рамяства, гандлю, культуры і рэгіянальнага культу; апошняе было надзвычай важна для чалавека ранняга Сярэднявечча. Так, акрамя вядомай "Валовай азярыны" ў Полацку, якая звязваецца даследчыкамі з культам бога Вялеса і паданні пра сакральны характар якой захоўваліся яшчэ ў XIX ст., вакол горада зафіксавана не менш за дзесятак

рэлігійных аб’ектаў дахрысціянскага паходжання: астранамічны комплекс на Яновым возеры, ахвярнікі, святыя камяні, крыніцы і г.д.

Свяцілішча Пяруна на беразе Святога возера было адкрыта археолагамі ля Рагачова і, на іх думку, працягвала функцыянаваць і пасля хрышчэння Русі ў 988 г.

Беларускія паданні данеслі да нас падкрэслена “язычніцкія” сюжэты, звязаныя з заснаваннем Турава, Менска, Ваўкавыска і шэрагу інш. гарадоў Беларусі.

Такім чынам, дахрысціянская эпоха не можа разглядацца як “цёмная” і “дзікунская”, хаця б таму, што Полацк – першы горад-дзяржава паўстаў задоўга да хрышчэння, інспіраванага кіеўскім князем Уладзімірам. Не адмаўляючы культурных інавацый, прынесеных хрысціянскай царквой на тэрыторыю Беларусі (мураванае дойлідства, мастацтва кнігі і фрэскі, іканапіс і г.д.), варта адзначыць, што прызначаліся яны тагачасным гарадскім элітам: князю, баярам, дружыннікам, заможным гараджанам (прыгадайма: Кірыла Тураўскі – сын княскага намесніка; Ефрасіння Полацкая – дачка князя). Колькасць храмаў з’яўлялася сваеасаблівым маркерам прэстыжу горада і яго валадара ў хрысціянскім свеце і давала адпаведныя магчымасці на міжнароднай арэне. Часам, будаўніцтва храмаў набывала форму спаборніцтва (храм Сафіі спачатку ў Кіеве, потым – у Ноўгарадзе, у адказ – у Полацку), дзе на першае месца выступала не хрысціянская вера, а дзяржаўна-палітычны сімвалізм.

У гэтым сэнсе, утварэнне моцнага і практычна незалежнага ад Кіева Полацкага княства, якое за часамі Усяслава Чарадзея (1044 – 1101) на поўначы межавала з Ноўгарадскай зямлёй, на ўсходзе – са Смаленскай, на поўдні – з Тураўскай, а на захадзе – з Літвою, земгаламі ды іншымі балцкімі народамі, было надзвычай важным крокам у актывізацыі этнакультурнага ўзаемадзеяння ў вялікім рэгіёне і кансалідацыі не толькі крывічоў, але і часткі дрыгавічоў, балтаў, фіна-уграў. Усё гэта стварала адметны этнакультурны сімбіёз і ўсё больш аддаляла Полацк ад культурных традыцый і палітычных прыярытэтаў Кіеўшчыны.

Тэзіс пра існаванне адзінай старажытнарускай народнасці з адзінай мовай, культурай, самасвядомасцю і дзяржавай (Кіеўскай Руссю), які быў агульнапрынятым у савецкай гісторыяграфіі, на сучасным этапе развіцця навукі падаецца ўсё больш сумніўным.

Прыклад незалежнай Полацкай дзяржавы сведчыць пра адсутнасць рэальнага палітычнага адзінства ўсходніх славян і адлюстроўвае агульную тэндэнцыю паасобных княстваў і земляў да адасаблення ад Кіева і сама-

стойнасці. Гэтая тэндэнцыя была рэалізавана ў 1097 г. на з'ездзе ў Любечы, калі па рашэнні кіеўскіх, чарнігаўскіх, пераяслаўскіх і валынскіх князёў "Руская зямля" афіцыйна падзялялася на асобныя ўладанні. Адсутнасць полацкага князя на з'ездзе тлумачыцца тым, што Полацкая зямля ўжо даўно дэ-факта была незалежнай і патрэбы ў афіцыйнай санкцыі на самастойнасць не мела.

Не існавала і агульнай "старажытнарускай" самасвядомасці, якая, нібыта, выяўлялася ў этноніме "Русь" і адпаведнай назве дзяржавы. Але справа ў тым, што летапісны тэрмін "Русь" з'яўляецца надзвычай полісемантычным (шматзначным). У залежнасці ад кантэкста ён мог абазначаць варагаў, дружыну, пэўную тэрыторыю, мову, веравызнанне. Як слушна адзначыў гісторык Генадзь Сагановіч, "Аповесць мінулых гадоў" выразна супрацьпастаўляе "Рускай зямлі" Полацкую ды Смаленскую. Як вядома, асноўнае насельніцтва тагачаснай Беларусі да сярэдзіны – другой паловы XII ст. выступала ў пісьмовых крыніцах пад старымі племяннымі назвамі: найменне дрыгавічы ў летапісах выкарыстоўваецца да 1149 г., крывічы – да 1162 г., радзімічы – да 1169 г.

Прычым, раптоўнае знікненне племянных, яшчэ дахрысціянскіх найменняў магло быць не вынікам аб'ектыўных этна-культурных працэсаў, але ініцыятывай з боку царквы, якая гэтак актыўна ў XI – XV стст. змагалася з язычніцкімі антрапонімамі. Відаць, у народнай свядомасці і традыцыі гэтыя этнонімы захоўваліся яшчэ досыць доўга. Іначай, цяжка патлумачыць той факт, што замежны аўтар XV ст. называў тэрыторыю Падзвіння "зямлёй крывіцкіх русаў" (*creviczensinim russosum*). Такім чынам, у IX – XIII стст. у адносінах насельніцтва тагачаснай Беларусі пераважалі або племянныя назвы, альбо рэгіянальныя назвы-этніконы, якія адлюстроўвалі зямляцкія сувязі, лакальныя формы этнанімічнай самасвядомасці, з'яўляліся вынікам першапачатковых узроўняў этнічнай кансалідацыі насельніцтва і былі характэрнымі для многіх раннефеадальных народнасцяў. Таму разам з вядомымі ў папярэднія часы назвамі "палачане", "смаляне", "тураўцы" распаўсюджваюцца урбанізаваныя этніконы "віцябляны", "берасцяне", "піняне", "меняне" і інш. Узровень іх стабільнасці і ступень распаўсюджанасці былі рознымі. Кожная з гэтых назваў часта ахоплівала насельніцтва ўсёй воласці, княства ці зямлі і заўсёды насельніцтва гарадоў.

Што датычыцца, нібыта, адзінай старажытнарускай культуры, то казаць мы можам толькі пра уніфікаваную культуру ўсходнееўрапейскіх гарадоў (жыхары якіх складалі ўсяго 2 – 5 % насельніцтва рэгіёна). Справа ў тым, што культура горада заўсёды мае тэндэнцыю да інавацый і трафарэта-

цыі (пераймання) найлепшых культурных узораў. Скажам, калі межы Усходняй Рымскай імперыі вызначаць па архітэктурных помніках так званай "Візантыйскай школы", то мы мусім уключыць у склад імперыі значную частку Балканаў і Усходняй Еўропы.

Культура ж уласна этнічная і, асабліва, яе духоўная (моўная) кампанента найбольш яскрава прадстаўлена ў кансерватыўным вясковым асяродку, які, дарэчы, аж да сярэдзіны XX ст. складаў пераважную частку ў сацыяльнай структуры беларускага этнасу.

Агульную пісьмовую старажытнарускую мову таго часу таксама нельга лічыць этнакансалідуючым фактарам, паколькі яна істотным чынам адрознівалася ад мовы гутарковай ці народнай. Ужо ў літаратурных помніках XII – XIII стст. даследчыкі фіксуюць асноўныя рысы беларускай мовы (цэканне, дзэканне, аканне, "у" нескладовае). Але ў афіцыйнай літаратуры і жывой моўнай стыхіі сітуацыя магла быць прынцыпова рознай. Прафесар В. Сядоў іранічна заўважаў на гэты конт: "Вядома, напрыклад, што "Аповесць мінулых часоў" напісана толькі ў XII ст. Але ж ніхто на гэтай падставе лічыць XII ст. часам складвання старажытнарускай мовы не стане. Мовазнаўцы небезпадстаўна лічаць, што старажытнаруская мова склалася ў VIII ст. Беларуская мова гэткім жа чынам магла сфармавацца на некалькі стагоддзяў раней, чым яна была зафіксавана пісьмовымі дакументамі" (Седов В.В. Еще раз о происхождении белорусов // Советская этнография. – 1969. – № 1. – С. 118). Такім чынам, можна сцвярджаць, што старажытнаруская літаратурная мова ў X – XIII стст. функцыянавала ў якасці мовы пісьменнай меншасці (па прыкладу лаціны ў Заходняй Еўропе), у той час, як паралельна развіваліся моватворчыя працэсы, слаба адлюстраваныя ў афіцыйнай літаратуры, якія пазней прывялі да канчатковага фармавання старабеларускай мовы, у тым ліку і літаратурнай.

Падагульняючы, можна прыйсці да высновы, што ў VIII – пачатку XIII ст. былі закладзены асновы для фармавання беларускага этнасу, галоўнай умовай чаго стала не эфімерная старажытнаруская народнасць, але дзейснае этна-культурнае ўзаемадзеянне паміж мясцовымі балтамі і прыйшлымі славянамі, што, у сваю чаргу, абумовіла ўзнікненне культурных і моўных асаблівасцяў, якія ў далейшым сталі разглядацца як спецыфічныя рысы беларускай этнічнай культуры. Пазітыўны ўплыў на згаданыя працэсы аказала ўзнікненне гарадоў і, асабліва, незалежнай дзяржавы – Полацкага княства, што спрыяла кансалідацыі яго насельніцтва і фармаванню пачатковых (зямляцка-тэрытарыяльных) форм этнічнай самаідэнтыфікацыі.

## 3.3. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай: этна-культурны аспект

У XIII ст. беларускія землі апынуліся ў новай знешнепалітычнай сітуацыі. У выніку агрэсіі нямецкіх рыцараў, Полацк губляе Ніжняе Падзвінне і, адпаведна, страчвае жыццёва важны для гандлёвага гораду выхад да Балтыйскага мора. На барацьбу з Лівонскім ордэнам выдаткоўваюцца вялікія матэрыяльныя і людскія рэсурсы, што яшчэ больш паслабляе Полацк.

З усходу ўсім беларускім землям пагражае мангольскае нашэсце. Пагроза была тым больш рэальнай, што к 1240-м гадам манголы заваявалі практычна ўсе землі Кіеўскай Русі.

У гэты ж час мацнее Галіцка-Валынскае княства, валадары якога прэтэндавалі на паўднёва-заходнія землі Беларусі. Абароназдольнасці далёка не спрыяла і феадальная раздробленасць; на тэрыторыі Беларусі існавалі дзесяткі ўдзельных княстваў, якія часта варагавалі паміж сабой.

Але адносна стабільным заставалася становішча ў летапіснай Літве, якая займала тэрыторыю паміж Нёманам і Віліяй з цэнтрам у Наваградку і была заселена славянскім (пераважна ў гарадах), балцкім і славянізаваным балта-славянскім насельніцтвам. Гарады рэгіёна (Наваградак, Ваўкавыск, Слонім) перажывалі эканамічны ўздым і дэмаграфічны рост, а сярод этнічных літоўцаў пачынаюцца актыўныя дзяржаватворчыя працэсы, у выніку якіх вылучаюцца маладыя, энергічныя княжацкія рады, што ладзілі вайсковыя паходя на суседнія землі (у тым ліку і на Полацкую) і зацята змагаліся за ўладу ўласна ў Літве.

Менавіта літоўскі князь Міндоўг і становіцца заснавальнікам новай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага са сталіцай у Наваградку. Маладая дзяржава адразу пачынае працэс збірання ўсходнеславянскіх зямель. Полацк, багаты на палітычныя, культурныя традыцыі, ужо не мог узначаліць гэты працэс, не толькі па прычыне аслаблення сваіх палітыка-эканамічных пазіцый, але і таму, што славутая полацкая княжацкая дынастыя да сярэдзіны XIII ст. фактычна спыніла сваё існаванне: з 1250-х гг. у Полацку валадарыць Таўцівіл – пляменнік Міндоўга.

У сярэдзіне XIII – XIV ст. практычна ўсе землі Беларусі паступова ўвайшлі ў склад поліэтнічнай феадальнай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага, што мела надзвычай важнае значэнне. Бо падначаленне раздробленых усходнеславянскіх княстваў і зямель адзінай уладзе спыніла працэс феадальнага драблення і садзейнічала стварэнню ўмоў для ўмацавання сацыяльна-эканамічных і этна-культурных сувязяў паміж рознымі тэрыта-

рыяльнымі часткамі адзінай і цэласнай этнічнай тэрыторыі беларусаў, што садзейнічала іх этнічнай кансалідацыі і фарміраванню беларускай народнасці. У гэтым сэнсе, важна адзначыць, што пры адсутнасці спецыфічных прыродна-кліматычных і сацыяльна-палітычных умоў, якія спрыялі б ізаляцыі асобных груп насельніцтва, працэсы этнічнай інтэграцыі і кансалідацыі адбываюцца значна хутчэй, калі плошча займаемай этнасам тэрыторыі ў геаграфічным сэнсе цэласная, а ў этнічным – кампактная (аднародная).

Беларуская этнічная супольнасць феадальнай эпохі ў межах сучаснай Беларусі мела дастаткова кампактны арэал распаўсюджвання. Неаднародным ён быў у паўночна-заходніх раёнах, якія ўяўлялі сабой змешаную зону балта-славянскага насельніцтва.

Палітычнае аб'яднанне беларускага насельніцтва ў межах ВКЛ поўнасцю не знішчала праваой лакальнай аўтаномнасці асобных зямель, што ўскосна адбівалася на федэратыўна-тэрытарыяльным і адміністратыўным падзеле дзяржаўных тэрыторый. Амаль да сярэдзіны XVI ст. ВКЛ складалася з асобных тэрытарыяльных адзінак "зямель" – Полацкай, Віцебскай, Смаленская, Кіеўскай, Валынскай, Чарнігава-Северскай, Жмудскай, якія ў значнай ступені захоўвалі мясцовую юрыдычную самастойнасць.

Лаяльнае стаўленне літоўскіх князёў да традыцый і правоў беларускіх "зямель" не ў апошнюю чаргу тлумачыцца этнічнай структурай ВКЛ. Усходнеславянскія землі складалі большасць дзяржаўных тэрыторый. У пачатку XVI ст. уласна этнічныя землі Літвы і Жмудзі займалі толькі 1/15 частку ад усёй плошчы дзяржаўных зямель. Нават у 1569 г. калі ўкраінскія землі і Падляшша былі адабраны ў ВКЛ і інкарпараваны Польскай Каронай, беларускія землі і тады займалі большасць тэрыторыі дзяржавы. Так, Жмудзь разам з Трокскім і Віленскім ваяводствамі (хоць апошняе напалову складалася з беларускіх зямель) мелі плошчу ў 98 835 км$^2$, а Наваградскае, Берасцейскае, Менскае, Полацкае, Віцебскае і Мсціслаўскае ваяводствы – 198 600 км$^2$. Беларускае насельніцтва, адпаведна, складала большую частку ўсіх жыхароў дзяржавы.

Дамінуючае дэмаграфічнае становішча беларусаў у межах ВКЛ і высокі ўзровень развіцця іх культуры вызначылі поліэтнічны характар пашырэння іх мовы. Старабеларуская (тады яе называлі "руськая") мова была ў той час афіцыйнай дзяржаўнай мовай і сродкам зносін паміж усходнеславянскім насельніцтвам і літоўцамі-аўкштайтамі, жмудзінамі, латгаламі, а таксама больш дробнымі этнічнымі групамі татараў, габрэяў, цыганоў, караімаў і інш.

Менавіта на старабеларускай мове вялося летапісанне XV – XVI стст. (“Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”, “Беларуска-літоўскі летапіс” (1446), “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, “Хроніка Быхаўца”), былі напісаны Першы (1529), Другі (1566) і Трэці (1588) Статуты ВКЛ, якія сталі вяршыняй еўрапейскай юрыдычна-прававой думкі таго часу.

Уздым беларускай культуры XV – XVI стст. быў выкліканы не толькі творчым развіццём уласных традыцый, але і актыўным знаёмствам з культурнымі еўрапейскімі каштоўнасцямі эпохі Рэнесансу. Многія элементы еўрапейскай культуры траплялі на Беларусь праз яе ўраджэнцаў, якія атрымалі адукацыю ва ўніверсітэтах Кракава, Прагі, Вены, Караляўца (Кёнігсберга), Гэйдэльберга і інш. Толькі ў Кракаўскім універсітэце на працягу XV – XVI стст. адвучылася 430 выхадцаў з ВКЛ, пры гэтым, большасць навучэнцаў складалі дзеці мяшчан і шляхты. Па навуку ў Кракаў, як сведчаць запісы ў метрычных кнігах універсітэта, прыязджалі жыхары Берасця, Ваўкавыска, Віцебска, Полацка, Менска ды іншых беларускіх гарадоў. Успрыняцце выхадцамі з Беларусі еўрапейскіх тэндэнцый грамадскага развіцця садзейнічала пашырэнню ў ВКЛ гуманістычных ідэй, станаўленню адукацыі, сферы прафесійнай культуры.

Вяршыняй тагачаснай беларускай літаратуры стала гуманістычная дзейнасць усходнеславянскага першадрукара, пісьменніка і мастака Ф. Скарыны, прадмовы якога прасякнуты шчырым патрыятызмам. Паслядоўнікі Скарыны С. Будны і В. Цяпінскі былі актыўнымі дзеячамі беларускай Рэфармацыі, палымяна выступалі ў абарону роднай мовы і лічылі неабходным захаванне яе ў сістэме адукацыі і сярод вышэйшага саслоўя. З жыццём, побытам і звычаямі беларусаў знаёміў еўрапейскага чытача знакаміты паэт-лацініст М. Гусоўскі. Значная частка палемічнай літаратуры ў другой палове XVI – пачатку XVII ст. (М. Сматрыцкі, Л. Карповіч, С. Зізаній, А. Філіповіч і інш.) таксама выдавалася па старабеларуску.

Разам з тым, з’явілася шмат польска-лацінамоўнай літаратуры, што стварыла сітуацыю полікультурнасці і вымагала ад адукаванага чалавека ведання хоць бы трох моў, не лічачы ўжо царкоўна-стараславянскай, кнігі на якой таксама шырока бытавалі на Беларусі.

Найбліжэй да літаратуры па сваёй этнічнай самабытнасці быў тэатр. З XVI ст. вядомы школьны тэатр, сярод простага народу папулярнасцю карыстаўся лялечны тэатр Батлейка. У гэтым жа стагоддзі распаўсюдзіліся беларускія харавыя песні-гімны – канты і псалмы; склалася самабытная беларуская іканапісная школа, адбываецца росквіт драўлянай скульптуры і аб’ёмнай разьбы па дрэве, калі так званая “беларуская рэзь” стала шырока вядома за межамі Беларусі.

Перыяд XV – XVI стст. вызначаецца для Беларусі (як і для ВКЛ у цэлым) і значнай актывізацыяй працэсаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. У сельскай гаспадарцы ўзніклі і пашыраліся новыя формы і спосабы апрацоўкі зямлі, арганізацыі земляробства. Правядзенне аграрнай рэформы "Устава на валокі" (1557), якая мела на мэце ўсталяванне фальваркава-паншчыннай гаспадаркі, хоць і вяла да ўзмацнення эксплуатацыі сялянства, але аб'ектыўна спрыяла інтэнсіфікацыі сельгасвытворчасці. Двухпольны севазварот паступова змяніўся трохпольным, што дало магчымасць у фальваркавых гаспадарках вырошчваць збожжа на продаж. Паралельна з інтэнсіфікацыяй выкарыстання стараворыўных зямель праводзілася асваенне пад ворыва новых зямель. Павелічэнне ворыўных зямель суправаджалася ўзнікненнем новых вясковых паселішчаў на месцах, расчышчаных ад лесу.

Надзвычай імклівым быў рост гарадскога насельніцтва. Калі ў канцы XV ст. на Беларусі налічвалася ўсяго 48 гарадоў і мястэчак, то ўжо ў пачатку XVII ст. іх было больш за 300, а іх жыхары складалі ад 16 % да 20 % усяго насельніцтва. Не ў малой ступені рэзкаму павелічэнню колькасці мястэчак паспрыяла палажэнне Статута 1558 г., якое дазваляла шляхце засноўваць мястэчкі на ўласных землях. Сярод дзяржаўных гарадоў існавалі прыватнаўласніцкія (Быхаў, Дуброўна, Лепель, Нясвіж, Чашнікі і інш.), прычым яны складалі каля 40 % усіх гарадоў.

Многія гарады і мястэчкі карысталіся *Магдэбургскім правам*, згодна з якім насельніцтва было арганізавана ў своеасаблівыя урбанізаваныя абшчыны са сваімі органамі кіравання (радай-магістратам), судом, правамі і прывілеямі, што даваліся жыхарам з пэўным маёмасным і сацыяльным цэнзам. Даволі разнастайнымі былі і сацыяльныя катэгорыі гарадскога насельніцтва. Сярод рамеснікаў вылучаліся цэхмайстры (старэйшыны), майстры, чаляднікі, вучні, кутнікі і партачы (займаліся рамяством, але ў цэхі не ўваходзілі). Сярод іншых груп знакавымі былі гандляры, купцы, перакупшчыкі і гарадская бедната, жабракі – "людзі лёзныя", "убогія".

Ваеннаслужылыя слаі гараджан складаліся з зямян, панцырных і конных баяр, шляхты. Да асобных катэгорый адносіліся духавенства і арыстакратыя. Асобныя групы складала іншаэтнічнае насельніцтва (да 20 – 30 %): рускія, габрэі, немцы і інш.

Даволі спрыяльная сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў краіне паўплывала на значны дэмаграфічны рост. Калі ў 1528 г. колькасць жыхароў у Вялікім княстве складала прыблізна 2,5 млн чалавек, то ўжо ў 1569 г. Насельніцтва краіны налічвала 3,5 млн чалавек, з якіх больш за 1,8 млн пражывала на Беларусі. Да шляхецкага стану адносілася каля 162 тысяч чала-

век, гэта значыць да 9 % насельніцтва. Такая ўдзельная вага рыцарства (дваранства) была яшчэ толькі ў Гішпаніі, у большасці ж дзяржаў (Францыя, Чэхія, Расія) яна не пераўзыходзіла 1 %.

Як і ў любым феадальным грамадстве, у беларусаў сярэдневечча важны чыннік этнічнасці – самасвядомасць і, адпаведна, эндаэтнонім (саманазва) не мелі уніфікаванага, устойлівага характару і з'яўляліся шматузроўневымі. Насельніцтва Беларусі ў Сярэдневеччы складалася з зямляцкіх аб'яднанняў, якія называліся па галоўным горадзе зямлі – "палачане", "магілёўцы", "случане" і г.д.

Тыповым зямляцкім аб'яднаннем у XIV – XVI стст. была Полацкая зямля. Цесныя зямляцкія сувязі насельніцтва гэтай тэрыторыі этнагенетычна адносіліся яшчэ да старажытнага перыяду існавання летапісных "палачан", як аднаго з раннесярэднявечных усходнеславянскіх аб'яднанняў. Тэрытарыяльна-зямляцкі ўзровень самасвядомасці палачан узмацняўся палітычным фактарам – існаваннем у IX – XIII стст. самастойнага княства, пазней (да сярэдзіны XVI ст.) захаваннем аўтаноміі Полацкай зямлі ў складзе ВКЛ. Таму многія дакументы складаліся ад усёй зямлі, калі "каралю… били челом… бояре Полоцкие и мъщане и вся земля Полоцкая».

У XIV – XVI стст., калі значна ўзрасла актыўнасць этна-сацыяльных сувязей паміж зямляцкімі супольнасцямі Беларусі, пачало ажыццяўляцца іх аб'яднанне ў выніку працэсаў этнагенетычнай кансалідацыі і агульнадзяржаўнай інтэграцыі, што адлюстравалася ў пашырэнні этнонімаў *русіны* (рускія) і *літвіны*, якія паходзілі ад назваў Русь і Літва. Руссю, у асноўным, называлі тэрыторыю Падзвіння і Падняпроўя. Насельніцтва гэтых зямель уяўляла сабой у цэлым аднародны этнічны масіў з агульнай рэлігіяй (праваслаўнай), этнічнай самасвядомасцю, з падобнымі элементамі культуры і моўнымі дыялектамі. Пры гэтым "русіны" Вялікага княства выразна адрознівалі сябе ад вялікарусаў, называючы апошніх "маскоўцамі" ці "маскалямі". У канкрэтным кантэксце тэрмін "рускі" мог выконваць функцыю канфесіёніма і азначаў прыналежнасць да праваслаўнай (рускай) веры: "літвін веры рускай".

Кампактны арэал існавання назвы літвіны быў звязаны з тапонімам Літва, які бытаваў у раёнах Верхняга Панямоння. Гэтыя землі былі поліэтнічынмі і мелі ў сваім складзе ўсходнеславянскае і балцкае насельніцтва. Паколькі ў XVI – XVII стст. Літвой называлі ВКЛ, то тэрмін "літвін" выконваў ролю палітоніма – так называлі ўсіх жыхароў краіны безадносна іх этнічнага паходжання і рэлігійнай прыналежнасці.

У пачатку XVII ст. на землі Падзвіння і Падняпроўя распаўсюджваецца тапонім "Белая Русь", а насельніцтва гэтых рэгіёнаў пачынае называць сябе "беларусцамі". Але калі пачаткова гэтае найменне насіла тапанімічны сэнс, то ўжо ў другой палове XVII ст. яно мае выразна этнічны змест. З'явіліся вызначэнні "родам беларусец", "беларускія гарады", "беларуская мова" і нават "беларуская вера" (уніяцтва).

Такім чынам, асноўным вынікам дзейнасці комплексу сацыяльна-эканамічных, палітычных, этнічных працэсаў XIV – XVI стст. на Беларусі з'явілася складванне самастойнай этнасацыяльнай супольнасці феадальнага тыпу – беларускай народнасці і яе асноўных этнічных прыкмет – мовы, культуры, самасвядомасці.

Аднак, беларуская народнасць, як паўнавартасная этнасацыяльная супольнасць была даволі няўстойлівай і слаба кансалідаванай з-за шэрагу сацыяльна-палітычных і рэлігійных фактараў.

Надзвычай важнай для чалавека Сярэдневечча з'яўлялася рэлігія, якая шмат у чым фармавала яго светапогляд, каштоўнасныя арыенціры і нават магла замяшчаць сабой этнічнае самавызначэнне.

У пэўным сэнсе, адзіная рэлігія (канфесія) ў межах дзяржавы спрыяла этнічнай кансалідацыі, але сітуацыя поліканфесійнасці ў сярэдневечным грамадстве, як правіла, рана ці позна прыводзіла да сур'ёзных сацыяльна-палітычных і культурных канфліктаў (прыгадайма Рэлігійныя войны ў Еўропе).

Праваслаўе, якое распаўсюджвалася на тэрыторыі Беларусі з X ст., да сярэдзіны XVI ст. было настолькі насычана архаічнымі (язычніцкімі) элементамі народнай культуры (святары, якія падчас не ўмелі чытаць, удзельнічалі ў народных абрадах, займаліся чарадзействам, варожбамі і г.д.), што каталіцкі кардынал Д'Элі мусіў заўважыць: "Русіны (беларусы) ў такой ступені наблізілі сваё хрысціянства да язычніцтва, што нават цяжка сказаць, што пераважае ва ўтворанай сумесі: ці хрысціянства, што прыняло ў сябе язычніцкія пачаткі, ці язычніцтва, якое паглынула хрысціянскую веру".

Але такая пазіцыя праваслаўнай царквы цалкам задавальняла большасць насельніцтва Беларусі і Літвы. Фармальна з'яўляючыся хрысціянамі (не-паганцамі), беларусы і літоўцы нават у XVI ст. практычна адкрыта ўшаноўвалі святыя камяні, крыніцы, вужоў, прыносячы ім ахвяры; шырока практыкавалі знахарства і чарадзейства. Пры гэтым вера ў сілу чараў, варожбаў, замоваў была ўласціва не толькі для сялянства, але і для гараджан, шляхты і нават магнатаў.

Хрышчэнне Ягайлам у 1387 г. Літвы і Жмудзі ў каталіцкую веру ў далейшай перспектыве радыкальна змяніла этнакультурную і сацыяльна-палітычную сітуацыю на Беларусі.

З аднаго боку, касцёл выступіў на Беларусі своеасаблівым рэтранслятарам заходнееўрапейскіх культурных каштоўнасцяў, з другога боку, ён быў катэгарычна нецярпімы да архаічнай кампаненты беларускай этнічнай культуры. Ужо ў 1436 г. на тэрыторыі ВКЛ пачынае сваю дзейнасць Трыбунал Свяшчэннай Рымскай інквізіцыі, "паляванне на ведзьмаў" якога красамоўна апісаў М. Гусоўскі.

Адбыўся і сацыяльны раскол у вышэйшых пластах грамадства. Шляхта, якая прыняла каталіцызм, атрымала значныя прывелеі і ільготы (Гарадзельскі прывелей 1413 г.) і, такім чынам, была супрацьпастаўлена праваслаўнай знаці, што ў выніку прывяло да грамадзянскай вайны 1430-х гадоў.

Рэфармацыйны рух, які разгарнуўся ў ВКЛ у 1550 – 1570-х гг. і правадніком якога была, перадусім, магнатэрыя, як раз і ставіў задачу ўмацавання дзяржаўнай ідэнтычнасці пасродкам распаўсюджвання адзінай для ўсёй краіны рэлігіі. Акрамя таго, перамога рэфармацыі ў ВКЛ аўтаматычна здымала б шмат якія прэтэнзіі з боку каталіцкай Польшчы і праваслаўнай Рускай дзяржавы. Аднак адсутнасць належнай сацыяльна-эканамічнай глебы, актыўная дзейнасць езуітаў, якія ўзначалілі Контррэфармацыю, практычна звялі рэфармацыйны рух на нішто.

Пры гэтым адбывалася істотная канфесійная трансфармацыя магнацкіх радоў (Сапегі, Хадкевічы, Корсакі і інш.) і шляхты, якія ў пачатку XVI ст. яшчэ з'яўляліся праваслаўнымі, перайшлі ў кальвінізм, але пад уплывам Контррэфармацыі і, не ў малой ступені, Люблінскай уніі 1569 г., прыймалі ўжо каталіцкую веру. Такім чынам, каталіцызм у канцы XVI – XVII стст. Становіцца вызначальнай канфесіяй шляхецкага саслоўя.

Востры сацыяльны крызіс у беларускім грамадстве выклікала і гвалтоўнае распаўсюджванне уніяцтва пасля заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. У гэтай сітуацыі важна зразумець, што для большасці праваслаўных вернікаў (палемісты з шэрагу адукаваных эліт тут не ўлік) сутнасць канфлікта заключалася не столькі ў пытаннях дагматыкі, канонаў ці царкоўна-іерархічнага падпарадкавання, колькі ў самім факце пасягнення на "даўнюю", "сваю" веру. Размова ідзе пра такую вызначальную рысу феадальнай супольнасці, як *традыцыяналізм* (невыпадкова, што практычна ва ўсіх "жалаваных граматах" беларускім гарадам вялікія князі літоўскія абяцалі "старины не рухати", гэта значыць, захоўваць мясцовыя традыцыі і звычаі), калі вымушаная змена веры ў калектыўнай свядомасці разглядала-

ся як небяспечная, дэструктыўная інавацыя, што разбурае "веру дзядоў", як адну з фундаментальных асноў існуючага светаладу. Адсюль, і выступленні ў Полацку, Магілёве, Оршы і Віцебскае паўстанне 1623 г. былі, хутчэй, барацьбой НЕ супраць уніі, а барацьбой ЗА сваю "старую" веру.

Тыпалагічна тоесны канфлікт паміж традыцыяй і інавацыяй адбыўся яшчэ раней, у 1582 г. калі ў Рэчы Паспалітай, як і ва ўсёй Заходняй Еўропе, уводзіўся новы грыгарыянскі каляндар. Хваляванні ў праваслаўных гарадах і, асабліва, у Полацку былі настолькі моцнымі, што Стэфан Баторы дазволіў праваслаўнаму насельніцтву карыстацца старым юліянскім календаром. Прычына вострай незадаволенасці палачанаў, віцеблянаў і іншых "русінаў" заключалася не ў фармальнай "разбежцы" паміж старым і новым календарамі, якая на той час складала 11 дзён, а ў спробе "лацінян" (католікаў) гвалтоўна змяніць часавую мадэль свету, бо, як трапна заўважыў культуролаг С. Санько, "каляндар заўжды функцыянаваў як адна з найістотных сімвалічных сістэм і як адмысловы Супертэкст культуры, які канкураваў бадай толькі з мовай па засяроджанасці выразу таго, што прынята называць "духам народу". Такім чынам, пасягненне, нават мінімальнае, на календар і веру "русінаў" несла пагрозу этнакультурнай саматоеснасці беларусаў праваслаўнага веравызнання, якія да 1596 г. складалі пераважную частку ўсёй этнічнай супольнасці.

Рэлігійны раскол грамадства, дыскрымінацыя праваслаўнага насельніцтва ў Рэчы Паспалітай актыўна выкарыстоўваліся і знешнім ворагам – Маскоўскай дзяржавай. Рускі цар Аляксей Міхайлавіч распачаў вайну з Рэччу Паспалітай пад лозунгам абароны праваслаўных адзінаверцаў: "Костелам не быть, униатам не быть… жидам на Белоруссии не быть и жизни никакой не иметь".

Вайна 1654 – 1667 гг. сталася для беларускага этнаса сапраўднай катастрофай, якая, фактычна, спыніла ў сваім развіцці беларускі этнас. У выніку вайны колькасць жыхароў Беларусі зменшылася больш чым на палову: калі ў 1648 г. яна складала 2 млн 900 тысяч, дык у 1667 г. – 1 млн 350 тыс. чалавек. Асабліва пацярпелі паўночныя і ўсходнія рэгіёны Беларусі. Так, у Полацкім павеце было знішчана 75 % насельніцтва, у Мсціслаўскім – 71,5 %, Аршанскім – 69 %. Жудаснымі былі страты сярод гарадскога насельніцтва: Полацк згубіў 93 % сваіх жыхароў, Віцебск – 94 %, Магілёў – 75,5 %. Пры гэтым, практычна ўсё рамесніцкае насельніцтва акупаваных гарадоў палонам выводзілася ў Рускую дзяржаву. Невыпадкова, што ўжо ў 1670-х гг. беларускія рамеснікі складалі 10 % ад усяго пасадскага насельніцтва Масквы.

У крытычным стане апынулася і сельская гаспадарка. Пасля вайны больш паловы ворыўных зямель не апрацоўвалася. Агрэсія, якая здзяйснялася пад лозунгам абароны праваслаўных, прывяла да таго, што ў пасляваенны час у Рэчы Паспалітай праваслаўнае насельніцтва пачало разглядацца як патэнцыйная "пятая калона" і, адпаведна, пачало адкрыта пераследавацца: у 1673 г. праваслаўныя былі пазбаўлены права ўваходзіць у шляхецкі стан, у 1676 г. – праваслаўныя брацтвы былі пазбаўлены ўсіх прывілеяў, а праваслаўным жыхарам было забаронена выязджаць за мяжу, у 1699 г. праваслаўныя страцілі права займаць выбарныя магістрацкія пасады. Мясцовыя ўлады ставіліся да праваслаўных з адкрытай варожасцю: масавымі становяцца гвалтоўныя перахрошчванні вернікаў, канфіскацыі храмаў і царкоўнай маёмасці.

Паралельна з наступам каталіцызма завяршаецца працэс паланізацыі шляхты і фармаванне "шляхецкага народу" – саслоўнай, поліэтнічнай супольнасці Рэчы Паспалітай, асновай якой былі кампаненты польскай шляхецкай культуры, мовы, канфесійнай прыналежнасці (каталіцызм) і самасвядомасці. У другой палове XVII ст. Беларуская мова канчаткова выходзіць з ужытку ў дзяржаўнай канцэлярыі, а ў 1696 г. дзяржаўны статус у ВКЛ юрыдычна набывае польская мова. Катастрафічнае зніжэнне сацыяльнага статуса беларускай мовы прывяло да таго, што яна перастае быць мовай міжэтнічных зносін, спыняецца кнігадрукаванне на ёй, а тым больш, выкарыстанне яе ў сістэме адукацыі (рэдкае выключэнне складалі ўніяцкія базыліянскія школы).

У XVIII ст. этнакультурная і канфесійная сітуацыя, якая склалася на Беларусі ў другой палове XVII ст., сутнасна не змянілася. Больш таго, становішча ў краіне было абцяжарана крызісам цэнтральнай (каралеўскай) улады, шляхецкай анархіяй, магнацкімі міжусобнымі войнамі і "дысідэнцкім" пытаннем (па ранейшаму ў дыскрымінацыйным становішчы знаходзіліся праваслаўныя і пратэстанты).

Вялізныя страты беларускаму этнасу і яго сацыяльна-эканамічным структурам нанесла Паўночная вайна са Швецыяй (1700 – 1721), у выніку якой насельніцтва Беларусі скарацілася амаль на траціну: з 2 млн 200 тысяч да 1 млн 500 тысяч чалавек. Надзвычай моцна ў чарговы раз пацярпела гарадское насельніцтва Беларусі, не ў малой ступені "дзякуючы" саюзнаму расійскаму войску, якое ў 1708 г. зруйнавала і спаліла Віцебск, Магілёў, Гародню.

У дадатак у 1710 – 1711 гг. на Беларусі лютавала чума. У выніку колькасць гарадскога насельніцтва, у параўнанні з канцом XVII ст. зменшылася на 30 – 35 %. Больш таго, карэнным чынам мяняецца этнічная

структура беларускіх гарадоў. Напрыканцы XVIII ст. іншаэтнічнае насельніцтва (пераважна габрэі) складала ад 30 да 50 % жыхароў гарадоў і мястэчак Беларусі. Так, напрыклад, у 1780 г. у Полацку габрэйскія мяшчане складалі 54 % ад усіх жыхароў. Такім чынам, беларускае мяшчанства, як адзін з найбольш актыўных нацыятворчых пластоў грамадства, на канец XVIII ст. знаходзілася ў крытычным стане: заможная частка – паланізавана, бяднейшая адыгрывала маргінальныя (другасныя) сацыяльна-культурныя ролі і, у прынцыпе, не магла маніфеставаць этна-нацыянальныя беларускія каштоўнасці.

У параўнанні з XVI ст., калі беларуская феадальная народнасць дасягнула найбольшага росквіту, а большасць насельніцтва складалі праваслаўныя, у канцы XVIII ст. прынцыпова змянілася і канфесійная структура грамадства: каталіцкае насельніцтва складала каля 15 % ад колькасці ўсіх жыхароў Беларусі, уніяты – 70 %, праваслаўныя – 6 %, іудзеі – 7 %, пратэстанты – 2 %.

Такім чынам, *на працягу другой паловы XVII – XVIII стст. у выніку ўздзеяння неспрыяльных сацыяльна-палітычных, этна-культурных і рэлігійных фактараў беларусы ператварыліся ў этнас з няпоўнай сацыяльнай структурай*, калі адзіным носьбітам беларускай этнічнасці (этнічнасць – сукупнасць моўных, бытавых і светапоглядных характарыстык, уласцівых для канкрэтнага этнаса) засталося сялянства.

Адсюль, невыпадкова, што і ў палажэннях Канстытуцыі 3 мая 1791 г., і ў праграмных дакументах Паўстання 1794 г., негледзячы на іх аб'ектыўна прагрэсіўны характар, беларусы, як самастойны этнас, не ўзгадваюцца ўвогуле, бо на той час наяўнасць самабытнай культуры беларускага сялянства, пры адсутнасці этнічных эліт (шляхта, гараджане, царкоўныя іерархі), яшчэ не азначала, нават для патрыётаў Рэчы Паспалітай, існавання асобнага беларускага народа.

## 3.4. Беларускі этнас у канцы XVIII – пачатку XXст.: пачаткі фарміравання беларускай нацыі

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. практычна ўся этнічная тэрыторыя беларусаў апынулася ў складзе Расійскай імперыі – адной з найбольш кансерватыўных дзяржаў тагачаснай Еўропы. Прагрэсіўныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія пачаліся ў Рэчы Паспалітай у апошнія дзесягоддзі яе існавання, былі спынены. Вызначальным становіцца захаванне і нават узмацненне феадальна-прыгонніцкіх адносін.

Для прыгонных сялян, якія складалі каля 75 % насельніцтва, далучэнне да Расійскай імперыі азначала павялічэнне падаткаў; цяжкім абавязкам стала рэкруцкая павіннасць. Традыцыйная беларуская супольнасць асэнсоўвала перамену дзяржаўна-палітычнай прыналежнасці і ўзмацненне прыгнёту ў катэгорыях міфапаэтычнага мыслення і звязвала гэтыя падзеі з парушэннем існага светаладу: “Старыя сцвярджаюць, што пакуль Кацярынушка не забрала край, – зімы былі карацей, а як забрала – лета стала карацейшым” (Берман Н. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губ. // Записки имп. Рус. геогр. общ-ва. – СПб. – 1873. –Т. V. – с. 41).

Пад час праўлення Кацярыны II і Паўла I больш за 200 тысяч былых дзяржаўных сялян было перададзена ва ўласнасць рускім дваранам, што істотным чынам пагоршыла маёмасны стан сялянства і знайшло сваё адлюстраванне ў калектыўнай памяці народа: “Мы спрэжда былі багаты, было ў нас трыццаць коней. Наканец таго, заступілі памешчыкі з Масквы, асталось з трыццаці тры толькі” (Романов Е.Р. Белорусский сборник. – Витебск. – 1891. – выпуск IV. – с. 89). Такім чынам, тэзіс пра “адвечнае жаданне” беларусаў уз’яднацца з рускім народам, насамрэч, не адпавядае рэчаіснасці.

Сельская гаспадарка Беларусі, асабліва ў 1840 – 50-ыя гады, знаходзілася ў крызісным стане. Неўраджаі, застой у развіцці вытворчасці, эканамічная нестабільнасць стрымлівалі рост колькасці насельніцтва. У 1796 – 1858 гг. яго пабольшала толькі на 27 %; налічвалася 3,3 млн чалавек (у межах сучаснай Беларусі).

Вялікія страты панесла Беларусь у час Айчыннай вайны 1812 г., калі было знішчана каля 1 млн насельніцтва, а матэрыяльныя страты беларуска-літоўскіх губерняў склалі каля 160 млн рублёў срэбрам. Гаспадарчая разруха ў спалучэнні з захаванай арыентацыяй царызму на мясцовую спаланізаваную каталіцкую шляхту прывялі да канчатковай перамогі ў краі расійскіх форм прыгонніцтва, да кансервацыі нізкага ўзроўню этнічнай самасвядомасці беларусаў, да складвання на тэрыторыі Беларусі і Літвы спецыфічна польскага па зместу і формах нацыянальна-вызваленчага руху, асноўная мэта якога заключалася ў аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

Нельга не адзначыць, што шэраг мерапрыемстваў рускай адміністрацыі (скасаванне правоў магнатаў мець уласнае войска, будаўніцтва каналаў, дарог, выкуп прыватнаўласніцкіх гарадоў і мястэчак) спрыялі эканамічнаму развіццю Беларусі, у выніку чаго ў першай палове XIX ст. хуткімі тэмпамі расце колькасць гарадскога насельніцтва: у 1825 – 58 гг. яго ўдзельная вага павялічылася з 5,2 % (148 тыс. чалавек) да 10 % (316 тыс. чалавек).

У пачатку XIX ст. з’явіліся першыя прыкметы нацыянальнай кансалідацыі, што было звязана з фарміраваннем мясцовай інтэлігенцыі з ліку збяднелай шляхты і духавенства.

Інтэлектуальным цэнтрам Беларусі і Літвы быў Віленскі універсітэт, адчынены ў 1803 г. на базе Віленскай езуіцкай акадэміі. У канцы 1810-х гадоў у асяроддзі студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта пачалі фармавацца ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння. Вядучую ролю ў іх станаўленні адыгралі навукоўцы, дзеці уніяцкіх святароў, ураджэнцы беларуска-польскага ўзмежжа *Міхаіл Баброўскі* і *Ігнат Даніловіч*. На развіццё іх светапогляду вялікі ўплыў зрабілі ідэі славянскага, асабліва чэшскага нацыянальнага адраджэння. Праграма віленскай групы інтэлегенцыі прадугледжвала аднаўленне палітычнай незалежнасці ВКЛ і дзяржаўнасці беларускай мовы. М. Баброўскі і І. Даніловіч паклалі пачатак беларусазнаўству, збіраючы і публікуючы помнікі беларускага пісьменства XVI – XVII стст. Іх навуковая дзейнасць і грамадзянская пазіцыя садзейнічалі абуджэнню цікавасці да гісторыі і культурнай самабытнасці беларусаў сярод студэнтаў – сяброў таварыстваў *філаматаў* і *філарэтаў*.

Аднак, у цэлым па Беларусі на пачатку XIX ст. працэсы паланізацыі і акаталічвання мясцовага насельніцтва толькі ўзмацніліся. У значнай ступені гэта тлумачыцца пазіцыяй рускага цара Аляксандра І, які прыязна ставіўся да палякаў і разлічваў на адпаведную лаяльнасць з боку мясцовай шляхты. Акрамя таго, ён асабіста сябраваў з *Адамам Чартарыйскім*, палымяным патрыётам Польшчы, аўтарам ідэі аб уключэнні Беларусі ў склад аўтаномнага (у межах Расійскай імперыі) Польскага каралеўства. Менавіта апошні з 1802 г. узначаліў Віленскую вучэбную акругу, у якую ўваходзіла большасць навучальных устаноў на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага. Неўзабаве практычна ўся сістэма адукацыі на Беларусі робіцца польскай як па форме, так і па змесце. Азначанаму працэсу актыўна спрыялі езуіты, якія ў 1812 г. дамагліся адкрыцця ў Полацку Акадэміі з правамі універсітэта.

У гэтай сітуацыі даволі моцныя беларуска-патрыятычныя настроі выявіў уніяцкі мітрапаліт *Іраклі Лісоўскі* і частка уніяцкіх святароў, якія адкрыта выказвалі незадаволенасць шырокамаштабнай паланізацыяй і акаталічваннем. Намаганнямі І. Лісоўскага ўдалося прадухіліць падпарадкаванне базыліянскіх школ, дзе адной з моў выкладання яшчэ была “простая” (беларуская) мова, Віленскай вучэбнай акрузе і такім чынам пазбегнуць іх канчатковай паланізацыі.

Разам з тым неабходна адзначыць, што сістэма польскай, а таксама езуіцкай адукацыі, якая была больш якаснай і разнастайнай, чым руская школьная сістэма, не толькі паланізавала, але і давала выдатныя веды, якія сілкавалі пачуццё краёвага патрыятызму, абуджалі цікавасць да гісторыі Беларусі, культуры і мовы яе народа.

Пасля падаўлення паўстання 1830 – 31 гг. адносіны царскай адміністрацыі да нацыянальнай палітыкі на Беларусі рэзка змяніліся. Быў створаны спецыяльны Камітэт па справах заходніх губерняў. У 1831 г. было забаронена выкарыстоўваць польскую мову ў афіцыйным справаводстве, а ў 1836 г. – выкладаць яе як асобны прадмет у школах. Замест польскай паўсюдна ўводзілася руская мова. У 1832 г. быў зачынены Віленскі універсітэт (Полацкая езуіцкая акадэмія была ліквідавана яшчэ ў 1820 г.) – апошняя вышэйшая навучальная установа на тагачаснай тэрыторыі Беларусі. Адсутнасць вышэйшай школы істотна замарудзіла фармаванне беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі і, адпаведна, беларускай нацыянальнай ідэялогіі.

Адным з пунктаў русіфікацыі беларусаў стала, інспіраванае царскімі ўладамі "уз'яднанне" уніятаў з рускай праваслаўнай царквой, якое было афіцыйна аформлена ў 1839 г. на Полацкім царкоўным саборы. Гэта выклікала супраціўленне вернікаў-уніятаў, для якіх прыналежнасць да уніяцкай канфесіі за 200 гадоў ужо стала неад'емнай часткай традыцыі.

Адміністрацыя, асабліва на Паўночным Захадзе Беларусі, часам выкарыстоўвала дапамогу войскаў для падаўлення уніяцкіх хваляванняў. Ліквідацыя уніі суправаджалася масавым знішчэннем царкоўнай літаратуры на беларускай мове, унікальных абразоў і барочных драўляных скульптур, якія не адпавядалі праваслаўным канонам, варварскай перабудовай уніяцкіх храмаў. У 1840 г. "дзеля выдалення ў жыхароў Паўночна-Заходняга краю ўсялякай думкі пра самастойнасць існуючага ў іх заканадаўста, якое можа служыць нейкай перашкодай да зліцця іх з карэннай Расіяй" было адменена дзеянне Статута ВКЛ 1588 г. Адначасова імператар Мікалай I забараніў выкарыстанне назваў Беларусь і Літва. У афіцыйных дакументах і друку пачаў ужывацца штучны тэрмін "Паўночна-Заходні край Расіі", а беларусаў сталі называць "заходнерусамі". Адначасова пачалося афармленне ідэялогіі так званага "*заходнерусізму*", якая грунтавалася на канцэпцыі адмаўлення гістарычнасці беларусаў як самастойнай і самабытнай этнічнай адзінкі, атаясамленні іх з велікарускім этнасам. Прадстаўнікі кансерватыўнага вялікадзяржаўна-шавіністычнага кірунку ў заходнерусізме (Ксенафонт Гаворскі) лічылі этнічныя асаблівасці беларусаў вынікам польска-каталіцкай экспансіі і прапаноўвалі знішчыць іх для аднаўлення "спрадвечна

рускага характару краю". Прыхільнікі ліберальна-памяркоўнага кірунку (Міхаіл Каяловіч) прызнавалі пэўную гістарычна-этнічную адметнасць Беларусі, аднак выключалі магчымасць яе нацыянальна-культурнага дзяржаўнага самавызначэння.

Але, негледзячы на ўзмацненне русіфікацыі, у 1840 – 50-х гадах уплыў польскай культуры на Беларусі застаўся даволі моцным. Польская мова была шырока распаўсюджана сярод шляхты, інтэлігенцыі, мяшчан і нават перайшоўшага ў праваслаўе былога уніяцкага духавенства. Разам з тым, сярод шырокага кола мясцовай інтэлігенцыі пашыралася цікавасць да вывучэння фальклору, абрадавасці і звычаяў карэннага насельніцтва і гістарычнага мінулага Беларусі. Паступова з польскамоўнага літаратурнага руху вылучалася так званая беларуская школа, творчасць прадстаўнікоў якой была прысвечана Беларусі. Асобныя творы Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі былі напісаны на беларускай мове, а ў *Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча* яна стала асноўнай. Паколькі беларуская мова знаходзілася ў прыгнечаным стане і рэалізаваць яе магчымасці на прафесійным узроўні было цяжка, у першай палове XIX ст. на Беларусі з'яўляецца спецыфічны жанр – *ананімныя творы*, якія ўзніклі на сутыку фальклору і прафесійнай літаратуры. Найбольш выдатнымі творамі гэтага жанру, сапраўднымі шэдэўрамі беларускай прафесійнай літаратуры сталі парадыйна-сатырычныя паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе" (па меркаванні даследчыкаў, іх аўтарамі адпаведна з'яўляюцца ўраджэнцы Паўночна-Усходняй Беларусі Вікенці Равінскі і Канстанцін Вераніцын), якія атрымалі шырокае распаўсюджанне і папулярнасць на Беларусі.

Такім чынам, у першай палове XIX ст., як вынік кансалідацыі беларускага этнасу беларуская мова стала паступова замацоўвацца ў літаратуры, пачалася яе літаратурна-нарматыўная апрацоўка, узмацнілася яе камунікатыўная функцыя.

Аднак, сацыяльная структура этнасу ў цэлым мела яшчэ феадальна-саслоўны характар. У пачатку 1860-х гг. з 2,6 млн беларусаў (у сучасных межах Беларусі) не менш 90 % складалі прыгонныя сяляне. Па ранейшаму шляхта прылічвала сябе да палякаў, а гарады і мястэчкі вылучаліся перавагай іншаэтнічнага насельніцтва. Так, напрыклад, сярод купецтва Беларусі 72,5 % складалі габрэі.

Вельмі павольна фармавалася этнічная самасвядомасць беларусаў. І, калі ў сярэдзіне XIX ст. этнонім "беларусы" быў шырока распаўсюджаны на Віцебшчыне, Магілёўшчыне, часткова Міншчыне (паўночна-усходняя частка), то Заходняя Беларусь і Палессе вылучаліся этнічнай стракатасцю.

У заходніх рэгіёнах поруч з найбольш пашыранай назвай "ліцвіны" ўжываліся назвы "русіны", "рускія", зрэдку – "беларусы". У Палессі агульнарэгіянальная назва "палешукі" суіснавала з лакальнымі назвамі тыпу "пінчукі", "зарачане", "замшукі" і г.д., а на беларуска-украінскім памежжы – з назвай "ліцвіны".

Такім чынам, акалічнасці сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця ў сукупнасці з астатнімі фактарамі замарудзілі працэс этнічнай кансалідацыі беларусаў. У сярэдзіне XIX ст. беларускі этнас яшчэ поўнасцю не сфармаваўся ў нацыю, але ўжо не быў і феадальнай народнасцю.

Фармаванне беларускай нацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адбывалася ў складаных, супярэчлівых і даволі неспрыяльных умовах. Адмена прыгоннага права ў 1861 г. і правядзенне шэрагу буржуазных рэформ (адукацыйная, судовая, вайсковая і інш.) спрыялі ліквідацыі перажыткаў феадальнага ладу ў эканоміцы і сацыяльна-палітычнай структуры грамадства. Вялікае значэнне мела будаўніцтва новых шляхоў зносін, асабліва густой сеткі чыгунак, што пазітыўна ўплывала на павышэнне таварнасці аграрнага сектара, развіццё прамысловасці і актывізацыю гандлёва-фінансавых аперацый.

У параўнанні з дарэформеннай эпохай значна палепшылася маёмаснае становішча беларускіх сялян, што, у сваю чаргу, прывяло да сапраўднага дэмаграфічнага "выбуху" – найбольш інтэнсіўнага роста насельніцтва Беларусі за ўсю яе гісторыю. За 40 паслярэформенных гадоў колькасць жыхароў падвоілася больш чым удвая. Па дадзеных перапісу 1897 г. з 8 518 247 жыхароў пяць заходніх губерній беларусы складалі 5 408 420 чалавек (63,4 %). Аднак, пры гэтым катастрафічным дысбалансам адносна карэннага насельніцтва вылучалася этнічная структура гарадоў і мястэчак Беларусі. Так у 1897 г. у гарадах і мястэчках пражывала адпаведна толькі 2,5 і 3,7 % ад агульнай колькасці беларусаў, у той час, як у сельскай мясцовасці – 93,8 %. "Вясковы" характар беларускага этнасу непасрэдным чынам уплываў на вельмі нізкі ўзровень адукацыі сярод беларусаў (14,3 % пісьменных) тады, як сярод этнічных меншасцяў, прадстаўленых на Беларусі, ён быў значна вышэйшы: сярод габрэяў пісьменных было 42,2 %, палякаў – 41,2 %, рускіх – 29,3 %. Пазначаны фактар крайне негатыўна адбіваўся на ўсведамленні нацыянальнай самаідэнтычнасці і фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, істотна абмяжоўваў распаўсюджванне ідэй беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў шырокіх пластах грамадства, што дазваляе тыпалагічна суаднесці фармаванне беларускай нацыі з працэсамі адраджэння так званых "сялянскіх" нацый Цэнтральнай і Усходняй Еў-

ропы: латышоў, эстонцаў, славенцаў, славакаў, чэхаў і інш. (Тыпалогія беларускага нацыянальнага Адраджэння канец XIX – пачатак XX ст.: Дадатак 2).

Аднак, пры ўсіх акалічнасцях, развіццё капіталістычных адносін у эканоміцы прывяло да канчатковай ломкі феадальна-саслоўнай структуры і ўтварэння новай, буржуазнай сацыяльнай структуры беларускага этнасу. Па перапісу 1897 г. беларуская нацыянальная буржуазія складала 23,6 %, сярэдняе і беднае сялянства – 27 %, пралетарыят і паўпралетарыят – 49,4 % беларускага насельніцтва.

Уласна нацыянальна-вызваленчы беларускі рух у другой палове XIX ст., не паспеўшы яшчэ стаць уплывовай грамадска-палітычнай сілай, апынуўся пад пагрозай поўнага вынішчэння. Паўстанне 1863 – 64 гг., негледзячы на дэмакратычную, нацыянальна-свядомую пазіцыю *Кастуся Каліноўскага* і яго паплечнікаў, якія бачылі Беларусь і Літву самастойнымі краінамі ў межах супольнай з Польшчай федэратыўнай дзяржавы, у цэлым з'яўлялася прапольскім, як па складу паўстанцаў (70 % складала шляхта, што ў пераважнай большасці лічыла сябе "польскай" паводле канфесійнай прыналежнасці і культурнай арыентацыі), так і адносна галоўнай мэты – аднаўлення дзяржаўнай незалежнасці Польшчы ў межах былой Рэчы Паспалітай. Апроч таго, польскае кіраўніцтва паўстаннем практычна не прадугледжвала вырашэння аграрнага пытання – ліквідацыі панскага землеўладання.

Адсюль невыпадкова, што беларускае сялянства ў пераважнай сваёй масе, разглядала паўстанне як чужую, "панскую" справу і не толькі не падтрымала яго, але і варожа ставілася да паўстанцаў, выдаючы іх царскім уладам. Паражэнне паўстання стала сапраўднай нацыянальнай катастрофай, якая адкінула беларускі этнас у нацыянальным развіцці на некалькі дзесяцігоддзяў назад. Лепшыя прадстаўнікі дэмакратычнай інтэлігенцыі загінулі падчас ваенных дзеянняў або былі пакараны смерцю, тысячы сасланы ў Сібір ці вымушаны былі эміграваць. Царская адміністрацыя ўстанавіла на Беларусі жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым. Пад выглядам барацьбы з паланізацыяй рэзка ўзмацнілася русіфікацыя краю.

Руская мова заняла пануючае становішча ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Было забаронена друкаваць беларускія кнігі лацінкай, што фактычна азначала поўную забарону беларускага друку. У сваёй палітыцы царскі ўрад актыўна выкарыстоўваў праваслаўную царкву і народную асвету на рускай мове. Узмацніўся ціск на беларусаў-каталікоў, прымусова зачыняліся каталіцкія храмы і кляштары, адчасова было разгорнута масавае будаўніцтва праваслаўных храмаў.

Такім чынам, нацыянальна-вызваленчы рух на Беларусі змярцвеў практычна на два дзесяцігоддзі. Аднак, нягледзячы на ўсе драмтычныя наступствы, паўстанне мела адзін несумнеўны пазітыўны вынік не практычнага, але сімвалічнага плану. У асобе К. Каліноўскага беларусы займелі знакавую постаць барацьбіта за нацыянальныя інтарэсы, нязломнага патрыёта Бацькаўшчыны. У гэтым сэнсе, менавіта К. Каліноўскі стаўся першай асобай у пантэоне *нацыянальных* герояў Беларусі, чыё імя, як сімвал змагарнасці, неадменна прысутнічала на ўсіх хвалях і этапах беларускага нацыянальнага Адраджэння.

Паўстанне 1863 – 1864 гг., завяршыўшы шляхецкі этап нацыянальна-вызваленчага руху, абудзіла тым самым новую адраджэнскую генерацыю – разначынную *інтэлігенцыю*. Паколькі ва ўмовах ваеннага становішча ўсялякая грамадская несанкцыянаваная дзейнасць была немагчымай, нацыянальны рух развіваўся па-за межамі Беларусі. Да канца XIX ст. студэнцкія гурткі ўраджэнцаў Беларусі паўсталі ў Пецярбурзе, Маскве, Варшаве, Кіеве, Кракаве, Адэсе, Харкаве. У 1868 – 70 гг. у Пецярбурзе дзейнічала беларускае асветнае таварыства “Крывіцкі вязок” начале з паэтам *Вайніславам Савіч-Заблоцкім*, якое мела на мэце ўдасканаленне вывучэння беларускай мовы і гісторыі, выданне папулярных кніг і падручнікаў па дадзенай тэматыцы, прыназначальных для “чарналюду” (сялянства). У пачатку 1880-х гг. у Пецярбурзе была ўтворана беларуская народніцкая група “*Гоман*” і пачаў выходзіць аднайменны часопіс, на старонках якога знайшла адлюстраванне *першая тэорыя развіцця беларускай нацыі*. Гаманаўцы ўпершыню доказна і пераканаўча даводзілі, што беларускі этнас знаходзіцца на стадыі фарміравання самастойнай нацыі і мае для гэтага ўсе неабходныя чыннікі: агульная тэрыторыя і гістарычнае мінулае, адметная мова і культура. Разам з тым, яны ўказвалі і на праблемы, якія замінаюць кансалідацыі беларускай нацыі, а таксама на шляхі іх пераадолення. Беларусь у будучым яны бачылі асобнай і вольнай краінай у складзе сацыялістычнай федэратыўнай Расіі.

Адначасова з нелегальным нацыянальна-вызваленчым рухам, на Беларусі разгортваецца маштабнае этнаграфічнае, фальклорнае і гістарычнае вывучэнне краю, якое ў апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст. дасягнула надзвычай высокага навукова-прафесійнага ўзроўню. Парадокс заключаўся ў тым, што царскі ўрад і адміністрацыя не толькі лаяльна ставіліся да падобнага роду даследаванняў, але і фінансавалі іх, маючы спадзяванне, што сабраныя навукоўцамі матэрыялы падцвердзяць “исконно русский” характар беларускіх зямель. Вынікі былі абсалютна супрацьлеглымі – характар і змест апублікаваных этнаграфічных, фальклорных, краязнаўчых даследаван-

няў і нацыянальна-свядомая пазіцыя такіх беларускіх навукоўцаў, як М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі і інш., пераканаўча даводзілі існаванне самастойнага беларускага этнасу з адметнай культурай, мовай і ментальнасцю. Легальны характар публікацый спрыяў іх шырокаму распаўсюджанню сярод розных катэгорый насельніцтва, што, у сваю чаргу, вяло да асэнсавання беларускай нацыянальнай самаідэнтычнасці і, адпаведна, спрыяла далейшай кансалідацыі беларускай нацыі.

Да канца XIX ст. адбыліся істотныя змены і ў этнічнай самасвядомасці беларусаў. Паводле перапісу 1897 г., 74 % насельніцтва Беларусі (у сучасных межах) лічыла роднай мовай беларускую. Вельмі істотна тое, што да беларусаў сябе адносілі ўжо і 43 % саслоўя дваран. Роднай мовай беларускую лічылі 40 % чыноўнікаў, 40 % юрыстаў, 20 % урачоў, 29 % пошто-ва-тэлеграфных служачых, 60 % настаўнікаў. У выніку росту этнічнай самасвядомасці значная частка насельніцтва, якая раней адносіла сябе да палякаў, у канцы XIX ст. ужо лічыла роднай мовай беларускую. Удзельная колькасць іх зменшылася з 8,1 да 2 % (абсалютная колькасць – з 289 тысяч да 130 тысяч чалавек). Узмацненне беларускай культурна-нацыянальнай кампаненты ў краі адлюстроўвае і той факт, што нават каля 1 тыс. габрэяў і 1,4 тыс. татараў лічылі роднай мовай беларускую.

У гэты ж час, сярод шматмільённага сялянства назва беларусы выцесніла большасць лакальных этнонімаў тыпу літвіны, чарнарусы. Тэрмін Беларусь замацаваўся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй беларусаў.

У канцы XIX – пачатку XX ст. на Беларусі паскорылася развіццё прамысловасці, якая ў 1913 г. ужо давала 15 % нацыянальнага прыбытку. У той жа час, у вёсцы, па прычыне захавання панскага землеўладання і рэзкага росту сельскага насельніцтва абвастрылася праблема аграрнай перанаселенасці. Малаземелле стала асноўнай прычынай масавых міграцый за межы Беларусі. У раёны Сібіры і далёкага Усходу з 1885 г. па 1914 г. выехала больш за 500 тыс. чалавек. Каля 100 тыс. чалавек, галоўным чынам з Заходняй Беларусі, перасяляліся ў ЗША, Канаду, Бразілію, Аргенціну. Нягледзячы на пэўнае паніжэнне тэмпаў прыросту насельніцтва, яго колькасць на Беларусі ў 1913 г. складала 8,5 млн чалавек, з якіх каля 1 млн чалавек жылі ў гарадах.

У пачатку XX ст. беларусы, як этнічная адзінка, фармуюць практычна ўсе базавыя структуратворчыя элементы, якія характарызуюць *нацыянальную супольнасць*. Пералічым асноўныя з іх:

1. *Нацыянальная ідэялогія і палітыка*. Публічным выразнікам беларускіх нацыянальных інтарэсаў і прадукавальнікам нацыянальнай ідэялогіі

з'явілася першая беларуская палітычная партыя – "*Беларуская сацыялістычная грамада*", якая была створана ў 1902 г. на аснове нацыянальна-культурных гурткоў беларускай студэнцкай моладзі, што існавалі ў Мінску, Пецярбургу, Вільні. Заснавальнікамі і кіраўнікамі "Грамады" былі браты *Іван* і *Антон Луцкевічы*, *Алаіза Пашкевіч* (Цётка), *Казімір Кастравіцкі* (Карусь Каганец), *Вацлаў Іваноўскі*, *Фелікс Умястоўскі* і інш. Галоўнымі праграмнымі ўстаноўкамі БСГ было звяржэнне самадзяржаўя, сацыялізацыя зямлі і прамысловасці, перадача іх ва ўласнасць працоўных, дасягненне мясцовай нацыянальна-культурнай аўтаноміі з соймам у Вільні, стварэнне ўмоў для развіцця беларускай мовы, культуры, навукі і адукацыі;

2. *Нацыянальнае прафесійнае мастацтва і літаратура*. Працэс фарміравання беларускай прафесійнай мастацкай культуры актывізаваўся яшчэ ў апошняй чвэрці XIX ст. Прыход у беларускую літаратуру такіх нацыянальных пісьменнікаў і паэтаў, як *Францішак Багушэвіч*, *Янка Лучына*, *Альгерд Абуховіч*, *Фелікс Тапчэўскі*, спрыяў не толькі складванню нарматыўнай граматыкі беларускай літаратурнай мовы, але і ўздымаў на новую ступень нацыянальную самасвядомасць беларусаў і іх нацыянальна-вызваленчы рух. Вядучую ролю ў літаратурным працэсе пачатку XX ст. адыгрывалі *Янка Купала*, *Якуб Колас*, *Максім Багдановіч*, *Максім Гарэцкі*, творы якіх інтэнсіфікавалі працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і самаўсведамлення, перадусім, у асяродку беларускага сялянства і, да таго ж, паводле сваіх мастацка-эстэтычных вартасцяў, з'явіліся шэдэўрамі не толькі беларускай, але і сусветнай літаратуры. Рэвалюцыя 1905 – 07 гг. стварыла ўмовы для развіцця легальнага беларускамоўнага друку. За перыяд з 1907 па 1916 г. беларускія выдавецкія таварыствы "Загляне сонца і ў наша аконца", "Наша хата" і іншыя выдалі на беларускай мове 179 кніг агульным тыражом каля 286 тыс. экземпляраў. У цеснай сувязі з літаратурай развіваліся і іншыя віды прафесійнага мастацтва. У 1910 г. была заснавана *Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага* – прафесійны беларускі тэатр. Шматлікія гастролі тэатра (па гарадах Мінск, Полацк, Слуцк, Дзісна, Капыль, Вільня і інш.) і свядомая арыентацыя яго калектыву на здабыткі беларускай этнічнай і нацыянальнай культуры былі надзвычай важкім фактарам прапаганды, як беларускага мастацтва, так і традыцыйных форм духоўнай культуры беларусаў (песенны фальклор, танцы). Збіраннем і апрацоўкай народных песень займаліся кампазітары А. Грыневіч, М. Чуркін, У. Тэраўскі і інш.

3. *СМІ, навука, адукацыя*. Значную ролю ў абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці адыгрываў перыядычны друк, асабліва першыя беларускія

газеты “*Наша доля*” (1906) і “*Наша ніва*” (1906 – 1915). Рэдакцыя “Нашай нівы” (А. Уласаў, Я. Купала, Я. Колас, В. Ластоўскі, С. Палуян і інш.), як асноўную мэту выдання, разглядала сацыяльнае, нацыянальнае адраджэнне беларускага народа, а таксама развіццё мовы, літаратуры і іншых галін духоўнай культуры беларусаў, стварэнне арыгінальнага нацыянальнага стылю ў паэзіі, прозе, архітэктуры, тэатральным, музычным і выяўленчым мастацтве на аснове творчага засваення здабыткаў айчыннага фальклору і дасягненняў сусветнай мастацкай культуры. Актыўна развівалася і гуманітарная сфера нацыянальнай беларускай навукі (этнаграфія, фальклярыстыка, мовазнаўства, гісторыя). Высокім прафесійным узроўнем вылучаюцца працы і даследаванні Е. Раманава, Я. Карскага, М. Доўнар-Запольскага, А. Сержпутоўскага, якія былі выкананы з пункту гледання беларускіх нацыянальных інтарэсаў. Найбольш дакладнае канцэптуальнае выяўленне беларуская нацыянальная самасвядомасць атрымала ў працах В. Ластоўскага, асабліва ў яго “*Кароткай гісторыі Беларусі*” (1910), якія заклалі асновы нацыянальнай годнасці і самаідэнтычнасці. Упершыню беларускі этнас разглядаўся як самастойны суб’ект гістарычнага працэсу. Сітуацыя ў сістэме нацыянальнай адукацыі была больш праблематычнай, паколькі царскі ўрад, дазволіўшы пасля рэвалюцыі 1905 – 07 гг. стварэнне нацыянальных школ, не палічыў патрэбным даць такое права беларусам, якія працягвалі разглядацца як неад’емнае частка вялікарускага этнасу. Тым не менш, у 1908 – 1910 гг. на Беларусі прадпрымаюцца актыўныя спробы стварэння прыватных беларускіх школ, а Я. Колас і Цётка выдалі буквары для пачатковага навучання на беларускай мове. З’яўленне беларускіх навучальных установ стала рэальным, як гэта не парадаксальна, ва ўмовах Першай Сусветнай вайны, бо нямецкія вайсковыя ўлады даволі лаяльна ставіліся да нацыянальна-культурнай дзейнасці беларускіх арганізацый на акупаваных тэрыторыях. Так, у 1915 г. у Вільні адкрылася першая беларуская школа, у 1916 г. – беларуская настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы.

Такім чынам, пазначаныя фактары, у сукупнасці з адзінай этнічнай тэрыторыяй, самасвядомасцю і комплексам духоўна-матэрыяльнай культуры, сведчылі, што ў пачатку XX ст. беларуская нацыя ўступіла ў заключны перыяд свайго фарміравання. Пэўная слабасць і незавершанасць нацыятворчых працэсаў тлумачылася адсутнасцю беларускай нацыянальнай дзяржавы – адзіным сацыяльна-палітычным інстытутам, здольным выступіць гарантам жыццяздольнасці і паступальнага развіцця беларускага нацыянальнага арганізма.

## 3.5. Беларуская нацыя ў XX – пачатку XXI ст.: праблемы і перспектывы развіцця

Асаблівы дынамізм развіццё беларускага нацыянальнага руху набыло ў сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі 1917 г. Актывізавалася дзейнасць беларускіх палітычных партый, найбольш прадстаўнічай і ўплывовай сярод якіх з'яўлялася БСГ, што ўвосень 1917 г. налічвала каля 10 тыс. сяброў. Аднак, пры гэтым у "Грамадзе", ішло актыўнае размежаванне ліберальна-буржуазнага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірункаў. На базе апошняга ў Петраградзе ўінікла Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (БСДРП) начале з *Аляксандрам Чарвяковым*, якая кіравалася ў сваёй дзейнасці праграмай расійскіх бальшавікоў і трымалася іх тактыкі.

Яшчэ ў ліпені 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд *беларускіх нацыянальных арганізацый*, які сфармаваў *Беларускі нацыянальны камітэт* і вылучыў галоўную мэту руху – утварэнне нацыянальнай аўтаноміі ў складзе федэратыўнай Расіі. На хвалі нацыянальна-рэвалюцыйнага ўздыму ў Беларусі актыўна ўводзілася ў зварот і пашыралася нацыянальная сімволіка – бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня". На Заходнім, Паўночным, Румынскім франтах, а таксама на Балтыйскім флоце ствараецца разгалінаваная сетка беларускіх арганізацый, што ў перспектыве магло стаць асновай для беларускіх вайсковых злучэнняў, якія, ва ўмовах развала царскай арміі, маглі б абараніць Беларусь, як ад знешняй агрэсіі, так і ад мясцовых банд і расійскіх дэзерціраў.

Пасля звяржэння Часовага ўрада ў Пецярбурзе і прыходу да ўлады бальшавікоў, на Беларусі абвастрылася супрацьстаянне паміж нацыянал-патрыятычным і камуністычным рухам. Бальшавіцкія лідэры, негледзячы на дэклараванае У. Леніным права нацый на самавызначэнне, былі супраць палітычнай незалежнасці Беларусі і разглядалі яе, як разменную манету ў перамовах з немцамі аб міры. Невыпадкова, што *Савет народных камісараў Заходняй вобласці* крайне варожа паставіўся да склікання *І Усебеларускага з'езда*, што мусіў прадвызначыць далейшы лёс Беларусі, і ў снежні 1917 г. з дапамогай узброеных сіл разагнаў яго, каб прадухіліць абвяшчэнне незалежнай Беларускай рэспублікі.

Аднак, падчас нямецкага наступлення ў лютым 1918 г., калі бальшавіцкая адміністрацыя ўжо пакінула Мінск, а германскія войскі яшчэ не падыйшлі, уладу ў горадзе ўзяў Выканкам Усебеларускага з'езда. Быў створаны ўрад – *Народны сакратарыят Беларусі* і апублікавана *Першая Устаўная грамата* (21.2.1918), якая акрэсліла асноўную мэту нацыянальнага руху – "поўнае самавызначэнне" беларускага народа. Негледзячы на

тое, што нямецкія акупацыйныя ўлады не прызналі гэтыя органы ўлады, яны працягвалі працаваць. У адказ на заключэнне Брэсцкага мірнага трактата (3.3.1918) паміж Савецкай Расіяй і Германіяй, які ўзаконьваў падзел беларускіх зямель паміж бакамі ваеннага канфлікту, была выдадзена *Другая Устаўная грамата* (9.3.1918), якая абвяшчала ўтварэнне *Беларускай народнай рэспублікі* (БНР) у межах этнічнай беларускай прасторы. Неўзабаве пачынае працаваць *Рада БНР* (І. Серада, А. Бурбіс, Я. Варонка, В. Захарка, браты Луцкевічы і інш.) – заканадаўчая ўстанова з функцыямі парламента.

*Трэцяя Устаўная грамата* (25.3.1918) абвясціла дзяржаўную незалежнасць Беларусі. Стварэнне БНР стала сведчаннем спеласці нацыянальнага руху, сам факт яе абвяшчэння меў значны ўплыў на развіццё нацыянальнай свядомасці. Пачалося масавае стварэнне беларускіх школ, інтэнсіўна працавала прэса, выдавецтвы, тэатральныя калектывы. Усё гэта найлепшым чынам сцвердзіла рэальнасць існавання беларускай нацыі; стварала ўмовы для завяршэння працэсу нацыянальнай кансалідацыі, стала моцным імпульсам для стварэння БССР.

Аднак абвяшчэнне сацыялістынай дзяржаўнасці (31.12.1918) не ўратавала беларускі этнас ад раз’яднання на некалькі частак. Ужо ў студзені 1919 г. ЦК РКП(б), груба ігнаруючы нацыянальныя інтарэсы беларусаў, пастанавіў далучыць паўночна-усходнія беларускія тэрыторыі да РСФСР. Падзеі Савецка-польскай вайны 1919 – 20-х гг. прывялі да далейшага падзелу беларускіх зямель. Паводле Рыжскай мірнай дамовы 1921 г. заходняя частка Беларусі была ўключана ў склад Польскай дзяржавы.

Раз’яднанне этнічнай тэрыторыі надзвычай негатыўна адбілася на развіцці працэсаў нацыянальнай кансалідацыі. Паўночна-Заходняя частка Беларусі – адзін з галоўных рэгіёнаў развіцця нацыянальнага руху, – апынулася ў складзе Польшчы, на тэрыторыі Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Гомельшчыны, далучаных да Савецкай Расіі, па сутнасці працягвалася дарэвалюцыйная палітыка русіфікацыі.

Умовы развіцця нацыянальных працэсаў у розных частках Беларусі істотна адрозніваліся. Беларусы ў Польшчы падвяргаліся пастаяннай дыскрымінацыі з боку дзяржавы ў палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, культурнай, моўна-адукацыйнай сферах. Так, калі ў 1918 г. у Заходняй Беларусі налічвалася 89 беларускамоўных школ, то ўжо ў 1925 г. іх засталося толькі чатыры.

Не нашмат лепшым было становішча беларусаў ва ўсходніх рэгіёнах краіны, што апынуліся ў складзе РСФСР. Мясцовае кіраўніцтва свядома

ігнаравала нацыянальныя патрэбы карэннага насельніцтва: беларускія школы былі адзінкавымі, беларускамоўныя выданні адсутнічалі цалкам.

З істотнымі праблемамі сутыкнулася беларускае нацыянальнае будаўніцтва і ў межах БССР, тэрыторыя якой у 1921 г. складала ўсяго 52 тыс. км$^2$ (каля 25 % ад сучаснай тэрыторыі РБ), а насельніцтва – 1,4 млн чалавек. Партыйнае і савецкае кіраўніцтва, якое складалася пераважна з прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, абыякава ставілася да развіцця нацыянальна-культурных працэсаў. З 12 газет, што выдаваліся ў рэспубліцы ў 1921 г., толькі адна выходзіла на беларускай мове, большасць школ заставалася рускамоўнымі, а прадстаўніцтва беларусаў у органах улады было мізэрным.

Сітуацыя істотна змянілася ў сярэдзіне 1920-х гадоў. На гэты перыяд прыпаў найвышэйшы ўздым у развіцці працэсаў кансалідацыі беларускай нацыі. Пэўная эканамічная стабілізацыя ў СССР, звязаная з ажыўленнем таварна-грашовых адносін ва ўмовах *новай эканамічнай палітыкі*, спрыяла лібералізацыі ў нацыянальнай палітыцы. Гэты курс атрымаў назву палітыкі "каранізацыі", на Беларусі – "*беларусізацыі*". Негледзячы на непаслядоўнасць і шырокае выкарыстанне адміністратыўных метадаў, а таксама непазбежную ідэялагічную абмежаванасць, палітыка беларусізацыі значна пашырыла магчымасці нацыянальнай інтэлігенцыі, узмацніла і пашырыла кансалідацыйныя працэсы ва ўсіх сферах жыццядзейнасці беларускага грамадства.

Адным з найбольш значных вынікаў гэтай палітыкі з'явілася вяртанне ў склад БССР часткі ўсходнебеларускіх зямель. У 1924 г. былі перададзены 15 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерній, у 1926 г. – Гомельскі і Рэчыцкі паветы. Агульная колькасць насельніцтва пасля гэтых пераўтварэнняў склала каля 5 млн чалавек, а тэрыторыя – 125,8 тыс. км$^2$. Аднак, пры гэтым, значная частка беларускіх зямель (Невельшчына, Себежшчына, Заходняя Смаленшчына) засталася ў складзе РСФСР. У часы ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі беларускае касельніцтва Пскоўшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны мела нацыянальна-культурную аўтаномію, беларускія школы і выданні, клубы, народныя дамы і г.д.

Другім значным дасягненнем гэтага перыяду стала стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі. У канцы 1920-х гадоў у беларускіх школах вучылася да 88 % дзяцей, на беларускую мову было пераведзена выкладанне ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Стварэнне шырокай сеткі ВНУ значна пашырыла магчымасці падрыхтоўкі спецыялістаў і садзейнічала колькаснаму росту нацыянальнай інтэлігенцыі.

Хутка развіваўся перыядычны друк і выдавецкая справа. Ужо ў сярэдзіне 1920-х гадоў у БССР выдавалася 11 газет і 10 часопісаў на беларускай мове. Агульны тыраж выданняў у 1931 г. склаў 10,7 млн экзэмпляраў, 95,3 % з іх выдавалася на беларускай мове.

Прыкметай часу стала дзейнасць масавых грамадскіх нацыянальных арганізацый. Так, толькі ў краяўнаўчым руху прымала ўдзел больш за 10 тысяч чалавек.

Паляпшэнне стану беларускай культуры ў БССР, інтэенсіўныя працэсы нацыянальнага будаўніцтва, якія там разгортваліся, паўплывалі на змену поглядаў шэрага палітычных і культурных дзеячоў, што знаходзіліся ў эміграцыі. У БССР пераехалі і актыўна далучыліся да нацыянальна-культурных пераўтварэнняў В. Ластоўскі, А. Цвікевіч, А. Смоліч і інш.

Галоўным дасягненнем беларусізацыі з’явілася карэнная змена становішча беларускай мовы. Яна замацавалася практычна ва ўсіх сферах грамадскага жыцця: у якасці афіцыйнай, у справаводстве, навуцы, адукацыі, сродках масавай інфармацыі, беларускіх тэрытарыяльных вайсковых фарміраваннях. Гэта абумовіла ўзнікненне якасных зрухаў у яе ўласным развіцці. *Пашырэнне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі і сродкаў масавай інфармацыі, стабільнае функцыянаванне нацыянальнай мастацкай культуры стварала неабходныя ўмовы для завяршэння працэсу фармавання нацыянальнай самасвядомасці.* І хоць змест нацыянальнай самасвядомасці быў істотна дэфармаваны ўздзеяннем камуністычнай ідэялогіі, яго засваенне садзейнічала замацаванню адзінай формы этнічнай назвы беларусы, якая цалкам выцесніла лакальныя, рэгіянальныя і канфесіянальныя назвы.

З разгортваннем кансалідацыйных працэсаў у БССР ажывіўся нацыянальны рух і ў Заходняй Беларусі. Тут ён быў звязаны са стварэннем новых масавых нацыянальна-палітычных арганізацый. Левае крыло беларускага палітычнага руху прадстаўляла *Беларуская сялянска-работніцкая грамада* (БСРГ), якая выступала ў абарону правоў бяднейшага сялянства, а таксама за аб’яднанне ўсіх беларусаў у межах савецкай дзяржавы. Ужо ў пачатку 1927 г. БСРГ налічвала ў сваіх шэрагах 120 тысяч чалавек і з’яўлялася буйнейшай сялянскай партыяй у Еўропе. Аднак, левaрадыкальная праграма БСРГ прывяла да яе забароны польскімі ўладамі вясной 1927 г. Сярод цэнтрысцкіх і кансерватыўных нацыянальных арганізацый найбольш уплывовай з’яўлялася *Беларуская хрысціянская дэмакратыя*, якая ў сваёй дзейнасці зыходзіла з агульначалавечых каштоўнасцяў і дамагалася правядзення

зямельнай рэформы пры захаванні інстытута прыватнай уласнасці і аб’яднання беларускіх зямель у адзінай дэмакратычнай рэспубліцы.

Развіццё нацыянальна-палітычнага руху паспрыяла актывізацыі культурна-асветніцкіх арганізацый. У 1927 г. колькасць гурткоў *Таварыства беларускай школы* (створана ў 1921 г.) дасягнула 600. Разгарнулася масавая кампанія па збору заяў для адкрыцця беларускіх школ, дзякуючы чаму польскія ўлады вымушаны былі стварыць 78 беларускіх і беларуска-польскіх школ і 1 гімназію. У Вільні быў заснаваны Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. Выходзілі дзесяткі палітычных, асветных, мастацкіх і спецыяльных беларускіх выданняў.

Аднак актыўнасць нацыянальнага руху не магла супрацьстаяць паўсядзённай паланізацыі беларусаў. Паводле афіцыйнай (значна сфальсіфікаванай) статыстыкі, удзельная вага беларусаў на тэрыторыі 4 ваяводстваў Заходняй Беларусі з 1921 г. па 1931 г. панізілася з 26 % да 21 %, а палякаў павысілася з 33 % да 49 %. Адначасова шырока распаўсюдзілася такая форма самасвядомасці як “тутэйшыя”, што задавальняла шавіністычныя колы польскага грамадства.

У канцы 20 – пачатку 30-х гадоў ХХ ст. беларускі этнас уступіў у перыяд глыбокага крызісу, які працягваўся да сярэдзіны 1980-х гадоў (дадатак 3). Яго ўзнікненне было абумоўлена трансфармацыяй аўтарытарнага аднапартыйнага рэжыму ў жорсткую таталітарную сістэму, пабудаваную на поўным кантролі над грамадствам і асобай, на спецыфічных формах гаспадарчых адносін.

Шырокамаштабныя палітычныя рэпрэсіі, разгорнутыя ў БССР, практычна цалкам вынішчылі нацыятворчую гаспадарчую і культурную эліту беларускага грамадства і надоўга прыпынілі паступальнае развіццё беларускай нацыі ў цэлым. “Люстраным адбіткам” савецкіх метадаў “вырашэння” нацыянальнага пытання стала расправа рэакцыйных польскіх уладаў з беларускім нацыянальным рухам у Заходняй Беларусі. У 1936 – 1938 гг. былі ліквідаваны ўсе палітычныя і культурна-асветніцкія арганізацыі, зачынены ўсе беларускія навучальныя ўстановы, спынена выданне большасці беларускіх газет і часопісаў. Значная частка актывістаў беларускага руху была арыштавана і кінута ў турмы ці канцэнтрацыйныя лагеры.

У верасні 1939 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі была далучана да БССР. Негледзячы на тое, што гэта стала прамым вынікам злачыннага пагаднення паміж Германіяй і СССР аб падзеле Еўропы на сферы стратэгічных інтарэсаў, неабходна пазначыць, што ўз’яднанне асноўнага масіва

беларускай этнічнай прасторы стала пазітыўным фактарам нацыянальнай гісторыі беларусаў.

Вялізныя страты панесла насельніцтва Беларусі ў гады *Вялікай Айчыннай вайны* 1941 – 45 гг., якая значна паглыбіла этнічны крызіс беларускага народа.

Нягледзячы на тое, што ў пасляваенныя часы практычна ўсе элементы сістэмы нацыянальна-культурнага аднаўлення беларускага народа былі моцна дэфармаваны або цалкам разбураны, што вяло да заняпаду беларускага этнасу ў цэлым, у 1960 – 1970-х гг пачалі зараджацца асновы новай хвалі *нацыянальнага адраджэння*. Перадусім, працэсы нацыянальнага абуджэння былі звязаны з фарміраваннем адносна нешматлікіх колаў навуковай і творчай інтэлігенцыі, у асяроддзі якой пачалі пераглядацца дагматычныя падыходы да гісторыі і культуры Беларусі, выпрацоўвацца асновы нацыянальнай самасвядомасці. Негледзячы на перашкоды, якія чыніліся дзейнасці гэтых груп, іх ідэі паўплывалі на гарадскую моладзь.

Агульны крызіс сацыялістычнай таталітарнай сістэмы, які ахапіў літаральна ўсе бакі жыцця, выклікаў пэўныя змены ў палітыцы кіруючых колаў СССР. Характэрнай асаблівасцю новага курсу, які атрымаў назву *перабудова*, стала лібералізацыя адносін да самастойных грамадскіх рухаў, у тым ліку нацыянальных. У 1985 – 86 гг. утварыліся нацыянальныя суполкі моладзі “Талака” (Мінск), “Паходня” (Гродна), “Маладзік” (Наваполацк) і інш., якія заняліся праблемамі захавання мовы і нацыянальнай культуры, аховы помнікаў гісторыі, экалогіі.

У 1989 г. арганізацыйна аформіўся масавы грамадска-палітычны рух “Беларускі народны фронт”, які налічваў каля 40 тысяч чалавек і выступаў за адраджэнне беларускай нацыі на прынцыпах дэмакратыі і гуманізму, развіццё культуры тытульнай нацыі і ўсіх нацыянальных супольнасцяў, за фактычную дзяржаўную незалежнасць Беларусі.

Апрача БНФ былі ўтвораны і іншыя нацыянальныя арганізацыі – *Беларускі экалагічны саюз* і *Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны*. Усе разам яны ўтваралі аснову развіцця нацыянальна-дэмакратычнага руху, які ў 1980 – пачатку 1990-х гадоў з’явіўся галоўнай праявай новай хвалі нацыянальнага адраджэння. Дзякуючы яго намаганням, было пераасэнсавана становішча беларускай мовы і культуры ў грамадстве, прыняты захады да яго нармалізацыі. “*Закон аб мовах у Беларускай ССР*”, ухвалены Вярхоўным Саветам рэспублікі 26.01.1990 г., замацаваў за беларускай мовай статус дзяржаўнай. Павялічылася колькасць беларускіх выданняў, у гарадах пачалі адкрывацца новыя беларускія школы, значна пашыралася вы-

карыстанне беларускай мовы ў сістэме ВНУ, сродках масавай інфармацыі, што значна павысіла яе сацыяльны прэстыж і функцыянальнасць.

Працэсы нацыянальнага адраджэння ў Беларусі спрыялі абуджэнню нацыянальнай свядомасці беларусаў Прыбалтыкі, Украіны, Сібіры, Масквы і Санкт-Пецярбурга. Актывізаваліся сувязі з беларускай нацыянальнай меншасцю ў Польшчы, эміграцыйнымі цэнтрамі ў ЗША, Канадзе, Англіі і Аўстраліі (дадатак 2).

Палітычны крызіс у жніўні 1991 г., выкліканы спробай дзяржаўнага перавароту ў СССР, паспрыяў афармленню *дзяржаўнага суверэнітэта Беларусі*, што было юрыдычна замацавана адпаведнай дэкларацыяй, прынятай 25.08.1991 г. Вярхоўным Саветам рэспублікі. Неўзабаве (19.09.1991 г.) была зацверджана новая назва дзяржавы – *Рэспубліка Беларусь*, а таксама дзяржаўная сімвалы – бела-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня".

Канчатковы распад СССР (канец 1991 г.) і дэнансацыя Саюзнага дагавора 1922 г. замацавалі за Беларуссю статус паўнапраўнага суб'екта міжнародных адносін. Карэнная змена палітычнай сітуацыі стварыла новыя ўмовы для пераадолення этнічнага крызісу беларускага народа. Аднак, нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці большай часткі насельніцтва Беларусі, рэзкае пагаршэнне жыццёвага ўзроўню і дабрабыту, выкліканыя распадам эканамічных сувязяў і крызісам вытворчасці на тэрыторыі былога СССР, выклікалі ў беларускім грамадстве моцныя настальгічныя настроі па адноснай эканамічнай і палітычнай стабільнасці савецкай эпохі. У гэтай сітуацыі найбольш востра праявіўся масавы нацыянальны нігілізм, калі праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння сталі разглядацца як другасныя і неабавязковыя ў параўнанні з праблемамі пераадолення сацыяльна-эканамічнага крызіса. Увядзенне прэзідэнцкага кіравання і абранне першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не перапынілі нарастанне пазначаных тэндэнцый у калектыўнай свядомасці, але, наадварот, узмацнілі іх, паколькі палітычнае кіраўніцтва Беларусі зрабіла стаўку не на будаўніцтва механізма нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і самаўзнаўлення, а на ўсебаковую інтэграцыю з Расіяй у рамках саюзнай дзяржавы. Рэферэндум 1995 г. паказаў, што пэўныя поспехі нацыянальна-культурнага адраджэння, дасягнутыя ў канцы 1980-х – 1994-м гадах, яшчэ не з'яўляюцца ні трывалымі, ні канчатковымі, а інэртнасць мыслення і нацыянальны нігілізм значнай часткі грамадзян Беларусі фактычна вядуць да сцірання і невеліроўкі беларускай этна-культурнай самабытнасці. Так, большасць выбаршчыкаў на рэферэндуме 1995 г. прагаласавала за наданне рускай мове статуса дзяржаўнай (упоравень з беларускай), што на практыцы прывяло да рэзкага

згортвання сферы функцыянавання беларускай мовы. І калі ў 1993/1994 вучэбным годзе па беларуску навучалася 67,3 % усіх першакласнікаў, то ўжо ў 2002/2003 вучэбным годзе 73,6 % (у Мінску – 93,6 %) школьнікаў Беларусі вучылася ў рускамоўных класах. У той жа час, паводле даследаванняў ЮНЭСКА, мова знаходзіцца на мяжы знікнення, калі на ёй размаўляе менш за 30 % дзяцей.

Падобная сітуацыя назіраецца і ў выдавецкай справе. Па стане на 1999 г. у Беларусі выдавалася 118 беларускамоўных перыядычных выданняў і 314 рускамоўных. Беларускія кнігі складалі толькі 10,6 % усіх выданняў і 8 % усяго тыража.

Недастаткова ўважлівае стаўленне дзяржавы да праблем захавання і развіцця беларускай мовы і нацыянальнай культуры вядзе да далейшай маргіналізацыі нацыянальнай свядомасці насельніцтва Беларусі і, у перспектыве, да знікнення беларускай этнічнасці, як сукупнасці характэрных культурных рыс, што адрозніваюць беларусаў ад іншых этнічных груп.

Разам з тым, фіналісцкае бачанне лёсу беларускай нацыі з’яўляецца перабольшаннем. Станаўленне і ўмацаванне інстытутаў незалежнай беларускай дзяржавы, уваходжанне ў актыўнае грамадска-палітычнае і культурнае жыццё краіны маладых пакаленняў беларусаў, не абцяжараных савецкай ідэялагічнай спадчынай, але абраўшых у якасці светапоглядных прыярытэтаў агульнадэмакратычныя і нацыянальныя каштоўнасці, гарантуе ў недалёкім будучым сапраўднае адраджэнне і пастулальнае прагрэсіўнае развіццё беларускай нацыянальнай супольнасці.

## Асноўная літаратура


Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. – Мн., 2001.

Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1 – 2. – Мн., 1994.

Пилипенко М.Ф. Этнография Белоруссии. – Мн., 1981.

Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – Мн., 2001.

Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002 гг.). – Мн., 2003.

Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. – Мн., 1985.

Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989.

## Літаратура для паглыбленага вывучэння тэмы


Гринблат М.Я. Белорусы: Очерки происхождения и этнической истории. – Мн., 1968.

Зеленин Д.К. Восточнославянская этнография. – М., 1991.

Карнейчык Я.І. Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс. – Мн., 1969.

Карскі Я. Беларусы. – Мн., 2001.

Кіпель В. Беларусы ў ЗША. – Мн., 1993.

Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. – Мн., 1991.

Півторак Г. Походження українців, росіян, білорусів та їхніх мов. – Киів, 2001.

Радзік Р. Беларусы: погляд з Польшчы.– Мн., 2002.

Рогалёв А.Ф. Белая Русь и белорусы. В поисках истоков. – Гомель, 1994.

Сачанка Б. Беларуская эміграцыя. – Мн., 1991.

Седов В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. – М., 1970.

Седов В.В. Восточные славяне в VI – XII вв. – М., 1982.

Урбан П. Да пытаньня этнічнай прыналежнасьці старажытных ліцьвінаў. – Мн., 1994.

# ТЭМА 4. ТРАДЫЦЫЙНАЯ МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА І САЦЫЯЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСАЎ

**1. Традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў.**
**1.1. Традыцыйныя промыслы беларусаў.**
**1.2. Традыцыйныя рамёствы беларусаў.**
**2. Беларускае традыцыйнае адзенне.**
**3. Традыцыйныя формы паселішчаў і народнае дойлідства Беларусі.**
**3.1. Сялянская сядзіба: структура, тэхналогія, сімволіка.**
**4. Беларуская традыцыйная кухня.**
**5. Традыцыйныя формы сацыяльнай арганізацыі беларусаў.**

Паколькі ў традыцыйнай культуры этнаса ўвасабляюцца яго найбольш спецыфічныя і адметныя рысы, а яна, у сваю чаргу, з'яўляецца асноўным прадметам этнаграфіі, вызначым у галоўных рысах сутнасць такой катэгорыі як "*традыцыя*", бо ў розных варыянтах (традыцыйная культура, традыцыйная супольнасць і г.д.) гэтае азначэнне будзе сустракацца напрацягу ўсіх далейшых тэм.

*Традыцыя* (лац. "*traditio*", перадача) – спосаб перадачы этнічнага вопыту ў выглядзе рытуалаў, звычаяў, сацыяльных норм, якія на працягу некалькіх пакаленняў застаюцца фактычна нязменнымі. Адпаведна, *традыцыйнае грамадства* – гэта супольнасць, арыентаваная на традыцыі продкаў, не схільная да наваўвядзенняў, дзе змены ў розных аспектах жыццядзейнасці з'яўляюцца непрыкметнымі ў межах, як мінімум, аднаго пакалення. У *традыцыйнай культуры* прыярытэтным з'яўляецца вопыт папярэдніх пакаленняў, калі традыцыя ўважаецца за найвышэйшую каштоўнасць, а любая інавацыя ўспрымаецца як патэнцыйная пагроза існуючаму сацыяльна-культурнаму парадку.

Ужываючы прыметнік "традыцыйны" да розных аспектаў беларускай культуры, будзем мець на ўвазе, што размова ідзе не пра нейкую "адсталасць" ці "непаўнавартасць", але пра адметны тып сацыя-культурнага быцця беларусаў, які быў жыццядзейсным яшчэ ў XIX – пачатку XX ст. і дзякуючы якому беларуская этнічнасць здолела не толькі захавацца, але і на пачатку III тысячагоддзя з'яўляецца адной з непаўторных часцінак сусветнай культуры.

## 4.1. Традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў

*Земляробства*, як адзін з асноўных гаспадарчых заняткаў насельніцтва Беларусі, з’яўляецца яшчэ ў эпоху неаліту (паўднёвыя рэгіёны), аднак агульнае распаўсюджанне атрымлівае ў часы бронзавага веку (канец III – пачатак I тыс. да н.э.). Спачатку для сяўбы выкарыстоўвалі невялікія ўчасткі зямлі пераважна ў поймах рэк, апрацоўвалі іх каменнымі і рагавымі матыкамі. Па меры развіцця земляробства з’явіліся вялікія палі, якія ўтвараліся ў выніку падсечкі значных дзялак лесу і яго спальвання. Так узнікла больш прагрэсіўнае на той час *падсечна-агнявое*, або *ляднае* земляробства. Дрэвы высякаліся каменнымі шліфаванымі сякерамі, збожжа жалі крамянёвымі і бронзавымі сярпамі, перацiралі на ручных каменных зерняцёрках. З паяўленнем жалеза (VII – VI стст. да н.э.) земляробства ўздымаецца на больш высокую ступень, паколькі жалезныя прылады працы па сваёй эфектыўнасці і трываласці значна пераўзыходзілі каменныя і касцяныя.

У гэты ж час пачынаецца паступовы пераход ад ручнога (матыжнага) да *ворыўнага* земляробства, пра што сведчыць знаходка архаічнага *рала* ля в. Капланавічы Клецкага раёна. У якасці цяглай жывёлы выкарыстоўвалі быкоў або валоў. Паводле археалагічных матэрыялаў, найбольш пашыранымі ў эпоху жалеза былі пшаніца, ячмень, а таксама проса, гарох, віка, лён.

Пераход да земляробства радыкальным чынам паўплываў на духоўны свет, матэрыяльную культуру, сацыяльную арганізацыю старажытнага насельніцтва Беларусі:

– месяцовы каляндар саступае месца сонечнаму (сучаснаму ў сваёй аснове);

– цэнтральнае месца ў вераваннях займае культ зямлі, прыродных стыхій і боствау, звязаных з аграрнай вытворчасцю;

– інтэнсіўна развіваецца ганчарства і ткацтва;

– лішкі сельгасвытворчасці стымулююць гандлёвы абмен і міжплемянныя сувязі;

– адбываецца пераход да бацькоўскай родавай грамады;

– узнікае сацыяльная няроўнасць; вылучаецца рода-племянная знаць;

– пачашчаюцца ваенныя канфлікты;

– узнікае новы тып паселішча-гарадзішча.

Структура земляробства на Беларусі істотна не мянялася на працягу стагоддзяў. Асноўнае месца займалі збожжавыя культуры (азімае жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, проса), сеялі лён, каноплі, бабовыя (гарох, палявыя бабы). Вырошчвалі гародніну (капусту, буракі, агуркі, моркву,

рэдзьку, цыбулю, рэпу). З канца XVIII ст. стала пашырацца культура бульбы, якая дагэтуль застаецца для беларусаў “другім хлебам”. З канца XIX ст. важнае месца ў севазваротах займаюць пасевы кармавых траў.

Да канца XIX ст. склаліся некалькі аграрных рэгіёнаў з уласцівымі ім асаблівасцямі спецыялізацыі, структурай пасяўных плошчаў, узроўнем агратэхнікі, працоўнымі і абрадавымі традыцыямі.

Найбольш заселенай і асвоенай пад земляробства была Цэнтральная Беларусь, Панямонне і Падняпроўе. Ворыўныя плошчы ў сярэдзіне XIX ст. складалі тут каля палавіны ўсіх сельгасугоддзяў. У сістэме севазваротаў панавала *трохполле* (падзел ворнай зямлі на тры палі, кожнае з якіх засявалася спачатку азімымі, затым яравымі, а на трэці год заставалася пад парам – не засявалася на адно лета). У панскіх маёнтках побач з трохполлем сустракалася чатырохполле з пасевамі кармавых траў. У пазначаных рэгіёнах атрымлівалі адносна высокія ўраджаі збожжавых (на пачатку XIX ст. – сам-4 – сам-5).

Менш спрыяльнымі для земляробства былі ўмовы ў паўночных і паўднёвых частках Беларусі. Дзярнова-падзолістыя, часта завалуненыя глебы, мноства марэнных узвышшаў, азёр, звужалі магчымасці земляробства на Беларускім Падзвінні. Побач са збожжавымі ў структуры пасеваў тут важную ролю адыгрываў лён. У сувязі са зніжэннем урадлівасці зямель ад частых яго пасеваў значныя плошчы пакідаліся пад *аблогу* (поле пакінутае на некалькі год без апрацоўкі; уздзірванелае поле), а з канца XIX ст. з мэтай узнаўлення іх урадлівасці сталі шырэй выкарыстоўваць траваnольныя севазвароты. Ва ўмовах церазпалосіцы, вузкіх надзелаў і значнай завалуненасці глеб на Падзвінні выкарыстоўвалі саху *віцебскага тыпу* з перакладной паліцай, перакідваючы якую з аднаго сашніка на другі, можна было адгортваць ворыўны пласт адпаведна направа ці налева, што значна павышала манеўранасць сахі. Да таго ж віцебская саха арала на невялікую глыбіню, што экалагічна адпаведала характару мясцовых глеб.

На Палессі традыцыйнае земляробства было максімальна прыстасавана да мясцовых экалагічных умоў. Найбольш абжытымі тут былі лёсавыя раўніны ў басэйне Ніжняй Прыпяці, Тураўшчына і Пабужжа. Вялізныя абшары Прыпяцкага Палесся мелі рэдкія пасяленні і былі слаба асвоеныя чалавекам. Значную частку сельгасугоддзяў тут займалі сенакосы і няўдобіцы. Пад ворыва выкарыстоўваліся невялічкія ўчасткі, што ў выглядзе шматлікіх дзюн-астраўкоў былі раскіданы па значнай плошчы сярод балот і лясоў. Да прыкладу, у канцы XIX ст. на адзін сялянскі двор магло прыхо-

дзіцца да 15 – 20 такіх астраўкоў, раскіданых на вялікай адлегласці. Вясной мясцовыя жыхары перапраўляліся на чоўнах з аднаго вострава на другі, ставілі там курані, што служылі ім часовым жыллём, апрацоўвалі і засявалі адзін участак за другім, у канцы лета збіралі ўраджай, абмалочвалі снапы ці складвалі іх неабмалочанымі на *адонку* (высокім памосце), дзе яны маглі захоўвацца і некалькі год. Прыродная спецыфіка абумовіла адпаведныя спосабы апрацоўкі зямлі (пашыранасць лядаў і лясных аблог побач з трохполлем) і выкарыстанне так званай "*палескай сахі*", якая вылучалася масіўнасцю, што адпавядала нетаропкай хадзе валоў у запрэжцы і дазваляла араць на значную глыбіню.

Апрача сахі да традыцыйных земляробчых прылад належалі рала, барана, акучнік, матыка, рыдлёўка, серп, каса, вілы, граблі, цэп і інш., кожная з якіх была прызначана для пэўнага віду работ і мела рэгіянальныя адрозненні.

Прынцыпова важна зразумець, што ў традыцыйнай беларускай супольнасці земляробства мела не толькі вузка утылітарную прагматыку (забеспячэнне прадуктамі харчавання, фуражом, сыравінай), але, у адрозненне ад сучаснага грамадства, з'яўлялася самым пачэсным відам працоўнай дзейнасці з амаль што свяшчэнным статусам. Невыпадкова, што практычна ўсе традыцыйныя каляндарныя святы (Каляды, Дабравешчанне, Вялікдзень, Юр'я, Купалле і інш.) мелі выразную аграрную скіраванасць, а ў беларускім абрадавым фальклоры нават Бог са святымі выступаюць у вобразе земляробаў:

"*Святы Юрый, з неба ідучы,*
*З неба ідучы, вазьмі ключы,*
*Адамкні зямлю сырусеньку,*
*Пусці расу цяплюсеньку…*
*Святое Ўшэсце пшонку сее,*
*Пшонку сее ў ярной змене.*
*Святы Мікола па межах ходзе,*
*Па межах ходзе, жыта аглядае,*
*Якое малое, тое падымае.*
*Святая Тройца краску накладае,*
*А Дзесятуха – жыта паспявае.*
*Святы Пётра сярпы востра,*
*Святы Ілля – зажынае,*
*Там жа яму Бог памагае:*
*Што раз разане – вязьмо нажне,*
*Што другі разок, то і снапок*".

*Жывёлагадоўля* (вядома на тэрыторыі Беларусі з часоў неаліту; у эпоху бронзы атрымала агульнае распаўсюджанне), адзін з важнейшых гаспадарчых заняткаў беларусаў, які забяспечваў насельніцтва прадуктамі харчавання і сыравінай для разнастайных рамёстваў, даваў арганічныя ўгнаенні і цяглую сілу (кані, валы).

На Беларусі здаўна разводзілі буйную рагатую жывёлу (займала асноўнае месца ў структуры жывёлагадоўлі), коней, свіней, авечак, хатнюю птушку. Найбольш распаўсюджанай у Беларусі была так званая “літоўская” парода кароў (паходзіць ад *еўрапейскага тура*), якая вылучалася прыстасаванасцю да суровых умоў утрымання, непераборлівасцю ў харчаванні і адносна высокай малочнасцю.

У Падзвінні і Падняпроўі была больш развіта конегадоўля. Конь здаўна быў тут асноўнай цяглавай сілай. Мясцовая парода коней, патомкаў *тарпанаў* (дзікіх лясных коней, вынішчаных яшчэ ў Сярэднявеччы), вызначалася невялікім ростам (120 – 130 см), але была параўнаўча моцнай і выносліваай у рабоце. Звычайна селянін даглядаў свайго каня лепей, чым карову, бо ад яго працаздольнасці залежыла эфектыўнасць апрацоўкі зямлі і, адпаведна, лёс будучага ўраджаю. Каню адводзілася больш утульнае і цёплае месца ў хлявах (стайні), для яго нарыхтоўвалі і больш якаснае (мурожнае) сена, а таксама канюшыну, віку, авёс.

На Палессі, у Панямонні і на значнай тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі асноўнай цяглавай сілай у сялянскай гаспадарцы былі валы. Яны выкарыстоўваліся як на ворыве, так і ў якасці транспартных жывёл. Іх таксама запрагалі ў прывады механічных млыноў, малатарняў, сукнавальняў і г.д. Аднак пры баранаванні поля, перавозцы больш лёгкіх грузаў і пасажырскай яздзе часцей за ўсё выкарыстоўвалі коней.

Выкарыстанне ў паўночна-усходняй частцы Беларусі ў якасці асноўных цяглавых жывёл коней, а ў паўднёва-заходняй валоў выступала, такім чынам, як пэўная этна-культурная традыцыя, якая накладала свой адбітак на штодзённы побыт і гаспадарчую дзейнасць, на спосабы апрацоўкі глебы, на канструктыўныя асаблівасці традыцыйных земляробчых прылад і транспартных сродкаў.

Свінагадоўля была шырока развіта на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Высокай прадуктыўнасцю свінагадоўлі ў канцы XIX ст. вылучаліся Гродзенская і Мінская губерні. Свіней адкормлівалі зялёнымі кармамі, карняплодамі, жалудамі. Вядомы этнограф Чэслаў Пяткевіч апісаў даволі экзатычны спосаб гадоўлі свіней, які бытаваў ва Усходнім Палессі яшчэ ў 1880-х гадах: “*…у час пасявання і ападання жалудоў, а часта і нашмат раней,*

*свінні ўцякаюць як найдалей у лес, і гэта ім не забараняюць гаспадары. У лясах яны знаходзяцца аж да вялікага снегу, які пазбаўляе іх спажывы і якога-небудзь падабенства гнязда. Тады, лагодненькія, самі вяртаюцца дадому. У лесе затое, трымаючыся разам, каб у выпадку неабходнасці пасяхова бараніцца ад ваўкоў...*” (Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палессе. – Мн., 2004. – С. 80 – 81).

Убой свіней рабілі напярэдадні Дзядоў, Калядаў, а больш заможныя і перад Вялікднём. Дзень разбірання забітай жывёлы па традыцыі адзначаўся ў сям’і, на свежыну (“пагалоўшчыну” на Полаччыне) запрашалі блізкіх родзічаў ці добрых суседзяў.

Даволі значную ролю ў гаспадарцы беларусаў адыгрывала авечкагадоўля. Як паказвае статыстыка XIX ст., бараніна ўжывалася ў ежу часцей, чым ялавічына. Адначасова авечкі давалі неабходную сыравіну для вырабу кажухоў і шапак. Авечак стрыглі два разы ў год – позняй вясной і восенню, выбіраючы цёплыя сонечныя дні (пераважна аўторак, чацвер, пятніца). Канец стрыжкі расцэньваўся як свята “ураджаю воўны” і адзначаўся вячэрай (“*Воўну трэба замачыць, каб была мяккай*”).

Найбольш інтэнсіўна авечкагадоўля развівалася ў Заходняй Беларусі, дзе побач са звычайнымі гадавалі і тонкарунных авечак, воўна якіх ішла на экспарт.

Развядзенне коз не атрымала распаўсюджання ў беларусаў і лічылася прыкметай скрайняй беднасці чалавека.

Амаль у кожнай сялянскай гаспадарцы было да дзесятка курэй. Паблізу рэк і вадаёмаў, асабліва ў Паазер’і, разводзілі вадаплаваючую птушку – гусей і качак.

Надзвычай вялікая роля хатняй жывёлы ў гаспадарчым і штодзённым жыцці беларускіх сялян абумовіла стварэнне складанай магічнай сістэмы яе аховы ад розных хвароб, драпежнікаў і чараўнікоў. Найбольш значным у гэтым сэнсе з’яўляўся дзень першага выгану статка ў поле, які быў прымеркаваны да свята Юр’я вяснавога (23.04. па старому стылю). Каб зберагчы жывёлу ад небяспекі і, з другога боку, паспрыяць яе пладнасці, удойнасці, прадпрымаліся розныя магічныя дзеянні. Так, напрыклад, на Віцебшчыне ў канцы XIX ст. перад першым выганам скаціны на пашу ля парога ў хляве клалі: *яйка, замок*, *нож*, *ніткі, вывернуты кажух*, каб а) скаціна была гладкая, як яйка; б) каб у ворагаў замкнуліся рукі; в) каб жывёлу не сурочылі чараўнікі; г) каб для жывёлы была простая дарога дадому і д) каб яе напладзілася столькі, колькі ў кажуху шарсцінак.

Засцерагальныя дзеянні маглі ўзмацняцца спецыяльнай замовай: "*Зара зарушчая, саберагаеш ты ясен месяц, саберагай маю скаціну пад цёмнымі лясамі, пад яснымі зарамі*". Падобныя мерапрыемствы, паводле народных уяўленняў, былі абавяковымі з улікам тых спусташэнняў, што наносілі жывёлагадоўлі ваўкі. Толькі ў Магілёўскай губерні за 1874 – 75 гг. ваўкі выразалі 16005 (!) коней і кароў, 45565 (!) жарабят, цялят, авечак і свіней, 14035 (!) хатняй птушкі, 5879 сабак.

Негледзячы на такія страты, жывёлагадоўля на Беларусі даволі паспяхова развівалася і ў сваёй дынаміцы значна апярэджвала ўнутрырасійскія губерні.

### 4.1.1. Традыцыйныя промыслы беларусаў

Пад *промысламі* ў этнаграфічнай літаратуры прынята разумець *падсобную ў сельскай гаспадарцы вытворчасць, адрозную ад уласна земляробства і жывёлагадоўлі*. Найбольшае значэнне мелі т.зв. *здабыўныя промыслы* – збіральніцтва, паляўніцтва, рыбалоўства, пчалярства (бортніцтва) і лясныя промыслы.

*Паляўніцтва*, адна з найбольш старажытных форм гаспадарчай дзейнасці чалавека; на тэрыторыі Беларусі вядома з часоў палеаліту (40 – 100 тыс. гадоў таму). На працягу многіх гістарычных эпох паляўніцтва забяспечвала людзей асноўнымі сродкамі існавання: ежай, адзеннем, сыравінай для вырабу прылад працы, зброі і г.д. У палеаліце асноўным аб'ектам палявання былі мамант і шарсцісты насарог, што вымагала выкарыстання калектыўных форм палявання: загонаў да абрываў ці ў дрыгву, аблаў і інш.

Пасля апошняга зледзянення і ўсталявання сучаснай геалагічнай эпохі (галацэну) на тэрыторыі Беларусі ўзнавіліся лясы і, нягледзячы на знікненне мамантаў і шарасцістых насарогаў, значна ўзбагаціўся жывёльны свет (з'явіліся: высакародны алень, зубр, тур, лось, мядзведзь, дзік, бабёр, куніца і інш). Прыручэнне ў мезаліце сабакі, вынаходніцтва лука са стрэламі зрабіла паляванне значна больш разнастайным і эфектыўным. У новых кліматычных умовах пачалі шырока выкарыстоўвацца неактыўныя спосабы палявання: *сіло* (самалоўнае прыстасаванне, дзеянне якога заснавана на зацягванні пятлі вакол лапы, шыі або тулава дзічыны), *петлі* з сырамяці і сухажылля, *лоўчыя ямы*. Апошняе прыстасаванне аказалася нагэтулькі простым і эфектыўным, што датрывала да XIX ст. Так, вядомы краязнаўца А. Семянтоўскі пісаў, што ў 1860 г. у адным толькі Полацкім павеце было ўпалявана ямамі не адна сотня ласёў.

Негледзячы на ўзнікненне жывёлагадоўлі паляванне яшчэ доўгі час (да Ранняга Сярэднявечча) давала чалавеку не менш за палову мясной ежы. Лук, вынайдзены яшчэ ў мезаліце, застаецца эфектыўнай паляўнічай зброяй амаль да XVIII ст. Аднак, з XVI ст. усё большае распаўсюджанне атрымлівае агнястрэльная зброя. Акрамя таго, у Сярэдневечча выкарыстоўвалі для палявання і іншыя віды зброі: кушы (арбалеты, дзіды, дроцікі, рагаціны, сякеры і г.д. Просты люд найчасцей практыкаваў разнастайныя самаловы: пасткі, сеткі, лоўчыя ямы, загарадзі і петлі, што вымагала дасканалага ведання асаблівасцяў жыцця, нораву і звычак кожнага звера. У асяродку шляхты з XV ст. становіцца папулярным *паляванне з сабакамі і сакаламі*. У XV – XVII стст. на Беларусі разводзілі некалькі відаў паляўнічых сабак, прывучаных цкаваць розную дзічыну: *харты* даганялі і душылі звера, *выжлы* нюхам адшуквалі і падымалі яго па загадзе, знаходзілі і прыносілі здабычу; *агары* (ганчакі) заганялі звера на паляўнічага, *ямнікі* (норнікі) выкарыстоўваліся пры паляванні на норных звяроў (ліс, барсукоў і да т.п.). Распаўсюджаным было і паляванне з *кундалямі* (дварнягамі), якія вылучаліся моцай і адвагай і былі незаменнымі пры паляванні на дзікоў і мядзвядзёў. Для палявання на гусей і качак на Беларусі выкарыстоўвалі *выдру*, якая (не старэйшая за 4 месяцы) лёгка паддавалася вывучцы.

Паляванне ж з сакаламі было безумоўным прывілеем магнатаў і найбагацейшай шляхты, бо адзін сокал у XVI ст. па сваім кошце быў роўны двум коням.

Негледзячы на развіццё паляўнічага і прыродаахоўнага права, якое знайшло сваё адлюстраванне ў Статутах ВКЛ і падрабязна рэгламентавала правілы і нормы палявання, прадугледжвала меры па захаванні папуляцый дзікай жывёлы, галоўнай небяспекай для фауны Беларусі ў XVI – XIX стст. становіцца *браканьерства*. У сукупнасці з ваеннымі дзеяннямі на тэрыторыі Беларусі, калі жывёла ў лясах вынішчалася па варварску і бескантрольна, і шырокім распаўсюджаннем агнястрэльнай зброі, браканьерства нанесла непапраўны ўрон дзікай прыродзе Беларусі. Так, ужо ў пачатку XVII ст. зніклі еўрапейскія туры, у сярэдзіне XVIII ст. – лясныя тарпаны, у пачатку XIX ст. быў забіты апошні высакародны алень мясцовай папуляцыі. Не стала собаля, мядзведзя-мурашкаеда, расамахі, чорнага зайца, ляснога ката. У 1919 г. браканьерам (лесніком!) быў забіты апошні зубр.

У канцы XIX ст. паляванне са стрэльбай набыло сярод прывілеяваных колаў насельніцтва спартыўна-аматарскі характар і толькі ў сялян і часткі местачкоўцаў яно захавала ролю дапаможнага занятку, які прыносіў пабочны прыбытак. Пры гэтым беларускія сяляне пераважна іранічна ста-

віліся да няпэўнага і зменлівага “шчасця” паляўнічага: “*У паляўнічага дым густы, ды абед пусты*”. У сваю чаргу, паляўнічыя, каб дасягнуць поспеху, выкарыстоўвалі разнастайныя магічныя прыёмы. Так, напрыклад, на Магілёўшчыне ў канцы XIX ст. лічылася, што *“каб зрабіцца добрым стральцом, трэба ўзяць з трох калодзежаў вады, частку яе выліць улева ад сябе, а рэшткаю прамыць стрэльбу са словамі: “Гром б’е, бліскавіца паліць, святы Пётра свінец правіць!”* Выхад паляўнічага мог суправаджацца спецыяльнай замовай, дзе выразна прасочваецца ўшанаванне як уласна лесу, так і яго міфалагічнага ўвасаблення – Лесуна: *“Звер прабягаў, ды майго сляда не відаў, а я, добры маладзец, на яго напаў, а Лесу Часному і Ляснparam хазяіну паклон аддаваў і падаркам яго надзяляў: хлебам да соллю, да каленкораву рубаху, да шаўковую падпаяску”.* Паспяховыя паляўнічыя, у гэтым сэнсе, разглядаліся сялянамі як чараўнікі, што водзяць сяброўства з Лесуном. Стаўленне да такіх людзей з боку грамады было паважліва-перасцярожлівым.

Сучаснае паляўніцтва на Беларусі істотна адрозніваецца ад старажытнага. Са знішчальнага яно стала адной з форм рацыяльнага прыродакарыстання, мае спартыўна-аматарскі характар, дазволена толькі членам Таварыства паляўнічых і рыбаловаў у паляўнічы сезон па пуцёўках або ліцэнзіях у вызначаных для палявання ўгоддзях.

*Рыбалоўства,* адна з ранніх форм гаспадарчай дзейнасці чалавека, вядомая на Беларусі з часоў палеаліту. У неаліце рыбалоўства становіцца вядучай галіной стражытнай эканомікі, чаму спрыялі не толькі выключна багатыя рыбныя ўгоддзі (на Беларусі і зараз налічваецца 20,8 тыс. рэк і каля 10,8 тыс. азёр, у якіх водзіцца 54 віды рыбы), але і рэзкая змена прыроднага асяроддзя, выкліканая знікненнем ледавікоў, што прывяла да крызісу палеалітычнага паляўніцтва і значнай трансфармацыі гаспадарчай дзейнасці чалавека. Менавіта ў неаліце сфармаваўся практычна ўвесь набор рыбалоўных прылад і прыстасаванняў – *гарпуны, восці, зазубцавыя снасці* (шнуры, рагулькі, пераметы, блешні, вуды), разнастайнага тыпу *сеткі, самаловы* (закоты, нераты), а таксама вадаплаўныя сродкі (чаўны, вёслы).

Негледзячы на тое, што з развіццём земляробства і жывёлагадоўлі рыбалоўства набывае характар падсобнага промыслу, у рэгіёнах з развітымі гідрасістэмамі (Падзвінне, Палессе) яно мела важную гаспадарчую функцыю.

У перыяд феадалізму значная колькасць злоўленай рыбы ішла на задавальненне патрэб феадалаў і царквы. Рыбалоўства становіцца павін-

насцю часткі прыгоннага сялянства (*невадная павіннасць* магла плаціцца грашыма, ці адпрацоўвацца вязаннем сетак для панскіх двароў, іх рамонтам, віццём невадных вяровак і інш.).

З распаўсюджаннем Магдэбургскага права на Беларусі пачынаюць узнікаць *рыбацкія цэхі* (Слуцк, Шклоў) – прафесійныя аб’яднанні рыбакоў аб’яднаных адным статутам (рэгламентаваў аб’ёмы вылаву рыбы, кошты на яе), таварыствам і звычаем ўзаемадапамогі. Практычна не адрозніваліся ад цэхаў і рыбацкія братствы (Віцебск, Вільня, Слуцк), аднак уваходзіць у апошнія маглі рыбакі толькі адной канфесіі (праваслаўныя ці каталікі).

Пытанні рыбалоўства на спрэчных ці памежных вадаёмах рэгуляваліся дзяржаўным заканадаўствам – Статутамі ВКЛ.

У XIX ст., з развіццём капіталістычных тэндэнцый у эканоміцы, таварны характар пачынае набываць і рыбалоўства. Значную ролю ў развіцці прамысловага рыбалоўства і актывізацыі гандлю адыгралі арандатары вадаёмаў і перакупшчыкі (пераважна рускія стараверы і габрэі). Аднак, сваім імкненнем да максімальнага прыбытку і часта драпежніцкай эксплуатацыяй водных рэсурсаў яны выклікалі негатыўнае стаўленне з боку мясцовага насельніцтва.

Тым не менш, у другой палове XIX ст. рыба становіцца адным са значных артыкулаў беларускага экспарту. Яна вывозілася на продаж у Польшчу, Латвію, Літву, Расію, на Украіну і Усходнюю Прусію. Значны прыбытак у пачатку XX ст. прыносіў экспарт у Нямеччыну рыбінай лускі, з якой выраблялі штучны жэмчуг і высакаякасны клей.

Даволі разнастайнымі ў канструктыўным і функцыянальным плане былі беларускія традыцыйныя *рыбалоўныя прылады*, якія паводле прынцыпу дзеяння і спосабу лоўлі падзяляліся на наступныя катэгорыі:

– *Невады* – снасці, якія складаліся з сеткавага мяшка (*куля*) і прывязаных да яго сеткавых палотнішчаў (крылаў), з вяроўкамі па супрацьлеглых баках кожнага з іх. Закінуўшы снасць у ваду так, каб яна ўтварала сеткавую сцяну, уручную або з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў невад працягвалі ў вадзе, а потым выбіралі ў чаўны ці на бераг. У залежнасці ад памераў і спосабаў лоўлі вылучалі *зімовыя невады* (даўжыня крыла каля 200 м, куля – каля 30 м; прызначаліся для падлёднай лоўлі рыбы ў азерах), *падвалокі* (летнія невады, меншая за зімовыя ў два разы), а таксама *брэдні* (невялікі невад, агульнай шырынёй 6 – 12 м, якім лавілі ўброд два чалавекі).

– *Сеткі* – палотнішчы з адной, дзвух ці трох сетак, прымацаваныя па даўжыні да дзвух вяровак (верхняя аснашчана паплаўкамі, ніжняя – гру-

зіламі). Сеткавай сцяной перагароджваюць шлях рыбе, якая, імкнучыся пераадолець перашкоду заблытваецца ў вочках сеткі.

– *Стаўныя пасткі* – прыстасаванні, якія выкарыстоўвалі натуральнае імкненне рыбы абмінуць перашкоду. Сярод стаўных пастак найбольш пашыранымі былі: *ез* – загарода на плыткіх рэчках і пратоках, якой перагароджвалі шлях рыбе. Будаваліся езы ў выглядзе частакольных платоў, платоў-плятнёў ці гацяў з камення і ламачча. У адтулінах еза ставілі рыбалоўныя пасткі (*бучы, нераты, венцеры*); *мярэжа* – снасць, якая складалася з дзвух нацягнутых на абручы кулёў (накіраваных уваходамі адзін да другога), злучаных з аднаго боку сеткай, што перагароджвала шлях рыбе і накіроўвала яе ў горлы.

– *Рухомыя пасткі* вызначаліся адсутнасцю ў іх перагародак, што перашкаджала выхаду рыбы. Таму, каб зберагчы ўлоў, пасткі хутка паднімалі з вады наверх. *Волакам* (сеткавы мяшок, прывязаны да двух шастоў) рыбачылі, сплаўляючы яго па цячэнню ракі; *таптухамі, кломлямі, сакамі* (сеткі, нацягнутыя на драўляныя каркасы) рыбачылі ўброд.

– *Кручковыя снасці* ўключаюць *вуды, перамёты* (шнур ад 10 м да 30 м, па ўсёй даўжыні якога прывязваюцца павадкі з кручкамі), *старожні* (жэрліцы), а таксама *імітацыйныя* снасці – *блісні, дарожкі, матылькі.*

– *Ударныя прылады*, якімі рыбу нанізвалі на востры наканечнік (*восці*), падчэплівалі яе знізу круком (*багром*) ці аглушалі ўдарам па лёдзе драўляным малатком (*чакухай*).

Як і паляўніцтва, рыбалоўства ў беларускім грамадстве было ахутана разнастайнымі прымхамі і магічнымі прадпісаннямі. На Падзвінні лічылася, што найбольш удалыя і паспяховыя рыбакі "сябруюць" з міфічным гаспадаром вадаёма – Вадзянікам.

У наш час рыбная лоўля набыла аматарска-спартыўны характар і стала масавым відам адпачынку насельніцтва.

*Збіральніцтва*, адна з самых ранніх форм гаспадарчай дзейнасці чалавека, збіранне (здабыванне) гатовых дароў прыроды, у асноўным прадуктаў харчавання і лекавых раслін. У першабытным грамадстве суіснавала побач з паляваннем і рыбалоўствам, займала важнае месца ў спажывецкай гаспадарцы і падрыхтавала ўмовы для вытворчай гаспадаркі. З пераходам да земляробства і жывёлагадоўлі набыло характар падсобнага (здабыўнога) промыслу. Найбольш значную ролю збіральніцтва выконвала ў лясных мясцовасцях, дзе не згубіла свайго значэння і па наш час. Сярод розных відаў збіральніцтва для жыхароў Беларусі былі ўласцівы збіранне траў

і карняплодаў, ягад і грыбоў, здабыванне раслінных сокаў і інш. Кожны з відаў збіральніцтва адпавядаў мясцовым умовам жыццядзейнасці, патрабаваў пэўных працоўных навыкаў і ўменняў, звязаных з веданнем флоры, харчовых і лекавых якасцей пэўных раслін, іх феналагічнага цыкла і сезонных змен, аптымальных спосабаў і прыёмаў іх здабывання, першаснай апрацоўкі і захавання.

Травяністыя расліны (лісце шчаўя, крапівы, лебяды) збіралі да іх цвіцення, складвалі ў фаскі і макотры, перасыпалі соллю, квасілі, каб у зімова-веснавы перыяд гатаваць варыва. Шчаўе, кісліцу, цыбулю лугавую, маладыя парасткі аеру і іншае ўжывалі і свежымі. Вялікае значэнне мелі хрэн і кмен, якія выкарыстоўваліся як прытрава да ежы і кансервант у розных саленнях. Акрамя таго, апроч спецыфічных смакавых уласцівасцяў, гэтыя расліны ўтрымлівалі ў пяць разоў болей вітамінаў і мікраэлементаў чым, напрыклад, цытрусавыя.

Тэхнічнае значэнне мелі раслінныя фарбавальнікі: цярноўнік даваў жоўты, зялёны і бронзавы колер, драсён птушыны – фіялетавы, паслён – бронзавы. Ярка-чырвоны колер атрымлівала тканіна з сабраных кукліц чарвякоў-кандыдаў.

Дзесяткі відаў раслін (святаянік, мацярдушка, скрыпень, чабор, крываўнік і інш.) збіраліся і сушыліся для працяглага захавання ў лекавых мэтах.

Пашырана было збіранне ягад і дзікарослых пладоў. Лясныя ягады – суніцы, чарніцы, дурніцы, маліны, ажыны, парэчкі – спажывалі пераважна свежымі. Некаторыя ягады збіралі пераважна на запас: брусніцы парылі ў гаршчках, ссыпалі ў кадушкі і бочкі, рабілі з іх сок і павідла (на мёдзе); чарніцы часцей сушылі; журавіны захоўвалі замарожанымі, дабаўлялі ў шаткаваную капусту, гатавалі з іх розныя напоі.

У значнай колькасці назапашвалі ў лесе жалуды і арэхі, дзікія грушы і яблыкі. Вялікае значэнне, асабліва ў Сярэднявеччы, меў збор дзікарослага хмелю, які з’яўляецца важнейшай сыравінай для півакарэння. У XV – XVI стст. ВКЛ з’яўлялася адным з буйнейшых экспарцёраў хмелю, забяспечваючы іх шматлікія ейрапейскія бровары.

Вялікай папулярнасцю ў беларусаў карыстаўся (і карыстаецца дагэтуль) бярозавы сок, што нарыхтоўвалі ўвёсну і які служыў асновай для вырабу адмысловага квасу – бярозавіка.

Але бадай самым улюблёным відам здабыўнога промыслу да нашага часу застаецца збіранне грыбоў, якія спажываюць свежымі (смажаць, вараць, тушаць), соляць, марынуюць і сушаць на зіму. Сушаныя баравікі былі не апошняй часткай беларускага экспарту – іх тонамі вывозілі ў Рыгу,

Кралявец, Гданьск, Дрэздэн і іншыя гарады Заходняй Еўропы, а таксама ў Расію і Украіну.

Збіральніцтва – адзін з нешматлікіх старажытных промыслаў, якія захаваў ва ўмовах урбанізацыі сваю архаічную форму, індывідуальны характар ручной працы і не страціў свайго значэння. Розных грыбоў і ягад штогод нарыхтоўваецца насельніцтвам Беларусі не менш за 100 тыс. тон (!).

Папулярнасць збіральніцтва ў сучасным грамадстве абумоўлена і тым, што яно адначасова з'яўляецца і захапляльным заняткам, і адпачынкам ва ўлонні прыроды.

*Пчалярства*, як развіты гаспадарчы промысел, існавала яшчэ ў часы агульнаславянскага моўнага адзінства, распад якога адбыўся ў V – VI стст. н.э. На гэта ўказвае агульнаславянскі пласт лексікі, звязанай з пчалярствам (напрыклад, бел. "воск", укр. "віск", польск. "wosk", чэшск. "vosk", балгар. "восък" і г.д.). Першапачатковай і самай працяглай па часе бытавання формай пчалярства было *бортніцтва – утрыманне і развядзенне пчол у борцях – натуральных і спецыяльна выдзяўбаных штучных дуплах жывых дрэў, такіх, як хвоя, дуб, ліпа, асіна.*

Бортніцтва ўзнікла з так званага дзікага пчалярства і прайшло ў сваім развіцці тры асноўныя этапы: 1) ахова і догляд лясных пчол (*баровак*) у натуральных дуплах, якія яны засялялі самі без дапамогі чалавека; 2) утрыманне пчол у натуральных дуплах, загадзя падрыхтаваных чалавекам; 3) развядзенне баровак у штучных дуплах, гэта значыць у борцях.

Прадукты пчалярства (мёд, воск) на працягу многіх стагоддзяў выступалі ў ролі грашовага эквіваленту, надзвычай каштоўнага тавару і даніны, што абумовіла надзвычай высокі статус пчаляра ў традыцыйным грамадстве. Неабходна адзначыць, што і сама пчала ў народных уяўленнях з'яўлялася сакральнай істотай, "божай казюркай", атрыбутам вярхоўных багоў і пасрэднікам паміж імі і людзьмі. Адсюль злачынствы ў галіне пчалярства (рабаванне, знішчэнне борцяў, скраданне пчолаў і г.д.), якія караліся ў сярэднявечным беларускім грамадстве надзвычай жорстка. Так, Статут ВКЛ 1588 года прадугледжваў за падобныя злачынствы велізарныя штрафы, а калі "пчаладзёра" лавілі на "гарачым учынку" (на месцы злачынства), то яго каралі смерцю.

У XVI – XVIII стст. існавалі брацтвы і цэхі бортнікаў, карпаратыўныя аб'яднанні, якія ахоплівалі ў асноўным мяшчан і дробную шляхту. Бортніцтвам пераважна займаліся сяляне, для якіх земляробства заставалася галоўнай крыніцай існавання, а пчалярства было другарадным заняткам.

Прафесіяналы і дваравыя бортнікі вызваляліся ад цяглавай службы і некаторых іншых павіннасцяў. На працягу ўсяго Сярэдневечча Беларусь (ВКЛ) з'яўлялася буйнейшым пастаўшчыком мёду і воску на еўрапейскі рынак. Развітае і прадуктыўнае бортніцтва здзіўляла іншаземцаў. Так, адзін з шведскіх жаўнераў, апынуўшыся на Беларусі ў часе Паўночнай вайны, занатаваў у сваім дзённіку: *"У гэтай краіне мы ласаваліся надзвычай вялікай колькасцю мёду, які мы называлі па-тутэйшаму "miod". Ён быў вельмі смачны. Нідзе таксама мы не бачылі такой колькасці воску, які быў якасны і танны"* (Котлярчук А. Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў. – Мн., 2002. – С. 152).

На змену борці прыйшоў *калодны вулей*, які азначаў надыход новага этапу ў развіцці культурнага пчалярства. Пераход ад борці да калоды расцягнуўся на некалькі стагоддзяў і завяршыўся толькі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.

Першы калодны вулей быў, фактычна, борцю, выпілаванай з вывернутага ветрам дрэва. Па пераемнасці калоднае пчалярства доўгі час называлася бортніцтвам. Калоднае пчалярства на пачатку было лясным і толькі пазней перамясцілася на сядзібы. З мэтай аховы ад медзведзяў, калоды ўсталёўвалі на подкурах (памостах) на вышыні да 15 м. Калі паменшала мядзведзяў, іх ставілі на двух паралельна ўрэзаных у дрэва, часта ў два суседнія, дубовых брусах. Канструкцыйна калода (рэгіянальныя назвы: "бучак", "даўбяк", "каранёк", "наварацень", "стаўбун" і інш.) адрознівалася ад борці толькі тым, што мела накрыўку.

З сярэдзіны XIX ст. калоду пачынае замяняць *рамовы вулей – разборны вулей з рухомымі гнездавымі і магазіннымі (для збору мёду) рамкамі.* Аднак рамовы вулей марудна пракладаў сабе дарогу на Беларусі. Пчаляры, 80 % з якіх былі сяляне, трымаліся традыцыйнай, пераважна лясной формы пчалярства. Яны з недаверам і насцярожанасцю ставіліся да новаўвядзення, якое амаль цалкам разбурала асвечаныя шматвекавым вопытам ўяўленні. Таму, яшчэ ў пачатку XX ст. у чатырох беларускіх губернях існавалі наступныя суадносіны паміж калоднымі і рамовымі вуллямі: Віцебская – 85:15, Гродзенская – 92:8, Магілёўская – 88:12, Мінская – 92:8. Канчаткова пераважаць рамовы вулей стаў толькі ў 1930-х гадах.

У беларускай традыцыйнай культуры пчалярства было вельмі цесна звязана з духоўным светам чалавека і калектыва: абрадамі, вераваннямі, магічнымі практыкамі. Мёд са старажытных часоў з'яўляўся адной з галоўных рытуальных страў. З яго гатавалі *канун*, хмяльныя напоі – *ліпец* і

*мядуху*, якія спажываліся на радзінах, вяселлях, хаўтурах і галоўных каляндарных святах.

Асноўны спектр магічных прыёмаў, непасрэдна звязаных з пчалярствам, быў скіраваны на ахову, захаванне раёў, павелічэнне іх колькасці і прадуктыўнасці. Так, напрыклад, каб засцерагчы пчолаў ад розных сурокаў і псоты, вуллі патрэбна было ставіць сярод глухой крапівы. На Падзвінні, каб падвысіць меданоснасць пчолаў, іх абкурвалі воскам ад згарэўшай царкоўнай свечкі, трэскай дрэва, разбітага перуном ці “пышам” – засушаным кончыкам ваўчыннага носу.

Прафесійна-магічныя веды пчаляроў трымаліся ў вялікай таямніцы і маглі быць перададзены толькі старэйшаму нашчадку па мужчынскай лініі, што абумовіла мінімальны аб’ём этнаграфічных матэрыялаў на гэтую тэму.

У маральна-этычным аспекце паказальным ёсць пачатковае значэнне словаў “*сябры*”, “*сябрына*” як таварыства пчаляроў, што мелі агульных пчолаў і вызначаліся паміж сабой шчырасцю, узаемапавагай і ўзаемадапамогай нават большай, чым сярод крэўных сваякоў.

Сучаснае беларускае пчалярства перажывае крытычны перыяд. Амаль удвая ўзрасла працаёмістасць пчалярства, што выклікана экалагічна неспрыяльнымі ўмовамі (хімізацыя, радыяцыя, кармавы дэфіцыт), нашэсцем вараатозу – хваробы пчол, якую выклікаў невядомы да 1970-х гадоў клешч, а таксама ўтратай шматвяковага вопыту і значнай долі пчалярскіх традыцый. Адраджэнне беларускага пчалярства магчыма толькі ў кантэксце агульнанацыянальнага экалагічнага адраджэння – пераходу ад спажывецкага да партнёрскага стаўлення да роднай прыроды.

Значную ролю ў традыцыйнай сістэме гаспадарання адыгрывалі *лесахімічны і лесанарыхтоўчы промыслы.*

Да лесахімічных промыслаў адносяцца *смалакурэнне*, *гонка дзёгцю*, *шкіпінару*, *выпальванне вугалю*, *выварка паташу.*

Смала ўжывалася для прасмолкі рыбацкіх невадаў, лодак, суднаў, канатаў, у ваеннай справе. У значным аб’ёме смалу вывозілі за мяжу. У раннім сярэднявеччы Полацк актыўна гандляваў смалой з нямецкімі ганзейскімі гарадамі праз Рыжскі порт. У сувязі з развіццём у Англіі і Галандыі марскога флоту і прамысловасці з XVI ст. павялічыўся экспарт смалы ў гэтыя краіны.

Надзвычай разнастайным з’яўлялася выкарыстанне *паташу* (шчалачная соль, атрыманая з расліннага попелу). Ён быў неабходны для мыцця воўны, адбельвання і фарбавання тканін, для мылаварэння, шкларобства. *Дзёгаць* выкарыстоўвалі для змазкі калёсных восяў, у гарбарстве, пры вы-

рабе сырамятнай скуры, у народнай медыцыне; *вугаль* – у кавальскай справе, металургіі.

Галоўнымі раёнамі лесахімічных промыслаў з'яўляліся Падняпроўе і Палессе. Для вытворчасці смалы, паташу, вугалю, дзёгцю стваралі спецыяльныя прадпрыемствы, якія называліся *будамі*. Яны вядомы на Беларусі ўжо ў XV – XVI стст. і, як правіла, належалі буйным феадалам: Радзівілам, Любамірскім, Солтанам і інш. Пазней, на месцах былых лясных прадпрыемстваў утвараліся вёскі з назвамі Буды, Буднікі, Смольня, Смалявічы і да т.п. Буды дзейнічалі круглы год. Вясной, летам і восенню рыхтавалі сыравіну: выпальвалі попел для варкі паташу, бралі бярosту для гонкі дзёгцю, выкопвалі смаляныя карчы для смалакурэння. У народных уяўленнях, лясныя ўрошчышчы, дзе працавалі смалакурні, выступалі як "нячыстыя", "ліхія" месцы, звязаныя з чортам. Апошні, нібыта, асабліва апекваўся над смалакурнямі, бо яны пастаўлялі смалу і для патрэб пекла.

Як асоба, набліжаная да чорта, схільная да чарадзейства выступае ў беларускім фальклоры *атаман* – галоўны майстра, упраўляючы смалакурні (буды).

Вельмі важнае значэнне мела і *нарыхтоўка драўніны*, якая ішла на задавальненне мясцовых гаспадарчых патрэб (будаўніцтва, сыравіна для рамёстваў, паліва і г.д.), а таксама на экспарт. Традыцыйна лес прызначаны на вываз сплаўлялі рэкамі: па Нёмане – у Прусію, па Заходняй Дзвіне праз Рыгу – у Англію і Галандыю, па Дняпры – на Украіну.

### 4.1.2. Традыцыйныя рамёствы беларусаў

*Рамёствы – вытворчасць прамысловых вырабаў уручную з выкарыстаннем механічных прылад і інструментаў, майстэрства ўмелых рук* (ст.-рус. "*рука мясло*"). Рамяство з'яўляецца першай гістарычнай стадыяй апрацоўчай вытворчасці, якая папярэднічала машыннай прамысловасці. Больш выразная спецыялізацыя апрацоўчай (рамеснай) вытворчасці абумовіла яе разгалінаваную ўнутраную структуру. Паводле зыходнага матэрыялу вылучаюць асобныя рамёствы – дрэваапрацоўчыя, металаапрацоўчыя, гарбарна-футравыя, харчовыя, апрацоўка мінеральнай, валакністай сыравіны, выраб адзення. У сваім развіцці рамёствы прайшло тры гістарычных стадыі: 1) хатняе рамяство; 2) рамяство на заказ і 3) рамяство на рынак, або дробна-таварная вытворчасць.

У дакапіталістычны перыяд рамёствы з'яўляліся асноўнай формай прамысловай вытворчасці і адыгрывалі важную ролю ў гаспадарчым жыц-

ці беларускага народа. Развіццю рамёстваў, іх спецыялізацыі і арганізацыйнаму ўпарадкаванню садзейнічала магдэбургскае права. У XVII ст. у гарадах Беларусі налічвалася каля 200 спецыялізаваных відаў рамёстваў, сярод якіх найбольш пашыранымі былі: у гарадах – кавальства, кравецтва, шавецтва, гарбарства, цяслярства, ганчарства; у вёсцы – розныя віды дрэваапрацоўкі, апрацоўка лёну і воўны, ткацтва, пляценне.

Гарадскія рамеснікі аб’ядноўваліся ў прафесійныя, карпаратыўныя арганізацыі – цэхі, вытворчая дзейнасць і грамадскае жыццё якіх рэгламентавалася спецыяльным статутам. У 18 гарадах Беларусі XVII ст. налічвалася 116 цэхаў, у тым ліку 46 цэхаў з адной спецыяльнасцю, астатнія 70 аб’ядноўвалі 2 – 6, а часам і да 10 прафесій кожны.

Аднак, да XIX ст., у сувязі з развіццём капіталістычных тэндэнцый у эканоміцы, цэхавае рамяство ўжо вычарпала свае магчымасці. Развіццё буйной прамысловасці ў другой палове XIX – пачату XX ст. прывяло да скарачэння большасці рамёстваў, але некаторыя з іх (кравецкае, шавецкае, кавальскае, шапавальнае, ваўчыннае, сталярнае, цяслярнае), ва ўмовах беларускай традыцыйнай вёскі, атрымалі яшчэ большае распаўсюджанне.

Пераважная большасць рамёстваў была заснавана на мужчынскай працы. Жаночая праца пераважала ў апрацоўцы льну, пянькі, канопляў і воўны, ткацтве, вышыўцы, хатняй вытворчасці адзення. Арганічна звязаныя з земляробствам і жывёлагадоўляй, традыцыйныя рамёствы беларусаў былі зарыентаваны на восеньска-зімова-веснавы сезон, вольны ад сельскагаспадарчых работ.

У наш час засваенне багатых традыцый народнага рамяства стала адной са знакавых праяў нацыянальна-культурнага адраджэння. Пры гэтым, прадукцыя майстроў, што працуюць у галіне традыцыйных беларускіх рамёстваў (перадусім, керамісты, кавалі, разьбяры па дрэве, арнаменталісты, ткачыхі і інш.), нясе не столькі ўтылітарную, колькі мастацка-эстэтычную і этнавызначальную функцыі.

*Кавальства* – вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з жалеза шляхам яго гарачага кавання. Адрозніваюць ад слясарства, дзе пераважаюць работы з халодным металлам. Аднак, у народным (вясковым) кавальстве такога падзелу не існавала – кавалі выконвалі любыя работы па апрацоўцы метала.

На Беларусі кавальства вядома з часоў жалезнага веку і было заснавана на выплаўцы крычнага жалеза з мясцовых балотных руд і выкоўванні з яго вырабаў гаспадарчага і ваеннага прыназначэння. У Сярэдневеччы ка-

вальствам пераважна займаліся гарадскія рамеснікі, якія валодалі складанымі тэхналогіямі загартоўкі, цэментацыі і зваркі жалеза. У XVI – XVII стст. існавалі шматлікія кавальскія цэхі (Полацк, Віцебск, Магілёў, Слуцк і інш.), якія аб'ядноўвалі кавалёў розных спецыяльнасцяў: нажоўшчыкаў, мечнікаў, замочнікаў, кацельшчыкаў і інш. У XIX ст. з развіццём прамысловасці кавальства ў гарадах заняпала, адначасова ўзрасла яго роля ў вёсцы, дзе яно задавальняла бытавыя і гаспадарчыя патрэбы мясцовага насельніцтва.

У традыцыйным беларускім грамадстве кавальскае рамяство, як правіла, з'яўлялася спадчынным. Сыны пераймалі навуку ў бацькі ці бліжэйшых родзічаў. Праца каваля ў вясковай грамадзе лічылася пачэснай і ганаровай, была ахутана мноствам таямніц. У народных вераваннях і фальклоры каваль, як чалавек, што працуе са стыхіяй агню і жалезам, нярэдка выступае ў якасці моцнага знахара, казачнага героя-асілка, які супрацьстаіць "нячыстай сіле" (чорту, цмоку, ведзьме) і перамагае яе.

Вясковую кузню, з меркаваннеяў пажарнай бяспекі, ставілі воддаль ад будынкаў, у канцы сядзібы, бліжэй да вады. Для грамадскіх кузняў лепшым месцам з'яўлялася скрыжаванне дарог ці паблізу карчмы – там, дзе быў найбольшы рух падарожных людзей. Кузня ўяўляла сабой просты будынак квадратнай ці простакутнай формы, без столі з земляной падлогай. Каля тарцовай сцяны, насупраць уваходу, узводзілі *горан* – кавальскую печ для награвання металу, забяспечаную мяхамі і паддувалам. Над горнам рабілі каптур для выцяжкі дыму. Паблізу горна, пасярэдзіны кузні (для зручнасці працы з любога боку), усталёўвалі *кавадла* – масіўны металічны куб з адным ці двума рагамі. Побач ставілася драўлянае карыта з вадой – ахалоджваць загатоўкі. Пры сцяне пад акном мацавалі *варштат* – драўляны насціл, на якім выконвалі розныя работы, не звязаныя з кавальствам, трымалі інструмент. Абавязковым кавальскім інвентаром былі малаткі і клешчы, а таксама разнастайныя зубілы, прабойнікі і г.д.

У залежнасці ад функцыянальнага і практычнага прызначэння, кавальскія вырабы можна падзяліць на некалькі груп.

1. *Падкоўванне коней.* Адзін з найбольш пашыраных і запатрабаваных у побыце працэсаў, які ўключаў выраб падкоў, вухналёў (цвікоў) і непасрэдна падкоўванне коней.

2. *Кавальства ў народным дойлідстве*: клямкі, завесы, крукі, зашчэпкі, замкі, крыжы на купалы цэркваў. Сюды ж можна аднесці і блізкія па характары надмагільныя крыжы і агароджы.

3. *Акоўка транспартных сродкаў* – калёс, саней, брычак, вазоў. Для іх выраблялі восі, шворны, атосы, шыны, падкосы, рэхвы і да т.п.

4. *Кавальскія вырабы ў народным побыце.* Сюды ўваходзяць шырокі дыяпазон рэчаў самага рознага прызначэння: кавальскія, слясарскія, цяслярскія інструменты; сельскагаспадарчы інвентар – плугі, бароны, сярпы, косы, матыкі і інш.; вырабы бытавога прызначэння – секачы, кавені (качэргі), рагачы (вілкі), крэсівы, бязмены і да т.п.

У наш час кавальства прыкметна змяніла свой характар. Сфера яго прымянення ў народным побыце моцна звузілася, саступіўшы месца вырабам прамысловай вытворчасці. Сваё выкарыстанне кавальства знайшло ў рэстаўрацыйнай справе, дзе носіць пераважна мастацкі характар.

*Ганчарства, вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з гліны*, вядома на Беларусі з часоў неаліту. Як спецыялізаванае рамяство вылучылася са з'яўленнем *ганчарнага круга* (на Беларусі ў X ст.). Першапачаткова вырабы ляпілі ад рукі і не абпалівалі. Асноўным кампанентам фармовачнай масы з'яўлялася гліна, у якую для павелічэння трываласці дадавалі сухую траву, жарству, пясок. З XIX ст. фармовачную масу рабілі з аднаго або двух – трох гатункаў гліны шляхам працяглай пластычнай апрацоўкі (нагамі, рукамі, доўбняй). Падрыхтаваную масу дзялілі на невялікія кавалкі, дастатковыя для вырабу адной пасудзіны (камякі, галкі, клёцы). Фармавалі посуд на нажным або ручным ганчарным крузе спосабам выціскання, кальцавога налепу ці выцягвання. Пасля посуд абпальвалі для атрымання большай трываласці ў *ганчарным горне* (зрэдку ў хатняй печы).

Ганчарства было надзвычай развіта ў гарадах сярэднявечнай Беларусі. У XVI – XVIII стст. цэхі, у якія ўваходзілі ганчары, існавалі ў Полацку, Віцебску, Дзісне, Мінску, Гродне, Слуцку, Міры і іншых гарадах і мястэчках. Аднак, у другой палове XIX ст. гарадское ганчарства было ўжо не ў стане канкураваць з прамысловай вытворчасцю і паступова занепадае. Іншыя працэсы адбываліся ў сельскім ганчарстве. Адмена прыгоннага права, развіццё капіталістычных адносінаў станоўча паўплывалі на народныя рамёствы. Паколькі прамысловыя вырабы былі маладаступныя сялянству, то вялікім попытам карыстаўся танны ганчарны посуд вясковых (мястэчковых) ганчароў. Росту рамяства садзейнічала таксама і малазямелле значнай часткі сялянства. Таму ў многіх месцах Беларусі, дзе меліся багатыя радовішчы добрай гліны, утварыліся буйныя ганчарныя асяродкі, якія аб'ядноўвалі некалькі суседніх вёсак і па колькасці майстроў нашмат апераджалі старажытныя ганчарныя цэнтры. З найбольш буйных канцэнтрацый ганчарных паселішчаў можна назваць Сіняўку, Ганявічы, Масцілавічы,

Забалотнікі (Клецкі р-н), Ясенец, Літвінавічы (Шклоўскі р-н). Колькасць ганчароў дасягала тут некалькі сотняў. Усяго ў канцы XIX – пачатку XX стст. ганчарствам на Беларусі займалася каля 4 – 4,5 тыс.чалавек.

Надзвычай шырокім і разнастайным быў асартымент ганчарных вырабаў, якія можна падзяліць на некалькі асноўных катэгорый.

*1. Посуд для гатавання:*

– *гаршкі;*

– *бабачнікі* (гліняныя пасудзіны ў выглядзе ўсечанага конуса з вертыкальнымі глыбокімі ўмяцінамі па баках для выпякання велікоднага пірага);

– *латкі* (глыбокія гліняныя пасудзіны з шырокім тулавам і вусцем, у якіх смажылі і тушылі мяса, бульбу, пражылі гарох і да т.п.);

– *рынкі* (круглая, плоская пасудзіна на трох ножках з полым дзяржальнам, прызначаная для смажання страў).

*2. Посуд для захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў:*

– *збаны* (пасудзіны з выцягнутым тулавам, пукатымі бакамі і звужаным горлам, прыназначаныя для захоўвання малака);

– *гарлачы* (падобныя на збаны, але без ручкі і дзюбкі);

– *глякі* (шарападобныя пасудзіны з плоскім дном, кароткім вузкім горлам і 1 – 2 ручкамі для захоўвання і транспарціроўкі вадкіх рэчываў – алею, квасу і інш.);

– *слаі* (высокія пасудзіны з пукатымі бакамі і шырокім горлам; у вялікіх слаях салілі агуркі, грыбы, капусту, у малых – захоўвалі мёд, тлушч, смятану і інш.);

– *спарышы* (пасудзіна з 2 – 3 гаршчкоў, змацаваных адной ручкай; прыназначалася для дастаўкі ежы на поле ў сенакос ці жніво).

3. *Сталовы посуд*: міскі, паўміскі, кубкі, хлебніцы, маслёнкі і інш.

4. *Рэчы гаспадарчага ўжытку:* рукамыі, паілкі, пасудзіны для гонкі дзёгцю і да т.п.

5. *Дэкаратыўная кераміка:* фігурны посуд, скульптуры малых форм у выглядзе жывёл, букетнікі, вазоны.

6. *Цацкі* ў выглядзе фігурак людзей, жывёл, птушак.

Самастойнае значэнне мела вытворчасць *дахоўкі* (керамічнай пліткі для накрыцця дахаў пераважна мураваных будынкаў) і *кафлі* (керамічныя пліткі для абліцоўкі і дэкаратыўнага аздаблення печаў, камінаў і інш.).

У беларускай традыцыйнай культуры з ганчарствам і ўласна гліняным посудам было звязана шмат архаічных уяўленняў і забабонаў. Да прыкладу, лічылася, што калі благое вока гляне на посуд пад час лепкі, то гаршкі ў печы паб’е пярун. З мэтай абароны посуд трэба было пакрапіць

салёнай вадой ці абвесці вакол тры разы падпаленай драўлянай качаргой. На Палессі гаршчок, таемна скрадзены ў ганчара і ўкінуты ў калодзеж, лічыўся надзейным сродкам выклікання дажджу ў часе працяглай засухі. Сувязь гаршчка з душамі продкаў і хатнім ачагом выразна прасочваецца ў агульнабеларускім павер’і аб тым, што дамавік перасяляецца ў новую хату менавіта ў гаршчку з жарам.

У наш час маштабы народнага ганчарнага промыслу з’яўляюцца мінімальнымі, аднак у сувязі з ростам цікавасці да традыцыйнай спадчыны назіраецца пэўнае адраджэнне мастацка-дэкаратыўных форм архаічнага рамяства.

*Дрэвaапрацоўчыя рамёствы* з’яўляюцца аднымі з найбольш старажытных і ўзніклі на пачатку чалавечай гісторыі разам з вырабам прымітыўных прылад працы. У XVI – XVII стст. на Беларусі існавала каля 30 рамесных прафесій, звязаных з апрацоўкай дрэва. У XIX – пачатку XX стст. Найбольш пашыранымі і развітымі ў сельскай мясцовасці былі такія дрэваапрацоўчыя рамёствы як *цяслярства*, *сталярства*, *бондарства, стальмашнае рамяство*, *такарнае рамяство*, *разьба па дрэве і пляценне.*

*Цяслярства – рамяство, звязанае з вырабам і ўстаноўкай драўляных канструкцый і дэталяў вялікіх памераў; галіна народнага дойлідства.* У XIX – пачатку XX стст. цяслярства развівалася ў форме саматужнага і адыходнага промыслаў. У гэты час на палескіх кірмашах можна было купіць усе неабходныя “запчасткі” і скласці з іх цэлую хату. Тут прадаваліся ў розніцу бэлькі, кроквы, вушакі, дошкі, гонта, аконныя шыбы і інш. Мноства будаўнічых матэрыялаў па Дняпры, Заходняй Дзвіне і Нёмане вывозілася за межы Беларусі. Па агульнай колькасці майстроў, для якіх саматужны промысел быў асноўнай крыніцай даходу, цесляры займалі адно з першых месц сярод іншых прафесій.

Народныя цесляры-дойліды будавалі не толькі жыллё і гаспадарчыя памяшканні (гумны, пуні, хлявы і г.д.), але і абарончыя збудаванні, культавыя будынкі (цэрквы, касцёлы, капліцы), прамысловыя аб’екты, млыны, масты і інш.

Паколькі асноўным заняткам цесляроў было будаўніцтва жылля (хат), якое ў міфапаэтычнай мадэлі карціны свету выступала як мікрамадэль космасу, сімвалічнае ўвасабленне ўсіх жыцёвых даброт і долі цэлага роду, то майстры гэтай спецыяльнасці карысталіся надзвычайнай павагай і пашанай з боку вясковай грамады. У выпадку дрэннага абыходжання, цясляр, закладаючы хату (першы вянец), мог заклясці яе.

Так, на Падзвінні ў канцы XIX ст. было распаўсюджана наступнае павер'е: "Калі майстрам дрэнна дагаджалі ці між імі ёсць гаспадароў "злоснік", то трэба асцерагацца, што ён навядзе на дом match насланнё: гніль, пажар, буру, калецтвы, хваробы і нават смерць. Звычайна гэта робіцца, калі сякуць першае бервяно. Удараючы крыж-накрыж сякераю па бервяне і трымаючы ў галаве задуманую шкоду, майстар гаворыць: "Так! Няхай будзе так!" – і што ён задумаў, тое абавязкова збудзецца" (Никифоровский Н.Я. Простонародные приметы и поверья. – Віцебск, 1897. – С. 136). У выпадку, калі адносіны паміж гаспадарамі і цесляром былі прыязныя, апошні мог заклясці на смерць клапоў і прусакоў з тым, каб яны не вяліся ў новай хаце.

*Сталярства*, як адзін з відаў дрэваапрацоўчых рамёстваў, цесна звязана з цеслярствам, што абумоўлена адзінай функцыянальнай мэтай – арганізацыяй жылога асяроддзя і стварэннем адпаведных жыллёва-бытавых умоў. Аднак характар працы, складанасць рамеснай тэхнікі, разнастайная наменклатура вырабаў вылучалі сталярства ў асобнае рамяство. У залежнасці ад функцыянальна-тыпалагічных асаблівасцяў усе *сталярныя вырабы* можна падзяліць на некалькі груп.

1. *Будаўнічыя канструкцыі і абсталяванне жылля*: асады вокан і дзвярэй, аконныя шыбы, ліштвы, аканіцы, дзверы, палаці, брамы і інш.

2. *Мэбля*: сталы, лавы, услоны, зэдлікі, крэслы, канапы, ложкі, куфры, шафы, суднікі, калыскі, бажніцы.

3. *Сельскагаспадарчыя прылады*: сохі, ралы, бароны, ільнамялкі, вілы, граблі, сахоры і мачы для гною, цапы, рыдлёўкі, хлебныя лапаты, драўляныя рукаяткі для розных прылад.

4. *Вытворчыя прылады і прыстасаванні:* варштаты, кросны, праснíцы, грабяні, бёрды, калодкі для вырабу абутку, ганчарныя кругі, ступы, паляўнічыя пасткі і інш.

5. *Транспартныя сродкі*: карпусы і кузавы карэт, калымажак, калёс і іншых выязных і грузавых павозак, а таксама рачных судоў.

6. *Дахавыя матэрыялы*: дошкі, гонты, драніцы.

Цесна звязаным з сталярствам і дрэваапрацоўкай увогуле было *стальмашное рамяство*, якое ў шырокім сэнсе азначае выраб традыцыйных транспартных сродкаў і аб'ядноўвае шэраг разнастайных і функцыянальна блізкіх майстэрстваў – вытворчасць колаў, рознага тыпу вазоў і экіпажаў, лёгкіх павозак і санак для ручной цягі, а таксама дуг, палазоў, аглабель, ярэмаў і інш.

У традыцыйным грамадстве гужавыя транспартныя сродкі выконвалі не толькі важныя практычныя функцыі, але выступалі, як тое ж адзенне,

сацыяльнай і фамільна-родавай адзнакай, сцвярджэннем уласнай годнасці і шляхецкага гонару (“*якія самі, такія і сані*”). Гэтая акалічнасць не ў малой ступені ўплывала на развіццё стальмашнага рамяства, павышала яго грамадскі статус. У сельскай мясцовасці, асабліва ў прыватнай гаспадарцы, гужавыя павозкі не страцілі свайго значэння й дагэтуль як адзін з найбольш эканомных і экалагічна дасканалых відаў транспарту.

Паводле канструкцыі і функцыянальных асаблівасцяў прызначэння, усе *гужавыя транспартныя сродкі* падзяляюцца на дзве вялікія групы – *палазныя* або *зімнія* (сані, крунжолы – грузавыя сані, вазкі) і *колавыя* або *летнія* (воз, калёсы, мажара – грузавая павозка з бартавымі драбінамі, калымажкі, брычкі і інш.).

*Суднабудаўніцтва* займала асобнае месца ў традыцыйных рамёствах, што было абумоўлена надзвычай развітай гідрасістэмай Беларусі і вялікай роляй воднага транспарту. У залежнасці ад канструкцыйных асаблівасцяў усе судны, што былі вядомы і выраблялiся на Беларусі можна падзяліць на тры групы: 1) чаўны (аднадрэўкі); 2) дашчаныя лодкі і 3) камбінаваныя лодкі. Яны ў сваю чаргу адрозніваліся нават у межах адной тыпалагічнай групы сваімі памерамі, формай днішча, носа, кармы, узаемнымі прапорцыямі, хуткасцю ходу, устойлівасцю на плаву і іншымі тэхнічнымі характарыстыкамі. Па знешніх прыкметах, абсталяванасці і камфортнасці большасць суднаў былі *адкрытымі* (чаўны, дашчаныя лодкі, стругі, баркі), меншая частка – *закрытымі*, з палубай, нярэдка і з дахам (берліна, віціна, бат, ладдзя). У некаторых лодках вялікіх памераў (лайбах, чайках, шугалеях) пэўную частку прасторы займала спецыяльна ўладкаванае памяшканне (будка). Такія судны адносяцца да прамежкавага варыянта.

Па спосабах руху традыцыйныя судны падзяляюцца на *сплаўныя* (струг, барка, люз) і *хадавыя*. Першыя звычайна рухаліся ўніз па цячэнні ракі на далёкія адлегласці да пэўнага пункта прызначэння, дзе тавары выгружаліся, а само судна за пэўны кошт збывалася мясцовым жыхарам. Да гэтага тыпу суднаў адносяцца і плыты, якія служылі для перавозкі лесу, збожжа і іншых тавараў.

Да хадавых адносіліся ўсе астатнія віды суднаў, што рухаліся на механічнай цязе пры дапамозе вёслаў ці доўгіх шастоў (“на ялінах”), на ветразях ці на буксіры. Яны хадзілі ўверх і ўніз па цячэнні ракі.

На сённяшні час з усёй разнастайнасці традыцыйных суднаў захаваліся пераважна дашчаныя лодкі, што карыстаюцца ў жыхароў прырэчных і прыазёрных паселішчаў, як адзін з самых практычных і экалагічна чыстых відаў транспарту, значнай папулярнасцю.

*Бондарства – рамяство па вырабу драўлянага посуду* – з'яўляецца адным з самых старажытных і распаўсюджаных рамёстваў у Беларусі. Рэшткі драўлянага посуду былі знойдзены пры археалагічных раскопках усіх раннесярэднявечных гарадоў: Полацка, Віцебска, Турава, Берасця, Мінска і інш.

У XIX – пачатку XX ст. бандарнае рамяство развівалася пераважна ў сельскай мясцовасці як падсобны промысел у сялянскай гаспадарцы. Вясковыя майстры-універсалы, што валодалі разнастайнымі навыкамі дрэваапрацоўкі, выраблялі пераважную колькасць бандарнага посуду ў восеньска-зімовы перыяд. Мноства посуду набывалася на кірмашах, куды яго прывозілі мясцовыя майстры або скупшчыкі.

Паводле функцыянальнага прызначэння бандарны посуд падзяляецца на чатыры групы.

1. *Посуд для вады і вадкіх рэчываў* (сок, квас, піва і інш.): вядро, біклага, транспартная бочка, барыла, конаўка.

2. *Посуд для захавання сельскагаспадарчых прадуктаў*: усыпішча (судзіна) для збожжа, бочка для гародніны, кадзь, кадушка, кубел.

3. *Бытавы посуд*: кубел для адзення, жлукта (пасудзіна для запарвання бялізны), балея (пасудзіна для мыцця бялізны і купання), цэбар, дзяжа, даёнка, маслабойка і інш.

4. *Меры ёмістасці*: бочка (= 406,5 л), карэц (= $^1/_4$ бочкі), асьміна (= $^1/_2$ карца), шаснастка (= $^1/_{16}$ бочкі), гарнец вялікі (= $^1/_{72}$ бочкі), гарнец малы (= $^1/_{144}$ бочкі).

У наш час, негледзячы на істотнае скарачэнне бандарскага асартыменту, драўляны посуд яшчэ далёка не вычарпаў сваіх магчымасцяў, паколькі з'яўляецца незаменным пры кансерванні і захоўванні шэрагу харчовых прадуктаў – квашаніны, салёных і марынаваных грыбоў, вінаградных вінаў, кан'яку і інш.

Сярод традыцыйных рамёстваў, якія шырока бытавалі на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., неабходна прыгадаць *пляценне* (рамяство па вырабу рэчаў утылітарнага і мастацкага прызначэння з лазы, саломы, лыка, бяросты і іншых пластычных матэрыялаў), *апрацоўку воўны, кушнерства* (апрацоўка і выдзелка аўчын і скурак пушных звяроў), *кравецтва* (рамяство па пашыву верхняга адзення з палатна, сукна, аўчын і футры), *гарбарства* (выраб скур рагатай жывёлы для пашыву абутку), *шавецтва* (рамяство па вырабу скуранога абутку), *ткацтва* (выраб тканін на ткацкім стане або спецыяльным прыстасаванні з перапляценнем асновы (падоўжаных ніцяў) і ўтку (папярэчных ніцяў). Нецяжка заўважыць, што значная частка рамёстваў непасрэдна ці ўскосна была звязана з вырабам даволі складанага комплекса традыцыйнага адзення.

## 4.2. Беларускае традыцыйнае адзенне

У беларускай традыцыйнай культуры адзенне, як штучнае покрыва чалавечага цела (у шырокім сэнсе ўключае абутак і галаўныя ўборы), акрамя непасрэднай утылітарнай функцыі выконвала надзвычай важную сімвалічную ролю. Адзенне служыла маркерам пола, узросту, сямейнага, сацыяльнага, саслоўнага, маёмаснага стану, этнічнай, рэгіянальнай, канфесійнай прыналежнасці, роду заняткаў чалавека, яго рытуальных роляў. Адначасова яно з'яўлялася інструментам, сродкам і аб'ектам магічных практык, адным з галоўных знакаў (у шэрагу з мовай і імем) культурнага статуса чалавека, яго вылучанасці са свету прыроды. Як "абалонка" чалавека, адзенне суадносілася з целам (параўнай агульныя пазначэнні дэталяў адзення і частак цела: спіна, плячо, пояс, рукаў, гарлавіна, нагавіцы і інш.).

У мастацкім плане ва ўсе гістарычныя перыяды вызначальную ролю адыгрываў *касцюм – сукупнасць кампанентаў адзення і прадметаў, што яго дапаўняюць, спалучаных у адзіным стылі*. Паводле канструкцыі касцюмы ўсіх эпох падзяляюцца на тры асноўныя тыпы:

– *драпіраваны* (складаецца з абгорнутага вакол цела кавалка тканіны, замацаванага непасрэдна на постаці);

– *накладны* (апранаецца праз галаву і як бы накладаецца на плечы);

– *расхінны* (мае спераду разрэз зверху данізу).

У XIX – пачатку XX ст. у традыцыйны комплекс мужчынскага адзення ўваходзілі кашуля, нагавіцы, а таксама *камізэлька* (від безрукаўкі, што апраналася на кашулю). Кашулю насілі навыпуск і абавязкова падпярэзвалі поясам, які лічыўся не толькі элементам адзення, але і надзейным магічным абярэгам ад "нячыстай сілы". Сярод абутку былі пашыраны лапці, скураныя *пасталы* (скураны абутак накшталт лапцей), боты, зімой – валёнкі. Галаўнымі ўборамі былі саламяны капялюш (*брыль*) ці валеная *магерка* (шапка ў выглядзе каўпака або ўсечанага конуса), зімой заечая ці аўчынная *аблавуха* (шапка-вушанка). Завершанасць ансамблю надавала скураная сумачка, якую падвешвалі цераз левае плячо ці да пояса. Мужчынскі касцюм меў сціплае аздабленне, у ім пераважаў белы (светла-шэры) колер, а дэкор прыпадаў на каўнер, пазуху, спод кашулі і на разнаколерны пояс з кутасамі. Аднак найбольш ярка і непаўторна этнічная адметнасць беларускага адзення выявілася ў традыцыйным жаночым касцюме.

У жаночай кашулі найбольшая ўвага звярталася на ўпрыгожанне рукавоў, што было звязана не толькі з мастацкім аздабленнем адзення, але і з верай у магічную сілу чырвонага геаметрычнага (рамбічнага) арнаменту,

якi не толькi засцерагаў чалавека ад рознай бяды, але i спрыяў яму ў працы i асабiстым жыццi. Рознастайнасцю вылучалася *паясное адзенне* жанчыны, куды ўваходзiлi:

– *андарак* – спаднiца з шарсцяной цi паўшарсцяной саматканкi ў клетку або ў падоўжаныя цi папярочныя палосы;

– *саян* – спаднiца з прышыўным лiфам-гарстэтам;

– *панёва* – старажытнае паясное адзенне ўсходнiх славян; вядомы расхiнная (тры сшытыя суконныя полкi, сабраныя зверху на шнуры, якiм мацавалiся на талii, крыссё адкрытае спераду цi збоку) i закрытая (чатыры цалкам сшытыя полкi) панёвы.

– *фартух* – паясная адзежына (апраналi на спаднiцу), пашытая з 1 – 2 полак iльнянога палатна, якую мацавалi на талii завязкамi.

Малюнак спаднiцы i панёвы – клетка, падоўжаныя або папярычныя палосы ў чырвоным, сiне-зялёным цi серабрыста-белым каларыце. Кампазiцыйна-арнаментальнае вырашэнне фартуха адпавядала кашулi i гарманiравала з ёю. У жаночае, асаблiва святочнае, убранне ўваходзiў i *гарсэт* у выглядзе безрукаўкi, якая шчыльна аблягала стан i рабiла фiгуру зграбнай. Касцюм мог дапаўняцца рознаколерным поясам з кутасамi цi махрамi.

Галаўныя ўборы строга залежалi ад узросту i сямейнага становiшча жанчыны. У дзяўчат гэта былi перавязкi накшталт вузкiх ручнiкоў (скiндачка, шлячок), вянкi. Замужняй кабеце не дазвалялася паказвацца на людзях з непакрытай галавой (у зваротным выпадку, такая жанчына магла расцэньвацца вясковай грамадой як ведзьма цi чараўнiца), таму жаночыя галаўныя ўборы паводле будовы больш складаныя i разнастайныя. Сярод найбольш пашыраных можна вылучыць наступныя:

– *намiтка* (павойнiк, сярпанка) – старажытны галаўны ўбор замужнiх жанчын на Беларусi, якi складаўся з тонкага кужэльнага палатна (шырынёй 30 – 60 см, даўжынёй ад 2,5 да 5 м), абматанага паверх чапца; было вядома каля 30 спосабаў абмотвання.

– *хустка* – квадратны кавалак тканiны або ажурнага палатна (складалi трохкутнiкам), прызначаны для пакрыцця галавы i плячэй.

– *каптур* – паўшарападобная цi плоская прызбораная на патылiцы шапачка з вушкамi, да якiх прышывалi стужкi для завязвання.

– *чапец* – круглая шапачка з фабрычнай тканiны або вязаная з iльняных цi баваўняных нiтак, састаўная частка больш складаных галаўных убораў, напрыклад, намiткi.

Штодзённым абуткам жанчыны былi лапцi, святочным – пасталы i чорныя хромавыя чаравiкi. Верхняя мужчынская i жаночая вопратка мала

адрознівалася паміж сабой. Яе шылі з валенага нефарбаванага сукна (світа, сярмяга, бурка і інш.); аўчыны (кажух).

Выразна адрознівалася ад народнага шляхецкае адзенне. У Сярэднявеччы адзенне магнатаў, шляхты і гарадской знаці развівалася ў рэчышчы заходнееўрапейскай моды. Шылі яго з дарагіх тканін, аздаблялі залатой і срэбранай вышыўкай, каштоўнымі камянямі. Важнымі часткамі мужчынскага гарнітура былі атласны *жупан* (верхняе адзенне двухбортнага крою з вузкімі рукавамі і стаячым каўняром і пруталенай спінкай, якое спераду зашпільвалася на гузікі і падпярэзвалася поясам), *кунтуш* (доўгае, ніжэй каленяў, адзенне з разрэзанымі рукавамі, якое насілі паверх жупана), воўчае (*вільчура*) ці баброва футра. Знатныя жанчыны насілі *ферэзію і чамару*, аблямаваныя карункамі або футрам собаля, куніцы, лісы, *кабат* з рукавамі. Спрашчэнне адзення феадалаў пачалося ў канцы XVIII ст.

У XX ст. у сувязі з імклівым развіццём прамысловай вытворчасці тканін, працэсамі ўрбанізацыі і разбурэннем традыцыйнай супольнасці, інстытут народнага адзення занепадае, утрачваецца сімволіка старажытных арнаментаў. Разам з тым, у канцы XX ст. у сувязі з абуджэннем цікавасці да архаічных пластоў беларускай культуры, адраджэннем аўтэнтычных каляндарных святаў, назіраецца пэўная рэанімацыя вырабу традыцыйнага адзення, пераважна, яго абрадавых форм.

## 4.3. Традыцыйныя формы паселішчаў і народнае дойлідства Беларусі

Паселішчы – адна з найбольш вывучаных абласцей беларускага народнага дойлідства, дзякуючы абшырнаму этнаграфічнаму, археалагічнаму і гістарычнаму матэрыялу.

У каменным і бронзавым веку на Беларусі пераважалі *стаянкі* – часовыя пасяленні людзей. У жалезным веку з’яўляюцца даугачасовыя пасяленні ўмацаванага (гарадзішча) і неўмацаванага (селішча) тыпаў. Практычна ўся наменклатура традыцыйных паселішчаў на тэрыторыі Беларусі сфарміравалася ў эпоху Сярэднявечча. Коратка ахарактаразуем асноўныя тыпы.

*Вёска* (ст.-слав. “*въсь*”) – асноўны тып сельскага паселішча на Беларусі, які ўзнік у раннім Сярэднявеччы пры рассяленні земляробчага насельніцтва, у выніку аддзялення асобных дворышчаў пры сямейных раздзелах або з двароў служылага люду. Асноўная структурная адзінка вёскі – сядзіба. Паводле планіроўкі вылучаюць некалькі форм вёскі: *скучаныя* (бессістэмная), *лінейная* (радковая), *вулічная* і інш.

*Сяло* – старажытны тып сельскага паселішча на Беларусі, якое пачаткова з’яўлялася загараднай княжацкай рэзідэнцыяй (дзе побач з гаспадарскім дварам знаходзіліся хаты чэлядзі), цэнтрам вотчыны ці маёнтка феадала. Сяло адрознівалася ад вёскі большымі памерамі, адміністрацыйным і гандлёва-эканамічным значэннем. У XIX ст. сяло – гэта цэнтр воласці, з царквою, школай, валасною ўправаю, з запасным магазінам, карчмой. Пры гэтым, наяўнасць царквы (касцёлу) магла быць неабавязковай: у Віцебскай губерні ў сярэдзіне XIX ст. налічвалася звыш 1300 сёл, а цэркваў у сельскай мясцовасці было толькі 190.

*Дзярэўня* – старажытны тэрмін для пазначэння сельскага паселішча ў лясной зоне (ад слова “драць” – выкарчоўваць дзялянкі ў лесе). У XIX ст. пад дзярэўняй разумелі сельскія паселішчы, якія не адносіліся да катэгорыі хутароў, сёл, мястэчак. У гэтым значэнні слова “дзярэўня” і зараз выкарыстоўваецца ў паўночна-заходніх гаворках беларускай мовы.

*Пагост* (ад ст.-слав. “*погостити*” – пабываць у гасцях), у X – XI стст. – пастаялы двор, дзе часова спыняўся князь (у тым ліку для збору палюддзя), духоўныя асобы ці купцы (госці), цэнтр сельскай абшчыны з царквою і могілкамі. На Беларусі (Пінскае княства) існавалі да пачатку XVI ст., потым ператварыліся ў вёскі, сёлы ці мястэчкі.

*Слабада* (воля, вулька) – сельскае паселішча, тыпалагічна набліжанае да вёскі, жыхары якога на пэўны час (ад 2 да 12 гадоў) вызваляліся ад феадальных павіннасцяў. Падобныя меры прадпрымаліся землеўладальнікамі а) пры засваенні няўдобіц і лясных масіваў; б) пры аднаўленні сельскай гаспадаркі ў паваенны час. У адрозненне ад рускіх рамесных слабод, вясковыя слабоды на Беларусі былі выключна земляробчымі. Разам з тым, у XVI – XVII стст. тэрмінам “слабада” пазначалі гандлёва-рамесніцкі пасад феадальнага гораду.

*Фальварк* (ад ням. “*Vorwerk*” – хутар) – невялікія (1 – 5 двароў) шляхецкія маёнткі, якія масава з’явіліся пасля валочнай рэформы (1557) і займаліся вытворчасцю хлеба на продаж. Галоўным элементам фальварка быў сядзібны дом, да ганку якога вяла алея, што пераходзіла ў курданёр (парадны двор перад будынкам). Паабапал алеі знаходзіліся свірны, ляднік, сырніцы, за домам – сад. Калі мелася рэчка ці ручай, то там размяшчаліся складоўня, бровар, млын. У XIX ст. назва “фальварк” замацавалася за ўсімі дробнымі шляхецкімі маёнткамі.

*Засценак* – тып сельскага паселішча, які ўзнік у выніку аграрнай рэформы XVI ст. Паводле “Уставы на валокі” (1557) уводзіўся трохпольны севазварот, калі ўся сялянская зямля дзялілася на 3 полі з дакладна вызна-

чанымі межамі (“сценкамі”). Пасля межавання заставаліся абрэзкі ворнай і сенакоснай зямлі – засценкі. Яны звычайна знаходзіліся на краі поля і аддаваліся ў арэнду дробнай шляхце (адсюль – засцянковая шляхта). Тыпалагічна засценкі практычна не адрозніваюцца ад хутароў.

*Хутар* – адасобленая сялянская гаспадарка, у якой хата і ўсе гаспадарчыя пабудовы знаходзіліся побач з ворнай зямлёй. Хутар, як тып сельскіх пасяленняў, вядомы на Беларусі з канца XIX ст., што было звязана з развіццём капіталістычных адносін на вёсцы. У выніку Сталыпінскай рэформы, хутар на пачатку XX ст. становіцца адной з асноўных форм сельскіх паселішчаў у Віцебскай (26,2 % усіх сялянскіх двароў) і Магілёўскай (14,5 %) губернях. Калектывізацыя 1930-х гадоў практычна знішчыла хутар, як адметны элемент беларускай культурнай прасторы.

*Мястэчка* – прамежкавая форма паселішча паміж горадам і вялікім сялом. Яго ўзнікненне было абумоўлена распаўсюджаннем грашовай рэнты і стварэннем вотчынных таргоў у XV – XVI стст. Паселішчы, што ўзніклі пры таргах, з цягам часу пераўтвараліся ў міжгарадскія гандлёва-рамесніцкія цэнтры, што адыгрывалі значную ролю ў тавараздвароце ўнутранага рынку цэлага краю. Да прыняцця Статута ВКЛ 1588, заснаванне мястэчак было пераважным прывілеем вялікакняжацкай улады. У канцы XVI – XVII стст. масава з’яўляюцца і прыватнаўласніцкія мястэчкі. Усяго на Беларусі ў XVI – XVIII стст. налічвалася больш за 300 мястэчак. Паводле сваёй планіроўкі, якая фармавалася ў пэўную гістарычную эпоху, мястэчкі падзяляюцца на *гатычныя* (плошча з вуліцамі, якія прымыкаюць да яе па датычнай), *рэнесансныя* (радыяльны план), *барочныя* (пераважна прыватнаўласніцкія побач з замкамі ці маёнткамі), *ампірныя*. Апошні тып узнік у выніку горадабудаўнічых пераўтварэнняў першай паловы XIX ст., накіраваных на ліквідацыю рэштак сярэднявечных земляных умацаванняў, вузкіх крывых вуліц і пераходу да рэгулярнай, квартальнай забудовы.

Істотна адрозніваюцца паміж сабой мястэчкі ўсходніх і заходніх рэгіёнаў Беларусі. Першым уласцівы адсутнасць плошчы (яе замяняла пашырэнне вуліцы), машчэнне вуліц, ходнікаў (тратуараў). Якіх-небудзь устойлівых трдыцый у размяшчэнні грамадскіх і культавых пабудоў тут не склалася, забудова амаль цалкам драўляная. У мястэчках заходніх рэгіёнаў вылучалася плошча, вакол якой стаялі царква і (ці) касцёл, гандлёвыя рады, карчма, найбольш дыхтоўныя дамы рамеснікаў і гандляроў. Плошча і вуліцы былі брукаваныя, ходнікі рабіліся з дошак.

Як афіцыйная форма паселішча, мястэчкі праіснавалі да 1938 г. (у Заходняй Беларусі – да 1939 г.), калі згодна ўрадавай пастановы яны былі пераведзены ў катэгорыю гарадоў, гарадскіх пасёлкаў ці ў разрад вёсак.

*Горад* – вялікі населены пункт, які з’яўляецца прамысловым, гандлёвым, культурным, рэлігійным і адміністрацыйна-палітычным цэнтрам прылеглага раёна, вобласці, краіны. Для яго характэрны тэрытарыяльная канцэнтрацыя вытворчасці, большая люднасць і тэрыторыя, больш разнастайны, чым у вёсцы, сацыяльны склад насельніцтва. Звычайна гараджане заняты ў прамысловасці, гандлі, сферах абслугоўвання, кіравання, навукі і культуры. Гэта спараджае сукупнасць бытавых рыс, якія складаюць гарадскі лад жыцця.

Першыя беларускія гарады, як і ў іншых усходніх славян, узніклі ў IX – X стст. Старажытныя летапісы IX – XIII стст. узгадваюць на тэрыторыі Беларусі 38 гарадоў. Да XVII ст. іх налічвалася ўжо 68. Аднак у выніку неспрыяльных сацыя-культурных і палітычных фактараў доля беларусаў сярод гарадскога насельніцтва ў XVII – XIX стст. пастаянна змяншалася. Па дадзеных перапісу 1897 г. беларусаў у гарадах пражывала толькі 2,5 %, у той час, як 53,2 % складалі габрэі, 37,5 % – рускія.

На канец XX ст. (перапіс 1999 г.) гараджане склалі 69 % (6,961 млн) насельніцтва Беларусі; пераважная іх большасць з’яўляецца беларусамі.

### 4.3.1. Сялянская сядзіба: структура, тэхналогія, сімволіка

*Сядзіба (аселішча) – комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў разам з дваром, агародам і садам, якія складаюць індывідуальную гаспадарку селяніна.* Тэрмін “сядзіба” вядомы на Беларусі з XV ст., аднак асабліва ён пашыраецца пасля правядзення аграрнай рэформы 1557 г., калі новыя пасяленні закладваліся на сядзібным (сярэднім) полі.

Традыцыйная беларуская сядзіба мела пэўную функцыянальную будову і складалася з чыстага двара (яго ўтваралі хата і суседнія з ёю збудаванні: клець, паветка, варыўныя і г.д.), гаспадарчага двара (хлявы), гумнішча ці прыгумнення (комплексу збудаванняў для захавання, прасушкі і абмалоту збожжавых). Гістарычна акрэсліліся два асноўныя тыпы сялянскага двара:

– *замкнёны* (вяночны, круглы), калі комплекс жылых і гаспадарчых будынкаў утвараў квадрат або выцягнуты чатырохкутнік, усе пабудовы ў якім звязаны паміж сабою. Гэты тып найбольш пераважаў у Паўночнай Беларусі;

– *пагонны* (лінейны), калі жыллё і гаспадарчыя збудаванні ўтваралі адзін (часам два) шэраг – “пагон” даўжынёю ў некалькі дзесяткаў метраў. У большасці выпадкаў усе гаспадарчыя пабудовы шчыльна прымыкалі да хаты і былі накрыты суцэльнай страхой.

Першы тып сядзібы з’яўляецца найбольш старажытным. Ён склаўся ва ўмовах бессістэмных, гнездавых паселішчаў, калі пераважнае значэнне надавалася абароне. Другі тып узнік яшчэ ў перыяд рассялення ў Палескай нізіне дрыгавічоў. Стымулявала яго распаўсюджанне “Устава на валокі”: вузкія надзелы-шнуры патрабавалі падоўжанай забудовы. Да таго ж у балоцістай мясцовасці найбольш зручным месцам для будоўлі з’яўлялася вузкая і працяглая выспа.

З цягам часу ўзніклі пераходныя тыпы двароў – П- і Г-падобныя. Традыцыйная беларуская сядзіба з’яўлялася даволі складаным жыллёва-гаспадарчым комплексам, асноўнымі структурнымі элементамі якога былі:

– *хата;*

– *хлеў* (абора, стайня) – гаспадарчая пабудова для ўтрымання свойскай жывёлы;

– *гумно* (клуня, ток, рыга) – пабудова для працяглага захоўвання і апрацоўкі неабмалочанай збажыны;

– *еўня* (асець) – збудаванне ў гумне з печкай-каменкай для прасушвання снапоў;

– *варыўня* (істопка) – гаспадарчая пабудова зрубнай канструкцыі для захоўвання гародніны, садавіны, малака і іншых харчовых прыпасаў. У вялікія маразы абагравалася печкай-каменкай ці жарам;

– *лазьня* (зрубнае збудаванне з печкай-каменкай. Складаецца з тамбура (прылазніка) і памяшкання для мыцця (мыльні);

– *пуня* (адрына) – пабудова гуменнага тыпу для захоўвання сена;

– *паветка* – гаспадарчая пабудова на сялянскім двары для захоўвання сельскагаспадарчых прылад (калёс, саней і інш.), а таксама дроваў;

– *студня* (калодзеж) – заглыбленне ў зямлі для здабычы вады з ваданосных гарызонтаў. Умацоўвалася ствалом дрэва з выдабленай сэрцавінай, камянямі, зрубам.

Цэнтральнай (асноўнай) пабудовай вясковай сядзібы з’яўлялася *хата* – традыцыйны тып жылля сельскіх жыхароў. Як тып жылля, хата прайшла доўгі шлях гістарычнай эвалюцыі, развіваючыся ад будкі і зямлянкі да наземнай пабудовы зрубнай канструкцыі. Спачатку хату будавалі без сянец, з печчу без коміна (курная хата) і вузкімі акенцамі, што зачыняліся спецыяльнымі засаўкамі. У XIX ст. курная хата была выцеснена так званай белай (мела печ з комінам), а яе аднакамерная планіроўка – двухкамернай (хата + сенцы) і трохкамернай (хата + сенцы + хата ці хата + сенцы + камора).

Будоўля хаты пачыналася з закладкі падмурка. На пясчаных, сухіх месцах у якасці яго служыў першы вянец, зроблены з больш тоўстых, часам дубовых бярвён – *падруб*. Аднак, ад нераўнамернага прамярзання верхнія слаі глебы прыходзілі ў рух, што, з цягам часу, утварала ў пабудове перакосы. Каб пазбегнуць гэтага, пад вуглы будынка з некаторым інтэрвалам укопвалі дубовыя калодкі – *штандары* і ўжо на іх клалі першы вянец. На балоцістых мясцінах штандары ставілі па ўсім перыметры пабудовы.

Згодна прыродна-экалагічных умоў Беларусі аптымальнай будаўнічай сыравінай тут з'яўлялася драўніна. Найчасцей выкарыстоўвалася хвоя, радзей – яліна.

Гістарычны вопыт будаўніцтва вызначыў аптымальны памер зруба – прыкладна 6х6 метраў. Сцены складаліся з 11 – 15 вянцоў з бярвён дыяметрам 15 – 25 сантыметраў. У Падзвінні, Падняпроўі, усходняй частцы Цэнтральнай Беларусі хаты ўзводзілі пераважна з круглага лесу, у Панямонні бярвёны абчэсвалі, а на Палессі іх распілоўвалі напалам і з атрыманых палавінак (*дылей*) рабілі зруб.

Рэгіянальныя асаблівасці мела і канструкцыя падлогі. На ўсім Поўдні Беларусі была распаўсюджана глінабітная (*токавая*) падлога. Для яе ўладкавання здымалася глеба і ў заглыбленне засыпалася гліна, змешаная з сечкай. Атрыманую мешаніну рабілі больш цвёрдай з дапамогай драўлянай калатушкі і зацíралі падлогу гліняным растворам. На поўнач ад Палесся падлогу ў дамах слалі пераважна з дошак.

Што датычацца стрэх, то на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў жалезным веку вызначыліся два асноўныя тыпы – *двухсхільныя і чатырохсхільныя* (шатровыя). Першыя адпавядалі шматкамерным пабудовам гарадзішчаў, другія – аднакамерным паўзямлянкам селішчаў. Традыцыйны матэрыял пакрыцця стрэх – салома і чарот – ужываўся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, але ў Паазер'і, Панямонні, Падняпроўі шырока выкарыстоўвалі і *дранку* (тонкія дошчачкі, якія дралі з калод).

Арганізацыя ўнутранай прасторы хаты залежала ад яе арыентацыі адносна напрамкаў свету і размяшчэння печы. Традыцыйнае беларускае жытло заўсёды арыентавалася на поўдзень, а печ размешчалася вусцем да парога. Унутраную прастору хаты можна ахарактаразаваць як *дыяганальную*: па дыяганалі ад печкі – *чырвоны кут* (адно з найбольш сакралізаваных месц у хаце: тут размяшчаліся абразы, стаяў стол, адбываліся рытуальныя трапезы на Радзіны, Вяселле, Каляды, Вялікдзень і іншыя святы), па другой – *бабін (кухонны) кут* (месца правядзення знахарскіх і чарадзейскіх аперацый) і месца адпачынку (палаці). Такая арганізацыя ўнутранай пра-

сторы абумовіла і асіметрычнае размяшчэнне аконных праёмаў: акно насупраць печкі ў бабіным куце, акно каля чырвонага кута і два акны ў сумежных з ім сценах.

Печ займала каля чвэрці карыснай плошчы жытла. Найбольш старажытным тыпам з'яўляюцца курныя печкі-каменкі, якія і зараз можна ўбачыць у старых лазнях Падзвіння. Пасля сталі рабіць глінабітныя (курныя, пазней – з комінам), а з канца XIX ст. цагляныя печы. У Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі для аптымальнага ацяплення жытла будавалі дадатковыя печкі: грубкі, сценкі, стаякі, шчыткі.

Прадметнае асяроддзе традыцыйнага жылля беларусаў пачыналася з так званай калясценнай мэблі: лавы, полкі і паліцы, вуглавая шафа, палаці, стол, услончык для вядра з вадою і інш. У цёмны час сутак хата асвятлялася з дапамогай *лучніка* (пасвета, светача, дзеда), які ў сваёй канструкцыі меў рэгіянальныя асаблівасці. На Палессі са столі звісала халява лучніка – сплеценая з лазы труба, абмазаная глінай, да якой унізе прымацоўвалася металічная рашотка, дзе спальвалі лучыну. На падлозе, пад лучнікам ставілі посуд з вадой для падаючага вугалля. У Панямонні лучыну палілі на каменнай плошцы ці ў камінку, спецыяльнай нішы на куце печы. У Падзвінні і Падняпроўі лучыну заціскалі ў спецыяльны клямар (заціск), які забівалі ў сцяну ці трымалі на стойцы (пасвет), замацаванай у крыжавіне ці калодцы.

Характарызуючы сялянскую сядзібу, хату і яе інтэр'ер, неабходна мець на ўвазе, што для прадстаўнікоў традыцыйнай культуры працэс будаўніцтва жылля, як і яно само, мелі надзвычай ёмістае міфа-рытуальнае значэнне. Хата (сядзіба) у міфапаэтычнай свядомасці выступала мікракосмасам, дзе падмурак, жылое памяшканне, гарышча / дах адпавядалі тром вертыкальным ярусам светабудовы (ніжні – падземны, хтанічны, сярэдні – чалавечы, культурны, верхні – сакральны, боскі), а сцены выразна маркіравалі чатырохчасткавую гарызантальную структуру свету (поўнач – поўдзень, захад – усход). У гэтым сэнсе невыпадкова, што менавіта хата выступае ў значнай колькасці беларускіх традыцыйных абрадаў (Каляды, Вялікдзень, Дзяды, Радзіны, Вяселле, Хаўтуры і інш.) адзінамагчымай прасторай, дзе можа разгортвацца рытуал. Хата (сядзіба) ў сімвалічным плане ўвасабляла "свой", чалавечы свет і супрацьпастаўлялася навакольнай прасторы, як "чужой", варожай, патэнцыйна небяспечнай. Рытуальна-сімвалічнае значэнне мелі практычна ўсе элементы, як сядзібы, так і хаты. Асноўныя структурныя часткі сядзібы (хата, хлеў, гумно, еўня, лазня), паводле народных уяўленняў, мелі сваіх міфічных духаў (хатнік, хляўнік, гуменнік, еўнік, лазнік), ад гарманічных узаемаадносінаў з якімі залежаў дабрабыт і жыццялад цэлага роду (сям'і).

Плот, парог, дзверы, сцены, вокны, дах у традыцыйным светаўспрыняцці выступалі як сімвалічная мяжа паміж “гэтым” і “тым” светам, што вельмі актыўна выкарыстоўвалася ў знахарстве, чарадзействе і варажбе. Так, напрыклад, памясціўшы на парозе хаты хворага чалавека, знахары адраблялі яго хваробу, адсылаючы яе за парог, у “іншасвет”. Падобныя аперацыі маглі адбывацца і каля акна, плота, у лазні. У гэтых жа месцах, як правіла, варажылі на Каляды.

Усе элементы хатняга інтэр’еру, акрамя свайго непасрэднага гаспадарчага прызначэння, таксама мелі сімвалічнае прачытанне. Да прыкладу, стол у міфалагічна-рытуальным сэнсе разумеўся як “далонь Бога” (параўнай стол і століь, як верхні ярус хаты, суаднесены з небам) і ўвасабляў хату (чатырохкутны ў плане). Адсюль, паводзіны за сталом жорстка рэгламентаваліся (нельга ўтыкаць нож, класці шапку, сядзець на ім), на ім пастаянна мусіў ляжаць бохан хлеба (на добрую долю), а падчас Радзінаў вакол яго тройчы абносілі немаўля, “каб любіла свой род, сваю хату”.

Такім чынам, падсумоўваючы, можна зрабіць выснову, што, калі для сучаснага чалавека дом (кватэра) з’яўляюцца свайго роду мёртвым “прыстасаваннем” для пражывання з той ці іншай ступенню бытавой камфортнасці, то для чалавека традыцыйнай культуры хата з’яўлялася не толькі штодзённым жыллём, але і самім эталонам адухоўленага касмічнага быцця.

## 4.4. Беларуская традыцыйная кухня

Тэрмін “кухня” ў беларускай мове азначае не толькі памяшканне для прыгатавання ежы, але і выступае адпаведнікам слова “кулінарыя”. Такім чынам, пад вызначэннем *традыцыйная беларуская кухня* будзем разумець *майстэрства прыгатавання ежы і сукупнасць найбольш пашыраных і тыповых страў, што бытавалі (бытуюць) на беларускай этнічнай тэрыторыі на працягу доўгага часу і з’яўляюцца неад’емным элементам беларускай этнічнай культуры.*

Характар беларускай традыцыйнай кухні вызначаўся спецыфікай гаспадарчай дзейнасці насельніцтва (земляробства і жывёлагадоўля), а таксама багатымі прыроднымі рэсурсамі тэрыторыі пражывання (разнастайная флора і паляўнічая фаўна, вялікая колькасць рыбных рэк і азёр). Акрамя таго, свой адбітак на фармаванне беларускай традыцыйнай кухні наладжылі, як этнагенетычная роднасць з украінцамі і рускімі, так і цесныя этнакультурныя кантакты з балцкімі і іншымі еўрапейскімі народамі.

Са старжытных часоў найбольшае распаўсюджанне ў беларусаў мелі *прадукты расліннага паходжання* і ў першую чаргу збожжавыя.

*Прадукты з зерневых*. Жыта, пшаніца, проса і іншыя культуры вядомы на тэрыторыі Беларусі з часоў жалезнага веку. Асноўным прадуктам з зерневых, у прыватнасці з жыта і пшаніцы, з'яўлялася мука. У сваю чаргу, самым распаўсюджаным ва ўсе часы прадуктам на Беларусі з'яўляўся *хлеб*, выпечаны з жытняй мукі. У залежнасці ад дастатку сям'і, добрага ці не ўраджаю, святочных дзён ці будзёнай пары выпякалі разнастайныя гатункі хлеба.

*Пытляваны* – хлеб вышэйшага гатунку з мягкай, прасеянай (пытляванай), як правіла, пшанічнай мукі, які быў адноснай рэдкасцю нават у багатых сем'ях і выпякаўся да вялікіх урачыстасцяў, напрыклад, да Вялікадня.

*Сітны* – жытні хлеб вышэйшага гатунку, выпечаны з мукі прасеянай праз рэшата, а затым і дробнае сіта; зазвычай быў адзнакай багатых гаспадароў.

*Шатраваны* – найбольш стандартны, якасны жытні хлеб з ачышчанага і пераверянага зерня. Пры дастатку збожжа, найбольш распаўсюджаны хлеб у беларускіх сялян.

*Градовы* – жытні хлеб горшай якасці з дрэнна правеянага зерня.

*Пушны* – жытні хлеб дрэннай якасці з зусім невеянага зерня, пры выпечцы якога ў муку дадавалі да паловы мякінных рэшткаў.

*Бульбяны* – жытні хлеб, у цеста якога ў якасці дамешкаў дадавалі сырую драную ці вараную тоўчаную бульбу. Вылучаўся высокімі смакавымі якасцямі, яго пяклі нават у багатых сем'ях. Распаўсюджанне атрымаў у другой палове XIX ст.

Нярэдка выпякалі хлеб, выкарыстоўваючы ў якасці дамешкаў аўсяную, ячменную, грэчневую муку. У цяжкія , неўрадлівыя гады маглі дадаваць лебяду, крапіву, змолатыя жалуды і інш. Аднак, якога б гатунку не быў хлеб, у беларускай традыцыйнай культуры ён з'яўляўся самым сакралізаваным відам ежы, сімвалам дабрабыту, шчасця, дастатку. Як "Дар Божы", хлеб выступаў увасабленнем чалавечай долі, карыстаўся асаблівай пашанай і выклікаў амаль рэлігійнае стаўленне. Падымаючы ўпушчаны хлеб, яго цалавалі са словамі "Даруй, Божухна!". Пакінутыя крошкі або кавалкі хлеба, кінутыя падчас абеду сабаку, маглі прыводзіць да няўроду ці галаду. Як самы каштоўны дар, хлеб прыносілі ў ахвяру Богу, продкам, Лесуну, Вадзяніку. У якасці дарунка хлеб насілі да святых камянёў і крыніц.

Да іншых мучных вырабаў належаць *бліны, локшына* (макароны), разнастайнае печыва. Але гэтыя стравы не былі штодзённымі і з'яўляліся на стале пераважна ў святочныя дні. Так, бліны былі абавязковым атрыбу-

там Масленіцы, а пячэнне ў выглядзе жаваронкаў выпякалі на Саракі. З выкарыстаннем мукі гатавалі і вадкія стравы: *зацірку, калатуху, кісель, жур, кулагу, раўгеню* (саладуху).

З крупяных страў найбольш старажытнай і распаўсюджанай з'яўлялася каша (ячная, грэчневая, пшонная). Ячная каша, звараная з цэльных, ачышчаных ад шалупіння зярнят (*куцця*, "*бабіна каша*") з'яўлялася галоўнай рытуальнай стравай на Каляды і Радзіны, дзе яна сімвалізавала калектыўную долю і жыццёвы дастатак. У штодзённым жыцці з ячных круп варылі розныя *крупнікі*: з малаком, бульбаю, мясам, грыбамі, з бобам і г.д.

Адным з галоўных прадуктаў харчавання была *гародніна*. Сырымі елі рэпу, рэдзьку, гуркі, моркву, цыбулю, часнок. Гарох і боб парылі і пражылі, капусту, буракі, бручку, гуркі квасілі і салілі, рэпу, бручку, моркву парылі і пяклі. Рэдкія, звычайна, кіслыя стравы (на першае) варылі з капусты, буракоў і бацвіння, салёных гуркоў і шчаўя.

З канца XVIII ст. значнае месца ў беларускай традыцыйнай кухні пачынаюць займаць *стравы з бульбы*, якая ўжо ў XIX ст. становіцца ў беларускіх сялян "другім хлебам". Бульбу варылі цэлую і рэзаную, чышчаную і ў лупінах, пяклі, тушылі, смажылі. З дранай бульбы пяклі і пякуць *дранікі* і *бабку*, з тоўчанай робяць *камы* ("*камы з душамі*" – бульбяныя камы з мясной начынкай з'яўляліся адной з галоўных страў на Дзяды, бо калі іх разразалі ўздымалася пара, якой, паводле народных уяўленняў, і харчуюцца душы продкаў). Бульба ішла на прыгатаванне клёцак, *калдуноў*, у дадатак да мучных і гароднінных страў. Налічваюць больш за 200 страў з бульбы, якая і зараз застаецца адным з улюблёных харчовых прадуктаў беларусаў (невыпадкова, што псеўдаэтнонім "бульбашы", які беларусы атрымалі ад сваіх суседзяў, адлюстроўвае менавіта гэты прыярытэт народнай кухні).

Значнае месца ў харчаванні займалі дзікарослыя расліны (шчаўе, цыбуля лугавая, часнок палявы, баршчавік, крапіва, лебяда), грыбы, ягады.

*Малочныя прадукты*. Акрамя малака, якое спажывалі халодным, гатаваным, але пераважна кіслым, а таксама ўжывалі для гатавання рэдкіх страў і розных кашаў, шырокае распаўсюджанне мелі такія прадукты, як смятана, сметанкавае масла, тварог, сыр. Зняўшы смятану, кіслае малако ставілі ў печ (у лёгкі дух), каб яно адтапілася. Потым яго злівалі ў спецыяльны мяшочак (ражок). Пасля таго як сыроватка сцячэ, тварог клалі паміж дашчэчак і прыціскалі камянём. Атрыманы клінковы сыр гаспадыні засушвалі і захоўвалі на зіму (звычайна да Масленіцы). З усіх малочных прадуктаў менавіта сыр з'яўляўся найбольш сакралізаваным. Прынамсі, ён з'яўляўся абавязковым пачастункам на дзень святога Юр'я (23.04 па стараму

стылю), дзе разам з іншымі прадуктамі сімвалізаваў дары вясны, урадлівасць, будучы ўраджай.

*Мясныя стравы* з'яўляліся неад'емным элементам беларускай традыцыйнай кухні. Спажывалі свініну, бараніну, мяса свойскіх птушак, значна радзей – ялавічыну, цяляціну і дзічыну (апошняе было прывілеем паляўнічых). Пераважную долю ў мясным рацыёне беларусаў займала свініна. Яшчэ ў старажытнасці ў германцаў, кельтаў і славян свіння лічылася ахвярнай жывёлай, прызначанай вышэйшым багам. Таму невыпадкова, што ў беларусаў стравы з свініны лічыліся абавязковымі на буйнейшыя гадавыя святы – Каляды і Вялікдзень. Багацейшыя рэзалі падсвінка і напярэдадні восеньскіх Дзядоў. Пры гэтым жывёла, якая мусіла быць ахвяраванай на памінанне продкаў, вызначалася загаддзя са словамі: “Гэта няхай Бог пасецьна Дзяды”. Калі ж гаспадар не выконваў зароку, лічылася, што свіння ўсё адно загіне ці то ад ваўка, ці то ад хваробы. Асартымент мясных страў быў даволі стандартны. Найбольш распаўсюджанымі былі *каўбасы* з сырога мяккага свінога мяса, якім разам з прыправамі (акрамя цыбулі) начынялі тонкія кішкі парсюка. Тоўстыя кішкі выкарыстоўвалі для вырабу *крывянкі* (добра размешаную, прыгатаваную кроў са спецыямі змешвалі з крыху адваранымі крупамі і пражаным салам, залівалі ў кішкі і запякалі ў печы). Шырока вядома была і *вантрабянка* (сальцісон), якую гатавалі з свінных вантрабоў) лёгкія, пячонка, сэрца, ныркі, спецыі, соль). З ног і галавы рабілі *сцюдзень* (квашаніна, халадзец). Сала, здор (нутранае сала) салілі са спецыямі і складалі ў спецыяльную дзежку. Тлушч з авечак, бараноў спажывалі толькі living ператопленым (лой), з гусей, качак, курэй вытаплівалі смалец.

Каб захаваць мяса да вясны і лета (сезон найбольш цяжкіх палявых работ), яго (кумпяк, паляндвіца) салілі, вэндзілі, сівярылі (вывешвалі кумпяк на паддашак хаты, каб яго натуральным чынам высушыў моцны вецер, які дзьме ў сакавіку пры сонечным надвор'і – “сівер”).

Спажывалася і мяса свойскай птушкі, але курэй спецыяльна амаль ніколі не рэзалі, бо яны давалі яйкі – прадукт важны не толькі ў кулінарным, але і ў рытуальным плане. Яйка, што ва ўсіх індаеўрапейскіх народаў сімвалізавала сусвет, нараджэнне, жыццё, фігуруе (печанае, смажанае, варанае) практычна ва ўсіх значных урачыстасцях і рытуалах беларусаў XIX – XX стст.

Значнае месца у народнай кухні, асабліва на Падзвінні і Палессі займалі *рыбныя стравы*. Буйную рыбу фаршыравалі, смажылі, з драбнейшай гатавалі *юшку*, тушылі. Шмат рыбы вялілі і сушылі, як для сваіх патрэб, так і на продаж.

Коратка закранем і шляхецкую кухню. Доўгі час яна ігнаравалася даследчыкамі, як адзін з аспектаў культуры эксплуататарскага класа, які быў арыентаваны, нібыта, толькі на замежныя прысмакі. Аднак, на самой справе, шляхецкая кухня не ў меншай ступені, чым сялянская з'яўлялася традыцыйнай і выкарыстоўвала мясцовыя прадукты. Іншая справа, што ежа шляхціча была значна больш насычанай, разнастайнай і багацейшай, чым ў вяскоўца. Але і ў тым і ў другім выпадку, размова ідзе пра адметную кулінарную спадчыну беларусаў, набыткі якой неабходна выкарыстоўваць і ў наш час, калі слова “хот-дог” для беларускай моладзі становіцца больш пазнавальным, чым “паляндвіца". Прывядзём некаторыя прыклады канца XVIII – пачатку XIX ст.

Полаччына. На вячэру ўдзельнікам сейміка былі пададзены “кручаныя зразы, розная квашаніна, некалькі вазаў з расолам… Была смажаная ласіна і сарніна, галовы і кумпякі дзікоў, мядзвежыя лапы..., былі ўзведзены горы з зайцаў і featured рознага птаства, на асобных рантавых місах стаялі блінцы да зразаў і расолу”.

Брэстчына. На абед сярэднезаможнаму шляхцічу падаюць “бялёны боршч з галёнкай, кавалак мяса з хрэнам, парасяціну на шэра і смажанага зайца..., грэцкую кашу са швядамі (скваркамі)”. На святы варылі “крупнік з паўгускамі, капусту з мясам і яблыкамі”; на куццю падаваліся “боршч з вушкамі (пельменямі), шчупак з шафранам, праснакі з макам, акуні з алеем і дробна парэзаным яйкам” (Мальдзіс А. І ажываюць спадчыны старонкі. – Мн., 1994. – С. 372).

Лакальныя асаблівасці этнічнай гісторыі, гаспадарчых заняткаў, разнастайных аспектаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія выразна фіксуюцца на беларускай этнічнай тэрыторыі ў XIX – пачатку XX стст. (часткова і зараз), дазваляюць вылучыць 6 асноўных *гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў* Беларусі:

– Падзвінне;
– Падняпроўе;
– Цэнтральная Беларусь;
– Панёманне;
– Усходняе Палессе;
– Заходняе Палессе.

Рэгіёны лакалізуюцца ў масівах з блізкімі гістарычнымі і экалагічнымі ўмовамі, пераважна ў басейнах вялікіх рачных сістэм (рэкі служылі сродкамі зносін і вызначалі напрамкі культурна-эканамічных сувязяў, а таксама стваралі спрыяльныя ўмовы для жыхарства і гаспадарчай дзейна-

сці). Мясцовая прырода з яе разнастайнымі рэсурсамі і адпаведнымі ўмовамі была жыццёвым асяроддзем, арганічна ўваходзіла ў паўсядзённы побыт і ў межах пэўнай сацыяльнай сістэмы ўплывала на спецыялізацыю гаспадарчых заняткаў, жыллё, адзенне, харчаванне, сродкі зносін і інш. (дадатак 5).

## 4.5. Традыцыйныя формы сацыяльнай арганізацыі беларусаў

### Грамадскі побыт

Яшчэ з часоў феадалізму грамадскі побыт і наогул усё жыццё селяніна падпарадкоўваліся канкрэтным грамадскім адносінам, якія вызначаліся юрыдычна-прававымі нормамі – дзяржаўнымі і звычаёва-традыцыйнымі. Грамадскі побыт у межах сялянскай грамады быў цесна звязаны і з гаспадарскімі адносінамі паміж асобнымі гаспадарамі, а таксама паміж імі і вялікакняскай адміністрацыяй ці феадалам-землеўласнікам.

Вышэйшую ўладу грамады ў межах воласці ажыццяўляў абраны “старэйшымі мужамі” на агульным валасным сходзе *старац*. Выбары адбываліся штогод на прадвесні. Старац складаў прысягу пачэсна служыць грамадзе і абараняць яе інтарэсы паўсюдна і заўсёды. Старцы зацвярджаліся самім Вялікім князем і прызнаваліся афіцыйнымі коламі ўсіх узроўняў паўнамоцнымі прадстаўнікамі воласці. Акрамя старцаў у склад кіраўніцтва выбіралі з ліку “добрых мужоў” найбольш прыстойных і паважаных сялян – *дзесяцкіх*, *сарочнікаў*, *соцкіх*.

Грамада, звязаная кругавой парукай, несла адказнасць за своечасовую выплату падаткаў і спраўнае выкананне павіннасцяў па ўтрыманню ў парадку дарог, перавозаў, мастоў; прыймала на пастой войска, дзяржаўных чыноўнікаў.

Акрамя таго, грамада мусіла падтрымліваць на сваёй тэрыторыі правапарадак, унутрыграмадскую дысцыпліну, сачыла за выкананнем звычаёва-прававых нормаў жыцця. Яна несла адказнасць за арганізацыю супрацьпажарных мерапрыемстваў, своечасовае тушэнне пажараў, прынядцце адпаведных захадаў у час паводак. Разам з тым грамада валодала і тымі грамадскімі функцыямі, што баранілі інтарэсы селяніна перад дзяржавай, феадалам, суседнімі грамадамі.

Адпавядала інтарэсам грамадоўцаў і кааператыўна-дабрачынная дзейнасць: узаемадапамога, падтрымка ў неўрадлівы год, матэрыяльная дапамога бедным, удовам, сіротам, хворым і адзінокім старым, арганізацыя магазінаў – грамадскіх хлебных камор са страхавым запасам зерня.

Выразнай формай сялянскай узаемадапамогі з’яўлялася *талака* – даўні народны звычай калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах. Звычайна на адзін дзень сям’я запрашала сваякоў, суседзяў, аднавяскоўцаў для тэрміновай ці працаёмкай работы: будаўніцтва хаты, жніво, касьба сена, вываз гною на поле і інш. Плата за такую дапамогу не прадугледжвалася; гаспадар толькі ладзіў калектыўны пачастунак (застолле) па завяршэнні меркаванай работы.

Супольная гаспадарчая дзейнасць сялян найбольш праяўлялася ў *сябрыне* – народным звычаі сумеснага карыстання сенажаццю, пашай, пчоламі. Саўладальнікаў маёмасці называлі сябрамі: адносіны паміж імі вызначаліся шчырасцю і ўзаемадапамогай.

З даўніх часоў, калі існавала калектыўная гаспадарка і грамадская ўласнасць, паходзіць такі звычай, як *бонда* – частаванне блізкіх і аднавяскоўцаў свежынай, а таксама хлебам, садавінай, агароднінай новага ўраджаю.

Важным элементам побыту вёскі з’яўлялася грамадская думка, якая была падставай і вынікам галоснасці ўсяго вясковага ладу жыцця. Думка пра асобнага чалавека складвалася ў вяскоўцаў з маленства, з першых сумесных гульняў, баўлення часу, выканання працы. Рэпутацыя, як правіла, складвалася ў юнацтве, калі маладыя людзі праходзілі своеасаблівыя ініцыяцыйныя іспыты, напрыклад, у форме маладзёжных ігрышчаў, гульняў, спаборніцтваў, розных абрадаў, некаторых відаў працы, сацыяльнымі вытокамі якіх з’яўлялася грамадскае прызнанне юнакоў і дзяўчат у якасці дарослых людзей. Уступленне ў правы дарослага ажыццяўлялася ў пэўным узросце, які, згодна са звычаёвым правам, наступаў для хлопца ў 17 – 18, а для дзяўчынак – у 14 – 16 гадоў.

Вялікім аўтарытэтам у грамадзе карысталіся старыя людзі; дзеці якіх ужо самастойна гаспадарылі. На Беларусі сяляне пасля 60 гадоў звычайна адыходзілі на спачын, нават тады, калі яшчэ захоўвалі фізічную моц і працаздольнасць. Перадаўшы надзел, а значыць, і ўсе абавязкі перад грамадой сыну, такія старыя з багатым жыццёвым вопытам і агульнапрызнанай рэпутацыяй складалі ў грамадзе нефармальную, але надзвычай уплывовую “раду старэйшын”. Яны не толькі раілі, як дзейнічаць у тым або іншым выпадку, але і ажыццяўлялі нефармальны кантроль за адпаведнасцю прынятых рашэнняў звычаям, традыцыям і маральна-этычным нормам. Значную ролю адыгрывалі яны ў выхаванні маладога пакалення, захаванні і перадачы традыцый.

Засваенне маладымі маральных каштоўнасцяў – нормаў паводзінаў, пэўных адносін да розных сацыяльных праблем, гэта значыць *сацыялізацыя*, адбывалася ў працэсе самога жыцця шляхам перадачы вопыту старэйшымі малодшым; дзейснай формай усталявання агульнапрынятай маральнасці з'яўляўся жывы прыклад. Пры такім характары сацыялізацыі выключаўся канфлікт пакаленняў. Адвечная праблема бацькоў і дзяцей суправаджаецца не ўзроставай розніцай і не адметнасцю характараў, а розніцай культурных узораў. У сялянскай жа моладзі не існавала праблемы выбару духоўных каштоўнасцяў, не было светапоглядных, веравызнаўчых праблем, не было практычна і праблемы выбару прафесіі. Адсутнасць альтэрнатыў здымала напружанасць пры ўключэнні моладзі ў жыццё грамады. Паміж пакаленнямі маглі ўзнікаць супярэчнасці, але яны не падрывалі матэрыяльную і духоўную культурную пераемнасць, бо мелі ў сваёй аснове чыста псіхалагічна-эмацыйныя моманты.

Падагульняючы, вызначым асноўныя прынцыпы функцыянавання вясковай грамады:

1. Вяршэнства інтарэсаў усёй грамады над інтарэсамі асобных сялян (сем'яў).

2. Калектыўная адказнасць: за селяніна перад дзяржавай адказвала грамада, перад грамадой – сям'я.

3. Дапушчэнне індывідуальнасці і ініцыятывы з боку асобных прадстаўнікоў у практычнай рэалізацыі прынцыпаў грамадскага жыцця, але ў межах традыцый і звычаяў.

4. Поўная роўнасць правоў і абавязкаў сялян (сем'яў).

5. Права сялян на ўласнасць і працу, якое рэалізавалася з дапамогай агульнага, роўнага карыстання ўсім набыткам грамады, забеспячэнне ўсіх членаў грамады сродкамі да жыцця і падтрыманне плацежаздольнасці кожнай сялянскай сям'і.

6. Права на ўдзел у грамадскіх справах (сходы, сялянскі суд, выбарныя пасады).

7. Права асобных сем'яў на дапамогу грамады ў крызісных сітуацыях.

8. Неўмяшане грамады ва ўнутрысямейныя і асабістыя справы сваіх членаў да тых пор, пакуль яны адбываюцца ў межах звычаяў і традыцый і не парушаюць інтарэсаў грамады.

9. Традыцыяналізм, пераважная арыентацыя на духоўную і матэрыяльную спадчыну папярэдніх пакаленняў, перасцярожлівае стаўленне да інавацый.

**Сямейны побыт**

На спецыфіку развіцця сям'і беларусаў, у прыватнасці на формы і тыпы, уплывала своеасаблівасць сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства ў розныя гістарычныя перыяды. Асноўнымі паказчыкамі форм і тыпаў беларускай сям'і з'яўляюцца:

– агульны колькасны склад;
– колькасць шлюбных пар і пакаленняў;
– дзетнасць;
– сваяцтва (прамое ці бакавое).

Сем'і падзяляюцца на дзве асноўныя формы: *вялікую*, неразздзеленую сям'ю (у склад якой уваходзілі дзве і больш сямей, звязаныя як прамым, так і бакавым сваяцтвам, але пры ўмове вядзення агульнай гаспадаркі) і *малую* (простая, нуклеарная), у якой жыла шлюбная пара з дзецьмі ці без дзяцей.

Сярод неразздзеленых сямей, у сваю чаргу, быў вядомы шэраг тыпаў.

– *Бацькоўскі* тып сям'і падзяляўся на два падтыпы: *аднalінейны* (калі разам з бацькамі жыў адзін жанаты сын са сваімі дзецьмі і ўнукамі) і *многалінейны* (калі ў сям'і бацькоў жылі некалькі жанатых сыноў).

– *Брацкі* тып сям'і ўтвараўся, калі пасля смерці бацькоў жанатыя браты не дзяліліся, а заставаліся жыць разам і вялі агульную гаспадарку. Брацкія сем'і былі толькі многалінейнымі. У іх жылі дзве і больш шлюбных пар. У брацкай сям'і ўсе браты былі юрыдычна раўнапраўнымі, да галавы сям'і – старэйшага брата – ставіліся з павагай і выконвалі ўсе яго распараджэнні.

Ва ўнутрысямейных адносінах значную ролю адыгрывала жанчына. Яе становішча было неаднолькавым. У бацькоўскай сям'і гаспадыняй была маці (*свякруха*), у брацкай – жонка старэйшага брата. Яна кіравала жанчынамі ў сям'і, вучыла іх гаспадарчым справам, размяркоўвала паміж імі працу, сачыла за парадкам у хаце, гатавала ежу, пякла хлеб і інш. У бацькоўскай сям'і *нявесткі* цалкам залежалі ад свякрові. Першай памочніцай гаспадыні была старэйшая нявестка. У малой сям'і жонка падпарадкоўвалася толькі мужу.

Існавалі сем'і пабудаваныя на прынцыпах бакавога сваяцтва: са стрыечнымі братамі, сем'і, дзе разам з дзядзькам жылі *швагры* (браты жонкі ці мужыкі сясцёр). Сустракаліся неразздзеленыя сем'і з *пасынкамі* (няроднымі сынамі; сынамі ад папярэдняй жонкі ў адносінах да мачахі ці сыны ад папярэдняга мужа ў дачыненні да айчыма) і *здольнікамі* (прыёмнымі сынамі ці дочкамі, якія мелі права на частку маёмасці).

У XIX ст. у сельскай мясцовасці пераважалі сем'і з 6 – 10 чалавек, другое месца занялі сямейныя калектывы, якія складаліся з 2 – 5 чалавек, на трэцім – з 11 – 16 чалавек, на апошнім – сем'і з 16 і больш чалавек.

Паводле дзетнасці нераздзеленыя сем'і ў сярэднім налічвалі 7 – 8 дзяцей. Падлік колькасці дзяцей у кожнай шлюбнай пары паказаў, што найбольшае распаўсюджанне мелі пары з 3 – 4 дзецьмі, крыху менш – з 5 – 6 і значна менш – з 7 і больш дзецьмі. Пры гэтым, трэба ўлічваць, што высокая нараджальнасць у беларускай вёсцы суправаджалася і высокай дзіцячай смяротнасцю (недастаткова медыцынская дапамога, нездавальняючыя санітарна-гігіенічныя ўмовы, хваробы і інш.). У некаторых сем'ях нараджалася па 19, а ў жывых заставалася 3 – 4 дзяцей. У Мінскай губерні ў 1860-х гг. на 1 тыс. навароджаных 377 паміралі не дажыўшы да 5 гадоў, у тым ліку 150 з іх не дажывалі да году. Разам з тым, дзеці лічыліся найвышэйшай каштоўнасцю ў сям'і. Бяздзетныя бацькі выклікалі ўсеагульнае спачуванне. Паводле народных уяўленняў, бяздзетнасць была "божай карай" за цяжкі грэх, здзейснены чалавекам альбо вынікам злоснага чарадзейства.

Уласна перыяд дзяцінства, у адпаведнасці з традыцыяй, падзяляўся на чатыры ўзроставыя ступені: *маленства* – ад араджэння да 6 – 8 гадоў; *дзяцінства* – ад 6 – 8 да 12 – 14 гадоў; *падлеткавы ўзрост* – ад 12 – 14 да 16 – 17 гадоў і *юнацтва* – ад 16 – 17 да 18 – 20 гадоў. Кожнай з іх адпавядалі змены ў біялагічным развіцці дзіцяці, пэўныя абавязкі яго ў сям'і і грамадстве, адносіны бацькоў і іншых членаў сям'і, а таксама сваякоў, суседзяў і гэтак далей, да дзяцей рознага полу і ўзросту.

Вялікае значэнне ў беларускім традыцыйным грамадстве надавалася выхаванню дзяцей. У аснове народнай педагогікі беларусаў былі даволі суровыя адносіны бацькоў да дзяцей, якія лічыліся не процівагай бацькоўскай любві, а наадварот, яе доказам. Пры гэтым, народная мараль адмаўляла рэзкасць і жорсткасць ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей. Не адмаўляючы фізічнага пакарання, народная педагогіка ўсё ж лічыць яго не такім эфектыўным у параўнанні з павучаннем: "Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі". Асаблівую ролю ў выхаванні выконвала маці. Можна сцвярджаць, што пяшчотная любоў маці да сваіх дзяцей – характэрная рыса ўзаемаадносін беларусаў. Такая любоў была ўласціва жанчыне з прычыны яе большай эмацыйнасці ў параўнанні з мужчынам: "Дзеці балуюцца ад матчынага блінца, а разумнеюць ад бацькоўскага дубца".

Строгасць і патрабавальнасць да дзяцей была характэрнай традыцыйнай нормай беларусаў. Так, калі здараліся бойкі паміж дзецьмі і бацькі

знаходзілі, што сын “даў у адказ” або абараняў сястру ці малодшых братоў, то яны абыходзіліся заўвагамі. Калі ж, наадварот, ён быў зачыншчыкам, паводзіў сябе агрэсіўна, то яго чакала пакаранне, у тым ліку і фізічнае. Аднак, нярэдка ўмешванне дарослых у разборкі дзяцей было прычынай канфліктных сітуацый паміж суседзямі.

Моладзь і нават дзеці пры сутычках з “чужакамі” вырашалі спрэчкі з дапамогай кулакоў. Падобныя сітуацыі ўзнікалі пры парушэнні межаў той ці іншай вёскі. Так, сустрэўшы ў лесе (“у грыбах” ці “ягадах”) на тэрыторыі, якая лічылася “сваёй”, “чужакоў” праганялі і маглі пабіць. Нельга было купацца, пасвіць жывёлу і гэтак далей на тэрыторыі, якая належала другой вёсцы. Звычай абараняць “сваю зямлю” трымаўся доўгі час у побыце беларусаў і спарадычна сустракаецца і зараз.

Паводзіны дзяцей і іх выхаванне былі саслоўна абумоўлены. Калі вясковыя дзеці маглі праводзіць вольны час у гурце хлопчыкаў і дзяўчынак, то ў шляхецкіх сем’ях дзяўчынкі маглі гуляць толькі з дзяўчынкамі і выключна ў межах сада, каля дома. Непрыстойнымі для дзяцей вышэйшага саслоўя лічыліся “мужыцкія гульні”, якія маглі забрудзіць адзенне. Непрыймальнымі былі гульні дваранскіх дзяцей з дзецьмі сялян ці гараджан.

У выхаванні дзяцей шляхты важнае месца належала прывіццю ім добрых манер, што забяспечвала нармальнае ўваходжанне ў сваё сацыяльнае асяроддзе. Вялікая ўвага надавалася, выхаванню рэлігійнасці і богабойнасці, пачцівасці да бацькоў. Але, як і ў вясковых сем’ях, у выпадку непаслухмянства дзяцей да іх нярэдка ўжывалася фізічнае пакаранне. Разам з тым, з ранняга дзяцінства ў шляхціча выпрацоўвалі пачуццё ўласнай годнасці, гонару і любові да Бацькаўшчыны.

Важнае месца ў сістэме народнай педагогікі займала працоўнае выхаванне. У беларусаў заўсёды заахвочваўся ранні (з 5 – 6 гадоў) удзел дзяцей у працоўнай дзейнасці. Дзеці, як спадкаемцы бацькоў, па народных уяўленнях, павінны былі набыць пэўныя веды і навыкі ва ўсіх галінах жыццядзейнасці: гаспадарцы, жывёлагадоўлі, промыслах, рамёствах, кулінарыі, метэаралогіі, медыцыне і шмат інш. Адбывалася гэта эмпірычным шляхам, канкрэтным паказам розных працоўных аперацый, пасільным удзелам у іх дзяцей.

У маральна-эстэтычным выхаванні велізарную ролю адыгрывалі разнастайныя жанры народнай вусна-паэтычнай творчасці (легенды, паданні, казкі, песні, прымаўкі, прыказкі і інш.), якія змяшчалі і адлюстроўвалі найважнейшыя светапоглядныя каштоўнасці беларусаў, што выспявалі і выцвярэджваліся стагоддзямі.

Такім чынам, усе прыёмы і метады народнай педагогікі былі скіраваны на выхаванне працавітага, фізічна здаровага, высокамаральнага (дабразычлівага, спагадлівага, адказнага, годнага, прыстойнага) чалавека, які стаў бы вартым прадстаўніком свайго роду ў соцыуме.

## Асноўная літаратура


Беларусы. Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мн., 1995.
Беларусы. Т. 2: Дойлідства. – Мн., 1997.
Беларусы. Т. 5: Сям'я. – Мн., 2001.
Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі. – Мн., 2002.
Пилипенко М.Ф. Этнография Белоруссии. – Мн., 1981.
Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989.


## Літаратура для паглыбленага вывучэння тэмы


Арлова Г.П. Беларуская народная педагогіка. – Мн., 1993.
Беларускае народнае адзенне. – Мн., 1975.
Беларускае народнае жыллё. – Мн., 1973.
Локотко А.И. Белорусское народное зодчество середины XIX – XX вв. – Мн., 1991.
Лакотка А.І. Пад стрэхамі прашчураў. – Мн., 1995.
Молчанова Л.А. Материальная культура белорусов. – Мн., 1968.
Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палессе. – Мн., 2004.
Сахута Е.М., Говор В.А. Художественные ремесла и промыслы Белоруссии. – Мн., 1988.
Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. – Мн., 1977.
Сям'я і сямейны быт беларусаў. – Мн., 1990.
Терёхин С.Ф. Охота в Белоруссии. – Мн., 1986.
Цітоў В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. – Мн., 1994.
Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына. – Мн., 1996.
Этнография восточных славян. – М., 1987.

# ТЭМА 5. ТРАДЫЦЫЙНАЯ ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ

**1. Сямейная абраднасць беларусаў.**
**2. Каляндарная абраднасць.**
**3. Беларускі традыцыйны фальклор.**
**4. Традыцыйныя рэлігійныя вераванні беларусаў.**
**5. Народныя веды.**

Вызначыўшы, у шырокім сэнсе, *духоўную культуру, як прадукт дзейнасці чалавечага розуму, мыслення і свядомасці,* мы павінны адзначыць, што асаблівасці традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў як раз і вынікаюць са спецыфікі міфапаэтычнага, архаічнага ў сваёй аснове, светапогляду нашых продкаў, які прынцыпова адрозніваецца ад сучаснага рацыянальнага светаўспрыняцця. Чалавек Традыцыі не вылучаў сябе з навакольнага асяродка – прыроднага і сацыяльнага і ўсведамляў сябе неад'емнай часткай светабудовы ўвогуле. Яго мысленне грунтавалася на эмацыянальных спосабах спасціжэння свету, а не на абстрактна-лагічных аперацыях розуму. Чалавек бачыў у прыродных аб'ектах свае ўласныя пачуцці, жыццёвыя і сацыяльныя якасці. Дыфузнасць, непадзеленасць традыцыйнага мыслення выявілася ў невыразным раздзяленні суб'екта і аб'екта, прадмета і знака, рэчы і слова, істоты і яго наймення, адзінкавага і множнага, прасторы і часу, паходжання і сутнасці. Міфапаэтычнае мысленне аперуе, як правіла, канкрэтным і персанальным, маніпулюе знешнімі другаснымі пачуццёвымі якасцямі рэчаў (так, у міфалагічным успрыняцці хаты надзвычай знакава абыгрываюцца яе геаметрычныя параметры, а не тое, што там жывуць людзі); аб'екты збліжаюцца па другасных пачуццёвых прыкметах (напрыклад, галава, гаршчок, купал неба з'яўляюцца сімвалічна тоеснымі, дзякуючы сваёй сферычнасці / паўсферычнасці). Канкрэтныя рэчы, не губляючы сваёй канкрэтнасці, могуць станавіцца знакамі другіх рэчаў ці з'яваў (стол, захаваўшы сваё ўтылітарнае прызначэнне, у рытуальнай сітуацыі можа ўвасабляць хату; ручнік – дарогу, каша – жыццёвую долю і г.д.). Такім чынам, міфічная думка, замяняючы адны сімвалы другімі, робіць рэальныя рэчы і з'явы больш зразумелымі і спасціжнымі. І абсалютна неістотна, што інфармацыя традыцыйнага тыпу (сонца абягае зямлю, бо гэта фіксуецца візуальна, а, значыць, з'ўляецца праўдай) можа не адпавядаць сучасным навуковым ведам, бо галоўнае, што яна давала чалавеку (калектыву), – гэта ўпэўненасць у правільнасці і непарушнасці светаладу, арганічнасці свайго месцазнаходжання ў ім.

Надзвычай важнае месца ў сістэме традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў займалі *рытуалы* (абрады) – сукупнасць сімвалічных дзеянняў, якія выражаюць (афармляюць) найбольш значныя (пераходныя) моманты жыццядзейнасці чалавека і калектыва, што паўтараюцца перыядычна. Пасродкам рытуалаў у культурах дапісьмовага тыпу захоўваецца і перадаецца найбольш важная (сакральная, сімвалічная) інфармацыя. Дзеля гэтага рытуал выкарыстоўвае ўсе знакавыя сродкі, вядомыя калектыву (мова, жэсты, міміка, танец, спевы, музыка, колер). Вельмі важныя і эмацыйныя функцыі рытуала, які здымае напружанасць, нейтралізуе агрэсію, кансалідуе ўдзельнікаў рытуала, дазваляе ім адчуць сябе адзіным цэлым перад чарговым выпрабаваннем. Прыкметна і тое, што кожны прадстаўнік традыцыйнай супольнасці напрацягу свайго жыцця мусіць прайсці праз усе рытуальныя сцэнарыі, прадпісаныя культурай. У гэтай сувязі, вылучаюць два асноўных узроўня рытуальных паводзінаў – рытуалы *каляндарнага* (у касмічным маштабе сімвалічна рэгулююць жыццё калектыва) і *сямейнага* (сімвалічна афармляюць асабістае жыццё чалавека: нараджэнне – шлюб / вяселле – смерць) цыклаў.

## 5.1. Сямейная абраднасць беларусаў

Вылучаюць тры асноўных рытуала: радзіны, вяселле, пахаванне.

*Радзіны – традыцыйны рытуал, закліканы сімвалічным чынам адасобіць навароджанага ад свету прыроды і ўключыць яго ў соцыясферу (калектыў) і , адпаведна, у свет культуры.* У радзіннай абрадавасці ўмоўна вылучаюць тры этапы: перадродавы, уласна роды і пасляродавы (радзіны ў вузкім сэнсе).

**Перадродавы этап** практычна цалкам супадае з перыядам цяжарнасці жанчыны і ўключае ў сябе разгалінаваную сістэму прадпісанняў і забаронаў, закліканых паспрыяць лёгкім родам, нараджэнню здаровага дзіцяці з шчаслівай жыццёвай доляй. Традыцыйныя нормы паводзінаў цяжарнай насілі выключна сімвалічны характар, у той час як ад гаспадарчых (утылітарных) клопатаў жанчына не вызвалялася. Нярэдка роды адбываліся непасрэдна ў полі, на жніве. Дзетак, у апошнім выпадку, называлі ў народзе “жытнічкамі”.

Каб пазбегнуць выкідыша, катэгарычна забаранялася высыпаць сажу з печы на сцежках, дзе магла прайсці цяжарная, а самой жанчыне раілі вы-

піць сырое яйка з пшанічнай мукой. Каб пупавіна не задушыла дзіця ў чэраве маці, ёй нельга было пераступаць цераз вяроўку, нітку, галлё, хмель, сноп ільну, сноп канапель ці вязьмо ад яго. Дзеля засцярогі плода ад сурокаў, жанчына мусіла ўвесь час насіць хвартух ці апярэзвацца чырвонай стужкай. Паўсюдна на Беларусі існавала павер'е згодна з якім цяжарная жанчына не павінна была стрыгчы валасы, каб не ўкараціць дзіцяці розум; нельга было ні хлусіць, ні біцца, ні красці, бо, як лічылася, дзіця вырасце хлусам, злодзеем і да т.п. Цяжарным забаранялася глядзець у калодзеж ці лужу (дзіця народзіцца сляпым), хадзіць па пілавінні (дзіця будзе пакутваць на болі ў жываце), забіваць жабу ці пераступаць цераз яе (дзіця народзіцца гарбатае і доўга не навучыцца хадзіць).

Існавалі і сімвалічныя спосабы прадказання полу будучага дзіцяці. Так, нараджэнне хлопчыка прадказвалі певень, драпежная птушка ці рыба, бачаныя ў снах, а таксама чырвоны твар цяжарнай, варушэнне плода ў правым баку жывата. Бледны твар, курыца ў снах, варушэнне дзіцяці ў левым баку – азначалі нараджэнне дзяўчынкі.

**Роды** – найбольш адказны момант радзіннай абраднасці, максімальна насычаны дзеяннямі рытуальна-магічнага характару. Галоўнай дзеючай асобай на гэтым этапе з'яўлялася *бабка-павітуха* – пажылая жанчына, якая валодала значнымі ведамі ў галіне народнай медыцыны (нярэдка – знахарка) і ўласнаручна прыймала роды. Абавязковым патрабаваннем да "бабкі" было тое, каб яна ўжо выйшла з дзетароднага ўзросту, бо ў зваротным выпадку "доля" навароджанага магла быць "перацягнута" дзіцём павітухі.

Роды адбываліся (асабліва на Падзвінні) у месцах, звязаных з сімволікай "памежжа" (лазня, гумно, аўчарня і да т.п.), бо ў народных уяўленнях дзіцёнак усведамляўся, як "госцік" з "таго" свету ("Бог да нас чужаземца прыслаў, ён з далёкіх стран прыбуваў").

Велізарнае значэнне надавалася часу нараджэння. Лічылася, што, калі дзіця народзіцца на маладзік (малады месяц), то яно будзе маладжавым і ўвішным усё жыццё, на поўню – сталым, разумным і шматдзетным чалавекам, на сход месяца – хутка састарэе. Шмат залежала і ад дня тыдня. Па меркаванні беларусаў Падзвіння ў панядзелак нараджаліся гультаі, нядбалыя і бедныя людзі, у аўторак – працавітыя і ўдачлівыя, у сераду – людзі, якія могуць неспадзявана разбагацець, але паміраюць у беднасці, у чацвер – кемлівыя і руплівыя гаспадары, што аднак, даволі рана паміраюць, у пятніцу – злодзеі, лайдакі і п'яніцы. Самымі шчаслівымі днямі, дзеля будачага лёсу дзіцяці, лічыліся субота і нядзеля.

Найбольш значнымі (у плане сімвалічнага праграмавання фізічных і сацыякультурных якасцяў навароджанага) працэдурамі падчас і адразу пасля родаў былі наступныя:

– *перарэзанне пупавіны*; хлопчыку пераразалі яе на дубовай кары (дзеля фізічнай моцы), на нажы, сякеры, кнізе, хлебнай скарынцы, каб быў майстравітым, разумным і заможным гаспадаром, а дзяўчынцы – на грэбні, верацяне, нітках, каб была ахвочая да жаночай работы.

– *першае купанне* з'яўлялася ачышчэннем, змываннем пасродкам вады ўсяго "нечалавечага". Акрамя таго, магічныя дзеянні, якія суправаджалі першае купанне дзіцяці, садзейнічалі станоўчаму ўплыву на яго лёс: у ваду клалі грошы і хлеб, каб дзіця было багатае, купальскія зёлкі – каб было здаровым і не баялася сурокаў.

– *першае апрананне* (спавіванне) – вельмі важны акт далучэння да сферы чалавечага, бо адзенне з'яўляецца найважнейшым маркерам свету культуры. Апраналі (спавівалі) ў бялізну, зробленую абавязкова "са старызны" – чыста вымытых бацькоўскіх абноскаў, гэта значыць з рэчаў пазначаных жыццёвай энергіяй. Пры гэтым лічылася, што дзіця пяройме ўсе станоўчыя якасці чалавека, з адзення якога была зроблена бялізна.

**Пасляродаавы этап.** У першыя дні пасля родаў дзіцёнак лічыўся найбольш безабаронным перад рознымі дэструктыўнымі, шкода254носнымі сіламі (чары, сурокі, нячысцікі) і яшчэ захоўваў сувязь з "тым" светам. Гэта, перадусім, выяўлялася ў тым, што дзіця не мела найважнейшых культурных прыкмет чалавека, што вылучаюць яго з свету прыроды, – *імені* і *мовы*. З тым, каб засцерагчы немаўля ад бяды, у калыску клалі асвячоныя зёлкі, соль, выразалі на ёй салярныя сімвалы, а дзіцяці давалі ўмоўнае, часовае імя – "Багданька" (Богам дадзены), "госцічак" ці інш.

Як праходзіла 2 – 3 дні пасля нараджэння, адбываліся *адведкі*, калі без адмысловага запрашэння праведаць парадзіху прыходзілі сяброўкі, сваячаніцы і суседкі. Мужчынам і незамужным дзяўчынам хадзіць у адведкі забаранялася. Паводле норм звычаёвага права, у адведкі нельга было ісці з пустымі рукамі, таму жанчыны неслі з сабой пачастункі, якія ў сімвалічным плане рэалізуюць ідэі плоднасці, жыцця, долі, багацця: хлеб, кашу, сыр, мёд, бліны. Каб засцерагчыся ад магчымых сурокаў, муж перад прыходам жанчын забіваў у парог два жалезныя цвікі, а парадзіха прымала гасцей лежачы.

Напярэдадні ўласна *Радзінаў* (у пазнейшай традыцыі – Хрэсьбінаў), якія адбываліся ў нядзелю праз 2 – 3 тыдні пасля нараджэння дзіцяці, выбі-

ралі *кумоў* (нарачоных, хросных бацькоў), што разам з бабакай-павітухай адыгрывалі выключную ролю ў радзіннай абрадавасці. Высокі сімвалічны статус кумоў тлумачыцца тым, што ў адрозненне ад біялагічных (прыродных) бацькоў, яны з'яўляліся бацькамі сацыяльнымі (культурнымі), свайго роду апекунамі дзяцей з боку вясковай грамады. Невыпадкова, што ў выпадку смерці родных бацькоў, менавіта кумы бралі дзяцей пад сваю абарону. У кумы запрашалі, як сваякоў, так і нясродных людзей, але перавага аддавалася сумленным, высокамаральным і працавітым гаспадарам. Калі дзеці ў сям'і часта паміралі, то бацька запрашаў "*збожных кумоў*". Дзеля гэтага гаспадар з боханам хлеба, завінутым у ручнік, раніцай выпраўляўся на ростані дарог, дзе і запрашаў у кумы першых стрэчных мужчыну і жанчыну. У народзе верылі, што іх пасылае сам Бог. Людзей сацыяльна непаўнавартых (бабылёў, удоў, удаўцоў, бяздзетных) і "чужых" паводле этнакультурных прыкмет (габрэяў, цыганаў і да т.п.) у кумы не запрашалі ніколі.

Архаічнай асновай радзінаў, якія афармлялі канчатковае далучэнне дзіцяці да чалавечай супольнасці, з'яўляўся *абрад надання імя*, бо, дзякуючы яму, нованароджаны ўключаўся ў сферу культуры і мог быць названым і пазнаным. У даўнейшыя часы імя давала бабка-павітуха або кумы, пад уплывам царквы гэта стала адбывацца падчас хрышчэння. У любым выпадку, імя разумелася як сутнасная, духоўна-матэрыяльная субстанцыя чалавека, здольная паўплываць на ўсё яго далейшае жыццё. Атрыманне імя ўсведамлялася як вынік дараабмену паміж людзьмі і сакральнай сферай (Богам). Так, калі дзіцёнак быў хворы і не мог ехаць да хросту, то па яго імя выпраўлялася бабка-павітуха. Адарыўшы святара пачастункамі, бабка атрымлівала ўзамен імя, якое служыцель культу прамаўляў над шапкай-аблавухай. Пасля шапка завязвалася, і павітуха несла імя, як рэальную, матэрыяльную рэч, дзіцёнку.

Дарога да храма, куды йшлі кумы з малым, уяўлялася небяспечнай і, разам з тым, знакавай. Так лічылася, што калі ў дарозе будзе дождж ці снег, то дзіця дзіця будзе багатым, калі білі грымоты і пяруны, то меркавалі, што з немаўляці выйдзе моцны чараўнік. Каб засцерагчы дзіця ад сурокаў і "нячыстай сілы", на ростанях, якія прамінаглі, сыпалі соль. Знакавымі былі паводзіны дзіцёнка ўласна ў царкве. На Падзвінні былі перакананыя, што калі дзіця будзе крычаць над "кстом", то будзе мець доўгі век, а рахманае – пражыве нядоўга. Вельмі добрым знакам было, калі малое мачылася ў купелі. У гэтым выпадку верылі, што ўсе прысутныя "пап'юць піва" на яго вяселлі.

Па вяртанні з храма, дзіця перадавалі бацьку, дзеля чаго кум клаў немаўля на парог хаты (сімвал мяжы), засцелены вывернутым кажухом (сімвал багацця і дастатку), а бацька, знаходзячыся ў хаце, пераймаў дзіцёнка ў свае рукі. Калі дзеці часта паміралі, то, каб падмануць смерць, што, нібыта, чакала ля парога, дзіця перадавалі бацькам праз акно.

Апагеем радзіннай абрадавасці з'яўлялася калектыўнае рытуальнае застолле, на якое запрашаліся толькі жанатыя людзі. Галоўнай мэтай супольнай трапезы з'яўлялася пераразмеркаванне *калектыўнай долі* з улікам новага члена вясковай грамады. Давальнікам долі, як калектыўнай, так і персанальнай, выступаў Бог, а пасрэднікам у яе перадачы – бабка-павітуха (радзей – кумы), якая выпрошвала для немаўляці трыадзіную долю: "збажавую", "грашавую", "вянчальную". Матэрыяльным увасабленнем калектыўнай долі з'яўлялася галоўная рытуальная страва Радзінаў – "*бабіна каша*", гаршчок з якой выкупаўся кумам і *разбіваўся* аб кут стала (дзеянне, што сімвалізуе ідэю памнажэння, павелічэння). Пасля гэтага, кожны з прысутных выкупаў ужо сваю частку кашы, а гэта значыць і долі. Каліва кашы дарослыя заносілі потым сваім дзецям, хоць колькі круп дадавалі ў корм хатняй жывёле, што мусіла спрыяць сямейнаму і гаспадарчаму дабрабыту канкрэтнага рода (сям'і).

Бацькі малога адорвалі бабку-павітуху і кумоў падарункамі (пірагі, палатно, кашуля).

На заключным этапе Радзінаў (акрамя Палесся) мужчыны ўсаджвалі бабку-павітуху на барану, укрытую вывернутым кажухом, і цягнулі праз усю вёску. У сімвалічным кантэксце гэтае дзеянне мусіла гарантаваць, што роды, якія прыняла бабка-павітуха, не будуць апошнімі ў гэтым паселішчы.

*Вяселле – комплекс абрадаў і звычаяў у спалучэнні са шматлікімі фальклорнымі элементамі (песні, музыка, танцы, гульні, зычанні і інш.), якія суправаджаюць урачыстасць заключэння шлюбу і з'яўляюцца няпісаным юрыдычным актам зацвярджэння новай сям'і.*

Традыцыйнае беларускае вяселле падзяляецца на тры асноўныя часткі: *давясельную* (падрыхтоўчую), уласна *вясельную* і *паслявясельную*.

Асноўнымі структурнымі кампанентамі падрыхтоўчага этапу з'яўляюцца:

– *Агледзіны* (выгледзіны) – перадвясельны звычай, закліканы высвятліць фізічныя параметры і гаспадарчыя здольнасці нявесты. У хату дзяўчыны звычайна пад выглядам падарожнага чалавека ехаў бацька (дзядзька) жаніха. У хаце ён распачынаў гаворку, аніяк не звязаную з тэмай вяселля, і пільна прыглядаўся да дзяўчыны. Калі яна спадабалася, то вырашалі слаць да яе сватоў.

– *Даведкі* (выведы, допыты) адбываліся перад сватаннем, калі ў хату дзяўчыны завітвала з хлебам і соллю старая сваячаніца хлопца, каб пераканацца ў згодзе бацькоў дзяўчыны прыняць сватоў. Даведкі рабіліся патаемна, каб у выпадку адмовы пра гэта ніхто не ведаў і не кпіў з хлопца.

– *Сватанне* (сваты) – адзін з галоўных этапаў падрыхтоўчага перыяду вяселля, у час якога бацькі і дзяўчына даюць (ці не даюць) папярэднюю згоду на шлюб. У сваты найчасцей ехалі бацька жаніха, яго старэйшы брат ці дзядзька, абавязкова жанатыя і не ўдаўцы. Сватаць ехалі ў аўторак, чацвер, суботу, якія лічыліся шчаслівымі (парнымі, мужчынскімі) днямі, альбо напярэдадні якога-небудзь свята ўначы. У рэдкіх выпадках, калі хлопец ішоў у прымакі, сватоў маглі засылаць і ад дзяўчыны. Дзеянні і размовы сватоў насілі падкрэслена сімвалічны характар, што падкрэслівала рытуальную значнасць сітуацыі. Так, сваты не заходзілі адразу ў хату, а грукалі ў акно (параўнай аналагічны звычай у калядоўшчыкаў і валачобнікаў), прасілі пусціць іх нанач, выдаючы сябе за падарожных, паляўнічых, купцоў. Увайшоўшы ў хату, сваты не адразу гаварылі пра мэту прыходу і паводзілі сябе сімвалічна: цісналіся да качарэжніка, быццам незнарок наступалі на памяло, качаргу, вілкі (каб сватанне было ўдалым, а малады меў вяршынства ў сям'і), не віталіся за руку, садзіліся на лаву каля сцяны ад двара (садзіцца на лаву каля сцяны ад вуліцы, паводле народных уяўленняў, азначала, што адзін з маладых неўзабаве аўдавее). У час сватання гаварыліся розныя спецыяльныя прымаўкі, прыказкі, іншаказанні, умоўныя формулы. У большасці формул захаваліся водгукі архаічнага звычаю куплі-продажу нявесты. Роля самой дзяўчыны была мінімальнай. Яна альбо ўвогуле ішла да суседзяў, альбо, застаючыся ў хаце, магла выказаць сваю волю толькі сімвалічна (калі дзяўчына пачынала пры сватах вымятаць хату ад печы да парога, гэта азначала яе нежаданне брацца шлюбам з гэтым жаніхом, калі ж яна мяла наадварот – азначала згоду). Калі бацькі былі прынцыпова згодныя на шлюб сваёй дачкі, то адбывалася сціплае застолле, на якое сваты выстаўлялі хлеб-соль і гарэлку, а гаспадары яешню, сыр і іншую закуску. Пасля сумеснай трапезы, маці адорвала сватоў караваем і вяртала пляшку ад гарэлкі, даверху насыпаную жытам. Нязгода бацькоў піць прынесеную бацькамі гарэлку азначала, адпаведна, іх нязгоду і на шлюб дачкі. Аднак, калі сваты прыязджалі да дзяўчыны першы раз у яе жыцці (і тым больш, калі ў сям'і было некалькі дачок шлюбнага ўзросту), то іх ніколі не адпраўлялі, не выпіўшы з імі (нават у выпадку адмовы). Але пры гэтым бацька плаціў за гарэлку. У зваротным выпадку лічылася, што сваты могуць больш ніколі не прыехаць у гэтую хату.

– *Запоіны* – адзін з падрыхтоўчых этапаў вяселля, на якім нявеста і яе бацькі ў прысутнасці самых блізкіх сваякоў афіцыйна давалі згоду на шлюб.

– *Заручыны* (змовіны, вялікія запоіны) – заключны этап падрыхтоўчага перыяду вяселля, на якім у прысутнасці вялікага кола сваякоў канчаткова замацоўвалася згода на шлюб, вырашаліся гаспадарча-матэрыяльныя пытанні, звязаныя з шлюбам (памеры пасагу, час, маштабы правядзення вяселля і інш.). Заручыны ўключалі ў сябе наступныя абрадавыя дзеянні: жаніх і нявеста над хлебам або над місай, у якую сват зліў гарэлку абодвух радоў ("ажаніў гарэлку"), падавалі адзін аднаму рукі і іх звязвалі ручніком, абменьваліся пярсцёнкам і абрадавымі падарункамі (пояс, кашуля, хустка); жаніх прывозіў спецыяльны падарунак для сяброўак нявесты, які сімвалізаваў яе выкуп з дзявочай грамады. Вяселле падчас заручынаў абвяшчалася афіцыйна, жаніха і нявесту пачыналі называць *малады* і *маладая* (князь і княгіня, заручоны і заручоная), іх удзел у жыцці моладзі істотна абмяжоўваўся. Адмова ад вяселля пасля заручынаў лічылася вялікай ганьбай, як для жаніха, так і для нявесты, таму здаралася надзвычай рэдка. Вінаваты ў адмове сплочваў і ўсе матэрыяльныя выдаткі.

– *Суборная субота* (паненскі вечар, вяночкі) – абрад развітання маладой са сваімі сяброўкамі, апошні вечар яе дзявоцтва напярэдадні вяселля. Адвячоркам у суботу ў хаце маладой збіраліся дзяўчаты, яны вілі вянкі, рыхтавалі абрадавыя ўпрыгожанні для жаніха і нявесты. Завіванне вянкоў, якія сімвалізавалі цнатлівасць маладой, адбывалася з дазволу і дабраслаўлення яе бацькоў. У той жа вечар, ад імя маладога, для дзяўчат ладзіўся пачастунак, які азначаў своеасаблівы выкуп маладой з дзявоцкай грамады.

Уласна *вясельны рытуал* пачынаўся з выпечкі святочнага *каравая*, які сімвалізаваў долю ў самым шырокім значэнні (здароўе, багацце, сэксуальную патэнцыю, сямейны лад). Выпяканне сямейнага каравая азначала пачатак усяго абраду, а яго дзяльба сведчыла пра заканчэнне вяселля. У структуру ўласна каравайнага абраду ўваходзілі наступныя рытуальныя дзеянні: падрыхтоўка дзяжы, замешванне цеста, вымятанне і распальванне печы (чым займаліся спецыяльныя жанчыны – "*каравайніцы*"), саджанне каравая ў печ (справа мужчыны – "*каравайніка*"), варажба аб лёсе маладых па форме каравая (напрыклад, калі каравай трэскаўся ў печы, лічылася, што маладыя хутка разыйдуцца ці нехта з іх памрэ), упрыгожванне каравая эратычна-шлюбнымі сімваламі (шышкі, ёлачкі, самкі і самцы розных жывёл, выпечаныя з цеста). Пасля выпечкі каравай разглядаўся як адна з найвышэйшых каштоўнасцяў вясельнага абраду, ад якой непасрэдным чынам

залежала далейшае жыццё маладых. Каравай успрымаўся як жывая істота і, дзеля таго, каб яго ніхто не сурочыў і не сапсаваў, каравай да самае дзяльбы захоўвалі ў каморы. Калі ж нехта скрадаў кавалак каравая, меркавалі, што ў маладых не будзе дзяцей; калі каравая ўхапіў сабака – не будзе весціся скаціна.

Абавязковай абрадавай працэдурай вяселля з'яўляўся *пасад*, калі перад вянчаннем маладога і маладую саджалі на хлебную дзяжу, пакрытую вывернутым кажухом. Абрад адлюстроўваў архаічныя дахрысціянскія культы: ушанаванне хатняга ачага, духаў продкаў, бостваў урадлівасці і пладавітасці. Галоўнай мэтай пасаду было забяспячэнне багацця, як гаспадарчага (ураджай, прыплод скаціны), так і сацыяльнага (лад у сям'і, здаровае, шматлікае патомства). Маладых, што страцілі цнатлівасць, удаўцоў (удоў), цяжарных жанчын або тых, якія мелі пазашлюбнае дзіця на пасад не саджалі. Парушэнне гэтага звычаю, паводле народных перакананняў, абавязкова прыводзіла да розных бед і няшчасцяў у жыцці сям'і і ўсяго рода ў цэлым.

Наступнымі храналагічнымі этапамі вяселля былі збор і адпраўленне дружыны жаніха з яго сядзібы, прыезд па нявесту і яе выкуп. Пасля таго як дружына маладога праходзіла выпрабаванні, наладжаныя дружкамі маладой і сімвалічна выкупляла яе, жаніх і нявеста выпраўляліся для шлюбу ў касцёл або павянчацца ў царкву. Тут неабходна адзначыць, што, у вачах беларускіх сялян, працэдура царкоўнага вянчання з'яўлялася шмат у чым фармальнай, навязанай афіцыйнымі ўладамі і не азначала заключэння шлюбу. У выпадку, калі, па нейкіх прычынах, вяселле адкладалася, то маладыя пасля вянчання працягвалі жыць паасобку і не лічыліся сям'ёй.

Пасля вянчання маладыя ехалі да дому нявесты, дзе іх перад парогам сустракалі яе бацькі; маці была ў вывернутым кажуху і трымала на ручніку хлеб-соль. Жаніх браў нявесту на рукі і пераносіў цераз парог, пасля чаго яны заходзілі па сонцы ў чырвоны кут (на покуць) і сядалі за сталом пад абразамі. З гэтага моманту пачыналася абрадавае вясельнае застолле.

Позна ўвечары ў хаце маладой адбывалася дзяльба яе каравая, затым малады адкупляўся ад сяброўак маладой, збіралася прыданае, і вясельная працэсія выпраўлялася да дому маладога. Сутнасць урачыстай сустрэчы была тая ж, што і ў хаце маладой.

У двухдзённым святкаванні вяселля ў хаце маладога найбольш рытуалізаванымі і значнымі былі такія этапы, як камора, завіванне і выпрабаванне маладой.

– *Камора* (пакладзіны) – вясельны абрад першай шлюбнай ночы. Самое памяшканне (камора, клецЬ), дзе клалі маладых спаць, было ўвасабленнем дабрабыту, дастатку (шырэй – Долі) усёй гасподы – там захоўваліся прадукты харчавання, збожжа, найбольш каштоўная маёмасць. "Спор" дабра, што захоўвалася ў каморы, мусіў станоўча ўздейнічаць на патэнцыю маладых, а плодная патэнцыя маладой шлюбнай пары, у сваю чаргу, спрыяла павелічэнню дабрабыту ўсёй гаспадаркі. У адрозненне ад цяперашняй сітуацыі, калі "пакладзіны" маладых азначаюць перапынак у вясельных урачыстасцях, раней рытуал не перапыняўся ні на хвіліну. Пакінуўшы жаніха і нявесту адных, госці пачыналі танцаваць, спяваць, жартаваць. Смех і жарты былі прыкметамі жыцця (мёртвыя не смяюцца), а таму выступалі ў якасці дзейсных абярогаў ад уздзеяння нячыстай сілы. Эратычны ж змест "*калінак*" (каморныя песні), з улікам веры ў магічную моц слова, толькі накіроўваў стваральную энергію на саму камору. Пабуджала маладых сваццця або сястра маладога, якая і засведчвала цнатлівасць маладой. За захаванне цнатлівасці нявестай адказваў увесь яе род, страта цнатлівасці да шлюбу лічылася не толькі ганьбай, але (у міфалагічным значэнні) і рэальнай пагрозай дабрабыту (ураджаю, прыплоду скаціны) сям'і маладога.

– *Завіванне* – вясельны абрад, пасродкам якога маладую ўводзілі ў жаночы стан. У час абраду (мужчынам прысутнічаць забаранялася) маладую садзілі на дзяжу, пакрытую вывернутым кажухом, а замужнія жанчыны – "завівальніцы" – пакрывалі яе валасы, заплеценыя ў косы, чапцом і закручвалі белай наміткай – неад'емным атрыбутам жаночага статусу.

– *Выпрабаванне* – вясельны абрад, у час якога правяралі здольнасці і характар маладой, а таксама знаёмілі яе з гаспадаркай і будучымі абавязкамі ў новай сям'і.

Асноўнымі этапамі заключнай, *паслявясельнай* часткі абраднасці былі пярэзвы і гасціны.

– *Пярэзвы* ўяўлялі сабой звычай запрашэння і частавання ўдзельнікаў вяселля ў хатах сваякоў маладых і іншых вясельнікаў у час вяселля. Наладжваліся з мэтай аказання матэрыяльнай дапамогі бацькам маладых у правядзенні вяселля.

– *Гасціны* адбываліся ў першую суботу пасля вяселля, калі бацькі маладога і іх бліжэйшыя родзічы разам з маладым і маладой прыязджалі з пірагамі да яе бацькоў. Бацькі маладой склікалі сваіх сваякоў і разам з імі частавалі гасцей. За сталом старэйшыя вялі размовы пра ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей, пра ўладкаванне дабрабыту маладых і да т.п. Пасля застолля маладыя вярталіся дадому разам з гасцямі.

У беларускай традыцыйнай культуры, апрача класічнага (звычайнага) вясельнага рытуалу, ахарактарызаванага вышэй, адрознівалі яшчэ чатыры тыпы вяселля:

– *Прымацкае*, калі жаніх ішоў у хату бацькоў нявесты (адсутнічаў абрад выпраўлення маладой у дом жаніха; спяваліся прымацкія песні пераважна жартоўнага зместу).

– *Сіроцкае*, калі ў каго-небудзь з маладых няма маці ці бацькі, а іх ролю выконвалі нарочаныя (хрочныя) бацькі. У абрадзе абавязкова прысутнічалі адмысловыя сіроцкія песні, блізкія зместам і танальнасцю да галашэнняў; нявеста (жаніх) напярэдадні вяселля хадзіла на могілкі да бацькоў, галасіла і прасіла ў іх багаслаўлення на шлюб.

– *Удавецкае*, калі шлюб бярэ ўдава ці ўдавец; вяселле было вельмі сціслым і абмяжоўвалася царкоўным вянчаннем без традыцыйных абрадаў.

– *Пакрыцкае*, калі нявеста да вяселля страціла цнатлівасць, зацяжарыла ці нарадзіла пазашлюбнае дзіця; як і ў папярэднім выпадку, абрад насіў фармальны, згорнуты характар.

*Пахавальная абраднасць (хаўтуры) – сістэма рытуальных дзеянняў, рэлігійных уяўленняў і прадпісанняў, закліканых сімвалічным чынам афарміць смерць чалавека і яго пераход у свет нябожчыкаў (продкаў).* У традыцыйным светапоглядзе натуральная смерць (ад старасці) разглядалася як аб’ектыўная рэальнасць, арганічнае завяршэнне любога чалавечага жыцця: “Як бы ні жыў, а памерці трэба”, “Шукаць смерці не трэба, сама прыйдзе”. Пры гэтым, смерць асобнага чалавека не мусіла парушаць рытмаў зямнога жыцця ўвогуле: “Паміраць збірайся, а жыта сей”. Паколькі час уласнай смерці чалавек не ведаў (выключэнне складалі моцныя знахары і чараўнікі), то ў традыцыйным грамадстве існавала развітая сістэма сімвалічных прадказанняў. Так, смерць вешчавалі наступныя прыкметы: рыццё сабакам зямлі пад акном хаты, птушка, што заляцела праз акно ў жылы пакой, цвыркун, які скача па падлозе хаты, падзенне абразоў з бажніцы, святар, царква, будаўніцтва хаты, уласнае вяселле, што прыснілася ва сне, і шмат іншага.

Калі чалавек цяжка хварэў, колькасць падобных прыкмет значна павялічвалася. Блізкую смерць хворага прадказвалі: трэск сценаў хаты, валтузня мышаў пад ложкам нядужага, пралёт гругана (савы, зязюлі) над хатай, сабакі і каты, якія абыходзілі хворага, свіння, што чухалася аб вугал хаты.

Калі хворы паміраў надзвычай цяжка, то, каб палегчыць яго адыход, знямоглага перакладалі з ложка на падлогу (“бліжэй да зямлі”), давалі ў рукі запаленую грамнічную свечку. У народзе верылі, што асабліва пакут-

ліва паміралі чараўнікі і знахары, якія не перадалі сваіх таемных, магічных ведаў нашчадкам. Каб дапамагчы іх душам выйсці з цела, адчынялі *душнік* (адтуліна ў столі курной хаты для выхаду дыму) ці нават падымалі некалькі дошак у столі.

Сам момант смерці разумеўся як адасабленне душы ад чалавечага цела (адсюль з-дохнуць = выдыхнуць апошні раз). Разам з тым, смерць магла апісвацца ў народнай традыцыі як канчатковае здранцвенне чалавека ("спруцянеў", "акасцянеў"), поўная яго немагчымасць перамяшчацца фізічна ў зямной прасторы ("адкінуў ногі", "скапыціўся") і, з другога боку, як перамяшчэнне памерлага са свету людзей у "іншасвет" ("у апошні шлях", "у дальнюю староначку").

Лічылася, што пасля смерці чалавека, яго душа на працягу 40 дзён знаходзіцца ў хаце ці паблізу яе. Для душы памерлага на вакно ставілі пасудзіну з вадой, вешалі ручнік, каб яна магла памыцца і ўцерціся. Адначасова прадпрымаўся шэраг засцерагальных мер, закліканых прадухіліць блізкую чарговую смерць у гэтай сядзібе. На павекі мёртваму клалі медзяныя грошы, каб яго вочы раптоўна (рэфлекторна) не расплюшчыліся і не "выглядзелі" яшчэ аднаго нябожчыка.

Калі ў хаце ў момант смерці стаяла вада, то яе абавязкова вылівалі. Лічылі, што ў такую ваду магла акунуцца душа, і той, хто нап'ецца яе ці выкарыстае для прыгатавання страў, у хуткім часе памрэ.

Найбольш значнымі рытуальнымі дзеяннямі ў рамках пахавання былі наступныя:

– *Абмыванне нябожчыка* – абавязковая аперацыя з надзвычай глыбокім міфалагічным сэнсам. З дапамогай вады з памерлага змываліся прыкметы "гэтага" свету (пот, нацельны бруд – адназначныя атрыбуты жыццядзейнасці), своеасаблівая "жыццёвая аура", якая не павінна быць занесенай на "той" свет. Чалавек, такім чынам, вяртаўся ў чысты, зыходны, прыродны стан. Абмывалі нябожчыка, як правіла, людзі не з ліку сваякоў. "Мярцвяную ваду" пасля абмывання вылівалі ў цёмных, глухіх кутах, дзе не свеціць сонца, не ходзяць людзі і жывёла, каб не нашкодзіць жывым.

– *Апрананне памерлага* мела на мэце матэрыяльна ўвасобіць нежывы статус чалавека з дапамогай сродкаў культуры – адзення, якое абавязкова павінна было быць новым і няношаным, гэта значыць, не адзначаным жыццём. Адзенне "на смерць" рыхтавалі задоўга да яе надыходу і шылі адмысловым спосабам (не злева направа, але справа налева, ніткай без вузялка, без металічных гузікаў), які адрозніваў гэтае адзенне ад штодзённага і святочнага.

Пасля таго, як нябожчыка апраналі, яго клалі на лаву пад абразамі, нагамі да дзвярэй. Нехта са сваякоў мусіў пастаянна знаходзіцца ля памерлага, бо, ў зваротным выпадку, у яго цела, як верылі беларускія сяляне, мог забрацца чорт, "ліхі дух".

– *Выраб труны.* Паводле народных уяўленняў, дамавіна (труна) з'яўлялася жыллём (домам) нябожчыка на "тым" свеце, што адлюстравана ў самой семантыцы слова. У дамавіну памяшчалася "доля" нябожчыка (хлеб, збожжа, гарэлка), рэчы, неабходныя для паўнавартаснага жыцця ў іншасвеце (шапка, пас, прылады працы, крамень, крэсіва і інш.) і дробныя грошы для аплаты месца на могілках. На Падзвінні і Падняпроўі дамавіну, як правіла, рабілі з кепска агабляваных ці зусім не габляваных ("абы якіх") дошак. Адмысловая недаробленасць надавала дамавіне прамежкавы, пераходны статус паміж светам жывых і памерлых. З мэтай прадухілення чарговай смерці ў сям'і памерлага забаранялася рабіць дамавіну яго блізкім сваякам. Трэскі, што засталіся пасля вырабу дамавіны, спальвалі або клалі ў яе, бо нават адна трэска, што засталася ў хаце, магла прывесці да чарговае смерці. Труну для малых дзяцей рабілі без жалезных цвікоў. У адваротным выпадку лічылася, што дзеці ў сям'і больш не будуць нараджацца.

– *Вынас нябожчыка з хаты; пахавальная працэсія.* Уласна пахаванне нябожчыка адбывалася на трэці дзень пасля смерці. Выносілі памерлага з хаты абавязкова нагамі наперад, бо, лічылася, што калі вынесці нябожчыка ўпярод галавой, то ў сям'і ўсе да аднаго вымруць. Пры выхадзе з хаты, труной лёгка грукалі аб парог. Паводле народных тлумачэнняў, такім чынам канчаткова "вытрасалі" душу памерлага з яго цела ці "вытрасалі" ўсе непаразуменні, якія засталіся паміж сваякамі і нябожчыкам на момант смерці апошняга. Аднак глыбінны сэнс гэтага дзеяння заключаецца ў сімвалічным размыканні мяжы "свайго" свету, што дазваляла пахавальнай працэсіі, як бы перамясціцца ў свет памерлых, дзе і здзейснялася пахаванне. Калі хаўтурнае шэсце праходзіла па вёсцы, абавязкова пабуджалі людзей (асабліва дзяцей), якія спалі ў гэты час, бо верылі, што душа чалавека ў сне вандруе асобна ад цела і, сустрэўшы душу нябожчыка, можа ўжо не вярнуцца назад. Калі хтосці з людзей пераходзіў дарогу працэсіі, альбо святар, які суправаджаў нябожчыка, азіраўся назад, лічылася, што неўзабаве ў вёсцы будзе чарговая смерць.

– *Апошняе развітанне з памерлым. Пахаванне.* Магілу для нябожчыка капалі ў дзень пахавання адмысловыя людзі – "*далакопы*", не з ліку сваякоў. Выкапаную магілу абкурвалі ядлоўцам, каб туды не забраўся шка-

даносны дух. Калі магіла абвальвалася, меркавалі, што ў сям'і хутка будзе яшчэ адна смерць. Перад тым, як апусціць труну ў магілу, сваякі кідалі туды манету, каб выкупіць месца ў памёрлых. Следам за дамавінай у магілу часам клалі замок, каб смерць доўгі час абмінала сям'ю нябожчыка. Пасля апошняга развітання на могілках труну на ручніках апускалі ў дол (тут жа на могілках мог прысутнічаць святар, які служыў набажэнства). На магіле ставілі часовы невялікі крыж, які прыблізна праз год замянялі больш даўгавечным ці каменем. Каб вельмі моцна не смуткаваць па памёрлым, сваякі забіралі з сабой шчэпаць зямлі з яго магілы. Усе вышэйпрыгаданыя этапы пахавальнай абраднасці суправаджаліся *галашэннямі* – плачамі, якія выконваліся жанчынамі, як правіла, сольна.

– *Вяртанне дадому. Памінкі.* Калі вярталіся з могілак, сваякам забаранялася аглядацца назад, бо хутка мог памерці яшчэ адзін чалавек з гэтай сям'і. Каня, на якім везлі нябожчыка, праганялі праз запаленую салому, раскладзеную ў варотах сядзібы. Вярнуўшыся з могілак, падыходзілі да печкі і, пагладзіўшы яе рукамі, казалі: "Няхай паміраюць прусакі ды тараканы, а не людзі!", пасля чаго мылі рукі. У хаце памерлага адбываліся памінкі, дзе галоўнай рытуальнай стравай была куцця, пакаштаваць якую мусіў кожны з прысутных. Як і на радзінах, гэта сімвалізавала пераразмеркаванне калектыўнай долі, але ўжо з улікам выбыўшага члена вясковай грамады. Паміналі нябожчыка на дзевяты дзень і на саракавы дзень пасля смерці. Цыкл памінак па нябожчыку завяршаўся гадавінай яго смерці, пасля чаго ён памінаўся разам з астатнімі памёрлымі продкамі – Дзядамі.

Прынцыпова іншым было пахаванне *самагубцаў*, што разглядаліся як "нячыстыя", небяспечныя мерцвякі, здольныя прынесці жывым людзям рэальную шкоду (засуху, хваробы). Перакананне аб небяспечнасці самагубцаў грунтуецца на ўяўленні пра тое, што натуральная смерць чалавека надыходзіць, калі той вычэрпаў сваю жыццёвую сілу, патраціў яе на працягу ўсяго жыцця; заўчасная ж (самавольная) смерць пакідала нябожчыку не выдаткаваную ў зямным жыцці энергію, якую ён мусіў траціць ужо на шкоду людзям. Паўсюль забаранялася хаваць самагубцаў на могілках. Найчасцей іх хавалі ў месцах, звязаных з сімволікай памежжа і хаосу: ля ростаняў, у багністых месцах, у канавах, што атачалі могілкі. Адзінай пахавальнай атрыбутыкай самагубцы магла быць тая адзежа, у якой ён засіліўся. Часам іх хавалі нават без дамавіны. Паўсюль адсутнічала адпяванне самагубцаў і звычай спраўлення па іх памінак.

## 5.2. Каляндарная абраднасць

Каляндарная абраднасць беларусаў неад’емна звязана з архаічным тыпам часаўспрыняцця, што быў характэрны для традыцыйнага грамадства, і такім феноменам культуры, як *каляндар* (ад лац. “*calendae*” – першыя часы месяца, дні маладзіка). Квінтэсенцыяй любога тыпу часаўспрыняцця, безумоўна, з’яўляецца каляндар, які ў кожнай культуры адыгрывае значна большую ролю, чым сімвалічны механізм хронаметражу. Найперш, гэта датычыцца традыцыйных грамадстваў, дзе каляндар – не проста сістэма адліку больш ці менш працяглых прамежкаў часу з дапамогай перыядычных прыродных з’яў, гэткіх, напрыклад, як змена дня і ночы, змена фазаў месяца, сезонаў. Гэта складаная знакавая сістэма, сродкамі якой структуруецца і ўпарадкоўваецца час чалавечага існавання, вызначаюцца перыяды працоўнай актыўнасці і святочных узрушэнняў духу. Каляндар напаўняе бяздушны час чалавечымі сэнсамі.

Структура беларускага народнага каляндара ўключае ў сябе шэраг цыклаў (суткі, тыдзень, месяц, сезон, год, век), дзе кожны, меншы ў метрычным выражэнні, з’яўляецца часткай большага, і, адпаведна, яго мікрамадэллю (так, Поўдзень на сімвалічным узроўні, тоесны Лету, Апоўнач – Зіме). Маючы складаную структуру, час у суцэльнасці сваіх элементаў, прыпадабняўся прасторавай мадэлі свету (чатыры бакі свету адпавядалі чатыром пераменам году: усход – вясне – раніцы, поўдзень – лету – дню, захад – восені – вечару, поўнач – зіме – ночы).

З’яўляючыся ў сваёй аснове сонечным (гэта значыць арыентаваным на фазы актыўнасці сонца), беларускі народны каляндар падзяляецца на два буйных сезоны – “Зіму” і “Лета”. Падзел гэты маркіруецца ўмоўнай лініяй, што злучае восеньскае (22 – 23.09) і веснавое (20 – 21.03) раўнадзенствы, і святамі, якія суаднесены з імі па каляндарнай шкале. Да восеньскага раўнадзенства найбольш набліжаныя: “Сямён Стоўпнік” (14.09/1.09 па стараму стылю)[1], на які звычайна выконвалі архаічны рытуал “Жаніцьба коміна”, “Багач” (21.09/8.09) і “Узвіжанне” (27.09/14.09).

Уласна восень і вясна маглі “губляцца”, не згадвацца ў беларускім фальклоры, паколькі, у традыцыйным светапоглядзе, усведамляліся складнікавымі часткамі (“пралогам”) зімы і лета адпаведна. Невыпадкова лічылася, што ўжо на “Стрэчанне” (15.02) зіма сустракаецца з летам.

---

[1] Вылучэнне так званага “новага” і “старога” стыляў звязана з каляндарнай рэформай 1582 г., калі недакладны юліянскі каляндар быў заменены на грыгарыянскі (ад імя рымскага папы Грыгорыя XII, ініцыятара рэформы). З тых часоў усе еўрапейскія краіны перайшлі на новы каляндар, але руская праваслаўная царква дагэтуль працягвае карыстацца юліянскім (“старым”), розніца паміж якімі на сённяшні момант складае 13 дзён.

Калі момант восеньскага і веснавога раўнадзенстваў падзялялі год на дзве вялікія часткі, то дадатковая вось (зімовы (21 – 22.12) – летні (21 – 22.06) сонцаварот) фармавала чатырохчасткавую структуру каляндарнага году. Непасрэдна суаднесенымі з гэтымі астранамічнымі падзеямі ў беларускай традыцыі з'яўляюцца, адпаведна, *Каляды* і *Купалле*.

Прымеркаванне да Калядаў (25.12) хрысціянскага свята "Раства Хрыстова" – з'ява, безумоўна, даволі позняя, закліканая перамяніць аб'ект рэлігійнага ўшанавання язычнікаў. У Міжземнамор'і часоў позняга язычніцтва было вельмі распаўсюджана ўшанаванне *Мітры* (індаіранскае боства святла і сонца), галоўнае свята якога прыпадала на 25 снежня, між тым як Раство Хрыстова дакладнай даты не мела. Яно было прымеркавана да 25 снежня спецыяльна для таго, каб навазвернутыя хрысціяне не мелі магчымасці святкаваць нараджэнне Мітры.

Такім чынам, народны каляндар беларусаў яшчэ ў XIX ст. захоўваў выразны падзел на чатыры сезоны, якія супадалі з фазамі сонечнай актыўнасці, змены якіх (сонцавароты і раўнадзенствы) суправаджаліся, верагодна, двухтыднёвымі абрадавымі цыкламі. Завяршэнне адной і пачатак другой храналагічнай фазы, гэта значыць сітуацыя "часавага памежжа" ці перарывістасці паміж "старым" і "новым", адначасова азначала і прарыў мяжы паміж "гэтым" і "тым" светам, што прыводзіла да з'яўлення ў свеце людзей душ продкаў. Невыпадкова, што кожнай сонечнай перамене папярэднічаў абрад (рытуальная трапеза) у гонар дзядоў. Улетку – "Траецкія дзяды", увосень – "Стаўроўскія" (14.09/1.09), ушанаванне продкаў фіксуецца падчас вячэры на першую калядную куццю; моманту веснавога раўнадзенства папярэднічалі "дзяды масленічныя".

Празрыстасць (а то і адсутнасць) мяжы паміж "старым" і "новым", "сваім" і "чужым" вызначалі гэтыя храналагічныя прамежкі як патэнцыйна небяспечныя для чалавека ("крывыя" калядныя вечары, "крывы" масленічны і русальны тыдзень), калі звыклыя гаспадарчыя заняткі маглі прыводзіць да драматычных наступстваў (калецтваў, хваробаў, неўраджаю, засухі і г.д.), праз што праца ў гэты час была жорстка табуіравана. З другога боку, "разрыў" часава-прасторавай суцэльнасці, магчымасць звяртацца і ўзаемадзейнічаць са звышнатуральнымі сіламі выводзілі на першы план і рабілі эфектыўнымі дзеянні сімвалічнага, рытуальнага характару (знахарства, чарадзейства, варажба). Адсюль невыпадкова, што большасць выпадкаў чарадзейства супадала з найбольш значнымі каляндарнымі святамі (Калядамі, Купаллем, Вялікднём, Юр'ем, Тройцай і інш.), калі барацьба паміж сіламі дэструкцыі, хаосу і логасу (касмічным парадкам) была найбольш вострай.

Аднак, падзел астранамічнага года на чатыры роўнавялікія часткі паводле фаз сонечнай актыўнасці, як правіла, не супадаў з народнай хранаметрыяй зімы, вясны, лета і восені, якая грунтавалася на вопыце феналагічных назіранняў, кліматычных асаблівасцях розных рэгіёнаў Беларусі і адпаведна спецыфіцы аграрна-гаспадарчага цыклу. Так, напрыклад, пачаткам восені выступала свята Іллі (2.08/20.08), пасля якога пачыналі жніво і забаранялася купацца ў прыродных вадаёмах, а зіма пачыналася з прысвятка Міколы (19.12/6.12): "Да Міколы няма зімы ніколі". Пры гэтым, выразная мяжа паміж порамі года (уласцівая сучаснаму "друкаванаму" каляндару, калі 1 верасня – пачатак восені, 1 снежня – зімы і г.д.) адсутнічала, бо фінальная стадыя кожнага сезону ўжо ўтрымлівала ў сабе праявы наступнага, а пачатковая – яшчэ захоўвала адзнакі папярэдняга.

Структурную аснову беларускага народнага календара складала сістэма *святаў* (каляндарных абрадаў) і прысвяткаў. У светапоглядзе чалавека любой культуры (а традыцыйнай – найбольш) феномен свята займае надзвычай важнае месца, бо ў яго аснове заўсёды ляжыць пэўная і канкрэтная канцэпцыя прыроднага (касмічнага), біялагічнага і гістарычнага часу. Пры гэтым святы на ўсіх этапах свайго гістарычнага развіцця былі звязаныя з крызіснымі, пераломнымі момантамі ў жыцці прыроды, грамадства і чалавека. Негледзячы на тое, што большую частку беларускага народнага календара складалі святы намінальна хрысціянскія, само разуменне свята заставалася глыбока міфалагічным. Найперш гэта выяўлялася ў тым, што народнае свята з'яўляецца важнейшым момантам стабілізацыі Сусвету, перадолення крытычных (памежных) момантаў быцця ўсяго калектыву і служыць своеасаблівым касмічным мастком паміж "старым / чужым" і "новым / сваім" у часе і прасторы. Значная колькасць святаў, якія нават не згубілі сваіх язычніцкіх найменняў (Каляды, Грамніцы, Масленка, Камаедзіца, Вялікдзень, Купалле, Багач і інш.), не кажучы ўжо пра іх унутраную структуру, сутнасць і скіраванасць, гавораць пра тое, што беларускія народныя святы яшчэ ў XIX – першай палове XX ст. былі набліжаныя да так званых "прыродных" рытуалаў, якія ўводзілі быццё чалавека на касмічны ўзровень. Невыпадкова, што практычна ўсе царкоўныя святы маюць уласную народную інтэрпрэтацыю і прагматыку, шчыльна звязаны з усімі праблемамі і аспектамі сялянскай жыццядзейнасці. Так, прысвятак Аляксея (30.03/17.03) лічыўся днём рыбакоў, якія рабілі ў гэты дзень "абыдзёны", браднік, якім можна было налавіць шмат рыбы. Святы Улас (хрысціянскі заменнік язычніцкага бога жывёлы і багацця Велеса) выступаў як апякун скаціны, а прысвятак у яго гонар (24.02/11.02) называлі "каровіным свя-

там". Дзень святога Анціпы (24.04/11.04) святкавалі тыя, у каго балелі зубы, а таксама знахары, што замаўлялі зубны боль. Прысвятак святога Зосіма (30.04/17.04) шырока адзначалі пчаляры, а хворыя на вочы, у сваю чаргу, – прысвятак Лонгіна (29.10/16.10). Часам для прагматычнай сялянскай кваліфлкацыі свята хапала гукавых асацыяцыяў, якія былі выкліканыя яго найменнем. Напрыклад, Дзень аднаўлення Цараграду пасля землятрусу (24.05/11.05) сяляне святкавалі, каб градам не выбіла пасеваў, бо яны лічылі, што існуе Цар граду, які і кіруе гэтай атмасфернай праявай.

Сістэма святочнага часазлічэння беларусаў ў XIX – першай палове XX ст. адрознівалася ад прынцыпаў друкаванага календара і была заснаваная на тыднёвым і дзённым адліку адносна буйнейшых гадавых святаў (*гадавымі* лічыліся святы, што адзначаліся некалькі дзён: Каляды, Вялікдзень, Тройца). Да прыкладу, Саракі святкаваліся на 11 дзень пасля Калядаў, а Купалле – на 26 дзень. Акрамя таго, усе святы падзяляліся на *нерухомыя*, што мелі дакладную храналагічную прывязку і *рухомыя*, прымеркаваныя і суаднесеныя з часам святкавання Вялікдня (можа святкавацца *ў першую нядзелю пасля веснавога раўнадзенства і поўні*; храналагічна – у перыяд з 4 красавіка па 8 мая).

Ніжэй разгледзім найбольш знакавыя і адметныя святы (календарныя рытуалы) беларускай традыцыі.

*Каляды.* Сам тэрмін "Каляды" яшчэ дагэтуль канчаткова не патлумачаны. Шэраг версій трактуе яго, як найменне язычніцкага боства, але, найхутчэй, што паходзіць ён ад лацінскага "*Calendae*", – першыя дні месяца ў мясцовым календары рымлян. Храналагічна Каляды былі прымеркаваныя да зімовага сонцазвароту, калі Сонца нараджалася наноў, несучы на Зямлю святло і жыццятворнае цяпло, таму сімвалізм "пачатку" падаецца найбольш адпаведным.

Каляды, як пераходны, памежны перыяд паміж Старым і Новым гаспадарчым годам, з'яўляліся як бы "зонай надзвычайнай адказнасці" чалавечага калектыву. Кожная рэч і дзея ў гэты час набывала знакавы, рытуальны характар і магла непасрэдным чынам уплываць на будучае.

Пачатак, сярэдзіна і завяршэнне двухтыднёвых калядных святкаванняў адзначаліся адмысловым абрадавым застоллем – "Куццёй". Напярэдадні першай рытуальнай вячэры, што мела назву "Поснай" ці "Вялікай Куцці" (7.01/25.12), у кожнай хаце наводзілася чысціня, гаспадары мыліся ў лазні, што мусіла гарантаваць чысціню, парадак і здароўе на будучы год. Збожжа, прызначанае для сяўбы, ставілі ў рэшаце на покуць, дзеля павышэння ўрадлівасці. Гарантам атрымання "новай долі" для ўсяго роду з'яў-

лялася прысутнасць на каляднай вячэры ўсіх сямейных, дзе б яны датуль не былі. Калі ж, па нейкіх важных абставінах, хтосьці адсутнічаў, гаспадар адмыслова ўзгадваў яго імя, і такім чынам сімвалічна ўзнаўляў цэльнасць сям'і. Гаспадар запрашаў за святочны стол і Дзядоў, чыя прысутнасць была гарантам жыццёвай стабільнасці ўсяго роду. Адпаведнымі былі і паводзіны нашчадкаў перад "вечна жывымі": "Трэба трымаць сябе ціха, лагодна, з вялікаю пашанаю, каб не абразіць дзядоў", – лічылі беларусы.

Стравай, надзеленай надзвычай высокім рытуальным статусам, з'яўлялася *куцця* – крутая ячная каша. Варылася яна ў адмысловым гаршэчку і абавязкова з цэльных зярняткаў. Гэтая акалічнасць сведчыць, што куцця, як абрадавая страва, узнікла яшчэ ў часы неаліту, калі тэхналогія памолу адсутнічала. Менавіта куцця і сімвалізавала калектыўную (сямейную) долю (дабрабыт, шчасце), і таму пакаштаваць яе мусіў кожны. Нават прыгатаванне куцці насіла знакавы характар. Лічылася, што калі куцця "выпрэцца" з гаршчку ў печы, будзе добры ўраджай жыта. Частку куцці адкладалі продкам, а таксама частавалі ёю Мароза, каб той не спляжыў палеткі: "Мароз, Мароз! Хадзі куццю есці. Не хадзі па палях – будзе кій па нагах!" Дзеля павелічэння прыплоду і ўдойнасці рэшту куцці аддавалі свойскай жывёле.

Пасля першай Куцці па вёсцы пачыналі хадзіць *калядоўшчыкі*, якія сімвалізавалі прадстаўнікоў вышэйшага (боскага) свету, носьбітаў долі ўсяе грамады. Прыналежнасць да сакральнай сферы падкрэслівалася вобразамі, якія выяўлялі сабой *машкоўнікі* (раджаныя): каза (сімвал плоднасці і ўрадлівасці), Дзед-павадыр (увасабленне бога-продка), журавель ці бусел (як божая птушка). Неад'емным элементам калядоўшчыцкага гурта з'яўляўся механоша і музыкі (дудар, скрыпач, бубнар). Спевы-зычанні калядоўшчыкаў гаспадару, гаспадыні, іх дзецям успрымаліся не як простыя чалавечыя пажаданні, але, фактычна, як воля багоў. Апагеем рытуальнай дзеі з'яўлялася "смерць і ўваскрасанне казы". Спачатку, калі калядоўшчыкі былі запрошаныя ў хату, "каза" (чалавек, апрануты ў вывернуты кажух і адпаведную маску) пад прынукай Дзеда, пад спевы ды йгру музыкаў шалёна скакала, робячы хаатычныя, нязграбныя рухі, пасля чаго раптоўна "памірала", нерухома, падала долу. Яе "смерць" сімвалізавала смерць Старога году, канчаткова знясіленнага, пазбаўленага жыццёвай энергіі. У гэты момант гаспадары, каб "ажывіць казу", давалі дары (грошы, каўбасы, яйкі) калядоўшчыкам, што з'яўлялася ахвярай Багам за долю, дадзеную на Новы год:

"Там дзе каза ходзіць – там жыта родзіць,
Дзе каза нагой – там жыта капой!".

*Другая* (“Шчодрая”, “Ласая”) *Куцця*, што атрымала сваю назву ад вялікай колькасці скаромных страваў, каляндарна супадала са святкаваннем Новага году (14.01/31.12). Яшчэ загадзя гаспадар біў кормную свінню, “каб Каляда не гневалася, ды дала на ўсё добры ўраджай, а на гавядо добры прыплод”. Да нашага часу ў беларусаў захаваўся архаічны звычай варажбы па вантробах забітай ахвярнай жывёлы, што адпавядае гаруспіцыям Старажытнага Рыму. Так, калі кроў лілася моцна “будзе даждлівае лета, калі каса (селязёнка) даўгая – будзе даўгое лета, каса рэзка звужаецца да канца – удалымі будуць толькі першыя пасевы”.

Апоўначы на Шчодрую Куццю надзвычай актыўна варажылі. Асноўнай мэтай было прадвызначэнне асабістага лёсу чалавека (жыццё / смерць, замужжа / незамужжа) і ягонага дабрабыту (ураджай / няўрод, прыбытак / нястача). “Праўдзілі” гэтыя варожбы толькі ў межах будучага году. Апошнім калядным святам з’яўлялася *Трэцяя* (“Посная”, “Вадзяная”) *Куцця* (19.01/6.01), якая практычна супадала з вадохрышчам. Як і раней, клікалі на Куццю Мароз, расчытвалі прыродныя шыфры, каб вызначыць надвор’е падчас жніва.

Неад’емнай часткай беларускай народнай традыцыі з’яўляліся маладзёжныя забавы і ігрышчы, цэнтральнае месца сярод якіх належыць “Жаніцьбе Цярэшкі” – унікальнай абрадавай гульні, характэрнай для Падзвіння.

*Вадохрышча* (19.01/6.01), зімовае свята народнага календара, якое ў хрысціянскай традыцыі звязана з хрышчэннем Ісуса Хрыста на рацэ Ярдан. Аднак, у беларускай традыцыі Вадохрышча яскрава ўвасобіла дахрысціянскі культ вады, як ачышчальнай і жыццядайнай стыхіі. У гэты дзень у храмах асвячалі ваду, якую бралі ў бліжэйшых вадаёмах, прасякаючы палонкі ў выглядзе крыжа. На працягу ўсяго года гэтая вада захоўвала цудадзейную моц: яе давалі піць хворым, апырсквалі хатнюю жывёлу перад першым выганам у поле, садовыя дрэвы, каб вяліся пчолы і г.д. Лічылася, што на Вадохрышча чорт, які жыў дагэтуль у вадзе, уцякае з асвечаных вадаёмаў і перабіраецца на вярбу.

*Грамніцы, Стрэчанне* (2.02/15.01) – свята, якое ў сваім найменні адлюстравала язычніцкі культ бога Грамаўніка (Перуна). Другая назва свята – Стрэчанне – у народзе тлумачылася як сустрэча зімы з летам. Па стане надвор’я ў гэты дзень прадказвалі характар надыходзячых вясны і лета. Лічылася, што, калі на Грамніцы вялікі мароз, то снег паляжыць нядоўга, а лета будзе пагоднае і сухое; пацяпленне на Грамніцы сведчыла пра раннюю вясну (“Калі на Грамніцы певень нап’ецца вадзіцы, то на Юр’я вол

пад’есць травіцы”), аднак лета чакалася непагоднае і няўдалае на ўраджай (на Грамніцы адліга – з ураджаю будзе хвіга).

Асноўным абрадавым дзеяннем свята было асвячэнне ў храме “грамнічных свечак”, якія надзяляліся надзвычайнай магічнай сілай. З іх дапамогай ахоўвалі хаты ад навальніцы і маланкі (Перуна), засцерагаліся ад уздзеяння нячыстай сілы і ведзьмаў, пазбаўляліся ад розных хваробаў (ліхаманкі, сурокаў, упуду, каўтуна), дапамагалі пры цяжкіх родах і аблягчалі смяротную агонію.

*Масленіца* (Масленка, Сырніца) – архаічнае свята, звязанае з адраджэннем плодных сіл зямлі і культам Сонца. Галоўная скіраванасць абраду – праводзіны зімы, набліжэнне вясны (лета), забеспячэнне багатага ўраджаю і дабрабыту ў сям’і і гаспадарцы. Адзначалася на восьмым перадвялікодным тыдні, напярэдадні вялікага посту. У чацвер масленічнага тыдня (“Волас”, “Улас”) асабліва даглядалі хатнюю жывёлу, аб’язджалі коней і валоў, што з’яўляецца водгукам язычніцкага культа Воласа – бога-апекуна жывёлы. У гэты ж дзень моладзь гушкалася на арэлях, што мусіла магічным чынам паўплываць на рост лёну, каталася на санках з горак, спявала масленічныя песні, асноўная тэматыка якіх – аграрна-земляробчая і шлюбная. Хлопцам і дзяўчатам шлюбнага ўзросту, якія не паспелі пабрацца шлюбам да Масленіцы, на знак сімвалічнага пакарання (каб не засядзеліся ў бабылях ці старых дзеўках) вешалі маленькія драўляныя калодкі. Тыя ж, каб не цягаць калодку цэлы дзень, мусілі адкупіцца пачастункам. У нядзелю, на “запусты” (“запускі” на малочнае) гатавалі толькі малочныя стравы: сыр з маслам, тварог з малаком, смятанай, а таксама пяклі бліны, якія сваёй формай сімвалізавалі сонца.

*Саракі* (22.03/9.03) – царкоўнае свята ў гонар 40 хрысціянскіх пакутнікаў, у народным календары суаднесенае з пачаткам вясны і прылётам птушак. Лічылася, што ў гэты дзень прылятаюць жаваранкі, якія канчаткова замыкаюць зіму і адмыкаюць “вырай” (лета). Абрадавыя дзеянні ў гэты дзень грунтуюцца на магічным пераасэнсаванні лічбы 40. У гонар свята выпякалі з цеста 40 жаваронкаў, маладыя дзяўчаты разрывалі 40 нітак ці вяровачак, здымаючы сімвалічным чынам “зімовыя путы” з зямлі. Фігуруе гэтая лічба і ў прадказаннях надвор’я. Калі на Саракі здараўся мароз, меркавалі, што да сапраўднага цяпла яшчэ адбудзецца 40 замаразкаў.

У шмат якіх рэгіёнах Беларусі ў гэты дзень адбываўся абрад “*Гуканне вясны*”. Галоўнымі дзеючымі асобамі рытуала з’яўляліся дзяўчаты і хлопцы шлюбнага ўзросту, маладосць якіх адпавядала касмічнай маладосці ўсяго сусвету. На пагорках (гара, як увасабленне цэнтра свету, кропкі,

максімальна набліжанай да неба, сферы багоў), хлопцы раскладалі агонь са старых, непатрэбных рэчаў (сімвалізавалі знямоглую, старую зіму), а дзяўчаты спявалі загукальныя песні, закліканыя магічным чынам паспрыяць надыходу лета і абуджэнню жыццятворных сіл прыроды:

“Благаславі, Божа,
Вясну красну пеці
На ціхае лета,
На буйное жыта…”

*Дабравешчанне*, Звеставанне (7.04/25.03), адно з буйнейшых веснавых свят беларусаў, храналагічна набліжанае (як і Саракі) да моманту сонечнага раўнадзенства. Праваслаўная царква адзначала гэтае свята, як дзень зачацця Маці Божай Ісуса Хрыста, але ў народным усведамленні яно выступала, як урачыстасць абуджэння зямлі (пачатак новага палявога сезону) і прылёта бусла, які сімвалізаваў канчатковы надыход вясны. Лічылася, што чалавек, які першы ўбачыў “бацяна” у небе, на працягу года будзе мець шанцунак і спор у любой справе. У гэты дзень забараняліся любыя гаспадарчыя работы, бо яны маглі прывесці да пакарання з боку вышэйшых сіл – няўроду, засухі, градабою, падзежа жывёлы і г.д. Аднак, прадпрымаліся розныя сімвалічныя дзеянні, закліканыя станоўча ўплываць на гаспадарчы і жыццёвы дабрабыт сям’і. Так, напрыклад, гаспадыня імкнулася яшчэ да ўсходу Сонца пасадзіць расаду гародніны, каб тая “ўдалася”, дзеля пазбаўлення хаты ад “нечысці” (прусакоў, блох, вошай), старэйшая жанчына, калі яшчэ спалі ўсе сямейныя, павінна была пасыпаць падлогу (крыж-накрыж) дабравешчанскім снегам, а каб каршун не драў курэй, павесіць на плот старое кола.

Неўзабаве пасля Дабравешчання, адбываўся ўрачысты абрад першага заворвання. Гаспадар, апрануты ў святочную кашулю, заворваў тры першых баразны, пасля чаго ладзіў святочны абед непасрэдна на палетках, “частуючы” пры гэтым (закопваліся ў баразну яйка, хлеб, сыр) “маці-зямлю”.

*Вербніца* – апошняя нядзеля перад Вялікднём – веснавое свята ў гонар абуджэння вегетацыйных сіл прыроды, якое ўзыходзіць да язычніцкага культу раслiннасці. Галоўным аб’ектам і суб’ектам магічных дзеянняў у гэты дзень з’яўляліся галінкі вярбы – дрэва, што першым распускаецца пасля зімы. Пасля асвячэння ў царкве, галінкамі вярбы злегку сцябалі адзін аднаго з адпаведнымі заклёнамі: “Не я б’ю, вярба б’е, за тыдзень – Вялікдзень, будзь здароў, як вада, а расці, як вярба! Будзь здароў на ўвесь год! Шырока выкарыстоўваліся галінкі вярбы і ў народнай медыцыне: ад зубнога болю і ліхаманкі трэба было з’есці 9 вербных пупышак; ад нярвовых і

псіхічных хвароб абкурвалі дымам ад запаленых галінак, у якасці абярога, попелам ад іх абсыпалі дзіцячую калыску. Галінкі вярбы, уторкнутыя на ніве, засцерагалі палеткі ад градабою, а пакладзеныя за абразамі (на гарышчы хаты) – ад перуна і пажара.

*Вялікдзень* (Вялічка, Пасха), вялікае старажытнае свята ў гонар сонца, вясны, абуджэння прыроды і надыходу земляробчага сезону. Верагодна, што ў дахрысціянскую эпоху Вялікдзень з'яўляўся галоўным (дакладна фіксаваным) святам у межах двухтыднёвага цыклу (Саракі – Вялікдзень – Дабравешчанне), з якога пачынаўся новы каляндарны год. У хрысціянскай традыцыі Вялікдзень быў прымеркаваны да ўваскрасення Ісуса Хрыста і становіцца рухомым святам.

Яшчэ напярэдадні Вялікдня, у *Чысты чацвер*, адбывалася працэдура рытуальнага ачышчэння, абнаўлення свету людзей: кожная сем'я да ўзыходу сонца мылася ў лазні, прыбірала ў хаце і на падворку, каб у сядзібе на працягу года была чысціня і здароўе. Соль, асвечаная ў царкве ("Чацвярговая соль") лічылася надзвычай эфектыўным сродкам ад сурокаў і нячыстай сілы. Усё пасеянае ў Чысты чацвер у полі ці агародзе, мусіла вырасці "чыстым", без пустазелля.

Уласна Вялікдзень завяршаў самы працяглы і строгі сямітыднёвы пост і тым самым сімвалізаваў адраджэнне і буянне сусветнай жыццёвай энергіі. Невыпадкова, што абрадавы стол на гэтае свята (як і на Шчодрую куццю) быў самы багаты і разнастайны ў межах году. Усе стравы лічыліся "свячонымі" (святымі) і нават іх рэшткі не выкідваліся пасля застолля, бо з'яўляліся дзейсным абярогам ад розных няшчасцяў (косткі ад мясных страў, напрыклад, закопвалі на раллі, каб град не пабіў палеткі). Найбольш сакралізаваным было стаўленне да вялікоднага яйка, фарбаванага ў чырвоны колер, – неад'емнага атрыбута свята. Як у беларусаў, так і ў іншых індаеўрапейскіх народаў, яйка сімвалічна ўвасабляла навароджаны сусвет, першакрыніцу жыцця, ідэю плоднасці і ўрадлівасці. Чырвоны колер (колер крыві, як субстанцыі ўсяго жывога) толькі ўзмацняў гэтыя значэнні. Яйкі асвячалі ў царкве, што надавала ім яшчэ большую магічную сілу. Вялікоднае яйка клалі ў ваду, калі ўмываліся, "каб быць румяным і здаровым увесь год", яно лічылася дзейсным абярогам ад пажару, дзеля чаго захоўвалася за абразамі. Шалупінне ад яек клалі ў збожжа, прызначанае для сяўбы, каб ураджай быў багаты.

Рытуальны характар мела і гульня з яйкамі – "*біткі*" (параўнай – разбіццё Сусветнага яйка ў індаеўрапейскай міфалогіі = нараджэнне Сусвету), якая з'яўлялася прэрагатывай дзяцей і падлеткаў, што, у сацыяльным плане, самі сімвалізавалі новае, абноўленае, маладое жыццё.

Унікальнай адметнасцю беларускай вялікоднай традыцыі, якая не мае аналагаў у суседніх народаў, з'яўляецца *валачобны абрад*, найбольш пашыраны на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. На Вялікдзень мужчыны і хлопцы (жанчынам забаранялася) збіраліся ў вялікія (10 – 15 чалавек) гурты валачобнікаў, якія ўвасаблялі "гасцей з Божага свету", "з самага раю". Сярод іх абавязкова прысутнічаў механоша, зачынальнік, падхватчыкі і музыкі (дудар, скрыпач, бубнар, пазней – гарманіст). Валачобнікі абыходзілі ўсе двары вёскі (ці некалькіх суседніх), спыняючыся пад вокнамі кожнай хаты, дзе спявалі абрадавыя песні, пераважна велічальнага зместу, услаўляючы гаспадара, яго руплівую працу, жадалі яму ўраджаю на ніве, прыплоду ў хляве, дабрабыту ў сям'і:

"Ой, жыві здароў і будзь багат
І з жаною маладою,
І з дзеткамі наймілейшымі,
І з брацелямі найкраўнейшымі,
І з суседзямі найбліжэйшымі.
Будзь здароў, як крынічная вада,
Будзь вясёл, як хароша вясна,
Будзь багаты, як сырая зямля."

*Радаўніца* (Радуніцкія Дзяды, Вялікдзень мёртвых) – язычніцкае веснавое свята, звязанае з культам продкаў, дзень памінання памерлых. Адзначалася ў праваслаўных на дзевяты дзень пасля Вялікдня, у аўторак на Фаміным тыдні, непасрэдна на могілках. Назва свята, найхутчэй, паходзіць ад літоўскіх слоў *rauda* "плач з галашэннем", *raudine* "малітва з плачам і галашэннем па памерлых", што сведчыць пра балта-славянскія вытокі абрада.

На Радаўніцу кожная сям'я ішла памінаць родзічаў спачатку ў царкву, а потым на могілкі, дзе прыводзілі ў парадак магілы блізкіх. Сваякі рассцілалі на насыпе абрус і пачыналі памінальную трапезу, якая нагадвала старажытную язычніцкую трызну. Частку абрадавых страў (бліны, яйкі, сыр, куцця і інш.) і гарэлкі пакідалі "для мёртвых". Вялікоднае яйка на магілу клалі як магічны сродак. Лічылася, што такім чынам можна часова ажывіць памерлых, выклікаць іх душы на "гэты" свет. У размовах успаміналі нябожчыкаў, часта гучалі галашэнні. Рэшту памінальных страў раздавалі жабракам, каб тыя маліліся за памерлых.

*Юр'я* (Юрай, Ягор'я), старажытныя святы народнага календара (адзначаліся 6.05/23.04 і 9.12/26.11) у гонар святога – заступніка свойскай жывёлы і сялянскай нівы. У хрысціянскую эпоху святому Георгію-пераможцу былі нададзены функцыі такога язычніцкага боства як Ярыла. Адначасова з апякунствам жывёлы Юр'я лічыўся валадаром ваўкоў. У народзе ўяўлялі,

што Юр'я едзе на белым кані і замыкае пашчы драпежнікам, альбо вызначае дакладную колькасць скаціны, на якую могуць паляваць ваўкі.

На Юр'я веснавога сяляне з песнямі і ахвярнымі стравамі выходзілі аглядаць свае зарунелыя палеткі, спраўлялі рытуал першага выгану жывёлы на пашу. Статак кароў імкнуліся выгнаць зарань, на цудадзейную ("Юраўскую") расу, якая павінна была забяспечыць добрую малочнасць. Перад выганам жывёлы гаспадар тройчы абыходзіў яе з запаленай грамнічнай свечкай; апырскваў асвечанаю вадою і абкурваў падпаленымі купальскімі зёлкамі, каб прадухіліць сурокі і розную псоту з боку чараўнікоў. Дзеля засцярогі жывёлы ад ваўкоў, у варотах сядзібы, пры яе прагоне, клалі замкнуты замок, а таксама ніты ад кроснаў – ад укусу змяі. Адначасова звярталіся непасрэдна да святога Юр'я з адмысловымі замовамі: "Святы Юр'я – Ягор'я, памажыце вы мне маю скаціну адратаваць". Пры "агледзінах" палеткаў спявалі абрадавыя "Юраўскія" песні:

"Юр'я, Юр'я, Божа мой!
Падай ключы зямлю адмыкаць,
Бычка напасаць!".

*Сёмуха* (Тройца, Зялёныя святкі), старажытнае свята, звязанае з культам расліннасці, ушанаваннем продкаў і, магчыма, з дзявоцкімі ініцыяцыямі; заключны каляндарны рытуал веснавога цыкла. Адзначалася на сёмы ("русальны") тыдзень пасля Вялікдня (адсюль і назва). Напярэдадні Сёмухі, у суботу, прыбіралі магілы памерлых сваякоў і спраўлялі Траецкія (стаўроўскія) Дзяды. У часе свята хату і падворак абавязкова аздаблялі "*маем*" – галінкамі бярозы, клёну, рабіны ці сцяблінамі аеру. "Май" служыў, як магічнай абаронай ад злых сіл, так і сродкам прадуцыравання жыццёвых сіл прыроды на ўсю сям'ю і гаспадарку. Так, напрыклад, вянкі з "маю" накідвалі на рогі каровам, каб павялічыць іх удойнасць і засцерагчы ад чарадзейства.

Ва ўсходняй і цэнтральнай частцы Беларусі на Сёмуху адбываўся абрад *кумавання*, калі дзяўчаты ішлі ў лес, звязвалі ("завівалі") жывыя галінкі бяроз у вянкі, пад якімі праходзілі тры разы ўзад і ўперад, спяваючы песні пра ўсталяванне сяброўскіх адносін. У старажытнасці гэты абрад сімвалізаваў наступленне паўналецця, дасягненне дзяўчынай шлюбнага ўзросту, пераход яе ў стан дарослага члена вясковай грамады і меў значэнне полаўзроставай ініцыяцыі. Разам з тым абрад меў і выразную аграрную прагматыку, злучаную з ідэяй жаночага пачатку і ўрадлівасці. Бярозкі завівалі:

"На годы добрыя, на жыта густое,
На ячмень каласісты, на авёс расісты,
На грачыху чорную, на капусту белую".

У хрысціянскай традыцыі, малазразумелай простаму народу, свята Тройцы прысвечана сашэсцю на апосталаў трыадзінага Бога (Бога-Бацькі, Бога-Сына і Бога-Святога Духа), якое нібыта адбылося на 50 дзён пасля ўваскрашэння Хрыста і натхніла апосталаў на місіянерскую дзейнасць.

*Купала*, Купалле, Іван, Ян (7.07/24.06), адно з буйнейшых і галоўных язычніцкіх святаў народнага календара беларусаў, прымеркаванае да летняга сонцастаяння – моманту найвышэйшага росквіту жыццятворных сіл Сусвету. На Купалле адбывалася своеасаблівае ўзаемапранікненне свету Прыроды і свету Культуры, “размыванне” межаў і адрозненняў паміж імі. Адсюль шырокараспаўсюджанае ў беларусаў ўяўленне пра тое, што ў Купальскую ноч звяры і птушкі, дрэвы і кветкі пачынаюць размаўляць паміж сабою, пераходзяць з месца на месца, вада апоўначы становіцца гаючай і цудадзейнай, скарбы, схаваныя ў зямлі, выходзяць на паверхню, каб “прасушыцца”, і свецяцца агеньчыкамі. У той жа час, і чалавек можа атрымаць надзвычайныя, касмічныя веды (стаць моцным знахарам, варажбітам, вяшчуном; разумець мову звяроў і раслін), дзеля чаго мусіць знайсці і сарваць апоўначы чароўную купальскую кветку папараці.

Уласна купальскі абрад ўяўляў сабой складаны комплекс рытуальна-магічных дзеянняў, сярод якіх можна вылучыць некалькі асноўных этапаў:

– *Збор купальскіх зёлак.* Раніцай (6.07/23.06), да ўзыходу сонца (верылі, што гаючыя сілы раслін найбольшыя датуль, калі расу яшчэ не высушыла сонца) жанчыны і дзяўчаты збіралі на лугах і ў лесе кветкі і травы (рута, святаянік, васілёк, браткі, рамонкі, купалкі і шмат іншых), якія надзяляліся вельмі моцнымі лекавымі і ахоўнымі ўласцівасцямі і захоўваліся на працягу года. Пры гэтым, у час іх збірання абавязкова спявалі купальскія песні, бо, лічылася, што іначай зёлкі не будуць мець гаючай сілы, нават пасля асвячэння іх у царкве.

– *Распальванне Купальскага вогнішча* – цэнтральны акт рытуалу, які адбываўся позна ўвечары на месцах, што ў міфалагічным разуменні ўвасаблялі Цэнтр Свету, – узвышшах, пагорках, высокіх берагах рэк ці азёр. Матэрыял для вогнішча рыхтавалі загадзя. Моладзь адусюль збірала розную “старызну” (паламаныя агароджы, бочкі, колы, дзеркачы і да т.п.), што сімвалізавала ўсё “нячыстае” (хваробы, няшчасці, чары). Купальскі агонь лічыўся святым і “жывым”, даваным людзям самім Богам:

> “Сягоння ў нас Купала,
> Не дзеўка агонь клала,
> Сам Бог агонь раскладаў,
> Усіх святых да сябе зваў”.

Невыпадкова, што здабывалі агонь найбольш паважаныя мужчыны вёскі, высякаючы яго крамянём і крэсівам ці з дапамогай двух кавалкаў дрэва. Купальскі агонь усведамляўся як універсальная ачышчальная і прадукцыйная стыхія. Над ім прасушвалі сарочкі хворых, да яго падносілі дзяцей, што занядужалі. У якасці ахвяры жанчыны кідалі ў полымя пучкі лёну са словамі: “Зарадзі лён”, а бяздзетныя кабеты прыгаворвалі пры гэтым: “Пладзіцеся дзеці”. Агульнараспаўсюджаным звычаем былі скокі моладзі цераз купальскае вогнішча з тым, каб абараніць сябе ад нячыстай сілы, чараў і хваробаў. Вуглі, попел, галавешкі вогнішча выкарыстоўваліся як магічны сродак павышэння ўрадлівасці: іх раскідвалі па палетках, садах і агародах.

– *Выяўленне і пакаранне (запалохванне) ведзьмаў*. Паводле народных уяўленняў, найбольшую шкаданосную актыўнасць ведзьмы выяўляюць менавіта ў Купальскую ноч: адбіраюць малако ў кароў, шкодзяць на людзей і скаціну, лётаюць на шабаш і г.д. Таму людзі ў гэту ноч не толькі абярагалі сваю гаспадарку ад іх (клалі на парогі хлявоў і хат расліны-апатрапеі: крапіву, дзядоўнік, падвешвалі грамнічную свечку над уваходам і інш.), але імкнуліся іх высачыць, распазнаць і абясшкодзіць. Дзеля гэтага, напрыклад, кіпяцілі на купальскім вогнішчы ваду, у якой варылі цадзілку (палатно для працэжвання малака) з уторкнутымі ў яе іголкамі. Лічылася, што гэта прычыняе малочнай ведзьме нясцерпны боль і яна сама прыйдзе да агню прасіць літасці. Увасабленнем ведзьмы лічыліся жабы, мышы, каты, заўважаныя каля купальскага вогнішча, якіх альбо кідалі ў агонь, альбо нявечылі (лічылі, што аналагічнае калецтва на раніцу праявіцца ў ведзьмы).

– *Маладзёжныя бясчынствы* – форма рытуальных паводзінаў (“антыпаводзінаў”), якія маглі заключацца ў таемным вывазе з падворкаў прылад працы (барон, сох), транспартных сродкаў (калёсаў, саней), зацягванне іх на дах, дрэвы; падпіранні, замыканні дзвярэй, перагароджванні вуліц і да т.п. Дэструктыўны харатар, час і месца здяйсняемых дзеянняў, а таксама тыповыя матывіроўкі (адагнаць, напалохаць ведзьму, заступіць шлях нячыстай сіле да хат і падворкаў) набліжаюць маладзёжныя бясчынствы да іншых абрадаў выгнання і знішчэння нячыстай сілы.

– *Абрадавае купанне. Сустрэча сонца*. Пад раніцу хлопцы і дзяўчаты купаліся ў адкрытых вадаёмах ці качаліся ў жыце па купальскай расе, што сімвалізавала ачышчэнне і набыццё жыццятворнай энергіі. Асабліва ўрачыста сустракалі ўзыход сонца, якое ў гэты дзень “*іграла*” – рассыпалася на асобныя кругі, ізноў сыходзілася, пералівалася markup рознымі колерамі.

– *Варажба* на Купалле мела мэтай прадвызначэнне асабістай долі чалавека ў межах будучага году. Дзяўчаты варажылі (на ростанях, з дапамогай вянкоў на вадзе) на замужжа і суджанага, больш сталыя людзі – на ўласнае здароўе.

Як найбольш урачыстае, эмацыйнае і абрадава-разгорнутае дзейства, Купалле было і застаецца дагэтуль адным з найбольш любімых святаў ва ўсіх кутках Беларусі. У сучасную эпоху шматлікія фальклорныя суполкі і гурты беларускай моладзі (“Княжыч”, Наваполацк; “Гуда”, Мінск і інш.) паспяхова адраджаюць аўтэнтычныя формы старажытнага свята, пазбаўленыя псеўданародных элементаў і штучных скажэнняў.

*Ілля* (2.08/20.08), царкоўнае свята ў гонар прарока Іллі, які ў беларускай народнай традыцыі выступаў як апякун земляробства і абаронца ад нячыстай сілы і ўвабраў у сябе рысы язычніцкага бога Перуна. Паколькі Ілля лічыўся распарадчыкам навальніц і дажджоў, то свята ў яго гонар адзначалі паўсюдна на Беларусі. У гэты дзень забараняліся розныя віды гаспадарчых і хатніх работ (касьба, вываз сена, жніва, а таксама сцірка бялізны), бо, у зваротным выпадку Ілля мог пакараць вёску ці асобнага гаспадара моцнай навальніцай, ураганам, пажарам ад маланкі.

Дзень Іллі лічыўся каляндарнай мяжой паміж летам і восенню, пачаткам жніва: “Ілля жніво пачынае, а лета канчае”. Пасля гэтага свята забаранялася купацца ў адкрытых вадаёмах, бо верылі, што чэрці, ратуючыся ад маланак (“перуновых стрэл”) Іллі, хаваюцца ў азёрах і рэках.

*Багач*, Раство Божай маці (21.09/8.09), старажытнае земляробчае свята заканчэння ўборкі зерневых, якое, верагодна, адлюстравала язычніцкі культ Дажбога – сонечнага боства, падацеля і размеркавальніка дабротаў, што вынікае з храналагічнай набліжанасці свята да восеньскага раўнадзенства.

“Багачом” называлі лубок з жытам, у сярэдзіну якога ўстаўлялася свечка. Жыта для “Багача” зносілі жыхары ўсёй вёскі. Над ім служыў спецыяльную службу святар, пасля чаго лубок з жытам і запаленай свечкай у суправаджэнні ўсіх жыхароў абносіўся па ўсёй вёсцы і вакол статка. Затым удзельнікі абраду ішлі да хаты, дзе “Багач” мусіў захоўвацца да наступнага году. Відавочнай з’яўляецца магічная скіраванасць рытуалу на захаванне дабрабыту, ураджайнасці, плоднасці жывёлы, сямейнага ладу.

*Узвіжанне*, Уздзвіжанне Крыжа Гасподня (27.09/14.09), свята суаднесенае ў народным календары з восеньскім раўнадзенствам і замыканнем на зіму “*выраю*” (райскай цёплай краіны, дзе знаходзіцца Сусветнае дрэва), куды адляталі ў гэты дзень птушкі і перамяшчаліся змеі (займалі месцы, адпаведна, у кроне і каранях Сусветнага дрэва). Лічылася, што на Узвіжан-

не сонца “іграе” на небе ў апошні раз. Шырокараспаўсюджанай была легенда, што ў гэты час чалавек можа сустрэць у лесе змяінае шэсце, якое ўзначальвае Цар-змей з залатой каронай на галаве. Праявіўшы пашану (разаслаўшы ручнік з хлебам-соллю), можна было атрымаць ад валадара змей ражок з яго кароны, што давала чалавеку надзвычайную мудрасць і імунітэт ад змяіных укусаў.

*Пакроў* (14.1/1.10), межавая дата ў народным і працоўным календары беларусаў. Свята сфарміравалася ў сувязі з завяршэннем восеньскага цыкла гаспадарчых работ і перамяшчэннем вытворчай дзейнасці з сферы прыроды (палеткі, пашы) ў сферу культуры (хата, сядзіба).

Пакроў разумеўся як прадвесце зімы і пачатак вясельнага сезону (“Вялікай вясельніцы”), што выключна адлюстравана ў народнай прымаўцы: “Святы Пакроў накрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам, рыбу луской, дрэва карой, птаху пяром, дзеўку чапцом”.

### 5.3. Беларускі традыцыйны фальклор

Тэрмін фальклор (англ. “*folklore*” – народныя веды, народная мудрасць) з’яўляецца міжнародным і, у шырокім сэнсе, абазначае народную культуру ў розным аб’ёме яе відаў. У айчыннай навуцы пераважае разуменне *фальклора, як комплекса славесных, славесна-музычных, музычна-харэаграфічных, гульлёвых і драматычных відаў народнай творчасці.*

Беларускі традыцыйны фальклор з’яўляецца важнейшай часткай нацыянальнай духоўнай культуры беларускага народа, што аб’ядноўвае паэтычнае, музычнае, драматычнае, харэаграфічнае, дэкаратыўна-прыкладнае, народнае выяўленчае мастацтва. Паводле старажытнасці, разнастайнасці і багацця форм і жанраў, беларускі фальклор з’яўляецца неад’емнай і непаўторнай часткай сусветнай культурнай спадчыны.

У фальклоры беларусаў прадстаўлены ўсе асноўныя віды і жанры, вядомыя і іншым еўрапейскім народам: абрадавая паэзія, замовы, народная проза, песенная лірыка, балады, прымаўкі і прыказкі, загадкі, народны тэатр, прыпеўкі, інструментальная музыка. Пры гэтым у ім захавалася шмат архаічных з’яваў, што былі страчаны іншымі народамі ці невядомыя ім (Валачобныя песні, калядная гульня “Жаніцьба Цярэшкі”, абрадава-песеннае дзейства “Пахаванне стралы” і “Ваджэнне куста”).

Ніжэй ахарактаразуем асноўныя жанры беларускага фальклору.

– *Замовы*, рытмічна арганізаваныя творы формульнага характару, якім надавалася сіла магічнага ўздзеяння для дасягнення розных практычных мэтаў; адзін з самых архаічных жанраў беларускага фальклору. Утылітарная накіраванасць замоў ляжыць у аснове іх класіфікацыі. Замовы выкарыстоўваліся ў гаспадарчай, асабістай, сацыяльнай сферах, практычна ва ўсіх выпадках жыцця. Адсюль іх падзел на *прамысловыя* (гаспадарчыя), *лячэбныя*, *любоўныя* і *сацыяльна-пабытовыя*. Найбольш старажытнымі з'яўляюцца прамысловыя і лекавыя замовы, у якіх адлюстравана ўшанаванне вады, дрэў, агню, лесавіка, хатніка і ахвярапрынашэнні ім. Уплыў хрысціянства на структуру і сутнасць замоў з'яўляецца чыста намінальным (увядзенне біблейскіх персанажаў). У наш час, у вясковым асяродку, замовы (пераважна лекавыя) працягваюць бытаваць, не страціўшы свайго функцыянальнага прызначэння.

– *Абрадавы фальклор* – сукупнасць розных жанраў народнай творчасці (песні, танцы, музыка), якія суправаджалі традыцыйныя рытуалы беларусаў; падзяляецца на каляндарна- і сямейна-абрадавы фальклор.

*Фальклор каляндарна-абрадавы* – комплекс славесных, песенных, гульнёвых і іншых жанраў, звязаных з рытуаламі каляндарнага цыклу, што былі неад'емнай часткай жыцця і гаспадарчай дзейнасці земляроба на працягу года. Каляндарна-абрадавы фальклор беларусаў канцэнтраваўся ў асноўным вакол старажытных аграрных святаў і генетычна ўзыходзіць да эпохі славянскай і, нават, індаеўрапейскай агульнасці. Назіранні за астранамічнымі з'явамі, зменамі ў прыродзе, феналагічнымі цыкламі раслін і фізіялагічнымі цыкламі жыцця яшчэ ў пракаветныя часы склаліся ў цэльную міфалагічную карціну Свету, што знайшло сваё адлюстраванне ў каляндарна-абрадавым фальклоры. З дапамогай рытуалаў і абрадавых песень, якія мелі заклінальна-магічны характар, чалавек імкнуўся ўплываць на Сусвет з мэтай забеспячэння аптымальнага жыццяладу (ураджаю, здароўя, працягу рода). Сярод каляндарна-абрадавых песняў, адпаведна сезонам года, можам вылучыць наступныя:

– *зіма*: калядныя (з імі змыкаюцца піліпаўскія і песні рытуальных ігрышчаў – "Яшчара", "Жаніцьбы Цярэшкі");

– *вясна*: масленічныя, загукальныя, юраўскія, вялікодныя, мікольскія, русальныя, траецкія, песні абрадавых карагодаў "Пахаванне стралы" і "Ваджэнне куста");

– *лета*: купальскія і пятроўскія;

– *восень*: жніўныя, ільнаробчыя, талочныя (апошнія бытавалі і ў межах летне-веснавога сезону).

*Фальклор сямейна-абрадавы* – адзін з важнейшых відаў абрадавай народнай творчасці беларусаў, які мае сваю сістэму жанраў, арганічна звязаных з пэўнымі рытуаламі сямейнага цыклу. Сямейна-абрадавы фальклор генетычна звязаны з язычніцкім культам продкаў і анімістычнымі вераваннямі. Яго дамінантнай функцыяй была ўтылітарна-магічная, якая мусіла забяспечыць чалавеку аптымальную жыццёвую долю, як на "гэтым", так і на "тым" свеце. Адпаведна з трыма асноўнымі рытуаламі, вылучаюць *радзінны*, *вясельны* і *пахавальны* (галашэнні) фальклор.

– *Празаічныя жанры фальклору* падзяляюцца на *казачныя* (небыліцы, анекдоты, уласна казкі) і *неказачныя* (легенды, паданні, былічкі, бывальшчыны).

*Казка* – адзін адзін з асноўных відаў вуснай народнай прозы. Ад іншых вусных аповядаў, што паведамляюцца з інфарматыўнымі мэтамі, казку адрознівае арыентацыя на выдумку – іх расказваюць для забавы і павучання. Вылучаюць тры асноўных разнавіднасці казак: *пра жывёл, чарадзейныя, сацыяльна-пабытовыя.* Найбольш старажытнымі з'яўляюцца чарадзейныя казкі, матывы і сюжэты якіх могуць быць патлумачаны ў святле рытуальна-міфалагічнай семантыкі. Але, як непраўдзівая проза, казка магла скласціся толькі ў часы разлажэння першабытна-абшчыннага ладу, калі найбольш архаічныя пласты міфалогіі ўжо рабіліся матэрыялам для мастацкай выдумкі. Разам з тым, казкі адлюстроўваюць спецыфіку міфалагічнага мыслення і светаўспрыняцця.

– *Небыліцы* – творы рознай жанравай прыналежнасці, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць з наўмысным парушэннем храналагічнай паслядоўнасці падзеяў, падставова-выніковых сувязяў і гэтак далей і ствараюць поўную недарэчнасцяў мастацкую карціну свету.

– *Анекдот* (грэц. "*anekdotos*" – невыданы, неапублікаваны) – невялікае аднаэпізоднае апавяданне пра надзвычайную падзею, сітуацыю, рысы характара чалавека ці яго праступак, якое завяршаецца камічнай развязкай. Асноўны змест анекдотаў часта схаваны і дамысліваецца слухачом. Асабліва вялікай папулярнасцю ў беларусаў карысталіся анекдоты сацыяльна-пабытовага зместу ("пра папа", "пана"), а таксама пра вядомых гістарычных дзеячоў

– *Легенда* (лац. "*legenda*" – тэкст, прызначаны для чытання) – празаічны твор, які фантастычна асэнсоўвае (на аснове міфалагічных поглядаў) падзеі, што маюць адносіны да прыродных, сацыяльных і сакральных з'яў і

аб’ектаў. Легенда ўспрымаецца апавядальнікам і слухачамі як праўдзівае паведамленне. Вылучаюць *касмаганічныя* (пра стварэнне сусвету і яго частак), *тапанімічныя* (пра ўзнікненне паселішчаў, урочышчаў, азёр і г.д.), *этыялагічныя* (пра з’яўленне розных жывёл, раслін, сацыяльных інстытутаў, норм і звычаяў), *этнаганічныя* (пра паходжанне народа ці паасобных яго частак) і іншыя легенды.

– *Паданне* – вусны празаічны твор пра рэальныя падзеі ці асобаў мінуўшчыны альбо рэальна-магчымых, альбо несумненна прыдуманых. Паданне з’яўляецца часткай народнай традыцыі і таму не зыходзіць непасрэдна ад сведкі ці ўдзельніка падзей. Доля міфалагічных кампанентаў у паданнях значна меншая, чым у легендах. Найбольш распаўсюджаныя віды – паданняў – *гістарычнае* і *мясцовае* (прадметам з’яўляюцца падзеі і персанажы лакальнага значэння). Легендарнымі называюць тыя паданні, што арыентуюцца на ірацыянальнае светаўспрыняцце, абумоўленае архаічнымі вераваннямі народа.

– *Былічка* – вуснае апавяданне-*мемарат* (успамін) пра надзвычайныя падзеі: сустрэчы, сутыкненні самаго апавядальніка ці яго знаёмца з міфічнымі істотамі (чортам, лесавіком, хатнікам, лазнікам, русалкай і інш.), пярэваратнямі (ваўкалакам, вупыром), чараўнікамі, ведзьмамі, а таксама з Богам і святымі.

– *Бывальшчына* – вуснае апавяданне, якое па змесце нагадвае былічку, аднак расказваецца не ад першай, а, як правіла, ад трэцяй асобы, гэта значыць з’яўляецца не мемаратам, а *фабулатам* (аповяд, заснаваны на рэальных падзеях і жыццёвых назіраннях, які не з’яўляецца іх непасрэдным адлюстраваннем).

– *Балада* – працяглая (“доўгая”) песня ліра-эпічнага характару з драматычна напружаным і разгорнутым сюжэтам; адметны жанр беларускага фальклору. У адрозненне ад рускіх і ўкраінскіх, значная частка беларускіх балад належыць да рытуалаў каляндарнага цыклу (балады веснавыя, юраўскія, купальскія, восеньскія, піліпаўскія і інш.). У некаторых сюжэтах знайшлі адлюстраванне асаблівасці міфалагічных пластоў культуры (матыў пазбегнутага інцэсту, закляцця, магічных метамарфоз, чарадзейства і інш.). Тыповымі для бяседных балад з’яўляюцца сюжэты пра змеяборца Юр’я, малойца, забітага перуном, нявернасць жонкі мужу-ваяру, суперніцтва ў каханні двух братоў, забойства свякроўю нялюбай нявесткі. Асобнае месца займаюць *гістарычныя* балады, дзе адлюстравана барацьба беларусаў супраць іншаземных захопнікаў.

*Пазаабрадавы фальклор* вылучае такія жанры, як песні пра каханне, сямейна-бытавыя, сацыяльна-бытавыя, сатырычныя і гумарыстычныя. У лірычных *любоўных* песнях паэтызуецца каханне, шчырыя пачуцці паміж дзяўчынай і хлопцам, асуджаецца здрада і лёгкадумнасць у адносінах паміж паламі.

У *сямейна-бытавых* песнях паказвалася цяжкая доля замужняй жанчыны, гаротнае жыццё з нялюбым чалавекам, цяжкая праца, здзекі мужа і яго бацькоў. *Сацыяльна-бытавыя* песні ўключаюць салдацкія, рэкруцкія, казацкія, чумацкія, батрацкія, прымацкія і інш. У іх гучаў пратэст супраць сацыяльнай няроўнасці, рэкруцкага набору, салдацкай муштры, прыгнёту паноў, паказваўся незайздросны лёс прымакоў. Барацьба беларускага і ўкраінскага народаў супраць нацыянальна-рэлігійнага і сацыяльнага прыгнёту адлюстраваны ў *казацкіх* песнях. У *сатырычных* песнях беларусы кпілі і высмейвалі маральна-этычныя хібы і звычаі іншых этна-культурных (габрэі, цыгане і інш.) і сацыяльных (паны, святары) груп. У *гумарыстычных* песнях, як правіла, іранізавалі над хібамі і заганамі (сквапнасць, шаляпаватасць, лёгкавернасць, гультайства) простых людзей.

– *Малыя жанры фальклору* прадстаўлены *прыказкамі* (кароткі ўстойлівы выраз, які ў завершанай і сціслай форме абагульняе тыповыя з’явы жыцця, характаразуе іх і дае практычныя парады: “Папу і дзяку не вер як сабаку”, “Пост – не мост: аб’ехаць можна”), *прымаўкамі* (устойлівае выслоўе, якое вобразна і эмацыйна характаразуе пэўную з’яву ці асобу, але толькі ў дадзеным, канкрэтным выпадку: “Каму здалося, а мне збылося”, “От рвануў, аж пяткі заблішчэлі”), *загадкамі*, *трапнымі выразамі*, *віншаваннямі*, *звычаямі*, *праклёнамі*, *бажбой* і іншымі выслоўямі.

– *Дзіцячы фальклор* – сукупнасць розных жанраў, аб’яднаных прызначанасцю дзецям і падлеткам, а таксама творчасць уласна дзяцей. Да дзіцячага фальклору адносяць калыханкі, забаўлянкі, дзіцячыя песенькі, заклічкі, дражнілкі, лічылкі, гульні. З маленства гэтыя творы аказвалі значны ўплыў на духоўнае жыццё дзяцей, фарміравалі іх мастацкія густы, сістэму жыццёвых і светапоглядных каштоўнасцяў.

*Музычна-харэаграфічнае мастацтва* (фальклор) з’яўляецца неад’емнай часткай традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, што генетычна ўзыходзіць да эпохі першабытнасці і адлюстроўвае эстэтычныя прынцыпы светаўспрыняцця народа.

Паколькі песенны фальклор быў ахарактаразаваны вышэй, звернем увагу на *інструментальную музыку*.

Будучы знітаваным з самымі рознымі сферамі народнага жыцця (працай, каляндарнай і сямейнай абраднасцю, звычаямі, адпачынкам), перадаючы багатыя ў сваіх адценнях пачуцці народа, інструментальны фальклор з'яўляецца выразнікам пазітыўнага, аптымістычнага светаадчування, носьбітам і ўзбуджальнікам абрадава-урачыстага і вясёлага настрою, але разам з тым можа выконваць сігнальныя, інфармацыйныя, засцерагальныя і магічныя функцыі. Для выканання найгрышаў беларусы выкарыстоўвалі розныя тыпы музычных інструментаў, якія можна падзяліць на некалькі катэгорый:

– *самагучальныя інструменты* (калатушка, лыжкі, клякоткі, звон, талеркі, рагулька, кляшчотка, бразготка, шархуны, варган і інш.);

– *мембранныя інструменты* (бубен, барабан, грэбень);

– *духавыя інструменты* (пуга, ліст дрэва, карынка, дудка шчылінная, берасцянка, пішчалка, жужалка, дудка, гармонік, свісцёлка, акарына, жалейка, дуда, труба, рог);

– *струнныя інструменты* (бандурка, цытра, цымбалы, ліра колавая, скрыпка, басэтля).

Інструментальны фальклор быў цесна звязаны з рознымі відамі народнай творчасці (песенным, харэаграфічным, вусна-паэтычным тэатрам), ахоплівае найгрышы, разнастайныя паводле сваіх вытокаў, вобразна-эмацыйнага зместу і стылістыкі, прызначэння і форм бытавання. У залежнасці ад сувязі найгрышаў з першапачатковымі жанравымі вытокамі – сігнальнасцю, гукапераймальнасцю, дэкламацыйнасцю, распеўнасцю – яны падзяляюцца на некалькі жанравых груп: *сігнальныя*, *гукавыяўленчыя*, песенныя і танцавальныя. Да найбольш старажытных пластоў належыць найгрышы сігнальныя, што спрадвеку былі звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю пастухоў, паляўнічых, лесарубаў і вартаўнікоў, каляндарнымі рытуаламі, і гукавыяўленчыя, якія імітуюць галасы птушак і жывёл, моўныя інтанацыі, характэрнае гучанне розных музычных інструментаў.

Ядро інструментальнага фальклору ўтвараюць песенныя і танцавальныя найгрышы, багацце і разнастайнасць якіх шмат у чым абумоўлены развітасцю песеннай і харэаграфічнай культуры беларусаў. Некалькі асобнае месца займаюць імправізаваныя найгрышы ("іграе сам па сабе", "сам уздумаў") песеннага або песенна-танцавальнага характару. На Беларусі пашыраны традыцыі як сольнага, так і ансамблевага (уласна інструментальнага і вакальна-інструментальнага) музыцыравання.

Неабходна адзначыць, што інструментальная музыка ў беларускай традыцыйнай культуры адыгрывала надзвычай важную рытуальную функцыю. Ні адно буйное каляндарнае і сямейнае свята (апроч, бадай, пахавання) не абыходзілася без музыкаў. Напрыклад, на Падзвінні дудар, які ў народнай свядомасці надзяляўся звышнатуральнымі здольнасцямі (мог разагнаць навальнічыя хмары ці выклікаць дождж сваёй ігрой на дудзе), быў абавязковым удзельнікам калядных і валачобных абыходаў, а для сіраты, падчас вяселля, замяняў бацьку.

*Народная харэаграфія* бярэ свае вытокі ў глыбокай старажытнасці, калі яна з’яўлялася складнікавай часткай рытуальных дзеянняў. Паступова танцавальнае мастацтва вылучылася ў асобны, па-мастацку завершаны від народнай творчасці.

Адным з архаічных на Беларусі харэаграфічных жанраў, які захаваў сувязь з каляндарный і сямейнай абраднасцю, з’яўляецца *карагод*. Беларускія карагоды падзяляюцца на тры групы: *карагодныя песні*, калі пры арганічным сплаве тэксту, мелодыі і харэаграфічнага дзеяння большае значэнне мае мелодыя; для іх характэрны нескладаны прасторавы малюнак і простае харэаграфічнае дзеянне (просты, велічны, урачысты крок). Яскравыя прыклады карагодаў гэтай групы – “Страла” (выканаўцы з песняй, узяўшыся за рукі, ідуць на ўскраіну вёскі), “Лука”, дзе спевакі рухаюцца, малюючы на плоскасці розныя крывыя акружнасці, ад здвоенай васьмёркі да асіметрычных фігур; *гульнёвыя карагоды*, дзе дасягаецца найбольш поўнае адзінства ўсіх трох кампанентаў, змест раскрываецца сукупнасцю выяўленчых сродкаў паэзіі, музыкі, харэаграфіі. Для паэтычнай і музычнай будовы гэтых карагодаў характэрны дыялагічнае выкладанне сюжэта, апавядальны тон, больш хуткі тэмп і выразны рытм напеву. *Карагодныя танцы*, дзе вядучая роля належыць харэаграфічнаму пачатку: танец выступае як незалежны і развіты арганізм, здольны ўтварыць паўнаварты мастацкі вобраз уласнымі сродкамі.

*Беларускія танцы* вылучыліся з карагоду ў XIII – XV стст. Асаблівасці харэаграфічнай структуры дазваляюць падзяліць іх на некалькі груп. Першую, найбольш значную ў мастацкіх і колькасных адносінах, складаюць старажытныя *традыцыйныя беларускія танцы* “Лявоніха”, “Мяцеліца”, “Качан”, “Бычок”, “Крыжачок”, “Гняваш”, “Юрачка”, “Мікіта”, “Таўкачыкі” і многія іншыя. Для іх структуры характэрны паўтаральнасць дзвюх-трох тыповых для нацыянальнай харэаграфіі музычна-пластычных формул, агульны для ўсіх удзельнікаў кампазіцыйны малюнак, масавае вы-

кананне, частае песеннае суправаджэнне, неабмежаваная колькасць удзельнікаў і любы іх склад (нярэдка танчаць толькі жанчыны). Інструментальнае суправаджэнне мянялася ад эпохі да эпохі. Даўней асаблівай павагай і папулярнасцю карысталіся дудары:

“Без дуды, без дуды
Ходзяць ножкі не туды,
А як дуду пачуць,
Самі ногі танцуюць”.

Побач з дудою ў XIX ст. танцам акампанавалі скрыпка, цымбалы і бубен, пазней – дзве скрыпкі і басэтля. У канцы XIX ст. у народны побыт увайшоў гармонік.

У сярэдзіне XIX ст. у беларускім харэаграфічным мастацтве пачалася асіміляцыя традыцыйнага фальклору танцавальнымі формамі кадрылі і полькі, што прыйшлі з Заходняй Еўропы. *Кадрылі ўтварылі другую групу беларускіх танцаў.* Асноўная прыкмета іх – цотная колькасць пар (4, 6, 8, 12) па вуглах квадрата ці ў дзве шарэнгі, крыжападобныя пераходы пар і розныя абмены партнёрамі, вызначаная паслядоўнасць і колькасць фігур (4, 6, 8, 12). Этнографы XIX ст. адзначалі, што практычна кожная вёска мела свой варыянт кадрылі: "Воранаўская”, “Турэйская”, “Грабаўская” і інш.

*Трэцюю групу беларускіх танцаў складаюць полькі.* Гэты старадаўні чэшскі танец быў у пэўнай ступені блізкі беларускаму харэаграфічнаму фальклору і стаў адным з самых пашыраных і любімых танцаў вяскоўцаў, набыў мноства рэгіянальных варыянтаў, аказаў вялікі ўплыў на ўсю нацыянальную харэаграфію і, у сваю чаргу, сам моцна трансфармаваўся. Так здарылася, напрыклад, з беларускай “Трасухай” – у першааснове тыповым народным танцам, які стаў называцца “Полькай-трасухай”. “Трасуха” пераняла ад полькі тыповыя для яе вярчэнні, а полька – характэрнае ўтрэсванне верхняй часткі корпуса і рук, прытупы. Пра лакальную і стылістычную разнастайнасць беларускіх полек сведчаць самі іх назвы: “Гайкаўская”, “Барысаўская”, “Віцяблянка”, “Сядуха”, “Адбіянка” і інш.

*Чацвёртую групу* танцавальнага жанру ўтвараюць *гарадскія бытавыя танцы*, а таксама створаныя на музычнай аснове папулярных песень (“Падэспань”, “Вянгерка”, “Месяц”, “На рэчаньку” і інш.). Некаторыя з іх прыйшлі ў беларускую вёску яшчэ ў канцы XIX ст., калі пачалі пашырацца “модныя” бальныя аранжыроўкі народных танцаў. Асабліва вялікія змены ў танцавальнай творчасці народа адбыліся ў пачатку XX ст. Амаль па ўсёй Беларусі пашыраліся ў гэты час пэўныя ўзоры бальных і бытавых танцаў, харэаграфія гарадскіх ускраін і суседніх народаў.

*Асобны жанр* танцавальнага беларускага фальклору ўтвараюць *сольныя імправізацыйныя танцы,* у якіх адсутнічаюць вызначаны парадак фігур, абавязковая іх паўтаральнасць, строгая ўзаемасувязь паміж партнёрамі. Кожны ўдзельнік вольна імправізуе, выказваючы ў разнастайных рухах свой настрой і пачуцці.

*Народныя гульні* – адзін са старажытнейшых пластоў народнай творчасці; адна з сімвалічных форм паводзінаў чалавека. Вылучаюць рытуальныя гульні ("*ігрышчы*"), якія з'яўляюцца неад'емнай часткай каляндарных і сямейных абрадаў, і ўтылітарна-практычныя ("*забавы*"), што былі сродкамі баўлення вольнага часу, маральна-эстэтычнага і фізічнага выхавання. Пазаабрадавая гульня (якіх была большасць), нягледзячы на свой сімвалічны характар, прынцыпова адрозніваецца ад рытуала – вышэйшай формы сімвалічных паводзінаў чалавека. Асноўныя адрозненні палягаюць у наступным:

– рытуал закліканы пераадольваць крытычныя, пераходныя сітуацыі ў жыцці чалавека (калектыву, шырэй – Космасу), а гульня такога прызначэння не мае, бо скіравана на сам працэс гульні;

– колькасць рытуалаў у традыцыйным грамадстве строга вызначана і абмежавана, колькасць жа вядомых гульняў можа пастаянна змяняцца (памяншацца / павялічвацца);

– рытуал дакладна прымеркаваны да канкрэтнай кропкі ў прасторы і часе (хранатопу), гульня такой прывязкі не мае;

– у рытуале ўсе прысутныя – удзельнікі, у той час як у гульні вылучаюцца катэгорыі гледачоў і суддзяў;

– удзельнікі рытуала ўспрымаюць яго як праўдзівую (сакральную) рэальнасць; удзельнікі гульні ўспрымаюць яе як рэальнасць умоўную.

У навуковых поглядах на паходжанне гульні пераважае меркаванне, што яна з'яўляецца аўтаномнай і не менш старажытнай формай духоўнай культуры, чым рытуал, хоць у шэрагу выпадкаў (рытуальныя гульні), гульня можа ўяўляць сабой выраджаны, здэградаваны абрад.

Паводле функцыянальна-тэматычнага і каляндарнага прынцыпу, традыцыйныя беларускія гульні можна класіфікаваць наступным чынам:

*Каляндарна- і сямейна-абрадавыя гульні ("ігрышчы"):*

– *зімовыя* ("Жаніцьба Цярэшкі", "Яшчар", "Бахар", "Галка", "Закрытае шыла", "Падушачка", "Дрэма", "Лунёк" і інш.), што ўваходзілі ў структуру калядных святкаванняў;

– *вяснавыя* ("А мы ляда капалі", "Проса", "Мак", "Старац", "Жоравы", "Тур", "Цар", "Перапёлка", "Лука"), якія, як правіла, з'яўляліся часткаю абрада "Гуканне вясны" і выконваліся моладдзю ў форме разнастайных карагодаў;

– *летнія і восеньскія* ("Ваджэнне куста", "Кумаванне", "Цяцерка", "Збіванне конскай галавы", "Выкінь", "Яшчар", "Абразы", "Пячэнне ката" і інш.);

– *сямейна-абрадавыя* ("Скраданне лялькі", "Цяганне доўбні", "Чобаты", "Цыганы").

*Пазаабрадавыя гульні:*

а) гульні з інвентаром:

– з палкамі ("Крэглі", "Чыжык-немец", "Пікар", "Поп", "Свіння", "Клёк", "Гуські" і інш.);

– гульні з мячом ("Салавей", "Горад-поле", "Вышыбайла", "Гаротнік", лапта, "Два агні");

– гульні з іншымі прадметамі ("Заганяка", качанне кола, качанне кружка, "Каменьчыкі", "Костачкі", "Бабкі", "Цар, злодзей і кат", "Трэнцік");

б) гульні без інвентара:

– з бегам навыперадкі, лоўляю, пошукам (дагонкі, "Хустачка", "Куткі", "Гусі", "Мышка", "Пошта", хованкі, "Шуляк", "Шчупак", "Крумкач" і шмат інш.);

– гульні з элементамі барацьбы і іншымі сілавымі прыёмамі (дужанне, "Перацяжкі", "Швыргі", "Кулачкі", "Рэпа", "Кароль", "Вежа");

– гульні, што патрабуюць назіральнасці і кемлівасці ("Плутаніца", "Капустка", "Зявака", "Фанты", "Шыла", "Сляпы музыка", "Вяровачка");

– гульні з перавагаю элементаў інтэрмедыі і харэаграфіі ("Па лужкам, лужкам", "Лянок", "Рэдзька", "Казёл", "Пастух", "Воўк", "Канапелька", "Крук" і інш.).

Даволі значная частка пазаабрадавых традыцыйных гульняў (хованкі, дужанне, перацяжкі, дагонкі, "Чыж", "Пікар" і інш.) перайшлі і ў сучасную субкультуру беларускіх дзяцей.

*Народны тэатр і драма. Батлейка.* Народны тэатр – адзін з даволі позніх відаў народнай мастацкай творчасці, росквіт якога прыпадае на XIX – пачатак XX ст. Спроба некаторых даследчыкаў выводзіць тэатральнае мастацтва з каляндарных і сямейных абрадаў не з'яўляецца слушнай, бо тэатральнае дзейства прынцыпова разлічана на гледача і рэалізуецца з дапамогай "роляў", у той час як у рытуала такія катэгорыі адсутнічаюць (напрыклад, удзельнікі Купалля перажываюць яго, як самую праўдзівую рэальнасць, і вылучыць яго сярод іх простых гледачоў – немагчыма). Хутчэй за

ўсё, народны тэатр бярэ свае вытокі ў гульнёвых формах паводзінаў, але, пры гэтым, можа карыстацца "цытатамі", узятымі з рытуала (машкоўніцтва, сімвалічная мова, абрадавы травестызм).

У станаўленне народных форм тэатральных прадстаўленняў значны ўклад зрабілі вандроўныя прафесійныя *скамарохі*, сярод якіх асаблівай папулярнасцю на Беларусі карысталіся павадыры мядзведзяў, музыкі (дудары, лірнікі, бубнары, пазней скрыпачы), выканаўцы драматычных сцэнак.

Найвышэйшай формай народнага тэатра з'яўляецца *драма* ("мушкарат"), якая атрымала найбольшае развіццё ў другой палове XX ст. Паказы народнай драмы параўнальна вялікія па аб'ёму са значнай колькасцю ўдзельнікаў (10 – 20 чалавек), валодаюць пэўнымі прыёмамі сцэнічнага выканання і спецыяльнай падрыхтоўкай (рэпетыцыі). Паказальна, што беларускія народныя драмы храналагічна прымяркоўваліся да каляднага святочнага цыклу з адпаведным светаадчуваннем, своеасаблівай карнавальнай атмасферай. Найбольш папулярнымі ў народзе былі драмы "Цар Максіміліян", "Цар Ірад" і "Трон" (спалучала сюжэты дзвюх першых), а таксама кароткія драматычныя сцэнкі тыпу "Мацей і доктар".

Паказы народных драм складаліся з дзвюх частак, кожная са сваімі героямі: так званая сур'ёзная (асноўны сюжэт) і камедыйная (інтэрмедыйныя сцэны). Прадстаўленні, што характэрна для народнага тэатра наогул, мелі своеасаблівы пралог – зварот да гаспадара хаты за дазволам "прэстаўляць" і эпілог – віншаванне са святам і просьба ўзнагароды.

Акрамя тэатра жывога акцёра, вялікую папулярнасць на Беларусі набыў і *лялечны тэатр – "Батлейка"*, як быў вядомы яшчэ з XVI ст. Сама назва паходзіць ад польскай назвы горада Віфліема (*Betleem*) – месца нараджэння Ісуса Хрыста. Адсюль невыпадкова, што значную частку рэпертуара батлейкі складалі сюжэты біблейскай гісторыі. Для паказу батлейкі рабілі драўляныя срынкі (прыблізна 1,5х1,5 м), звычайна ў выглядзе хаткі ці царквы, з гарызантальнымі перагародкамі (ярусамі-сцэнамі). Лялькі-персанажы рабіліся з дрэва і каляровай тканіны, воўны, лёну і мацаваліся на драўляным ці металічным шпяні, пры дапамозе якога батлеечнік вадзіў іх па прорэзях. Рэпертуар батлейкі багаты жыццёвым і фальклорным матэрыялам, незвычайным сюжэтам, вялікай колькасцю персанажаў. Паказ складаўся звычайна з дзвюх частак: кананічнай (рэлігійнай) і свецкай (народна-пабытовай). Многія сцэны мелі вострасатырычны характар і высмейвалі такія сацыяльныя тыпы, як доктар-шарлатан, прагны поп, фанабэрысты шляхціч, скнарлівы карчмар і інш.

Апошнія зафіксаваныя паказы батлейкі адбыліся ў 1963 г. у в. Бялевічы Слуцкага раёна.

*Народная дэкаратыўная прыкладная творчасць* – вобласць народнай беларускай культуры, якая ўключае выраб мастацка аздобленых прыладаў працы, хатняга начынення, пабытовых прыладаў, транспартных сродкаў, адзежы, цацак і г.д. Як і іншыя віды матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, мае ярка выяўлены этнічны характар, у ім праяўляеццца самабытнасць народа, яго эстэтычныя погляды і светапоглядныя каштоўнасці ў цэлым. У беларусаў найбольш распаўсюджанымі відамі дэкаратыўна-прыкладной творчасці былі: разьба па дрэве (язычніцкія ідалы, хрысціянскія скульптуры, дэкаратыўна-сімвалічнае аздабленне хаты і яе інтэр’еру і інш.), ткацтва (паясы, ручнікі, абрусы, посцілкі і іх арнаментальнае ўпрыгожанне), вышыўка (сакральная і мастацкая арнаментацыя адзення), ганчарства, пляценне, коўка. Выкарыстоўваліся звычайна шырокадаступныя матэрыялы: дрэва, гліна, лён, воўна, лаза, салома і інш., з якіх выраблялі неабходныя ў побыце і абрадавых практыках рэчы. У аснове народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці – гарманічнае спалучэнне утылітарных (практычных), сімвалічных функцый вырабаў з мастацкімі задачамі, якія дасягаліся ўмелым выкарыстаннем дэкаратыўных магчымасцяў матэрыялу, прастатой кампазіцыі, выразнасцю мастацкай мовы.

У цэлым для беларусаў характэрна перавага скульптурна-пластычных форм, падкрэсленых рознымі відамі дэкора, перадусім геаметрычнага, што мае старажытнае сімвалічнае паходжанне. У шматлікіх відах арнаменту адлюстраваны дахрысціянскія вераванні: ушанаванне сонца, месяца, культы прыродных стыхій і аб’ектаў, аграрная магія, зааморфныя і антрапаморфныя выявы, як аб’екты пакланення і інш. У пазнейшыя часы пераважаюць арнаменты, не звязаныя з міфалагічным светаўспрыняццем, якія адлюстроўваюць пераважна эстэтычныя густы народа. З развіццём прамысловай вытворчасці, народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва занепадае ці, у нешматлікіх выпадках, перажывае “другое нараджэнне” ў сувязі з: а) значнай грамадскай цікавасцю да традыцыйнай спадчыны; б) абслугоўваннем турыстычных патрэб.

## 5.4. Традыцыйныя рэлігійныя вераванні беларусаў

Нягледзячы на шматвяковую гісторыю хрысціянскай царквы на Беларусі і яе актыўныя спробы выкараніць язычніцкія ўяўленні, вераванні і абрады, светапогляд беларускіх сялян яшчэ ў XX ст. заставаўся міфалагічным у сваёй аснове. Гэтая адметнасць традыцыйнага мыслення была абумоўлена цеснай знітаванасцю земляроба са светам Прыроды, якая ўяўляла-

ся жывой і адухоўленай, выступала надзейным партнёрам у быцці чалавека. Невыпадкова, што ўсе этнаграфічныя крыніцы засведчылі ў беларусаў *ушанаванне прыродных стыхій і аб'ектаў*.

Сакральным характарам вызначалася стаўленне нашых продкаў да *зямлі* – адной з асноўных касмічных стыхій (побач з вадой, паветрам і агнём), першаэлемента, з якога і быў створаны Сусвет. Земля асэнсоўвалася як усеагульная крыніца жыцця, маці ўсяго жывога, у тым ліку і чалавека (лічылася, што Бог стварыў чалавека з зямлі). У адпаведнасці з міфалагічнымі ўяўленнямі зямлю лічылі жывой істотай, якая несла ў сябе жаночы пачатак, апладнялася жыватворнай нябеснай вільгаццю (дажджом) і давала новы ўраджай. "Маці-сыра зямля" лічылася святой, што тлумачыць паважнае, асцярожнае да яе стаўленне: "няможна зямлі біць, знявераць ці пашкудзіць, бо зямля святая". Самай моцнай клятвай (ад якой нельга адракнуцца ні пры якіх абставінах) лічылася тая, калі чалавек спачатку цалаваў, а затым з'ядаў жменьку зямлі. Родная зямля, узятая чалавекам на чужыну, адыгрывала ролю абярога, пасля ягонай смерці яе клалі ў магілу. Уяўленні аб зямлі былі цесна звязаныя з паняццем рода, радзімы, краіны, што адлюстравана ва ўсіх жанрах беларускага фальклору.

*Вада*, адна з асноўных жыццятворных стыхій; крыніца жыцця, сродак магічнага ачышчэння. Разам з тым водная прастора ўсведамлялася як мяжа паміж зямным і "тым" светам.

У касмаганічных легендах вада асацыіруецца з першабытным хаосам, калі яшчэ не было ні неба, ні зямлі, а толькі вада і цемра. Ачышчальная, апатрапейная і прадуцыйная семантыка праяўляецца ў шматлікіх рытуалах акраплення, умывання, купання, аблівання, піцця асаблівай ("замоўленай") вады. Да праточнай вады беглі ў святочныя дні ўмывацца для бадзёрасці, прыгажосці і здароўя; ею аблівалі хворых ці саграшыўшых людзей; традыцыйным святочным пажаданнем у беларусаў была формула: "Будзь здаровы, як вада!"

Катэгарычна забаранялася мачыцца ці пляваць у вадаёмы, бо азёры, крыніцы разумеліся, як "вочы маці-зямлі". У зваротным выпадку чалавек мог быць жорстка пакараны Вадзянікам.

Вада з'яўляецца абавязковым элементам знахарства, носьбітам энергетыкі замовы. Вадзе ў замовах ад хваробаў і нячыстай сілы надаваліся асабістыя імёны: Ульяна, Кацярына, Марына і інш. З старажытных часоў на Беларусі ўшаноўваюцца сотні чудадзейных крыніц – "прошчаў".

*Агонь* у народных уяўленнях з'яўляецца адной з вышэйшых касмічных стыхій, суаднясеннай з верхнім (нябесным) ярусам светабудовы. Лічылася, што першы агонь трапіў на зямлю разам з Пяруном, пасля чаго лю-

дзі навучыліся разводзіць яго і карыстацца ім. Сімволіка агню мела дваісты характар. На адным полюсе – вобраз яраснага і пагрозлівага полымя, што нясе знішчэнне і смерць. На другім – стыхія ачышчальнага полымя, якое ўвасабляла творчы, актыўны пачатак.

Агонь успрымаўся як непасрэдны аб'ект язычніцкіх культаў (яму прыносілі ахвяры), і як пасрэднік паміж людзьмі і багамі. Невыпадкова, што раскладанне (распальванне) агню было неад'емным элементам значнай часткі рытуалаў (Масленніца, Гуканне вясны, Купалле, Багач і інш.). Катэгарычна забаранялася пазычаць хатні агонь незнаёмым людзям, а ў часе святаў нават і суседзям. "Святы", "жывы" агонь, здабыты архаічным спосабам з дапамогай трэння, лічыўся надзейным абярэгам ад хвароб, эпідэмій і эпізотый.

Агонь ўяўляўся беларусам жывой, свавольнай істотай, што есць, п'е, спіць падобна чалавеку, а раззлаваўшыся за непаважнае стаўленне, можа і адпомсціць пажарам.

Пляваць у агонь лічылася вялікім грахом, за што вінаваты захворваў на адмысловую хваробу – "вогнік" – прышчавую чырвоную высыпку па ўсім твары і целе. Амаль што злачынствам было мачыцца на агонь. Верылі, што чалавека, які здзейсніў гэта, агонь "высушыць" да смерці, альбо спаліць дашчэнту яго сядзібу.

З ушанаваннем касмічных стыхій былі цесна звязаныя *культы прыродных аб'ектаў* (крыніц, камянёў, дрэў), шырока распаўсюджаныя па ўсёй тэрыторыі Беларусі і не згубіўшыя сваёй актуальнасці дагэтуль. Найбольшай пашанай карысталіся *крыніцы* – месцы выхаду на зямную паверхню падземных водных жыл, якія, паводле народных ўяўленняў, мелі цудадзейную лекавую сілу. Сярод іншых вадаёмаў крыніцы надзяляліся асаблівай чысцінёй, гаючай моцай, дзякуючы сваёй сувязі з падземнымі і нябеснымі водамі. Ушанаванне крыніц мае ў аснове веру ў магічныя ўласцівасці праточнай вады, якая называлася "жывой", "святой". Да культавых крыніц здавён неслі ахвярапрынашэнні (грошы, хлеб, палатно, воўну), атрымліваючы ад іх вады пазбаўленне ад разнастайных хвароб і немачы.

У раннім Сярэднявеччы хрысціянская царква вельмі агрэсіўна выступала супраць ушанавання крыніц. Але, так і не здолеўшы перамагчы гэтую народную традыцыю, царкоўнікі пачалі, хаця б і фармальна, прыстасоўваць яе да сваіх патрэб: ставіць ля "святых ключоў" капліцы, крыжы, праводзіць малебны і г.д.

Этнаграфічныя і гістарычныя дадзеныя сведчаць аб наяўнасці на тэрыторыі Беларусі каля 300 культавых крыніц, але бясспрэчнае першынство

ў гэтым сэнсе належыць беларускаму Падзвінню (звыш 100), што не ў малой ступені абумоўлена геа-марфалагічнымі асаблівасцямі рэгіёна.

Нягледзячы на тое, што ў народнай свядомасці, лекавыя здольнасці "жывой вады" мелі ўніверсальны характар ("памагае ад усяго"), шэраг крыніц надзяляўся "спецыялізаванымі" функцыямі: ад болю ў суставах дапамагае крыніца ля в. Кавалеўшчына Полацкага раёна, ад хвароб страўніка – "святы ключ" ля в. Вішкавічы Чашніцкага раёна, ад дзіцячых хвароб і сурокаў – святая крыніца ля Сафійскага сабора ў Полацку, "Марозаў ключ" ля в. Забор'е Расонскага раёна, ад жаночых хвароб і бясплоддзя – крыніца для в. Сарочына Ушацкага раёна, ад хвароб вачэй – "Янава крыніца" ля в. Бабруйшчына Глыбоцкага раёна і крыніца – "Шальніця" ля Браслава.

Ушанаванне культавых крыніц, характэрнае для насельніцтва Беларусі і зараз, з'яўляецца сведчаннем адметнасці і жыццяздольнасці традыцыйных каштоўнасцяў этнічнай культуры беларусаў, нават ва ўмовах індустрыяльнага грамадства.

*Камень* у міфалагічных уяўленнях беларусаў з'яўляўся адным з першаэлементаў Космасу, апорай, асновай, стрыжнем (цэнтрам) Сусвету. Цвердасць, трываласць, непарушнасць і даўгавечнасць каменя вызначылі яго шырокае выкарыстанне ў ахоўнай, прадукцыйнай і лекавай магіі.

Культавае ўшанаванне камянёў узнікла, на думку даследчыкаў, яшчэ ў балцкі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі, а на працягу Сярэднявечча становіцца неад'емным элементам традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. Як і ў выпадку з святымі крыніцамі, усе намаганні хрысціянскай царквы выкараніць культ каменя былі марнымі. І нават у сярэдзіне XIX ст. А. Кіркор адзначаў, што любы значны валун нязвыклай формы ўшаноўваецца беларускімі сялянамі і мае легенду пра сваё паходжанне. На тэрыторыі Беларусі ўлічана больш за 300 культавых камянёў. Гэта *абярэгі, гойбіты* (дапамагаюць ад розных хвароб), *следавікі* (паглыбленне ў выглядзе слядоў, што нібыта пакінуў Бог, святыя ці Чорт), дажджавая вада з якіх лічыцца цудадзейнай), *цудадзейныя, акамянелыя істоты* і інш.

Значная частка культавых валуноў звязваецца з язычніцкімі боствамі – Дажбогаў камень (в. Крамянец Лагойскага раёна), Волас (в. Крыжоўка Мінскага раёна), Пярун (в. Папялы Глыбоцкага раёна). Уяўленне пра характар і маштабнасць ушанавання камянёў на Беларусі дае апісанне А. Багдановіча (1895), прысвечанае славутым культавым камяням Дзям'ян і Мар'я (в. Пярэжыр Ігуменскі павет): "Гадоў дваццаць таму праславіўся цудадзейнай сілаю камень Мар'я: хадзілі чуткі пра вылечванне паралітыкаў, кульгавых, глухіх і інш. Да яго ішлі на пакланне не толькі жыхары найблі-

жэйшай мясцовасці, але нават здалёку, з губерняў Магілёўскай, Віцебскай, Пскоўскай, Віленскай і інш. Гэтым камяням прыносяць ахвяраванні: палатно, лён, воўну, парсючкоў, цялят, авечак, грошы. Часам ахвяраванняў было так шмат, што іх вазілі вазамі".

На вялікі жаль, значная частка культавых камянёў Беларусі была знішчана ў гады Савецкай улады альбо перавезена ў музейныя экспазіцыі (напрыклад, музей камянёў у Мінску), што прыкметна разбурыла ўнікальную сістэму беларускай сакральнай геаграфіі, якая складвалася на працягу многіх стагоддзяў і адлюстроўвала вопыт гарманічнага ўзаемадзеяння чалавека і прыроды.

*Дрэва*, у традыцыйным светапоглядзе беларусаў, з'яўляецца адным з асноўных элементаў міфалагічнай карціны свету і мадэліруе вертыкальную мадэль Космасу, дзе крона – нябесная, боская сфера, камель – свет людзей, а карэнні – хтанічная сфера, свет памерлых. Невыпадкова, што ў беларускім фальклоры, дрэва выступае ў якасці ўніверсальнага медыятара, пасродкам якога чалавек (бог, святы, дэман, душа памерлага, навароджаны і г.д.) трапляе ў свет людзей і пакідае яго, выпраўляючы на неба, "той" свет ці ў "краіну памёрлых".

Паводле павер'яў беларусаў, дрэвы мелі душу, маглі хадзіць і размаўляць (асабліва ў Купальскую ноч).

Вылучаліся на Беларусі і асобныя культавыя дрэвы, здольныя, як лічылі, пазбаўляць ад хвароб (ліпа каля в. Капланцы Бярэзінскага раёна, дуб блізу в. Царкавішча Ушацкага раёна). Да XX ст. захавалася абрадавае кармленне паклонных дрэў ("Французская сасна" ля в. Узрэчча Глыбоцкага раёна, сасна ў в. Старыца на Случчыне, у г. Лідзе, ля г.п. Радашковічы і інш.), да якіх насілі хлеб-соль, загорнутыя ў палатно, лён, грошы.

Вельмі часта дрэвы ўваходзілі (разам з святымі крыніцамі і камянямі) у склад аднаго культавага комплексу. Так, напрыклад, язычніцкае капішча, якое складалася з "Дуба-волата", святой крыніцы і Дзед-каменя, функцыянавала ў Мінску аж да 1904 г.

У традыцыйнай карціне свету беларусаў значнае месца займалі *міфалагічныя песанажы*, якія з'яўляліся антрапаморфнымі персаніфікацыямі прыродных ці культурных локусаў, з'яў і аб'ектаў, выступалі іх анімістычнымі ўвасабленнямі. Пад уплывам хрысціянства вобразы і функцыі вышэйшых язычніцкіх бостваў былі ў значнай ступені "асіміляваныя" персанажамі хрысціянскай міфалогіі. Так, напрыклад, якасцямі і ўласцівасцямі бога грымотніка Пяруна стаў надзяляцца старазапаветны прарок Ілля, функцыі бога-апекуна жывёлы перанялі святыя Аўлас і Мікола, Ярылу, бога актыў-

нага мужчынскага пачатку і плоднасці, замясціў святы Юр'я. Аднак ніжэйшы ярус міфалагічных персанажаў вельмі добра захаваўся ва ўяўленнях беларусаў. Яшчэ ў XIX – пачатку XX ст. этнографы зафіксавалі на беларускай этнічнай тэрыторыі веру ў існаванне вялікай колькасці (каля 100) міфічных істот, якія можна падзяліць на тры асноўныя катэгорыі: *духі – увасабленні прыродных аб'ектаў і з'яў* (Азярніцы, Русалкі, Вадзянік, Балотнік, Лесавік, Палявік, Жыжаль, Зюзя і інш.); *духі – апекуны элементаў культурнага ландшафту* (Хатнік, Хлеўнік, Гуменнік, Еўнік, Лазнік, Жыцень, Раёк, Хут) і *духі – увасабленні хвароб* (Кадук, Ліхаманка, Мара, Начніцы, Падвей, Стрыга, Халера, Чума і інш.).

Стаўленне беларусаў да звышнатуральных істот не з'яўляецца катэгарычна адмоўным, а вызначалася, хутчэй, жаданнем усталяваць пэўны парытэтны баланс ва ўзаемаадносінах з імі, каб, у сваю чаргу, дасягнуць аптымальнага поспеху ў пэўнай сферы гаспадаркі ці жыццядзейнасці. Каб праілюстраваць гэты тэзіс ахарактаразуем такія цэнтральныя персанажы беларускай міфалогіі, як Хатнік і Лесавік.

*Хатнік* (Дамавік, Гаспадар, Падпечнік), у беларускай міфалогіі дух хаты, цесна звязаны з уяўленнем аб продках і гаспадарчым дабрабыце той ці іншай сям'і. Часцей за ўсё бачыўся старэнькім дзядком з сівой барадой і сівымі кудлатымі валасамі, апрануты ў насоў ці белую кашулю. Прыкметай прыналежнасці Хатніка да іншасвету з'яўлялася адсутнасць у яго шапкі і абутку. У выпадку "згоды" з гаспадарамі і паважлівага стаўлення да сябе з боку апошніх Хатнік усяляк спрыяе павелічэнню дабарабыту сям'і: даглядае і корміць жывёлу, сушыць збожжа, ад чаго яно "спарнее", шые, прадзе, мые ў хаце. Пра магчымую небяспеку для сям'і Хатнік папярэджвае гаспадара, завываючы ці грукаючы ў сцены хаты.

Сярод іншых міфалагічных персанажаў Хатнік карыстаўся найбольшым ушанаваннем і павагай, займаючы асобную, прамежкавую пазіцыю паміж прадстаўнікамі "нячыстай сілы" і людзьмі: "Дамавік ад чарцей адстаў, а да людзей не прыстаў". Паказальна, што Хатнік крыўдзіўся, калі яго называлі "нячыстым" і сам баяўся чорта. У той жа час да Хатніка спагадліва ставіўся святы Ілля, не палюючы на яго перунамі. Лічылі, што дабро, атрыманае ад Дамавіка, не пойдзе прахам, а ўзаемадачыненні з ім, у адрозненне ад іншых нячысцікаў, мелі даволі "легітымны" характар. Каб залагодзіць Хатніка і заручыцца ягонай падтрымкай, яму прыносілі ахвяры. У Магілёўскай губерні гаспадар адразаў акраец хлеба ад першай булкі, спечанай на поўню, і з соллю заносіў яго ў хлеў, прамаўляючы: "Дамавік, дамавы! Прымі ад мяне хлеб-соль, любі маіх коней і жалуй! І я буду цябе лю-

біць і жалаваць!”. Абавязковым лічылася ўшанаванне Хатніка падчас найбольш значных абрадаў сямейнага цыкла: радзінаў, вяселля і ўсіх памінальных дзён, што падкрэслівае ягоную сувязь з продкамі і ўяўленнямі аб сямейнай долі. Падчас восеньскіх Дзядоў гаспадары, запрашаючы Хатніка прыняць удзел у супольнай рытуальнай трапезе, высцілалі дарогу з клеці да стала белым палатном.

Найбольш дапамагаў Хатнік у тых гаспадарках, дзе жыве моцная, трывалая сям’я, дзе гадуюць жывёлу яго ўлюбёнай масці, падтрымліваецца чысціня і парадак і пільнуюцца дзедаўскіх звычаяў. Крыўду ж і помслівасць Дамавіка выклікаюць сямейныя сваркі, п’янства, брыдкаслоўе, неахайнасць у вядзенні гаспадаркі.

*Лесавік* (Дабрахожы, Лясны Дзед, Лясун), у беларускай міфалогіі дух – увасабленне лесу як часткі прасторы, патэнцыйна чужой чалавеку. Кожны лясны масіў мае свайго гаспадара – Лесавіка, які апякуецца ўсімі раслінамі, звярамі і птушкамі (ратуе іх ад пажару, паляўнічых і г.д.). Лясун пры неабходнасці мае здольнасць павялічвацца (у лесе) і памяншацца (у полі) у памерах. Выразна прасочваецца сувязь Лесавіка з левым бокам (левым крысом захінае правае, левая пятка наперад), што падкрэслівае яго апазіцыйнасць да сферы штодзённага жыцця чалавека. Дваістае стаўленне да Лесавіка тлумачыцца як шкодай з яго боку (можа прымусіць блукаць, напалохаць чалавека, пазбавіць паляўнічай здабычы), так і дапамогай. У замовах Лесавік (“правялікі пан”, “справядлівы”, “цар грозны”) фігуруе як выратавальнік ад урокаў, крыксаў, згубы скаціны і нават нячыстай сілы. За паслугу з боку чалавека (выратаванне дзяцей Лясуна) Лесавік можа надаць яму знахарскія здольнасці і спрыяць у лясных промыслах. З мэтай дасягнуць апошняга яшчэ ў канцы XIX ст. Лесавіку прыносілі ахвяры, а паляўнічыя і моцныя знахары маліліся ў лесе.

Прасочваецца сувязь Лесавіка з іншымі міфалагічнымі персанажамі. Будучы родным братам Хатніку і Палявіку, Лясун выконвае ролю пастуха ваўкоў у дзень святога Юр’я. Вобраз Лесавіка быў распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Беларусі, і вера ў яго служыла ўсталяванню своеасаблівай экалагічнай раўнавагі паміж чалавекам і прыродай (лесам). Толькі пад уплывам хрысціянства Лесавік набывае рысы незвычайнага злога і шкоданоснага нячысціка.

Асобнае масца ў міфалагічных уяўленнях беларусаў займаў Чорт (ад праслав. “*cъrtъ*” – пракляты) – ліхі дух, які шкодзіць толькі чалавеку і супрацьстаіць Богу. Вобраз Чорта меў дахрысціянскае паходжанне, але быў істотна дапоўнены хрысціянскімі ўяўленнямі аб д’ябле. Чорт мае антрапа-

морфнае аблічча, пакрыты чорнай поўсцю, мае рогі, капыты і хвост, якія імкнецца схаваць пад вопраткай. Можа быць вызначаны паводле этнічнай або сацыяльнай прыкметы: “чорны маскаль”, “немчык”, “паніч”.

Чорт вызначаецца ўсюдыіснасцю (можа з’яўляцца нават у царкве) і здольнасцю да пераўтварэнняў (чорны баран, кот, сабака, чалавек і інш.), што спарадзіла забарону прамаўляць яго імя (карысталіся эўфемізмамі тыпу “ліхі”, “нячысты”). У беларускіх касмаганічных легендах Чорт у пары з Богам фігуруе як адзін са стваральнікаў свету (дастае першую зямлю з-пад вады, стварае балоты, рэптылій, жаб і г.д.), але пазней з прычыны непаслушэнства (падману, суперніцтва) уступае з Богам у канфлікт, які выяўляецца ў паляванні апошняга на Чорта перунамі.

Але асноўны занятак Чорта – рабіць усялякую шкоду людзям (п’янства, сваркі, бойкі) і ўводзіць іх у грэх (самазабойства, здрада, хлусня, крадзеж і г.д.), за які ён забірае душы грэшнікаў у пекла, гаспадаром якога з’яўляецца. Адсюль, з боку людзей існавала тактоўна-перасцярожлівае стаўленне да Чорта: “І Бога любі, і Чорта не гняві”. Імя Чорта як найбольш пашыранага міфалагічнага персанажа вельмі шырока фігуруе ў розных жанрах беларускага фальклору.

Такім чынам, думка аб тым, што вялікая колькасць міфалагічных істот з’яўляецца адлюстраваннем бездапаможнасці чалавека традыцыйнай культуры перад сіламі прыроды, нібыта незразумелымі яму, – не зусім верная. Наадварот, у адрозненне ад сучаснага, навукова-рацыянальнага мыслення, для міфапаэтычнага не было нічога цьмянага і непасціжнага ў навакольным свеце, бо любая яго праява была патлумачана міфам, а гарманічнае існаванне чалавека ў Сусвеце дасягалася праз паважныя (часам перасцярожлівыя) і партнёрскія адносіны з яго прадстаўнікамі.

Усведамляючы сябе неад’емнай часткай прыроды, прадстаўнікі традыцыйнай супольнасці былі не проста яе сузіральнікамі і пасіўнымі карыстальнікамі матэрыяльных рэсурсаў, але шчыра верылі ў магчымасць уплыву на навакольную рэчаіснасць пасродкам сімвалічных (магічных) дзеянняў. Практычна кожны вясковец валодаў даволі шырокім спектрам прасцейшых магічных прыёмаў засцерагальнага і прадуцыйнага характару (засцеражэнне гаспадаркі і здароўя ад ведзьмаў, варажба, прыёмы земляробчай магіі, закліканай павысіць ураджайнасць і да т.п.). Аднак, у межах сельскай грамады вылучаліся “прафесіяналы” – *чараўнікі, знахары*, чые таемныя магічныя веды выклікалі ў аднавяскоўцаў перасцярожлівае і, адначасова, паважлівае стаўленне.

Чараўнік, паводле народных уяўленняў – чалавек, надзелены звышнатуральнымі здольнасцямі, дзякуючы якім ён можа ўплываць на прыродныя з'явы (выклікаць град, навальніцу), здароўе людзей, жывёл (насылаць хваробы і смерць), ураджайнасць, ператварацца і ператвараць людзей у прадстаўнікоў навакольнага свету.

Наяўнасць чараўнікоў на тэрыторыі Беларусі фіксуецца яшчэ ў раннім Сярэдневеччы. Вобраз князя-чараўніка Усяслава Чарадзея, здольнага перакідвацца ў ваўка і прадвызначаць будучае, мае старажытныя індаеўрапейскія вытокі і, верагодна, сведчыць пра пачатковыя жрэцкія функцыі чараўнікоў. З прычыны пашырэння хрысціянства з чараўнікамі пачалі звязвацца пераважна негатыўныя, шкаданосныя якасці, што тлумачылася іх кантактамі з "нячыстай сілай".

Яшчэ ў XVII ст. у Беларусі (Браслаўскі павет) фіксуецца кланавая арганізацыя чараўнікоў, якая гарантавала "вузка-прафесійную" міжпакаленную перадачу магічных прыёмаў. Адсюль, пашыранае ўяўленне, што, не перадаўшы сваіх ведаў нашчадку, чараўнік памірае асабліва пакутліва. У народным асяродку такія чараўнікі лічыліся найбольш "моцнымі", "прыроднымі". Іх дзейнасць была цесна звязаная з астранамічнымі цыкламі (сонцаварот, квадры, месяцы і г.д.), а "чары" маглі дзейнічаць на вялікай адлегласці. У адрозненне ад Заходняй Еўропы, дзе асноўным суб'ектам магічных аперацый лічылася жанчына-ведзьма (паводле хрысціянскага вучэння жанчына – увасабленне грахоўнасці і спакусы), самымі моцнымі чараўнікамі на Беларусі з'яўляліся мужчыны, звычайна звязаныя з пчалярствам, кавальствам, млынарствам, ганчарствам ды іншымі адрознымі ад сельскай гаспадаркі заняткамі, што тлумачыцца іх сувяззю з асноўнымі касмічнымі стыхіямі: агнём, вадой, зямлёй (глінай), паветрам.

Патэнцыйная шкода, якую мог зрабіць чараўнік, выклікала да яго паважна-перасцярожлівае стаўленне. У штодзённым жыцці імкнуліся не сварыцца з чараўніком і не крыўдзіць яго, лічылася абавязковым запрашаць яго на вяселле. У якасці супрацьдзеяння "чарам" выкарыстоўвалі замовы, магічна-засцерагальныя сродкі ("перуновы стрэлы", "грамнічныя свечкі", "чацвярговую соль" ды інш.) або звярталіся да знахара.

*Знахар*, паводле народных уяўленняў, чалавек надзелены магічнымі здольнасцямі, якія ў адрозненне ад чараўніка выкарыстоўвае для дапамогі людзям. Як і чараўнікі, знахары падзяляюцца на "прыродных" (моцных) і "навучоных" і маюць цесную сувязь з рамёствамі і промысламі. Існавала павер'е, што адзнака "прыроднага" знахара – яго нараджэнне на свет адразу з усімі зубамі. Моцныя знахары маюць здольнасць прадказваць буду-

чыню (варажыць), лячыць разнастайныя хваробы як у людзей, так і ў жывёл, выступаюць як абаронцы людзей ад "чараў" і нячыстай сілы. У якім бы абліччы нячысцік не з'яўляўся да людзей, моцны знахар яго адразу мог убачыць і распазнаць. Найгалоўная здольнасць "прыроднага" знахара – яго ўлада над сілаю слова. Патаемным словам такі знахар мог перамагчы любога нячысціка. Веды і ўменне знахара звычайна ўсведамляюцца як дадзеныя Богам і разглядаюцца як мацнейшыя за сілу хрысціянскага святара, але прыблізна роўныя чарадзейскай. Адсюль шырокая распаўсюджанасць сюжэта аб суперніцтве і двубоі знахара і чараўніка. Лічылася таксама, што моцныя знахары ведаюць усе сакрэты апошніх.

Паводле народных уяўленняў, знахар разумее мову дрэваў, звяроў і птушак, выдатна разбіраецца ў лекавых зёлках, можа адрозніць крыніцу з жывой вадой ад крыніцы з вадой мёртвай, а таксама кіраваць змеямі і ваўкамі. Перадача магічных ведаў і прыёмаў у межах аднаго роду дазваляе разглядаць "прыродных", "патомных" знахароў як нашчадкаў жрэцкіх карпарацый той ці іншай вясковай акругі (характэрна, што і ў XIX – XX стст. "моцныя" знахары ніколі не жывуць на блізкай адлегласці адзін ад аднаго), якія фармальна ўспрынялі хрысціянства і такім чынам былі "легітымізаваныя" як "белыя", "добрыя", негледзячы на язычніцкую сутнасць іх практык.

Знахары "навучоныя" ведаюць замовы і прыёмы ад некалькіх хвароб, якімі, як правіла, авалодалі выпадкова. Знахарства такога кшталту шырока бытуе ў беларускай вёсцы і зараз.

## 5.5. Народныя веды

*Касмалогія і астраномія.* Паўсядзённы жыццёвы вопыт, практычная і рытуальна-сімвалічная дзейнасць выпрацавалі на працягу многіх соцень гадоў у сялян шматаспектныя погляды на свет і прыродныя з'явы. Усведамляючы сябе неад'емнай часткай прыроды, селянін уважліва назіраў за нябеснымі свяцiламі, вызначаў іх становішча на небе, дынаміку іх руху і даволі дакладна арыентаваўся ў прасторава-часавай структуры Сусвету (час сутак, квадры месяца, перамены сонечных фаз, бакі свету і інш.). Пры гэтым, веды беларускіх сялян у галіне астраноміі і касмалогіі былі вельмі шчыльна знітаваныя з міфалагічнымі ўяўленнямі пра будову Космасу.

Узнікненне сусвету, у народнай свядомасці, суадносілася з міфічнымі часамі першастварэння, калі суб'ектамі касмагоніі выступаюць Бог і яго праціўнік (Чорт, Волат). Суперніцтва гэтых персанажаў прыводзіць да та-

го, што “свет” адпачатку характаразуецца неаднароднасцю і разнаякаснасцю (Бог – Творца “зямлі” у значэнні “палеткаў, ворыва”, чорт стварае балоты і “няўдобіцы”). Структура свету ў гарызантыльным вымярэнні характарызуецца *тэтракратычнасцю* і суадносіцца з бакамі свету, кожны з якіх надзелены пэўнай сімволікай і энергетыкай. Бакі свету ўтваралі апазіцыйныя пары, дзе Поўдзень – Усход лічыліся спрыяльнымі і асацыяваліся з ідэяй святла, цяпла, нараджэння (жыцця) і “тым” светам у значэнні “боскай”, сакральнай сферы Космасу, а Поўнач – Захад атаясамліваліся з цемрай, холадам, смерцю і “тым” светам у значэнні інфернальнай (пякельнай, падземнай) зоны.

У вертыкальным вымярэнні свет характаразуецца *трыядычнасцю*, дзе верхняя сфера прадстаўлена Небам (паўсферычным, аднародным, сяміўзроўневым), нябеснай вільгаццю і суадносіцца з Богам, свет людзей размяшчаецца ўласна на зямлі, а ніжні ярус прадстаўлены хтанічнай сферай з яе насельнікамі (змеі, земнаводныя ці чорт) і падземнымі водамі.

Паводле касмалагічных ўяўленняў беларусаў, нябесны купал абапіраўся на слупы. Вяршыню цэнтральнага слупа завяршае Стажар (Палярная зорка), які стаіць нерухома, а вакол яго круцяцца іншыя зоркі. Цэнтральнае месца на небе займала сузор’е Вялікай Мядзведзіцы (народныя назвы: Воз, Карэц, Сакачы, Конь), якое ў старажытнасці асацыявалася з “нябеснай калясніцай” бога Грымотніка (Перуна). Невыпадкова, што ў беларускай замоўнай традыцыі да “нябеснай (божай) калясніцы” звярталіся па дапамогу ад нячыстай сілы, шалу, уроку і іншых хвароб.

Паўночная зорка служыла своеасаблівым арыенцірам для вызначэння начнога часу. З гэтай жа мэтай назіралі за рухам сузор’я Арыён (Тры каралі, Касары, Матавіла), сузор’я Плеяды (Валасажар, Сітка, Рэшата). Час вызначаўся па месяцы – знаходжанні гэтых сузор’яў адносна пэўнай хаты ці гаспадарчай пабудовы прыблізна наступным чынам: “Лёг спаць, калі Тры каралі яшчэ не ўсходзілі, а ўстаў, калі Тры каралі былі насупраць Язэпава гумна”.

Назіраннямі за сузор’ямі карысталіся ў летні час рыбакі, што лавілі рыбу, касцы, якія знаходзіліся на сенакосах удалечыні ад сяла некалькі дзён, а таксама падарожныя людзі, што мусілі быць у начной дарозе. У паўсядзённым жыцці час па зорках вызначалі больш зімою, калі ночы доўгія, радзей – летам. Па сузор’ях часам вызначалі пачатак сельскагаспадарчых работ. Так, калі сузор’е Валасажар перад світаннем знаходзілася дакладна на поўдні (сярэдзіна верасня), азначала, што надышла пара восеньскай сяўбы.

Найвялікшай пашанай у беларускіх сялян карысталіся Сонца і Месяц, якія ўвасабляліся ідэальнай шлюбнай парай (жонкай і мужам). Сонца абагаўлялі як адну з галоўных жыццядайных сіл, што валодае і пазітыўнымі магічнымі якасцямі. Вобраз Сонца з'яўляецца надзвычай пашыраным у абрадавых жанрах беларускага фальклора. Салярныя матывы здаўна з'яўляюцца ў беларусаў асноўным элементам у арнаментыцы вырабаў рытуальнага, пабытовага, мастацкага прызначэння.

Не меншай павагай у народнай свядомасці карыстаўся Месяц. Невыпадкова, што дзейсным абярогам ад злыбяды ў любой дарозе была наступная замова:

“Мяне маці нарадзіла,
Сонейкам абгарадзіла,
Месяцам падпаясала,
У дарогу адпраўляла”.

Вялікае значэнне ў сістэме народнай храналогіі адыгрываў месяцовы час, бо з падзелам на месяцы і тыдні звязаныя квадры месяца. Гэтая сувязь тлумачыцца тым, што змена 4-х квадраў месяца, кожная з якіх прыблізна адпавядае сямідзённаму тыдню, можа быць прасочана чалавечым вокам беспасярэдне.

Квадры месяца, паводле народных уяўленняў, аказвалі вялікі ўплыў на чалавека і прыроду. Так, на “*маладзік*” (фаза росту месяца) раілі ставіць вуллі (пчолы будуць збірацца, як “збіраецца” месяц), стрыгчы валасы (хутка адрастуць), аднак лічылі, што нават нязначныя раны, нанесеныя ў гэты час, будуць вельмі марудна загойвацца. Усе важнейшыя работы імкнуліся праводзіць пад “*поўню*” – сеяць азімыя і яравыя культуры, садзіць бульбу, купляць жывёлу і да т.п., бо ўсяго будзе “поўна”. У трэцюю квадру (“*ветах*”, “*сход*”) раілі высякаць пні, зараснікі, палоць грады, лячыць хваробы, якія павінны былі знікнуць гэтак жа хутка, як “знікае” месяц.

“*Перамена*” (фаза безлуння) лічылася благім часам для асабістай долі чалавека. Меркавалі, што ў людзей, народжаных у гэты часавы прамежак, у будучым можа ня быць дзяцей.

Сярод планет, якія ўспрымаліся сялянамі як зоркі, найбольш ушаноўвалі Венеру (“Зарніца” ці “Вечарніца” ў залежнасці ад часу бачнасці), якая фігуруе ў беларускіх замовах як абярог ад розных хвароб.

*Народная метэаралогія*, адна з важных старажытных галін народных ведаў пра магчымае надвор'е ў бліжэйшы ці больш аддалены час. Выклікана неабходнасцю арыентавацца ў зменах стану прыроды для аптымальнага

вядзення гаспадаркі, асабліва земляробства. Народныя прадказанні надвор'я засноўваліся на шматвяковым сялянскім вопыце, назіральнасці, глыбокім веданні прыроды. Пад увагу браліся ўзаемасувязі атмасферных з'яў, асаблівасці росту раслін, іх рэагаванне на змены метэаралагічных умоў, фізічны стан чалавека, паводзіны звяроў, птушак, рыб і г.д. Разам з тым, у прадказанні надвор'я вялікую ролю адагрывала і міфалагічнае асэнсаванне сусвету. Невыпадкова, што найбольш вызначальнымі днямі для доўгатэрміновых прагнозаў лічыліся буйнейшыя каляндарныя святы, калі знакі пра характар будучага надвор'я даюць самі багі. Так, паводле народных уяўленняў, адліга на Каляды сведчыла, што санны шлях пратрывае да сярэдзіны сакавіка, вясна будзе ранняя, а лета багатае; калі на Каляды ішоў снег – вясна чакалася худая; на Шчадрэц (Новы год) снег падаў з самага ранку – уся зіма будзе снежная, а лета – пагоднае.

Найбольшую колькасць метэаралагічных прагнозаў складаюць народныя прыкметы, заснаваныя на назіраннях людзей за жывёльным светам. Паводзіны амаль усіх прадстаўнікоў мясцовай фауны разглядаліся як прадказанне пэўных перамен надвор'я: калі ў каровы шэрсць вільготная – будзе дождж; свіння нясе салому з хлява – будзе сцюдзёна; мышы звілі кубло ў ільне – у наступную зіму будзе вялікі снег і інш. Існавала шмат прыкмет надвор'я, прадказаных свойскімі ці дзікімі птушкамі (бусел шукае жаб на балоце – будзе дождж ці адліга), паводзінамі рыб, земнаводных і жамяры: на змярканні рыба плёскаецца на паверхні вады – будзе добрае надвор'е, калі выскоквае з вады і ловіць мошак – будзе дождж; калі пчолы з раніцы сядзяць у вуллі і гудуць, а мурашкі хаваюцца ў мурашніках – будзе дождж. Мноства прадказанняў грунтавалася на асаблівасцях росту, цвіцення, выспявання пладоў разных раслін, месцазнаходжанні і руху астранамічных цел, пабытовых прыкметах і г.д.

Такім чынам, надзвычай развітая і эфектыўная сістэма народнай метэаралогіі сведчыць пра асаблівы, партнёрскі тып узаемадачыненняў чалавека Традыцыі і Прыроды, калі апошняя разумелася не як бяздушная пляцоўка для тэхнагенных эксперыментаў (адзнака нашага часу), але як вялізная кніга, здольная пры тактоўным і ўважлівым стаўленні даць адказы практычна на ўсе пытанні.

*Народная метралогія* бярэ свае вытокі з часоў глыбокай старажытнасці. У дадзенае паняцце ўваходзяць адзінкі мераў даўжыні, плошчы, часу. Развіццю метралогіі садзейнічалі патрэбнасці абменных аперацый і развіццё гандлю. Паваротным момантам у развіцці метралогіі з'явілася ўзнікнен-

не дзяржавы, калі ўлады і адміністрацыя бралі на сябе абавязак кантраляваць стандартнасць мераў на яе тэрыторыі. Аднак дзяржаўныя меры былі абавязковымі толькі ў гандлі. У штодзённым жыцці, асабліва ў далёкіх ад гарадоў мясцовасцях, сяляне карысталіся ў асноўным народнымі мерамі.

Сістэма вымярэння *часу* мела сваім грунтам галоўныя рытуалы каляндарнага і сямейнага цыклаў: “На Каляды”, “за два тыдні да Юр’я”, “тыдзень пасля Іллі” ці “за год, як ажаніўся Міхась”, “месяц пасля радзінаў у Янкі, што былі за тыдзень да Міколы” і г.д. У межах сутак, што мелі падзел на чатыры часткі (раніца, дзень, вечар, ноч), час вызначалі па сонцы, уночы – па месяцу і зорках. Светавы дзень падзяляўся на снеданне – раніцай, абед – у поўдзень, падвячорак – у 5 – 6 гадзін дня і вячэру – звычайна пасля заходу сонца. Дзённы час яшчэ вызначаўся ў залежнасці ад догляду жывёлы – даення, кармлення ці паення кароў, кармлення коней, свіней, курэй і г.д. Існавалі і архаічныя вызначэнні часавых прамежкаў праз адлегласць і наадварот: “Ісці да Валатоўскай амшарыны доўга, як да Святога дуба” ці “шлях гэты няблізкі – тры дні пуці”.

*Народныя лінейныя меры* на Беларусі выкарыстоўваліся з даўніх часоў. Усе яны мелі антрапаметрычнае паходжанне і вызначаліся здольнасцю чалавека кінуць на пэўную адлегласць палку ці камень, бачыць выразна прадмет, пачуць голас чалавека ці жывёлы. Мерай даўжыні служылі і часткі цела чалавека сярэдняга ўзросту: рукі, ногі, далоні, ступні і г.д. Асноўнай мерай даўжыні лічылі локаць, аднак яго параметры ў розныя гістарычныя эпохі вар’іраваліся. Так, у часы Полацкага княства бытаваў “*кіеўскі локаць*”, што складаўся з дзвюх пядзяў і меў 46 см, што раўнялася адлегласці ад локця да канца сціснутага кулака. Пазней на тэрыторыі Беларусі шырока карысталіся “*літоўскім локцем*”, які быў роўны 61,6 см і складаў адлегласць ад левай часткі грудной клеткі да канца зацiснутага кулака правай рукі. У 1766 г. гэтую меру ўзаконіў Сейм Рэчы Паспалітай як асноўную адзінку даўжыні ў дзяржаве.

Локцем вымяралі перш за ўсё палатно і вырабы з яго. Для прадметаў меншых памераў ужывалася *пядзь*: малая пядзь – адлегласць ад вялікага пальца да ўказальнага – 19 см; вялікая – адлегласць ад вялікага пальца да мезенца – 22 – 23 см.

Карысталіся і іншымі лінейнымі мерамі. *Махавой сажанню* (адлегласць ад канцоў пальцаў дзвюх разведзеных у бакі рук, роўная 1 м 77 см) вымяралі вяроўкі, рыбацкія сеткі, ланцугі і г.д. *Касая сажаць* – самая вялікая адлегласць ад падэшвы левай нагі да кончыкаў пальцаў выцягнутаў

уверх правай рукі, роўная 2 м 48 см. З XV ст. бытуе такая мера як *аршын* – даўжыня выцягнутай рукі ад пляча да канца сярэдняга пальца – прыкладна 0,72 м. Зямлю, сенакосныя ўгоддзі мералі крокам (даўжыня сярэдняга кроку чалавека ад пяты адной нагі да пяты другой, роўная ў сярэднім 75 см).

*Вымярэнне цяжару і вадкасці* розных рэчываў адбывалася паводле іх аб'ёму. Асноўнымі мерамі былі гарнец, кварты, вядро і інш. (падрабязней глядзі п. 4.1.2, Бондарства).

*Народная медыцына* – сукупнасць эмпірычна набытых народам ведаў пра гаючыя сродкі, лекавыя травы і прафілактычна-лекавыя навыкі (дзеянні), а таксама іх практычнае выкарыстанне для зберажэння здароўя, папярэджання, дыягностыкі і лячэння хвароб. Спецыфіка беларускай народнай медыцыны абумоўлена прыродна-кліматычнымі асаблівасцямі беларускай этнічнай прасторы і сімбіёзам міфалагічных і рацыянальных ведаў прадстаўнікоў традыцыйнай супольнасці пра навакольны свет. Адпаведна, метады і прынцыпы народнай медыцыны ўяўлялі складаны сінтэз магічных і рацыянальных прыёмаў, разглядаць якія паасобку (што было характэрна для савецкай навукі) немагчыма.

Любая хвароба разумелася нашымі продкамі як пэўнае парушэнне аптымальнага жыццёвага стану чалавека, нормай якога з'яўлялася фізічнае і псіха-эмацыйнае здароўе. Пры гэтым, прычыны захворвання маглі быць пабытова-натуральнымі (звіх, падрыў, пералом, падрэз, апёк, прастуда) і магічна-міфалагічнымі (сурокі, сцень, валасень, трасца, халера, падвей, вогнік і шмат іншых). У апошнім выпадку хваробы разглядаліся як вынік уздзеяння варожых чалавеку сіл (духаў хвароб, "нячысцікаў", чапаўнікоў, ведзьмаў) ці як пакаранне з боку прыродных стыхій і прадстаўнікоў сакральнай сферы (агню, вады, месяца, Бога, святых, персаніфікаваных святаў) за парушэнне чалавекам рэлігійных, маральна-этычных і сацыя-культурных норм (праца ў святы, знявага агню, вады, крадзеж, блюзнерства і да т.п.).

Своеасаблівай гіперхваробай, шырока вядомай па ўсёй Беларусі і здольнай праявіцца ў дзесятак канкрэтных хвароб (ад галаўнога болю да бясплоддзя і паралюша), з'яўляліся *Сурокі* – немач, псота ці іншае няшчасце, выкліканае благім поглядам, словам ці думкамі ў бок пацярпелага.

Найбольш небяспечнымі лічыліся сурокі, выкліканыя адмысловымі праклёнамі ("прымоўленыя", "нагаворныя"), што тлумачыцца язычніцкімі ўяўленнямі пра матэрыяльнасць і энергетычнасць слова, асабліва прамоўленага ў так званую "благую мінуту" – храналагічны абрэзак (апоўначы,

апоўдні, напярэдадні свята), калі мяжа з іншасветам робіцца найбольш празрыстай.

Адратаваць ад такіх сурокаў маглі толькі моцныя знахары, якія, у сваю чаргу, звярталіся па дапамогу да Лесавіка, Палевіка, “царыцы-вадзіцы”, “цара-сонца” і г.д.

Меншую небяспеку ўяўлялі сурокі ненаўмысныя (“падзіўныя”. “пасмешныя”), якія маглі быць зробленыя нават у межах адной сям’і: бацькам, маткай, бабай, дзедам, братамі, сёстрамі ды інш. Асноўнай прычынай падобных сурокаў бачыўся “благі час”, у які агучаная пахвала ці станоўчае здзіўленне мелі надалей супрацьлеглыя, негатыўныя наступствы (напрыклад, пахваленая такім чынам жывёла перастае набіраць у вазе, даваць малако, дзеці хварэюць ды інш.). Ненаўмысныя сурокі здымаліся без “спецыялізаванай” вонкавай дапамогі. Эфектыўнымі сродкамі ад іх лічыліся “чацвярговая соль” (асвячаная ў чацвер вялікоднага тydня), вада з роту таго, хто сурочыў, ці пралітае праз рэч з адтулінай (“перунова страла”, ключ, клямка, замок), працягванне дзіцяці паміж ног маці, што сімвалізавала новае (здаровае) нараджэнне.

Трэба адзначыць, што і ў наш час значная частка жыхароў Беларусі (асабліва вяскоўцы) перакананы ў немагчымасці лекавання сурокаў (а таксама ўпуду, валасня, находу, рожы, грыжы і іншых хвароб з міфалагічнай этыялогіяй) медыкаментознымі сродкамі і адносіць іх да выключнай кампетэнцыі знахараў.

Значную ролю ў сістэме народнай медыцыны беларусаў адыгрываюць *аб’екты сакральнай геаграфіі* – святыя камяні, азёры, крыніцы, дрэвы, да якіх (асабліва ў спецыяльныя святочныя дні) неслі ахвяры, атрымліваючы пазбаўленне ад хвароб ці прафілактычную засцярогу ад іх.

Велізарнае значэнне меў і тысячагадовы народны вопыт у галіне *фітатэрапіі*. Абсалютнае веданне лекавых уласцівасцяў практычна ўсіх раслін, часу і месца іх збору, нарыхтоўкі і захавання, спосабу і механізму прыгатавання з іх лекавых сродкаў дадаткова падкрэслівае экалагічна дасканалы характар беларускай народнай медыцыны, набыткі якой з кожным годам прыцягваюць усё большую ўвагу, як з боку афіцыйнай медыцыны, так і з боку грамадства ў цэлым.

## Асноўная літаратура

Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. – Мн., 2004.
Беларускі народны каляндар / Аўтар-укладальнік А.Ю. Лозка. – Мн., 1992.
Беларусы. Т. 5: Сям’я. – Мн., 2001.
Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі. – Мн., 2002.
Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии. – Мн., 1993.
Вяселле: Абрад. – Мн., 2004.
Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. – Мн., 1993.
Кухаронак Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў канец XIX – XX стст. – Мн., 1993.
Сысоў У.М. Беларуская пахавальная абраднасць. – Мн., 1995.
Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989.

## Літаратура для паглыбленага вывучэння тэмы

Беларускі народны соннік. – Мн., 1996.
Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. – Мн., 1995.
Валодзіна Т.В. Талака ў сістэме духоўнай культуры. – Мн., 1998.
Валодзіна Т.В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. – Мн., 1999.
Дай божа знаць, з кім век векаваць: Бедаруская народная варажба. – Мн., 1993.
Замовы. – Мн., 1992.
Зямля стаіць пасярод свету: …Беларускія народныя прыкметы і павер’і. – Кн. 1. – Мн., 1996.
Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер’і. – Кн. 3. – Мн., 1999.
Ляўкоў Э.М. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. – Мн., 1992.
Ненадавец А.М. Сілаю слова: Чорная і белая магія. – Мн., 2002.
Никифоровский Н.Я. Нечистики. – Витебск, 1997.
Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палессе. – Мн., 2004.
Сержпутоўскі А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – Мн., 1998.
Федароўскі М. Люд беларускі: Вяселле. – Мн., 1991.

# ТЭМА 6. НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕНШАСЦІ І МІЖЭТНІЧНЫЯ АДНОСІНЫ НА БЕЛАРУСІ

На сучасным этапе, дый у гістарычным мінулым, практычна немагчыма прыгадаць аніводнай краіны, дзяржаўнага ўтварэння монаэтнічнага характару, якія складаліся б выключна з прадстаўнікоў аднаго этнаса. Шматлікія міграцыі насельніцтва, а таксама актыўнае ўзаемадзеянне паміж рознымі народамі ў культурнай, гандлёва-эканамічнай, ваенна-палітычнай і сацыяльнай сферах зрабілі такі феномен як *нацыянальная* (этнічная) *меншасць* абавязковым атрыбутам любой краіны. Пад тэрмінам "нацыянальная меншасць" у этнаграфіі разумеюць *частку этнаса, адасобленую ад асноўнага этнічнага маства, якая пражывае ў іншаэтнічным асяроддзі.* Практычна сінанімічнай з'яўляецца і катэгорыя "этнічная меншасць". Аднак, пры гэтым, паняцці гэтыя не тоесныя. Калі нацыянальная меншасць прадстаўляе частку этнаса, які дасягнуў нацыянальнага ўзроўню развіцця і, у пераважнай большасці выпадкаў, мае сваю нацыянальную дзяржаву, то этнічная меншасць – частка народа, што яшчэ не сфармавалася ў нацыю. Так, у першым выпадку, мы можам гаварыць пра палякаў, літоўцаў ці рускіх Беларусі як пра нацыянальныя меншасці, у той час як цыганскае насельніцтва нашай краіны з'яўляецца этнічнай меншасцю. Пры гэтым, размова ідзе не пра перавагу ці непаўнавартасць нейкага народа і яго культуры, але пра адметнасць этнічнай гісторыі пэўнага этнасу.

Вывучэнне гісторыі і культуры этнічных меншасцяў краіны дазваляе зразумець не толькі іх уласную самабытнасць, але і гісторыю, характар і спецыфіку этнакультурнага ўзаемадзеяння з карэнным (тытульным) народам, што значна ўзбагачае веды пра этнічную гісторыю ўсёй краіны ў цэлым. Надзвычай важным з'яўляецца і стварэнне нацыянальнай дзяржавай спрыяльных умоў для захавання і развіцця культуры і самабытнасці нацыянальных меншасцяў, рэалізацыі іх нацыянальных патрэб (адукацыя, друк на роднай мове, установы культуры, свабода веравызнання і г.д.), што, пры павазе з боку апошніх да мовы, гісторыі і культуры карэннага этнаса, ёсць яскравым сведчаннем дэмакратычна спелага грамадства і залогам паспяховага развіцця нацыі ў перспектыве.

Закранаючы гістарычны аспект, неабходна адзначыць, што размова пра з'яўленне этнічных меншасцяў на тэрыторыі Беларусі можа весціся толькі пачынаючы з таго перыяду, калі сфармаваўся, як уласна беларускі этнас (XIII – XV стст.), так і тыя народы, прадстаўнікі якіх у далейшым склалі нацыянальныя меншасці на беларускіх землях.

Хоць перапіс 1999 г. зафіксаваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прадстаўнікоў звыш 130 нацыянальнасцяў (этнасаў), ніжэй разгледзім гісторыю і этна-культурную самабытнасць тых нацыянальных меншасцяў, што доўгі час пражывалі на землях Беларусі і з'яўляюцца найбольш знакавымі для этнічнай гісторыі нашай краіны.

*Яўрэі (габрэі, жыды)* (саманазва *йегудзім* – на іўрыце, *ідн* – на ідыш), этнічная супольнасць, якая дысперсна пражывае ў многіх краінах свету, складаецца з розных субэтнічных груп (ашкеназы, сефарды і інш.), мае адзіную этнічную свядомасць і аб'яднана агульным паходжаннем ад старажытных іудзеяў – выхадцаў з былога Ізраільска-Іудзейскага царства.

Яшчэ ў X – XIII стст. габрэі з Крыма пачалі рассяляцца па гарадах усходнеславянскіх княстваў. Тут яны сфарміраваліся ў асобную славянамоўную субэтнічную групу – *кенаанітаў*. Магчыма, у гэты час прадстаўнікі гэтай групы з'явіліся на паўднёвым захадзе Беларусі, дзе заснавалі нешматлікую абшчыну ў Берасці.

У XIV – XV стст. на тэрыторыі ВКЛ стала рассяляцца больш шматлікая субэтнічная група габрэяў – *ашкеназы* (ад Ашкеназ-Германія), якія размаўлялі на нямецка-габрэйскай мове *ідыш* (іўрыт выконваў толькі культавыя функцыі) і да XVII – XVIII стст. цалкам асімілявалі габрэяў-кенаанітаў. На тэрыторыі Беларусі і Літвы мясцовыя ашкеназы склалі асобную этнаграфічную групу – *літвакоў*. Абазнаныя ў гандлёвых, фінансавых і рамесніцкіх справах, праследаваныя па рэлігійных матывах у Заходняй Еўропе, габрэі былі заахвочаны да перасялення ў ВКЛ спецыяльнымі прывілеямі. Невыпадкова, што першыя буйныя абшчыны габрэяў склаліся ў Брэсце і Гродне – гарадах, найперш атрымаўшых Магдэбургскае права, дзе ўмовы для гандлёва-эканамічнай дзейнасці былі найбольш аптымальнымі.

У 1495 г. вялікі князь Аляксандр здзейсніў прымусовае выгнанне габрэяў з ВКЛ. Рэлігійная матывацыя высялення была чыста фармальнай, бо галоўным здабыткам дзяржавы рабілася закладзеная габрэйскім фінансістам зямельная маёмасць і грашовыя пазыкі мясцовай шляхты, якія павінны былі сплочвацца ўжо ў вялікакняскую скарбніцу. Паражэнне ў вайне з Масковіяй (1500 – 1503 гг.) каштавала вялізных выдаткаў і катастрафічна пагоршыла эканамічнае становішча княства. Крыніцай грашовых крэдытаў і пазык маглі быць яўрэі, і Аляксандр ізноў дазваляе ім сяліцца ў межах ВКЛ. Аднак цяпер геаграфія іх рассялення істотна пашыраецца. Апроч Брэста і Гродна, габрэйскія абшчыны ўзніклі ў Наваградку, Слоніме, Клецку, Полацку, Віцебску і іншых гарадах.

У XVI ст. перасяленне габрэяў у ВКЛ значна павялічылася за кошт эмігрантаў з нямецкіх зямель, Італіі і Чэхіі. У 1560-я гады агульная колькасць габрэяў на тэрыторыі ВКЛ дасягала 20 тыс. чалавек, а ў 1628 г. – каля 40 тыс. У гарадах і мястэчках Беларусі яны складалі да 10 % насельніцтва. Паколькі габрэі не мелі права набываць зямельную ўласнасць і, адпаведна, займацца сельскай гаспадаркай, то асноўнай сферай іх дзейнасці стаў гандаль, фінансавыя аперацыі і рамяство, што спарадзіла жорсткую канкурэнцыю з мясцовым гарадскім насельніцтвам. Так, у 1585 г. мяшчане Магілёва ў грамаце да караля прасілі: *“...обыхмо в том месте Могилёвском жидом домами селится не допустили, даючы тую причину, иж от них никоторого бы пожитку и порядку в месте том быти не могло, а им бы ся великая переказа в гандлях и торговлях от них деяла”* (Акты, относящиеся к истории Западной Руси. – Т. III. – СПб, 1848. – С. 296).

Супярэчлівае стаўленне да габрэяў выявіліся і ў тагачасным заканадаўстве – Статуце ВКЛ 1588 г. Паколькі габрэі валодалі значнымі фінансавымі рэсурсамі, у якіх была зацікаўлена дзяржава, то іх жыццё ацэньвалася даволі высока. Так, за забойства габрэя нават шляхціч павінен быў быць пакараны смерцю, у той час, як за забойства селяніна, яго чакаў толькі грашовы штраф. Паколькі ў сярэдневечным грамадстве рэлігійная ідэнтыфікацыя адыгрывала надзвычай важную ролю, то пераход габрэяў з іудаізму ў хрысціянства ўсяляк зааахвочваўся: *“А естли бы который жид або жидовка до веры христианское приступили, тогда каждая такая асоба и потомство их за шляхтича почитаны быть маюць”* (Статут ВКЛ 1588. Тэксты. Даведнік. Каментырыі. – Мн., 1988. – С. 315).

З другога боку, улады ВКЛ імкнуліся не дапусціць росту ўплыву габрэяў у дзяржаве і абмежаваць іх правы. Паводле заканадаўства габрэі не мелі права займаць дзяржаўныя пасады, валодаць прыгоннымі сялянамі і халопамі (хрысціянамі), быць сведкамі ў судовых спрэчках з хрысціянамі. За схіленне мясцовага хрысціяніна да пераходу ў іудаізм, габрэя чакала смяротнае пакаранне праз спаленне.

Разам з тым, менавіта ў XVI ст. аформілася абшчынная форма габрэйскага самакіравання – *кагал*, што яшчэ больш ізалявала габрэяў ад карэннага насельніцтва. Вышэйшым іх органам былі *ваады* – з’езды *рабінаў* (духоўных кіраўнікоў веруючых абшчын) і кагальных прадстаўнікоў. У 1623 – 1764 гг. вышэйшым органам габрэяў ВКЛ быў *Літоўскі ваад.*

Незадавальненне беларускіх сялян і гараджан багатымі габрэямі – адкупшчыкамі, арандатарамі, аканомамі маёнткаў, ліхвярамі, карчмарамі, узмоцненае рэлігійным адчужэннем, спрыяла фармаванню негатыўнага эт-

настэрэатыпу адносна габрэяў, што найбольш яскрава выявілася ў народным фальклоры, і, часам, прыводзіла да жорсткіх адкрытых канфліктаў. Так, адно з самых буйных сялянскіх паўстанняў у гісторыі Беларусі, якое ўзначаліў Васіль Вашчыла ў 1740 – 1744 гг., было выклікана жорсткай эксплуатацыяй і здзекамі над мясцовым насельніцтвам з боку арандатара-адкупшчыка Крычаўскага староства Гдаля Іцкавіча.

Пастановы соймаў Рэчы Паспалітай (1764; 1768) скасавалі шэраг ранейшых прывілеяў габрэяў (у тым ліку права набываць шляхецтва) і ўвялі абмежавальныя меры ў сферы рамёстваў, гандлю і інш.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі, усе беларускія губерні былі ўключаны ў *мяжу яўрэйскай аселасці*, якая павінна была прадухіліць прыток габрэяў ва ўнутрырасійскія рэгіёны. Гэтая мера прывяла да рэзкага росту габрэйскага насельніцтва ў беларускіх гарадах і мястэчках. Так, паводле перапісу 1897 г. колькасць габрэяў у пяці беларускіх губернях складала больш за 1202 тыс. чалавек (14,1 % усяго насельніцтва і каля 40 % гарадскога насельніцтва). У прамысловасці Беларусі гарэі складалі 56,5 % ад усіх занятых, у гандлі – 88,6 % (у той час як беларусы складалі толькі 1,7 % купцоў).

Негледзячы на палітычны і прававы ўціск (забарона купляць і арандаваць зямлю, займаць дзяржаўныя пасады, служыць у войску і г.д.) у XIX ст. паспяхова развіваецца культура габрэйскага насельніцтва Беларусі. Дзякуючы стварэнню разнагалінаванай сеткі *хедараў* (пачатковых рэлігійных школ) і *ешываў* (вышэйшых навучальных устаноў рэлігійнага характару), адукацыйны ўзровень габрэяў (42,2 % пісьменных) быў значна вышэйшы за ўзровень карэннага насельніцтва Беларусі (у сярэднім – 14,3 %). З Беларусі паходзілі вядомы філосаф С. Майман, гісторыкі А. Гаркаві, С. Дубноў. У мястэчку Капыль нарадзіўся *Мэндэле Мойхер-Сфорым*, адзін з пачынальнікаў новай габрэйскай літаратуры.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. габрэі атрымалі роўныя правы з грамадзянамі ўсіх нацыянальнасцяў краіны. У 1921 г. дэкрэтам ЦВК БССР мове ідыш быў нададзены статус дзяржаўнай разам з беларускай, рускай і польскай. Паводле перапісу 1926 г. у БССР пражывала 407 тыс. габрэяў (8,2 % насельніцтва рэспублікі). У той жа час былі створаны і габрэйскія нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – 19 мястэчковых і 3 сельскія саветы. Актыўна развівалася габрэйская адукацыя і культура. У 1927 г. налічвалася 147 пачатковых і 53 сямігадовыя габрэйскія школы, 3 педтэхнікумы; на ідыш выдаваліся кнігі, часопісы і газеты. Габрэйская культура дала свету такіх вядомых мастакоў, як Ю. Пэн, М. Ша-

гал, З. Азгур. У канцы 1930-х гадоў развіццё культуры і адукацыі габрэяў Беларусі, як і іншых нацыянальных меншасцей было згорнута.

У час Другой Сусветнай вайны на акупаванай тэрыторыі Беларусі габрэі падвергліся генацыду з боку нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1950 – 1990-х гадах колькасць габрэйскага насельніцтва Беларусі нязменна скарачалася, як за кошт асіміляцыйных працэсаў, так і за кошт міграцый. Так, калі ў 1950 г. у Беларусі пражывала 150 тыс. габрэяў, то ў 1999 г. – толькі 27810, з якіх толькі 1508 чалавек назвалі роднай мову сваёй нацыянальнасці. Разам з тым, у апошні час ажывілася грамадскае і культурнае жыццё габрэйскай нацыянальнай меншасці. У 1991 г. быў створаны Саюз беларускіх грамадскіх габрэйскіх аб'яднанняў і абшчын, які аб'ядноўвае больш за 40 арганізацый у 26 гарадах Беларусі. У Мінску з 1992 г. выдаецца рэспубліканская газета "Авив" ("Вясна"), у Віцебску з 1995 г. – альманах "Мишпоха" ("Сям'я"). Наладжаны трывалыя культурныя сувязі габрэйскай дыяспары з Ізраілем.

*Татары* (саманазва *татар*), народ цюркскай моўнай групы ва Ўсходняй Еўропе і Паўночнай Азіі. Падзяляюцца на волга-уральскіх (або казанскіх, асноўнае насельніцтва Рэспублікі Татарстан у Расіі), астраханскіх, сібірскіх, крымскіх, літоўскіх (беларуска-літоўскіх) і інш. У Рэспубліцы Беларусь паводле перапісу 1999 г. – 10089 чалавек.

Першыя звесткі пра знаходжанне татараў на тэрыторыі Беларусі адносяцца да XIV ст., калі Вялікія князі ВКЛ Гедымін, Кейстут, Альгерд запрасілі іх з Залатой Арды на службу і выкарыстоўвалі ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам. У ВКЛ таксама траплялі шматлікія татары-ваеннапалоныя, знаходзілі прытулак збеглыя ханы са сваімі паплечнікамі і прэтэндэнты на ханскі пасад. Пасля Кулікоўскай бітвы 1380 г. у ВКЛ эміґравала група мурзаў (буйных феадалаў, кіраўнікоў асобных ордаў і родаў) на чале з Мансур-Кіятам Мамаевічам, які лічыцца пачынальнікам роду Глінскіх.

Асаблівую апеку татарам аказваў Вітаўт, які разлічваў на іх як на ўмелых коннікаў і сяліў пераважна на заходніх межах дзяржавы і ў наваколлях буйных замкаў. У 1395 г. Вітаўт прыняў разбітага Цімурам хана Залатой Арды Тахтамыша і яго людзей, якія пасяліліся ў ваколіцах Ліды. Шмат татараў было перасялена ў ВКЛ у выніку сумеснага паходу Вітаўта і Тахтамыша пад Азоў у 1397 г. (гэтая дата традыцыйна лічыцца пачаткам пасялення татараў на Беларусі). Татары былі размешчаны каля Вільні, у Лідскім, Ашмянскім, Навагрудскім, Брэсцкім паветах, на ўмовах нясення вайсковай службы яны атрымалі зямельныя ўладанні і ў сваіх правах былі прыраўняны да мясцовага насельніцтва.

Татары даволі хутка інтэграваліся ў дзяржаўны арганізм ВКЛ і лічылі Княства сваёй новай радзімай, змагаючыся за яго інтарэсы са знешнімі ворагамі. Вельмі паказальным у гэтым плане з'яўляецца пасланне літоўскіх татараў сваім адзінаверцам, якія рабавалі паўднёва-усходнія межы ВКЛ: *"Ні Бог, ні прарок не дазваляюць вам рабаваць, а нам быць няўдзячнымі. Мы лічым вас за драпежнікаў і шаблямі нашымі забіваем рабаўнікоў, а не братоў нашых. Аставайцеся за Волгаю, пакуль іншыя вас не выжывуць, бо мы ля Вакі (каля Вільні) будзем кроў праліваць за літоўцаў, якія лічаць нас братамі сваімі".* Вялікую дапамогу аб'яднанным войскам ВКЛ і Польшчы аказалі татары і падчас Грунвальдскай бітвы (1410), у якой прымалі ўдзел *чамбулы* (харугвы) ханаў Джэлал-ад-Дзіна і Багардзіна.

На Беларусі татары пасяляліся згуртаванымі родаплемяннымі групамі (*улусамі*), што ўплывала на іх ваенна-адміністрацыйны лад: усе ваенна-служачыя татары падзяляліся на *харуствы* (тыя ж племянныя улусы), а ў ваенных адносінах – на сцягі (атрады). Падзел на улусы існаваў у татараў Беларусі да канца XVII ст.

Паводле сацыяльна-эканамічнага становішча татарскае насельніцтва на землях ВКЛ у XVI – XVII стст. можна ўмоўна падзяліць на 3 катэгорыі:

– найбольш прывілеяваная група – прамыя нашчадкі ардынскіх ханаў (роды Астрынскіх і Пунскіх) і мурзаў, якія атрымалі тытулы князёў: Крычынскія, Лоўчыцкія, Смольскія, Талькоўскія і інш. Яны валодалі вялікімі вотчынамі з сялянамі, за што павінны былі несці вайсковую службу;

– нашчадкі простых воінаў, якія атрымалі невялікія зямельныя надзелы і апроча вайсковай службы выконвалі павіннасці на карысць вялікага князя (транспартную, кур'ерскую, вартавую і інш.);

– гарадскія ("простыя") татары – самая бедная група, якая сфарміравалася з ліку тых перасяленцаў, што на гістарычнай радзіме былі не феадаламі, а вольнымі, або залежнымі, "ясачнымі людзьмі". У гарадах і мястэчках ім адводзілася зямля пад сядзібы і агароды. Яны неслі павіннасці, як і мяшчане, плацілі пагалоўны падатак. Асноўнымі іх заняткамі былі рамізніцтва, гарбарства, агародніцтва.

Негледзячы на пэўныя ільготы і рэлігійную верацярпімасць (свабодна дазвалялася вызнаваць іслам і будаваць мячэці), татары ў ВКЛ не мелі права ўдзельнічаць у выбарах у сойм і мясцовыя соймікі, займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

З-за згасання кантактаў з гістарычнай радзімай і шматлікіх шлюбаў з мясцовымі жанчынамі (дазвол Жыгімонта II на гэта быў неабходнасцю, бо для татараў не хапала нявест-татарак, што, у сваю чаргу, паўплывала на

звычай беларуска-літоўскіх татараў мець толькі адну жонку) у XVI – пачатку XVII ст. татары ВКЛ паступова страцілі родную мову (кыпчакская група цюрскіх моў) і сталі карыстацца беларускай (пазней таксама польскай, а з XIX ст. і рускай). Татары Беларусі, захаваўшы этнічную самасвядомасць, падвергліся значнаму беларускаму культурнаму ўплыву. На беларускай мове, але арабскім пісьмом, была створана багатая літаратура беларуска-літоўскіх татараў – *кітабы* (кнігі з легендарным, казачным, маральна-этычным, павучальным зместам), *тэджвіды* (кнігі-падручнікі па навуцы чытання Карана), *тэфсіры* (кнігі-падручнікі з каментарыямі і тлумачэннямі Карана), *хамаілы* (малітоўнікі) і інш.

Вусна-паэтычная спадчына беларускіх татараў вельмі блізкая да фальклору беларусаў, а такія жанры, як прыказкі, прымаўкі, песні, прыпеўкі і загадкі, амаль нічым не адрозніваюцца ад беларускіх. Больш арыгінальныя і пазбаўленыя моўнага ўплыву беларускага фальклору паданні, легенды і вусныя апавяданні татараў. Яскрава адбіўся беларускі ўплыў і на сямейнай абраднасці татараў: радзінах ("азан" наданне імя), вяселлі, пахаванні і хаўтурах.

Са свайго боку татары таксама паўплывалі на культуру беларусаў. Яны ўвялі ў беларускую мову шмат слоў-цюркізмаў (напрыклад, каракуль, атлас, аксакал, казак і інш.), пакінулі значны след у беларускай айканіміцы (назвах населеных пунктаў): Апчак, Арда, Койданава, Мамаі, Татаршчызна і інш.; занеслі на Беларусь высокую культуру агародніцтва і насенняводства кветак (адсюль, беларуская прымаўка: "Татары – добры гаспадары"), паўплывалі на адзенне і манеру яго аздаблення ў некаторых рэгіёнах Беларусі (напрыклад, Заходняе Палессе).

У XIX ст. узнікаюць новыя цэнтры татарскага насельніцтва ў Паўночнай Беларусі – у Відзах, Докшыцах, Глыбокім, Мядзеле. Агульная колькасць татараў на беларускіх землях у 1897 г. склала 13877 чалавек.

Пасля 1920 г. большая частка татараў, што пражывала на тэрыторыі Заходняй Беларусі, апынулася ў складзе Польшчы, што, аднак, не спыніла актыўнай дзейнасці па адраджэнні татарскай культуры. Былі створаны Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне (1925), Культурна-асветніцкі саюз татараў (1926); выдаваліся таатрскія часопісы і газеты, мусульманскія календары, падручнікі для дзяцей і інш.

У паваенны час у БССР пераехала пэўная колькасць волга-уральскіх, крымскіх, сібірскіх татараў. Такім чынам, сучаснае татарскае насельніцтва Беларусі складаецца з 4 супольнасцяў – мясцовай беларуска-літоўскай і трох груп усходніх татараў.

У 1989 – 99 гг. усю работу па нацыянальна-культурным адраджэнні самабытнага татарскага народа Беларусі разам з Мусульманскім аб'яднаннем Рэспублікі Беларусь каардынавала Беларускае згуртаванне татараў-мусульман "*Аль-Кітаб*" ("Кніга"). За гэты час былі адбудаваны цэнтры Этнаканфесійнай культуры татараў – мячэці ў Слоніме (1994), Смілавічах (1996), Навагрудку (1997), Відзах (1999), Клецку (2000), Лоўчыцах (2000), створаны татарскі культурны цэнтр у Іўі (1995).

*Цыганы* (саманазва *рома*), прадстаўнікі этнічных груп, аб'яднаных агульнасцю паходжання і мовы. Продкі – выхадцы з Індыі (канец І тыс. н.э.); у сучасным свеце па розных звестках налічваецца ад 2,5 да 10 млн чалавек. Паводле перапісу 1999 г., на Беларусі пражывае 9927 цыганоў. Мова цыганская, падзяляецца на шэраг дыялектаў, але большая частка цыганоў добра валодае і мовай таго народа, сярод якога жыве. Веравызнанне цыганоў залежыць ад пануючай рэлігіі краіны пражывання, прытрымліваюцца пры гэтым і традыцыйных вераванняў.

На Беларусі вылучаюцца групы так званых *рускіх цыганоў* (жывуць на Ўсходзе Беларусі, саманазва "руска рома", а паводле веравызнання – праваслаўныя) і *беларуска-літоўскіх цыганоў* (паўночна-заходняя Беларусь і памежныя раёны Літвы, саманазва "польска рома", паводле веравызнання – каталікі). Лінгвістычна і этнаграфічна беларуска-літоўскія цыганы бліжэй да рускіх цыганоў, чым да супляменнікаў, што пражываюць у Польшчы.

На Беларусі цыганы з'явіліся ў XV ст., прывандраваўшы з Польшчы і Германіі. У канцы XVI – пачатку XVII стст. яшчэ адна плыня цыганоў прыйшла з тэрыторыі Венгрыі.

Вандроўны лад жыцця цыганоў, іх адметная сацыяльная арганізацыя (плямёны пад уладай выбарных войтаў) і пабытовая спецыфіка (звычаі, знешні выгляд і г.д.) выклікалі насцярожанасць і недавер з боку аселага, пераважна земляробчага насельніцтва Беларусі. Негледзячы на тое, што сярод тутэйшага люду цыганы славіліся як добрыя спецыялісты ў гадоўлі і вывучцы каней, высокапрафесійныя кавалі, іх схільнасць да бадзяжніцтва, варажбы і чарадзейства, махлярства ў гандлі, а таксама конекрадства сфарміравалі ў беларускім сярэдневечным грамадстве ўстойлівы негатыўны стэрэатып адносна прадстаўнікоў гэтага народу, які знайшоў сваё адлюстраванне і ў тагачасным заканадаўстве. Так, у спецыяльным артыкуле "О цыганех" Статута ВКЛ 1588 г. гаворыцца: "*Иж цыгани суть люди непотребные и порожнуючые, которые не только жадное послуги, пожытку нам и никому в речы посполитой не чынять, але и овшем шкода через них в ошу-*

*киванью простых людей и в крадежы, а снать и в збыванью потаемном не малая ся дееть. А часом, выходечы до иншых земль, звлаща неприятельских шпегами и вожами до злого могли бы ставати. А прето уставуем, абы их конечно от того часу нигде в паньстве нашом Великом князьстве Литовском... далей не было ховано...*" (Статут ВКЛ 1588, С. 347). Аднак усе пастанаўленні, накіраваныя на выгнанне цыганоў з тэрыторыі ВКЛ, як правіла, мэты не дасягалі. Спробы ўладаў прымусіць цыганоў весці аселы лад жыцця спраўдзіліся толькі часткова. На Беларусі вядома некалькі цыганскіх вёсак (аднайменныя Цыганы ў Наваградскім і Гарадоцкім паветах, Завячэлле ў Лепельскім, Мяшчэнцы і Лапатнікі ў Сенненскім павеце і інш.).

Найбольш значным цэнтрам аселых цыганоў было мястэчка Мір, дзе яны ў другой палове XVIII ст. заснавалі суконныя, палатняныя і футравыя мануфактуры. Тут жа ў 1778 – 1790 гг. знаходзілася рэзідэнцыя і найбольш вядомага "*цыганскага караля*" (выбарны вярхоўны правіцель цыганоў, паўнамоцтвы якога падцвярджалі магнаты ці каралеўская канцэлярыя) *Яна Марцінкевіча*.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, колькасць цыганоў на беларускіх землях значна скарацілася. Разам са сваімі "каралямі" і "баронамі" большая частка цыганоў перасялілася ў Бесарабію, Малдову і Валахію. Вандроўныя цыганы, што засталіся ў Беларусі, пад уціскам царскіх уладаў вымушаны былі прыпісвацца да сельскіх абшчын ці мястэчак, дзе яны жылі асела толькі ў халодную пару года. У весну ж, сабраўшыся табарам (3 – 5 сем'яў) пад кіраўніцтвам важака, цыганы выпраўляліся ў вандроўку. Важак вызначаў час і напрамак вандровак, спосаб здабывання сродкаў да існавання, быў афіцыйным прадстаўніком табара перад мясцовымі ўладамі. Для вырашэння спрэчак і канфліктаў існаваў цыганскі суд, у які ўваходзілі найбольш паважаныя і старэйшыя па ўзросту члены табара. Жанчыны поўнасцю падпарадкоўваліся бацьку, потым мужу; як і ў даўнія часы, займаліся варажбой, знахарствам, папрашайніцтвам, спевамі і танцамі, клапаціліся пра забеспячэнне сям'і харчаваннем. Традыцыйнымі засталіся і заняткі мужчын – гандаль коньмі, канакрадства, кавальства, пляценне кашоў, разьба па дрэве і інш.

Хоць цыганы імкнуліся да аўтаномнага існавання, частка іх была асімілявана беларусамі яшчэ ў XIX ст. У гаворках цыганоў пад уздзеяннем лексікі беларускай мовы ўтварыўся шэраг характэрных запазычанасцяў. З другога боку, вобраз цыгана як кемлівага, спрытнага і, адначасова зладзеяватага, валацужнага чалавека заняў трывалае месца ў розных жанрах беларускага народнага фальклору.

Спробы далучыць цыганоў да аселага, земляробчага ладу жыцця прадпрымаліся і ў БССР, што вылілася ў стварэнне ў 1920 – 30-х гг. некалькіх цыганскіх калгасаў у Віцебскім, Лёзненскім, Езярышчынскім і Жлобінскім раёнах.

Пашырэнню культурна-асветніцкай работы сярод цыганоў Беларусі спрыяла ўвядзенне ў 1926 г. цыганскай пісьмовасці. У 1930-х гг. у Віцебску працавала некалькі цыганскіх школ. Негледзячы на прадпрыемствы ўладаў большасць цыганоў працягвала весці вандроўны ці паўвандроўны лад жыцця.

У Вялікую Айчынную вайну цыганы, як і яўрэі, падвяргаліся планамернаму фізічнаму вынішчэнню нямецкімі фашыстамі.

У паваенны час большасць цыганоў Беларусі перайшла да аселага жыцця, утварыўшы шэраг кампактных паселішчаў (пасёлкі Паўночны і Сляпянка ў Мінску, Цітаўка ля Бабруйску, Лазоўка ў Полацку і інш.).

З сярэдзіны 1990-х гадоў на Беларусі з’явіліся прадстаўнікі этнаграфічных груп сярэднеазіяцкіх цыганоў мусульманскага веравызнання – *джугі* ці *люля* (выхадцы, адпаведна, з Узбекістану і Таджыкістану), асноўным промыслам якіх з’яўляецца жабрацтва.

На 2002 г. у Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваны тры цыганскія грамадскія нацыянальна-культурныя аб’яднанні, якія захоўваюць і развіваюць этнакультурную самабытнасць беларускіх цыганоў.

*Рускія*, (маскоўцы, маскалі) (саманазва *русские*), народ усходнеславянскай моўнай групы, адзін з буйнейшых этнасаў свету, асноўнае насельніцтва Расійскай Федэрацыі. Найбольшая этнічная група ў Рэспубліцы Беларусь – 1142 тыс. чалавек (перапіс 1999 г.).

Пачатковы этап фармавання рускага этнасу прыпаў на XIII – XIV стст. У гэты перыяд у шырокіх кантактных зонах беларуска-рускага памежжа існаваў своеасаблівы абмен насельніцтвам, ішлі інтэнсіўныя культурна-бытавыя ўзаемаўплывы. Але з’яўленне “маскоўцаў” (палітонім, якім у ВКЛ пазначалі насельніцтва Маскоўскага княства), як асобнай этнічнай групы, прыпадае на канец XV – XVI ст., калі ў выніку актыўных баявых дзеянняў паміж ВКЛ і рускай дзяржавай на беларускія землі патрапіла шмат рускіх ваеннапалонных.

Значную частку гэтай этнічнай групы складалі ўцекачы з рускіх земляў, якія ратаваліся ад неабмежаванай тыраніі манархічнай улады (А. Курбскі, князі Ляцкія і інш.), царкоўнага праследу (вальнадумцы Арцемій, Ф. Касой), узмацнення феадальнага прыгнёту (сяляне, гарадскія нізы). Вялікая

колькасць эмігрантаў сялілася на ўсходніх межах ВКЛ, дзе несла службу ў якасці панцырных баяр, зямян, абслугі мясцовых гарнізонаў. Літоўска-беларускія феадалы ахвотна прымалі перабежчыкаў пад сваю апеку, давалі ім землі ў арэнду, вызвалялі на пэўны час ад падаткаў. Былыя прыгонныя сталі тут вольнымі людзьмі. Аднак, абсалютная большасць нашчадкаў гэтых добраахвотных перасяленцаў і ваеннапалонных паступова асімілявалася беларускім насельніцтвам, чаму спрыялі блізкасць мовы і агульнасць рэлігіі – праваслаўя.

У выніку рэформы патрыярха Нікана і расколу рускай праваслаўнай царквы ў другой палове XVII – пачатку XVIII стст. на Беларусь перасялілася некалькі дзесяткаў тысяч рускіх, якія ўтварылі тут замкнёную этнаканфесійную групу стараабраднікаў (раскольнікаў), якая выразна адрознівалася ў культурна-пабытовым плане ад мясцовага насельніцтва.

“Маскалі”-старaверы вызначаліся грунтоўнасцю вядзення гаспадаркі і яе заможнасцю, актыўнай прадпрымальніцка-гандлёвай дзейнасцю, якая насіла карпаратыўны характар. Знешні выгляд і адзенне таксама адрознівалі іх ад беларусаў: мужчыны абавязкова мелі бароды, насілі доўгія каптаны, шаравары, запраўленыя ў боты, падзёвы. Аснову жаночага строю складаў сарафан з сітца, штофу ці нават шоўку. Грамадскі быт стараабраднікаў таксама вылучаўся своеасаблівасцю. Катэгарычная забарона датычылася палення тытуню, строга рэгламентаваным было спажыванне алкаголю. Аднак заключэнне шлюбу, у адрозненне ад звышскладанага і развітага ў беларусаў вясельнага абрада, адбывалася на працягу аднаго вечара і, у секты беспапоўцаў, без царкоўнага вянчання, што спарадзіла ў тутэйшага насельніцтва ўстойлівае меркаванне аб распусце старавераў. Адносіны паміж беларускімі сялянамі і раскольнікамі былі даволі складанымі і напружанымі, бо апошнія, напрыклад, не лічылі за грэх красці ў мясцовага люду ў той час, як падобны ўчынак у адносінах да аднаверца разглядаўся імі як цяжкае злачынства. Нелюдзімасць, адасобленасць старавераў, шырокае выкарыстанне імі ненарматыўнай лексікі (мату), асаблівасці сямейнага жыцця, неўласцівыя беларусам, былі адзначаны вядомым этнографам і краязнаўцам XIX ст. А. Семянтоўскім: *“...раскольнікі трымаюць сябе адасоблена... не прызнаюць святасці шлюбу і наогул мала цэняць шлюбныя узы; жанчыны раскольніцы, у сваю чаргу, не надаюць вялікага значэння цнатлівасці і вернасці паміж супругамі; маральнасць раскольнікаў наогул ніжэй за мараль беларусаў. Першыя часцей абвінавачваюцца ў злачынствах, рабунках, гвалтах, крадзяжах, канакрадстве і г.д.”* (Сементовский А.К. Этнографический обзор Витебской губернии. – СПб, 1872. – С. 68).Падобную адзнаку

знаходзім і ў беларускім фальклоры: “На тое ён маскаль, каб краў”, “Не за тое маскаля б’юць, што ўкраў, а за тое б’юць, што дрэнна схаваў” (Federowski M. Lud bialoruski na Rusi Litewskiej. – T. IV. – Warszawa, 1934. – S. 179).

Разам з тым на фарміраванне беларускага стэрэатыпу адносна “масквы” (рускіх) не ў малой ступені паўплывалі крывавыя войны XVI – пачатку XVIII ст., калі руская армія праводзіла надзвычай жорсткую акупацыйную палітыку на захопленых беларускіх землях: “З туль маскалі, а з туль шведы, недзе дзецца з велькай беды”; “Маскаль слязам не верыць”, “Ад чорта адхрысцісься, а ад маскаля не адмолісься”; “– Тату, тату, лезе чорт у хату! – Няхай лезе, абы не маскаль” (Максимов С. Белорусская Смоленщина с её соседями // Живописная Россия. – Т. III. – СПб, 1882. – С. 438, 457).

Нягледзячы на далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі, колькасць рускіх (без уліку старавераў) у беларускіх губернях нават у 1861 г. была мізэрнай – каля 10 тыс. чалавек (альбо 0,3 % усяго насельніцтва). Аднак, да канца XIX ст. у выніку мэтанакіраванай палітыкі “обрусения края”, якая разгарнулася пасля задушэння паўстання 1863 – 64 гг., колькасць рускіх узрасла ў 23 (!) разы і склала ўжо 235 тыс. чалавек, ці 3,6 % усяго насельніцтва. Рускія складалі 54 % праваслаўнага духавенства, 46 % чыноўнікаў, 19 % дваран і 10 % купецтва.

У савецкі час, у перыяд ажыццяўлення беларусізацыі, пастановай ЦВК БССР (1921) за рускай мовай быў замацаваны статус адной з дзяржаўных, што давала рэальную магчымасць рускім дзецям (6 % ад агульнай колькасці вучняў) атрымліваць адукацыю на роднай мове. У 1926 – 27 гг. было створана і 14 нацыянальных рускіх сельсаветаў. Разам з тым, актыўнае будаўніцтва беларускай нацыі і набыццё этнонімам “беларусы” агульнадзяржаўнага сэнсу вялі да паслаблення этнічнай самасвядомасці рускага насельніцтва ў БССР.

Пасля Другой Сусветнай вайны рускія сталі адной з найбольш хутка растучых этнічных груп (у 1959г. – 659 тыс. чалавек, у 1989 г. – 1342 тыс. чалавек). Такое павелічэнне адбывалося галоўным чынам за кошт знешняй міграцыі, выкліканай патрэбай рэспублікі ў высокакваліфікаваных кадрах. Узнаўленне разбуранай вайной гаспадаркі, стварэнне новых галін прамысловасці суправаджалася прытокам рускіх, якія асядалі ў асноўным у гарадах.

Аднак у перыяд 1988 – 1999 гг., у сувязі з нарастаннем дэпапуляцыйных тэндэнцый і развіццём этнатрансфармацыйных працэсаў абсалютная колькасць рускіх на Беларусі паменшылася на 15 %. Перапіс 1999 г. выявіў, што сярод рускага насельніцтва назіраюцца адаптацыйныя працэсы да

беларускай мовы і культуры (9,1 % рускіх назвалі беларускую мову роднай). Рускія ў Рэспубліцы Беларусь маюць магчымасці для захавання сваёй мовы, культуры, падтрымліваюць сувязі з гістарычнай радзімай. У 1995 г. руская мова набыла разам з беларускай статус дзяржаўнай.

*Палякі* (саманазва *polacy*), народ заходнеславянскай моўнай групы, асноўнае насельніцтва Польскай Рэспублікі. У Беларусі каля 392 тыс. чалавек (3,9 % насельніцтва). Большасць веруючых палякаў – католікі.

Складванне польскай народнасці супадае з перыядам фармавання раннефеадальнай польскай дзяржавы (X – XI стст.). Этнічную аснову польскага народа склалі плямёны палян, слянзян, віслян, мазаўшан і памаран.

Этнакультурныя сувязі беларускага і польскага народаў маюць даўнія традыцыі. Яшчэ ў XII – XIII стст. пад націскам германскіх плямён і крыжацкай агрэсіі адбылося перасяленне часткі ляшскага насельніцтва (люцічаў, мазаўшан, памаран) на тэрыторыю беларускага Панямоння. Узмацненне польскага этнакультурнага ўплыву на Беларусі прыпадае на перыяд пасля Люблінскай уніі 1569 г., калі беларускія землі разам з іншымі землямі ВКЛ увайшлі ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую. Частка беларускага насельніцтва, асабліва прадстаўнікі шляхецкага саслоўя, гарадской вярхушкі, прымаючы каталіцкую або уніяцкую веру, змяняла сваё этнічнае самавызначэнне. Аднак, пры гэтым, перасяленне этнічных палякаў на беларускія землі было нязначным, паколькі Статут ВКЛ 1588 г. забараняў іншаземцам (у тым ліку і палякам) набываць землі на тэрыторыі Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Сваю этнічную спецыфіку захоўвалі групы мазурскіх перасяленцаў так званых *буднікаў* (чыншавая шляхта), што займаліся ляснымі промысламі і жылі на Палессі ў *будах* (невялікіх лясных паселішчах са смалакурняй). Многія дзяржаўныя і культурныя дзеячы ВКЛ XVI – XVIII стст. былі палякамі (Кішкі, Кавячынскія, Патоцкія, С. Будны, А. Волан, Я. Ласіцкі, П. Скарга і інш.).

З XVII ст. паланізацыя беларускіх магнатаў і шляхты набыла вялікія маштабы, многія з іх, з’яўляючыся этнічнымі беларусамі, пазней прыпісвалі сабе польскае паходжанне. Амаль да пачатку XX ст. паланізаваную беларускую шляхту афіцыйныя ўлады прылічвалі да палякаў. За перыяд існавання Рэчы Паспалітай на беларускіх этнічных землях і беларуска-літоўскім этнічным памежжы ўтварыліся пэўныя тэрыторыі, на якіх сяляне, што былі католікамі па веравызнанні, вызначалі сваю этнічную прыналежнасць як польскую і імкнуліся да пераймання пэўных элементаў польскай культуры. Ва ўмовах, калі на беларускіх землях існавалі розныя формы шматмоўя, у тым ліку беларуска-польскае, узнік і ў далейшым уздзейнічаў на

працэс фарміравання польскай літаратурнай мовы мясцовы дыялект польскай мовы, так званая *ўскраінная польская мова* (polszczyzna kresowa), творчасць на якой праславіла такіх літаратараў як Адам Міцкевіч, Ян Баршчэўскі, Уладзіслаў Сыракомля, Ян Чачот, Эліза Ажэшка і шмат інш.

У 1897 г. у Беларусі жыло больш за 324 тыс. палякаў, большасць з якіх пражывала на Гродзеншчыне (161 тыс. чалавек) і меншасць на Магілёўшчыне (17,5 тыс. чалавек).

Павелічэнне колькасці палякаў у Беларусі ў ХХ ст. адбывалася ў асноўным на заходнебеларускіх землях, якія ў 1921 – 39 гг. уваходзілі ў склад Польшчы. Ва ўмовах нацыянальна-культурнага, рэлігійнага і сацыяльнага прыгнёту беларускага насельніцтва, польскія ўлады праводзілі актыўную палітыку акаталічвання і паланізацыі нацыянальных меншасцяў краіны. У Заходнюю Беларусь з этнічных польскіх зямель перасяляліся групы *асаднікаў* (ваенных і цывільных каланістаў), розныя катэгорыі рабочых і чыноўнікі (усяго каля 300 тыс. чалавек). У той жа час у БССР, дзе палякі з'яўляліся адной з асноўных этнічных груп (паводле перапісу 1926 г. – 97,5 тыс. чалавек), этнакультурныя асаблівасці польскага насельніцтва, спецыфіка этнічных сувязяў беларускага і польскага народаў улічвалася ўсебакова і па магчымасці поўна.

У БССР дзейнічала 136 польскіх школ, педагагічны тэхнікум, польскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. На польскай мове выдаваліся кнігі, часопісы і газеты. У месцах кампактнага пражывання польскага насельніцтва з 1926 г. быў створаны 31 польскі нацыянальны сельсавет. У 1932 – 37 гг. існавала даволі буйная аўтаномная адзінка – *Польскі нацыянальны раён* (цэнтр – Койданава), дзе было 10 польскіх нацыянальных сельсаветаў. Вывучэннем матэрыяльнай і духоўнай культуры палякаў у Беларусі займаўся польскі сектар Інбелкульта. Аднак у выніку палітычных рэпрэсій і пагаршэння савецка-польскіх адносін у 1937 г. культурнае і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва палякаў у БССР было згорнута. Па абвінавачванні ў шпіянажы на карысць Пльшчы было арыштавана каля 10 тыс. палякаў. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (верасень 1939 г.), яшчэ да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, значная колькасць палякаў, што пражывалі на далучаных тэрыторыях, былі дэпартаваны, як палітычна недабранадзейныя, у аддаленыя раёны Сібіры, Казахстана, Далёкага Усходу. Гэтыя рэпрэсіі прывялі да росту масавых антысавецкіх і антыбеларускіх настрояў сярод польскага насельніцтва, што асабліва праявілася ў характары партызанскай дзейнасці польскай "Арміі Краёвай" падчас нямецка-фашысцкай акупацыі Беларусі і ў першае паваеннае дзесяцігоддзе.

Паводле дамоўленасці паміж уладамі БССР і ПНР у 1944 – 48 гг. у рамках абмену насельніцтва з Беларусі ў Польшчу было пераселена 274,2 тыс. чалавек польскай нацыянальнасці, у тым ліку пэўная колькасць беларусаў-католікаў, якія пры перасяленні падалі сваю нацыянальнасць як польскую.

У другой палове 1980-х гадоў у сувязі з развіццём дэмакратызацыі ў СССР пачалося адраджэнне культуры палякаў Беларусі. Былі створаны саюзы палякаў больш чым у 30 гарадах краіны, пачалі актыўна дзейнічаць польскія мастацкія калектывы і культурныя цэнтры. Адчыніліся польскія школы ў Гродне, Ваўкавыску, Сапоцкіне і асобныя польскія класы ў школах Мінска, Клецка, Койданава (Дзяржынска). Створаны Польскія грамадскія аб'яднанні: "Саюз палякаў Беларусі" (1988), "Польскае дэмакратычнае аб'яднанне" (1944) і інш., пасродкам якіх наладжаны трывалыя сувязі палякаў Беларусі з Польшчай.

*Украінцы* (саманазва *українці*), народ усходнеславянскай моўнай групы, асноўнае насельніцтва Украіны (звыш 37 млн чалавек паводле перапісу 1989 г.). У Рэспубліцы Беларусь, па дадзеных перапісу 1999 г., налічваецца 237 тыс. чалавек. Пры гэтым, па Беларусі вылучаюць дзве групы украінцаў: выхадцы з Украіны і аўтахтонныя жыхары беларускага Палесся (пераважна ў межах Брэсцка-Пінскага рэгіёна), для якіх характэрна ўкраінская ці часцей пераходная (украінска-беларуская, беларуска-украінская, палеска-украінская і інш.) самасвядомасць.

Са старажытных часоў у шырокіх кантактных зонах беларуска-украінскага памежжа адбываліся інтэнсіўны абмен і актыўныя культурна-бытавыя ўзаемаўплывы. У XIV – пачатку XVI стст. (да Люблінскай уніі 1569 г.) большая частка украінскіх зямель уваходзіла ў ВКЛ, дзе украінцы разам з беларусамі і літоўцамі былі адным з дзяржаваўтваральных этнасаў княства. Шэраг буйных магнацкіх родаў ВКЛ выводзілі свой радавод з Украіны ці мелі там галоўныя радавыя маёнткі (Астрожскія, Вішнявецкія, Тышкевічы, Хадкевічы, Чартарыйскія і інш.). Мова стараўкраінскай літаратуры XV – пачатку XVI стст. з Валыні і Галіцыі амаль не адрознівалася ад тагачаснай літаратурнай мовы беларусаў.

Пісьменства і кніжнасць украінцаў і беларусаў у гэты перыяд развівалася разам. Агульным культурным здабыткам украінскага і беларускага народаў у XVI – XVII стст. з'яўляюцца кнігадрукаванне і літаратурная дзейнасць праваслаўных брацтваў, палемічная літаратура, патрыстыка і інш. Шэраг выдатных дзеячоў культуры таго часу (Л. і Е. Зізаніі, М. Сматрыцкі, С. Косаў і інш.) былі адначасова ўкраінскімі і беларускімі пісьменнікамі.

Супольны ўдзел украінцаў і беларусаў у казацкім паўстанні 1648 – 1654 гг. і вайне 1654 – 1667 гг. абумовіў прыток насельніцтва з Украіны (казакоў і выхадцаў з Валыні) на Беларусь і наадварот з Беларусі на Украіну, у тым ліку да запарожскіх казакоў.

Этнічныя межы рассялення ўкраінцаў і беларусаў былі заўсёды невыразныя, што ў этнографаў XIX ст. выклікала цяжкасці ў гэтым пытанні. І дагэтуль даволі складана правесці мяжу ў Заходнім Палессі, якое з'яўляецца старажытнай зонай славянскай каланізацыі і доўгі час захоўвала архаічныя рысы ў народнай культуры і побыце, характарызавалася этнічнай неразмежаванасцю.

Этнічная самасвядомасць палешукоў вызначалася як прыналежнасцю да ўсходняга славянства, так і да пэўнай усходне-славянскай этнаграфічнай групы. Адной з найбольш значных такіх груп з'яўляецца *брэсцкапінская* (“*загародская*”) этнаграфічная група, у якой у параўнанні з іншымі палескімі групамі на тэрыторыі Беларусі ў гаворцы і самасвядомасці найбольш праяўляюцца рысы “украінскасці”. Саманазвай для палешукоў доўгі час з'яўляўся агульны для ўсходніх славян этнонім рускія (*руськы*). У XIX – пачатку XX стст. сярод значнай часткі палешукоў была пашырана “агульнаруская” самасвядомасць. Як украінская, так і беларуская нацыянальная арыентацыя ў параўнанні з іншымі украінскімі і беларускімі этнічнымі тэрыторыямі прыйшла на Палессе запознена. Сутыкненне некалькіх нацыянальных ідэй прыводзіла да фарміравання розных варыянтаў пераходнай самасвядомасці, якая магла быць рознай нават у родных братоў і магла мяняцца ў аднаго чалавека некалькі разоў на працягу жыцця. Перапіс 1897 г. (шмат у чым супярэчлівы і недакладны) падае наступныя звесткі пра колькасць украінскага насельніцтва на тэрыторыі беларускага Палесся: у Бельскім павеце – 64256 (39,1 % насельніцтва), у Брэст-Літоўскім – 140561 (64,4 %), у Кобрынскім – 146789 (79,6 %), у Пружанскім – 9278 (6,7 %).

Аднак польскія афіцыйныя дадзеныя перапісу 1921 г. істотна адрозніваюцца ад прыведзеных вышэй лічбаў. Так, “*русінаў*” (назва украінцаў паводле тагачаснай польскай тэрміналогіі) у адпаведных паветах налічвалася: у Брэсцкім – 2744 (2,4 % насельніцтва), Кобрынскім – 2224 (3,5 %), Пружанскім – 112 (0,2 %). У 1920 – 30-х гг., нягледзячы на дыскрымінацыйную палітыку польскіх уладаў у адносінах да нацыянальных меншасцяў, у Заходнім Палессі значна пашыраецца украінская самасвядомасць, актывізуецца нацыянальна-культурны рух (грамадская арганізацыя “Прасвіта”, палітычныя арганізацыі “Сельраб”, “Сельсаюз”, Камуністычная партыя Заходняй Украіны і інш.).

У 1941 г. нямецка-фашысцкія акупацыйныя ўлады ўключылі ў склад рэйхкамісарыята “Украіна” асноўную частку Брэсцка-Пінскага і частку Гомельскага Палесся, адпаведна карэннае насельніцтва гэтых абшараў было запісана ўкраінцамі. Пэўная частка жыхароў Заходняга Палесся змагалася супраць фашысцкай акупацыі (а пасля вайны – супраць савецкай улады) у шэрагах партызанскай “Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў”.

Да 1950-х гг. у вёсках і мястэчках гэтага рэгіёну развівалася ўкраінская мастацкая самадзейнасць, ствараліся фальклорныя і драматычныя гурткі. Паводле пасляваенных перапісаў дынаміка колькасці ўкраінцаў і іх доля сярод насельніцтва Беларусі была наступная: у 1959 г. – 133 тыс. чалавек (1,7 %), у 1979 г. – 231 тыс. чалавек (2,4 %), у 1989 г. – 291 (2,9 %). Рост адбываўся пераважна за кошт перасяленцаў з Украіны і іх нашчадкаў, бо абсалютная большасць карэнных жыхароў Заходняга Палесся была пазначана ў перапісах як беларусы. За гэты час у рэгіёне пашырылася і ўмацавалася беларуская самасвядомасць.

Працэсы дэмакратычнай перабудовы грамадскага жыцця ў канцы 1980-х гадоў паўплывалі на нацыянальна-культурнае адраджэнне ўкраінцаў Беларусі. Сталі стварацца ўкраінскія грамадскія арганізацыі (“Кобзар”, Мінск; “Верховина”, Гомель; “Культурна-асветнае адзінства ўкраінцаў “Палессе”, Брэсцкая вобл.; Беларуская асацыяцыя ўкраінцаў “Ватра” і інш.), якія і ў наш час вядуць актыўную дзейнасць па адраджэнні і захаванні ўкраінскай культуры, мовы, гісторыі, рэлігіі і традыцый.

*Латышы* (саманазва *latviesi*), народ балцкай моўнай групы, асноўнае насельніцтва Латвійскай Рэспублікі (каля 1,4 млн чалавек); у Рэспубліцы Беларусь налічваецца каля 2600 латышоў.

Этнакультурныя сувязі беларускага і латышскага народаў маюць даўнія традыцыі, асабліва ў памежных рэгіёнах. На тэрыторыі, дзе жылі латгалы, у XI ст. былі заснаваны фарпосты полацкіх крывічоў у Ніжнім Падзвінні – гарады Кукейнос і Герцыке.

У XIII ст. жыхары Полацкай зямлі разам з латгаламі і іншымі балцкімі плямёнамі вялі супольную барацьбу з агрэсіяй нямецкіх рыцараў у Прыбалтыцы. Аднак, як асобная этнічная група на тэрыторыі Беларусі, латышы пачалі фарміравацца толькі з канца XVIII ст., што было звязана з перасяленнем латышскіх каланістаў на паўночна-усходнія беларускія землі. На Віцебшчыне латышы ўтваралі хутары і невялікія сельскія паселішчы, на Магілёўшчыне – пераважна вёскі. У 1897 г. найбольш значныя групы латышоў жылі ў Віцебскім (каля 4 тыс. чалавек), Полацкім (каля 1,7 тыс. чалавек), Аршанскім (да 3,7 тыс. чалавек) і Быхаўскім (каля 1 тыс. чалавек) паветах.

Пераважная большасць веруючых латышоў на Беларусі былі лютэране, нязначная частка – католікі і праваслаўныя. У пачатку XX ст. у Лёзне дзейнічала латышскае праваслаўнае брацтва.

Асноўнымі заняткамі латышоў, што пражывалі ў сельскай мясцовасці былі земляробства, жывёлагадоўля, садаводства, розныя віды промыслаў (піва-, сыраварэнне) і рамёстваў (пераважна ткацтва). У народных характарыстыках беларусаў латышы фігуруюць, як працавітыя, руплівыя і майстравітыя гаспадары, што вылучаюцца спакойным, ураўнаважаным характарам, дабрасумленнасцю і высокай маральнасцю. З другога боку, іх незразумелая мова, адасоблены (хутарскі) лад жыцця спарадзілі ў беларусаў Віцебшчыны ўяўленні пра чарадзейскія і знахарскія здольнасці латышоў, якія, аднак, выкарыстоўваліся супраць розных злодзеяў, але не на шкоду добрым людзям: “Беларускія сяляне лічаць латышоў чараўнікамі, бо яны жвавейшыя і спрытнейшыя за беларусаў; скрадзенае някемным беларусам хітры латыш адразу ж знойдзе” (Р. Падбярэскі. “Лісты пра Беларусь”, 1844). Але такія выпадкі былі надзвычай рэдкімі, бо, у цэлым, адносіны паміж беларусамі і латышамі-пасялянамі вызначаліся ўзаемапавагай і добразычлівасцю. Гэтаму не ў малой ступені спрыяла этнагенетычная роднасць паміж народамі і значнае падабенства гаспадарча-пабытовага ўкладу, матэрыяльнай і духоўнай культуры, што адзначылі этнографы яшчэ ў XIX ст.: “У звычаях і ладзе жыцця латышы шмат у чым падобныя да літоўцаў і беларусаў” (Живописная Россия. – СПб., 1882. – Т. III. – С. 285).

Нацыянальна-культурны ўздым сярод латышоў Беларусі назіраўся ў 1920-я гады: былі створаны нацыянальныя латышскія сельсаветы (Быхаўскі, Лёзненскі, Клімавіцкі, Глускі, Ушацкі раёны), адчынены латышскія школы, на латышскай мове выходзіла літаратура, гучалі радыёперадачы). Аднак, ужо ў 1936 – 1940 гг. большая частка латышоў была рэпрэсавана і выслана за межы БССР.

З канца 1950-х гадоў колькасць латышоў у Беларусі застаецца адносна стабільнай (у 1959г. – 2631 чалавек, у 1979 г. – 2617), аднак, у адрозненне ад даваеннага перыяду, большасць латышоў (65 %) пражывае ўжо ў гарадах.

Нацыянальна-культурнае адраджэнне канца 1980-х – сярэдзіны 1990-х гадоў закранула і беларускіх латышоў. З 1995 г. дзейнічае “Саюз латышоў Віцебскай вобласці “Даўгава”.

*Літоўцы* (саманазва *lietuviai, летувяй*), народ балцкай моўнай групы, асноўнае насельніцтва Літоўскай Рэспублікі (каля 2,7 млн чалавек). У Рэспубліцы Беларусь пражывае каля 7,5 тыс. літоўцаў.

Фарміраванне літоўскай народнасці, этнічную аснову якой склалі племянныя аб'яднанні *аўкштойтаў* і *жэмайтаў*, завяршылася ў XIII – XIV стст. У склад літоўскай народнасці ўвайшлі таксама роднасныя ім плямёны яцвягаў, куршаў, земгалаў, селаў, прусаў. Кансалідацыя літоўцаў у нацыю завяршылася ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Беларуска-літоўскія этна-культурныя сувязі маюць даўнія традыцыі. На працягу XIII – XVIII стст. беларускія і літоўскія землі ўваходзілі ў склад ВКЛ. Пры гэтым і беларускае і літоўскае насельніцтва аб'ядноўваў адзіны палітонім "ліцвіны". Моцным інтэграцыйным фактарам у XV – XVII стст. выступала старабеларуская мова, якая выконвала функцыі агульнадзяржаўнай. Шматлікая арыстакратыя літоўскага паходжання мела тэндэнцыю да абеларушвання, з другой паловы XVIIст. – да паланізацыі. Тая ж тэндэнцыя назіралася і сярод літоўскага гарадскога насельніцтва. Моцны культурны ўплыў беларусаў адчувалі літоўскія сяляне *дзукі* (лакальная група аўкштайтаў, што пражывае на Паўднёвым Усходзе Літвы, у Дзукіі). Да канца XIX ст.гэта прывяло да маштабнай беларусізацыі Віленскага краю.

Яшчэ ў першай палове XX ст. некаторыя жыхары заходняй Гродзеншчыны, Ашмяншчыны і Слонімшчыны памяталі, што іх бацькі ці дзяды размаўлялі на літоўскай мове, якую яны ўжо не ведаюць.

У 1870 – 90-х гадах адзначана перасяленне літоўскіх сялян на ўсходнія і паўночна-усходнія землі Беларусі. У 1897 г. кампактныя групы літоўцаў жылі ў Лідскім (17285 чалавек), Ашмянскім (8754), Гродзенскім (2814), Аршанскім (каля 1400), Сенненскім (каля 800) і шэрагу іншых паветаў. Гаспадарчыя заняткі (земляробства, жывёлагадоўля, промыслы), побыт, матэрыяльная і, часткова, духоўная культура літоўскіх перасяленцаў мелі шмат агульнага з культурай беларускага насельніцтва. Узаемаадносіны паміж беларускімі сялянамі і літоўцамі вызначаліся дабразычлівасцю, узаемадапамогай і адсутнасцю канфліктаў.

Перад Першай Сусветнай вайной толькі на Ўсходзе Беларусі жыло каля 10 тыс. літоўцаў. У час вайны ў выніку міграцыі з этнічнай Літвы павялічылася колькасць літоўцаў-гараджан.

Паводле перапісу 1926 г. у БССР было 6564 літоўцаў, у тым ліку да 2 тыс. гараджан (Віцебск, Барысаў, Гомель, Мінск). Да калектывізацыі літоўцы БССР утваралі больш за 50 асобных населеных пунктаў. У месцах кампактнага рассялення літоўцаў у 1920 – 30-ыя гады існавалі нацыянальныя калгасы (з 1928 па 1939 г. існаваў Малькаўскі літоўскі нацыянальны сельсавет). У БССР дзейнічалі літоўскія школы (у 1934 – 35 гг.), працаваў літоўскі сектар Акадэміі навук, выдавалася газета "Raudonasis Artoias" ("Чырвоны араты"), рэспубліканскае радыё транслявала перадачы на літоўскай мове.

У пасляваенны час, пераважна ў 1950-ыя гады, з месцаў кампактнага пражывання літоўцаў на Беларусі адбывалася міграцыя ў Літоўскую ССР, у сувязі з чым колькасць беларускіх літоўцаў, у параўнанні з даваенным часам, скарацілася і склала ў 1979 г. – каля 7 тыс. чалавек.

На сённяшні момант большасць літоўцаў Беларусі пражывае ў Гродзенскай вобласці – у Астравецкім і Воранаўскім раёнах. Тут дзейнічае тры літоўскія школы, у в. Рымдзюны (Астравецкі раён) будуецца Літоўскі грамадска-культурны цэнтр.

Нягледзячы на актыўныя працэсы этнакультурнага збліжэння, літоўскае насельніцтва ў многім захоўвае асаблівасці побыту і культуры.

## Асноўная літаратура


Беларусазнаўства. Навучальны дапаможнік. – Мн., 1998.

Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. – Мн., 2004.

Беларусы: Этнагеаграфія, дэмаграфія, дыяспара, канфесіі. – Мн., 1996.

Живописная Россия. Т. III. – Мн., 1992.

Думін С.У., Канапацкі І.Б. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. – Мн., 1993.

Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зборнік навуковых прац. Кн. 1 – 2. – Брэст – Віцебск, 1996.

Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі. – Мн., 2001.

Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989.


## Літаратура для паглыбленага вывучэння тэмы


Борисёнок Ю., Лобач В. Восточный сосед: образ русского в белорусской традиционной культуре // Родина. – 2002. – № 7. – С. 46 – 49.

Бядуля Зм. Жыды на беларусі. – Мн., 1918 (Рэпрынт. выд. – Мн., 1992).

Даўгяла Зм. Цыганы на Беларусі // Спадчына. – 1992. – № 4. – С. 54 – 67.

Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). – Мн., 1998.

Лакотка А.І. Бераг вандраванняў, ці адкуль у Беларусі мячэці. – Мн., 1994.

Скир А. Еврейская духовная культура в Беларуси. – Мн., 1995.

Сосіс І. Яўрэі на Беларусі // Спадчына. – 1992. – № 2. – С. 75 – 81.

Терешкович П. Русские в Беларуси// Нёман. – 1992. – № 6. – С. 164 – 176.

Шпилевский П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. – Мн., 1992.

ДАДАТАК 1

## ДА МЕТОДЫКІ ПАЛЯВОЙ ЭТНАГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

1. Выбар месца правядзення этнаграфічнай экспедыцыі мусіць вынікаць не з уяўнай "экзатычнасці" і аддаленасці рэгіёна, але, перадусім, з навуковай мэтазгоднасці і сувязі дадзенага палявога пошуку з папярэднімі і меркаванымі наперад этапамі даследчыцкай дзейнасці.

2. Правядзенне ў тым ці іншым рэгіёне фальклорных і этнаграфічных экспедыцый ранейшых (савецкіх) часоў не павінна слугаваць фактарам, які выключае гэтыя мясціны з аб'ектаў сучаснага этнаграфічнага даследавання, якое вылучаецца значна большай універсальнасцю і ўсеабдымнасцю (ідэалагічнай незаангажаванасцю).

3. Кіраўнік экспедыцыйнай групы павінен не толькі сам азнаёміцца з усімі, дасяжнымі яму, матэрыяламі, што характарызуюць этнакультурную спецыфіку рэгіёну, меркаванага для даследавання, але вылучыць базавы мінімум інфармацыі, неабходны для ўсіх удзельнікаў групы, азнаямленне з якім можа адбывацца як на адпаведных семінарах-трэнінгах, так і самастойна.

4. Тэматычная скіраванасць палявых даследаванняў ва ўмовах стацыянарнай экспедыцыі мусіць насіць шматаспектны характар, бо выключная цікавасць, прыкладам, да абрадавага фальклору ці сакральнай тапаграфіі, пакідае па-за ўвагай не менш значныя кампаненты духоўнай культуры (этна-сацыяльныя стэрэатыпы, рэлігійная свядомасць, этнаграфія дзяцінства, сакральная кулінарыя ці маладзёвая субкультура ў традыцыйнай супольнасці), што і ёсць уласна складнікамі традыцыйнай светапогляднай мадэлі.

5. Пры падрыхтоўцы экспедыцыі найбольш апраўданым з'яўляецца вылучэнне як універсальных (агульных) для ўсёй групы тэм (напрыклад, каляндарная і сямейная абрадавасць, фальклор, сакральная тапаграфія), так і асобных накірункаў даследавання, замацаваных (з улікам асабістай зацікаўленасці ці абазнанасці за кожным удзельнікам групы. Распрацоўка сваёй "дзялянкі" ў экспедыцыі дазваляе больш глыбока вывучаць канкрэтны феномен традыцыйнай культуры і пазбягаць "усеабдымнасці" пры палявых даследаваннях, якая, направер, аказваецца павярхоўнасцю і фрагментарнасцю.

6. З улікам папярэдняга пункта, імкненне палявой групы ахапіць этнаграфічным даследаваннем як мага большую колькасць паселішчаў пада-

еціца неэфектыўным, бо на першы план выносяцца не якасныя, а колькасныя параметры даследавання, у той час як традыцыйная мадэль светаладу, як правіла, была прадметна рэалізаваная ў межах “свайго” ці “малага” свету, які ўлучаў 1 – 5 вёсак з ваколіцамі.

7. Абавязковым для ўдзельніка экспедыцыі з’яўляецца вядзенне *палявога этнаграфічнага сшытка* і *дзённіка*. Першы прызначаны для пісьмовай фіксацыі (з адпаведнай пашпартызацыяй: імя, імя па бацьку, прозвішча, год і месца нараджэння, этнаканфесійная прыналежнасць інфарматара) матэрыялаў, што не знайшлі свайго адлюстравання на аудыё- і відэаносьбітах, і змяшчэння каментараў і ўдакладненняў адносна аудыё- і відэаматэрыялаў. Палявы дзённік – адлюстроўвае этапы, паслядоўнасць, асаблівасці і праблемы асабістага даследавання і, што самае галоўнае, змяшчае ў сабе першасныя рэфлексіі і водум даследчыка, якія ўзнікаюць непасрэдна падчас “палявой сітуацыі”. Каштоўнасць дзённіка ў тым, што ён, на прашэсці значнага часу, дазваляе ўзнавіць непасрэдную, эмацыйную рэакцыю даследчыка і сітуатыўную праблематыку, што ўзнікла ў “полі”, і тым самым дапамагае больш поўна і аб’ектыўна асэнсаваць і прааналізаваць зафіксаваныя матэрыялы, асабліва, калі іх апрацоўка вядзецца іншымі людзьмі;

8. “Поле” – далёка не тое месца, дзе даследчык павінен выяўляць сваю абазнанасць у навуковай тэрміналогіі, валоданне чыстай літаратурнай мовай і свае палітычныя прыхільнасці: з тым, каб суразмоўца адказаў на пытанне, яно мусіць быць сфармулявана і зададзена “людскай” (зразумелай) мовай. Гэткай жа мовай фіксуюцца (пісьмова) адказы, любыя скажэнні і літаратурныя выпраўленні – недапушчальныя.

9. Найбольш аптымальная колькасць даследчыкаў у палявой групе – 2 (максімум 3) чалавекі; часам, у залежнасці ад сітуацыі (характар і настрой інфарматара, спецыфіка тэмы), найбольш эфектыўнай з’яўляецца форма камунікацыі “сам-насам” ці, наадварот, варыябельнасць традыцыйнай духоўнай культуры найбольш ярка праяўляецца ў апытанні групы (сітуацыя чакання аўталаўкі, кароў з пашы і г.д.). У межах палявой групы пажадана, каб асабістыя тэмы даследаванняў былі сумежнымі ці лагічна знітаванымі, што дазваляе весці мэтанакіраванае перахроснае апытанне;

10. Паводле вынікаў кожнага палявога дня мэтазгодна ў межах базавага лагеру праводзіць аператыўныя абмеркаванні, што дазваляе падсумоўваць набыткі, вызначаць бягучыя праблемы, карэктаваць методыку і прыярытэты пошуку і праграмаваць (сёння – на заўтра) далейшую даследчыцкую дзейнасць.

ДАДАТАК 2

## БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА

Тэрмін "*дыяспара*" (ад грэч. "*diaspora*" – рассейванне) у этнаграфіі азначае *частку народа (этнічнай супольнасці), якая пражывае па-за межамі краіны (гістарычнай тэрыторыі) свайго паходжання.*

У розных гістарычных умовах перасяленне насельніцтва беларускіх этнічных зямель у іншыя рэгіёны было выклікана эканамічнымі, палітычнымі, ваеннымі, рэлігійнымі і іншымі прычынамі. Ранняя эміграцыя была нешматлікай і вызначалася ўцёкамі з ВКЛ паўкрыўджаных ці незадаволеных дзяржаўнай палітыкай прадстаўнікоў пануючага саслоўя, што мелі, як правіла, зямельныя ўладанні ў памежных рэгіёнах краіны (напрыклад, чарнігаўскія і северскія баяры).

Натуральнай эміграцыі з беларускіх зямель садзейнічалі створаныя ў ВКЛ прававыя падставы. Так, Статуты ВКЛ 1566 г. і 1588 г. прадугледжвалі для вольных людзей розных саслоўяў права выезда ў іншыя краіны (акрамя "непрыяцельскіх") для лячэння, набыцця адукацыі, навучання рамяству, прадпрымальніцкай дзейнасці і інш.

Значны рост перасяленцаў з тэрыторыі Беларусі ў канцы XVI – XVII стст. быў выкліканы ўзмацненнем прыгоннай эксплуатацыі і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту. У той жа час, Маскоўская дзяржава, якая мела вострую патрэбу ў працоўных рэсурсах (сяляне, рамеснікі), заахвочвала эміграцыю беларусаў як "исконно русских" з мэтай каланізацыі далучаных да яе Ўсходніх рэгіёнаў. У XVII – XVIII стст. у ходзе войнаў Рускай дзяржавы з Рэччу Паспалітай і іншымі дзяржавамі беларускія землі часта станавіліся арэнай жорсткіх бітваў, а іх жыхары масава выводзіліся ў глыб расійскай тэрыторыі. Толькі ў XVII ст. (у выніку казацкага паўстання 1649 – 1651 гг. і вайны 1654 – 1667 гг.) насельніцтва Беларусі скарацілася больш чым напалову: кожны другі жыхар загінуў або трапіў у палон і быў выселены ў Расію. На Украіну і ў Расію бегла насельніцтва ў галодныя неўрадлівыя гады (1588 г., 1601 – 1602 гг., 1655 г., 1690 г. і інш.), а таксама шукаючы паратунку ад эпідэмій (у XVI – XVIII стст. іх было больш за 80). Выхадцы з Беларусі і прымусова перасеrange сяляне, рамеснікі, гандляры, шляхта садзейнічалі гаспадарчаму асваенню Паволжа і Сібіры, некаторыя з іх займалі высокія ваенныя і дзяржаўныя пасады, сталі заснавальнікамі купецкіх радоў, узбагачалі культурнае жыццё ў месцах свайго пражывання.

У другой палове XVII ст. толькі ў Маскве выхадцы з Беларусі, якія пражывалі ў спецыяльна створанай Мяшчанскай Слабадзе, складалі ад 10 % да 15 % усяго насельніцтва рускай сталіцы.

Далучэнне беларускіх зямель Расіяй у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 г., 1793 г., 1795 г.) і развіццё ў сувязі з гэтым у канцы XVIII – XIX стст. нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі вызначалі палітычныя прычыны эміграцыі. Рэпрэсіі з боку царскага ўрада выштурхнулі з Бацькаўшчыны тысячы ўдзельнікаў паўстанняў 1794 г., 1830 – 31 гг., 1863 – 64 гг., а таксама прыхільнікаў аднаўлення ВКЛ, якія выступілі на баку Напалеона падчас вайны 1812 г. Яны рассеяліся па свеце, некаторыя ўключыліся ў рэвалюцыйны і вызваленчы рух у Еўропе і Амерыцы (Т. Касцюшка, В. Урублеўскі, М. Судзілоўскі, З. Мінейка і інш.), садзейнічалі развіццю культуры і навукі краін свайго пражывання, узбагачалі тым самым і беларускую спадчыну (І. Дамейка, Г. Дмахоўскі, Н. Орда, А. Рыпінскі і інш.).

Далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі абумовіла асаблівасці ўсходняй дыяспары: беларускае насельніцтва, якое перасялялася ў цэнтральны і паўднёвы раёны Еўрапейскай Расіі, Сібір, на Далёкі Ўсход, пакідала сваю гістарычную радзіму і апынался ў іншаэтнічным асяроддзі, але фармальна перамяшчэнні адбываліся ў межах адной дзяржавы. Паводле перапісу 1897 г. за межамі губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам пражывала каля 500 тыс. беларусаў.

Усходняя дыяспара папаўнялася шляхам гвалтоўнага высялення ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчых паўстанняў, тайных патрыятычных таварыстваў і іншых палітычна нелаяльных царскаму ўраду беларусаў. Сасланыя ў розныя куткі Расіі, беларусы зарэкамендавалі сябе таленавітымі даследчыкамі прыроды, побыту, традыцый, мовы карэнных народаў Сібіры і Крайняй Поўначы, Далёкага Ўсходу і Казахстана (Я. Чэрскі, Э. Пякарскі, А. Янушкевіч).

*Першая хваля масавай* (працоўнай) *міграцыі*, выкліканая станаўленнем капіталістычных адносін і праблемай малаземелля на Беларусі, пракацілася на мяжы XIX і XX стст. Да Першай Сусветнай вайны па эканамічных прычынах толькі ў Сібір з Беларусі перасялілася (пераважна сяляне) больш за 700 тыс. чалавек, за межы Расійскай імперыі – 500 – 800 тыс. чалавек (пераважна ў ЗША, Канаду, Бразілію, Аргенціну).

Пры гэтым, негледзячы на развіццё працэсаў беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст., узровень самаўсведамлення ў межах беларускай дыяспары (асабліва на Захадзе) быў надзвычай нізкі; нацыянальна-культурныя беларускія арганізацыі ў эміграцыі практычна адсутнічалі.

Рэвалюцыйныя і ваенныя падзеі 1915 – 1920-х гг. спарадзілі *другую хвалю масавай міграцыі.* Падчас Першай Сусветнай вайны тэрыторыю Беларусі пакінула каля 2 млн чалавек, з якіх на радзіму не вярнулася каля 250 тыс. Яшчэ каля 120 тыс. чалавек выехала ў краіны Балтыі, Чэхаславакію, Фінляндыю, Германію, ратуючыся ад ваеннага ліхалецця, белага і чырвонага тэрору (у Германіі ў 1919 г. знаходзілася, акрамя таго, 30 – 40 тыс. беларусаў-ваеннапалонных).

У міжваенны перыяд прасочваюцца 2 асноўных плыні эміграцыі, што выразна адрозніваліся па сваіх характары.

Пасля ўсталявання савецкай улады на Беларусі і стварэння БССР, упершыню арганізацыйна афармляецца *беларуская палітычная эміграцыя*, ядром якой з'явіліся ўрадавыя, вайсковыя і культурныя арганізацыі БНР, кіраўніцтва партыі беларускіх эсэраў і іншых нацыянальных суполак антыбальшавіцкага характару.

Другая плынь міжваеннай эміграцыі – *сацыяльна-эканамічная* (працоўна-сялянская) звязана з выездам у Амерыку і Еўропу часткі насельніцтва Заходняй Беларусі ў сувязі з яго цяжкім сацыяльна-эканамічным становішчам, нацыянальным і рэлігійным уціскам у складзе Польшчы, яе палітыкай садзеяння эміграцыі (для памяншэння колькасці беларускага насельніцтва на гэтых землях). У 1921 – 1939 гг. выехалі пераважна ў Канаду, ЗША, Францыю, Аргенціну, Бразілію, Латвію 180 – 250 тыс. чалавек.

Асобнай крыніцай папаўнення дыяспары з'явілася міграцыя з Савецкай Беларусі. У 1926 – 1938 гг. з БССР, насельніцтва якой складала каля 5 млн чалавек, у іншаэтнічныя раёны СССР выехала і было гвалтоўна перaселена ў выніку калектывізацыі і палітычных рэпрэсій ад 600 да 700 тыс. чалавек. Да гэтай колькасці ў 1939 – 1940 гг. дадалася некалькі дзесяткаў тысяч жыхароў Заходняй Беларусі і Віленскага краю, дэпартаваных у рэгіёны Сібіры і Далёкага Ўсходу. У 1930-х гг., калі таталітарнай сістэмай разбуралася і нішчылася ўсё нацыянальна адметнае, беларускія арганізацыі ў іншаэтнічных абласцях СССР зніклі, а нацыянальныя асяродкі ў краіне не мелі ні маральнай, ні матэрыяльнай падтрымкі з боку ўладаў БССР.

Найбольшую палітычную актыўнасць, нацыянальна-культурную дзейнасць у міжваенны час мелі дыяспары ў Літве, Латвіі, Чэхаславакіі, ЗША, Францыі, Аргенціне. Тут існавалі беларускія арганізацыі, аб'яднанні, таварыствы, выдаваліся газеты і часопісы. Цэнтрамі збірання нацыянальных сіл сталі эміграцыйны ўрад БНР (з канца 1920 г. знаходзіўся ў Коўне (Літва), з 1923 г. – у Празе), дыпламатычныя місіі і прадстаўніцтвы ў прыбалтыйскіх краінах, Фінляндыі, Турцыі, Балгарыі, Германіі, Чэхаславакіі.

У 1920 – 30-х гадах беларускія нацыянальныя сілы ў *Літве* гуртаваліся вакол "*Беларускай грамады*" і "*Беларускага сабрання*" ў Коўне. Тут выдаваліся часопісы "Крывіч", "Беларускі сцяг", дзейнічалі "Беларускае культурна-асветнае таварыства", "Аб'яднанне студэнтаў-беларусаў" і іншыя арганізацыі.

Нацыянальная эміграцыя ўзначаліла беларускі рух у *Латвіі*. Былі створаны культурна-асветныя таварыствы "Бацькаўшчына" (Дзвінск), "Рунь", "Беларуская хата", навуковае таварыства ў Рызе. Актыўнай была дзейнасць "Таварыства беларускіх вучыцялёў" і "Беларускага выдавецкага таварыства", дзякуючы якім выходзілі часопісы "На чужыне", "Школа і жыццё", "Голас беларуса" і інш.

У 1920-я гады значны палітычна актыўны асяродак склаўся ў *Чэхаславакіі*. У Празе працаваў урад БНР, сялянскі саюз "Крывічы", дзейнічалі Крывіцкае (беларускае) культурнае таварыства імя Ф. Скарыны, Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый (БАСА).

Даволі актыўна ў гэты час ствараліся беларускія нацыянальна-культурныя аб'яднанні ў *Францыі*, *ЗША* і *Аргенціне*. Аднак, прасавецкі, пракамуністычны кірунак шэрагу аб'яднанняў у ЗША і Аргенціне, іх арыентацыя на рускую культуру прыводзілі да паступовай русіфікацыі і арганізацыйнага заняпаду.

Другая сусветная вайна паглыбіла палітычнае размежаванне беларускай дыяспары. Частка эмігрантаў пайшла на супрацоўніцтва з уладамі нацысцкай *Германіі*, спадзяючыся ажыццявіць нацыянальна-культурнае адраджэнне пад пратэктаратам Трэцяга Рэйху. З другога боку, у асяроддзі беларускай эміграцыі значна павялічылася колькасць людзей, што былі патрыятычна настроеныя і актыўна падтрымлівалі СССР у яго барацьбе з фашызмам. Толькі ў Паднёвай Амерыцы "Беларускі дэмакратычны камітэт дапамогі Радзіме" (5 тыс. чалавек) меў 36 арганізацый у Аргенціне, Парагваі, Уругваі, Бразіліі, якія праводзілі рэгулярныя кампаніі па збору матэрыяльных каштоўнасцяў і грашовых сродкаў для дапамогі СССР.

Разам з тым, менавіта Другая Сусветная вайна, абумовіла *трэцюю масавую хвалю ўнутранай і знешняй міграцыі*, выклікала вымушанае папаўненне дыяспары. Каля 1,5 млн чалавек былі эвакуіраваны на ўсход СССР, і толькі кожны трэці потым вярнуўся на Беларусь. На Захадзе Еўропы апынуліся сотні тысяч беларусаў з ліку ваеннапалонных, гастарбайтараў (людзей, гвалтоўна вывезеных на прымусовую працу ў Германію), удзельнікаў беларускіх арганізацый і фарміраванняў, створаных на акупа-

ванай тэрыторыі Беларусі. Справядліва баючыся сталінскіх рэпрэсій, гэтыя людзі адмовіліся вяртацца на Савецкую Радзіму пасля перамогі над фашызмам. Так, у ЗША і Канадзе пасля вайны пасялілася па 50 тыс. эмігрантаў беларускага паходжання. Дзесяткі тысяч іх аселі ў Францыі, Бельгіі, Германіі, а таксама ў новых цэнтрах – Англіі, Аўстраліі.

У выніку палітычных спекуляцый Сталіна, калі Беластоцкая вобласць БССР была перададзена Польшчы (жнівень 1945 г.), ад 300 да 400 тыс. беларусаў апынулася па-за межамі Радзімы. Паколькі паваенная Польшча развівалася ў рэчышчы камуністычнай ідэялогіі, то беларусы ў гэтай краіне практычна не мелі шанцаў на паўнавартае нацыянальна-культурнае развіццё, што спрыяла іх паступовай паланізацыі і асіміляцыі. Дзейнасць беларускіх эмігранцкіх арганізацый у краінах Захаду была значна больш актыўнай і нацыянальна змястоўнай. Руплівая праца шматлікіх навукова-культурных цэнтраў у ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Францыі, Англіі, крытыка імі таталітарнай сістэмы на Бацькаўшчыне паўплывалі на развіццё нацыянальнай самасвядомасці, зберажэнне этнакультурных традыцый, мовы, ідэалаў незалежнасці і яе сімвалаў, пашырылі веды пра Беларусь у свеце. Асяроддзе беларусаў на эміграцыі вылучыла вядомых вучоных (Б. Кіт, І. Прыгожын), літаратараў (Н. Арсеннева, Л. Геніюш, М. Сяднёў, А. Салавей), мастакоў (В. Жаўнярэвіч, П. Мірановіч, Г. Русак), кампазітараў і спевакоў (М. Равенскі, М. Забэйда-Суміцкі, Б. Андрусішын). Праблемныя пытанні беларускай гісторыі і культуры плённа распрацоўвалі А. Станкевіч, П. Урбан, А. Калубовіч, А. Надсан, В. і З. Кіпелі і інш. Сярод сучасных нацыянальна-культурных і палітычных арганізацый беларусаў "далёкага замежжа" найбольш прадстаўнічымі з'яўляюцца:

- "Беларуска-амерыканскае задзіночанне" (ЗША);
- Беларускі інстытут навукі і мастацтва (ЗША);
- Вялікалітоўскі фонд імя Л. Сапегі (ЗША);
- Згуртаванне беларусаў Канады;
- Федэральная рада беларускіх арганізацый (Аўстралія);
- "Згуртаванне беларусаў Вялікай Брытаніі";
- Беларуская бібліятэка і музэй імя Ф. Скарыны (Англія);
- Саюз беларусаў Бельгіі.

Значная колькасць беларусаў у наш час пражывае і ў новых незалежных дзяржавах на тэрыторыі былога СССР:

- У Расійскай Федэрацыі – 1млн 200 тысяч;
- На Украіне – 440 тысяч;

– У Казахстане – 183 тысячы;
– У Латвіі – 120 тысяч;
– У Літве – 63 тысячы;
– У Эстоніі – 29 тысяч чалавек.

Развал таталітарнай савецкай сістэмы, набыццё Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту, чарговая хваля беларускага нацыянальнага адраджэння абумовілі пераход ад канфрантацыі да ўзаемадзеяння з заходняй эміграцыяй, ад грэбавання патрэбамі ўсходняй дыяспары да пошуку шляхоў абароны правоў і нацыянальных інтарэсаў суайчыннікаў на абшарах былога СССР, а потым і ў новых дзяржавах, што ўзніклі на яго тэрыторыі. У 1990 г. намаганнямі грамадскасці ў Мінску створана Згуртаванне беларусаў свету "*Бацькаўшчына*". Падтрымку ўрада атрымалі яго ініцыятывы агульнанацыянальнага маштабу – *Першы сход беларусаў блізкага замежжа* (1992) і *Першы з'езд беларусаў свету* (1993). Яны далі імпульсы для супольнай працы на карысць Айчыны.

Аднак, крызісныя з'явы ў сацыяльна-эканамічнай сферы, умацаванне з сярэдзіны 1990-х гадоў аўтарытарных тэндэнцый у палітычным жыцці краіны і згортванне працэсаў нацыянальна-культурнага адраджэння спарадзілі *чацвёртую хвалю масавай эміграцыі*. Яе небяспека для нацыянальнага станаўлення Беларусі заключаецца ў тым, што радзіму пакідаюць высокаадукаваныя, высокапрафесійныя людзі, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі (В. Быкаў, У. Някляеў, А. Разанаў), а таксама моладзь. Пасля майскага (1995) і лістападаўскага (1996) рэферэндумаў беларуская дыяспара на Захадзе аказалася ў апазіцыі да ўлады. На сённяшні момант не выклікае сумнення, што паспяховае, натуральнае развіццё беларускай дыяспары арганічна звязана з захаваннем і ўмацаваннем дзяржаўнасці Беларусі, працэсамі нацыянальнага адраджэння Бацькаўшчыны, усталяваннем добрасуседскіх адносін з памежнымі краінамі, уваходжаннем у еўрапейскую і міжнародную супольнасць. Самастойная дэмакратычная і прававая Беларусь зможа забяспечыць існаванне беларускага народа і дыяспары як адзінага арганізма, што з'яўляецца адной з умоў самазахавання і развіцця беларускай нацыі ў эпоху глабалізацыі.

ДАДАТАК 3

## ЭТНІЧНЫ КРЫЗІС 1930 – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1980-Х ГГ.

Разгляд гэтага перыяду ў жыцці беларускай нацыі надзвычай важны. Бо, аналізуючы праявы і глыбіню крызісных з'яў у жыцці этнаса, значна лягчэй зразумець спецыфіку і заканамернасці працэса другой паловы 1980 – пачатку 1990-х гадоў, які атрымаў устойлівую назву "Нацыянальнае Адраджэнне".

Кропкай адліку мусім мець канец 20-х гг. XX ст. – найвышэйшы ўздым у гісторыі беларускай нацыі, калі па ўсіх параметрах (асвета, мастацкая культура, сродкі масавай інфармацыі) фіксуецца стварэнне, няхай усяго на некалькі гадоў, мо і недасканалай, мо і непаслядоўнай і моцна саветызаванай, але ж рэальна дзеючай мадэлі нацыянальнага камунікатыўнага механізму, які на працягу бліжэйшых 15 – 20 гадоў мусіў завяршыць кансалідацыю беларускай нацыі.

Аднак далейшыя падзеі (увесь комплекс якіх атрымаў назву "сталіншчына") развіваліся далека не спрыяльна для вышэй акрэсленай тэндэнцыі. Адзін з першых udараў быў нанесены па хутарскім землекарыстанні, якое на Беларусі мела доўгую гісторыю і традыцыйна ўкаранялася (ад часоў "Валочнай памеры" сярэдзіны XVI – пачатку XVII ст.). Былі знішчаны самыя прадуктыўныя, заможныя гаспадаркі, якія складалі 23,2 % ад агульнай колькасці сялянскіх гаспадарак рэспублікі. Разбураўся, прычым з вонку, сам беларускі сялянскі ідэал суіснавання гаспадара і зямлі. Супраціўленне было проста парадаксальна жорсткім.

Так, толькі ў 1930 г. дзяржаўнымі органамі бяспекі было зарэгістравана каля 520 (!) узброеных выступленняў. Калі ўлічыць, што згаданыя падзеі адбываліся, фактычна, ва Ўсходняй Беларусі, дзе ў памежных з Расіяй раёнах даволі моцнымі былі рудыменты абшчыны, то лічбы разрозненых, асуджаных на паражэнне выступленняў хутаранаў выглядаюць рэальнай антытэзай "ціхмянасці й забітасці" беларускага селяніна. Улічваючы ж тое, што ў гарадах (паводле перапісу 1926 г.) жыло толькі 8,3 % ад агульнай колькасці беларусаў БССР, неабходна адзначыць, што рэпрэсіі супраць сялянства з'яўляліся першым этапам рэпрэсій супраць фарміруючайся беларускай нацыі.

Калектывізацыя Заходняй Беларусі (пасля 1939 г.) адбывалася не так жорстка і расцягнулася ажно да канца 40-х – пачатку 50-х гг. Тым не менш падзел Беларусі на дзве вялізных вобласці (Заходняя – дзе і дагэтуль

адчуваюцца перавагі прыватнаўласніцкай свядомасці; Усходняя – змаргіналізаваная калгасная свядомасць) сёння выяўляецца спецыфічным аграрным (вясковым) рэгіяналізмам: “заходнікі” – “усходнікі”. Прычым абвінавачванне апошніх у нядбаласці і негаспадарчасці, не мае пад сабой ніякага грунту, бо менавіта яны за 1931 – 34 гг. пазбавіліся больш за 260 тыс. чалавек вясковай гаспадарчай эліты.

Паралельна з рэпрэсіямі супраць сялянства, Масква не магла не пайсці на карныя меры супраць інтэлектуальнай эліты Беларусі, бо, перш за ўсё, яна спрычынілася да напаўнення беларускай дзяржаўнай формы рэальным нацыянальным зместам, які ніяк не стасаваўся з маскоўскай палітыкай жорсткай цэнтралізацыі. Нават не парупіўшыся прыдумаць новую назву (дагэтуль на Украіне была “выкрыта” “Спілка вызволення України”), органы ДПУ распачынаюць справу “Саюза вызвалення Беларусі”. Галоўным аб’ектам чыстак 1929 – 31 гг. на Беларусі стаў Народны Камісарыят Асветы. Ён кіраваў усёй культурнай, асветніцкай дзейнасцю ў рэспубліцы і таму туды ўваходзіла большасць беларускай інтэлігенцыі. У 1929/30 навучальным годзе са школаў забралі амаль усе падручнікі… Агулам было забаронена карыстацца 54 падручнікамі, у тым ліку нават падручнікамі па матэматыцы. Былі рэпрэсаваны слынныя навукоўцы (мовазнаўцы, гісторыкі, культуролагі, эканамісты), якія фармавалі культурны грунт нацыі: В. Ластоўскі, Я. Лесік, С. Некрашэвіч, А. Цвікевіч, У. Пічэта ды інш.; скончыў жыццё самагубствам У. Ігнатоўскі. Адначасова быў нанесены першы ўдар па беларускіх пісьменніках.

Няцяжка заўважыць, што рэпрэсіі былі скіраваны на важнейшыя складнікі саматоеснасці нацыі: на сістэму асветы і адукацыі, мастацкую культуру. Велізарныя страты панёс аграрны сектар, як адзін з чыннікаў эканамічнай незалежнасці нацыі (характэрна, што ўжо ў 1940 г. калгасы, маючы 57,1 % пасеўных плошчаў давалі толькі 11,4 % мяса; 13,2 % малака; 34 % бульбы ад агульнарэспубліканскай вытворчасці).

У 1930 – 31 гг. адбылася падзея, якая на фоне адвечнай рэлігійнай талерантнасці беларусаў, была дагэтуль нябачаным гвалтам. Былі зачынены і перададзены гаспадарчыя патрэбы 573 царквы, 366 сінагог, 52 малельныя дамы, 29 касцелаў і 2 капліцы.

Тым не менш, нягледзячы на распачатыя рэпрэсіі і даволі адназначную кадравую палітыку Масквы, калі на месцы адкліканых і звольненых прызначаліся, як правіла, небеларусы (пераважна рускія), або Масква пачынала вышукваць на гэтыя пасады сярод беларускіх камуністаў самых паслухмяных і вернападданых сабе кар’ерыстаў, беларускі ўрад і кіраўніцтва

КП(б)Б заявілі: "…лозунг, які сцвярджае, што нацыянальная дэмакратыя ўяўляе цяпер галоўную небяспеку – няслушны… У дадзены момант галоўнай небяспекай з'яўляецца вялікарасійскі шавінізм". Наступная хваля рэпрэсій зламала назаўсёды гэтае супраціўленне. Улетку 1933 г. пачынаецца справа "Беларускага нацыянальнага цэнтру". Штучнай падставай для гэтага было "імперыялістычнае акружэнне" Беларусі, як фарпосту будуючагася сацыялізму на Захадзе. Ідзе масавае выкрыццё замежных (польскіх, нямецкіх, латышскіх і інш.) "агентаў". Так, у якасці польскіх шпіёнаў былі рэпрэсаваны 96 вядомых беларускіх дзеячоў, колькі гадоў таму вызваленых з польскіх турмаў. Не задавальняючыся фізічнай расправай, Масква інспіруе здзек над адным з галоўных выразнікаў беларускай культуры – мовай. Дэкрэт СНК "Аб змене і спрашчэнні ў граматыцы і правапісе" (ад 26.08.1933 г.) на доўгі час пазбавіў беларускую літаратурную мову натуральных, выспяваўшых стагоддзямі фанетычных ды арфаграфічных норм. І ў снежні таго ж году ЦК КП(б)Б вымушаны быў прызнаць, што "у дадзены момант ў Беларусі галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы беларускі нацыяналізм". Такім чынам было дадзена "дабро" на самую крывавую хвалю сталінскага тэрору 1936 – 38 гг. Яшчэ адной рысай пазбаўлення беларускай дзяржавы сваіх асноў з'явілася скасаванне ўсіх нацыянальных вайсковых злучэнняў у 1935 г.

Праз два гады, агулам арыштавалі 90 % беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, большасць з іх расстралялі ці закатавалі ў турме. Адначасова вынішчаліся ўсе вышэйшыя савецкія ды вайсковыя функцыянеры.

XVI з'езд КП(б)Б высветліў становішча: шалёнае цкаванне "нацдэмаў", "агентаў" ды іншых "ворагаў народа" (што вымусіла скончыць жыццё самагубствам старшыню ЦВК А. Чарвякова), было справай вельмі дзіўнага складу дэпутатаў. Беларусы (больш за 80 % насельніцтва) складалі 38,9 % дэпутатаў, рускія ж (менш за 8 % насельніцтва) склалі 35,7 % з'езду.

Перш за ўсё, гэта азначала смерць беларускага нацыянал-камунізму, што, нягледзячы на савецкую ідэялогію, адыграў вялікую ролю ў станаўленні рэальнай беларускай дзяржаўнасці. Амаль разбуранай сталася ўся нацыянальная сістэма беларускага этнасу (амаль знішчаны прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, разбураны беларускі сялянскі парадак гаспадарання на зямлі, асвета, культура і сродкі масавай інфармацыі зрабіліся беларускімі па форме і савецкімі па зместу), у тым ліку яго дзяржаўны чын. Фармальнасць (несамастойнасць) беларускай дзяржавы выявілася ў лёсе Віленскага краю (восенню 1939 г. Сталін без усялякага ўзгаднення з кіраўніцтвам БССР перадае Віленскі край Літве) і, такім чынам, дзяржаватворчыя працэсы фактычна адпавядалі ўзроўню 1918 – 1921 гг. (Брэсцкі і Рыжскі мір).

Другая сусветная вайна, у якой Беларусь не мела ніякіх інтарэсаў, абярнулася для народа страшэннай бядой. Першыя ахвяры былі яшчэ ў верасні 1939 г. З аднаго боку – беларусы, якія ў шэрагах Войска Польскага баранілі Рэч Паспалітую. З другога боку – ахвяры чыстак НКУС у Заходняй Беларусі. Падзеі 1941 – 45 гг. павялічылі ахвяры ў тысячы разоў.

Навала вайны два разы пракацілася па тэрыторыі Беларусі, пакідаючы смерць ды спусташэнне. Неадназначным падаецца і партызанскі рух, які ў 1944 г. насіў сапраўды масавы рух і ўнёс велізны ўклад у разгром фашызму. Тут ёсць некалькі акалічнасцяў. Тое, што асноўная частка партызанскіх атрадаў ды злучэнняў з'явілася толькі ў другой палове 1943 г. можна растлумачыць сялянскай кемлівасцю беларусаў: яны чакалі пакуль вагі перамогі канчаткова не схіляцца на савецкі бок. Прычым, большая колькасць і ўкараненасць партыйных структур усякіх узроўняў на мясцовай глебе, а таксама працяглае знаёмства насельніцтва з метадамі "сацыяльнай абароны" Сталінскага рэжыму тлумачаць тое, што Ўсходняя Беларусь мела ў 2,5 разы большую колькасць партызанаў, чым Заходняя. Ды і самі вынікі партызанскай вайны не могуць адзначацца толькі станоўча, бо вельмі часта аперацыі партызанаў выклікалі аператыўныя, добра арганізаваныя карныя акцыі з боку акупантаў. Прычым, ахвярамі, збольшага, станавілася мірнае жыхарства партызанскіх зон. Значнага вывучэння яшчэ патрабуе роля ўкраінскіх, рускіх, латышскіх, літоўскіх нацыяналістычных арганізацый і баявікоў Арміі Краёвай у злачынствах супраць беларускага насельніцтва.

Другі аспект разбуральнага характара апошняй вайны выявіўся ў канчатковым расколе беларускай інтэлігенцыі (у больш шырокім кантэксце – нацыянальнай эліты ўвогуле), якая апынулася па розныя бакі "фронту". Частка яе, ацалеўшая пасля рэпрэсій 1930-х гадоў, альбо непасрэдна ўключылася ў барацьбу з захопнікамі, альбо, знаходзячыся ў эвакуацыі (Я. Купала, Я. Колас ды інш.) стварала ідэалагічна-эмацыянальны грунт, дзеля разгортвання беларускага партызанскага нацыянальнага руху ў рэчышчы ідэалагічных ды ваенна-стратэгічных кірункаў Маскоўскай палітыкі.

Другі лагер склалі беларускія эмігранты, якія вярнуліся разам з нямецкім войскам, і людзі, пабачыўшыя і адчуўшыя ўвесь жах сталінскага рэжыму. Плёнам іх дзейнасці падчас акупацыі з'явілася рэанімацыя і ўздым беларускай школы, друку, рэлігійнага жыцця на Беларусі. З'яўляючыся носьбітамі беларускай нацыянальнай ідэі, яны так і не змаглі дабіцца хаця б мінімальнага яе ажыццяўлення. Утварэнні кшталту "Беларуская народная самапомач", "Беларуская краёвая абарона" ды іншыя з'яўляліся несамастойнымі, і гэта было асноўнай умовай з боку нямецкага камандаван-

ня ў дачыненні да нацыянальных арганізацый блізу фронта. Невыпадкова, што Беларуская Краёвая Абарона, ды Беларуская Цэнтральная Рада дазвол на існаванне атрымалі толькі напярэдадні ўступлення на Беларусь Чырвонай Арміі.

У выніку, ўся пасляваенная беларуская эміграцыя разглядалася ў БССР з пазіцый непрымірымай канфрантацыі і ганьбавання, не кажучы ўжо пра жорсткія рэпрэсіі адносна тых, хто ўдзельнічаў у культурным беларускім жыцці падчас акупацыі (паэты, настаўнікі, святары і г.д.).

Такім чынам, часы сталіншчыны, калі было рэпрэсіравана, па розных падліках, ад 600 да 800 тыс. чалавек (цікава, што за ўдзел у паўстанні 1863 – 64 гг. на Беларусі і ў Літве было пакарана 18507 чалавек), і Другая Сусветная вайна, страты ад якой склалі блізу 25 % насельніцтва (бліжэйшы гістарычны аналаг – войны сярэдзіны XVII – пачатку XVIIIст.), а таксама 209 разбураных гарадоў ды мястэчак, 9200 спаленых вёсак, сталі тым пераломным этапам, калі перапыняецца кансалідацыя беларускай нацыі і знікае грунт ды ўмовы станаўлення Беларусі як рэальнага суб’екта дзяржаўнасці. Перыяд 1950 – 80-х гг. у гісторыі Беларусі правамочна разглядаць як паўкаланіяльны (негледзячы на статус дзяржавы – заснавальніка ААН), бо яна ператвараецца ў аб’ект разнастайных (эканамічных, сацыяльных, культурных і г.д.) эксперыментаў, вядучых прама ці ўкосна да разбурэння этнічнай беларускай сістэмы. Вось толькі некаторыя кірункі савецкай палітыкі ў дачыненні да Беларусі.

1. *Эканоміка, этна-сацыяльная структура*. З другой паловы 1950-х гадоў пачынаецца імклівае прамысловае будаўніцтва ў рэспубліцы, якая да 1941 г. з’яўлялася бадай самай адсталай у эканамічным плане ў Еўрапейскай частцы СССР. Прыярытэт аддаецца будаўніцтву нафтахімічных ды машынабудаўнічых гігантаў, што адпачатку азначала максімальную залежнасць ад сыравінных крыніцаў (Расія). Экалагічна небяспечныя тэхналогіі прывялі да ўзнікнення шэрагу зон экалагічнага бедства (Наваполацк, Салігорск, Магілёў і інш.). Нястача працоўнай сілы (габрэі – асноўная частка гарадскога насельніцтва да 1941 г. былі, збольшага, знішчаны падчас вайны) прывяла да дзвух відаў міграцыі. Унутраная, якая падарвала фізічны патэнцыял вёскі, пакрывала патрэбы ў малакваліфікаванай працоўнай сіле і ўяўляла сабой класічны прыклад дээтнізацыі, маргіналізацыі беларусаў. Маргіналізаваліся цэлыя пакаленні. Гэта не магло не прывесці да хуткага разбурэння культурных стэрэатыпаў, выпрацаваных стагоддзямі. Гублялася сацыяльная памяць, а значыцца, і тая глеба, на якой натуральным чынам фарміруецца разнастайнасць культурных узораў, перадаваемых ад бацькоў

дзецям. З 1959 г. па 1989 г. доля гарадскога насельніцтва ўзрасла з 31 да 65 % (!), што значна вышэй за агульнасавецкую, заходнееўрапейскую, азіяцкую дый сусветную дынаміку урбанізацыі. Знешняя міграцыя, якая была выклікана недахопам тэхнічнай інтэлігенцыі, адміністратараў, чыноўнікаў прывяла да значнага росту іназтнічных элементаў.

Так, колькасць рускіх з 659,1 тыс. (8,2 % насельніцтва) у 1959 г. вырасла да 1342,1 тыс. (13,2 %) у 1989 г., прычым у апошнім выпадку 87 % рускіх жыло ў гарадах.

2. *Аграрная палітыка.* Беларусь, як бліжэйшая ды значная зона даволі эфектыўнай аграрнай вытворчасці, у адносінах да шматмільённых мегаполісаў Масквы ды Ленінграда, стала іх сельскагаспадарчым прыдаткам. Стварэнне велізарных жывёлагадоўчых комплексаў, непрадуманая меліярацыя, ды ненавуковае выкарыстанне разнастайных угнаенняў, не адпавядалі ўласна беларускім патрэбам у сельскагаспадарчай прадукцыі. Усе гэтыя меры былі скіраваныя на забяспячэнне “Цэнтру”, што, дарэчы, выявілася ў вельмі распаўсюджаным этнастэрэатыпе савецкіх часоў: “Беларусь Расею корміць, бо там ніколі працаваць ня ўмелі”.

Савецкая аграрная палітыка мела шэраг трагічных наступстваў: сацыяльнае ды эканамічнае зганьбаванне вёскі, якое прывяло да зацяжнога крызісу ў аграрным сектары (бацькі самі заахвочвалі дзяцей на пераезд у горад у “пошуку лепшай долі”), экалагічныя бедствы (меліярацыя; нітраты; забруджванне навакольнага асяроддзя); экстэнсіўны характар сельскагаспадарчай вытворчасці прывёў да нізкай канкурэнтаздольнасці беларускае прадукцыі на сусветным рынку.

3. *Культурная палітыка.* Смерць Сталіна і працэсы частковай рэабілітацыі ахвяраў рэпрэсій вярнулі з “Гулагу” шэраг дзеячоў беларускай культуры (С. Грахоўскі, У. Дубоўка, А. Звонак, Я. Пушча ды інш.), свет убачылі творы Ц. Гартнага, П. Галавача, М. Чарота і інш. Але, тым не менш, з прыходам да ўлады М.С. Хрушчова пачалася новая хваля русіфікацыі нацыянальных культур. Ідэя пабудовы камунізму пры жыцці аднаго пакалення, абвешчаная ў 1961 г. на XXII з’езде КПСС, звязвалася з далейшым збліжэннем нацый і дасягненнем іх поўнага адзінства на аснове рускай мовы і культуры.

Пачынаецца чарговая хваля барацьбы з вернікамі. Так, толькі за 1960 – 64 гг. на старонках беларускага друку было змешчана антырэлігійнага матэрыялу больш чым за 15 папярэдніх год. Актыўна разбураліся ўнікальныя помнікі культавага дойлідства ў Полацку, Віцебску, Мінску, Гродне и іншых гарадах і мястэчках.

Жорсткі ціск з боку ідэалагічных аддзелаў КПСС адчувала на сабе ўся мастацкая культура ўвогуле. Любыя праявы “інакшасці”, адыход ад норм, задач так званага “сацрэалізму” жорстка караліся. Так, у 1969 г. тагачасны старшыня КДБ СССР Ю. Андропаў інфармаваў ЦК КПСС “аб палітычна нездаровых настроях беларускіх пісьменнікаў – члена КПСС Карпюка і Быкава. Карпюк нелегальна распаўсюджвае сярод сваіх знаёмых розныя пасквілі ў выглядзе кнігі Гінзбург-Аксёнавай “Круты марштрут” і інш. Адмоўна дзейнічае на моладзь… Погляды Карпюка ў значнай меры падзяляе Быкаў… Камітэтам дзяржбяспекі Беларусі з санкцыі ЦК КПБ рыхтуюцца мерапрыемствы, накіраваныя на прадухіленне магчымых варожых акцый з боку названых асоб”.

Аднак і творы Васіля Быкава, які здолеў паказаць лёс чалавека на вайне без ілжывых патрыятычных лозунгаў, і творы Уладзіміра Караткевіча, напісаныя ў гісторыка-рамантычным рэчышчы, служылі і служаць творчымі арыенцірамі для нацыянальна свядомых людзей, абуджаюць любоў да Бацькаўшчыны.

Курс “на зліццё моў” не мог не адбіцца на становішчы беларускай мовы ў грамадстве. Адбываецца яе выцясненне з сістэмы асветы і адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі, кнігадруку, што ўрэшце рэшт, прывяло да адасобленага існавання беларускіх савецкіх літаратараў, спансіраваных дзяржавай і выконваўшых яе “сацыяльны заказ”.

Так, яшчэ ў 1958 г. было дазволена бацькам выбіраць мову навучання дзяцей. Гэта ва ўмовах хутка растучых гарадоў прывяло да таго, што ў сярэдзіне 80-х гг. толькі 23,1 % школ і 19,3 % дашкольных дзіцячых устаноў працавала на беларускай мове. Фактычна яны засталіся толькі ў сельскай мясцовасці ды й многія з іх былі беларускімі чыста фармальна. Ня лепшай была сітуацыя і ў кнігадруку. З выдадзеных у 1985 г. 3431 адзінкі кніг і брашур накладам 53,5 млн асобнікаў колькасць беларускамоўных складала 393 назвы з накладам 5 млн асобнікаў, адпаведна 89,8 % (91,4 %) і 10,2 % (8,6 %). Мэтанакіраваная палітыка русіфікацыі прывяла да таго, што, калі ў 1958 г. беларусаў, лічыўшых беларускую мову роднай, было 93,1 % дык у 1989 г. гэты паказчык знізіўся да 80,2 %. Значна аслабла і этнанацыянальная функцыя мовы, знізіўся яе сацыяльны прэстыж.

Лінія на падпарадкаванне ўсёй культуры марксісцкай дагматыцы, ператварэнне яе ў служку камуністычнага будаўніцтва, выявілася нават у абсурдных па сваёй сутнасці спробах “саветызацыі фальклору”, які з’яўляецца адной з самых яркіх рыс беларускай этнічнай адметнасці. Так, “фальклёратворцамі” ў савецкі час з’яўляюцца загадчыкі мясцовых клубаў, самадзейныя паэты і кампазітары, кіраўнікі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Адным з такіх штукараў “савецкага беларускага фальклору”, напрыклад, з’яўляўся А. Шыдлоўскі – чалавек, які атрымаў музычную адукацыю і пусціў у зварот дзесяткі песняў кшалту: “Беларусь Савецкая”, “Песня аб Леніне”, “Нас партыя вучыць” ды інш. Дзейнасць такіх аўтараў больш нізкага (клубнага) узроўню гарантавала адлюстраванне ўсіх падзеяў “паспяховага камуністычнага будаўніцтва”. Напрыклад:

“Нашай партыі Праграма
Асвятліла новы дзень
На арбіту камунізма
Край упэўнена вядзе”.

Аўтэнтычны ж фальклор, які выспяваў і развіваўся не адно стагоддзе, хоць і збіраўся руплівымі даследчыкамі і нават пачаў перыядычна выдавацца (унікальная па Еўрапейскіх мерках серыя “Беларуская Народная Творчасць”), але, як адзін з элементаў этнічнай культуры, увасабленне светапоглядных, этнічных і эстэтычных каштоўнасцяў народа не быў уведзены належным чынам ні ў сістэму дашкольнага выхавання, ні ў сістэму адукацыі і асветы. Наклады (тыражы) “БНТ” (1500 – 2000) рабілі выданне недаступным шырокаму чытачу.

4. *Экалогія*. Уся недасканаласць савецкага гаспадарчага механізму, а таксама паўкаланіяльнае становішча беларусі ў складзе СССР прывялі да жахлівых экалагічных наступстваў. Так, на сённяшні дзень мы маем, апрача Чарнобыльскай праблемы, якая сваімі памерамі абавязана нядбайнасці беларускага камуністычнага ўрада, яшчэ па 10 кг таксічных рэчываў на чалавека і 40 млн т шкодных выкідаў штогод. Захаванне ж экалагічна небяспечнай прамысловасці вядзе да далейшага пагаршэння экалагічнай сітуацыі. Так, калі ў Чырвоную кнігу БССР 1981 г. было занесена 80 відаў жывёл і 85 відаў раслін, дык у 1992 г. у яе патрапіла 182 віды жывёл і 178 відаў раслін ! Гэта вядзе да разбурэння першаасновы існавання этнаса – тэрыторыі яго пражывання, як адметнай прыроднай адзінкі, і да выкаранення этнічнага генатыпу ўвогуле. Сёння кожная пятая хвароба жыхара Беларусі, звязана з неспрыяльным навакольным асяроддзем.

Такім чынам, падсумаваўшы этнічную гісторыю 1930 – 80-х гг., можна адзначыць, што Беларусь напрыканцы гэтага адрэзку ўяўляла сабой эфемернае дзяржаўнае ўтварэнне без усялякіх праяў рэальнага суверэнітэту, з маргіналізаваным горадам, дэнацыялізаванай культурай і дэградаваным этнасам, адкінутым у плане нацыянальнай кансалідацыі на ўзровень пачатку XX ст., што і адрознівала, дык гэта – значна горшы экалагічны стан беларускай этнічнай прасторы.

ДАДАТАК 4

# ТЫПАЛАГІЧНЫЯ РЫСЫ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТСТ.)

Супастаўленне нацыянальных рухаў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы (Польшча, Чэхія, Славаччына, Вугоршчына і інш.) выяўляе шмат падабенства па ўмовах узнікнення, рухаючых сілах ды механізмаў гэтых працэсаў. Гэтыя заканамернасці ў поўнай меры датычацца і Беларусі.

Так ніводная з краін не ўяўляла сабой самастойнай дзяржавы і знаходзілася ў складзе мульцінацыянальных імперый (Расійскай і Аўстра-Венгерскай). Крыху вышэйшы статус мелі народы, валодаўшыя хаця б ілюзорнай формай дзяржавы (Варшаўскае герцагства да 1831 г., Вугорская дзяржава ў складзе Аўстрыйскай імперыі), што ў сукупнасці з палітычнай разарванасцю ці неразарванасцю этнічнага арэала (напрыклад, Польшча ў складзе трох краін: Расіі, Аўстрыі, Прусіі; і Беларусь – суцэльна ў складзе Расійскай імперыі) складала адзін з чыннікаў спецыфікі нацыянальнага руху.

У эканамічным аспекце нацыянальныя ўскраіны характэрызаваліся наступнымі рысамі:

– значная адсталасць рэгіёнаў, вызначаная феадальнымі перажыткамі ў сельскай гаспадарцы (бадай адзінае выключэнне – Чэхія);

– развіццё рынку на нацыянальнай тэрыторыі падпарадкавана іншанацыянальным інтарэсам; часткі гэтага рынку часцяком горш звязаныя між сабой, чым з вонкавымі рынкамі;

– капіталізм развіваецца пераважна ў сельскай гаспадарцы і ў сферы здабычы сыравіны;

– амаль або цалкам адсутнічае нацыянальная буржуазія.

Вялікую ролю ў генезісе нацыянальнага адраджэння адыгрывала такая акалічнасць, як поўны (палякі, венгры, харваты) ці непоўны (славакі, балгары, беларусы) сацыяльны склад этнаса. У апошнім выпадку кансалідацыя нацыі сустракала значна больш цяжкасцяў і мела меншую дынаміку. Але і ў тым і ў другім выпадку пераважную частку этнаса складала сялянства.

Да таго ж народы з няпоўным сацыяльным складам не мелі ўласных нацыянальных гарадскіх цэнтраў, з перавагай карэннага насельніцтва і інтэнсіўным культурным рухам (якім стала для палякаў Варшава, для чэхаў – Прага, для венграў – Будапешт), што выклікала ўзнікненне нацыянальна

арганізуючых цэнтраў па-за асноўнай этнічнай тэрыторыяй народа. Так было ў славакаў, славенцаў, беларусаў. Для беларусаў такім цэнтрам стаў Пецярбург, дзе ўжо на пачатку 80-х гадоў XIX ст. была створана Сацыял-рэвалюцыйная беларуская народная партыя. Непаўнавартая сацыяльная структура спрыяла і таму, што нацыянальны прыгнёт быў цяжэйшым і часцяком выяўляўся ў формах, пагражаўшых захаванню самабытнасці этнаса, у той час, як народы і групы з поўным сацыяльным складам, у горшым выпадку, аказваліся толькі ў моцнай палітычнай і эканамічнай залежнасці, а іх пануючыя класы, у сваю чаргу, выкарыстоўвалі ўсе магчымасці для падаўлення нацыянальных працэсаў у народаў другой групы. Ілюстрацыяй можа быць славацка-беларуская паралель. Так, на Беларусі апрача расійскага імперскага прыгнёту, да 1863 г. няспынна ішоў працэс апалячвання. У славакаў, да аўстра-нямецкага ціску, з 60-х гадоў XIX ст. дадаецца моцны працэс мад’ярызацыі.

Асіміляцыйным працэсам спрыяла канфесійная неаднароднасць этнасу, а таксама агульнасць рэлігіі з “народам прыгнятальнікам” (беларус-каталік – “паляк”, беларус-праваслаўны – “рускі”). З другога боку, этнас з няпоўнай сацыяльнай структурай, існуючы пераважна як сялянскі, гэтаксама як і сацыяльна паўнаварты, амаль не губляў сваёй культурнай саматоеснасці. Адрозненне было толькі ў спосабе самазахавання. Для славакаў, чэхаў, беларусаў ды іншых народаў, якія не мелі пачаткова моцнай нацыянальнай культуры ў гарадах, такім раставальным апірышчам, “духоўным падполлем” з’явілася вёска. Менавіта таму, перыяд “шляхецкай рэвалюцыйнасці” не быў досыць значным, ды не адыграў такой ролі, як у венграў, харватаў і палякаў. Сялянства, якому этнічная свядомасць, увогуле, не чужая, бачыла ў нацыянальным руху “панскую справу”. Таму дзейснай рухаючай сілай нацыянальнага адраджэння робіцца дэмакратычная інтэлігенцыя, якая вельмі хутка губляе ілюзіі магчымасці прыцягнуць на свой бок шляхту і ўсё больш арыентуецца на шырокія масы народа, імкнучыся абудзіць іх ад феадальнай спячкі, надаць ім пачуццё нацыянальнай годнасці.

У адрозненне ад шляхты, якая вядзе змаганне за ідэалы мінуўшчыны (за аднаўленне Рэчы Паспалітай – у паўстаннях 1830 – 31 гг., 1863 – 64 гг.), інтэлігенцыя мусіць стаць творцай нацыянальнай ідэі адпаведнай сучаснасці і гарантам дэмакратычнасці нацыянальнага руху ўвогуле. Так, беларускія народнікі заклікалі менавіта да панадэтнічнага, пазаканфесійнага згуртавання “ўсіх працоўных і інтэлігентных людзей Беларусі дзеля працы на карысць беларускага народа”. Гэтак сталася ў Чэхіі, дзе нацыянальны рух падтрымала частка аўстра-нямецкай інтэлігенцыі, на Беларусі, дзе ў нацыя-

нальным Адраджэнні плённа працавалі прадстаўнікі ўсіх этнічных меншасцяў, ды ў іншых краінах. Ідэялагічны грунт Адраджэння даволі тыповы для многіх народаў. Так, вялікую ролю набывае прапаганда палітычных і культурных традыцый, часам трактаваных не толькі рэалістычна, але і ў рамантычным кантэксце (ідэалізацыя мінуўшчыны). Такім чынам сцвярджаўся гістарычны грунт (натуральнасць) нацыі ("Гоманаўцы": "А між тым былі калісьці часы, калі і нашыя продкі жылі поўным гістарычнымі падзеямі жыццём і нават уплывалі на сваю суседку Літву, што выкарыстоўвала беларускую мову ў якасці афіцыйнай").

Праца ў кірунку распрацоўкі гістарычных ведаў у беларускім каннтэксце знайшла сваю першую рэалізацыю ў "Кароткай гісторыі Беларусі" В. Ластоўскага (Вільня, 1910 г.), якая мела ярка выяўлены папулярны, прапагандысцкі характар.

Адначасова з пошукамі месца этнаса ў часе, ідзе працэс "прамаўлення" пра месца этнаса ў прасторы. Даволі вялікі аб'ём этнаграфічных ведаў, вызначэнне этнічных тэрыторый даюць падставы для ўдакладнення нацыянальнай культурна-прасторавай максімы, як неабходнай "пляцоўкі" для культурнага, а потым і дзяржаўна-палітычнага будаўніцтва нацыі. Першым аргументам усіх "малых народаў" быў навукова засведчаны факт этнічнай перавагі на пэўнай прасторы ("Гоманаўцы": "…наш народ складае пераважную большасць насельніцтва цэлага краю").

Адраджэнская сітуацыя XIX – пачатку XX стст. у народаў з няпоўнай сацыяльнай структурай, калі ў нацыянальным жыцці можна было заўважыць дзве асноўныя сілы: захаваўшае сваю этнічную саматоеснасць, але палітычна пасіўнае сялянства ды нешматлікія нацыянальна свядомыя інтэлігенты (чэшскія "будзіцелі", беларускія "абуджальнікі", "песняры" і г.д.), вымагала сялянскага пафасу ўсяго руху, бо толькі пафас сялянскасці быў адэкватны тагачаснай нацыянальнай задачы, якая і заключалася ва ўздыме беларускага (як і славацкага, балгарскага, галісійскага ды інш.) сялянства. Пра інтэлігенцыю (як і пра буржуазію) як апірышча нацыі гаворыць не даводзілася. Адсюль, каштоўнасці цалкам сялянскія (працавітасць, стараннасць, неканфліктнасць і г.д.) набываюць статус каштоўнасцяў нацыянальных, праз якія мусяць быць успрынятыя іншыя народы (Я. Лёсік: "народ маскоўскі да таго некультурны, нядбалы і няўмелы, што галадаў амаль на кожнае пакаленне").

Пафас сялянскасці выяўляўся і ў максімальным выкарыстанні дзеячамі Адраджэння здабыткаў традыцыйнай (фальклёрнай) культуры.

Агульнай рысай нацыянальнага Адраджэння ўсіх “малых” народаў Еўропы, з’яўляецца моўны характар яго першага этапу. Хоць досыць заканамерным быў пачаткова іншамоўны характар выяўлення нацыянальных ідэй. Слабая палітычная зарганізаванасць, колькасны брак нацыянальных сіл тлумачаць культурны характар Адраджэння ў той час, як максімальнай палітычнай задачай з’яўлялася здабыванне культурна-адміністратыўнай аўтаноміі (гэтая ідэя валадарыла на Беларусі да 1918 г.).

Фарміраванне ж агульнанацыянальнай літаратурнай мовы (аднаго з найважнейшых чыннікаў нацыі) патрабавала намаганняў “будзіцеляў” і пераадолення вялікіх перашкод (напрыклад, шматгадовая забарона на выданне нацыянальных газет у Славеніі, Славакіі, Галіцыі, Беларусі…). Паралельна ішла барацьба за выкладанне на роднай мове ў пачатковых і, асабліва, у сярэдніх школах. Другім прыступкам у змаганні за правы роднай мовы было патрабаванне ўвядзення яе ў грамадска-палітычнае жыццё – у адміністрацыю, заканадаўства і г.д.

Але варта адзначыць, што барацьба гэтая не была толькі “культурна-моўнай”, бо разгортвалася ў кантэксце падрыву манаполіі іншанацыянальных пануючых класаў у сферы асветы, культуры і палітыкі.

Найважнейшым крокам на шляху зліцця лакальных этнаграфічных груп і кансалідацыі нацыі з’яўлялася кадыфікацыя агульнанацыянальнай мовы (з выкладаннем на ёй у школах), выхад у свет граматык і слоўнікаў.

Тая акалічнасць, што часцяком (славацкі, літоўскі, беларускі ды інш.) генезіс нацыянальнай ідэі апярэджваў развіццё сацыяльна-эканамічнага грунту нацыі, прывяла да спраўджвання наступнай схемы кансалідацыі нацыі (Адраджэння) у краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы: *агульная дзяржава – агульная мова – агульная самасвядомасць – нацыянальная супольнасць*. Прычым утварэнне дзяржавы (у згаданых выпадках) не было непасрэдным вынікам мясцовага нацыянальнага руху, а хутчэй наступствам цэлага шэрагу ўнутраных і вонкавых фактараў і супярэчнасцяў, абвостраных Першай Сусветнай вайной, якія развалілі Аўстрыйскую ды Расійскую імперыі.

З ўзнікненнем нацыянальных дзяржаў, сканчаецца першы этап станаўлення нацыі, які кваліфікуецца як “нацыянальнае Адраджэнне ці Абуджэнне”. Пачынаецца другі этап – далейшай кансалідацыі нацыі ва ўмовах уласнай дзяржавы і з дапамогай яе механізмаў.

Падсумоўваючы вышэй пададзенае, можна пагадзіцца з думкай М. Гроха, які лічыць тыпалагічна падобнай і гістарычна аб’ектыўнай з’яву нацыянальнага Адраджэння ў эстонцаў, латышоў, літоўцаў, беларусаў, фінаў, нарвежцаў, фламандцаў, ірландцаў, валійцаў, брэтонцаў ды баскаў.

ДАДАТАК 5

## ГІСТАРЫЧНА-ЭТНАГРАФІЧНЫЯ РЭГІЁНЫ (ВОБЛАСЦІ) БЕЛАРУСІ

*Падзвінне*. Беларускае Падзвінне займае сярэдні басейн Заходняй Дзвіны. Як гістарычна-этнаграфічны рэгіён Падзвінне адпавядае асноўнаму масіву старажытнай Полацкай зямлі, першай на тэрыторыі Беларусі раннефеадальнай дзяржавы.

У выніку войнаў XVI – пачатку XIX ст. мясцовыя эканоміка і культура панеслі каласальныя страты, адбыліся істотныя змены ў геаграфічным размяшчэнні і этнасацыяльнай структуры насельніцтва, якое скарацілася ў некалькі разоў. Паводле перапісу 1897 г. этнічны склад насельніцтва Падзвіння быў наступны: беларусы – 76,1 %, габрэі – 12,1 %, рускія – 8,2 %, палякі – 2,3 %, латышы – 1 %.

Мясцовыя гаворкі Падзвіння вылучаюць у полацкую і віцебскую групы ў складзе паўночна-усходняга дыялекту беларускай мовы. Выразнай адметнасцю вылучаецца каляндарная абраднасць і фальклор рэгіёна. Побач з агульна-беларускімі каляндарна- і сямейна-абрадавымі песнямі тут распаўсюджаны жанры мала ці зусім невядомыя ў іншых рэгіёнах – валачобныя, масленічныя, талочныя, ільнаробчыя, ярынныя песні. Выключнай адметнасцю з’яўляецца рытуальнае маладзёжнае ігрышча, прымеркаванае да Каляд, – “Жаніцьба Цярэшкі”.

Велізарныя лясныя масівы, багатыя на розныя ягады і паляўнічую фауну, шматлікія азёры і рэкі з вялікай колькасцю рыбы і вадаплаваючай дзічыны служылі важкай дапамогай у гаспадарцы і спрыялі развіццю такіх промыслаў, як паляўніцтва, рыбалоўства, бортніцтва, збіральніцтва. Пры гэтым, глебы ў Падзвінні пераважна дзярнова-падзолістыя, завалуненыя і малаўрадлівыя. Вегетацыйны перыяд – 175 – 180 дзён – самы кароткі ў Беларусі. Таму насельніцтва Падзвіння з цяжкасцю забяспечвала свае патрэбы ў збожжавых. У структуры пасеваў пераважалі жыта, авёс, ячмень, а таксама лён. З канца XIX ст. прыкметна пашырыліся пасевы бульбы і кармавых траў. Палеткі апрацоўваліся з дапамогай мясцовага варыянта сахі (віцебскай сахі) з перакладной паліцай. Асноўнай цяглай (транспартнай) жывёлай у сялянскай гаспадарцы быў конь. З канца XIX ст. жывёлагадоўля ў рэгіёне атрымала выразны мяса-малочны напрамак, што спрыяла развіццю маслабойчай і сыраробчай вытворчасці. З развіццём капіталістычных адносін значны штуршок атрымалі лясныя і адыходныя промыслы.

Шчыльнасць насельніцтва ў Падзвінні была самай нізкай сярод іншых рэгіёнаў Беларусі і складала ў канцы XIX ст. у сярэднім 30 – 35 чала-

век на 1 км$^2$. Пераважалі маладворныя вёскі (3 – 5 сядзіб), раскіданыя сярод лясных пагоркаў паблізу рэк і азёр. Сельскія шляхі вызначаліся слабай набітасцю грунту і невыразнымі абрысамі. Узімку ўзнаўлялася мноства часовых дарог (*зімнікаў*), што вялі наўпрост па замёрзлых рэках і азёрах.

Пашыраны тып сядзібнай забудовы замкнуты, ці вяночны. Побач з размяшчэннем пабудоў па перыметры двара сустракалася і кампактная забудова, калі гаспадарчыя памяшканні шчыльна прымыкалі да жылля, утвараючы адзіны жыллёва-гаспадарчы комплекс з крытым дваром (вядомы толькі ў гэтым беларускім рэгіёне). На некаторай адлегласці (50 – 60 м) у глыбіні сядзібы будавалі гумно (у мясцовым варыянце ўключала еўню, пуню і азяроды) і лазню. Тыповая планіроўка жылля: хата + сенцы + істопка (варыўня).

Мясцовае народнае адзенне адрознівалася прыкметнай разнастайнасцю тыпаў і спосабаў упрыгожвання. З верхняга адзення ў шырокім ужытку быў лёгкі зрэбны каптан (*насоў*), які насілі ва ўсе поры года. Зімовы варыянт гэтага адзення – *знізак* (сходак) рабіўся карацейшым, часам прыталеным; яго насілі пад кажухом або світай. Найбольш распаўсюджаны колер адзення – белы ці светла-шэры.

Даволі разнастайнае жаночае паясное адзенне – спадніцы, андаракі, узорныя саяны, дрыліхі, сарафаны. Для традыцыйнага жаночага касцюма Падзвіння характэрна строгая геаметрычная арнаметыка (“працвіўшыя” ромбы, зоркі, крыжы).

Аднак міграцыйны рух і ўцягванне ў адыходныя промыслы значнай масы насельніцтва ў другой палове XIX ст. прывялі да адносна ранняга выцяснення традыцыйных форм і збліжэнню сялянскага адзення з гарадскім касцюмам.

Мясцовая кераміка вызначалася некаторай масіўнасцю формы і грунтоўнасцю апрацоўкі, што павышала яе функцыянана-утылітарныя якасці. Мясцовыя майстры рабілі посуд з адносна тоўстымі сценкамі і шырокімі гарлавінамі. Дзеля мастацка-дэкаратыўнага аздаблення і большай трываласці посуд абварвалі ў мучным растворы, задымлівалі ці абгортвалі яго стужкамі бяросты.

Пазначаныя этнакультурныя асаблівасці Падзвіння стваралі непаўторнае культурнае аблічча краю ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі.

*Падняпроўе*. Гістарычна-этнаграфічны рэгіён Падняпроўя займае басейн Дняпра і яго прытокаў Сажа, Друці, часткова Бярэзіны. Пры параўнаўчым вывучэнні культурна-гістарычнай спадчыны, народных традыцый, асаблівасцяў мовы беларускае Падняпроўе выяўляе шмат агульнага з су-

седнімі рэгіёнамі, асабліва Смаленшчынай і заходняй Браншчынай. Вытокі гэтай блізкасці сягаюць яшчэ ў раннефеадальны перыяд, калі большая частка Падняпроўя ўваходзіла ў склад Смаленскага, паўднёвая частка – Чарнігаўскага княстваў. Паводле перапісу 1897 г. этнічны склад краю быў наступны: беларусы – 82,4 %, габрэі – 12,1 %, рускія – 3,4 %, палякі – 1,4 %. Паводле моўных асблівасцяў, вылучаюць усходнемагілёўскую групу гаворак з пераходам іх да сярэднебеларускіх гаворак.

Гаспадарча-бытавы ўклад насельніцтва Падняпроўя характарызаваўся больш прыкметнай, чым на поўначы, роляй земляробства. Сярод збожжавых першае месца займала жыта, затым – авёс, які шырока выкарыстоўваўся як фуражная культура ў конегадоўлі. З тэхнічных культур, апрача лёну, важнае значэнне мела вырошчванне канапель.

У лясных раёнах прыкметную ролю адыгрывалі здабыўныя промыслы – збіральніцтва, пчалярства, лясныя і лесахімічныя промыслы (здабыванне смалы, выпальванне паташу, вуглю і г.д.). Частка насельніцтва выпраўлялася ў адыходныя промыслы ў суседнія губерні Расіі, дзе словы “буднік” і “беларусец” ужываліся як сінонімы.

Паселішчы Падняпроўя адрозніваліся большымі памерамі ў параўнанні з Падзвіннем і налічвалі ў сярэднім 15 – 30 двароў.

Вёскі (сёлы) вызначаліся выразнай вулічнай структурай з наяўнасцю больш старажытнай цэнтральнай часткі і канцоў, завулкаў. Найбольш тыповая забудова двара – вяночная, Г-падобная, радковая. Замкнуты двор часцей бытаваў ў заможнага сялянства. Распаўсюджанымі тыпамі планіроўкі традыцыйнага жылля былі: хата + сенцы + клець; хата + сенцы + хата.

Традыцыйным верхнім адзеннем былі злёгку прыталеныя кажухі і шыракаполыя світкі светла-шэрага колеру са стаячым каўняром без гузікаў (павязваліся вакол таліі шарсцяным плеценым поясам), каптан-армяк тыпу бурноса, укарочаная паўсвітка і кажушок. Выхадныя світы атарочваліся па каўняры, ворату, абшлагу рукавоў каляровымі, пераважна сінімі (радзей чырвонымі, зялёнымі) шнуркамі; кажухі былі апушаны шэрсцю па краях і ворату. У традыцыйным жаночым адзенні вылучаліся старажытныя панёвы, былі пашыраны ўзорныя андаракі, сшытыя з безрукаўкай-ліфам, спадніцы, саяны. Жаночыя кашулі шылі звычайна з плечавымі ўстаўкамі (палікамі), іх упрыгожвалі вышыўкай і тканым арнаментам (пераважна геаметрычным, чырвонага колеру). У арнаменце святочнага адзення і тканін дамінавалі адносна буйныя геаметрызаваныя ўзоры ў выглядзе шматкутнікаў, стылізаваных крыжоў, разэтак, сняжынак; у Пасожжы часцей сустракаліся раслінныя матывы. Непаўторнай адметнасцю вылучалася неглюбскае і будакашалёўскае мастацкае ткацтва. Тканыя ручнікі, даўжынёй да 5 м, багата

аздабляліся па канцах унікальным геаметрычна-раслінным арнаментам, які ніколі не паўтараўся.

Керамічны посуд у краі рабілі пераважна з чырвонай гліны з тонкімі сценкамі і аздаблялі па гарлавінах ці плечыках хвалістымі пояскамі, што наносіліся завостраным прутком па сырой гліне.

Такім чынам беларускае Падняпроўе, як гістарычна-этнаграфічны рэгіён, мае свой непаўторны этна-культурны каларыт.

*Цэнтральная Беларусь*. Рэгіён займае асноўную частку Мінскай і заходнюю ўскраіну Магілёўскай абласцей. Насельніцтва Цэнтральнай Беларусі этнагенетычна склалася на балта-славянскай аснове (нашчадкі ўсходніх балтаў, дрыгавічоў, крывічоў) з удзелам асобных груп палякаў, рускіх, габрэяў, татараў і інш.

У XI ст. паўночная частка рэгіёна ўваходзіла ў склад Полацкага княства, у пачатку XII ст. вылучылася ў самастойнае Менскае княства. Пасля далучэння да ВКЛ (пачатак XIV ст.) тут працягвала правіць мясцовая княжацкая дынастыя, з 1566 г. Мінск становіцца цэнтрам ваяводства. Гістарычны лёс паўднёвай часткі рэгіёна ў старажытнасці быў больш цесна звязаны з другім раннефеадальным утварэннем – Тураўскім княствам, у якім вылучаліся Слуцкі і Клецкі ўдзелы. Слуцкі ўдзел вылучыўся ў самастойнае княства, якое ў складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай захоўвалася як унікальная адміністрацыйная адзінка да канца XVIII ст. Мясцовыя князі Алелькавічы і Радзівілы з’яўляліся буйнейшымі землеўладальнікамі дзяржавы, мелі свае войска і аўтаномны апарат кіраўніцтва.

Этнакультурны комплекс Цэнтральнай Беларусі ўвабраў у сябе шматлікія рысы і элементы, уласцівыя іншым рэгіёнам.

Мясцовая тапаніміка вызначаецца складанасцю і неаднароднасцю, якія адлюстравалі доўгі працэс балта-славянскіх сувязяў. Мясцовыя гаворкі вылучаюцца ў асобную групу сярэднебеларускіх гаворак, што ўяўляюць пераходнае, міждыялектнае ўтварэнне. Паводле перапісу 1897 г., у якім этнавызначальнай была родная мова, у Цэнтральнай Беларусі налічвалася 75,3 % беларусаў, 16 % – габрэяў, 4,8 % – рускіх, 3,5 % – палякаў.

Цэнтральная Беларусь была заселена і засвоена нераўнамерна, што адлюстравалася ў разнастайнасці культурных ландшафтаў. У сярэдзіне XIX ст. пад ворывам у Слуцкім і Мінскім паветах знаходзілася больш паловы ўсёй плошчы, у той час як у Бярэзінскім басейне – толькі каля 20 %.

Земляробства было больш развіта на Слуцка-Нясвіжскай лёсавай раўніне, дзе ўрадлівыя глебы і больш інтэнсіўная агратэхніка давалі магчы-

масць вырошчваць высокія ўраджаі збожжавых – жыта, пшаніцы, аўса. Тут нярэдка практыкаваліся больш эфектыўныя шматпольныя севазвароты, у якіх збожжавыя культуры чаргаваліся з пасевамі бульбы і кармавых траў, а пад парам пакідалася толькі пятая ці шостая частка поля.

У Бярэзінскім басейне шырока распаўсюдзіліся лясныя промыслы. Ва ўмовах прыгону сяляне ў зімовы перыяд працавалі ў лясах, нарыхтоўвалі лесаматэрыялы, выпальвалі вугаль і паташ.

Земляробства ў гэтым краі насіла экстэнсіўны характар і нават у другой палове XIX ст. тут поруч з трохполлем часта сустракаліся лясная аблога і ляда. У жывёлагадоўлі больш прыкметную ролю ў параўнанні з паўднёвым захадам адыгрывала развядзенне коней.

Характар сельскіх пасяленняў Цэнтральнай Беларусі прыкметна мяняецца з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад і поўдзень ад невялікіх вёсак, рассеяных сярод лясоў, да буйных шматдворных сёл, размешчаных на адкрытай мясцовасці.

У Цэнтральнай Беларусі вядомы амаль усе тыпы сядзібнай забудовы, што сустракаліся ў іншых рэгіёнах краіны. Найбольш тыповым быў пагонны двор. Традыцыйнае сялянскае жыллё – двух- і трохкамернае тыпу хата + сенцы, хата + сенцы + клець.

Народнае адзенне Цэнтральнай Беларусі да канца XIX ст. захоўвала шэраг традыцыйных рыс. Асноўная верхняя вопратка – світа з адкладным, радзей стаячым каўнярам, крыху звужаная ў таліі, шылася з шэрага ці чорнага сукна, па баках, ворату, адвароту рукавоў упрыгожвалася каляровымі (блакітнымі, сінімі) шнуркамі. Для жаночага комплексу найбольш тыповымі былі дэкараваная кашуля з палікамі, суконны андарак (або ільняная спадніца), фартух, безрукаўка; на галаве – чапец-каптур, хустка, у сталых – намітка.

Асаблівай разнастайнасцю і багаццем узорных упрыгожванняў вылучаліся *капыльскі* і *пухавіцкі* строі адзення. Ва ўзорным дэкоры андаракаў, спадніц, фартухоў даволі папулярным было чаргаванне гарызантальных рознатанальных палос, што паступова згушчаліся данізу. У капыльскіх строях рознакаляровыя палосы часцей спалучаліся з геаметрычным арнаментам (асноўныя фігуры – ромб, разетка, елка і інш.). На рукавах гэты ўзор дапаўнялі раслінныя формы.

Мясцовая кераміка па сваёй тэхналогіі і мастацкіх якасцях вызначалася разнастайнасцю і спалучала ў сабе рысы, уласцівыя суседнім рэгіёнам. У XIX – пачатку XX ст. найбольш распаўсюджаным быў задымлены і паліваны посуд; у сельскіх цэнтрах (Сіняўка, Забалотнікі, Ганевічы і інш.) выраблялі пераважна абварную кераміку. Вырабы распісваліся сціплым

узорам у выглядзе хвойных галінак, паяскоў, хвалістых ліній (івянецкая і ракаўская кераміка).

Паводле этнаграфічнай самабытнасці ў межах рэгіёна можна вылучыць тры лакальныя варыянты – *паўночны* (Мінскі), *паўднёвы* (Слуцка-Нясвіжскі) і *ўсходні* (Бярэзінскі), якія ў культурным плане маюць шмат падабенства з суседнімі рэгіёнамі Беларусі.

*Панямонне.* Беларускае Панямонне займае верхні басейн Нёмана і яго прытокаў. Мясцовае насельніцтва этнагенетычна склалася на славянскай аснове, з удзелам асіміляваных балтаў (літвы, прусаў, яцвягаў). У Сярэднявеччы рэгіён быў вядомы пад лакальнай назвай "Літва", побач з якой ужывалася і назва "Чорная Русь".

У XIII ст. рэгіён становіцца эпіцэнтрам дзяржаватворчых працэсаў – утварэння Вялікага княства Літоўскага, першай сталіцай якога быў Наваградак.

У выніку этнічнага сімбіёзу ў Панямонні складваецца рэгіянальны тып культуры, у якой спалучаліся беларускія, літоўскія і польскія рысы. Агульны лёс беларускага і літоўскага народаў у складзе адзінай дзяржавы абумоўліваў узаемны культурны ўплыў і блізкія рысы ў развіцці этнасацыяльных, грамадска-прававых і эканамічных адносін. Зменлівая палітычная і канфесійная сітуацыя ў рэгіёне ўскладняла і без таго стракаты этнасацыяльны склад мясцовага насельніцтва, размывала этнічныя межы, узмацняла працэсы інфільтрацыі і асіміляцыі.

Мясцовыя гаворкі Панямоння вылучаюцца ў асобную гродзенска-баранавіцкую групу беларускай мовы; у павілейскай частцы дамінуе пераходны сярэднебеларускі дыялект. Паводле перапісу 1897 г. этнічны склад рэгіёна быў прадстаўлены наступным чынам: беларусы – 78,3 %, габрэі – 13,1 %, палякі – 3,2 %, літоўцы – 2,7 %, рускія – 2,5 %.

У ландшафтах Панямоння ўзгоркавыя ўзвышшы і перасечаныя раўніны чаргуюцца з шырокімі нізінамі, дрэніраванымі рupsламі Нёмана і яго прытокаў. Дзярнова-падзолістыя глебы, што развіваліся на лёсападобных суглінках, пры захаванні адпаведных агратэхнічных правіл давалі высокія ўраджаі.

Асноўнае месца ў структуры пасеваў займалі жыта (каля паловы плошчаў), авёс, пшаніца, грэчка. У другой палове XIX ст. пашырыліся пасевы кармавых траў, што паляпшала структуру глебы і стымулявала развіццё жвёлагадоўлі. Мясцовая парода рагатай жывёлы была тут больш буйнай, чым на ўсходзе Беларусі. Палі апрацоўвалі з дапамогай так званай "літоў-

скай” (палескай) сахі, якая была прыстасавана да мясцовых умоў і ўяўляла даволі лёгкую канструкцыю для аднаконнай (ці аднаваловай) запрэжкі.

Істотны рост мануфактурнай вытворчасці ў рэгіёне садзейнічаў развіццю гандлёвых адносін і рыхтаваў базу для прамысловага перавароту. У сярэдзіне XIX ст. па развіццю прамысловасці Гродзенская губерня займала першае месца ў Беларусі і давала прамысловай прадукцыі больш, чым усе астатнія беларускія губерні, разам узятыя.

У выніку правядзення аграрнай рэформы 1557 г. большасць сельскіх паселішчаў Панямоння ўяўляла сабой вёскі вулічнага тыпу, якія размяшчаліся на адкрытай мясцовасці ўздоўж дарог і гандлёвых трактаў, паблізу рэк і азёр.

Прадстаўнікі свабодных саслоўяў (дробная шляхта, аднадворцы) пражывалі ў аколіцах, засценках, фальварках. Назвы гэтых паселішчаў, як правіла, супадалі з прозвішчамі іх жыхароў.

Найбольш тыповай для сялянскіх сядзіб была пагонная (аднарадная) сістэма забудовы. Гумны, пуні для сена ставіліся на некаторай адлегласці ў канцы сядзібы ці насупраць хаты, па другі бок вуліцы. Там жа нярэдка будаваліся і двухпавярховыя *лямусы* (гаспадарчыя пабудовы для захавання харчовых прадуктаў, збожжа, адзення, каштоўнай маёмасці, прылад працы, а таксама для жылля ўлетку). Тыповая планіровачная структура традыцыйнага жылля – хата + сенцы + камора. У пачатку XX ст. яна ўскладнілася вылучэннем функцыянальна самастойнай кухні, спальні, святліцы.

Складаны этнасацыяльны склад насельніцтва і актыўныя міжэтнічныя кантакты абумовілі спецыфіку мясцовага адзення. Тыповая верхняя вопратка – *бурнос* з адкладным каўняром свабоднага крою і прыталеная світа, зшытая з даматканага шэрага і цёмна-шэрага сукна. Дробная шляхта і дзяржаўныя сяляне замест сярмягі насілі *капот* з шэрага і шэра-зялёнага сукна з адкладным каўняром. Капот шылі ў талію, ён меў у ніжняй частцы фалды, зашпільваўся на металічныя гузікі, традыцыйны пояс не выкарыстоўваўся. Жанчыны насілі *катанку*, якая адрознівалася ад капота тым, што была карацейшай, зашпільвалася на гаплікі і мела адну бакавую кішэню. З іншых тыпаў верхняга адзення ў шырокім ужытку быў кажух, палатняны насоў, *спанцэрка* (куртка), жаночы каптанік (кафтан), мужчынская *камізэлька* (безрукаўка). Адметнасцю жаночага строю з’яўляўся *сурдут* (капот) з цёмна-гранатавага сукна з аксамітавым каўняром і фалдамі, featured: разнакаляровая спадніца і фартух. У левабярэжнай частцы Панямоння адзенне жыхароў у большай ступені захоўвала традыцыйныя рысы. Тут часцей сустракаліся жаночыя наміткі і звычайныя світы – сярмягі. Мужчыны ўзімку

насілі шапкі-аблавухі з аўчыны, а ўлетку часта саламяныя *капелюшы*, якія плялі самі. Будзёны абутак – лыкавыя лапці, падшытыя грубай скурай ("сабакамі"), *хадакі* (пасталы), часам чаравікі на тоўстай драўлянай падэшве ці цалкам выразаныя з дрэва (*дзеравянікі*).

Багаццем мастацкіх сродкаў і арыгінальным майстэрствам вызначаліся панёманскія ўзорныя посцілкі, ручнікі, дываны, абрусы.

У вытворчасці керамічнага посуду і яго дэкаратыўна-засцерагальнай апрацоўцы працэс задымлівання часта спалучаўся з глянцаваннем. Мастацкай выразнасцю вылучалася мясцовая чорнаглянцавая кераміка, для якой быў уласцівы старажытны арнамент у выглядзе рамбічнай сеткі, палосак, елачак і інш. Узор наносілі па падсохшай паверхні вырабаў кавалкам крэменю – "*лашчыкам*", пасля чаго посуд абпальвалі ў закрытых печах без доступу кіслароду.

У выніку тэрмахімічнай апрацоўкі посуд набываў цёмна-матавы колер, на фоне якога праступаў бліскучы ўзорны арнамент.

Адзначаныя рысы народнай культуры і гаспадарча-бытавога ўкладу, а таксама адметны этна-гістарычны лёс, дазваляюць разглядаць Беларускае Панямонне як самастойны гістарычна-этнаграфічны рэгіён.

*Усходняе Палессе* займае большую частку Палескай нізіны на тэрыторыі Гомельскай, часткова Мінскай і Брэсцкай абласцей. У VIII – IX стст. рэгіён засялялі дрыгавічы, якія мелі сваё палітычнае аб'яднанне – "княжанне" з цэнтрам у Тураве. У перыяд феадальнай раздробленасці (XII – XIII стст.) асноўная частка Ўсходняга Палесся ўваходзіла ў склад Тураўскага княства, Мазырскае Палессе – Кіеўскага княства. У часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай рэгіён уваходзіў у склад Мінскага, Наваградскага і Брэсцкага ваяводстваў.

Па выніках перапісу 1897 г. на тэрыторыі Ўсходняга Палесся пражывала 81,2 % беларусаў, 14,4 % – габрэяў, 1,5 % – палякаў, 1,5 % – рускіх і 1 % – украінцаў.

У рэльефа Ўсходняга Палесся кампактныя ўзвышшы і грады (Мазырская, Юравіцкая, Хойніцка-Брагінская) чаргуюцца з шырокімі балоцістымі нізінамі Прыпяцкага Палесся. Шырокія веснавыя разлівы, вялікія плошчы забалочаных зямель і няўдобіцы накладалі адбітак на характар рассялення, становішча шляхоў зносін і транспартныя сродкі, гаспадарчыя заняткі і паўсядзённы побыт. Раздробленыя ўчасткі ворных зямель былі раскіданы на значнай адлегласці асобнымі астраўкамі сярод балот, рачных старыц і лясоў, што стварала шмат нязручнасцяў пры іх апрацоўцы. У гэтым кантэксце, лодкі ва Ўсходнім Палессі былі неабходным атрыбутам

гаспадарчага і пабытовага жыцця. Значнае месца ў земляробчай практыцы побач з трохпольнай сістэмай займалі лясная аблога і падсечна-агнявое (ляднае) земляробства. Зямлю апрацоўвалі палескай сахой, у якую запрагалі валоў, а таксама *вершалінай* і *смыкам*, якія выкарыстоўваліся пры скароджанні поля побач з плеценай бараной да пачатку XX ст.

Мясцовыя сяляне трымалі шмат свойскай жывёлы, больш заможныя – па некалькі дзесяткаў галоў на двор. У структуры жывёлагадоўлі пераважалі каровы і свінні. Гаспадарча-пабытовы ўклад характарызаваўся самабытна-патрыярхальнымі рысамі і ўяўляў універсальную сялянскую гаспадарку, у якой гарманічна спалучаліся земляробства, жывёлагадоўля, разнастайныя промыслы (рыбалоўства, пчалярства, збіральніцтва) і хатнія рамёствы. У рацыёне ежы больш значнае месца, чым у суседніх рэгіёнах, займалі рыбныя і мясныя прадукты, дары лесу.

Сельскія пасяленні былі нераўнамерна размеркаваны па тэрыторыі краю. Найбольшая шчыльнасць пасяленняў прыпадала на ўзвышшы, дзе пераважалі шматдворныя вёскі. Вулічная паласа ў прыбярэжных нізінных паселішчах уяўляла сабой сыпучы пясчаны грунт або штучную *грэблю*, ад якой да двароў вялі такія ж гаці-пад’езды і масткі. Праз балоцістыя, затопленыя ўвесну ўчасткі ўладкоўваліся пераходы на *палях* і кладкі. Побач з шматдворнымі сустракаліся невялікія вёскі ў 5 – 10 сядзіб, засценкі і хутары-выселкі.

Тыповыя двары – пагонныя, вяночныя (замкнутыя) і Г-падобныя. Пабудовы звычайна размяшчаліся ў наступным парадку: хата – сенцы – істопка – павець – хлявы – адрына. Лазні, як структурны элемент сядзібы, практычна адсутнічалі. Найбольш распаўсюджаныя планіровачныя тыпы жылля: хата + сенцы, хата + сенцы + істопка. Сенцы (“*ляцён*”) – паўжылое памяшканне – летам служылі спальняй. На балоцістых месцах хаты мелі драўляную падлогу і, як клеці і свірні, ставіліся на палі.

Народнае адзенне Ўсходняга Палесся вызначалася шырокім дыяпазонам стылявых і дэкаратыўных асаблівасцяў. Асаблівай мастацка-дэкаратыўнай адметнасцю вылучаліся такія лакальныя строі, як *калінкавіцкі*, *брагінскі*, *мазырскі* і *тураўскі*. Асновай дэкаравання жаночых кашуль і фартухоў быў багаты вышываны арнамент. На ўзмежжы з заходнепалескім рэгіёнам вылучаецца самабытны *давыд-гарадоцкі* комплекс адзення, што складаецца з простай, часта недэкараванай кашулі, доўгай спадніцы (*сукні*), безрукаўкі, шырокага пояса і арыгінальнага галаўнога ўбору – *галавачкі* – усходняга (татарскага) паходжання. Шчодрасць шыйных і нагрудных упрыгожанняў у выглядзе шматлікіх караляў, ланцужкоў з медальёнамі

падкрэслівалі своеасаблівасць гэтага ўбору, які прыкметна адрозніваўся ад традыцыйнага касцюма навакольных сялян.

У керамічнай вытворчасці вядома некалькі цэнтраў (Парычы, Юравічы, Лоеў), што спецыялізаваліся па вырабу задымленага і паліванага посуду. На значнай частцы Ўсходняга Палесся бытаваў і белагліняны посуд, які прывозілі ганчары з Гараднай, буйнейшага цэнтра керамічнай вытворчасці ва ўсім Палессі.

Этнакультурная спецыфіка Ўсходняга Палесся дапаўняецца лінгвістычнай і фальклорна-абрадавай адметнасцю. Мясцовыя мазырскія гаворкі складаюць асобную групу паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы. Асабліва развітай у рэгіёне з'яўляецца веснавая абрадавасць і адпаведны фальклорны блок (веснавыя загукальныя, юраўскія, русальныя песні). Да XX ст. захаваўся і надзвычай архаічны веснавы рытуал "пахаванне стралы", які ўзыходзіць да язычніцкага культа Бога Грымотніка-Перуна і з'яўляецца выключнай адметнасцю Ўсходняга Палесся.

Спецыфіка і кансерватызм традыцыйных форм культуры дазваляюць аднесці Ўсходняе Палессе да аднаго з найбольш самабытных гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

*Заходняе Палессе* займае басейн верхняй Прыпяці і яе прытокаў Піны і Ясельды; на захадзе ўключае правабярэжжа Заходняга Буга. Насельніцтва Заходняга Палесся этнагенетычна склалася на старажытнаславянскай аснове (валыняне, бужане, дрыгавічы, драўляне) з удзелам асімліяваных яцвягаў, асобных груп мазаўшан і інш. У XIII ст. рэгіён становіцца сферай сутыкнення інтарэсаў галіцка-валынскіх і літоўскіх князёў. У складзе ВКЛ Заходняе Палессе ўтварала Берасцейскую зямлю, якая захоўвала абласную аўтаномію і мела свае прадстаўнічыя органы (мясцовы сейм).

Самабытны лад жыцця, прыстасаванага да мясцовых экалагічных умоў, адносная ізаляванасць і самадастатковы рытм жыццядзейнасці паасобных сельскіх акруг узмацнялі культурна-пабытовую і лінгвістычную разнастайнасць у рэгіёне. Па выніках перапісу, які арыентаваўся на родную мову, тут у канцы XIX ст. пражывала 46,7 % беларусаў, 29,9 % – украінцаў, 16,8 % – габрэяў, 3,8 % – рускіх, 2,4 % – палякаў. Як гістарычна-этнаграфічны рэгіён Заходняе Палессе ў асноўным супадае з арэалам заходнепалескіх (брэсцка-пінскіх) гаворак. Заходнепалескі песенны фальклор характарызуецца глыбокімі традыцыямі харавога і адзіночнага спеву (унісонна-гетэрафонны стыль), лаканічнасцю меладычных фабул з элементамі бурданавання ("уздрыгвання") напеўнага гучання.

Прыродныя і культурныя ландшафты Заходняга Палесся неаднародныя, што дазваляе вылучыць тры лакальныя раёны – *Падляшша* (Пабужжа), *Загароддзе* і *Пінскае Палессе*.

*Падляшша* ўяўляе сабой пляскатую раўніну з слабапрыўзнятымі ўзгоркамі. Зімовы сезон тут самы кароткі ў Беларусі, вегетатыўны перыяд працягваецца 200 – 208 дзён. Спрыяльныя кліматычныя ўмовы садзейнічалі развіццю земляробства і жывёлагадоўлі. З развіццём капіталістычных адносін гэтыя галіны гаспадаркі ўсё цясней звязваліся з рынкам. Продаж хлеба і бульбы складаў важную крыніцу грашовых прыбыткаў. У басейнах Нарава і Буга прамысловае значэнне набыла культура хмелю. У жыхароў Белавежскай пушчы прыкметную ролю адыгрывалі лясныя і здабыўныя промыслы.

Народная архітэктура Падляшша выяўляе шэраг агульных рыс з суседнімі рэгіёнамі Польшчы. У сярэдзіне XIX ст. у гэтым раёне нярэдка сустракаліся трох- або чатырохкамернае жытло тыпу хата + сенцы + камора, прысценак + хата + сенцы + камора. *Прысценак* ўяўляў сабой халоднае памяшканне, дзе ў зімовы час стаялі бочкі з капустай і буракамі, захоўвалася мука і іншыя прадукты. Жылыя пабудовы мелі, як правіла, каменны падмурак; з каменю рабіліся часам і сцены студняў.

*Загараддзе* ўяўляе сабой узвышаны масіў марэнных град і дзюнных форм рэльефу, месцамі перасечаных púсламі рэк. Гэты раён, як і Падляшша, быў даволі густазаселены і засвоены пад земляробства. Спецыялізацыя гаспадаркі мае шмат агульных рыс з Падляшшам. Земляробства задавальняла пераважна мясцовыя патрэбы ў хлебе. У структуры прадукцыйнай жывёлагадоўлі прыкметную ролю адыгрывала авечкагадоўля. У прырэчных вёсках значнай падмогай было рыбалоўства, бурлацтва, рамізніцкі промысел.

Загародскія майстры славіліся вырабам драўлянага посуду, распісных куфраў, транспартных сродкаў, розных рэчаў з лазы і саломкі (кошыкі, сявенькі, корабы і да т.п.), апрацоўкай аўчын, узорным ткацтвам. Жыллёвы комплекс на поўначы Загараддзя складаўся з хаты, сенцаў і варыўні (істопкі), апошняя была не характэрна для большай часткі рэгіёна.

*Пінскае Палессе*, як і левабярэжжа Ясельды, мела рэдкія пасяленні, раскіданыя сярод балот. Самабытны кут рэгіёна – Зарэчча, дзе шматлікія рэкі (Стыр, Ясельда, Піна, Бобрык і інш.) упадаюць у Прыпяць на невялікай адлегласці, утвараючы мноства рукавоў і пратокаў. Вясною гэты край ператвараўся ў вялізнае возера, сярод якога ўзвышаліся выспы з вёскамі.

На працягу двух-трох месяцаў зносіны паміж імі былі магчымыя толькі з дапамогай лодак. На лодках мясцовыя жыхары выпраўляліся ў лес па дровы, на сенажаць, палявалі на качак, лавілі рыбу. На *шугалеях* перавозілі валоў і земляробчыя прылады на суседнія выспы, каб узараць і засеяць поле. На чоўнах выпраўляліся і на могілкі, каб пахаваць нябожчыка ці памянуць дзядоў, а таксама на кірмашы, дзе гандлявалі каля прыстані непасрэдна з лодак.

Вёскі Заходняга Палесся, пераважна шматдворныя, размяшчаліся групамі ці па адной, па ўзбярэжжах, на пясчаных градах і дзюнах па краі балота. Традыцыйная сядзібная забудова – пагоннага тыпу (аднарадная), радзей – скучаная. Найбольш характэрная структура традыцыйнага жытла: хата + сенцы + камора; хата + сенцы. У канцы XIX ст. яна ўскладнялася выдзяленнем у сенцах кухні.

Народнае адзенне Заходняга Палесся вызначалася самабытнасцю і ўстойлівасцю традыцыйных форм, маляўнічасцю аздаблення жаночага строю. Асноўнае верхняе адзенне – шыракаполая прыталеная світа (*латуха*) і кажух. Колер світы вар'іраваў ад чорнага да попельна-шэрага і бурага. Выхадную світу шылі звычайна з больш цёмнага (чорнага) сукна; па кішэнях, бакавых клінах яе ўпрыгожвалі каляровымі (блакітнымі, чырвонымі) шнуркамі і кутасамі.

Значнай разнастайнасцю адрознівалася паясное жаночае адзенне. Узорныя андаракі, ільняныя спадніцы (летнікі), спадніцы-буркі з валенай воўны мелі лакальныя асаблівасці і насіліся ў залежнасці ад бытавой сітуацыі і рытуальнага кантэксту, адпавядаючы ўзросту, сацыяльнаму статусу і сезону года. Толькі ў Заходнім Палессі сустракаліся не ўласцівыя іншым беларускім рэгіёнам буркі, *затулкі* (блізкія да панёвы фартухі), *платы* (старасвецкія наміткі з тонкіх адбеленых нітак).

У краі існаваў шэраг буйных цэнтраў народных промыслаў – ткацкіх (Моталь), гарбарна-аўчынных (Дамачава), ганчарных (Гарадная, Пружаны) і інш. Вырабы мясцовых ганчароў (белаглінны ці чорналашчоны посуд) былі вядомы далёка за межамі рэгіёна.

Падобныя прыродна-кліматычныя ўмовы і гаспадарча-культурныя асаблівасці збліжаюць Заходняе і Ўсходняе Палессе. Аднак этнакультурная спецыфіка і самабытнасць кожнага з гэтых рэгіёнаў дазваляюць разглядаць іх як асобныя гістрычна-культурныя вобласці.

# ЗАДАННІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## Тэма 1. Этнаграфія Беларусі як навука, яе прадмет, метады і ўзаемасувязь з сумежнымі дысцыплінамі

### Этнаграфічны практыкум

Выбярыце адзіна магчымы варыянт адказу:

1. Этнаграфія вывучае:
а) сацыяльна-эканамічную структуру этнаса;
б) гісторыю мастацкай культуры і літаратуры народа;
в) антрапалагічныя асаблівасці этнаса;
г) паходжанне і этнічную гісторыю народа.

2. Аб'ектам этнаграфіі з'яўляецца:
а) беларускі традыцыйны фальклор;
б) беларуская этнічная прастора;
в) этнічная культура беларусаў;
г) беларускі этнас;
д) этнічная гісторыя беларусаў.

3. Этнас – гэта:
а) супольнасць людзей з аднолькавай мовай і знешнім абліччам;
б) гістарычна склаўшаяся на пэўнай тэрыторыі супольнасць людзей з агульнай культурай і самасвядомасцю;
в) супольнасць людзей, што характарызуецца агульнасцю сацыяльна-эканамічнага жыцця і наяўнасцю дзяржавы;
г) чалавечая супольнасць, якая вызначаецца адзінствам культуры і рэлігійнага жыцця.

4. Этнічная тэрыторыя – гэта:
а) тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа, з якой звязаны яго этнагенез і этнічная гісторыя;
б) тэрыторыя пражывання этнаса, якая ўвайшла ў склад нацыянальнай дзяржавы;
в) прастора, дзе дамінуе мова і культура аднаго народа;
г) сукупнасць тэрыторый, дзе пражываюць прадстаўнікі пэўнага этнаса.

5. Прадметам этнаграфіі Беларусі з'яўляецца:
а) беларусы, як асобны этнас;
б) этнічная культура беларусаў;
в) дзяржаватворчыя працэсы на беларусі;
г) нацыянальная культура беларусаў.

6. Адной з галоўных катэгорый духоўнай культуры з'яўляецца:
а) гаспадарка;
б) рэлігія;
в) ментальнасць;
г) этнічныя працэсы;
д) рамяство.

7. Саманазвай народа з'яўляецца:
а) этнонім;
б) эндаэтнонім;
в) палітонім;
г) канфесіонім;
д) экзаэтнонім.

8. Да гістарычных форм этнаса не адносіцца:
а) племя;
б) этнічная група;
в) народнасць;
г) нацыя.

9. Адным з важнейшых кампанентаў нацыянальнага механізму трансляцыі этнакультурнай інфармацыі з'яўляецца:
а) традыцыйны светапогляд этнаса;
б) народныя абрады і звычаі;
в) асвета і адукацыя;
г) комплекс этнічных стэрэатыпаў;
д) гаспадарча-культурны тып.

10. Найбольш важным метадам палявых этнаграфічных даследаванняў з'яўляецца:
а) апытанне інфарматараў;
б) сбор этнаграфічных калекцый;
в) назіранне і фотафіксацыя;
г) эксперэментальная этнаграфія.

11. Уласна этнаграфічнай з'яўляецца наступная класіфікацыя:
а) геаграфічная;
б) лінгвістычная;
в) гаспадарча-культурная;
г) антрапалагічная.

## Лагічныя задачы і праблемныя пытанні

1. У чым заключаецца падабенства і розніца паміж этнаграфіяй і этналогіяй?

2. Патлумачце, чаму менавіта традыцыйная этнічная культура з’яўляецца галоўным прадметам этнаграфіі?

3. У чым заключаецца сутнасць этнаграфічнага разумення культуры?

4. Пералічыце і ахарактарызуйце актуальныя праблемы этнаграфіі Беларусі на сучасным этапе.

5. Прыгадайце і ахарактарызуйце асноўныя кампаненты этнічнай сістэмы.

6. У чым заключаецца праблема “экалогіі этнаса”?

7. Ахарактаразуйце сучасныя функцыі беларускай мовы, як неад’емнага кампанента беларускай этнічнай сістэмы.

8. Вызначце функцыянальную ролю этнічнай самасвядомасці ў эпоху Сярэднявечча і ў сучасным грамадстве.

9. Якія прынцыпы з’яўляюцца асноватворчымі пры дасягненні гарманічных міжэтнічных адносін?

10. Якія крыніцы этнаграфічнага даследавання Беларусі з’яўляюцца прыярытэтнымі на сучасным этапе?

11. Якое месца, на вашую думку, займае этнаграфія Беларусі ў сістэме сучаснай айчыннай гуманітарыстыкі?

## Тэматыка даследаванняў, рэфератаў і спавешчанняў

1. Месца і роля этнаграфіі ў сістэме сучасных гуманітарных ведаў.

2. Этнаграфія Беларусі: праблемы, перспектывы і прыярытэты.

3. Гуманітарныя і прыродызнаўчыя навукі ў этнаграфічных даследаваннях.

## Этнаграфічныя катэгорыі і паняцці, рэкамендаваныя да засваення

Этнаграфія, этналогія, этнас, культура этнаса, этнічная тэрыторыя, этнічная самасвядомасць, этнонім, эндаэтнонім, экзаэтнонім, палітонім, канфесіёнім, псеўдаэтнонім, этнічны стэрэатып, племя, народнасць, нацыя, тытульная нацыя, этнічная (нацыянальная) меншасць, гістарычна-этнаграфічная вобласць, гаспадарча-культурны тып.

## Тэма 2. Гісторыя этнаграфічнага вывучэння Беларусі

## Этнаграфічны практыкум

Выбярыце адзіна магчымы варыянт адказу:

1. Першыя напаўлегендарныя звесткі пра старажытнае насельніцтва Беларусі належаць:
а) Гіпакрату;
б) Гесіёду;
в) Герадоту;
г) Тацыту;
д) Страбону.

2. Першым аўтарам, хто выкарыстаў этнаграфічна-параўнаўчы метад пры апісанні насельніцтва Беларусі, з’яўляецца:
а) М. Гусоўскі;
б) М. Ліцвін;
в) Я. Ласіцкі;
г) А. Гваніні;
д) С. Рысінскі.

3. Актывізацыя вывучэння народнай беларускай культуры звязана з эпохай:
а) Рэнесансу;
б) Мадэрнізму;
в) Рамантызму;
г) Асветніцтва;
д) Класіцызму.

4. Сярод польскіх даследчыкаў першай паловы XIXст. аўтарам першага артыкула па этнаграфіі беларусаў з’яўляецца:
а) Г. Калантай;
б) А. Нарушэвіч;
в) Я. Патоцкі;
г) Т. Чацкі;
д) М. Чарняўская.

5. У першай палове XIX ст. даследчыкі беларускай народнай культуры найбольшую ўвагу звярталі:
а) на традыцыйныя рамёствы і промыслы;
б) на народнае дойлідства;
в) на сацыяльную арганізацыю і формы сям’і;
г) на песенны фальклор;
д) на этнічныя стэрэатыпы.

6. Беларускі этнограф П. Шпілеўскі з’яўляецца яскравым прадстаўніком наступнай навуковай школы:
а) міфалагічнай;
б) эвалюцыянісцкай;
в) этнапсіхалагічнай;
г) сацыялагічнай;
д) дыфузіянісцкай.

7. І. Насовіч з’яўляецца першым прафесійным даследчыкам:
а) дахрысціянскіх вераванняў і культаў;
б) песеннага фальклору беларусаў;
в) народнай медыцыны;
г) беларускай мовы;
д) каляндарнай абрадавасці.

8. Для М. Нікіфароўскага асноўным прадметам навуковага вывучэння была традыцыйная культура беларусаў:
а) Заходняга Палесся;
б) Падзвіння;
в) Усходняга Палесся;
г) Падняпроўя;
д) Панёмання;
е) Цэнтральнай Беларусі.

9. Дзявіцітомнае выданне “Беларускі зборнік” стала плёнам актыўнай этнаграфічнай дзейнасці:
а) Е. Раманава;
б) П. Шэйна;
в) А. Багдановіча;

г) М. Нікіфароўскага;
д) У. Дабравольскага.

10. Буйнейшым польскім даследчыкам беларускай этнічнай культуры з’яўляецца:
а) З. Глогер;
б) М. Федароўскі;
в) К. Машынскі;
г) Ч. Пяткевіч;
д) А. Кваснеўскі;
е) А. Рыпінскі.

11. У сваёй працы “Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў” А. Багдановіча прадпрыняў спробу:
а) прааналізаваць узаемаўплыў хрысціянства і язычніцтва ў духоўнай культуры беларусаў;
б) рэканструяваць дахрысціянскі пантэон беларусаў;
в) прасачыць генезіс традыцыйных беларускіх вераванняў;
г) ахарактарызаваць дахрысціянскія элементы ў сямейнай абрадавасці беларусаў.

12. Адным з першых, хто пачаў актыўна выкарыстоўваць метад фатафіксацыі ў этнаграфічных экспедыцыях, з’яўляецца:
а) М. Федароўскі;
б) П. Шэйн;
в) М. Доўнар-Запольскі;
г) Я. Карскі;
д) А. Сержпутоўскі.

13. Найвышэйшым дасягненнем дарэвалюцыйнага беларусазнаўства лічыцца праца:
а) Е. Раманава “Беларускі зборнік”;
б) Я. Карскага “Беларусы”;
в) М. Федароўскага “Люд беларускі”;
г) І. Сербава “Беларусы-сакуны”;
д) А. Рыпінскага “Беларусы”.

14. У 1920-х гг. значную ролю ў развіцці этнаграфічнага вывучэння Беларусі адыграў часопіс:
а) “Беларускі этнограф”;
б) “Этнаграфічны агляд”;
в) “Весці АН БССР. Серыя этнаграфіі”;
г) “Наш край”;
д) “Савецкая краіна”.

15. Сярод беларускіх дарэвалюцыйных этнографаў, працягнуўшых сваю працу ў савецкі час, найбольш плённай была навуковая дзейнасць:
а) М. Янчука;
б) А. Сержпутоўскага;
в) А. Шлюбскага;
г) У. Дабравольскага;
д) А. Багдановіча.

16. У другой палове XX ст. акадэмічным цэнтрам беларускай этнаграфіі становіцца:
а) Інстытут этналогіі і палявой этнаграфіі;
б) Акадэмія культурнай антрапалогіі і фальклору;
в) Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору;
г) Інстытут беларускай традыцыйнай культуры.

17. У 1950 – 1970-х гг. этнограф Л. Мінько з’яўляўся практычна адзіным даследчыкам:
а) міфалагічных уяўленняў беларусаў;
б) беларускай народнай медыцыны і знахарства;
в) каляндарнай абрадавасці беларусаў;
г) сямейнай абрадавасці беларусаў.

18. Сярод сучасных беларускіх этнографаў метадалагічныя прынцыпы семіялогіі ў сваіх даследаваннях выкарыстоўвае:
а) Т. Валодзіна;
б) П. Церашковіч;
в) М. Піліпенка;
г) А. Лакотка;
д) І. Назіна.

## Лагічныя задачы і праблемныя пытанні

1. Чым адрозніваюцца пісьмовыя этнаграфічныя крыніцы часоў Сярэднявечча і Рэнесансу?

2. Пазначце агульныя заканамернасці і асаблівасці фіксацыі этнаграфічных звестак на Беларусі ў IX – XVIII стст.

3. У чым праявіўся ўплыў ідэй Рамантызму на развіццё этнаграфічных ведаў?

4. Ахарактарызуйце своеасаблівасць так званай “міфалагічнай школы” ў беларускай этнаграфіі XIX ст.

5. Вызначце месца і ролю РГТ у развіцці дарэвалюцыйнай беларускай этнаграфіі.

6. Ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай этнаграфіі другой паловы XIX – пачатку XX стст. у сувязі з грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіццём Беларусі.

7. Пазначце новыя накірункі даследаванняў у беларускай этнаграфіі другой паловыXIX – пачатку XX ст.

8. Ахарактарызуйце ролю беларускай этнаграфіі другой паловы XIX – пачатку XX стст. у станаўленні нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі.

9. Якія фактары паўплывалі на развіццё этнаграфіі ў БССР у 1920 – 1930-я гады?

10. Пазначце характар і змест этнаграфічных даследаванняў у Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг.

11. Ахарактарызуйце крызісныя з’явы і прыкметы стагнацыі ў беларускай савецкай этнаграфіі ў 1930 – 60-х гг.

12. Вылучыце асноўныя прыярытэты беларускай савецкай этнаграфіі ў 1960 – 80-х гг.

13. Ахарактарызуйце новыя накірункі даследаванняў у айчыннай этнаграфіі (этналогіі) канца XX – пачатку XXI ст.

## Тэматыка даследаванняў, рэфератаў і спавешчанняў

1. Сярэднявечныя помнікі пісьменства, як крыніцы па этнаграфіі Беларусі.

2. Паўночна-заходні аддзед РГТ: характар дзейнасці і навуковыя здабыткі.

3. Роля беларускіх этнографаў другой паловы XIX – пачатку XX стст. у станаўленні нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі.

4. Краязнаўства і этнаграфія ў БССР: вопыт і плён узаемадзеяння.

5. Традыцыі і навацыі ў сучаснай беларускай этнаграфіі (этналогіі).

## Тэма 3. Этнічная гісторыя Беларусі

### Этанаграфічны практыкум

1. Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі сяліліся ў басейнах:
а) Дняпра і Друці;
б) Нёмана і Віліі;
в) Прыпяці і Сажа;
г) Бярэзіны і Свіслачы;
д) Заходняй Дзвіны і Дзісны.

2. Рассяленне індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі звязана з плямёнамі культуры:
а) грабеньчата-ямкавай керамікі;
б) днепра-дзісненскай керамікі;
в) шнуравой керамікі;
г) свідэрскай керамікі;
д) пражскай керамікі.

3. Асіміляцыя балтаў прыйшлымі славянамі працягвалася:
а) з IX па XIII ст.;
б) з VIII па X ст.;
в) з VI па XI ст.;
г) з VII па XIV ст.

4. Этнакультурная спецыфіка крывічоў знайшла сваё адлюстраванне ў скроневых кольцах наступнай формы:
а) прамянёвай;
б) бранзалетападобнай;
в) пацеркападобнай;
г) лопасцевай.

5. Сацыяльна-эканамічныя і культурныя перадумовы для фармавання беларускага этнаса ў асноўным склаліся:
а) ў VIII – XIII стст.;
б) ў V – VII стст.;
в) ў IX – X стст.;
г) ў X – XII стст.;
д) ў VII – XI стст.

6. “Летапісная Літва” займала тэрыторыю:
а) міжрэчча Дзісны і Авуты;
б) верхняга Пабужжа;
в) верхняга Панёмання;
г) міжрэчча Нёмана і Прыпяці;
д) вярхоўяў Віліі і Бярэзіны.

7. Утварэнне і станаўленне ВКЛ спрыялі:
а) этнакультурнаму адасабленню беларусаў;
б) складванню і стабілізацыі этнічнай тэрыторыі беларусаў;
в) з’яўленню і распаўсюджванню этноніма “беларусы”;
г) знікненню рэгіянальнай (зямляцкай) самасвядомасці ў насельніцтва Беларусі.

8. У сярэдзіне XVI ст. на тэрыторыі Беларусі пражывала:
а) каля 2,5 млн чалавек;
б) каля 3,2 млн чалавек;
в) каля 4,6 млн чалавек;
г) каля 1,8 млн чалавек;
д) каля 0,9 млн чалавек.

9. Перыяд XV – XVI стст. быў адзначаны для насельніцтва Беларусі працэсам:
а) этнічнай кансалідацыі;
б) этнічнай стагнацыі;
в) асіміляцыі;
г) этнічнай міксацыі;
д) этнічнай сепарацыі.

10. У XVI ст. на тэрыторыі Беларусі суіснавалі наступныя рэлігіі і канфесіі (вылучыце неправільны адказ):
а) іслам;
б) праваслаўе;
в) каталіцызм;
г) уніяцтва;
д) кальвінізм;
е) юдаізм;
ё) стараабраднiцтва.

11. Адна з галоўных мэт рэфармацыйнага руху ў ВКЛ:
а) падрыў эканамічнай моцы каталіцкай царквы;
б) ліквідацыя ўплыву каталіцкага кліру на палітычнае жыццё;
в) змены ў хрысціянскай дагматыцы і абраднасці на карысць іх спрашчэння;
г) умацаванне дзяржаўна-культурнай ідэнтычнасці ВКЛ пасродкам адзінай рэлігіі;
д) Рэфармацыя ў ВКЛ (на Беларусі), з'яўляючыся часткай агульнаеўрапейскага працэсу, асобных мэт не мела.

12. Адна з вызначальных рысаў беларускай этнічнай супольнасці часоў Сярэдневечча – гэта:
а) канфармізм;
б) эсхаталагізм;
в) традыцыяналзім;
г) рэлігійны фундаменталізм;
д) ксенафобія;
е) пацыфізм.

13. Дэмаграфічны і этна-культурны крызіс на Беларусі ў XVII – XVIII стст. быў выкліканы:
а) сітуацыяй поліканфесійнасці;
б) Лівонская вайной і заключэннем Люблінскай уніі;
в) шляхецкай анархіяй і слабасцю каралеўскай улады;
г) вайной 1654 – 1667 гг. і паланізацыяй вышэйшага саслоўя;
д) узмацненнем феадальнай эксплуатацыі сялян і нізкай нараджальнасцю.

14. У канцы XVIII ст. беларусы з'яўляліся:
а) этнасам з няпоўнай сацыяльнай структурай;
б) раннебуржуазнай нацыяй;
в) канчаткова скансалідаванай феадальнай народнасцю;
г) этнанацыянальнай супольнасцю.

15. У канфесійнай структуры беларускага грамадства пераважнае месца ў канцы XVIII ст. займалі:
а) католікі;
б) уніяты;
в) пратэстанты;

г) праваслаўныя;
д) стыхійныя матэрыялісты.

16. У XVIII – XIX стст. пераважным носьбітам беларускай этнічнасці з’яўлялася:
а) магнатэрыя;
б) сялянства;
в) дробная (“шарачковая”) шляхта;
г) уніяцкае духавенства;
д) гараджане.

17. Дысбаланс у сацыяльнай структуры беларускага этнасу ў XIX ст. найбольш рэзка выявіўся:
а) ў адсутнасці бюеларускай шляхты;
б) ў інаэтнічным характары гарадскога насельніцтва;
в) ў вялікай долі рускіх чыноўнікаў і святароў;
г) ў адсутнасці беларускага войска і паліцыі.

18. Упершыню канцэпцыю развіцця беларускай нацыі распрацавала:
а) рэдакцыя газеты “Наша доля”;
б) рэдакцыя часопіса “Гоман”;
в) рэдакцыя газеты “Наша Ніва”;
д) рэдакцыя часопіса “Наш край”.

19. Першай беларускай палітычнай партыяй з’явілася:
а) Беларуская Сацыялістычная грамада;
б) Беларуская партыя незалежных сацыялістаў;
в) Партыя беларускіх эсэраў;
г) Беларуская незалежная партыя;
д) Беларуская народная партыя сацыялістаў.

20. Дзяржаўная незалежнасць Беларусі ў 1918 г. была абвешчана:
а) Пастановай Народнага Сакратарыята Беларусі;
б) Дэкрэтам Першага Усебеларускага з’езда;
в) Актам З’езда беларускіх нацыянальных арганізацый;
д) III Устаўной граматай БНР;
е) Дэкрэтам Рады БНР.

21. У часы “беларусізацыі” з эміграцыі ў БССР вярнуўся і актыўна далучыўся да культурнага будаўніцтва:
а) Уладзімір Дубоўка;
б) Аляксандр Чарвякоў;
в) Вацлаў Ластоўскі;
г) Язэп Варонка;
д) Зміцер Жылуновіч.

22. У канцы 1920-х гг. на тэрыторыі БССР у беларускіх школах навучалася дзяцей:
а) каля 65 %;
б) каля 75 %;
в) каля 55 %;
г) каля 80 %;
д) каля 90 %.

23. Найбольш значнае “узбуйненне” БССР адбылося ў:
а) 1921 г.;
б) 1924 г.;
в) 1926 г.;
г) 1932 г.;
д) 1939 г.

24. Рэальны дзяржаўны суверэнітэт Беларусь набыла:
а) ў 1917 г.;
б) ў 1918 г.;
в) ў 1919 г.;
г) ў 1921 г.;
д) ў 1991 г.;
е) ў 1994 г.

## Лагічныя задачы і праблемныя пытанні

1. Ахарактарызуйце працэс узаемадзеяння балцкага насельніцтва і прыйшлых славян на тэрыторыі Беларусі.
2. Дайце характарыстыку раннесярэднявечных племянных супольнасцяў на тэрыторыі Беларусі.
3. Пазначце асноўныя версіі паходжання этнонімаў “крывічы”, “радзімічы”, “дрыгавічы”.

4. Ахарактарызуйце язычніцкія традыцыі і спецыфіку хрысціянізацыі старажытнабеларускіх зямель.

5. Вызначце месца і ролю Полацкай зямлі ў дзяржаватворчых і этнакультурных працэсах на тэрыторыі Беларусі.

6. Дайце інтэрпрэтацыю (з аргументамі "за" і "супраць") канцэпцыі "старажытнарускай народнасці".

7. Вызначце месца і ролю ВКЛ у этнічнай гісторыі беларусаў.

8. Пазначце функцыянальную ролю беларускага этна-культурнага кампанента ў межах ВКЛ.

9. У чым выявіўся росквіт ("залаты век") старабеларускай культуры ў XV – XVI стст.?

10. Ахарактарызуйце этна-сацыяльную структуру насельніцтва Беларусі ў XV – XVI стст.

11. Патлумачце ў чым выяўлялася шматузроўневасць самасвядомасці насельніцтва Беларусі ў XV – XVI стст.

12. Ахарактарызуйце ролю канфесійных фактараў у этнічнай гісторыі беларусаў XIV – XVI стст.

13. У чым выяўляўся традыцыяналізм беларускай этнічнай супольнасці ў Сярэднявеччы?

14. Патлумачце прычыны этнічнага крызісу XVII – XVIII стст. на Беларусі.

15. Прааналізуйце вынікі далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ў кантэксце сацыяльна-эканамічнага і этна-культурнага развіцця беларусаў.

16. Пералічыце і патлумачце прычыны, якія замаруджвалі этнічную (нацыянальную) кансалідацыю беларусаў у XIX ст.

17. Ахарактарызуйце спецыфічныя рысы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

18. Ахарактарызуйце этна-сацыяльны склад насельніцтва Беларусі паводле перапісу 1897 г.

19. Прааналізуйце дзяржаватворчыя працэсы на Беларусі ў першай палове XX ст.

20. Пазначце асноўныя задачы і вынікі палітыкі "беларусізацыі".

21. Вызначце і ахарактарызуйце асноўныя праявы этнічнага крызісу 1930 – пачатку 1980-х гг.на Беларусі.

22. Ахарактарызуйце асноўныя этапы і заканамернасці фарміравання беларускай дыяспары.

23. Прааналізуйце праблемы і перспектывы развіцця беларускай нацыі на сучасным этапе.

## Тэматыка даследаванняў, рэфератаў і спавешчанняў

1. Роля балтаў у этнагенэзе беларусаў.
2. Беларуская мова ў ВКЛ: этна-культурная і дзяржаўна-палітычная функцыя.
3. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у другой палове XIX – пачатку XX ст.
4. Беларуская дыяспара.
5. Беларускае нацыянальнае Адраджэнне 1980 – 1990-х гг.

## Этнаграфічныя катэгорыі і паняцці, рэкамендаваныя да засваення

Адаптацыя, акультурацыя, асіміляцыя, генацыд, гістарычная памяць народа, дыскрымінацыя, дэмаграфія, дээтнізацыя, дыяспара, ідэнтыфікацыя этнічная, міграцыя, народнасць, нацыя, нацыяналізм, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальны гонар, нацыянальны нігілізм, палітонім, самаідэнтыфікацыя этнічная, сацыяльная структура этнасу, сімволіка нацыянальная, сімволіка этнічная, талерантнасць нацыянальная, фрустрацыя этнічная, эміграцыя, этнас, этнікас, этнічная група, этнічная самасвядомасць, этнічная тэрыторыя, этнічны характар, этнонім.

# Тэма 4. Традыцыйная матэрыяльная культура і сацыяльная арганізацыя беларусаў

## Этнаграфічны практыкум

1. Агульнае распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі земляробства атрымлівае:
а) ў неаліце;
б) ў верхнім палеаліце;
в) ў бронзавым веку4
г) ў мезаліце;
д) ў жалезным веку.

2. Для апрацоўкі завалуненых дзярнова-падзолістых глеб найбольш адпавядала:
а) палеская саха;
б) саха-камяніца;
в) полацкая саха;
г) віцебская саха.

3. У традыцыйнай структуры беларускай жывёлагадоўлі прыярытэт належаў гадоўлі:
а) коней;
б) буйной рагатай жывёлы;
в) свінняў;
г) авечак і коз;
д) хатняй птушкі.

4. Для палявання на вадаплавуючую птушку беларусы выкарыстоўвалі:
а) выжлаў;
б) хартоў;
в) лаек;
г) кундалёў;
д) таксаў.

5. Вядучай галінай гаспадарчай дзейнасці чалавека на тэрыторыі Беларусі рыбалоўства было ў эпоху:
а) бронзавага веку;
б) верхняга палеаліту;
в) мезаліту;
г) жалезнага веку;
д) неаліту.

6. Выключыце са спісу прыстасаванне, якое не з’яўляецца рыбалавецкім:
а) буч;
б) венцер;
в) адонак;
г) мярэжа;
д) таптуха;
е) кломля.

7. У першапачатковым сэнсе слова “сябры” азначала:
а) людзей, што разам набывалі і прадавалі коней;
б) загоншчыкаў звяроў на паляванні;
в) рыбакоў, што супольна лавілі рыбу;
г) пчаляроў, якія мелі агульных пчолаў.

8. Беларускія пчаляры XIX ст. пераважна выкарыстоўвалі:
а) натуральныя (прыродныя) борці;
б) калодныя вуллі;
в) рамовыя вуллі;
г) штучнаробленыя борці.

9. Традыцыйнае лесахімічнае прадпрыемства на Беларусі мела назву:
а) дзягцярня;
б) вуглярня;
в) тартак;
г) рымарня;
д) буда.

10. Росквіт вясковага кавальства на Беларусі прыпадае на:
а) XVIII ст.;
б) XIX ст.;
в) XVII ст.;
г) XX ст.;
д) XVI ст.

11. Найбольшая канцэнтрацыя ганчарскіх паселішчаў у XIX – пачатку XX ст. прыходзіла на ваколіцы:
а) Пастаў;
б) Камарына;
в) Клецка;
г) Пружан;
д) Лепеля.

12. Да катэгорыі традыцыйнага керамічнага посуду не належыць:
а) латка;
б) бабачнік;
в) кавеня;

г) рынка;
д) спарыш;
е) слой.

13. У XVI – XVII стст. на Беларусі дрэваапрацоўчых прафесій было вядома:
а) каля 20;
б) каля 30;
в) каля 40;
г) каля 50;
д) 15;
е) 35.

14. Беларускія сталяры, як правіла, не выраблялі:
а) мэблю;
б) сельскагаспадарчыя прылады;
в) дахавыя матэрыялы;
г) абсталяванне жылля;
д) драўляны посуд.

15. Да традыцыйных хадавых суднаў адносіцца:
а) струг;
б) шугалея;
в) барка;
г) люз.

16. Найбольшай мерай ёмістасці з’яўляецца:
а) асміна;
б) карэц;
в) бочка;
г) шаснастка;
д) гарнец вялікі.

17. Сярод асноўных тыпаў традыцыйнага беларускага касцюма адсутнічаў:
а) драпіраваны;
б) нашыўны;
в) накладны;
г) расхінны.

18. Да замужжа дзяўчаты не мелі права насіць:
а) скіндачку;
б) вянок;
в) намітку;
г) шлячок.

19. “Кунтуш”, як элемент касцюма, быў уласцівы:
а) заможнаму селяніну;
б) уніяцкаму святару;
в) гарадскому рамесніку;
г) дробнаму шляхцічу;
д) удаўцу, безадносна сацыяльнай прыналежнасці.

20. Які тып сельскага паселішча практычна цалкам быў знішчаны падчас калектывізацыі 1930 – 1950-х гг.?
а) слабада;
б) мястэчка;
в) хутар;
г) засценак;
д) фальварак;
е) пагост.

21. Які тып планіроўкі не ўласцівы беларускім мястэчкам?
а) ампірны;
б) раманскі;
в) гатычны;
г) барочны;
д) рэнесансны.

22. Для захавання гародніны ў сялянскай сядзібе выкарыстоўвалася:
а) абора;
б) істопка;
в) паветка;
г) клуня;
д) асець;
е) адрына.

23. Адметнасцю народнага дойлідства Палесся з’яўляецца выкарыстанне:
а) дыляў;
б) штандараў;
в) падрубаў;
г) дранкі;
д) ліштваў;
е) масніц.

24. Найбольш сакралізаваны від ежы ў традыцыйнай беларускай культуры – гэта:
а) бліны;
б) каша;
в) мёд;
г) хлеб;
д) яешня;
е) сыр.

25. Сярод гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі адсутнічае:
а) Паўночная Беларусь;
б) Цэнтральная Беларусь;
в) Панёманне;
г) Падняпроўе;
д) Падзвінне;
е) Заходняе Палессе;
ё) Усходняе Палессе.

26. Вышэйшую ўладу ў межах вясковай грамады ажыццяўляў:
а) маршалак;
б) аканом;
в) цівун;
г) старац;
д) стараста;
е) солтыс.

27. Народны звычай калектыўнай узаемадапамогі ў беларусаў – гэта:
а) бонда;
б) сябрына;
в) пагалоўшчына;

г) палюддзе;
д) талака;
е) куліга;

28. Пры вызначэнні асноўных тыпаў сям'і не ўлічваецца:
а) агульны колькасны склад;
б) сацыяльна-маёмаснае становішча;
в) колькасць шлюбных пар і пакаленняў;
г) дзетнасць;
д) прамое і бакавое сваяцтва.

## Лагічныя задачы і праблемныя пытанні

1. Ахарактарызуйце характэрныя рысы традыцыйнай культуры (грамадства).
2. Якім чынам пераход да земляробства паўплываў на культуру нашых продкаў?
3. Пазначце рэгіянальныя асаблівасці традыцыйнай беларускай жыўёлагадоўлі.
4. Патлумачце сутнасць магічных дзеянняў распаўсюджаных у традыцыйнай беларускай жывёлагадоўлі.
5. Ахарактарызуйце месца і ролю паляўніцтва ў жыцці і гаспадарцы беларусаў.
6. Вылучыце асноўныя катэгорыі традыцыйных рыбалавецкіх прылад беларусаў паводле іх функцыянальных і канструктыўных асаблівасцяў.
7. Параўноўваючы традыцыйныя промыслы, паспрабуйце вызначыць які (якія) з іх не згубіў свайго утылітарнага значэння і сёння.
8. Ахарактарызуйце ўнутрыэканамічнае і экспартнае значэнне беларускіх лесахімічных промыслаў у Сярэднявеччы.
9. Акрэсліце асноўныя прычыны заняпаду пчалярства ў сучаснай Беларусі.
10. Ахарактарызуйце асноўныя групы вырабаў у беларускім народным кавальстве.
11. Вызначце асноўныя катэгорыі традыцыйных ганчарных вырабаў.
12. Дайце характарыстыку прафесійнай спецыялізацыі сталяроў, стальмахоў, бондараў, цесляроў.

13. Ахарактарызуйце сімвалічныя функцыі беларускага традыцыйнага адзення.

14. Пазначце асноўныя структурныя элементы традыцыйнага жаночага строю (касцюму) на Беларусі.

15. Ахарактарызуйце асноўныя тыпы традыцыйных паселішчаў на Беларусі.

16. Вылучыце эпахальныя і рэгіянальныя тыпы местачковай планіроўкі на Беларусі.

17. Якія традыцыйныя тыпы паселішчаў практычна не сустракаюцца ў сучаснай Беларусі? Патлумачце чаму.

18. Ахарактарызуйце тыпалогію і структуру традыцыйных вясковых сядзіб Беларусі.

19. Пазначце рэгіянальныя асаблівасці народнага дойлідства Беларусі.

20. У чым заключаецца міфалагічны сімвалізм хаты і яе структурных элементаў?

21. Вызначце тыпалогію беларускіх народных страў (прадуктаў харчавання).

22. Ахарактарызуйце структуру кіравання вясковай грамады.

23. Дайце характарыстыку кааператыўна-дабрачынным функцыям вясковай грамады.

24. Ахарактарызуйце спецыфіку маральна-этычных і міжпакаленных узаемаадносін у межах вясковай супольнасці.

25. Вылучыце асноўныя прынцыпы функцыянавання вясковай грамады.

26. Ахарактарызуйце традыцыйныя тыпы сям'і ў беларусаў.

27. Пазначце асноўныя прынцыпы беларускай народнай педагогікі.

## Тэматыка даследаванняў, рэфератаў і спавешчанняў

1. Беларускае Падзвінне як асобны гістарычна-этнаграфічны рэгіён Беларусі.

2. Рацыянальнае і сімвалічнае (магічнае) у сістэме традыцыйнага земляробства беларусаў.

3. Рытуальныя аспекты беларускіх традыцыйных промыслаў.

4. Рэгіянальныя асаблівасці традыцыйнага адзення беларусаў Падзвіння.

5. Беларуская народная кухня (кулінарыя): традыцыі і інавацыі.

6. Беларуская народная педагогіка.

## Этнаграфічныя тэрміны і катэгорыі, рэкамендаваныя да засваення

Арнамент, бонда, бондарства, бортніцтва, ганчарства, гарбарства, гаспадарча-культурны тып, гістарычна-этнаграфічны рэгіён, грабарства, грамада (абшчына), дзядзькаванне, дойлідства народнае, жывёлагадоўля, збіральніцтва, земляробства, кавальства, кравецтва, кушнерства, матэрыяльная культура, паляванне, побыт, пчалярства, род, рыбалоўства, сябрына, сядзіба, сяліба, традыцыйная культура.

## Тэма 5. Традыцыйная духоўная культура беларусаў

### Этнаграфічны практыкум

1. Прынцыпова важнае месца ў сістэме традыцыйнай духоўнай культуры займаюць:
а) легенды і паданні;
б) агратэхнічныя веды;
в) міфы;
г) рытуалы;
д) ахвярапрынашэнні;
е) песенныя жанры фальклору.

2. Паводле беларускіх народных уяўленняў, невысокія разумовыя здольнасці дзіцяці маглі быць вынікам таго, што яго маці падчас цяжарнасці:
а) не хадзіла на царкоўныя службы;
б) чытала падчас прыёму ежы;
в) не ўдзейнічала ў каляндарных абрадах;
г) падстрыгала ўласныя валасы;
д) спаліла кнігу.

3. Вылучыце сцвярджэнне, якое не адпавядае народнай традыцыі:
а) дзіця, што нарадзілася ў панядзелак, будзе ўдалым майстрам у сваёй справе;
б) у аўторак – працавітым і ўдачлівым;
в) у чацвер – кемлівым і руплівым;
г) у нядзелю – шчаслівым.

4. “Збожнымі кумамі” называлі:
а) заможных гаспадароў (мелі шмат збожжа);
б) рэлігійныя, набожныя людзі;
в) сваякі па лініі бацькі;
г) абсалютна выпадковыя людзі;
д) сваякі па лініі маці.

5. Сімвалічнае далучэнне навароджанага да чалавечай супольнасці (сферы культуры) адбывалася:
а) адразу пасля нараджэння;
б) падчас першага купання;
в) пасля першага прамоўленага слова;
г) падчас атрымання імя;
д) як прарэжацца першы зуб.

6. Канчатковая згода на шлюб з боку партый жаніха і нявесты дасягалася падчас:
а) сборнай суботы;
б) сватання;
в) аглзедзінаў;
г) запоінаў;
д) даведак;
е) заручынаў.

7. Уласна вясельнае дзейства пачыналася:
а) з абрадавага ачышчэння маладых у лазні;
б) з выпячкі вясельнага караваю;
в) з вянчання ў храме;
г) з прыезда маладога да маладой;
д) з пасаджэння маладых на “пасад”.

8. Абрад, падчас якога маладую ўводзілі ў жаночы стан, меў назву:
а) “камора (“пакладзіны”);
б) “завіванне”;
в) “пасад”;
г) “выпрабаванне”;
д) “пярэзвы”.

9. У народзе верылі, што каб палегчыць пакуты паміраючага чараўніка, трэба:
а) перахрысціць яго і прачытаць малітву;
б) абкурыць хату купальскімі зёлкамі;
в) адчыніць “душнік” у столі;
г) адчыніць вароты сядзібы;
д) запрасіць знахара.

10. Адным са святаў, якое маркіруе сонечнае раўнадзенства ў беларускім народным календары, з’яўляецца:
а) Узвіжанне;
б) Стрэчанне;
в) Купалле:
г) Сёмуха;
д) Масленіца.

11. У беларускай народнай традыцыі прысвятак святога Анціпы асабліва шанавалі:
а) рыбакі і паляўнічыя;
б) пастухі;
в) пчаляры;
г) хворыя на зубы;
д) хворыя на вочы;
е) людзі з такім жа імем.

12. Свята Дабравешчання ў народных уяўленняў асацыявалася:
а) з провадамі зімы;
б) з першым выганам жывёлы ў поле;
в) з вяснавым абуджэннем зямлі;
г) з пачаткам маладзёжных ігрышчаў;
д) з прылётам жаваронкаў з “выраю”.

13. Найбольш насычанай буйнымі каляндарнымі святамі з’яўляецца пара:
а) зімы;
б) вясны;
в) лета;
г) восені.

14. У беларускім традыцыйным фальклоры адсутнічае такі жанр, як:
а) балада;
б) былічка;
в) бывальшчына;
г) быліна;
д) байка.

15. Адным з жанраў пазаабрадавага фальклору з’яўляюцца песні:
а) рэкруцкія;
б) талочныя;
в) радзінныя;
г) юраўскія;
д) пятроўскія;
е) мікольскія.

16. Традыцыйныя музычныя інструменты беларусаў падзяляюцца на наступныя катэгорыі (вылучыць няправільны адказ):
а) самагучальныя;
б) найгрышныя;
в) мембранныя;
г) духавыя;
д) струнныя.

17. Беларускія народныя танцы вылучыліся з Карагодаў у асобны харэаграфічны жанр:
а) у эпоху жалезнага веку;
б) у XVI – XVII стст.;
в) у XI – XII стст.;
г) у VIII – IX стст.;
д) у XIII – XV стст.

18. Танец “Полька” прыйшоў на Беларусь:
а) з Чэхіі;
б) з Валахіі;
в) з Польшчы;
г) з Трансільваніі;
д) з Венгрыі.

19. Да традыцыйных абрадавых гульняў не належыць:
а) “Яшчар”;
б) “Бахар”;
в) “Клён”;
г) “Лука”;
д) “Дрэма”.

20. Рытуал адрозніваецца ад народнага тэатра адсутнасцю:
а) машкоўнікаў;
б) гледачоў;
в) музыкаў і танцораў;
г) жартоўных песень.

21. Найбольш распаўсюджанымі і шанаванымі прыроднымі аб’ектамі на Беларусі былі (вылучыць няправільны адказ):
а) крыніцы;
б) азёры;
в) камяні;
г) крушні;
д) дубравы;
е) узвышшы.

22. Да духаў-апекуноў культурнага ландшафту не мае дачынення:
а) Гуменнік;
б) Жыцень;
в) Жыжаль;
г) Еўнік;
д) Раёк;
е) Хут.

23. Сузор’е, якое займае цэнтральнае месца на начным небе, у беларускай народнай астраноміі мае назву:
а) Карэц;
б) Матавіла;
в) Валасажар;
г) Рэшата;
д) Сітка.

24. Час знаходжання месяца “ў маладзіку”, паводле народных уяўленняў, быў спрыяльным для:
а) лячэння хваробаў;
б) ачысткі палеткаў ад пустазелля;
в) усталявання пчаліных вулляў;
г) сяўбы азімых і яравых;
д) куплі жывёлы.

25. У 1766 г. Сейм Рэчы Паспалітай узаконіў у якасці асноўнай меры даўжыні ў дзяржаве:
а) Віленскі локаць;
б) Сеймавы локаць;
в) Літоўскі локаць;
г) Варшаўскі локаць;
д) Полацкі локаць.

26. На думку беларусаў найбольш пашыранай і небяспечнай з’яўлялася наступная хвароба:
а) рожа;
б) звіх;
в) вогнік;
г) падвей;
д) валасень;
е) сурокі.

## Лагічныя задачы і праблемныя пытанні

1. Ахарактарызуйце спецыфіку міфапаэтычнага (традыцыйнага) светапогляду.
2. Пазначце асноўныя функцыі рытуала ў традыцыйным грамадстве.
3. Прааналізуйце сімвалічную сутнасць прадпісанняў для паводзінаў цяжарнай жанчыны, якія існавалі ў беларускім традыцыйным грамадстве.
4. Ахарактарызуйце рытуальныя функцыі кумоў і бабкі-павітухі ў межах радзіннага абраду.
5. Вызначце структуру і ахарактарызуйце падрыхтоўчы этап беларускага традыцыйнага вяселля.

6. Пазначце сімвалічныя функцыі каравая і хлебнай дзяжы ў межах вясельнага рытуала.

7. Ахарактарызуйце асноўныя тыпы беларускага традыцыйнага вяселля.

8. Дайце характарыстыку асноўных этапаў пахавальнай абрадавасці беларусаў.

9. Вылучыце і ахарактарызуйце базавую структуру беларускага народнага каляндара.

10. У чым заключаецца феномен свята ў беларускай традыцыйнай культуры?

11. Пазначце асноўныя рытуальныя дзеянні падчас святкавання Калядаў.

12. Ахарактарызуйце сімволіку асноўных этапаў Купальскага рытуала.

13. Ахарактарызуйце жанравую разнастайнасць беларускага абрадавага фальклору.

14. Пазначце і ахарактарызуйце асноўныя жанры беларускага празаічнага фальклору.

15. Вылучыце спецыфічныя рысы традыцыйнага інструментальнага мастацтва беларусаў.

16. У структуры беларускай народнай харэаграфіі вылучыце аўтэнтычныя і запазычаныя элементы і ахарактарызуйце адрозненні паміж імі.

17. Акрэсліце асноўныя адрозненні паміж рытуалам і гульнёй, як двума асобнымі відамі сімвалічных паводзін чалавека.

18. Пазначце самабытныя рысы беларускага народнага тэатру.

19. Вылучыце і патлумачце функцыянальнасць утылітарнага і сімвалічнага ў беларускай народнай астраноміі і касмалогіі.

20. Ахарактарызуйце спецыфіку беларускай народнай медыцыны.

21. У чым заключаецца сутнасць рэлігійнага ўшанавання прыродных стыхій і аб’ектаў у традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў?

22. Пазначце функцыянальна-сімвалічную сутнасць “прыродных” і “культурных” міфалагічных персанажаў на прыкладзе “Лесавіка” і “Хатніка”.

23. Ахарактарызуйце месца і ролю “чараўнікоў” і “знахароў” у межах вясковай грамады.

24. Дайце характарыстыку беларускай міфапаэтычнай мадэлі свету.

25. Пералічыце асноўныя адзінкі народных лінейных мер; укажыце, якім чынам яны вызначаліся.

## Тэматыка даследаванняў, рэфератаў і спавешчанняў

1. Каляндарная абрадавасць беларускага Падзвіння.
2. Сямейная абрадавасць беларусаў Падзвіння.
3. “Чарадзейства” і “знахарства” паводле этнаграфічных прац М. Ніціфароўскага.
4. Беларуская народная медыцына: сінтэз магічнага і рацыянальнага.

## Этнаграфічныя катэгорыі і паняцці, рэкамендаваныя для засваення

Абыдзённік, абярэг, анімізм, ахвярапрынашэнне, варажба, вяселле, духоўная культура, знахарства, культ продкаў, магія, менталітэт этнічны, міф, міфалагічная свядомасць, міфалогія, пахаванне, рытуал (абрад), свята, сімвал, татэмізм, традыцыйная культура, фальклор, фетышызм, чарадзейства, шлюб.

# Тэма 6. Нацыянальныя меншасці і міжэтнічныя адносіны на Беларусі

## Этнаграфічны практыкум

Выбярыце адзіна магчыма варыянт адказу.

1. Да нацыянальных меншасцяў Беларусі не належаць:
а) рускія;
б) літоўцы;
в) габрэі;
г) цыгыны;
д) украінцы.

2. Паводле перапісу 1999 г. колькасць нацыянальнасцяў, прадстаўнікі якіх пражываюць на Беларусі, дасягае:

| | |
|---|---|
| а) 80; | г) 120; |
| б) 130; | д) 100; |
| в) 90; | е) 110. |

3. Адна з першых буных габрэйскіх абшчын на Беларусі склалася:
а) ў Полацку;
б) ў Гародні;
в) ў Менску;
г) ў Магілёве;
д) ў Пінску;
е) ў Віцебску.

4. Выгнанне габрэяў з тэрыторыі ВКЛ у канцы XV ст. было выклікана:
а) іх радыкальным культурна-рэлігійным непадабенствам з мясцовым насельніцтвам;
б) палітычнымі інтрыгамі пры двары Вялікага князя;
в) іх шпіянажам на карысць варожых дзяржаў;
г) жаданнем уладаў рэквізаваць іх маёмасць;
д) вывазам імі буйных грашовых сум за межы ВКЛ.

5. Габрэі паводле заканадаўства ВКЛ мелі права (вылучыць няправільны адказ):
а) займацца гандлёвымі і фінансавымі аперацыямі;
б) арандаваць прыбытковыя “месты” (корчмы, перавозы і г.д.);
в) валодаць зямельнай маёмасцю і прыгоннымі сялянамі;
г) вольна прытрымлівацца свайго веравызнання.

6. Вышэйшы орган самакіравання габрэяў ВКЛ у XVII – XVIII стст.:
а) Віленскі кагал;
б) Літоўская габрэйская рада;
в) Сойм габрэяў ВКЛ;
г) Літоўскі ваад;
д) Вялікалітоўская ежыва.

7. Адным з пачынальнікаў новай габрэйскай літаратуры з’яўляецца ўраджэнец Беларусі:
а) М. Мойхер-Сфорым;
б) С. Майман;
в) А. Гаркаві;
г) Г. Іцкавіч;
д) З. Азгур.

8. Першыя значныя групы татараў на Беларусі з'яўляюцца:
а) ў XVст.;
б) ў XII ст.;
в) ў XIVст.;
г) ў XIII ст.;
д) ў XVI ст.

9. Падзея (дата), якая традыцыйна лічыцца пачаткам пасялення татараў на Беларусі:
а) Кулікоўская бітва (1380 г.);
б) сумесны паход Вітаўта і Тахтамыша на Азоў (1397 г.);
в) сумесны ўдзел беларусаў і татараў у Грунвальдскай бітве (1410 г.);
г) паражэнне Вітаўта і Тахтамыша на р. Ворскла (1399 г.);
д) разгром крымскіх татар пад Клецкам (1506 г.).

10. На працягу XV – XVII стст. татары Беларусі (вылучыць няправільнае сцвярджэнне):
а) страцілі родную мову і перайшлі на мову карэннага насельніцтва;
б) захавалі ісламскае веравызнанне;
в) страцілі этнічную самасвядомасць;
г) стваралі багатую літаратуру;
д) прынеслі мясцоваму намельніцтву высокую культуру агародніцтва.

11. У наш час культурнае жыццё татараў Беларусі арганізуе і каардынуе таварыства:
а) "Хамаіл;
б) "Тэфсір";
в) "Джэлал-ад-Дзін";
г) "Чамбул";
д) "Аль-Кітаб".

12. Першая буйная плыня цыганоў з'явілася на Беларусі:
а) ў XIVст., перабраўшыся з Малдавы;
б) ў XIII ст., прыйшоўшы з тэрыторыі Румыніі;
в) ў XVст., прывандраваўшы з Польшчы і Германіі;
г) ў XVI ст., прыйшоўшы з Венгрыі і Чэхіі.

13. Буйнейшым асяродкам аселых цыганоў Беларусі ў XVIII ст. з’яўляўся:
а) Клецк;
б) Мір;
в) Слуцк;
г) Свержань;
д) Навагрудак;
е) Нясвіж.

14. Першая значная група рускіх перасяленцаў, якая здолела захаваць сваю этнакультурную самабытнасць, з’явілася на Беларусі:
а) ў канцы XIII – першай палове XIV ст.;
б) ў другой палове XIV – XV ст.;
в) ў другой палове XVI – пачатку XVII ст.;
д) ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.

15. У канцы XIX ст. на Беларусі найбольшую долю рускія складалі сярод:
а) купецтва;
б) праваслаўнага духавенства;
в) чынавенства;
г) дваранства.

16. Сярод палітычных і культурных дзеячоў ВКЛ этнічным палякам з’яўляўся:
а) М. Гусоўскі;
б) С. Будны;
в) Л. Сапега;
г) В. Цяпінскі;
д) Л. Зізані.

17. “Асаднікі” – гэта:
а) польскія кавалерыйскія часткі;
б) польскія рамеснікі, якія мелі ільготы ў гарадах Беларусі;
в) польскія каланісты на беларускіх землях;
г) уладальнікі земляў на мяжы Польшчы і Беларусі.

18. У якім рэгіёне Беларусі колькасць этнічных украінцаў у XIX – пачатку XX ст. была найбольшай:
а) Усходняе Палессе;
б) Панямонне;
в) Падняпроўе;
г) Заходняе Палессе.

19. Найбольшы культурны уплыў з боку беларусаў адчувала на сябе наступная этнаграфічная група літоўцаў:
а) дзукі;
б) селы;
в) земгалы;
г) жамайты;
д) дайнава.

## Лагічныя задачы і праблемныя пытанні

1. Ці з’яўляюцца тоеснымі катэгорыі “этнічная” і “нацыянальная меншасць”? Патлумачце адказ.
2. Патлумачце, чаму нацыянальныя (этнічныя) меншасці з’яўляюцца адным з прадметаў даследавання этнаграфіі Беларусі.
3. Ахарактарызуйце адносіны дзяржаўнай улады да габрэйскага насельніцтва ў сярэднявечнай Беларусі.
4. Дайце характарыстыку габрэйскаму абшчыннаму самакіраванню на тэрыторыі Беларусі.
5. Патлумачце, чым выклікана супярэчлівае стаўленне беларусаў да габрэяў у Сярэднявеччы.
6. Дайце характарыстыку культурных набыткаў габрэяў Беларусі.
7. Патлумачце прычыны з’яўлення татараў-пасяленцаў на Беларусі.
8. Ахарактарызуйце асноўныя групы татарскага насельніцтва ВКЛ паводле іх сацыяльна-эканамічнага становішча.
9. Прааналізуйце характар этна-культурнага ўзаемадзеяння беларусаў і татараў.
10. Ахарактарызуйце нацыянальна-культурнае жыццё татараў Беларусі ў XX ст.
11. Дайце характарыстыку сацыякультурных асаблівасцяў рускіх старавераў на Беларусі.

12. Чым было выклікана перасцярожлівае стаўленне беларусаў да рускіх старавераў у XIX – пачатку XX ст.

13. Якімі прычынамі быў выкліканы імклівы рост рускага насельніцтва на Беларусі ў апошняй трэці XIX ст.?

14. Ахарактарызуйце гісторыю фармавання і этна-культурныя асаблівасці польскай нацынальнай меншасці на Беларусі.

15. У чым заключаецца спецыфіка фармавання ўкраінскай нацыянальнай меншасці на Беларусі?

16. Ахарактарызуйце этнічныя стэрэатыпы беларусаў адносна літоўцаў і латышоў.

## Тэматыка даследаванняў, рэфератаў і спавешчанняў

1. “Іншаземец” вачыма беларускага селяніна (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – XX стст.).
2. Этнічныя меншасці на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.
3. Прававое становішча этнічных меншасцяў у Сярэднявечнай Беларусі (паводле III Статута ВКЛ).

## Этнаграфічныя катэгорыі і паняцці, рэкамендаваныя да засваення

Акультурацыя этнічная; асіміляцыя, білінгвізм, дыскрымінацыя, дээтнізацыя, іміграцыя, інкультурацыя, інтэграцыя міжэтнічная, кампліментарнасць, ксенафобія, нацыяналізм, расізм, стэрэатып этнічны, талерантнасць нацыянальная, эміграцыя, этнічная меншасць.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Этнаграфія Беларусі ў сістэме айчыннай гуманітарыстыкі: аб'ект, прадмет і задачы даследавання.
2. Крыніцы этнаграфіі Беларусі.
3. Палявыя этнаграфічныя даследаванні: формы і метады.
4. Паняцце аб этнасе: кампаненты этнічнай сістэмы.
5. Этнаграфічныя веды пра Беларусь у X – XVIII стст.
6. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.
7. Беларуская этнаграфія ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
8. Развіццё этнаграфіі Беларусі ў 1920 – 30-х гг.
9. Беларуская савецкая этнаграфія ў 1950-х – сярэдзіне 1980-х гг.
10. Айчынная этналогія на сучасным этапе.
11. Этнічныя супольнасці на тэрыторыі Беларусі ў раннім Сярэднявеччы.
12. Канцэпцыі паходжання беларусаў і этноніма "беларусы".
13. Беларускія землі ў складзе ВКЛ: этнакультурны аспект.
14. Рэлігійны фактар у этнічнай гісторыі беларусаў эпохі Сярэднявечча.
15. Этнасацыяльны і культурны крызіс на Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.
16. Этнакультурныя працэсы на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.
17. Спецыфіка фармавання беларускай нацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
18. Беларускае нацыянальнае адраджэнне канцы XIX – пачатку XX ст.: тыпалагічная характарыстыка.
19. Беларуская дзяржава і нацыя ў першай чвэрці XX ст.
20. Нацыянальны крызіс 1930-х – сярэдзіны 1980-х гг.
21. Беларуская нацыя на сучасным этапе: праблемы і перспектывы развіцця.
22. Беларуская дыяспара: гісторыя і асаблівасці фармавання.

23. Традыцыйная культура (супольнасць): спецыфіка функцыянавання.

24. Земляробства і жывёлагадоўля на Беларусі: гісторыя развіцця і рэгіянальныя асаблівасці.

25. Беларускія традыцыйныя промыслы: збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства.

26. Пчалярства і лесахімічныя памествы: кавальства, ганчарства, ткацтва.

27. Беларускія традыцыйныя рамёствы: кавальства, ганчарства, ткацтва.

28. Традыцыйныя дрэваапрацоўчыя промыслы на Беларусі.

29. Традыцыйныя тыпы паселішчаў на Беларусі.

30. Беларускае народнае дойлідства: тэхналагічны і рытуальна-сімвалічны аспект.

31. Беларускае традыцыйнае адзенне.

32. Гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны (вобласці) Беларусі: Падзвінне і Падняпроўе.

33. Гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны (вобласці) Беларусі: Панямонне і Цэнтральная Беларусь.

34. Гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны (вобласці) Беларусі: Заходняе і Ўсходняе Палессе.

35. Беларуская традыцыйная кухня: тыпалагічная характарыстыка.

36. Вясковая грамада на Беларусі: структура кіравання і спецыфіка жыццядзейнасці.

37. Традыцыйныя тыпы сям'і на Беларусі

38. Беларуская народная педагогіка: каштоўнасці і метады выхавання.

39. Асаблівасці міфапаэтычнага светапогляду і роля рытуала ў традыцыйным беларускім грамадстве.

40. Традыцыйная радзінная абрадавасць беларусаў.

41. Беларускае традыцыйнае вяселле: структура і сімволіка рытуала.

42. Традыцыйная пахавальная абрадавасць беларусаў.

43. Базавая структура беларускага народнага календара; феномен свята ў традыцыйнай культуры.

44. Віды і жанры беларускага традыцыйнага фальклору.

45. Традыцыйнае інструментальнае мастацтва беларусаў.

46. Беларуская народная харэаграфія і тэатр.

47. Беларускія народныя веды: касмалогія і астраномія.

48. Беларускія народныя веды: медыцына і метралогія.

49. Традыцыйныя вераванні беларусаў: культы прыродных стыхій і аб'ектаў.

50. Беларуская міфалогія.

51. Чарадзейства і знахарства ў беларускім традыцыйным грамадстве.

52. Нацыянальныя (этнічныя) меншасці Беларусі (габрэі, татары, цыганы): гісторыя фарміравання і этнакультурная спецыфіка.

53. Нацыянальныя меншасці Беларусі (рускія, украінцы, палякі): гісторыя фарміравання і этнакультурная спецыфіка.

54. Нацыянальныя меншасці Беларусі (літоўцы, латышы): гісторыя фарміравання і этнакультурная спецыфіка.

55. Нацыянальныя меншасці ў сучаснай Беларусі: прававое і этнакультурнае становішча.

# ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ЗАДАННІ ДА ЗАЛІКУ

**Варыянт 1**

1. Аб’ектам этнаграфіі Беларусі з’яўляецца:
а) беларускі традыцыйны фальклор;
б) беларуская этнічная прастора;
в) этнічная культура беларусаў.
Эталон: А = 1.

2. Чым адрозніваюцца пісьмовыя этнаграфічныя крыніцы часоў ранняга Сярэднявечча і Рэнесансу?
3. Ахарактарызуйце працэс узаемадзеяння балцкага насельніцтва і прыйшлых славян на тэрыторыі Беларусі.
4. Пазначце рэгіянальныя асаблівасці традыцыйнай беларускай жывёлагадоўлі.
5. Вызначце структуру і ахарактарызуйце падрыхтоўчы этап беларускага вяселля.
6. Патлумачце, чаму нацыянальныя (этнічныя) меншасці з’яўляюцца адным з прадметаў даследавання этнаграфіі Беларусі.

**Варыянт 2**

1. Першыя напаўлегендарныя звесткі пра старажытнае насельніцтва Беларусі належаць:
а) Гіпакрату;
б) Гесіёду;
в) Герадоту;
г) Тацыту;
д) Страбону.
Эталон: А = 1.

2. У чым заключаецца падабенства і розніца паміж этнаграфіяй і этналогіяй?
3. Дайце характарыстыку раннесярэднявечных племянных супольнасцяў на тэрыторыі Беларусі.
4. Якім чынам пераход да земляробства паўплываў на культуру насельніцтва Беларусі?
5. Пазначце асноўныя функцыі рытуала ў традыцыйным беларускім грамадстве.
6. Ахарактарызуйце катэгорыі “этнічная” і “нацыянальная” меншасць.

**Варыянт 3**

1. Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі сяліліся ў басейнах:
а) Дняпра і Друці;
б) Нёмана і Віліі;
в) Прыпяці і Сажа;
г) Бярэзіны і Свіслачы;
д) Заходняй Дзвіны і Дзісны.

Эталон: А = 1.

2. У чым заключаецца сутнасць этнаграфічнага разумення культуры?

3. Пазначце агульныя заканамернасці і асаблівасці фіксацыі этнаграфічных звестак на Беларусі ў IX – XVIII стст.

4. Вылучыце асноўныя версіі паходжання этнонімаў "крывічы", "радзімічы", "дрыгавічы".

5. Ахарактарызуйце ролю паляўніцтва ў жыцці і гаспадарцы беларусаў у гістарычна-генетычным кантэксце.

6. Пазначце спецыфічныя рысы беларускай народнай медыцыны.

**Варыянт 4**

1. Выключце са спісу прыстасаванні, якія не з'яўляюцца рыбалавецкімі:
а) буч;
б) венцер;
в) адонак;
г) мярэжа;
д) таптуха;
е) кломля;
ё) кавеня.

Эталон: А = 2.

2. Чаму менавіта традыцыйная этнічная культура з'яўляецца галоўным прадметам этнаграфіі?

3. У чым праявіўся ўплыў ідэй Рамантызму на развіццё этнаграфічных ведаў?

4. Ахарактарызуйце спецыфіку хрысціянізацыі старажытнабеларускіх зямель.

5. Пазначце асноўныя рытуальныя дзеянні падчас святкавання Калядаў.

6. Дайце характарыстыку габрэйскаму абшчыннаму самакіраванню на тэрыторыі Беларусі.

**Варыянт 5**

1. Свята, якое маркіруе сонечнае раўнадзенства ў беларускім народным календары:
а) Сёмуха;
б) Стрэчанне;
в) Узвіжанне;
г) Саракі;
д) Масленіца;
е) Купалле.
Эталон: А = 2.

2. У чым заключаецца праблема "экалогіі этнаса"?

3. Ахарактарызуйце новыя накірункі даследаванняў у айчыннай этналогіі канца XX – пачатку XXI стст.

4. Вызначце месца і ролю Полацкай зямлі ў дзяржаватворчых і этнакультурных працэсах у сярэднявечнай Беларусі.

5. Ахарактарызуйце асноўныя тыпы традыцыйных паселішчаў на Беларусі.

6. Чым было выклікана перасцярожлівае стаўленне беларусаў да рускіх старавераў у XIX – пачатку XX стст.?

**Варыянт 6**

1. Выгнанне габрэяў з тэрыторыі ВКЛ у канцы XV ст. было выклікана:
а) іх радыкальным культурна-рэлігійным непадабенствам з мясцовым насельніцтвам;
б) іх палітычнымі інтрыгамі пры двары Вялікага князя;
в) жаданнем уладаў рэквізаваць іх маёмасць;
г) вывазам імі буйных грашовых сум за межы ВКЛ;
д) іх шпіянажам на карысць варожых дзяржаў.
Эталон: А = 1.

2. Якія крыніцы этналагічнага даследавання Беларусі з'яўляюцца прыярытэтнымі на сучасным этапе?

3. Вызначце месца і ролю РГТ у развіцці дарэвалюцыйнай беларускай этнаграфіі.

4. Пазначце функцыянальную ролю беларускага этна-культурнага кампанента ў межах ВКЛ.

5. Які (якія) з традыцыйных промыслаў не згубілі свайго утылітарнага значэння і сёння?

6. Акрэсліце прынцыповыя адрозненні паміж рытуалам і гульнёй.

**Варыянт 7**

1. Адным з важнейшых кампанентаў нацыянальнага механізму трансляцыі этнакультурнай інфармацыі з'яўляецца:
а) традыцыйны светапогляд этнаса;
б) народныя абрады і звычаі;
в) асвета і адукацыя;
г) комплекс этнічных стэрэатыпаў;
д) гаспадарча-культурны тып.

Эталон: А = 1.

2. Пазначце характар і змест этнаграфічных даследаванняў у Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг.

3. Ахарактарызуйце этна-сацыяльны склад насельніцтва Беларусі паводле перапісу 1897 г.

4. Вылучыце асноўныя прынцыпы функцыянавання беларускай вясковай грамады.

5. У чым заключаецца феномен свята ў беларускай традыцыйнай культуры?

6. Прааналізуйце характар этнакультурнага ўзаемадзеяння беларусаў і татараў у XV – XVIII стст.

**Варыянт 8**

1. У першай палове XIX ст. даследчыкі беларускай народнай культуры найбольшую ўвагу звярталі на:
а) традыцыйныя рамёствы і промыслы;
б) народнае дойлідства;
в) сацыяльную арганізацыю і формы сям'і;
г) песенны фальклор;
д) этнічныя стэрэатыпы.

Эталон: А = 1.

2. Вызначце функцыянальную ролю этнічнай самасвядомасці ў эпоху Сярэднявечча і ў сучасным грамадстве.

3. Ахарактарызуйце ролю канфесійных фактараў у этнічнай гісторыі беларусаў XIV – XVII стст.

4. Пазначце рэгіянальныя асаблівасці народнага дойлідства Беларусі.

5. Вылучыце самабытныя рысы традыцыйнага інструментальнага мастацтва беларусаў.

6. Ахарактарызуйце этнічныя стэрэатыпы беларусаў адносна латышоў і літоўцаў.

**Варыянт 9**

1. Адна з вызначальных рысаў беларускай этнічнай супольнасці часоў Сярэднявечча:
а) канфармізм;
б) эсхаталагізм;
в) традыцыяналізм;
г) рэлігійны фундаменталізм;
д) ксенафобія;
е) пацыфізм.

Эталон: А = 1.

2. Дайце вызначэнне этнаса.

3. Ахарактарызуйце ўклад В. Ластоўскага ў развіццё беларускай этнаграфіі.

4. Акрэсліце асноўныя прычыны заняпаду пчалярства ў сучаснай Беларусі.

5. Пазначце рытуальныя функцыі каравая і хлебнай дзяжы ў вясельнай абрадавасці.

6. Дайце характарыстыку культурных дасягненняў габрэяў Беларусі ў XIX – XX стст.

**Варыянт 10**

1. Сярод гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі адсутнічае:
а) Паўночная Беларусь;
б) Цэнтральная Беларусь;
в) Заходняя Палессе;

г) Заходняя Беларусь;
д) Усходняе Палессе;
е) Усходняя Беларусь;
ё) Падняпроўе;
ж) Панямонне.

Эталон: А = 3.

2. Ахарактарызуйце сутнасць узаемаўплыву этнаса і тэрыторыі яго пражывання.

3. Пазначце прыярытэтныя накірункі даследаванняў беларускай этнаграфіі ў 1950 – 1970-х гг.

4. Чым быў выкліканы дэмаграфічны і этнакультурны крызіс на Беларусі ў другой палове XVII – XVIII стст.?

5. Дайце характарыстыку асноўных этапаў традыцыйнай пахавальнай абрадавасці беларусаў.

6. Пазначце асноўныя групы татарскага насельніцтва ВКЛ паводле іх сацыяльна-эканамічнага становішча.

### Варыянт 11

1. “Збожнымі кумамі” ў рамках радзіннага рытуалу называлі:
а) заможных гаспадароў (мелі шмат збожжа);
б) рэлігійных, набожных людзей;
в) сваякоў па лініі бацькі;
г) абсалютна выпадковых людзей;
д) прадстаўнікоў царквы.

Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце асноўныя метады палявых этнаграфічных даследаванняў.

3. Пазначце своеасаблівасці “міфалагічнай школы” ў беларускай этнаграфіі.

4. У чым праявіўся дысбаланс у сацыяльнай структуры беларускага этнасу ў XIX ст.?

5. Вылучыце асноўныя катэгорыі традыцыйнага керамічнага посуду на Беларусі.

6. Патлумачце, чым выклікана супярэчлівае стаўленне беларусаў да габрэяў у Сярэдневеччы.

**Варыянт 12**

1. Падзея (дата), якая традыцыйна лічыцца пачаткам пасялення татараў на Беларусі:
а) Кулікоўская бітва (1380);
б) сумесны паход Вітаўта і Тахтамыша на Азоў (1397);
в) сумесны ўдзел беларусаў і татараў у Грунвальдскай бітве (1410);
г) параза Вітаўта і Тахтамыша на р. Ворскла (1399);
д) разгром крымскіх татараў пад Клецкам (1506).

Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце гістарычныя формы этнаса.

3. Якія фактары паўплывалі на развіццё этнаграфіі ў БССР у 1920 – 30-х гг.?

4. Пазначце асноўныя этапы і заканамернасці фарміравання беларускай дыяспары.

5. Вылучыце асноўныя тыпы традыцыйных бондарскіх вырабаў на Беларусі.

6. Ахарактарызуйце асноўныя тыпы традыцыйнага беларускага вяселля.

**Варыянт 13**

1. Саманазвай народа з’яўляецца:
а) псеўдаэтнонім;
б) этнонім;
в) канфесіонім;
г) экзаэтнонім;
д) палітонім.

Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце навуковую этнаграфічную дзейнасць М.Я. Нікіфароўскага.

3. Пазначце асноўныя задачы і вынікі палітыкі “беларусізацыі” ў БССР.

4. Вылучыце эпахальныя і рэгіянальныя тыпы местачковай планіроўкі на Беларусі.

5. У чым заключаецца сутнасць рэлігійнага ўшанавання прыродных стыхій і аб’ектаў у традыцыйнай культуры беларусаў?

6. Дайце характарыстыку этнакультурных асаблівасцяў цыганаў Беларусі.

**Варыянт 14**

1. Актывізацыя вывучэння беларускай народнай культуры звязана з ідэялогіяй:
а) Рэнесансу;
б) Мадэрнізму;
в) Рамантызму;
г) Асветніцтва;
д) Класіцызму;
е) Постмадэрнізму.
Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце сучасныя функцыі беларускай мовы, як неад’емнага кампанента беларускай этнічнай сістэмы.

3. Прааналізуйце праблемы і перспектывы развіцця беларускай нацыі на сучасным этапе.

4. Пазначце сімвалічныя функцыі беларускага традыцыйнага адзення.

5. Вылучыце і ахарактарызуйце базавую структуру беларускага народнага календара.

6. У чым заключаецца спецыфіка фармавання ўкраінскай нацыянальнай меншасці на Беларусі?

**Варыянт 15**

1. Дысбаланс у сацыяльнай структуры беларускага этнасу ў XIX ст. найбольш рэзка выявіўся ў:
а) адсутнасці беларускай шляхты;
б) іншаэтнічным характары гарадскога насельніцтва;
в) вялікай долі рускіх чыноўнікаў і святароў;
г) адсутнасці беларускага войска і паліцыі.
Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце асноўныя групы вырабаў у беларускім народным кавальстве.

3. Вызначце месца і ролю “чараўнікоў” і “знахараў” у межах вясковай грамады.

4. Ахарактарызуйце рэлігійную прыналежнасць нацыянальных меншасцяў Беларусі.

5. Якія прынцыпы з’яўляюцца асноватворчымі пры дасягненні гарманічных міжэтнічных адносін?

6. Патлумачце ролю краязнаўства ў развіцці беларускай этнаграфіі 1920-х гг.

### Варыянт 16

1. Народны звычай калектыўнай узаемадапамогі ў беларусаў:
а) бонда;
б) сябрына;
в) пагалоўшчына;
г) палюддзе;
д) талака;
е) куліга.

Эталон: А = 1.

2. Пазначце і ахарактарызуйце асноўныя жанры беларускага празаічнага фальклору.

3. Вылучыце асноўныя гістарычныя этапы фарміравання рускай нацыянальнай меншасці на Беларусі.

4. У чым сутнасць класіфікацыі ў этналогіі?

5. Ахарактарызуйце ўклад польскіх этнографаў XIX – паловы XX стст. у развіцці беларускай этнаграфіі.

6. Патлумачце прычыны, якія замаруджвалі нацыянальную кансалідацыю беларусаў у канцы XIX ст.

### Варыянт 17

1. Сімвалічнае далучэнне навароджанага да чалавечай супольнасці (сферы культуры) адбывалася:
а) адразу пасля нараджэння;
б) падчас першага купання;
в) пасля першага прамоўленага слова;
г) падчас атрымання імя;
д) як прарэжацца першы зуб;

Эталон: А = 4.

2. Патлумачце гісторыю з’яўлення цыганаў на Беларусі.

3. Ахарактарызуйце ўзаемадачыненне духоўных і матэрыяльных кампанентаў у культуры этнаса.

4. Пазначце ўклад І. Насовіча і Я. Карскага ў развіццё беларускай этнаграфіі.

5. У чым выяўляўся традыцыяналізм беларускай этнічнай супольнасці ў Сярэднявеччы?

6. Вылучыце асноўныя прынцыпы беларускай народнай педагогікі.

**Варыянт 18**

1. У якім рэгіёне Беларусі колькасць этнічных украінцаў у XIX – пачатку XX ст. была найбольшай:
а) Усходняе Палессе;
б) Панямонне;
в) Цэнтральная Беларусь;
г) Падняпроўе;
д) Заходняе Палессе.

Эталон: А = 1.

2. Вылучыце асноўныя кампаненты этнічнай сістэмы.

3. Ахарактарызуйце этнаграфічную дзейнасць Е.Р. Раманава.

4. Вызначце асноўныя праявы этнічнага крызісу 1930 – пачатку 1980-х гг. на Беларусі.

5. У чым заключаецца міфалагічны сімвалізм хаты і яе структурных элементаў?

6. Патлумачце прычыны з’яўлення татараў на Беларусі.

**Варыянт 19**

1. Найбольш важным метадам палявых этнаграфічных даследаванняў з’яўляецца:
а) апытанне інфарматараў;
б) сбор этнаграфічных калекцый;
в) назіранне і фотафіксацыя;
г) эксперыментальная этнаграфія.

Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай этнаграфіі другой паловы XIX – пачатку XX стст. у сувязі з грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіццём Беларусі.

3. Патлумачце, у чым выяўлялася шматузроўневасць самасвядомасці насельніцтва Беларусі ў XV – XVI стст.?

4. Вызначце тыпалогію беларускіх народных строяў.

5. Пералічыце асноўныя адзінкі народных лінейных мер; укажыце, якім чынам яны вызначаліся.

6. Ахарактарызуйце нацыянальна-культурнае жыццё татараў Беларусі ў XX ст.

**Варыянт 20**

1. Буйнейшым польскім даследчыкам беларускай народнай культуры з'яўляецца:
а) З. Глогер;
б) М. Федароўскі;
в) К. Машынскі;
г) Ч. Пяткевіч;
д) А. Квасьнеўскі;
е) А. Рыпінскі.

Эталон: А = 1.

2. Прааналізуйце дзяржаватворчыя працэсы на Беларусі ў першай трэці XX ст.

3. Ахарактарызуйце традыцыйныя тыпы сям'і ў беларусаў.

4. Пазначце самабытныя рысы беларускага народнага тэатру.

5. Ахарактарызуйце гісторыю фарміравання і этнакультурныя асаблівасці польскай нацыянальнай меншасці на Беларусі.

6. Якім чынам этнічная прастора беларусаў паўплывала на спецыфіку іх матэрыяльнай культуры?

**Варыянт 21**

1. Для насельніцтва Беларусі XV – XVI стст. быў характэрны працэс:
а) этнічнай міксацыі;
б) этнічнай парцыяцыі;

в) асіміляцыі;
г) этнічнай стагнацыі;
д) этнічнай кансалідацыі.

Эталон: А = 1.

2. Пазначце этнаграфічныя асаблівасці беларускага Падзвіння.

3. Ахарактарызуйце жанравую разнастайнасць беларускага абрадавага фальклору.

4. У чым праявіўся этнакультурны ўплыў беларусаў на татарскую этнічную меншасць у XV – XVII стст.?

5. У чым заключаецца функцыянальнае прызначэнне палявой этнаграфічнай дакументацыі?

6. Дайце характарыстыку развіццю беларускай фалькларыстыкі ў другой палове XX ст.

**Варыянт 22**

1. У першапачатковым сэнсе слова "сябры" азначала:
а) людзей, што разам набывалі і прадавалі коней;
б)загоншчыкаў звяроў на паляванні;
в) рыбакоў, што супольна лавілі рыбу;
г) пчаляроў, што мелі агульных пчолаў;
д) плытагонаў, якія разам сплаўлялі лес.

Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце народныя веды ў галіне касмалогіі і астраноміі.

3. Якімі фактарамі была выклікана рэзкая зменлівасць колькасці габрэйскага насельніцтва Беларусі ў XIX – XX стст.?

4. Дайце вызначэнне розным катэгорыям этнонімаў.

5. Пазначце новыя накірункі даследаванняў у беларускай этнаграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

6. Ахарактарызуйце спецыфіку маральна-этычных і міжпакаленных узаемаадносін у межах традыцыйнай беларускай супольнасці.

**Варыянт 23**

1. Найбольшы этнакультурны ўплыў з боку беларусаў адчувала на сабе наступная этнаграфічная група літоўцаў:
а) селы;
б) дзукі;

в) яцвягі;
г) земгалы;
д) жамайты;
е) дайнава.

Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце месца і ролю этналогіі Беларусі ў сістэме сучаснай айчыннай гуманітарыстыкі.

3. Дайце характарыстыку этнаграфічным даследаванням А. Багдановіча і У. Дабравольскага.

4. У чым заключаецца тыпалагічнае падабенства нацыянальнага адраджэння беларусаў і іншых цэнтральнаеўрапейскіх народаў у канцы XIX – пачатку XX стст.?

5. Пазначце этнаграфічныя асаблівасці Ўсходняга Палесся.

6. Патлумачце спецыфіку ўзаемаадносін беларусаў і цыганаў у XIX – пачатку XX стст.

**Варыянт 24**

1. Адной з галоўных катэгорый духоўнай культуры з'яўляецца:
а) этнічнасць;
б) рамяство;
в) самасвядомасць;
г) рэлігія;
д) кнігадрукаванне;
е) пісьмовасць.

Эталон: А = 1.

2. Пазначце асноўных даследчыкаў народнай культуры Беларускага Падзвіння.

3. У чым сутнасць "балцкай" канцэпцыі паходжання беларусаў?

4. Ахарактарызуйце этнаграфічныя асаблівасці Заходняга Палесся.

5. Вылучыце асноўныя этапы Купальскай абрадавасці.

6. Якім чынам Статут ВКЛ 1588 рэгламентаваў статус этнічных меншасцяў?

**Варыянт 25**

1. Для М.Я. Нікіфароўскага асноўным прадметам навуковага вывучэння была традыцыйная культура беларусаў:
а) Заходняга Палесся;
б) Смаленшчыны;
в) Латгаліі;
г) Падняпроўя;
д) Падзвіння;
е) Беласточчыны.

Эталон: А = 1.

2. Ахарактарызуйце этна-сацыяльную структуру насельніцтва Беларусі ў XV – XVI стст.

3. Дайце характарыстыку прафесійнай спецыялізацыі сталяроў і стальмахоў.

4. Пазначце функцыянальна-сімвалічную сутнасць “прыродных” і “культурных” персанажаў беларускай міфалогіі.

5. У чым праявілася нацыянальна-культурнае адраджэнне палякаў і украінцаў на Беларусі ў канцы XX ст.?

6. Пазначце асноўныя метадалагічныя прынцыпы правядзення палявых этнаграфічных даследаванняў.

**Варыянт 26**

1. Упершыню канцэпцыю развіцця беларускай нацыі распрацавала рэдакцыя:
а) газеты “Наша доля”;
б) газеты “Савецкая Беларусь”;
в) часопіса “Гоман”;
г) часопіса “Наш край”;
д) газеты “Наша ніва”
е) газеты “Мужыцкая праўда”.

Эталон: А = 1.

2. Пазначце этнаграфічную спецыфіку Падняпроўя;

3. Дайце характарыстыку беларускай міфапаэтычнай мадэлі свету;

4. Ахарактарызуйце міжнацыянальныя адносіны ў сучаснай Беларусі.

5. Якім чынам этнічная тэрыторыя беларусаў уплывае на іх духоўную культуру?

6. Вызначце ролю гуманітарных і прыродазнаўчых навук у этналагічных даследаваннях.

**Варыянт 27**

1. Этнічная тэрыторыя – гэта:
а) тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа, з якой звязаны яго этнагенэз і этнічная гісторыя;
б) прастора, дзе дамінуе мова і культура аднаго этнаса;
в) тэрыторыя пражывання этнасу, якая ўвайшла ў склад нацыянальнай дзяржавы;
г) сукупнасць тэрыторый, дзе пражываюць прадстаўнікі пэўнага этнасу.

Эталон: А = 1.

2. Калі і ў выніку чаго этнонім "беларусы" становіцца агульнаэтнічным?

3. Ахарактарызуйце ўклад у айчынную этналогію В. Бандарчыка, М. Піліпенка і Л. Мінько.

4. Пазначце рытуальна-сімвалічныя аспекты беларускіх традыцыйных промыслаў.

5. Ахарактарызуйце спецыфіку міфапаэтычнага (традыцыйнага) мыслення.

6. Вылучыце нацыянальныя меншасці Беларусі, якія сфармаваліся ў XX ст.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭМЫ КУРСАВЫХ РАБОТ

1. Канцэпцыі паходжання беларусаў і этноніма “беларусы”.
2. Гісторыя этнаграфічнага вывучэння Беларускага Падзвіння.
3. Беларускія традыцыйныя промыслы: утылітарная і сімвалічная прагматыка.
4. Беларускае народнае дойлідства: тэналагічны і рытуальны аспект.
5. Беларуская традыцыйная кухня: тыпалагічная і семантычная характарыстыка.
6. Традыцыйныя каляндарныя святы Беларускага Падзвіння.
7. Беларуская традыцыйная абрадавасць сямейнага цыклу: структурна-семантычны аналіз.
8. Беларуская народная медыцына.
9. Знахарства і чарадзейства ў беларускай традыцыйнай культуры.
10. Этнічныя стэрэатыпы, як складовая частка традыцыйнага беларускага светапогляду.
11. Культ прыродных стыхій і аб’ектаў у беларускім традыцыйным грамадстве.
12. Гісторыя і культура нацыянальных (этнічных) меншасцяў Беларусі.

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ ПА ВЫКАНАННІ КУРСАВЫХ РАБОТ

## 1. Агульныя палажэнні

Курсавая работа па этнаграфіі (этналогіі) Беларусі з'яўляецца самастойнай навукова-даследчай работай студэнта, якая мае ўнутранае адзінства і змяшчае вынікі паглыбленага аўтарскага вывучэння і распрацоўкі адной з актуальных праблем беларускай этнаграфіі.

Курсавая работа выконваецца на беларускай альбо рускай мове ў друкаваным ці рукапісным выглядзе.

## 2. Структура курсавой работы

Курсавая работа павінна змяшчаць:

– тытульны ліст;
– змест;
– уводзіны;
– асноўную частку, прадстаўленую раздзеламі (главамі);
– заключэнне;
– спіс выкарыстаных крыніц;
– дадаткі (пры неабходнасці).

**2.1. Тытульны ліст.** На тытульным лісце павінны быць прыведзены наступныя звесткі: найменне ведамаснага міністэрства і ВНУ, дзе выканана курсавая работа; назва структурнага падраздзялення (кафедры); назва (тэма) курсавой работы; прозвішча, ініцыялы аўтара; службовая пасада, навуковая ступень, прозвішча і ніцыялы навуковага кіраўніка; горад і год. (глядзі Ўзор 1).

Назва работы павінна вызначаць вобласць праведзеных даследаванняў, быць па магчымасці кароткай і дакладна адлюстроўваць змест.

**2.2. Змест.** Змест уключае ў сябе назвы структурных частак курсавой работы ("Уводзіны", "Глава", "Спіс выкарыстаных крыніц", "Дадаткі") з указаннем нумароў старонак, на якіх размяшчаецца пачатак матэрыялу ад-

паведных частак курсавой работы. Змест падаецца пасля тытульнага ліста, што дае магчымасць адразу ўбачыць структуру работы.

**2.3. Уводзіны.** Уводзіны – уступная, пачатковая частка курсавой работы, дзе даецца агульная ацэнка стану навуковай, сацыяльнай ці іншай сферы дзейнасці чалавека і грамадства, дзе знаходзіцца абраны аўтарам аб'ект даследавання.

*Абавязкова* пазначаецца **актуальнасць** тэмы курсавой работы (указваецца ступень распрацаванасці тэмы ў айчыннай навуцы, месца даследавання ў сучаснай гуманітарыстыцы, навуковая і грамадская значнасць даследавання.

**Мэта і задачы** курсавой работы. Звычайна фармуліруецца адна мэта работы (супадае з тэмай) і некалькі задач, якія неабходна вырашыць для дасягнення пастаўленай мэты.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Указваецца *аб'ект* – тая частка рэальнага свету, якая спасцігаецца і даследуецца аўтарам. Мэта і задачы даследавання вызначаюць рамкі *прадмета* даследавання, які канкрэтна фармуліруецца аўтарам.Уводзіны змяшчаюць і кароткі **гістарыяграфічны агляд**, дзе аўтар дае нарыс асноўных этапаў развіцця навуковай думкі па разглядаемай праблеме. Сцісла, крытычна асвятляючы работы папярэднікаў, аўтар павінен акрэсліць тыя пытанні, якія засталіся невырашанымі і, такім чынам, вызначыць сваё месца ў вырашэнні праблемы.

**2.4. Асноўная частка.** Асноўная частка курсавой работы ўтрымліваецца ў главах, дзе даецца выбар накірункаў даследавання, выкладанне агульнай канцэпцыі і асноўных метадаў даследавання, выкананыя ў рабоце тэарэтычныя ці прыкладныя даследаванні, аналіз і абагульненне вынікаў даследавання.

У главах курсавой работы з вычарпальнай паўнатой выкладаецца ўласнае даследаванне студэнта з выяўленнем таго новага, што ён уносіць у распрацоўку праблемы. Увесь парадак выкладання ў рабоце павінен быць падпарадкаваны мэце даследавання, сфармуліраванай аўтарам. Лагічнасць пабудовы і мэтаскіраванасць асноўнага зместу дасягаецца толькі тады, калі кожная глава мае канкрэтнае мэтавае прыназначэнне і з'яўляецца базай для наступнай. У курсавой рабоце неабходна сцісла, лагічна і аргументавана выкладаць змест і вынікі даследаванняў; пазбягаць залішняга выкарыстан-

ня агульных слоў, бездоказных сцвярджэнняў, тафталогіі, неапраўданага павелічэння аб'ёму курсавой работы.

Пры напісанні курсавой работы аўтар абавязаны даваць спасылкі на аўтараў і крыніцу, з якой ён запазычае матэрыялы ці асобныя вынікі. Цытаванне дазваляецца толькі з выкарыстаннем двукоссяў. Не дазваляецца кампілятыўны пераказ тэксту і асобных сказаў іншых аўтараў.

У кожнай главе варта рабіць кароткія высновы, што дазваляе выразна сфармуляваць вынікі кожнага этапу даследавання і дае магчымасць вызваліць асноўныя вынікі па рабоце ад другасных падрабязнасцяў.

**2.5. Заключэнне.** У гэтым раздзеле павінны ўтрымлівацца асноўныя вынікі даследавання і высновы, зробленныя на іх аснове.

**2.6. Спіс выкарыстаных крыніц.**Спіс павінен утрымліваць пералік крыніц інфармацыі, на якія ў курсавой рабоце прыводзяцца спасылкі.

**2.7. Дадаткі.** Пры неабходнасці ў дадаткі ўключаюць дапаможны матэрыял (графікі, табліцы, ілюстрацыі і да т.п.), неабходны для паўнаты ўспрыняцця курсавой работы.

## 3. Правілы афармлення курсавой работы

**3.1. Агульныя патрабаванні.** Курсавая работа друкуецца (пішацца) на адной старонцы ліста белай паперы фармата А4. Пры камп’ютарным наборы тэкст набіраецца праз паўтарачны інтэрвал, шрыфтам Times New Roman памер 14 pt без пераносаў. Параметры палей: левае – 30 мм, правае – 10 мм, верхняе – 15 мм, ніжняе – 20 мм. Мінімальны аб’ём курсавой работы – 25 старонак тэкста (без уліку дадаткаў і спісу выкарыстаных крыніц).

Загалоўкі структурных частак курсавой работы “ЗМЕСТ”, “УВОДЗІНЫ”, “ГЛАВА”, “ЗАКЛЮЧЭННЕ” і іншыя друкуюць прапіснымі літарамі ў сярэдзіне радка. Гэтак жа друкуюць загалоўкі глаў. Слова “ГЛАВА” перад загалоўкам главы як у тэксце, так і ў змесце можа не выкарыстоўвацца.

Кожную структурную частку курсавой работы неабходна пачынаць з новага ліста.

**3.2. Спасылкі.** Пры напісанні курсавой работы аўтар абавязаны даваць спасылкі на крыніцы і матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца ў даследаванні. Спасылка афармляецца пасля цытаты ў квадратных дужках. Напрыклад: [25, с. 17], дзе 25 – нумар крыніцы ў алфавітным спісе, а 17 – нумар цытаванай старонкі. Падобным чынам спасылаюцца і на дадаткі: [дадатак 1].

**3.3. Нумарацыя.** Нумарацыя старонак даецца арабскімі лічбамі без знака №. Першай старонкай работы з'яўляецца тытульны ліст, які ўключаюць у агульную нумарацыю. На тытульным лісце і лісце са зместам нумар старонкі не ставіцца, на наступных лістах нумар прастаўляюць у верхнім правым куце без кропкі ў канцы.

**3.4. Спіс выкарыстаных крыніц.** Крыніцы неабходна размяшчаць у спісе ў алфавітным парадку прозвішчаў першых аўтараў ці загалоўкаў (глядзі Ўзор 2).

**3.5. Дадаткі.** Дадаткі афармляюць як працяг курсавой работы на наступных яе старонках, размяшчаючы іх у парадку з'яўлення спасылак у тэксце. Кожны дадатак пачынаецца з новага ліста з указаннем у правым верхнім куце слова “ДАДАТАК”. Калі ў рабоце больш за адзін дадатак, іх нумаруюць паслядоўна, напрыклад, ДАДАТАК 1, ДАДАТАК 2 і г.д.

Узор 1

ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**УА “Полацкі дзяржаўны універсітэт”**

**Кафедра гісторыі і сацыялогіі**

**Курсавая работа**
**на тэму:**

**“ЭТНІЧНЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ XIX СТ.”**

**Выканаў:** студэнт гр. 07-ГІС
Станкевіч Я.Дз.

**Навуковы Кіраўнік** прафесар, доктар гістарычных навук
Ластоўскі В.Ю.

**Полацк 2009**

Узор 2

# ПРЫКЛАД АФАРМЛЕННЯ СПІСА КРЫНІЦ

| Характарыстыка крыніцы | Прыклад афармлення |
|---|---|
| Адзін ці болей аўтараў | Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972. – 168 с. |
| | Садохин А.П., Грушевицкая Т.Г. Этнология: Учебник для студ. высш. учеб. заведений. – М.: Издат. центр “Академия”, Высш. школа, 2000. – 304 с. |
| Асобны том у шматтомным выданні | Беларусы: У 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Пііпенка, А.І. Лакотка. – Мн.: Бел. навука, 1999. – 365 с. |
| Складнікавая частка кнігі | Ажэшка Э. Людзі і кветкі над Нёманам // Выбраныя творы / Уклад., прадм., камент. В. Галавай. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2000. – 512 с. |
| Зборнік | Лобач Ул. Да механізму чарадзейскіх судовых працэсаў у сярэднявечнай Беларусі: на прыкладзе справы палачаніна В. Брыкуна (1643 г.) // Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: Зборнік навуковых прац. – Наваполацк: ПДУ, 2001. – с. 52 – 59. |
| Часопіс | Лобач Ул. Асаблівасці традыцыйнай культуры Полаччыны XIX ст. // Весці Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2000. – С. 36 – 43. |
| Энцыклапедыя | Иванов В.В. Лес // Мифы народов мира. Энциклопедия в 2-х т. / Гл. ред. С.А. Токарев. – М.: Сов. Энц., 1991. – Т. 2. К – Я. – С. 49 – 50. |
| Газета | Глёбус А. Сучаснікі // Наша ніва. – 2005. – 23 жніўня. – с. 16. |

# КАРОТКІ СЛОЎНІК ЭТНАГРАФІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

## А

**Абыдзённік** – ручнік ці кавалак палатна, выткнаны калектыўна жанчынамі сяла на працягу дня (ад усходу да заходу сонца) ці ночы, закліканы прадухіліць (спыніць) засуху, град, працяглыя дажджы, эпідэмію і іншыя няшчасці. У якасці *абярэга*, А. вяшалі на прыдарожныя крыжы, абносілі вакол вёскі, праганялі праз яго хатнюю жывёлу ці ахвяравалі царкве.

**Абярэг, кудмень, амулет, апатрапей** – прадмет, выява або дзеянне, якім прыпісвалі магічную здольнасць засцерагаць ад няшчасцяў і злых духаў; вядомы ад эпохі Палеаліту.

**Адаптацыя** (позналац. “*adaptation*” – прыстасаванне), у этнаграфіі – прыстасаванне чалавека або *этнічнай групы* да кліматычных, геаграфічных, сацыяльна-эканамічных, культурна-бытавых і іншых умоў жыцця.

**Адносіны жартоўныя** – у традыцыйным грамадстве сукупнасць замацаваных *звычаем*, свядома несур’ёзных, смехавых (але не сатырычных) узаемаадносінаў, закліканых зняць псіхалагічную напружанасць і няўпэўненасць, якая ўзнікае ў неспрыяльны, драматычны для калектыва ці асобы перыяд жыцця.

**Акультурацыя этнічная** – працэс і вынік узаемаўплыву этнічных культур, які заключаецца ва ўспрыняцці адной з іх (звычайна меньш развітай) элементаў другой культуры. У выніку А.э. адбываецца частковая альбо поўная *асіміляцыя*.

**Анімізм** ( ад лац. “*anima*” – душа, дух), вера ў існаванне душ і духаў, як унутранага першаснага змесціва ўсіх праяў (рэчы, стыхіі, з’явы) існага Космасу; адна з найбольш ранніх форм рэлігіі.

**Антрапалогія** – біялагічная навука аб паходжанні і эвалюцыі фізічнай арганізацыі чалавека і яго рас. У заходняй традыцыі разумеецца як сукупнасць навук пра чалавека, уключаючы этнаграфію, культурную і сацыяльную антрапалогію.

**Асіміляцыя** (ад лац. “*assimilation*” – прыпадабненне), від аб’яднальных *этнічных працэсаў*, які суправаджаецца засваеннем адным народам мовы, культуры і іншых этнічных прыкмет другога народа (сацыяльна больш развітага ці дэмаграфічна пераважаючага) да поўнага зліцця з ім.

**Арнамент** (ад лац. “*ornamentum*” – упрыгожанне), узор з рытмічна ўпарадкаваных элементаў для аздаблення твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктурных збудаванняў, прадметаў хатняга

ўжытку. У беларускім народным мастацтве вядомы тканы, вышываны, плецены, набіваны, аплікацыйны, ляпны, гравіраваны, разьбяны, маляваны і інш. Пачаткова А. выконваў магічныя функцыі *абярэга*, якія з цягам часу замяшчаюцца мастацка-эстэтычным прызначэннем.

**Ахвярапрынашэнне –** рытуал, закліканы залагодзіць або аддзячыць суб'ектаў сакральнай сферы (багоў, духаў, продкаў) шляхам прынясення дароў, у тым ліку і жывых істот. У найбольш чыстым выглядзе А. Бытавала ў дахрысціянскую эпоху. Памеры А. залежалі ад значнасці, прадухіляемай, чакаемай ці здзейсніўшайся падзеі (з'явы), а таксама ад статуса аб'екта, якому яна прызначалася.

## Б

**Білінгвізм** (ад лац. "*bis*" – двойчы і "*lingua*" – мова), **двухмоўе** – функцыянаванне дзвух моў для абслугоўвання патрэб этнічнага калектыва, якое дазваляе карыстацца living рознымі мовамі ў разнастайных жыццёвых сітуацыях.

**Бонда,** 1) беларускі народны звычай частавання блізкіх і аднавяскоўцаў свежынай, а таксама хлебам, садавінай, агароднінай новага ўраджаю. Звычай сведчыць пра існаванне ў старажытнасці калектыўнай (абшчыннай) гаспадаркі і грамадскай уласнасці; 2) старадаўняя назва *пасагу*, запасу грошай, адзення; 3) круглая пшанічная булка.

**Бондарства** – традыцыйнае рамяство, выраб адмысловага посуду (бочкі, вёдры, цэбры, балеі, кублы і інш.) з дрўляных клёпак.

**Бортніцтва** – старадаўні лясны промысел, заснаваны на ўтрыманні і развядзенні лясных пчол у прыродных (штучных) дуплах – борцях; пачатковая форма культурнага пчалярства.

## В

**Варажба** – комплекс магічных практык і дзеянняў, закліканых прадвызначыць будучае, высвятліць невядомае ў мінулым ці ў прасторава аддеглай сучаснасці. Узнікла ў першабытным грамадстве разам з выкрышталізацыяй веры ў існаванне пэўнага касмічнага парадку, які быў засведчаны людзьмі праз назіранне і супастаўленне з'яў прыроды, астранамічных цыклаў, паводзін жывёл і г.д.

**Вяселле** – комплекс абрадаў і звычаяў у спалучэнні са шматлікімі фальклорнымі элементамі (песні, танцы, музыка і інш.), якія суправаджаюць урачыстасць заключэння *шлюбу* і з'яўляюцца няпісаным юрыдычным актам зацвярджэння новай сям'і.

## Г

**Ганчарства** – традыцыйнае рамяство, вытворчасць ганчарных вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння. Зарадзілася ў раннім неаліце, але як спецыялізаванае рамяство вылучылася са з'яўленнем ганчарнага круга (на Беларусі ў X ст.).

**Гарбарства** – рамяство па вырабу і апрацоўцы скур, прызначаных, пераважна, для пашыву абутку.

**Гаспадарча-культурны тып** – комплекс асаблівасцяў гаспадаркі і культуры, які склаўся ў розных народаў, што знаходзяцца на адным узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця і ў падобных геа-кліматычных умовах.

**Генацыд** (ад грэч. "*genos*" – род, племя і лац. "*caedere*" – забіваць) – планамернае вынішчэнне асобных груп насельніцтва па расавых, этнічных, нацыянальных ці рэлігійных матывах.

**Гістарычная памяць народа** – важнейшы кампанент духоўнай культуры этнаса, які дазваляе падтрымліваць непарыўнасць этнічнай эвалюцыі; пераемнасць культуры этнаса.

**Гісторыка-этнаграфічны рэгіён** – тэрыторыя, у насельніцтва якой на аснове сацыяльна-эканамічнай агульнасці, працяглых сувязяў і ўзаемаўплываў узніклі падобныя культурна-бытавыя (этнаграфічныя) асаблівасці.

**Грабарства**, традыцыйны промысел, звязаны з землянымі работамі пры пракопванні каналаў, дрэнажных канаў, выкопванні студняў, будаўніцтву крэпасных валоў і г.д.

**Грамада, абшчына** – самакіруючыйся гаспадарчы і сацыяльна-бытавы калектыў у дакласавым (радавая грамада) і дакапіталістычным класавым грамадствах (суседская ці сялянская грамада); характарызуецца поўнай ступенню калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці, асаблівасцямі працэсу вытворчасці і сацыяльнага жыцця. Як устойлівая форма сацыяльнай арганізацыі людзей, Г. узнікла ў першабытнаабшчынную эпоху.

## Д

**Дзядзькаванне** – звычай аддаваць дзяцей шляхты на выхаванне ў сялянскую сям'ю, дзеля фармавання ў дзяцей станоўчых фізічных і духоўных якасцяў простага народа: сілы, вынослівасці, працавітасці, неперабор-лівасці ў харчаванні і адзенні, любові да роднай зямлі і інш.; пашыраны на беларускіх землях у XVI – XVIII стст.

**Дойлідства народнае** – галіна архітэктуры і будаўніцтва, якая развіваецца пад пераважным уплывам народных будаўнічых традыцый. Належыць да народных матэрыяльнай і мастацкай культур, вылучаецца арганічным зліццём утылітарнай, рытуальна-сімвалічнай і эстэтычнай функцый.

**Духоўная культура** – сукупнасць духоўных каштоўнасцяў, выпрацаваных чалавечым розумам у працэсе гістарычнага развіцця. У сферу Д.к. уваходзяць вытворчыя навыкі, народныя веды, традыцыі і звычаі, розныя віды народнага мастацтва і творчасці, рэлігійныя ўяўленні і вераванні. З падзелам працы на фізічную і разумовую, Д.к. пачала існаваць у двух відах – прафесійная (літаратура, адукацыя, права і г.д.) і народная, якія знаходзяцца ў пастаянным узаемадзеянні і ўзаемапранікненні. У Д.к. найбольш выразна ўвасоблены этна-культурныя асаблівасці любога народа.

**Дыскрымінацыя** (ад лац. “*discrimination*” – адрозніванне) – абмежаванне ці пазбаўленне правоў пэўнай катэгорыі грамадзян па прыкмеце расавай, этнічнай, нацыянальнай прыналежнасці, па полавай прыкмеце, па рэлігійных, палітычных перакананнях і г.д.

**Дыяспара** (ад грэч. “*diaspora*” – рассейванне) – частка народа, якая пражывае па-за межай краіны свайго паходжання.

**Дэмаграфія** (ад грэч. “*demos*” – народ і “*grapho*” – пішу) – навука пра насельніцтва, заканамернасці яго развіцця, структуру і размеркаванне на пэўных тэрыторыях.

**Дэманалогія народная** – сукупнасць міфалагічных уяўленняў пра звышнатуральных істот (духаў) навакольнага свету; неад’емная частка традыцыйнай (архаічнай) *духоўнай культуры.*

**Дээтнізацыя** – працэс страты народам ці яго асобнымі прадстаўнікамі сваіх этнічных рыс; пачынаецца са страты роднай мовы, потым нацыянальнай (этнічнай) самасвядомасці і этнічнай ідэнтыфікацыі.

### Ж

**Жывёлагадоўля** – галіна сельскай гаспадаркі па развядзенні свойскай жывёлы; адзін з найважнейшых традыцыйных заняткаў беларусаў, які забяспечваў насельніцтва прадуктамі харчавання, вытворчай сыравінай, цяглавай сілай і даваў асноўныя арганічныя ўгнаенні. На Беларусі Ж., як форма гаспадаркі, вядома з часоў позняга Неаліту і Бронзавага веку.

### З

**Збіральніцтва** – адна з форм гаспадарчай дзейнасці чалавека, якая заключаецца ў збіранні (здабыванні) гатовых дароў прыроды, у асноўным прадметаў харчавання і лекавых раслін, найбольш шырокае распаўсюджванне мела ў першабытнаабшчынным грамадстве, але не страціла канчаткова свайго значэння і пры вытворчых тыпах гаспадаркі.

**Звычаёвае права** – сукупнасць гістарычна выпрацаваных і прынятых грамадствам няпісаных нормаў, правілаў паводзінаў і ўзаемаадносін людзей у розных галінах вытворчага, грамадскага і сямейнага жыцця. Як адна з форм грамадскай свядомасці, З.п. фарміравалася на аснове *звычаяў*, якія існавалі ў дадзяржаўным грамадстве.

**Звычай** – гістарычна ўсталяваны і агульнапрыняты ў пэўным грамадстве або этна-сацыяльнай групе спосаб паводзін.

**Земляробства** – галіна сельскай гаспадаркі; асноўны занятак насельніцтва Беларусі з часоў позняга Неаліту і Бронзавага веку. У шырокім (сучасным) сэнсе адпавядае раслінаводству і ўключае ворыўнае З., лугаводства, садоўніцтва і лесаводства.

**Знахарства** – вядомыя з першабытных часоў сімвалічныя спосабы лячэння хвароб і дасягнення спору ў разнастайных галінах жыццядзейнасці чалавека, якія суправаджаліся разнастайнымі магічнымі дзеяннямі і замовамі. У сельскай мясцовасці не страціла свайго значэння і ў наш час.

## І

**Ідэнтыфікацыя этнічная** (ад лац. “*identificare*” – атаясамляць) – псіхалагічны працэс атаясамлення індывідам сябе з этнічнай супольнасцю. І.э. адбываецца на аснове прынцыпа самавызначэння этнічнай прыналежнасці. Згодна гэтаму прынцыпу, чалавек прыналежыць да той этнічнай супольнасці, з якой ён лічыць сябе звязаным агульнасцю мовы, культуры, быту.

**Іміграцыя** (ад лац. “*immigrans*” – усяляючыйся) – прыезд у краіну на часовае ці пастаяннае пражыванне грамадзяна іншай дзяржавы (імігрантаў).

**Інкультурацыя** – прцэс уваходжання чалавека ў культуру, авалоданне этнакультурным вопытам.

**Інтэграцыя міжэтнічная** – працэс збліжэння розных этнасаў без зліцця іх у адзінае цэлае. Вынікам І.м. з’яўляецца ўзнікненне пэўнай культурнай, духоўнай, сацыяльна-эканамічнай агульнасці (пры захаванні асноўных этнічных рыс).

## К

**Кавальства –** вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прыназначэння з жалеза шляхам яго гарачага ці халоднага кавання. Як традыцыйнае рамяство, К.вядома на Беларусі з часоў Жалезнага веку.

**Кампліментарнасць** – адчуванне падсвядомай сімпатыі (антыпатыі) членаў этнічных калектываў, якое ляжыць у аснове падзелу на “сваіх” і “чужых”.

**Канвенгерцыя** (ад лац. “*converge*” – набліжаюся, сыходжуся), у этнаграфіі, незалежнае ўзнікненне аднолькавых, падобных з’яў (рыс, форм) у матэрыяльнай і духоўнай культуры, мове, самасвядомасці, сацыяльнай структуры і іншых этнічных прыкметах розных народаў.

**Кансалідацыя этнічная** (ад лац. “*consolido*” – умацоўваць, ушчыльняць) – від аб’яднальных *этнічных працэсаў*, у выніку якога адбываецца зліццё блізкіх па мове і культуры этнасаў ці частак этнасаў у больш буйную этнічную супольнасць (напрыклад, плямён у народнасць) ці ўключэнне ва ўжо сфармаваны этнас блізкай яму *этнічнай групы*.

**Канфесіёнім** – назва груп насельніцтва (частак этнаса) паводле іх канфесійнай прыналежнасці (напрыклад, беларусы-католікі, як “палякі, “польскай веры”; праваслаўныя – “рускія”, “рускай веры”). З ростам нацыянальнай самасвядомасці і распаўсюджаннем агульнага этноніма, К. губляе свае значэнне.

**Касмапалітызм** (ад грэч. “*cosmopolitis*” – грамадзянін свету) – адмаўленне ідэі “нацыянальнай глебы”, нацыянальнай культуры, патрыятызму; у палітыцы – непрыняцце дзяржаўнага і нацыянальнага суверэнітэта, ігнараванне нацыянальных інтарэсаў.

**Кравецтва** – традыцыйнае рамяство па пашыву верхняга адзення з палатна, сукна, футра (пераважна аўчын).

**Ксенафобія** (ад грэч. “*xenos*” – чужы і “*phobos*” – страх) – негатыўнае, варожае ці агрэсіўнае стаўленне да чужаземцаў і да ўсяго чужога – мовы, ладу жыцця, стылю мыслення і да т.п.

**Культ продкаў** – рэлігійнае ўшанаванне памерлых бацькоў і ўсіх родзічаў. Развіваўся як сямейны культ на стадыі распаду родавай абшчыны. Генетычна звязаны з першабытнымі анімістычнымі ўяўленнямі і вераваннямі аб продках як ахоўніках роду, нашчадкаў, гаспадаркі. Элементы К.п. захаваліся ў беларускіх святкаваннях Дзядоў, Радаўніцы, у пахавальных абрадах, звычаях і галашэннях.

**Культура этнаса** – сукупнасць кампанентаў матэрыяльнай, духоўнай і сацыянарматыўнай культуры, якія сфарміраваліся ў рамках дадзенага этнаса, з’яўляюцца для яго спецыфічнымі і вылучаюць яго сярод іншых этнасаў.

**Кушнерства** – традыцыйнае рамяство па апрацоўцы аўчын і скурак пушных звяроў. У народным К. галоўнае месца займаў выраб аўчын для пашыву зімовага адзення – кажухоў, паўкажухоў, шапак. Апрацоўка скур упаляваных пушных звяроў (лісы, куніцы, вавёркі і да т.п.) мела другараднае значэнне.

## М

**Магія** – агульнае найменне шырокага комплексу сімвалічных дзеянняў і вербальных (славесных) формул, здольных, паводле міфалагічнага мыслення, звышнатуральным чынам уплываць на навакольны свет (прыроду, жывёл, чалавека).

**Маргінальнасць** (ад лац. "*margo*" – мяжа, край, ускраіна) – стан чалавека ці групы людзей, адарваных ад звыклага этна-культурнага асяродка і лада жыцця і не прыняўшых новага, знаходзячыхся ў прамежкавым, памежным стане.

**Матэрыяльная культура** – сукупнасць матэрыяльных каштоўнасцяў, створаных пэўным этнасам у працэсе гістарычнай грамадска-карыснай дзейнасці, – прылады працы, жыллё, адзенне, ежа, транспартныя сродкі, культавыя і бытавыя рэчы і інш. М.к. адлюстроўвае ўзровень вытворчых сіл і экалагічнага асваення прыроды чалавекам; арганічна звязана з *духоўнай культурай* у адзінай функцыянальнай сістэме.

**Менталітэт этнічны** (ад фр. "*mentalite*" – мысленне) – глыбінны ўзровень калектыўнай і індывідуальнай свядомасці (які ўключае і неўсвядомленае), дзе фіксуецца сукупнасць уяўленняў, вераванняў, стэрэатыпаў, каштоўнасных арыентацый, якія складаюць цэльную карціну свету і ўмацоўваюць адзінства культурнай традыцыі.

**Міграцыя насельніцтва** (ад лац. "*migro*" – пераходжу, перасяляюся) – тэрытарыяльнае перамяшчэнне людзей (мігрантаў), звязанае з пераменай месца жыхарства.

**Міф** (грэч. "*mithos*" – паданне, апавяданне) – сказанне, дзе адлюстраваны архаічныя ўяўленні аб паходжанні свету, з'яў прыроды, сацыяльных норм і інстытутаў, пра багоў, культурных герояў і інш.; узніклі ва ўсіх народаў на ранняй стадыі развіцця, як прадукт спасціжэння сусвету архаічнай свядомасцю.

**Міфалагічная свядомасць** – навуковае паняцце, пад якім разумеецца асаблівы лад архаічнай чалавечай свядомасці, найбольш рэльефна адлюстраваны ў тэкстах міфалагічнага характару. Вызначальнай рысай М.с. лічыцца яе дыфузнасць, якая выяўляецца ў невыразнасці супрацьстаўлення чалавека і прыроды, жывога і мёртвага, аб'екта і суб'екта, прасторы і часу і г.д. Адсюль вынікае ачалавечванне навакольнага свету ("глабальная антрапамарфізацыя"), усеагульная персаніфікацыя ў міфах прыродных і культурных (сацыяльных) з'яў і аб'ектаў.

**Міфалогія**, 1) сукупнасць міфаў, якія належаць адной гісторыка-культурнай традыцыі (напрыклад, хецкая,старажытнагрэчаская М.); 2) навуковая дысцыпліна, якая вывучае міфы і міфалагічныя сістэмы.

## Н

**Народ** – суб’ект гісторыі; сукупнасць класаў і сацыяльных груп грамадства; насельніцтва дзяржавы, краіны; у этнаграфічным сэнсе тое ж, што *этнас*.

**Народнасць** – гістарычны тып *этнаса*, які прыходзіць на змену *плямёнам* і папярэднічае *нацыі*. Фарміруецца на аснове інтэграцыі і кансалідацыі суседніх, як правіла роднасных, плямён, абшчын, тэрытарыяльных і іншых груп насельніцтва ў выніку актывізацыі палітычных, сацыяльна-эканамічных, этнакультурных і іншых фактараў.

**Нацыя** – вышэйшая форма гістарычнай арганізацыі *этнаса*, якая прыходзіць на змену *народнасці* ва ўмовах капіталістычнага спосабу вытворчасці і ўяўляе сабой устойлівую супольнасць людзей, што складваецца і ўзнаўляецца на аснове агульнасці тэрыторыі, эканамічнага жыцця, мовы, культуры і псіхалагічнага складу.

**Нацыяналізм,** 1) у заходняй этналогіі – тэрмін, які азначае прыхільнасць і адданасць людзей каштоўнасцям сваёй нацыі (этнаса), ідэялогію і групавыя паводзіны, заснаваныя на ўяўленні аб першаснасці нацыянальных інтарэсаў свайго этнаса; 2) у савецкай, постсавецкай этнаграфіі – ідэялогія, псіхалогія, сацыяльная практыка, светапогляд і палітыка падпарадкавання адных нацый другім, прапаганда нацыянальнай выключнасці і перавагі.

**Нацыянальная самасвядомасць** – сукупнасць поглядаў, меркаванняў і адносін, выяўляючых змест і асаблівасці ўяўленняў прадстаўнікоў нацыянальнай супольнасці аб сваёй гісторыі, сучасным стане і перспектыве свайго развіцця, а таксама месцы сярод аналагічных супольнасцяў і характары ўзаемаадносін з імі.

**Нацыянальны гонар** – эмацыйна афарбаваныя адносіны людзей да ўнёску сваёй *нацыі* (*этнаса*) у сацыяльны прагрэс і сусветную культуру.

**Нацыянальны нігілізм** – адмоўнае стаўленне, недаацэнка ці поўнае ігнараванне нацыянальнай спецыфікі (мовы, культуры, гісторыі і інш.). Шырокае распаўсюджанне Н.н. у грамадстве з’яўляецца вынікам крызіса механізма нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і ўзнаўлення, сведчаннем нізкага ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці.

## П

**Палітонім** (ад грэч. “*politeia*” – дзяржава і “*onyma*” – імя), назва народа адпаведна яго дзяржаўна-палітычнай прыналежнасці. На тэрыторыі Беларусі адным з першых П. была назва “палачане”, што ў X – XIII стст. вызначала насельніцтва Полацкага княства.

**Паляванне** – адна са старажытных форм гаспадарчай дзейнасці чалавека. На працягу многіх гістарычных эпох – асноўны занятак, што забяспечваў людзей сродкамі існавання: ежай, адзеннем, сыравінай для вырабу прылад працы, зброі, упрыгожанняў і інш. Ва ўмовах развітай вытвараючай гаспадаркі П. набывае форму дапаможнага промысла, а ў сучасным грамадстве – характар спартыўнага, аматарскага занятка.

**Пахаванне, хаўтуры** – адзін з цэнтральных рытуалаў сямейнага цыклу, закліканы абрадавым (сімвалічным) чынам аформіць пераход нябожчыка з свету жывых у свет памёрлых, забяспечыць яму аптымальную долю ў пасмяротным жыцці і такім чынам заручыць яго (продкаў) звышнатуральнай апекай у дачыненні да жывых суродзічаў. Ушанаванне памяці нябожчыка неад’емна звязана з развітым на Беларусі *культам продкаў.*

**Панібрацтва** (ад польск. “*panie bracie*” – пан-брат) – сістэма паводзін і адносін у асяроддзі шляхты ў Польшчы, на Беларусі, у Літве і на Украіне. Згодна П. ўся шляхта лічылася раўнапраўнай і прытрымлівалася сяброўскіх, таварыскіх адносін. У падобных формах (напрыклад, кумпанства, братчына) ці часткова П. было характэрна для ладу жыцця, адносін і побыту іншых саслоўных груп насельніцтва (казакаў, баяр панцырных, часткова гараджан).

**Племя** – першы гістарычны тып этнічнай супольнасці і сацыяльнай арганізацыі людзей, уласцівы першабытнаабшчыннаму ладу. П. узнікае ў эпоху развітога радавога грамадства і храналагічна папярэднічае народнасці.

**Побыт, быт** – сукупнасць спосабаў і форм жыццядзейнасці ў пазавытворчай сферы, непасрэднае задавальненне матэрыяльных і духоўных патрэб людзей у харчах, адзенні, жыллі, падтрыманні здароўя, спорце, адпачынку, забавах і інш. П. надзвычай цесна звязаны, як з матэрыяльна-гаспадарчай, так і з духоўнай сферай (абрады, звычаі, святы, рэлігійныя вераванні, народная мараль і этыкет і інш.) этнічнай культуры.

**Псіхічны склад этнаса** – спецыфічны спосаб успрыняцця і адлюстравання прадстаўнікамі этнічнай супольнасці навакольнага свету і сукупнасць псіхічных рыс, уласцівых этнасу.

**Пчалярства** – адна са старажытных форм гаспадарчай дзейнасці чалавека, заснаваная на развядзенні і гадаванні пчол дзеля атрымання мёду, воску і іншых прадуктаў жыццядзейнасці пчалінай сям’і: праполісу, матачнага малачка, пяргі, пчалінага яду і пылку.

## Р

**Раса** – гістарычна склаўшаяся група людзей, аб’яднаная агульнасцю паходжання, якая выяўляецца ў агульнасці спадчынных, перадаваемых нашчадкам, другасных знешніх фізічных асаблівасцяў (колер скуры, вачэй, валасоў, абрысы галавы і г.д.).

**Расізм** – ідэялогія і грамадская псіхалогія, сутнасцю якіх з'яўляюцца ўяўленні аб біялагічнай перавазе ці, наадварот, непаўнавартасці асобных расавых груп.

**Род –** калектыў кроўных родзічаў, якія вялі сваё паходжанне па адной лініі (мацярынскай або бацькоўскай), у большасці выпадкаў усведамлялі сябе нашчадкамі агульнага продка (рэальнага ці міфічнага) і мелі агульнае родавае імя. Р. узнік на мяжы ніжняга і верхняга палеаліту, прыкладна 40 тыс. гадоў таму назад; на Беларусі існаваў амаль да канца жалезнага веку.

**Рыбалоўства** – адна з форм гаспадарчай дзейнасці чалавека; здабыча рыбы ў рэках, азёрах і іншых вадаёмах. Вядома з эпохі Палеаліту. У Неаліце займала першае месца сярод іншых відаў гаспадарчай дзейнасці людзей; існавала побач са *збіральніцтвам* і *паляўніцтвам*. Пашырэнню Р. на тэрыторыі Беларусі спрыяла вялікая колькасць вадаёмаў з багатай іхтыяфаунай. З развіццём *земляробства* і *жывёлагадоўлі* Р. набыло характар падсобнага промыслу.

**Рытуал, абрад** – вышэйшая форма сімвалічных паводзін чалавека (калекатыва), замацаваных традыцыяй і закліканых урэгуляваць найбольш значныя ці крытычныя (пераходныя) моманты ў жыццядзейнасці індывіда (Р. сямейнага цыклу: Радзіны, Вяселле, Пахаванне) ці соцыума (каляндарныя Р.), якія ўзнікаюць перыядычна.

**Радзіны, хрэсьбіны** – адзін з галоўных рытуалаў сямейнага цыклу, заклікaны пасродкам абрадавых (сімвалічных) дзеянняў забяспечыць дзіця пазітыўнай жыццёвай доляй і ўключыць навароджанага ў сацыяльную структуру вясковай грамады (шырэй – у сферу культуры ўвогуле).

## С

**Самаідэнтыфікацыя этнічная** – сацыяльна-псіхалагічны працэс усведамлення этнічнай групай сваёй тоеснасці (адзінства ўсіх членаў на аснове якіх-небудзь прыкмет), а асобным індывідам – сваёй прыналежнасці да пэўнага этнасу.

**Сацыяльная структура этнасу** – сукупнасць класаў, пазакласавых, унутрыкласавых і дэмаграфічных груп, розных сацыяльных слаёў, якія ўтвараюць канкрэтны этнасацыяльны арганізм; адзін з асноўных фактараў развіцця этнасацыяльных працэсаў.

**Свята** – адно з галоўных паняццяў народнага календара, "сакральны" час, супрацьпастаўлены паўсядзённаму, "прафаннаму" часу будняў. Падчас С. паводзіны і дзеянні чалавека (калектыва) носяць падкрэслена

сімвалічны, рытуальны характар, што павінна выправіць існуючыя парушэнні жыццяладу і спрыяць дасягненню аптымальнага гарманічнага светапарадку.

**Сімвал** (ад грэч. "*simbolon*" – знак, прыкмета) – прадметна-вобразнае ўвасабленне тых ці іншых ідэй і ідэалаў як вышэйшых каштоўнасцяў і сэнсаў, якімі жыве чалавек (калектыў) і якімі абумоўліваецца трываласць і стабільнасць функцыянавання *культуры.*

**Сімволіка нацыянальная** – канцэнтравана адлюстраваныя пасродкам знакаў і вобразных сімвалаў веды пра народ, яго гісторыю, нацыянальныя і дзяржаўныя прыкметы і памкненні.

**Сімволіка этнічная** – сукупнасць з'яў і элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры этнаса, якая выконвае этнавызначальную функцыю і з'яўляецца адметным знакам, які пазначае этнічную прыналежнасць сваіх носьбітаў.

**Стэрэатып этнічны** – схематызаваны, спрошчаны вобраз пэўнага этнаса ці яго прадстаўнікоў, які фіксуе толькі некаторыя, часам неістотныя рысы, але з'яўляецца надзвычай устойлівым.

**Субкультура** – сукупнасць норм, каштоўнасцяў, ідэалаў, сімвалаў пэўнай этнічнай ці сацыяльнай групы, якая існуе адносна самастойна ад культуры грамадства ў цэлым (напрыклад, С. шляхты ці рамеснікаў у феадальным грамадстве).

**Субэтнас** – этнічная сістэма, што ўзнікае ўнутры этнаса і адрозніваецца пэўнымі гаспадарчымі, бытавымі, культурнымі і іншымі асаблівасцямі.

**Сябрына** – народны беларускі звычай сумеснага карыстання сенажаццю, пашай, пчоламі (С. пчалярская), падоранай жывёлай і г.д. Саўладальнікаў маёмасці называлі сябрамі. Характэрнымі рысамі адносін паміж імі былі шчырасць і ўзаемадапамога.

**Сядзіба** – комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў разам з дваром, агародам і садам, якія складаюць індывідуальную гаспадарку селяніна.

**Сяліба** – населены пункт у сельскай мясцовасці (хутар, вёска, сяло ці інш.).

## Т

**Талерантнасць нацыянальная** (ад лац. "*tolerantia*" – цярпенне) – спецыфічная рыса нацыянальнага характару, неад'емны элемент структуры менталітэту, які арыентуе на цярпімасць, адсутнасць ці аслабленне рэакцыі на розныя неспрыяльныя фактары ў нацыянальным развіцці ці міжнацыянальных адносінах.

**Татэмізм** (на мове паўночна-амерыканскіх індзейцаў аджыбве "*от-атэм*" – літар. яго род) – сукупнасць уяўленняў, рытуалаў і звычаяў, заснаваных на веры ў звышнатуральную роднасць паміж групай людзей (родам) і татэмам – прадстаўніком жывёльнага ці расліннага свету. Як адна з ранніх форм рэлігіі Т. найбольш характэрны для абшчынна-родавага грамадства.

**Традыцыйная культура** – тып культуры, дзе прэвалююць звычаі і перадаваныя з пакалення ў пакаленне традыцыі, а змены і навацыі непрыкметныя для жыцця аднаго пакалення. Т.к., як правіла, даіндустрыйная, непісьмовая (асноўная форма захавання і трансляцыі інфармацыі – фальклор і другасныя знакавыя сістэмы), арыентаваная на натуральную сельскую гаспадарку і арганічнае ўзаемадзеянне з прыродай; яна супрацьстаіць наваўвядзенням і гарантам уласнай самабытнасці разглядае непарушнае захаванне традыцый.

**Тытульны этнас** – народ, які даў найменне таму ці іншаму нацыянальна-дзяржаўнаму ўтварэнню.

## У

**Умоўныя мовы** – лексічныя сістэмы, якія выкарыстоўваліся для захавання вытворчых, гандлёвых і іншых сакрэтаў, вядомых абмежаваным сацыяльным групам людзей, аб'яднаных рамяством ці родам дзейнасці (напрыклад, У.м. жабракоў ці старцаў).

**Урбанізацыя** (ад лац. "*urbanus*" – гарадскі) – працэс росту гарадоў, павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва, распаўсюджання ўзораў, нормаў, каштоўнасных арыентацый, характэрных для гарадскога ладу жыцця.

## Ф

**Фальклор** (ад англ. "*folk-lore*" – літар. народная мудрасць) – комплекс славесных, славесна-музычных, музычна-харэаграфічных, гульнёвых і драматычных відаў народнай творчасці. У Заходняй этналогіі Ф. Вызначаецца, як калектыўная і заснаваная на традыцыях творчасць груп ці індывідуумаў, якая адлюстроўвае надзеі і спадяванні грамадства і з'яўляецца адэкватным выяўленнем яго сацыякультурнай самабытнасці. У гэтым сэнсе, Ф. уключае ў сябе мову, вусную літаратуру, музыку, танцы, гульні, міфалогію, абрады, звычаі, рамёствы, архітэктуру і іншыя віды мастацкай творчасці.

**Фетышызм** (ад партуг. "*feitico*" – амулет) – вера ў звышнатуральныя ўласцівасці прыродных або зробленых чалавекам неадухоўленых рэчаў; з'яўляецца састаўным элементам практычна ўсіх рэлігійных сістэм (напрыклад, вера хрысціян у звышнатуральныя ўласцівасці крыжа ці абразоў).

**Фрустрацыя этнічная** – псіхалагічны стан этнічнай групы, які характарызуецца стратай перспектывы гістарычнага развіцця, трывогай, няўпэўненасцю ў заўтрашнім дні, пачуццём безвыходнасці.

## Ч

**Чарадзейства, вядзьмарства** – у народнай традыцыі – абагульняючае найменне ўсяго комплекса магічных дзеянняў і вербальных (славесных) формул, скіраваных, пераважна, на дэструктыўнае, шкадаёснае ўздзеянне на аб'екты і стыхіі навакольнага свету (надвор'е, расліны, жывёлы, чалавек).

## Ш

**Шлюб** – у традыцыйным грамадстве адзіная магчымая форма рытуальнай і сацыяльнай легітымізацыі сям'і і ўмова прадаўжэння роду. Абавязковай абрадавай працэдурай заключэння Ш. з'яўляецца *вяселле*.

## Э

**Эміграцыя** (ад лац. "*emigrare*" – выязджаць, высяляцца) – выезд, перасяленне грамадзян краіны за яе межы.

**Этнаграфічная група** – лакальна-тэрытарыяльная група насельніцтва, якая адрозніваецца асаблівасцямі традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры, побыту, часам мовы.

**Этнікас** (ад грэч. "*ethnicos*" – народны, уласцівы народу) – тэрмін, які азначае этнакультурнае адзінства прадстаўнікоў аднаго і таго ж народа незалежна ад месца пражывання (напрыклад, беларусы Канады, ЗША, Польшчы і іншых краін разам з беларусамі, што пражываюць у РБ, складаюць адзіны этнікас).

**Этнаграфія** – гістарычная навука, якая даследуе паходжанне і этнічную гісторыю народа, вывучае фармаванне спецыфічных асаблівасцяў яго культуры, побыту, сацыяльнай арганізацыі і псіхалогіі (ментальнасці); у заходняй сацыякультурнай антрапалогіі. Э. – частка *этналогіі*, якая вызначаецца апісальным узроўнем даследавання культурна-бытавых і сацыяльных адрозненняў паміж народамі.

**Этналогія** – навука, якая даследуе працэсы фарміравання і развіцця розных этнічных груп, іх ідэнтычнасць, формы іх культурнай самаарганізацыі, заканамернасці іх калектыўных паводзін і ўзаемадзеяння, узаемасувязі асобы і сацыяльнага асяродку; у постсавецкай традыцыі – сінонім этнаграфіі.

**Этнас** – устойлівая супольнасць людзей, якая гістарычна склалася на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, культуры, побыту, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання.

**Этнічная група** – група прадстаўнікоў пэўнага народа (частка этнасу), якая пражывае па-за межамі яго этнічнай тэрыторыі (напрыклад, беларусы ЗША).

**Этнічная меншасць** – частка этнаса, адасобленая ад асноўнага этнічнага масіва, што пражывае ў іншаэтнічным асяроддзі; у сучасных дзяржавах сінонім нацыянальнай меншасці.

**Этнічная самасвядомасць** – усведамленне людзьмі сваёй прыналежнасці да пэўнага этнасу; адна з асноўных этнічных прыкмет.

**Этнічны тэмперамент** – знешняе праяўленне *этнічнага характару*; найбольш яскрава праяўляецца ў асаблівасцях камунікацыі (тэмп маўлення, рухі, жэсты і да т.п.).

**Этнічная тэрыторыя** – тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа, з якой цесна звязаны яго этнагенез і этнічная гісторыя.

**Этнічны характар** – цэласная структура, якая адлюстроўвае спецыфіку гістарычна склаўшыхся асаблівасцяў псіхікі, што адрозніваюць адзін этнас ад другога.

**Этнонім** – назва этнаса – саманазва (эндаэтнонім) і назва, якую яму даюць іншыя народы (экзаэтнонім).

# ЗМЕСТ

Уводзіны ........ 3
Мэты і задачы дысцыпліны ........ 5
Віды заняткаў і формы кантролю ведаў ........ 5
Вучэбна-метадычныя матэрыялы па дысцыпліне ........ 10
Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны ........ 13
Тэма 1. Этнаграфія Беларусі як навука, яе прадмет, метады і ўзаемасувязь з сумежнымі дысцыплінамі ........ 16
1.1. Вызначэнне этнаграфіі. ........ 16
1.2. Аб΄ект і прадмет этнаграфіі Беларусі. ........ 17
1.3. Этнас. Кампаненты этнічнай сістэмы. ........ 19
1.4. Гістарычныя формы этнічных супольнасцяў ........ 23
1.5. Крыніцы і метады этнаграфічных даследаванняў. Класіфікацыя ў этнаграфіі ........ 24
1.6. Класіфікацыя ў этнаграфіі. ........ 27
Тэма 2. Гісторыя этнаграфічнага вывучэння Беларусі ........ 29
2.1. Этнагрфічныя звесткі пра Беларусь ў IX – XVIII стст. ........ 29
2.2. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст. ........ 32
2.3. Развіццё беларускай этнаграфіі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. ........ 36
2.4. Беларуская савецкая этнаграфія. ........ 48
Тэма 3. Этнічная гісторыя Беларусі ........ 64
3.1. Рассяленне індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі. ........ 64
3.2. Славянская каланізацыя тэрыторыі Беларусі ........ 65
3.3. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай: этнакультурны аспект ........ 71
3.4. Беларускі этнас у канцы XVIII – пачатку XXст.: пачаткі фарміравання беларускай нацыі. ........ 80
3.5. Беларуская нацыя ў XX – пачатку XXI ст.: праблемы і перспектывы развіцця. ........ 91
Тэма 4. Традыцыйная матэрыяльная культура і сацыяльная арганізацыя беларусаў ........ 100
4.1. Традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў. ........ 101
4.2. Беларускае традыцыйнае адзенне. ........ 124
4.3. Традыцыйныя формы паселішчаў і народнае дойлідства Беларусі. ........ 126
4.4. Беларуская традыцыйная кухня. ........ 133
4.5. Традыцыйныя формы сацыяльнай арганізацыі беларусаў. ........ 138
Тэма 5. Традыцыйная духоўная культура беларусаў ........ 145
5.1. Сямейная абраднасць беларусаў. ........ 146
5.2. Каляндарная абраднасць. ........ 159
5.3. Беларускі традыцыйны фальклор ........ 173
5.4. Традыцыйныя рэлігійныя вераванні беларусаў. ........ 184
5.5. Народныя веды. ........ 193
Тэма 6. Нацыянальныя меншасці і міжэтнічныя адносіны на Беларусі ........ 201
Дадатак 1. Да методыкі палявой этнаграфічнай дзейнасці ........ 221
Дадатак 2. Беларуская дыяспара ........ 223
Дадатак 3. Этнічны крызіс 1930 – першай паловы 1980-х гг. ........ 229

Дадатак 4. Тыпалагічныя рысы беларускага нацыянальнага руху ў еўрапейскім кантэксце (канец XVIII – пачатак XX стст.) .................. 237
Дадатак 5. Гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны (вобласці) Беларусі .................. 241
Заданні да практычных заняткаў .................. 253
Кантрольныя пытанні да заліку .................. 288
Індывідуальныя заданні да заліку .................. 291
Прыкладныя тэмы курсавых работ .................. 306
Метадычныя парады па выкананні курсавых работ .................. 307
Кароткі слоўнік этнаграфічных тэрмінаў .................. 313

*Вучэбнае выданне*

ЛОБАЧ Уладзімір Аляксандравіч

ЭТНАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 "Гісторыя",
1-02 01 02 "Гісторыя. Замежная мова"

Рэдактар Ю.В. Мацук

Дызайн вокладкі І.С. Васільевай

Падпісана да друку 05.02.06. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Гарнітура Таймс. Папера афсетная.
Надрукавана на рызографе. Ум. друк. арк. 19,03. Ул.-выд. арк. 18,23. Тыраж 80. Заказ 105.

Выдавец і паліграфічнае выкананне –
Установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт"

ЛВ № 02330/0133020 ад 30.04.04 ЛП № 02330/0133128 ад 27.05.04

211440, г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29